Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
Кафедра беларускага мовазнаўства

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
______________________________
“____”________________20____ г.

БГПУ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС

вучэбнай дысцыпліны “Актуальныя праблемы беларускай мовы”

для спецыяльнасцей:

1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура

Узгоднена: дэкан факультэта_______________________________________

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння на пасяджэнні кафедры пратакол №__ ад “___” ______________ 2011 г.

Мінск, 20__

# ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
# ВМК ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ
# “АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”

## Тлумачальны каментарый

ВМК па дысцыпліне **“Актуальныя праблемы беларускай мовы”** прызначаны для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін.

Асноўная **мэта выкладання дысцыпліны** – развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне будучых спецыялістаў-філолагаў; выпрацаваць уменні і навыкі практычнай рэалізацыі атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці; садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў, здольных паспяхова вырашаць праблемы функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму; выхаваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

ВМК “Актуальныя праблемы беларускай мовы” займае важнае месца ў сістэме лінгвістычнай падрыхтоўкі студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, з’яўляецца дадатковай базай для грунтоўнага засваення беларускай мовы. Пры вывучэнні дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і цесная сувязь яго з ВМК іншых лінгвістычных прадметаў і, у першую чаргу з ВМК па дысцыпліне “Сучасная беларуская літаратурная мова”.

Прапанаваны тэарэтычны раздзел уключае (згодна “Палажэння аб вучэбна-метадычным комплексе на ўзроўні вышэйшай адукацыі” пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь) матэрыялы для тэарэтычнага вывучэння вучэбнай дысцыпліны ў аб’ёме, устаноўленым тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура, у прыватнасці, прыкладную тэматыку лекцыйных заняткаў па курсе “Актуальныя праблемы беларускай мовы”. Тэматыка лекцый адпавядае базавай вучэбнай і рабочай вучэбнай праграмам па дысцыпліне “Актуальныя праблемы беларускай мовы” і складаецца з назваў тэм лекцый, пераліку пытанняў, якія вывучаюцца па названай тэме, спісу рэкамендаванай літаратуры, агульнага аб’ёму гадзін па курсах. За выкладчыкам пакідацца права ўдакладніць пералік пытанняў, якія будуць вывучацца, канкрэтызаваць спіс літаратуры.

## Метадычныя рэкамендацыі

Галоўная мэта лекцыйных заняткаў названай дысцыпліны -- азнаямленне з новым тэарэтычным матэрыялам. У адпаведнасці з гэтым асноўным метадам выкладання выступае такі славесны метад, як метад слова выкладчыка (настаўніка). Названы метад з мэтай актывізацыі пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў можа спалучацца з метадам гутаркі (гутаркі падрыхтоўчай, гутаркі паведамляльнай ці эўрыстычнай, гутаркі ўзнаўляльнай, гутаркі паўтаральна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

абагульняльнай). Як метад можа выкарыстоўвацца і метад самастойнай працы, заснаваны на самаарганізацыі студэнта пры засваенни новага матэрыялу.

Акрамя названых варта выкарыстоўваць таксама наглядныя метады: ілюстрацыі, дэманстрацыі, назіранні. Выбар метаду залежыць ад характару матэрыялу, які разглядаецца на лекцыі, ад узроўню падрыхтаванасці навучэнцаў і тых задач, якія ставіць перад сабой выкладчык.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Прыкладная тэматыка лекцыйных заняткаў**
**па дысцыпліне "Актуальныя пытанні беларускай мовы"**

**1 курс (20 гадзін)**

**Тэма 1**: Нацыянальная мова як гістарычная катэгорыя

*План*

1. Нацыянальная мова як сістэма.

2. Беларуская літаратурная мова на сучасным этапе.

3. Беларуская мова як першааснова нацыянальнай культуры.

*Літаратура*

1. Лукашанец, А. Беларуская мова: Асаблівасці сучаснага стану і функцыянавання / А. Лукашанец // Роднае слова, 2009. – № 2. – С. 11-14.

2. Гуліцкі, М. Беларуская мова як першааснова нацынальнай культуры / М. Гуліцкі // Роднае слова, 2009. -- № 2. – С. 23-26.

**Тэма 2**: Навуковы дасягненні вядомых беларускіх лінгвістаў

*План*

1. Навуковая спадчына Я.Ф. Карскага.

2. Навуковая спадчына Б.А. Тарашкевіча.

*Літаратура*

1. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.

2. Германовіч, І.К. Беларускія мовазнаўцы: у 2 т. / І.К. Германовіч; рэд. М.Р. Прыгодзіч, І.С. Роўда – Мінск: БДУ, 2006.

3. Карский, Е.Ф. Белорусы: в 3 т. / Е.Ф. Карский. – Мінск: БелЭн, 2006 - 2007.

**Тэма 3**: Слова як адзінка лексічнай сістэмы

*План*

1. Двухбаковая сутнасць слова.

2. праблема асобнасці слова. Крытэрыі вылучэння слова.

3. Праблема тоеснасці слова. Варыянты слова. Адрозненне варыянтаў слова ад самастойнага слова.

4. Праблема лексічнага значэння слова.

*Літаратура*

1. Баханькоў, А.Я. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / А.Я. Баханькоў [ і інш.]; пад агул. рэд. А.Я. Баханькова / АН Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я.Коласа. – Мінск, 1994. – 463 с.

2. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.

3. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003.— 672 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Сучасная беларуская літаратурная мова. Лексікалогія. Фанетыка. Арфаграфія: Вучэб. дапаможнік для філал. фак. пед. ін-таў/ М.Ц. Кавалёва, А.К. Юрэвіч, Ф.М. Янкоўскі і інш. – 2-е выд., дапрац. -- Мінск: Выш. шк., 1984.

**Тэма 4**: Сістэмна-семасіялагічная характарыстыка лексікі

*План*

1. Праблема сістэмнай арганізацыі мовы ў сучаснй лінгвістыцы.
2. Сінтагматычныя і парадыгматычныя адносіны ў лексіцы.
3. Фармальна-семантычная структура слова.
4. Асноўныя тыпы слоўных апазіцый па сememах і лексемах.

*Літаратура*

1. Баханькоў, А.Я. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / А.Я. Баханькоў [ і інш.]; пад агул. рэд. А.Я. Баханькова / АН Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я.Коласа. – Мінск, 1994. – 463 с.
2. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.
3. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003.— 672 с.

**Тэма 5**: Семантычная класіфікацыя антонімаў

*План*

1. Антонімы, якія выражаюць якасную процілегласць.
2. Камплементарныя антонімы.
3. Антонімы, якія выражаюць супрацьлеглую накіраванасць дзеянняў, уласцівасцей, прымет.
4. Антонімы-канверсівы.

*Літаратура*

1. Баханькоў, А.Я. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / А.Я. Баханькоў [ і інш.]; пад агул. рэд. А.Я. Баханькова / АН Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я.Коласа. – Мінск, 1994. – 463 с.
2. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.
3. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003.— 672 с.

**Тэма 6**: Класы слоў як з’ява лексічнай парадыгматыкі

*План*

1. Прадметна-тэматычныя групы слоў (ПТГ).
2. Лексіка-семантычныя групы слоў (ЛСГ).
3. Семантычныя палі.

*Літаратура*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Баханькоў, А.Я. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / А.Я. Баханькоў [ і інш.]; пад агул. рэд. А.Я. Баханькова / АН Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я.Коласа. – Мінск, 1994. – 463 с.

2. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.

3. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003.— 672 с.

**Тэма 7**: Гісторыка-этымалагічная характарыстыка бедарускай лексікі

*План*

1. Спрадвечная лексіка.
2. Лексіка перыяду беларускай народнасці.
3. Лексіка перыяду беларускай нацыі.
4. Роля народных гаворак ва ўзбагачэнні лексікі беларускай мовы.

*Літаратура*

1. Баханькоў, А.Я. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / А.Я. Баханькоў [ і інш.]; пад агул. рэд. А.Я. Баханькова / АН Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я.Коласа. – Мінск, 1994. – 463 с.

2. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.

3. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003.— 672 с.

**Тэма 8**: Гісторыка-этымалагічная характарыстыка бедарускай лексікі

*План*

1. Разнавіднасці іншамоўнай лексікі.
2. Прычыны запазычвання іншамоўнай лексікі.
3. Шляхі пранікнення і спосабы ўвядзення іншамоўных слоў у беларускую мову.

*Літаратура*

1. Баханькоў, А.Я. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / А.Я. Баханькоў [ і інш.]; пад агул. рэд. А.Я. Баханькова / АН Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я.Коласа. – Мінск, 1994. – 463 с.

2. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.

3. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003.— 672 с.

**Тэма 9**: Лексікаграфія як раздзел мовазнаўства

*План*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Стан, праблемы і кірункі сучаснай беларускай лексікаграфіі.
2. Аналіз аднамоўных слоўнікаў.
3. Аналіз двухмоўных слоўнікаў.
4. Аналіз шматмоўных слоўнікаў.

*Літаратура*

1. Шахоўская, С.У. Беларуская анамастычная лексікаграфія: фарміраванне, сучасны стан, вектары развіцця / С.У. Шахоўская; навук. рэд. П.А. Міхайлава. – Мінск: Красная звезда, 2012.

2. Сучасная беларуская літаратурная мова: Лексікалогія. Фанетыка. Арфаграфія: вучэб. дапам. /.М.Ц. Кавалёва, А.К. Юрэвіч, Ф.М. Янкоўскі і інш. -- 3-е выд. --Мн., 1993.

3. Сучасная беларуская літаратурная мова. Лексікалогія. Фанетыка. Арфаграфія: Вучэб. дапаможнік для філал. фак. пед. ін-таў/ М.Ц. Кавалёва, А.К. Юрэвіч, Ф.М. Янкоўскі і інш. – 2-е выд., дапрац. -- Мінск: Выш. шк., 1984.

**Тэма 10:** Арфаграфія як раздзел мовазнаўства

*План*

1. З гісторыі беларускай арфаграфіі.
2. Сучасная беларуская арфаграфічная сістэма.

*Літаратура*

1. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.

2. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003.— 672 с.

3. 2. Сучасная беларуская літаратурная мова: Лексікалогія. Фанетыка. Арфаграфія: вучэб. дапам. /.М.Ц. Кавалёва, А.К. Юрэвіч, Ф.М. Янкоўскі і інш. -- 3-е выд. --Мн., 1993.

4. Сучасная беларуская літаратурная мова. Лексікалогія. Фанетыка. Арфаграфія: Вучэб. дапаможнік для філал. фак. пед. ін-таў/ М.Ц. Кавалёва, А.К. Юрэвіч, Ф.М. Янкоўскі і інш. – 2-е выд., дапрац. -- Мінск: Выш. шк., 1984.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**2 курс (36 гадзін)**

**Тэма 1**: Марфеміка як вучэнне аб марфемах

*План*

1. Прадмет і задачы марфемікі.
2. Паняцце марфемы, аламарфемы.
3. Паняцце морфа, аламорфа.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.

2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.

3. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.

4. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

**Тэма 2**: Словаўтварэнне

*План*

1. З гісторыі вывучэння словаўтварэння.
2. Кірункі даследавання словаўтварэння ў беларускім мовазнаўстве.
3. Сінхроннае словаўтварэнне і дыяхроннае словаўтварэнне.

*Літаратура*

1. Лукашанец, А.А. Праблемы сучаснага беларускага словаўтварэння / А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларуская навука, 2013.—315 с.

2. Лукашанец, А.А. Словаўтварэнне і граматыка / А.А. Лукашанец. – Мінск: Права і эканоміка, 2001. – 252 с.

3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.

4. Русак, В.П. Марфаналогія словазмянення і словаўтварэння сучаснай беларускай мовы / В.П. Русак. – Мінск: Беларуская навука, 2012. – 429 с.

**Тэма 3**: Граматыка. Марфалогія: кірункі даследавання

*План*

1. Апісальна-граматычныя даследаванні.
2. Функцыянальна-граматычныя даследаванні.
3. Супастаўляльна-граматычныя даследаванні інш.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.

3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.

**Тэма 4**: Асноўныя граматычныя паняцці і адзінкі

*План*

1. Паняцце граматычнай катэгорыі
2. Паняцце граматычнай формы.
3. Паняцце парадыгмы. Спосабы і сродкі выражэння граматычных значэнняў.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.

2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.

3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.

4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.

5. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 5**: Слова як адзінка марфалогіі

*План*

1.Словы і іх граматычныя групоўкі
2. Сістэма часцін мовы.
3. Безасабова-прэдыкатыўныя словы.
4. Няпэўна-колькасныя словы.
5.Мадальныя словы. выклічнік.
6. Гукаперайманні. Звязка.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.

2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.

3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.

4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.
5. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

**Тэма 6**: Граматычны статус назоўніка

*План*

1. З гісторыі вывучэння назоўніка.
2. Прадметна-сэнсавая аснова катэгорыі назоўніка.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.
2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.
3. Наркевіч, А.І. Назоўнік: Граматычныя катэгорыі і формы / А.І. Наркевіч. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1976. – 248 с.
4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.
5. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

**Тэма 7**: Граматычны статус назоўніка

*План*

1. Лексіка-семантычныя групы назоўніка.
2. Узаемадзеянне паміж катэгорыямі назоўніка, прыметніка, лічэбніка, займенніка, прыслоўя.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.
2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.
3. Наркевіч, А.І. Назоўнік: Граматычныя катэгорыі і формы / А.І. Наркевіч. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1976. – 248 с.
4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.
5. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

**Тэма 8**: Граматычны статус прыметніка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*План*

1. Аспекты вывучэння прыметніка.
2. Семантычныя асновы катэгорыі прыметніка.
3. Узаемадзеянне розных разрадаў прыметніка.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.
2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.
3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.
4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.
5. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

**Тэма 9**: Граматычны статус прыметніка

*План*

1. Класіфікацыйныя прыметы якасных прыметнікаў.
2. Класіфікацыйныя прыметы адносных прыметнікаў.
3. Класіфікацыйныя прыметы прыналежных прыметнікаў.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.
2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.
3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.
4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.
5. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

**Тэма 10**: Граматычны статус лічэбніка

*План*

1. З гісторыі вывучэння лічэбніка.
2. Граматычныя асаблівасці лічэбніка.
3. Асаблівасці скланення  і ўтварэннялічэбнікаў.

*Літаратура*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.
2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.
3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.
4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.
5. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

**Тэма 11**: Граматычны статус займенніка

*План*

1. З гісторыі вывучэння займенніка.
2. Займеннік як асаблівы лексіка-семантычны тып слоў.
3. Граматычныя асаблівасці катэгорыі займенніка ў беларускай мове.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.
2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.
3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.
4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.
5. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 12**: Граматычны статус дзеяслова

*План*

1. Шляхі вывучэння дзеяслова ў граматычнай традыцыі.
2. Пытанне пра стан у лінгвістычнай літаратуры.
3. Граматычныя асаблівасці пераходных і непераходных дзеясловаў.
4. Граматычныя асаблівасці дзеясловаў незалежнага і залежнага стану.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.

2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.

3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.

4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.

5. Шуба, П.П. Дзеяслоў у беларускай мове / П.П. Шуба. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1968. – 82 с.

6. Русак, В.П. Марфаналогія сучаснай беларускай мовы / В.П. Русак. – Мінск: Бел. навука, 2003. – 316 с.

**Тэма 13**: Граматычны статус дзеяслова

*План*

1. Узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасць катэгорый дзеяслова
2. Сувязь катэгорыі ладу з катэгорыямі часу і трывання.
3. Сувязь паміж катэгорыяй трывання і катэгорыяй часу.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.

2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.

3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.

4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.

5. Шуба, П.П. Дзеяслоў у беларускай мове / П.П. Шуба. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1968. – 82 с.

6. Русак, В.П. Марфаналогія сучаснай беларускай мовы / В.П. Русак. – Мінск: Бел. навука, 2003. – 316 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 14**: Граматычны статус прыслоўя

*План*

1. Традыцыйныя пункты гледжання на прыслоўе.
2. Вызначэнне катэгорыі прыслоўя.
3. Граматычныя асаблівасці прыслоўя.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.

2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.
3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.
4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.
5. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.
6. Шуба, П.П. Прыслоўе ў беларускай мове: Марфалагічны нарыс / П.П.Шуба. – Мінск: выд-ва АН БССР, 1962. – 194 с.

**Тэма 15**: Лінгвістычны статус безасабова-прэдыкатыўных слоў

*План*

1. Катэгарыяльнае значэнне безасабова-прэдыкатыўных слоў.
2. Граматычныя асаблівасці безасабова-прэдыкатыўных слоў.
3. Сінтаксічная функцыя безасабова-прэдыкатыўныхслоў.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.
2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.
3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.
4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.
5. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 16**: Граматычны статус службовых часцін мовы

*План*

1. З гісторыі станаўлення службовых часці мовы.
2. Аспекты даследавання службовых часцін мовы.
3. Характарыстыка функцый прыназоўніка.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.
2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.

3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.
4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.
5. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

**Тэма 17**: Граматычны статус службовых часцін мовы

*План*

1. Характарыстыка разрадаў прыназоўніка.
2. Характарыстыка прасторавых, часавых, прычынных і інш. прыназоўнікаў.
3. Вытворныя і невытворныя прыназоўнікі.
4. Простыя, складаныя і састаўныя прыназоўнікі.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.
2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.
3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.
4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.
5. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.
6. Шуба, П.П. Прыназоўнік у беларускай мове / П.П. Шуба. – Мінск: БДУ імя У.І. Леніна, 1971. – 224 с.
7. Яўневіч, М.С. Сінтаксічная сінаніміка ў сучаснай беларускай літаратурнай мове / М.С. Яўневіч. – Мінск: БДУ імя У.І. Леніна, 1977. – 280 с.

**Тэма 18**: Граматычны статус службовых часцін мовы

*План*

1. Разрады злучнікаў паводле паходжання.
2. Разрады злучнікаў паводле структуры.
3. Разрады злучнікаў паводле спосабу ўжывання.

*Літаратура*

1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.
3. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994.
4. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія: вучэб. дапам. / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск: Выш. шк., 1997.
5. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 3 курс (10 гадзін)

**Тэма 1**: Сінтаксіс як узровень мовы і раздзел граматыкі.

*План*

1. Адгалінаванні сінтаксісу.
2. Аспекты вывучэння сінтаксісу.
3. Сінтаксічныя адзінкі (сінтаксема, словазлучэнне, сказ, ЗФА і інш.).

*Літаратура*

1. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.
2. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.
3. Чалюк, Н.М. Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне. Просты сказ / Н.М.Чалюк. – Мінск: ТетраСистемс, 2004. -- 208 с.

**Тэма 2**: Словазлучэнне

*План*

1. З гісторыі вывучэння.
2. Лінгвістычны статус словазлучэння.
3. Перабудова і парушэнне падпарадкавальных сувязей словазлучэння ў кантэксце.

*Літаратура*

1. Бандарэнка, Т.П. Аднатыпныя словазлучэнні ў сучаснай беларускай літаратурнай мове / Т.П. Бандарэнка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 131 с.
2. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.
3. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.
4. Чалюк, Н.М. Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне. Просты сказ / Н.М.Чалюк. – Мінск: ТетраСистемс, 2004. -- 208 с.

**Тэма 3**: Просты сказ

*План*

1. Аспекты вывучэння сказа.
2. Мадэль сказа і сінтаксічныя пазіцыі.
3. Паняцце прэдыкатыўнасці як асноўнай прыметы сказа.
4. Вербацэнтрычная тэорыя сказа.

*Літаратура*

1. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 2. Сінтаксіс / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.

3. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.

4. Чалюк, Н.М. Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне. Просты сказ / Н.М.Чалюк. – Мінск: ТетраСистемс, 2004. -- 208 с.

**Тэма 4**: Прэдыкатыўная аснова двухсастаўнага сказа.

*План*

1. Дзейнік і выказнік як арганізацыйны цэнтр сказа
2. Праблема каардынацыі дзейніка і выказніка.

*Літаратура*

1. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.

2. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.

3. Чалюк, Н.М. Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне. Просты сказ / Н.М.Чалюк. – Мінск: ТетраСистемс, 2004. -- 208 с.

**Тэма 5**: Даданыя члены сказа

*План*

1. Традыцыйнае вучэнне аб даданых членах сказа.
2. Сінкрэтызм у сістэме даданых членаў сказа.
3. Дэтэрмінаваныя і недэтэрмінаваныя члены сказа.

*Літаратура*

1. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.

2. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.

3. Чалюк, Н.М. Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне. Просты сказ / Н.М.Чалюк. – Мінск: ТетраСистемс, 2004. -- 208 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**4 курс (22 гадзіны)**

**Тэма 1**: Аднасастаўныя сказы

*План*

1. Лінгвістычны статус аднасастаўных сказаў.
2. Праблема класіфікацыі аднасастаўных сказаў.
3. Сінтаксічная кваліфікацыя галоўнага члена аднасастаўнага сказа.
4. Лінгвістычны статус вакатыўных сказаў.
5. Месца генітыўных сказаў у сістэме простага сказа.

*Літаратура*

1. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.
2. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.
3. Чалюк, Н.М. Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне. Просты сказ / Н.М.Чалюк. – Мінск: ТетраСистемс, 2004. -- 208 с.

**Тэма 2**: Сінтаксічна непадзельныя сказы. Няпоўныя і эліптычныя сказы

*План*

1. Тэрміналагічнае абазначэнне сінтаксічна непадзельных сказаў.
2. Лінгвістычная сутнасць няпоўных сказаў.
3. Лінгвістычная сутнасць эліптычных сказаў.

*Літаратура*

1. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.
2. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.
3. Чалюк, Н.М. Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне. Просты сказ / Н.М.Чалюк. – Мінск: ТетраСистемс, 2004. -- 208 с.

**Тэма 3**: Ускладнены просты сказ

*План*

1. Пытанне аб кампанентах ускладнення простага сказа.
2. Класіфікацыя адасобленых членаў.
3. Сінтаксічная сувязь адасобленых членаў у сказе.

*Літаратура*

1. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.
2. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Чалюк, Н.М. Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне. Просты сказ / Н.М.Чалюк. – Мінск: ТэтраСистемс, 2004. -- 208 с.

**Тэма 4**: Пабочныя канструкцыі

*План*

1. Сувязь пабочных канструкцый з асноўнай часткай сказа.
2. Размежаванне пабочных канструкцый з аманімічнымі непабочнымі.
2. Класіфікацыя сказаў з пабочнымі канструкцыямі.

*Літаратура*

1. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.
2. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.
3. Чалюк, Н.М. Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне. Просты сказ / Н.М.Чалюк. – Мінск: ТэтраСистемс, 2004. -- 208 с.
4. Яўневіч, М.С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы: падруч. Для студэнтаў філал спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / М.С. Яўневіч, П.У. Сцяцко. – Мінск: Аверсэв, 2006. – 286 с.

**Тэма 5**: Устаўныя канструкцыі

*План*

1. Лінгвістычны статус устаўных канструкцый.
2. Сувязь устаўных канструкцый з асноўнай часткай сказа.
3. Адрозненне ўстаўных канструкцый ад іншых сінтаксічных адзінак.

*Літаратура*

1. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.
2. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.
3. Чалюк, Н.М. Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне. Просты сказ / Н.М.Чалюк. – Мінск: ТэтраСистемс, 2004. -- 208 с.
4. Яўневіч, М.С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы: падруч. Для студэнтаў філал спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / М.С. Яўневіч, П.У. Сцяцко. – Мінск: Аверсэв, 2006. – 286 с.

**Тэма 6**: Далучальныя канструкцыі

*План*

1. Лінгвістычны статус далучальных канструкцый.
2. Адрозненне далучальных канструкцый ад іншых сінтаксічных адзінак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Літаратура*

1. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.

2. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.

3. Чалюк, Н.М. Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне. Просты сказ / Н.М.Чалюк. – Мінск: ТетраСистемс, 2004. -- 208 с.

**Тэма 7**: Складаны сказ

*План*

1. З гісторыі вывучэння.
2. Сінтаксічная сутнасць складанага сказа.
3. Кампаненты складанага сказа.

*Літаратура*

1. Антанюк, Л.А. Сінтаксіс беларускай мовы. Сказ. Функцыянальна-семантычны сінтаксіс: Вучэбны дапаможнік / Л.А. Антанюк. – Мінск: Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, 2004. – 110 с.

2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 2. Сінтаксіс / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 240 с.

3. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.

4. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.

**Тэма 8**: Складаны сказ

*План*

1. Класіфікацыя складаных сказаў.
2. Канструкцыі з прыметамі простага і складанага сказа.

*Літаратура*

1. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 2. Сінтаксіс / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 240 с.

2. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.

3. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.

**Тэма 9**: Складаназлучаны сказ

*План*

1. Праблема класіфікацыі частак складаназлучанага сказа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Сказы адкрытай і закрытай структуры.

*Літаратура*

1. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 2. Сінтаксіс / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 240 с.
2. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.
3. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.
4. Яўневіч, М.С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы: падруч. Для студэнтаў філал спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / М.С. Яўневіч, П.У. Сцяцко. – Мінск: Аверсэв, 2006. – 286 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 10**: Складаназалежны сказ

*План*

1.Праблема класіфікацыі складаназалежнага сказа. Складаназалежныя сказы з сінкрэтызмам значэнняў.

2. Кваліфікацыя асобных тыпаў дадзеных частак.

3. Складаныя злучнікавыя сказы прамежкавага, або пераходнага, тыпу.

*Літаратура*

1. Антанюк, Л.А. Сінтаксіс беларускай мовы. Сказ. Функцыянальна-семантычны сінтаксіс: Вучэбны дапаможнік / Л.А. Антанюк. – Мінск: Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, 2004. – 110 с.
2. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 2. Сінтаксіс / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 240 с.
3. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.
4. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.
5. Яўневіч, М.С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы: падруч. Для студэнтаў філал спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / М.С. Яўневіч, П.У. Сцяцко. – Мінск: Аверсэв, 2006. – 286 с.

**Тэма 11**: Камунікацыйны аспект сказа

*План*

1. Актуальнае чляненне выказвання.

2. З гісторыі распрацоўкі пытання.

*Літаратура*

1. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.

2. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ (ПЕРШАЯ ЧАСТКА) ВМК ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”

## Тлумачальны каментарый

ВМК па дысцыпліне **“Актуальныя праблемы беларускай мовы”** прызначаны для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін.

Асноўная **мэта выкладання дысцыпліны** – развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне будучых спецыялістаў-філолагаў; выпрацаваць уменні і навыкі практычнай рэалізацыі атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці; садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў, здольных паспяхова вырашаць праблемы функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму; выхаваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

ВМК “Актуальныя праблемы беларускай мовы” займае важнае месца ў сістэме лінгвістычнай падрыхтоўкі студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, з’яўляецца дадатковай базай для грунтоўнага засваення беларускай мовы. Пры вывучэнні дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і цесная сувязь яго з ВМК іншых лінгвістычных прадметаў і, у першую чаргу з ВМК па дысцыпліне “Сучасная беларуская літаратурная мова”.

Агульнавядома, што спецыфічнымі практыкаваннямі пры навучанні мове з’яўляюцца дыктанты (якія ў залежнасці ад мэты правядзення падзяляюцца на навучальныя і кантрольныя).

Першая частка практычнага раздзела змяшчае (згодна “Палажэння аб вучэбна-метадычным комплексе на ўзроўні вышэйшай адукацыі” пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь) матэрыялы для фарміравання ўстойлівых прыктычных уменняў і навыкаў, у прыватнасці, у якасці дадактычнага матэрыялу -- сістэму навучальных (тлумачальных, папераджальных, каменціраваных і інш. ) дыктантаў (аўтары-складальнікі: Мароз С.С., Ржавукая М.С., Старасценка), якія можна выкарыстоўваць на этапе фарміравання і ўдасканалення практычных ўменняў і навыкаў. Паколькі сярод дыктантаў ёсць слыхавыя і зрокавыя, а зрокавыя суправаджаюцца даведкай, то апошнія могуць быць выкарыстаны і на этапе паўстамастойнай працы або ў якасці заданняў да кантралюемай самастойнай працы.

## Метадычныя рэкамендацыі

Асноўнымі метадамі пры правядзенні практычных заняткаў па названым курсе з’яўляюцца практычныя метады (практыкаванні аналітычнага, сінтэтычнага, аналітычна-сінтэтычнага характару, лінгвістычны эксперымент і інш.). Як метад можа выкарыстоўвацца і метад самастойнай працы, заснаваны на самаарганізацыі студэнта пры выкананні заданняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асноўныя прыёмы: прыёмы параўнання і супастаўлення, прыёмы аналізу і сінтэзу, прыёмы класіфікацыі і дыферэнцыяцыі і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ДЫДАКТЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ ДА ПРЫКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

### Навучальныя тлумачальныя дыктанты

1. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце правапіс прапушчаных арфаграм і пунктаграмы, сфармулюйце правілы.

Мартын Рыль ехаў са стрэльбай на чоўне (ў, у)скрай Прып…ці. Ён туліцца бліжэй да чаротаў каб спрытней па…красціся да дзікіх качак. Яму пашчас…лівілася настраляць іх штук пяць. З таго боку Прып…ці шыбуе човен. На носе чоўна ляжыць зялёная вязка свежай травы і ёмкі сноп пышнага кучаравага чароту. На чоўне бялее гнуткая, руплівая дз…вочая постаць у чырвонай хуста…цы завязанай канцамі назад. Спрытна мільгае весла ў яе пру…кіх руках і човен борзда і роўна с…лізгаціць па шырокім лоне спакойнай Прып…ці. Мінуўшы сярэдзіну рэчкі човен крута верне ў/бок Мартына. Мартын сумыслу едзе павольна і пільна ўзіраецца ў затокі дзе любяць жыраваць качкі і не/глядзіць на човен з дзяўчынаю хоць ужо ведае хто на ім плыве. Але яму прыемна.

– А я табе ўсіх качак папужаю чуецца малады звонкі дз…вочы голас і следам за гэтым даносіцца яе крык.

Якуб Колас. “Дрыгва”.

***** Патлумачце значэнне слоў *шыбаваць, борзда, ёмкі*. Падбярыце сінонімы да слова *спрытна*.

2. Запішыце тэкст пад дыктоўку згодна з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Растлумачце правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Адштурхнуўшыся ад берага, Лаўрэн едзе ўверх па Дняпру, да самага дальняга семафора свайго ўчастка. Адну за другой запальвае семафорныя лямпы і ўсцягвае іх на самы верх мачтаў. Дзе газы падалье, дзе старанна пратрэ закуранае шкло, падрэжа і падчысціць кнот. І калі запаліцца апошняя лямпа, едзе Лаўрэн да невялікай выспачкі, зарослай лазняком і алешнікам, выцягвае човен, раскладвае цяпельца, назбіраўшы ўсякага сушняку з ламачча, павыкіданага вадой. Тут і алешнікавы цюльпак, і яловае бервянцо – адбіліся ад плытоў, – тут і павыкіданыя вадой бярозавыя пярэвіткі, і ўсякая іншая драбяза.

Лаўрэн грэе над вадой старэчыя рукі і, уладзіўшыся над узятым з чоўна сене, пазірае ўздоўж рачных берагоў, углядаецца ў запаленыя семафоры. Чырвоныя і белыя, мільгацяць яны ў загусцелай цемені ночы і адсвечваюць то пырскамі, то дрыготкімі круцёлкамі на цёмнай вадзе. Лаўрэн глядзіць і ўздыхае. Прызвычаіўся ўжо так. Гляне на што – уздыхне, падумае – уздыхне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Міхась Лынькоў . “На чырвоных лядах”.

* Патлумачце значэнне слоў *човен, кнот, цяпельца, цюльпак, пярэвіткі, выспачка*, карыстаючыся тлумачальнымі слоўнікамі.

3. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце правапіс прапушчаных арфаграм і пунктаграмы, сфармулюйце правілы.

Па глыбіні псіхалагічных дaслед(ава, ва)нняў чалавечай душы Кузьму Чорнага адны параўноўваюць з Дастаеўскім іншыя з Бальзакам славутым французскім піс…меннікам. Яшчэ ў 30-я гады беларуская крытыка выказвала меркаванне што задуманая серыя раманаў Чорнага пра гістарычны шлях беларусаў “ад паншчыны да нашых дзён” у (А, а)йчыннай літаратуры можа стаць з’явай не мен…ш прыкметнай чым вядомыя творы Бальзака з серыі “Чалавечая камедыя”.

Чорны разумеў што паставіў перад сабою н…простую задачу якая вымушае што/дзё(н, нн)ай карпатлівай працы. Але працаваць ён сын бедных сялян быў прывучаны з маленства. Больш таго, ад продкаў перадалося яму жаданне любую работу выкон(ыва, ва)ць так каб не было сорамна перад людз…мі. Дзед піс…менніка Міхал Парыбак якога ў вёсцы клікалі Чорны (вось адкуль псеўданім творцы, а сапраўднае імя і прозвішча яго, як вядома, Мікалай Карлавіч Раманоўскі) цудоўна ведаў ткацкае рамяство яго сурвэткі высока цаніў сам князь Радзівіл. Пра такіх як бацька Мікалая Карлавіча гавораць майстар на ўсе рукі. Ён быў і цеслем і шаўцом і краўцом. Дарэчы сам Чорны ўжо ў дзяцінстве здзіўляў бацькоў сваімі акцёрскімі здольнасцямі уменнем добра маляваць і іграць на розных музычных інструментах.

І ўсё ж прага да літаратурнай творчас…ці перамагла ўсе іншыя захапленні.

Алесь Бадак. “Чалавечая драма” Кузьмы Чорнага”.

* Падбярыце сінонімы да слова *карпатлівы*. Растлумачце значэнне слова *цесля*.

4. Запішыце тэкст пад дыктоўку ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыіі. Растлумачце правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

А ў календарах і на Беларусі – восень… Апалае лісце і дажджыстыя дні… Калісьці пяцьдзясят гадоў таму гэтай парою ў палескай вёсачцы на Берасцейшчыне нарадзілася дзяўчынка Жэня, якой наканавана было стаць выдатнай беларускай паэткай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Жэня Янішчыц заўсёды ішла на голас Ліры, і ён, гэты голас, чуўся ёй то з роднага Палесся (і ніхто пра Палессе, пра тамтэйшых людзей так прыгожа-высока не змог расказаць, як расказвала, апявала яна ў сваіх вершах); то раптам гэты голас кратаў нейкія вельмі таемныя струны, і тады Жэня пісала вершы пра каханне – гарачае, трапяткое, а найчасцей такое, калі “смяюцца вочы, поўныя святла, а на губах – гарчавінка самоты”. Яе лірычны радок праткäны праз усю беларускую паэзію залатою ніткаю. І ўжо немагчыма ўявіць нашу літаратуру без імя Яўгеніі Янішчыц. Свой творчы шлях яна распачала кніжкаю “Снежныя грамніцы”, якая засведчыла, што ў беларускую паэзію прыйшоў моцны, надзвычай пранікнёны светлы голас.

Раіса Баравікова. “Ластаўка вясны”.

* Растлумачце значэнне слоў *тамтэйшы*, *грамніцы*, *ліра*. Як вы разумееце выраз *расказаць прыгожа-высока* ?

5. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце правапіс прапушчаных арфаграм і пунктаграмы, сфармулюйце правілы. Лічбы запішыце словамі.

Зусім не/аспрэчваючы мудрага (Г, г)ётаўскага сцв…рджання (хто хоча зразумець паэта, павінен пабываць у паэтавым краі), каб зразумець Паэта я мусіў пабываць у краі для яго чужым дзе ён памёр і пахаваны. Можа таму, што жыццё гэтага генія ад пачатку і да канца складзена з загадак якія ўжо даўно разгад(ыва, ва)юць і будуць яшчэ доўга разгад(ыва, ва)ць уседлівыя дасле…чыкі і проста зацікаўл…ныя людзі. Такое кароткае жыццё і такія доўгія пошукі разгадак…

У чэрвені 1975 года пашэнціла мне на добрую паўднёвую дарогу якая і прывяла ў найсонечную Ялту шчаслівае ластаўчына гняздзечка ўсіх аматараў а…пачынку. Рамантычных зваб прыўзнёслых а…чуванняў у б…стурботным (Я, я)лцінскім абсягу было аж залішне. Пяшчотны прасвечаны да самага дна блакіт мора і мяккі духмяны водар паветра, настоены на чыстым дыханні багатай горнай раслі(н, нн)асці, усё гэта нагад(ыва, ва)ла нейкае незвычайнае блакітнае варыва якое хтос…ці прыправіў самымі экзатычнымі зёлкамі. Усё вабіла і чаравала асабліва тых хто можа ў/першыню бачыў само мора.

Сапраўдныя свае звабы мора здольнае паказаць толькі над/вечар калі прыстынуць берагавы жвірок і каменне падыме свае крылы вецер/свяжак і ў сінявата/чырвоным паўзмроку ра…плывуцца і згладзяць свае абрысы далёкія і блізкія вяршыні гор. Такой парой я пакідаў свой утульны пакойчык (Д, д)ома творчасці імя Чэхава і пакручастай сцяжынай спускаўся з гары каб пабыць сам/насам з морам.

Казімір Камейша. “Пад пошум хваль, ля сіняй бухты…”.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

***** Патлумачце значэнне слоў *звабы, зёлкі.* Падбярыце сінонім да слова *пакручасты*. Пра якога паэта ідзе гаворка ў тэксце? Чаму аўтар ужывае слова *Паэт* з вялікай літары?

6. Запішыце тэкст пад дыктоўку ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Растлумачце правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку. Лічбы запішыце словамі.

Далёкае XII стагоддзе не данесла шмат інфармацыі пра сябе. Летапісцы занатоўвалі толькі самае важнае, значнае. Трэба было быць вельмі неардынарнаю, цікаваю асобаю, каб пра цябе напісалі хоць некалькі радкоў. Мабыць, Ефрасіння Полацкая зрабіла шмат добрага Полацкай зямлі, калі пра яе напісалі кнігу, поўную шчырай любові і павагі. Хоць твор гэты і адносіцца да царкоўна-рэлігійнай літаратуры, дзе на чалавека як на асобу мала звярталася ўвагі, а на першы план ставілася яго поўная адданасць Богу, усё ж такі ў "Аповесці жыцця і смерці Ефрасінні Полацкай" вельмі яскрава выяўляецца вобраз галоўнай гераіні. Ефрасіння – не толькі аскетычка, жыццё якой прайшло ў пастах і малітвах, Ефрасіння яшчэ і вельмі моцная жанчына, якая выконвала ўсе пастаўленыя перад сабой мэты. Вырашана стаць манахіняй – стала, вырашана пабудаваць храм – пабудавала, вырашана пайсці ў Іерусалім – і гэта зрабіла. Не пабаюся сказаць, што лічу яе сілу волі як дух мацнейшым за дух любога полацкага князя тых гадоў. Да таго ж гэтая жанчына была вельмі адукаваная: у гісторыі Еўропы таго часу вы, бадай, не знойдзеце жанчын з такімі ж ведамі, як у Ефрасінні.

Марыя Шахаўцова. "…Для ўсіх была ўсім…".

***** Падбярыце сінонімы да слова *неардынарны*. Да якога тыпу маўлення належыць тэкст? Дакажыце сваю думку.

7. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце правапіс прапушчаных арфаграм і пунктаграмы, сфармулюйце правілы.

Не будзе перабольшваннем сказаць што яшчэ і цяпер творчасць Купалы і Коласа вывучаецца ў школе крыху аднабакова. А між тым творчасць кла(сс,с)ікаў разнастайная – скажам, якая шырокая і глыбокая (К, к)упалава лірыка альбо філасо…ская паэзія, што све…чаць пра багаты духоўны свет як аўтара, так і яго герояў! Праўда Коласу, бадай, пашанцавала больш – асабліва з вывучэннем яго паэмы "Новая зямля". Гэты твор перажыў многія тагачасныя і пазнейшыя крытычныя наскокі н…ўхільна сц…вердзіўся ж…мчужынай (К, к)оласавага паэтычныга плёну і ўсёй беларускай літаратуры энцыклапедычна адлюстраваў жыццё побыт духоўны свет

тагачаснай вёскі і часткова горада натхніў да далейшага глыбейшага развіцця нашу прозу. Так, так, прозу бо ў “Новай зямлі” (ў, у)дала спалучыліся паэзія і проза ярка даследавана пэўная эпоха чалавечы свет з зямлёй і космасам. Пазнейшая проза не магла і цяпер не можа  не ўлічыць (К, к)оласавай лірыкі і натуральнай заземленасці мастацкай дэталізацыі эстэтычна-філасофскага заглыблення ў асэнсаванні жыццёвых з’яў сацыяльных пераўтварэнняў і ўнутранага чалавечага свету. Не/выпадкова ж не толькі нашы паэты але і празаікі гэтак любяць “Новую зямлю”: яна такая адзіная і непаўторная, не/выпадкова ж сын беларускай зямлі касманаўт Пётр Клімук узяў яе з сабой у высокае неба!

Генрых Далідовіч. “Новы Колас”.

* Растлумачце значэнне слоў *класік, лірыка*. Вызначце, да якога тыпу маўлення належыць тэкст.

8. Запішыце тэкст пад дыктоўку ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Растлумачце правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Аўтастоп, або з англійскай “хіч-хайкінг”, – гэта вандроўкі па свеце на хоць-якім спадарожным транспарце: на аўтамабілях, цягніках, самалётах, лакаматывах, вазах, – увогуле на ўсім, што рухаецца ў патрэбным кірунку – са згоды кіроўцы ці гаспадара транспартнага сродку. Для адных аўтастоп – гэта нязручны і небяспечны спосаб перамяшчэння, звязаны з нудотным стаяннем на дарозе з узнятай рукой, з начлегам у спальніку “ў лесе пад кустом”, непаўнавартасным і несвоечасовым харчаваннем ды з неабходнасцю прыстасоўвацца да розных абставін. А для іншых аўтастоп – гэта захапляльныя прыгоды, у якіх само паняцце “дарога” набывае надзвычайны сэнс. Калі можна ўпэўніцца, што шанцаванне – гэта дыягназ, што ўсё, што адбываецца з вамі ў дадзены момант у дадзеным пункце прасторы сапраўды не/паўторна і ніхто не здольны паўтарыць ваш шлях пасля вас. І ўсе згодны з тым, што аўтастоп – найлепшая і найтаннейшая магчымасць пабачыць свет.

Крысціна Карчэўская. “Аўтастоп, ці як вандраваць, не марнуючы грошай”.

* Вызначце, да якога тыпу маўлення і стылю належыць тэкст. Дакажыце сваю думку.

9. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце правапіс прапушчаных арфаграм і пунктаграмы, сфармулюйце правілы.

Як адзначаюць дасле...чыкі лірычнай паэзіі, (не, ня)/гледзячы на тое, што яе аснову складаюць вобразы/перажыванні лірычная паэзія не можа абмяжоўвацца адлюстраваннем толькі суб...ектыўнага свет...: у рэальным жыцці немагчыма а...дзяліць тыя прадметы і з...явы знешняга свет... якімі гэтыя перажыванні выкліканы. А...сюль узнікае неабходнасць увесці ў склад лірычнага верш... элементы прадметна/рэчыўнага свет... і іх слоўна/моўныя адзінкі. Таму тыповая мадэль лірычнага верш... ўключае ў свой склад тры асноўны... кампанент... р...альны свет пачуццё і паэтычную думку. Пры гэтым думка як бы падводзіць вынік аўтарскай р...флексіі і змя...чаецца як правіла у канцы верш... або страфы – утвараецца лірычны сюж...т створа(н, нн)ы перапляценнем трох кампанентаў з іх бясконца/зменлівымі не/прадбача(н, нн)ымі с...адносінамі.

П...йзажныя ...образы ў лірыц... моцныя сро...кі выражэння нацы...нальна/патры...тычных пачуццяў бо кожны паэт адухо...лены любо...ю да прыроды якая з...яўляецца неад...емнай часткай яго Радзімы.

Міхась Цікоцкі. “Урокі моўнага майстэрства”.

***** Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце адказ. Патлумачце значэнне слова *р...флексія* і выразаў *слоўна/моўныя адзінкі, вобразы-перажыванні, лірычны с...жэт*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10. Запішыце тэкст пад дыктоўку згодна з правіламі беларускай арфаграфіі і пуктуацыіі. Растлумачце правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Плён працы Аркадзя Наркевіча прарос добрым зернем: сваім спадчыннікам ён пакінуў амаль чатырыста прац. Яны знітоўваюцца ў адну вялікую кнігу, што паўстае перад пакаленнямі велічным гмахам вучонасці, навуковай руплівасці і дбайнасці, але зайсці ў які наканавана не кожнаму. Толькі таму, хто мае ўлюбёнасць у слова, хто дасягнуў адчування сваёй Айчыны, мовы, раскрыецца гэтая скарбніца Наркевічавых думак і памкненняў. А значыць, ён працаваў на сёння і на будучае.

Колькі журналістаў прайшло праз яго добразычлівасць, чуласць, розум і сабраную, здаецца, з крыніц роднай Капыльшчыны прафесарскую інтэлігентнасць, вытрымку і талерантнасць! Дзе ёсць газета, часопіс, рэдакцыя, там жывуць яго словы, загартоўваецца моц беларускага інтэлекту, развіваецца спадчына беларускай журналістыкі.

Віктар Іўчанкаў. “Мовазнаўчая спадчына прафесара Наркевіча”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***** Падбярыце сінонімы да слоў *руплівасць*, *талерантнасць*, а таксама антонімы да слоў *чуласць*, *вытрымка*. Патлумачце значэнне выразу *ён працаваў...на будучае*.

11. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце правапіс прапушчаных арфаграм і пунктаграмы, сфармулюйце правілы.

На беларускіх землях вас...мна...атае стаго(дз, ддз)е гэта час войнаў па...ста(н, нн)яў сацы...льных канфліктаў і м...жканф...сі...нальных сутычак але гэта і час этнічнай кансалідацыі беларускага народа абуджэ(н, нн)я цікавасці да яго гісторыі культуры час плё(н, нн)ай творчай дзейнасці многіх нашых з...млякоў. Адным з іх з...яўляецца гісторык і царкоўны дзе...ч Ігнат Кул...чыцкі якога заслужа(н, нн)а называюць першым дасле...чыкам беларускіх старажытнасцей.

(Не, ня)/гледзячы на вялікае значэнне асобы Ігната Кул...чыцкага для беларускай гісторыі сёння яго жыццёвы шлях і творчая спа...чына застаюцца слаба/вывучанымі. У айчы(н, нн)ай гістары...графіі яму прысвечаны адзінкавыя не/вялікія публікацыі не/пазбаўленыя шматлікіх недакладнасцей. Праз не/дастатковае знаёмства беларускіх дасле...чыкаў з замежнай на...уковай літаратурай па/за іх увагай засталася пераважная большасць работ Ігната Кул...чыцкага.

І ...краінскія і польскія дзе...чы лічаць Ігната Кул...чыцкага адным з выдатных дзе...чаў іх культуры. Праведзены аналіз творчай спа...чыны Ігната Кул...чыцкага дазваляе нам звязаць яго асобу з Белару(с, сс)ю, бо ён пра...ставіў самой Еўропе Беларусь край багаты тал...навітымі людз...мі і кул...турнымі помнікамі.

Аляксандр Суша. “Ля вытокаў беларускай гістарычнай навукі: творчая спа...чына Ігната Кул...чыцкага”.

* Вызначце стыль тэксту. Абгрунтуйце адказ. Патлумачце значэнне слоў *м...жканф...сі...нальныя*, *кансалідацыя*, *гістары...графія*. Да якой сферы ўжывання адносяцца гэтыя словы?

12. Запішыце тэкст пад дыктоўку ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктаграфіі. Растлумачце правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Напэўна, шчаслівы той аўтар, калі чытач ці глядач пасля знаёмства з яго творамі адчувае раптам у сабе неспадзеўнае трапяткое хваляванне, калі ў памяці, нібы на палатне пацямнелага ад часу экрана, пракручваюцца кадры нечага свайго, патаемнага, разбудзіўшы пачуцці і ўспаміны, а лёсы герояў гэтых твораў стануць неабыякавымі табе.

Проза Васіля Ткачова даўно стала адметнай з'явай у нашай літаратуры. Не ўсе яго героі – анёлкі, не ва ўсіх склалася жыццё так, як хацелася б, але ўсе яны – людзі, і ва ўсіх свой унутраны свет, свая душа, у якой, нягледзячы на ўсе супярэчнасці і выбрыкі лёсу, не згасаюць іскрынкі чалавечнасці, дабрыні, спагаднасці, часам ужо змяльчэлай, прыглухлай ад няўмольнай рэчаіснасці, але годнай, вартай прыстойнага стаўлення да сваёй асобы.

Мікола Чарняўскі. "Да людзей з любоўю ідучы..."

***** Знайдзіце ў тэксце вобразныя сродкі мовы і ахарактарызуйце іх. З якой стылістычнай мэтай яны ўжыты?

13. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце правапіс прапушчаных арфаграм і пунктаграмы, сфармулюйце правілы.

Падарожнічаць можна па/рознаму. Тра...ыцыйна гэта як вядома робіцца так бярэцца білет на пэўны від транспарт... і калі ласка ў дарогу. Вядома гэта зручна аднак ты прывяза(н, нн)ы да пэўнага маршрут... і не мож...ш спыніцца там дзе захацелася б. Куды зручней калі едз...ш на ўласным аўтамабіл... ці скажам на велас...педзе. А пешая прагулка хоць і марудная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыносіць куды больш задавальнення што хоч...ш тое і пабач...ш з кім захоч...ш з тым і сустрэне...ся. Гэта падарожжа р...альнае бо з адрывам ад дом... у якім жывеш з разлукай няхай і на пэўны час з блізкімі табе людз...мі са зменай звыклых а...ставін.

Калі ж падарожнічаць за...очна то ўсё можна спалучыць. Такое ма...чыма дзякуючы гісторыка/кра...знаўчым дакументальным фільмам навукова/пазнавальным т...л...візійным перадачам бо тое што гучыць па рады... усё ж пазбаўле(н, нн)а візу...льнасці а нездарма кажуць лепш адзін раз убачыць чым сем... разоў пачуць.

Алесь Марціновіч. “Хараство блізкіх дарог”.

* Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце адказ. Падбярыце сінонімы і антонімы да слоў *марудная*, *р...альнае*, *разлука*.

14. Запішыце пад дыктоўку, растлумачце правапіс толькі падкрэсленых арфаграм.

Холад, халадэча, этыкет, брысці, кап’ютар, цёплы, цеплыня, Еўропа, тысяча, без меры, радыёантэна, радыеметрычны, высокаідэйны, легкадумны, вадасховішча, звышімклівы, падыдзеш, зайграць, пераігрыванне, панісламізм, аўра, аул, ноу-хау, лаўка, каля урны, дождж, рубчык, малодшы, айсберг, поезд, коласаўскія мясціны, Коласаўскія чытанні, Уладыка Нябесны, крый бог, фея, імпрэсарыа, Юпітэр, лідар, ерэтык, дзесятковы, без жартаў, агорафобія, Вадохрышча, прыборабудаўнічы, прыймальны, адысці, раўнд, Ландау, экзамен, берагчы.

* Растлумачце значэнне слоў *ноу-хау*, *агорафобія*. З 3 словамі (на выбар) складзіце і запішыце сказы.

15. Спішыце словы (спалучэнні слоў), устаўляючы патрэбныя літары. Растлумачце правапіс арфаграм.

Р…чны, р…чанька, партфолі(а, о), кр…шаны, фламаст…р, к…раміка, дз…сятка, н(е, я) б(е, я)з прычыны, мес…ц, рады(е, я)графія, рады(е, я)ізатоп, ф…ндасховішча, раб…тадавец, в…лікасвецкі, В…лікабрытанія, рацы(ё,о)н, ажы(я, а)таж, аві(я, а)цыя, інвары(я ,а)нт, бі(ё, о)лаг, суб(і, ы)нтэндант, за(і, й)кацца, пера(і, й)грываць, без(і, ы)дэйнасць, па(в/ )ук, (в/ )унікум, ці(в/ )ун, (в/ )устрыца, (В/ )Ушачы, а(у, ў)дыторыя, ба(у, ў)л, а(у, ў)каць, кансілі(у, ў)м, со(у,

ў)с, для (у, ў)збекаў, ва (У, Ў)збекістан, А…ганістан, пераво…чык, роўня(дзь, ць), чыс(ц, т)юткі, мун(дз, д)ір, (дз, д)юны, бар(дз, д)юр, Гаі(ц, т)і, навако(лл, л)е, Сюза(н, нн)а, выя(здн, зн)ы, фарпо(стн, сн)ы, ліпен…скі, (А, а)нёл.

***** Складзіце сказы са словамі *ажы(я, а)таж*, *ба(ў, у)л*, *(дз, д)юны*.

**Даведка**

1. Мартын Рыль ехаў са стрэльбай на чоўне ўскрай Прыпяці. Ён туліцца бліжэй да чаротаў, каб спрытней падкрасціся да дзікіх качак. Яму пашчаслівілася настраляць іх штук пяць. З таго боку Прыпяці шыбуе човен. На носе чоўна ляжыць зялёная вязка свежай травы і ёмкі сноп пышнага кучаравага чароту. На чоўне бялее гнуткая, руплівая дзявочая постаць у чырвонай хустачцы, завязанай канцамі назад. Спрытна мільгае вясло ў яе пругкіх руках, і човен борзда і роўна слізгаціць па шырокім лоне спакойнай Прыпяці. Мінуўшы сярэдзіну рэчкі. човен крута верне ў бок Мартына. Мартын сумыслу едзе павольна і пільна ўзіраецца ў затокі, дзе любяць жыраваць качкі, і не глядзіць на човен з дзяўчынаю, хоць ужо ведае, хто на ім плыве. Але яму прыемна.

– А я табе ўсіх качак папужаю, -- чуецца малады звонкі дзявочы голас, і следам за гэтым даносіцца яе крык.

Якуб Колас. “Дрыгва”.

3. Па глыбіні псіхалагічных даследаванняў чалавечай душы Кузьму Чорнага адны параўноўваюць з Дастаеўскім, іншыя – з Бальзакам, славутым французскім пісьменнікам. Яшчэ ў 30-я гады беларуская крытыка выказвала меркаванне, што задуманая серыя раманаў Чорнага пра гістарычны шлях беларусаў “ад паншчыны да нашых дзён” у айчыннай літаратуры можа стаць з’явай не менш прыкметнай, чым вядомыя творы Бальзака з серыі “Чалавечая камедыя”.

Чорны разумеў, што паставіў перад сабою няпростую задачу, якая вымушае штодзённай карпатлівай працы. Але ён сын бедных сялян быў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прывучаны з маленства. Больш таго, ад продкаў перадалося яму жаданне любую работу выконваць так, каб не было сорамна перад людзьмі. Дзед пісьменніка Міхал Парыбак, якога ў вёсцы клікалі Чорны (вось адкуль псеўданім творцы, а сапраўднае імя і прозвішча яго, як вядома, Мікалай Карлавіч Раманоўскі), цудоўна ведаў ткацкае рамяство, яго сурвэткі высока цаніў сам князь Радзівіл. Пра такіх, як бацька Мікалая Карлавіча гавораць: майстар на ўсе рукі. Ён быў і цеслем, і шаўцом, і краўцом. Дарэчы, сам Чорны ўжо ў дзяцінстве здзіўляў бацькоў сваімі акцёрскімі здольнасцямі, уменнем добра маляваць і іграць на розных музычных інструментах.

І ўсё ж прага да літаратурнай творчасці перамагла ўсе іншыя захапленні.

Алесь Бадак. “Чалавечая драма” Кузьмы Чорнага”.

5. Зусім не аспрэчваючы мудрага гётаўскага сцверджання (хто хоча зразумець паэта, павінен пабываць у паэтавым краі), каб зразумець Паэта, я мусіў пабываць у краі для яго чужым, дзе ён памёр і пахаваны. Можа таму, што жыццё гэтага генія ад пачатку і да канца складзена з загадак, якія ўжо даўно разгадваюць і будуць яшчэ доўга разгадваць уседлівыя даследчыкі і проста зацікаўленыя людзі. Такое кароткае жыццё і такія доўгія пошукі разгадак…

У чэрвені 1975 года пашэнціла мне на добрую паўднёвую дарогу, якая і прывяла ў найсонечную Ялту, шчаслівае ластаўчына гняздзечка ўсіх аматараў адпачынку. Рамантычных зваб, прыўзнёслых адчуванняў у бестурботным ялцінскім абсягу было аж залішне. Пяшчотны, прасвечаны да самага дна блакіт мора і мяккі, духмяны водар паветра, настоены на чыстым дыханні багатай горнай расліннасці, – усё гэта нагадвала нейкае незвычайнае блакітнаеварыва, якое хтосьці прыправіў самымі экзатычнымі зёлкамі. Усё вабіла і чаравала асабліва тых, хто можа ўпершыню бачыў само мора.

Сапраўдныя свае звабы мора здольнае паказаць толькі надвечар, калі прыстынуць берагавы жвірок і каменне, падыме свае крылы вецер-свяжак і ў сінявата-чырвоным паўзмроку расплывуцца і згладзяць свае абрысы далёкія і блізкія вяршыні гор. Такой парой я пакідаў свой утульны пакойчык Дома творчасці імя Чэхава і пакручастай сцяжынай спускаўся з гары, каб пабыць сам-насам з морам.

Казімір Камейша. “Пад пошум хваль, ля сіняй бухты…”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

7. Не будзе перабольшваннем сказаць, што яшчэ і цяпер творчасць Купалы і Коласа вывучаецца ў школе крыху аднабакова. А між тым творчасць класікаў разнастайная – скажам, якая шырокая і глыбокая Купалава лірыка альбо філасофская паэзія, што сведчаць пра багаты духоўны свет як аўтара, так і яго герояў! Праўда, Коласу, бадай, пашанцавала больш – асабліва з вывучэннем яго паэмы “Новая зямля”. Гэты твор перажыў многія тагачасныя і пазнейшыя крытычныя наскокі, няўхільна сцвердзіўся жамчужынай Коласавага паэтычныга плёну і ўсёй беларускай літаратуры, энцыклапедычна адлюстраваў жыццё, побыт, духоўны свет тагачаснай вёскі і часткова горада, натхніў да далейшага, глыбейшага развіцця нашу прозу. Так, так, прозу, бо ў “Новай зямлі” ўдала спалучыліся паэзія і проза, ярка даследавана пэўная эпоха, чалавечы свет з зямлёй і космасам. Пазнейшая проза не магла і цяпер не можа не ўлічыць Коласавай лірыкі і натуральнай заземленасці, мастацкай дэталізацыі, эстэтычна-філасофскага заглыблення ў асэнсаванні жыццёвых з’яў, сацыяльных пераўтварэнняў і ўнутранага чалавечага свету. Невыпадкова ж не толькі нашы паэты, але і празаікі гэтак любяць “Новую зямлю”: яна такая адзіная і непаўторная, невыпадкова ж сын беларускай зямлі, касманаўт Пётр Клімук, узяў яе з сабой у высокае неба!

Генрых Далідовіч. “Новы Колас”.

9. Як адзначаюць даследчыкі лірычнай паэзіі, нягледзячы на тое, што яе аснову складаюць вобразы-перажыванні, лірычная паэзія не можа абмяжоўвацца адлюстраваннем толькі суб’ектыўнага свету: у рэальным жыцці немагчыма аддзяліць тыя прадметы і з’явы знешняга свету, якімі гэтыя перажыванні выкліканы. Адсюль узнікае неабходнасць увесці ў склад лірычнага верша элементы прадметна-рэчыўнага свету і іх слоўна-моўныя адзінкі. Таму тыповая мадэль лірычнага верша ўключае ў свой склад тры асноўныя кампаненты: рэальны свет, пачуццё і паэтычную думку. Пры гэтым думка як бы падводзіць вынік аўтарскай рэфлексіі і змяшчаецца, як правіла, у канцы верша або страфы – утвараецца лірычны сюжэт, створаны перапляценнем трох кампанентаў з іх бясконца зменлівымі, непрадбачанымі суадносінамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пейзажныя вобразы ў лірыцы – моцныя сродкі выражэння нацыянальна-патрыятычных пачуццяў, бо кожны паэт адухоўлены любоўю да прыроды, якая з'яўляецца неад'емнай часткай яго Радзімы.

Міхась Цікоцкі. "Урокі моўнага майстэрства".

11. На беларускіх землях васямнаццатае стагоддзе – гэта час войнаў, паўстанняў, сацыяльных канфліктаў і міжканфесіянальных сутычак, але гэта і час этнічнай кансалідацыі беларускага народа, абуджэння цікавасці да яго гісторыі, культуры, час плённай творчай дзейнасці многіх нашых землякоў. Адным з іх з'яўляецца гісторык і царкоўны дзеяч Ігнат Кульчыцкі, якога заслужана называюць першым даследчыкам беларускіх старажытнасцей.

Нягледзячы на вялікае значэнне асобы Ігната Кульчыцкага для беларускай гісторыі, сёння яго жыццёвы шлях і творчая спадчына застаюцца слаба вывучанымі. У айчыннай гістарыяграфіі яму прысвечаны адзінкавыя невялікія публікацыі, не пазбаўленыя шматлікіх недакладнасцей. Праз недастатковае знаёмства беларускіх даследчыкаў з замежнай навуковай літаратурай па-за іх увагай засталася пераважная большасць работ Ігната Кульчыцкага.

І ўкраінскія, і польскія дзеячы лічаць Ігната Кульчыцкага адным з выдатных дзеячаў іх культуры. Праведзены аналіз творчай спадчыны Ігната Кульчыцкага дазваляе нам звязаць яго асобу з Беларуссю, бо ён прадставіў самой Еўропе Беларусь – край, багаты таленавітымі людзьмі і культурнымі помнікамі.

Аляксандр Суша. "Ля вытокаў беларускай гістарычнай навукі: творчая спадчына Ігната Кульчыцкага".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

13. Падарожнічаць можна па-рознаму. Традыцыйна гэта, як вядома, робіцца так: бярэцца білет на пэўны від транспарту і, калі ласка, у дарогу. Вядома, гэта зручна, аднак ты прывязаны да пэўнага маршруту і не можаш спыніцца там, дзе захацелася б. Куды зручней, калі едзеш на ўласным аўтамабілі ці, скажам, на веласіпедзе. А пешая прагулка, хоць і марудная, прыносіць куды больш задавальнення: што хочаш, тое і пабачыш, з кім захочаш, з тым і

сустрэнешся. Гэта падарожжа рэальнае, бо з адрывам ад дому, у якім жывеш, з разлукай, няхай і на пэўны час, з блізкімі табе людзьмі, са зменай звыклых абставін.

Калі ж падарожнічаць завочна, то ўсё можна спалучыць. Такое магчыма дзякуючы гісторыка-краязнаўчым дакументальным фільмам, навукова-пазнавальным тэлевізійным перадачам, бо тое, што гучыць па радыё, усё ж пазбаўлена візуальнасці, а нездарма кажуць: лепш адзін раз убачыць, чым сем разоў пачуць.

Алесь Марціновіч. "Хараство блізкіх дарог".

15. Рачны, рэчанька, партфоліа, крышаны, фламастар, кераміка, дзясятка, не без прычыны, месяц, радыяграфія, радыеізатоп, фондасховішча, работадавец, велікасвецкі, Вялікабрытанія, рацыён, ажыятаж, авіяцыя, інварыянт, біёлаг, субынтэндант, заікацца, пераігрываць, безыдэйнасць, павук, унікум, цівун, устрыца, Ушачы, аўдыторыя, баул, аукаць, кансіліум, соус, для ўзбекаў, ва Узбекістан, Афганістан, перавозчык, роўнядзь, чысцюткі, мундзір, дзюны, бардзюр, Гаіці, наваколле, Сюзанна, выязны, фарпосны, ліпеньскі, анёл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Навучальныя папераджальныя дыктанты

1. Прачытайце тэкст. Назавіце прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Сфармулюйце правілы. Спішыце тэкст, афармляючы ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

Дзесяць гадоў таму назад у Вепрах не было дзяўчыны цікавейшай за Аўгіню цяпер войтаву жонку. В…сёлая жывая дураслівая, свавольніца і першая штукарка на розныя забаўкі і выдумкі – вось якая была Кублікавых Аўгіня. Любіла яна і з дз…цюкамі пажартаваць ды жартавала так што кожнаму з іх здавалася нібы ён і ёсць той на кім запыніла яна сваю дз...вочую ласку.

“Нарвецца дзяўчына” казалі пра яе сталыя жанкі і маладзіцы калі гутаркі пра яе дурас…ці даходзілі да іх вушэй. Аўгіня жартаваць жартавала але граніц у сваіх дурас…цях не/пераступала. Умела быць яна сталаю і сур…ёзнаю і вочы яе цемнаватыя як лёгкі змрок ясных чэрвен…скіх вечароў пазіралі тады строга і ўдумліва. І цяжка было адзначыць колер гэтых вачэй што свяціліся як дз…ве роўныя, прадаўгавата/круглыя ямінкі\багны на цёмным балотным дне ў роспісе пышных раслін. Іх можна было ўспрымаць як карыя вочы чуць/чуць пацягнутыя зелянкаваю павалокаю а часамі яны здаваліся шэравата/зялёнымі. Можа проста мяняліся яны ў залежнасці ад тых думак ад тых маладых мар што поўнілі дз…вочую галаву і гушкалі яе сэрца ў той ці іншы час. Адно можна сказаць пра іх яны вабілі – вось як вабіць воля і радасныя прасторы вясны поўныя музыкі звону і шуму жыцця і зацягвалі як на…рэчная дрыгва дзе звадлівым шэптам гамоняць высокія шумлівыя чароты і пахучы яер.

Якуб Колас. “Дрыгва”.

***** Растлумачце значэнне слова *войт, зелянкавы*. Адкажыце, якому тыпу маўлення адпавядае прапанаваны тэкст (апісанню, апавяданню ці разважанню). На якія структурныя часткі падзяляецца тэкст, пра што гаворыцца ў кожнай частцы? Падбярыце да тэксту загаловак. Якія вобразныя сродкі ўжыты ў тэксце?

2. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы ў адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

Была ціхая летняя раніца. Сонца яшчэ не/паспела забрацца высока і пераліваласся міл…ёнамі аген…чыкаў у роснай мураве, на палянах, пабліск(ава, ва)ла на вільготным лісці бяроз ра(с, сс)ыпалася залацістымі плямамі праз лапкі галін праз кучомістыя верхавіны хвой. І калі трапляла сонца на спелыя ягады маліны яны гарэлі як камні-самацветы. І пах ад іх ішоў далёка/далёка, праз лес праз балота, да самае лесавое дарогі. Ягады пахлі летам сонцам з…лёнаю муравою палян, ды чым толькі яны (не, ні пахлі) ! Знай толькі адно еш, не лянуйся! І Мішка [медзведзяня] стараўся. Спачатку абскубаў ягады лапай еў хапаўся соп, набіваў повен рот малінай разам з лісцем з маленькімі мурашкамі з не/даспелымі ягадамі. Калі ж наеўся стаў больш пераборлівым стаіць прыглядаецца самую спелую ягадзіну выглядае. Выгледзіць маліну на якой сонца больш пераліваецца і нацэліцца паважна языком старанна зліжа ягадзіну і вочы прыжмурыць ад вялікага задавальне(н, нн)я.
Вялікі ласун быў Мішка!

Міхась Лынькоў. “Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

* Адкажыце, якому тыпу маўлення адпавядае тэкст (апісанню, апавяданню ці разважанню). Якія вобразныя азначэнні ўжыты ў тэксце? Патлумачце значэнне слоў *мурава, кучомісты.*

3. Прачытайце тэкст. Назавіце прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Сфармулюйце правілы. Спішыце тэкст, афармляючы згодна з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

Той асе(н, нн)і дзень быў цёплы і пахмурны. Лісце ляжала пад нагамі тоўстым стракатым дываном і нам з сябрам добра было хадзіць па ім варушыць лістоўныя сумёты нагамі і а…чуваць сябе бязбожна шчас…лівымі нягледзячы на лёгкі сум. Таму што мы былі ў Залессі былым маёнтку славутага Міхала Кляофаса Агінскага “паўночных (А, а)фінах” як называлі гэты кут сучаснікі.

Залессе адна з самых паэтычных мясцін нашай радзімы а восень надавала ўсяму што мы бачылі вакол лёгкую пацiну чысціні празрыстас…ці і журбы.

Магутныя прысады клёнаў і ліп ішлі да Віллі туліўся ў зарас…ніках старажытны цёплы дом са свечкамі калон ртутна св…ціліся ставы ручай імкнуў праз грэблю. І ва ўсім што вакол была музычнасць ціхая песня: у плёску вады ў шолаху лісця ў парывах ветру які гайдаў палын на мяжы.

Ёсць м…лодыі якія чуеш так часта што пачынаеш грэбаваць імі. Але колькі б ты (не, ні)слухаў палан…зы Агінскага а асабліва вялікі палан..з ля-мінор (“Развітанне з радзімай”) – ён  застанецца блізкі і дарагі твайму сэрцу будзе закранаць у ім самыя глыбі(н, нн)ыя, самыя свае струны.

Уладзімір Караткевіч. “Песня з паўночных Афін”.

* Патлумачце значэнне слоў *пацiна, ставы, грэбаваць*. Назавіце метафары, ужытыя ў тэксце.

4. Прачытайце тэкст. Назавіце прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Сфармулюйце правілы. Спішыце тэкст, афармляючы згодна з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

Постаць творцы класічнага беларускага харавога мастацтва знакамітага збірал…ніка даследчыка і прапагандыста помнікаў традыцыйнай культуры беларусаў літаратара культурна/грамадскага дзеяча Рыгора Раманавіча Шырмы пэўна можа быць названа знакавай. Па…ставай такога высокага азначэння яго жыццё ў мастацтве харавога спеву этнамузакалогіі культурна/грамадскай сферы.

Заснаванай і пеставанай без мала паўвека Рыгорам Раманавічам Шырмам (Б, б)еларускай (А, а)кадэмічнай кап…лай былі падараваны суайчы(н, нн)ікам і свету ў найгустоўнейшай трактоўцы маэстра дз..сяткі твораў (Е, е)ўрапейскай музычнай класікі сотні беларускіх народных песен… данес(ен, ян)ых да слухача беражліва з глыбі(н, нн)ым адчуваннем іх н..ўміручай красы. Да

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыходу Р.Р. Шырмы харавая культура на Беларусі такой мастацкай вышыні не/дасягала ніколі.

Агульнавядома, справай жыцця Р.Р. Шырмы як фальклрыста/збіральніка публікатара і дырыжора было практычнае выяўленне багацця душы беларускага народа. Перш/наперш для яго духоўнага самасцвярджэння а ў стратэгічным плане – для станаўлення прафесійнай беларускай музыкі на трывалых асновах нацыянальнага меласу.

Арсень Ліс. “Рыгор Шырма: віленскі час”.

*** Карыстаючыся слоўнікам, патлумачце значэнні слоў *этнамузыкалогія, кап…ла*, *мелас*. Вызначце сферу ўжывання названых слоў.

5. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

У тую (ў, у)рачыстую пера…святочную ноч у глыбінях (Г, г)алактыкі акурат над Завоссем успыхнула калядная зорка Паэта.

Дата яго нараджэ(н, ння) цяпер значыцца ў кал…ндары UNESKO бо ён Адам Міцкевіч – сусветна/вядомы творца бо ягоны ўнёсак у культуру і асвету дужа важкі гуманістычныя ідэі якімі прасякнута ўся яго літаратурная спадчына працягваюць служыць дабру прагрэсу краса яго высокай шчымліва/праніклівай паэзіі ў розных кутках свету зачароўвае тых хто любіць мастацкае слова.

Духоўная постаць Адама Міцкевіча заўсёды была і застаецца надта прыкметнаю ў сферы прыгожага піс…менства і прывабнаю. Яго любілі і любяць шанавалі і шануюць розныя народы а заўважалі і заўважаюць найперш іх вялікія сыны. Вельмі высока яго цаніў знакаміты творца палымяны патрыёт Украіны Іван Франко. Богам называў Міцкевіча ў адным з вершаў Яўгені Баратынскі. Заслужанаю і далёка чутаю славаю Міцкевіч карыстаўся яшчэ ў маладыя гады. Як засве…чылі сучаснікі генія (у прыватнасці – Антоні Эдвард Адынец у яго “Піс…мах з падарожжа”) Аляксандр Пушкін сонца рускай паэзіі на адной з вечарын сваіх усклікнуў узрушаны імправізава(н, нн)ем Міцкевіча Які геній! Які свяшчэнны агонь! Што я побач з ім!

Васіль Жуковіч. “Пад зоркаю каляднаю”.

*** Патлумачце значэнне слоў *(Г,г)алактыка*, *зырка*. Як разумееце выразы *калядная зорка Паэта*, *сфера прыгожага піс...менства*, *шчымліва/праніклівая паэзія*? Падбярыце сінонім да слова *ўнёсак*.

6. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы згодна з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Алесь ішоў высокім берагам возера на якім шумелі кашлатыя хвоі. Белы пясок побліз вады быў затканы зялёнымі верасамі. Дзе/нідзе як волаты ахапіўшы чыгу(н, нн)ым вузлаватым карэннем зямлю стаялі дубы. Магутныя і велічныя постаці іх адбіліся ў люстранай вадзе…

Малюнкі прыроды мяняліся адзін за другім. Толькі што ён захапляўся высокім абрывістым берагам як раптам даро…ка што белая ручаінка пакацілася з у…горка на/ніз і перад вачыма яго развінулася бязмежная сенажаць як разаслаў хто вялізны-вялізны дыван што зліваўся ў/далечыні з блакітным шоўкам чэрвен…скага неба. Дзе/нідзе толькі віднеліся на гэтай неабсяжнай зялёнай роўн…дзі асобныя купкі беланогіх бярозак якія стаялі мясцінамі што тыя дзяўчаты ў карагодзе. Зусім на/доле даро…ку перабягаў невялікі ручай які цурчэў з/пад маладой алешыны што ўзнімалася над чаратамі. Вада была такая чыстая з нейкім крыштал…ным а…ценнем што нават круглыя, гладкія камен…чыкі якія ляжалі на дне ручая здаваліся белымі каралямі. І хоць Алесю у той час не хацелася піць ён нахіліўся і прыемны халадок асвяжыў яго ўсяго. Пасля падняўся далоняю выцер губы а…трос з кашулі празрыстыя кропелькі і а…чуў што прасвятлела ў вачах. Нават лягчэй цяпер ступалі ногі…

Пятрусь Броўка. “Калі зліваюцца рэкі”.

* Патлумачце значэнне слоў *кашлаты*, *каралі, развінуцца*. Якія вобразныя сродкі ўжываюцца ў тэксце? Вызначце, да якога тыпу маўлення належыць тэкст. Дайце тэксту загаловак.

7. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

На зямлі ёсць н…мала цудоўных тварэнняў прыроды якія сталі сімваламі цэлых краінаў. Напрыклад, гара (Ф, ф)удзі ў далёкай Японіі, у суседняй Расіі – рака (В, в)олга, а возера (Б, б)алатон адразу нагадвае пра Венгрыю.

Сімвалам жа нашай Беларусі з’яўляецца (Б, б)елавежская (П, п)ушча – бадай, самы вялікі і стары лясны абшар у (Ц, ц)энтральнай Еўропе дзе захаваліся амаль у н…кранутым стане і гонкія аж да воблакаў бары і магутныя векавыя дубы і светлыя б…розавыя гаі і змрочныя нават у сонечныя дні яловыя не(т, д)ры.

Недарэмна хуткаплы(н, нн)ы час у (Б, б)елавежскай (П, п)ушчы спыніўся каб сівая мінуўшчына сустрэлася з днём сё(н, нн)яшнім і заўтрашнім. Тут на/яву трапляеш у казку легенду паданне тут святлееш душою дабрэеш сэрцам зноў пачынаеш верыць у неспакойны чалавечы розум. Нам пад сілу захаваць гэты цудоўны разнастайны свет для будучых пакаленняў людзей. Кожны раз бываючы ў пушчы я быццам замову шапчу радкі з верша Ларысы Геніюш

Зубр на мох бы ягнё прылёг

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ля бярозаў у белай адзежы
Калі недзе існуе (Б, б)ог
Тут ён пэўна у (Б, б)елавежы.
Уладзімір Ягоўдзік. “(Б, б)елавежская (П, п)ушча”.

* Патлумачце значэнне слоў *не(т,д)ры, замова*. Якому тыпу маўлення адпавядае тэкст? Дакажыце сваю думку.

8. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы згодна з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

Сонца толькі што паказалася з/за сасо(н, нн)іку. Вялікі пунсовы шар імкліва каціўся на/сустрач адзінокай ранішняй хмарцы якая нібы спалохаўшыся што спазнілася хутка падала ў/ніз за далягляд і стаяла там у полымі ўсходу. Полымя гэтае праглынуўшы хмарку паступова бл…днела гасла – ра(с, сс)ейвалася.

Заблішчала раса; пад праменнем сонца маладая рунь і трава сталі алюмініева/белымі, на выгляд – зыркімі і сухімі толькі дзе/нідзе па іх праляглі ярка/зялёныя мокрыя сцежкі – сляды чалавека ці жывёлы. Статак яшчэ быў на выгане каровы прагна хапалі ля агароджы траву незадаволена мычэлі, увішныя цёлкі залазілі ў пасевы. Пастухі крычалі ляскалі пугамі. Радасна віталі новы дзень птушкі звінелі ў вышыні жаваранкі мітусіліся каля шпакоўніц у садах і над стрэхамі шпакі і няспы(н, нн)а лёталі то высока ў небе то над самай з…млёй імклівыя ластаўкі.

Іван Шамякін. “У добры час”.

* Падбярыце сінонімы да слоў *пунсовы*, *зыркі*, *увішны*. Падбярыце да тэксту загаловак. Вызначце стыль тэксту. Абгрунтуйце вывад.

9. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

Дол быў ус…ланы рудым лісцем сухой рыжай папара(ц, цц)ю доўгаю пераблытанаю як іржавы дрот травою друзам збуц…велых галінак. З/пад гэтай перапрэлай за многія гады коўдры сям/там прагляд(ыва, ва)ў бледны як вымачаны мох крывыя сцяблінкі ягадніку. Вострымі зялёнымі шпількамі тырчала маладая травічка.

Дрэвы яшчэ не распусціліся былі брудна/шэрыя і рэзка вырысоўваліся на фоне густой зеляніны маладога ельніку. Вербалоз толькі што ра…пусціў свае каткі, над ім бзынкалі першыя смелыя чмялі. На арэшніку можна было заўважыць на пупышках далікатныя ружовенькія вусікі цвету. Каткі – распушаныя, толькі дакраніся да іх – асыпаліся на зямлю сеючы ледзь

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыкметны пылок. З пупышкаў на бярозе  вось/вось гатовы былі паказацца маладыя лісточкі але бяроза нешта марудзіла – мо чакала пакуль пройдуць в…сеннія такія непатрэбныя але немінучыя халады. Можа гэтую асцярожнасць яна пераняла ад дуба бо той усё (не, ні)як  (не, ні) асмельваўся скінуць сваё старое пажоўклае ўбранне усё чакаў пакуль добра ўгрэе сонца і адыдзе ад холаду карэнне.

Дуб не спяшаўся бо па небе яшчэ снавалі як н…вылінялыя пасля зімы каровы на пашы  непрыветлівыя кудлатыя хмары. З іх на/дол ледзь чутна шапочучы сыпаўся часам дробны як крупы  сн…жок. І тады яшчэ больш цягнула холадам ад сырых лагчын ад зацен(ен, ян)ых густымі елкамі, яшчэ з астаткамі наздраватага лядку, упадзін хоць на дварэ быў ужо канец красавіка.

Уладзімір Дамашэвіч. “Між двух агнёў”.

***** Падбярыце сінонімы да слоў *збуц...велы, далікатны, снаваць, бзынкаць*. Падкрэсліце параўнальныя канструкцыі, ужытыя ў тэксце.

10. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы  згодна з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

Сучасныя дзеці, асабліва гарадскія, амаль адарваныя ад (Б, б)еларускай народнай культуры. У сялянскай хаце аніводная рэч аніводны прадмет убранства ці адзення не мог узнікнуць па/за межамі  традыцыйнага мастацтва. Рушнікі посцілкі сурвэткі фіранкі тканае і аздобленае вышыўкай  а(п, пп)лікацыяй вязанымі карункамі адзенне гліняны посуд ра…пісныя дываны скрыні прыгажосць раз…бы на шафе  калаўроце ці аканіцах кованыя клямкі і завесы саламяныя брылі ці павукі на шчасце пад столлю усё гэта былі высока/мастацкія рэчы а між тым адначасова і звычайныя неабходныя кожны час кожны дзень усё жыццё. Створаныя па строгіх канонах выпрабаваных стагоддзямі яны разам з песнямі казкамі святамі з маленства выхоўвалі густ і пачуццё прыгажос…ці а потым навучалі і саміх дзяцей як зрабіць усё гэта хараство сваімі рукамі.

Беларусам французам эстонцам чалавека робіць асяро(дз, ддз)е – ма…чына мова, бацькава хата, родны горад першая казка кніга лялька.  Ніводны чалавек не народзіцца адразу з пачуццём што ён японец фін або рускі. Менавіта ў дзяцінстве закладаецца падмурак разумення сувязі са сваім народам з пэўнаю часткаю Зямлі – з (Б, б)ацькаўшчынай.

Таццяна Церашковіч. “Лялька беларуская”.

***** Растлумачце значэнне слоў *фіранкі, караўрот, аканіцы, клямка*. Да якога тыпу  маўлення і стылю належыць тэкст? Дакажыце сваю думку.

11. Растлумачце правапіс падкрэсленых арфаграм. Запішыце пад дыктоўку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Колас, калоссе, парэа, ода, ёд, вёска, лядок, яліна, герой, дабрадзей, дабрабыт, добразычлівы, шэравокі, асновапалажэнне, радыёстанцыя, радыеактыўнасць, падысці, прыйсці, безыдэйна, перайсці, на ўвесь голас, з усёй моцы, неба ўлетку, траур, паўза, няма унтаў, шаўковы, рыбка, важкі, хлеб, казка, магчы, даведка, сядзь, вадзяны, ліцвін, дзверы, віцязь, каратэ, Алесеў сад, Божая Маці, барані божа, Багдановічаў зборнік, бальзакаўскі ўзрост, Купалаўская прэмія, купалаўскія вершы, кашнэ, дэфіле.

***** Растлумачце значэнне слоў *дабрадзей*, *ода*, *кашнэ, дэфіле*. Як вы разумееце выраз *бальзакаўскі ўзрост*?

12. Прачытайце словы (спалучэнні слоў, словазлучэнні), называючы патрэбную літару. Растлумачце правапіс, запішыце.

Дапам…жнік, дапам…гчы, ц…мны, ц…мнаваты, в(е, я)сёлы, в…с…лосць, скар…ход, в…гнетрывалы, біблі(о, ё)граф, біблі(а, я)графія, рады…грама, рады…хімія, с…грацьь, за…сці, аб…сці, вы…грацьь, …мклівы, па…мкнуцца, на …льдзіне, …льнозавод, мог (у, ў)зяць, магла (у, ў)зяць, фра(у, ў), на (У, Ў)рале, кла(д, т)ка, ха(дзь, ць)ба, фу…бол, дзя(дз, ц)ька, ха(т, ц)іна, мядзве(дзь, ць), (ц, т)юль, раздаро(ж, жж)а, гру(п, пп)а, прая(здн, зн)ы, кампо(стн, сн)ы, аген…чык, мален…кі, (С, с)карынавы выданні, (Б, б)ожы суд, (А, а)лах з ім, рэзюм…, пік(э, е), (Іа, Іо)ркшыр, (Іа, Іо)ан, на …ржышчы, вакол …ржышча, за…очны, за…азёрны, за…облачны.

***** З 3 словамі (на выбар) складзіце і запішыце сказы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Даведка**

1. Дзесяць гадоў таму назад у Вепрах не было дзяўчыны цікавейшай за Аўгіню цяпер войтаву жонку. Вясёлая, жывая, дураслівая, свавольніца і першая штукарка на розныя забаўкі і выдумкі – вось якая была Кублікавых Аўгіня. Любіла яна і з дзецюкамі пажартаваць, ды жартавала так, што кожнаму з іх здавалася, нібы ён і ёсць той, на кім запыніла яна сваю дзявочую ласку.

“Нарвецца дзяўчына” , -- казалі пра яе сталыя жанкі і маладзіцы, калі гутаркі пра яе дурасці даходзілі да іх вушэй. Аўгіня жартаваць жартавала, але граніц у сваіх дурасцях не пераступала. Умела быць яна сталаю і сур’ёзнаю, і вочы яе, цемнаватыя, як лёгкі змрок ясных чэрвеньскіх вечароў, пазіралі тады строга і ўдумліва. І цяжка было адзначыць колер гэтых вачэй, што свяціліся, як дзве роўныя, прадаўгавата-круглыя ямінкі-багны на цёмным балотным дне ў роспісе пышных раслін. Іх можна было ўспрымаць як карыя вочы, чуць-чуць пацягнутыя зелянкаваю павалокаю, а часамі яны здаваліся шэравата-зялёнымі. Можа проста мяняліся яны ў залежнасці ад тых думак, ад тых маладых мар,

што поўнілі дзявочую галаву і гушкалі яе сэрца ў той ці іншы час. Адно можна сказаць пра іх: яны вабілі – вось як вабіць воля і радасныя прасторы вясны, поўныя музыкі звону і шуму жыцця, і зацягвалі, як надрэчная дрыгва, дзе звадлівым шэптам гамоняць высокія шумлівыя чароты і пахучы яер.

Якуб Колас. “Дрыгва”.

2. Была ціхая летняя раніца. Сонца яшчэ не паспела забрацца высока і пералівалася мільёнамі агеньчыкаў у роснай мураве, на палянах, паблісквала на вільготным лісці бяроз, рассыпалася залацістымі плямамі праз лапкі галін, праз кучомістыя верхавіны хвой. І калі трапляла сонца на спелыя ягады маліны, яны гарэлі як камні-самацветы. І пах ад іх ішоў далёка-далёка, праз лес, праз балота, да самае лесавое дарогі. Ягады пахлі летам сонцам зялёнаю муравою палян, ды чым толькі яны не пахлі! Знай толькі адно: еш, не лянуйся! І Мішка [медзведзяня] стараўся. Спачатку абскубаў ягады лапай, еў, хапаўся, соп, набіваў повен рот малінай разам з лісцем, з маленькімі мурашкамі, з недаспелымі ягадамі. Калі ж наеўся, стаў больш пераборлівым: стаіць, прыглядаецца, самую спелую ягадзіну выглядае. Выгледзіць маліну, на якой сонца больш пераліваецца, і нацэліцца паважна языком, старанна зліжа ягадзіну і вочы прыжмурыць ад вялікага задавальнення.
Вялікі ласун быў Мішка!

Міхась Лынькоў. “Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў”.

3. Той асенні дзень быў цёплы і пахмурны. Лісце ляжала пад нагамі тоўстым стракатым дыванам, і нам з сябрам добра было хадзіць па ім, варушыць лістоўныя сумёты нагамі і адчуваць сябе бязбожна шчаслівымі, нягледзячы на лёгкі сум. Таму што мы былі ў Залессі, былым маёнтку славутага Міхала Кляофаса Агінскага, “паўночных Афінах”, як называлі гэты кут сучаснікі.

Залессе – адна з самых паэтычных мясцін нашай радзімы, а восень надавала ўсяму, што мы бачылі вакол, лёгкую паціну чысціні празрыстасці і журбы.

Магутныя прысады клёнаў і ліп ішлі да Віллі, туліўся ў зарасніках старажытны цёплы дом са свечкамі калон, ртутна свяіліся ставы, ручай імкнуў праз грэблю. І ва ўсім, што вакол, была музычнасць, ціхая песня: у плёску вады, у шолаху лісця, у парывах ветру, які гайдаў палын на мяжы.

Ёсць мелодыі, якія чуеш так часта, што пачынаеш грэбаваць імі. Але колькі б ты ні слухаў паланэзы Агінскага, а асабліва вялікі паланэз ля-мінор (“Развітанне з радзімай”) – ён застанецца блізкі і дарагі твайму сэрцу, будзе закранаць у ім самыя глыбінныя, самыя свае струны.

Уладзімір Караткевіч. “Песня з паўночных Афін”.

4. Постаць творцы класічнага беларускага харавога мастацтва, знакамітага збіральніка, даследчыка і прапагандыста помнікаў традыцыйнай культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларусаў, літаратара, культурна-грамадскага дзеяча Рыгора Раманавіча Шырмы, пэўна, можа быць названа знакавай. Падставай такога высокага азначэння – яго жыццё ў мастацтве харавога спеву, этнамузакалогіі, ку льтурна-грамадскай сферы.

Заснаванай і пеставанай без мала паўвека Рыгорам Раманавічам Шырмам Беларускай акадэмічнай капэлай былі падараваны суайчыннікам і свету ў найгустоўнейшай трактоўцы маэстра дзесяткі твораў еўрапейскай музычнай класікі, сотні беларускіх народных песень, данесеных да слухача беражліва, з глыбінным адчуваннем іх неўміручай красы. Да прыходу Р.Р. Шырмы харавая культура на Беларусі такой мастацкай вышыні не дасягала ніколі.

Агульнавядома, справай жыцця Р.Р. Шырмы як фальклярыста-збіральніка, публікатара і дырыжора было практычнае выяўленне багацця душы беларускага народа. Перш-наперш для яго духоўнага самасцвярджэння, а ў стратэгічным плане – для станаўлення прафесійнай беларускай музыкі на трывалых асновах нацыянальнага меласу.

Арсень Ліс. “Рыгор Шырма: віленскі час”.

5. У тую ўрачыстую перадсвяточную ноч у глыбінях галактыкі акурат над Завоссем успыхнула калядная зорка Паэта.

Дата яго нараджэння цяпер значыцца ў календары UNESKO, бо ён, Адам Міцкевіч,– сусветна-вядомы творца, бо ягоны ўнёсак у культуру і асвету дужа важкі, гуманістычныя ідэі, якімі прасякнута ўся яго літаратурная спадчына, працягваюць служыць дабру, прагрэсу, краса яго высокай шчымліва-праніклівай паэзіі ў розных кутках свету зачароўвае тых, хто любіць мастацкае слова.

Духоўная постаць Адама Міцкевіча заўсёды была і застаецца надта прыкметнаю ў сферы прыгожага пісьменства і прывабнаю. Яго любілі і любяць, шанавалі і шануюць розныя народы, а заўважалі і заўважаюць найперш іх вялікія сыны. Вельмі высока яго цаніў знакаміты творца, палымяны патрыёт Украіны Іван Франко. Богам называў Міцкевіча ў адным з вершаў Яўгені Баратынскі. Заслужанаю і далёка чутаю славаю Міцкевіч карыстаўся яшчэ ў маладыя гады. Як засведчылі сучаснікі генія (у прыватнасці – Антоні Эдвард Адынец у яго “Пісьмах з падарожжа”) Аляксандр Пушкін, сонца рускай паэзіі, на адной з вечарын сваіх усклікнуў, узрушаны імправізаваннем Міцкевіча: “Які геній! Які свяшчэнны агонь! Што я побач з ім!”

Васіль Жуковіч. “Пад зоркаю калядНАЮ”.

6. Алесь ішоў высокім берагам возера, на якім шумелі кашлатыя хвоі. Белы пясок побліз вады быў затканы зялёнымі верасамі. Дзе-нідзе, як волаты, ахапіўшы чыгунным вузлаватым карэннем зямлю стаялі дубы. Магутныя і велічныя постаці іх адбіліся ў люстранай вадзе…

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Малюнкі прыроды мяняліся адзін за другім. Толькі што ён захапляўся высокім абрывістым берагам, як раптам дарожка, што белая ручаінка, пакацілася з узгорка на ніз, і перад вачыма яго развінулася бязмежная сенажаць, як разаслаў хто вялізны-вялізны дыван, што зліваўся ўдалечыні з блакітным шоўкам чэрвеньскага неба. Дзе-нідзе толькі віднеліся на гэтай неабсяжнай зялёнай роўнядзі асобныя купкі беланогіх бярозак, якія стаялі мясцінамі, што тыя дзяўчаты ў карагодзе. Зусім на доле дарожку перабягаў невялікі ручай, які цурчэў з-пад маладой алешыны, што ўзнімалася над чаратамі. Вада была такая чыстая, з нейкім крыштальным адценнем, што нават круглыя, гладкія каменьчыкі, якія ляжалі на дне ручая, здаваліся белымі каралямі. І хоць Алесю у той час не хацелася піць, ён нахіліўся, і прыемны халадок асвяжыў яго ўсяго. Пасля падняўся, далоняю выцер губы, абтрос з кашулі празрыстыя кропелькі і адчуў, што прасвятлела ў вачах. Нават лягчэй цяпер ступалі ногі…

Пятрусь Броўка. “Калі зліваюцца рэкі”.

7. На зямлі ёсць нямала цудоўных тварэнняў прыроды, якія сталі сімваламі цэлых краінаў. Напрыклад, гара Фудзі ў далёкай Японіі, у суседняй Расіі – рака Волга, а возера Балатон адразу нагадвае пра Венгрыю.

Сімвалам жа нашай Беларусі з’яўляецца Белавежская пушча – бадай, самы вялікі і стары лясны абшар у цэнтральнай Еўропе, дзе захаваліся амаль у некранутым стане і гонкія аж да воблакаў бары, і магутныя векавыя дубы, і светлыя бярозавыя гаі, і змрочныя нават у сонечныя дні яловыя нетры.

Недарэмна хуткаплынны час у Белавежскай пушчы спыніўся, каб сівая мінуўшчына сустрэлася з днём сённяшнім і заўтрашнім. Тут наяву трапляеш у казку, легенду, паданне, тут святлееш душою, дабрэеш сэрцам, зноў пачынаеш верыць у неспакойны чалавечы розум. Нам пад сілу захаваць гэты цудоўны разнастайны свет для будучых пакаленняў людзей. Кожны раз, бываючы ў пушчы, я ,быццам замову, шапчу радкі з верша Ларысы Геніюш:

Зубр на мох, бы ягнё, прылёг
Ля бярозаў у белай адзежы.
Калі недзе існуе Бог,
Тут ён пэўна у Белавежы.

Уладзімір Ягоўдзік. “Белавежская пушча”.

8. Сонца толькі што паказалася з-за сасонніку. Вялікі пунсовы шар імкліва каціўся насустрач адзінокай ранішняй хмарцы, якая, нібы спалохаўшыся, што спазнілася, хутка падала ўніз, за далягляд, і стаяла там у полымі ўсходу. Полымя гэтае, праглынуўшы хмарку, паступова бляднела гасла – ра ссейвалася.

Заблішчала раса; пад праменнем сонца маладая рунь і трава сталі алюмініева-белымі, на выгляд – зыркімі і сухімі, толькі дзе-нідзе па іх праляглі ярка-зялёныя мокрыя сцежкі – сляды чалавека ці жывёлы. Статак яшчэ быў на

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

выгане, каровы  прагна хапалі ля агароджы траву,  незадаволена мычэлі, увішныя цёлкі залазілі ў пасевы. Пастухі крычалі, ляскалі пугамі. Радасна віталі новы дзень птушкі: звінелі ў вышыні жаваранкі, мітусіліся каля шпакоўніц у садах і над стрэхамі шпакі і няспынна лёталі то высока ў небе, то над самай зямлёй імклівыя ластаўкі.

Іван Шамякін. “У добры час”.

9. Дол быў услані рудым лісцем, сухой рыжай папараццю, доўгаю, пераблытанаю, як іржавы дрот, травою, друзам збуцвелых галінак. З-пад гэтай перапрэлай за многія гады коўдры сям-там праглядваў бледны, як вымачаны, мох, крывыя сцяблінкі ягадніку. Вострымі зялёнымі шпількамі тырчала маладая травічка.

Дрэвы яшчэ не распусціліся, былі брудна-шэрыя і рэзка вырысоўваліся на фоне густой зеляніны маладога ельніку. Вербалоз толькі што распусціў свае каткі, над ім бзынкалі першыя смелыя чмялі. На арэшніку можна было заўважыць  на пупышках далікатныя ружовенькія вусікі цвету. Каткі – распушаныя, толькі дакраніся да іх – асыпаліся на зямлю, сеючы ледзь прыкметны пылок. З пупышкаў на бярозе  вось-вось гатовы былі паказацца маладыя лісточкі, але бяроза нешта марудзіла – мо чакала, пакуль пройдуць вясеннія, такія непатрэбныя, але немінучыя халады. Можа, гэтую асцярожнасць яна пераняла ад дуба, бо той усё ніяк  не асмельваўся скінуць сваё старое пажоўклае ўбранне ,усё чакаў, пакуль добра ўгрэе сонца і адыдзе ад холаду карэнне.

Дуб не спяшаўся, бо па небе яшчэ снавалі, як нявылінялыя пасля зімы каровы на пашы,  непрыветлівыя кудлатыя хмары. З іх на дол, ледзь чутна шапочучы, сыпаўся часам дробны, як крупы,  сняжок. І тады яшчэ больш цягнула холадам ад сырых лагчын, ад зацененых густымі елкамі, яшчэ з астаткамі наздраватага лядку, упадзін, хоць на двары быў ужо канец красавіка.

Уладзімір Дамашэвіч. “Між двух агнёў”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10. Сучасныя дзеці, асабліва гарадскія, амаль адарваныя ад беларускай народнай культуры. У сялянскай хаце аніводная рэч, аніводны прадмет убранства ці адзення не мог узнікнуць па-за межамі  традыцыйнага мастацтва. Рушнікі, посцілкі, сурвэткі, фіранкі, тканае і аздобленае вышыўкай, аплікацыяй, вязанымі карункамі адзенне, гліняны посуд, распісныя дываны, скрыні, прыгажосць разьбы на шафе,  калаўроце ці аканіцах, кованыя клямкі і завесы, саламяныя брылі ці павукі на шчасце пад столлю –  усё гэта былі высокамастацкія рэчы, а між тым адначасова і звычайныя, неабходныя кожны час, кожны дзень усё жыццё. Створаныя па строгіх канонах, выпрабаваных стагоддзямі, яны разам з песнямі, казкамі, святамі з маленства выхоўвалі густ і

пачуццё прыгажосці, а потым навучалі і саміх дзяцей, як зрабіць усё гэта хараство сваімі рукамі.

Беларусам, французам, эстонцам, чалавека робіць асяроддзе – матчына мова, бацькава хата, родны горад, першая казка, кніга, лялька. Ніводны чалавек не народзіцца адразу з пачуццём, што ён японец фін або рускі. Менавіта ў дзяцінстве закладаецца падмурак разумення сувязі са сваім народам, з пэўнаю часткаю Зямлі – з Бацькаўшчынай.

Таццяна Церашковіч. “Лялька беларуская”.

12. Дапаможнік, дапамагчы, цёмны, цемнаваты, вясёлы, весялосць, скараход, вогнетрывалы, бібліёграф, бібліяграфія, радыяграма, радыяхімія, сыграць, зайсці, абысці, выйграць, імклівы, памкнуцца, на льдзіне, ільнозавод, мог узяць, магла ўзяць, фрау, на Урале, кладка, хадзьба, футбол, дзядзька, ха ціна, мядзведзь, цюль, раздарожжа, група, праязны, кампосны, агеньчык, маленькі, Скарынавы выданні, Божы суд, алах з ім, рэзюмэ, піке, Іаркшыр, Іаан, на ржышчы, вакол іржышча, завочны, заазёрны, завоблачны.

**Навучальныя каменціраваныя дыктанты**

1. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Не/рухома стаяў густы ам…рцвелы лес шчыльна прытуліўшы верхавіны да верхавін пераплёўшы галіны акрыўшыся белымі шатамі крохкай, шапаткой шэрані. Ні звер ні чалавек ні птушка не парушалі яго ранішняга зімняга спакою. Толькі дзесь у гушчары галін суха палуск(ава, ва)ў мароз пераскокваючы з дрэва на дрэва. Пачынала святлець. З мроку вырысоўваліся стромкія камлі ялін каржакаватыя дубы шурпатыя крывыя бярозы а паміж іх выступалі як пачварныя дзяды зломаныя бураю высокія ра…шчэпл…ныя абломкі дрэў і спілованыя пні з белымі круглымі шапкамі з завостранымі вярхамі ды белымі капцамі ра…кідаліся па лесе прыгожа скругл…ныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

снежныя курганкі. Працяты марозам снег хрустка скрыпеў пад нагамі дзеда

Талаша і грамознага Мартына Рыля. Ішлі яны не спяшаючыся выбіраючы

найболей глухія л…сныя дарожкі і сце…кі абыходзячы небяспечныя

мясціны. Ішлі моўчкі ўглыбіўшыся ў свае самотныя думкі.

Дзед Талаш чалавек пераважна замкнуты. Сваімі думкамі не з кожным падзеліцца і думае іх спакваля грунтоўна асабліва калі справа ходзіць аб важных рэчах і планы свае выношвае доўга. Але ўжо калі на што наважыцца то не а…ступіцца покі не/дойдзе свайго.

Якуб Колас. "Дрыгва".

* Падбярыце сінонімы да слоў *грамозны, самотны*. Растлумачце значэнне слова *капец*.

2. Запішыце тэкст пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Бярлога была прасторная і ўтульная. Хапала цёплага моху, сухога лісця. Уверсе было багата пераплеценага карэння ад паваленага дрэва, так што столь была добрая, шчыльная, ніколі не_прапускала дажджу. Бярлога была ў дзікім гушчарніку, ніхто не парушаў спакою, хаця і праходзіла недалёка лясная дарога, але была яна глухой і непраезджай. Колькі разоў выбіралася мядзведзіца з Мішкам [медзведзяня] на гэтую дарогу, каб пагрэцца на сонцы, і ніколі не_сустракалі тут чалавека. Маці адпачывала, а Мішку не было ніякай ахвоты да сну. Ён каторы раз ужо абследаваў бярлогу, абнюхваў кожны каменьчык, кожны корань. Праўда, цікавага ў гэтым было мала. І калі ўсё гэта надакучыла Мішку, ён выбраўся з бярлогі на волю. Там было весялей. Добра было пакуляцца ў верасках, пабегаць сярод папараці, пастаяць перад мурашнікам і, запусціўшы ў яго лапу, разварушыўшы, хуценька адскочыць убок і пазіраць, як бегаюць неўгамонныя мурашы, цягаюць сцяблінкі, перацягваюць белыя яечкі. Багата чаго ёсць у лесе і паглядзець, паслухаць.

Міхась Лынькоў. "Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў".

* Растлумачце значэнне слова *глухая* (дарога). Падбярыце да тэксту загаловак.

3. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Першы раз на вёсцы Алесь не заўважыў як прыходзіла вясна. А некалі памятае ён востра а…чуваў раннія подыхі яе яшчэ тады калі ледз… прыкметна звінелі капяжы са страхі і нават заўважаў як пачыналі мяняцца вераб…іныя галасы на сметніку.

Раней ён пазнаваў голас вясны тады калі вакол ляжалі і рэзалі вочы сваёй б…лізной снягі і раптам а/поўдні капяжы са стрэх падалі так што гук іх нагад(ыва, ва)ў ба…злівы грукат падарожніка які ўжо з…явіўся але яшчэ баіцца голасна сказаць аб сваім прыходзе. З нізін, з/пад возера, Алесь прыносіў дамоў галінкі вярбы іх слабы і тонкі пах жыў асобна не/хочучы зліваццa са звыклымі пахамі хаты а пупырышкі якія распускаліся нагад(ыва,ва)лі яму маленькіх гусянят якія плывуць адно за адным па летняй вадзе. Ён ладзіў млыны на першай ручаіне якая бегла з/пад белага снегу чыстая і празрыстая потым калі адтайвалі ўзгоркі вечарамі раптам пазнаваў як востра і па/свойму пахне гліна. Вясна! Адзіная вечная кніга якую чытаюць ад нараджэння да самай смерці не/адчуваючы смутку і ра…чаравання…

Пятрусь Броўка. “Калі зліваюцца рэкі”.

* Патлумачце выраз *рэзаць вочы*. Вызначце, да якога тыпу маўлення належыць тэкст.

4. Запішыце тэкст пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Ёсць на свеце гарады, імя якіх для твайго вуха проста сугучча. Прагучала назва, скалыхнула паветра і знікла назаўсёды ці да наступнага разу, бо нічога за гэтай назвай для цябе не стаіць. Не чуў, не бываў. А і не буду – невялікая страта.

А ёсць гарады, звязаныя з табою нябачнай повяззю, самой музыкай свайго імя, або нечым трывалым, што вяжа з імі назаўсёды, нават супраць твайго жадання. Ёсць для мяне некалькі такіх гарадоў на Беларусі. І адзін з іх – горад маёй маці, Мсціслаў. Тут яна нарадзілася амаль дзевяноста год таму назад і тут пражыла некалькі першых сваіх месяцаў. І Мсціслаў быў для мяне, з гэтай прычыны, і не свой, і нібыта крыху свой.

Гарады, як некаторыя людзі, чакаюць свайго адкрыцця табой. Шмат год праходзіў міма чалавека – і раптам раскрываецца ён табе ў адной размове і на ўсё жыццё.

Уладзімір Караткевіч. “Дыяментавы горад”.

* Падбярыце сінонімы да слова *повязь*.

5. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Любоў да (Р, р)адзімы  мае передумовай веданне мінулага свайго народа –  яго перамог і паражэнняў здабыткаў і страт яго г…рояў мысліцеляў вялікіх майстроў, помнікаў духоўнай і матэры…льнай культуры.

Памяць патрабуе клопату. Гэта тым больш тычыцца мінуўшчыны беларускага народа які так часта апынаўся пад смерчам вае(н, нн)ых дзеянняў і цярпеў незаме(н, нн)ыя страты людзей каштоўнасцей духоўных скарбаў.

Любоў да (Р, р)адзімы не з…яўляецца аднак вынікам атрыманых ведаў; хутчэй імкненне да ведаў ёсць вынік любові да (Р, р)адзімы. Менавіта любоўю да (Р, р)адзімы дыктуецца жаданне прасякаць загадкі даўніны давед(ыва, ва)цца пра тое што было але чаго ўжо няма ці што засталося   мала/прыкметнымі слядамі ў скупых словах летапісаў і не/шматлікіх дакументаў што зацерлася гужам стаго(дз, ддз)яў зацягнулася глухімі туманамі мінулых эпох.

Цікавас…ць да даўніны мае духоўны характар яна караніцца ў сутнасці чалавека жыццё якога вельмі кароткае але чый розум жадае агарнуць неахопны час зазірае ў будучыню і пранікае ў мінулае.

Кастусь Тарасаў. “Памяць пра легенды”.

* Як вы разумееце выразы *прасякаць загадкі даўніны, гуж стагоддзяў*? Вызначце, да якога тыпу маўлення належыць тэкст.

6. Запішыце тэкст пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і  пастаноўку знакаў прыпынку.

А ці ведаеце вы такую дзівосную мясціну Налібоцкай пушчы, як возера Кромань? Калі ёсць край на зямлі, дык гэта тут, на замілаванай мясціне Прынёманскага краю. На шырокім рухомым люстэрку вады нараджаецца ранішняе сонейка. Яно – вялікая радасць для жывёл, раслін, і ўвогуле для ўсёй пушчы. Разумная вада плюскоча, хвалюецца, іскрыцца срабрыстымі зорачкамі, віхлястымі хвалямі ў зялёнай раме выносістых лясін і выпетранага чароту. Тут, у жыццядайнай цішыні вытканага з туману фрэскавага неба, на вашых вачах разам з берагам перакуліцца ў азёрную бездань цэлая флатылія белапенных аблачын.

Як дагістарычны дыназаўр, разваліўся ўздоўж берага каля самай вады кашлаты выварацень. Пачарнелыя ад часу крывулястыя ногі-сукі ўпіраюцца ў бурштынавае дно. Гарбатая спіна, пакрытая парэпанай скурай-карой, бы панцырам, адлівае халоднай сінечай, даўжэзны замшэлы хвост пахаджае на ветры. Глядзець страхоцце адно: здаецца, ён вось-вось накінецца на цябе. Напэўна, ён выйшаў з каменнага веку і застыў у чаканні сваіх суродзічаў!

Ласкавы праменьчык заглянуў мне ў вочы, абдаў прыемным цяплом, падняў настрой. Насупроць мяне, на затравелай выспе, п’ючы сонейка, групуюцца мае сябры: з белымі зграбнымі ножкамі танкаствольныя бярозкі-падлеткі, прыземістыя ў зялёных сарафанах ялінкі.

– Ах, якое хараство! Райскі кут!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мікола Бусько. “Райскі кут”.

* Патлумачце значэнне слоў *выносісты*, *выпетраны*, *бурштынавы*. Падбярыце сінонім да слова *выспа*.

7. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Дзе яшчэ, як (не, ні) у вандроўцы, можна падзівіцца на кра…віды роднага краю! А колькі яшчэ ўсяго цікавага за межамі Беларусі! Пад/час вандровак сам таго не заўважаеш як вывучаеш ге…графію і мову. Як у кап’ют…рнай стратэгіі: а…крываеш для сябе новыя землі і гарады на практыцы а не з падручнікаў дазнаешся пра розныя дзівы пра не/паўторныя месцы заўважаеш асаблівасці мясцін адметнасць насельніцтва таго ці іншага рэгіёна прыкмячаеш не толькі розніцу ў мовах але ж нават і ў ды…лектах. Вяртаешся да/дому і гаворыш на такой дзіўнай сумесі гаворак што сябры калі пастараюцца змогуць вылічыць дзе вас увесь час насіла.

А з ге…графіяй усё прасцей: нават калі вы вывучылі ў школе дзе знаходзіцца тая ці іншая краіна які там клімат асаблівасці жыцця палітычнае становішча асноўныя гарады рэльеф і назвы рэк – усё/роўна пакуль там не пабываеш словы ў падручніку застаюцца словамі. Можна выдатна ведаць ге…графію але тым не менш падарожнік – практык а ге…граф застанецца тэарэтыкам. Гэта ўсё/роўна што быць доктарам і нікога не л…чыць.

Крысціна Карчэўская. “Аўтастоп, ці як вандраваць, не марнуючы грошай”.

* Падбярыце сінонімы да слова *вандроўка*.

8. Запішыце тэкст пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

…Разнявολена і пакручаста, абягаючы ўзгорыстыя сасннякі, раздзяляючы заліўныя лугі, плыве з_вякоў няспешна Нёман. У яго затоках і завоінах, асмужаных аерам і асакой, шныпараць серабрыстыя плоткі, тапырацца зялёна-чырвоныя, з сінім адлівам акуні, як падводная лодка, як нежывая здань, назіркам праплыве гарласты шчупак, сыта і цельпукавата прасунуцца ў прыцемку язі…

Антось ой як даўно ведаў кожны выгін і кожнае нёманскае калена. Яшчэ тады, калі сам ганяў плыты ў Коўна, бусаком перамераў усе бухты і водмелі, вывучыў нечаканыя вірластыя круцялі і ціхія завадзі. А тут, ля дому, дзе няма на вадзе месца, па якім не сцябала яго вуда-валасянка, Антось мог без памылкі ўявіць усё гэтае падводнае царства. І хоць з году ў год рэчышча рабіла новыя выкрунтасы, наносіла пясчаныя грады, пакідала старыцы і адкрывала выдмы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

падмывала і валіла на дно ўчэпістыя дубы, ён, вырываючыся прыхапкам ад сялянскай штодзённіцы, запамінаў гэтыя змены і бярог у памяці…

Алесь Камароўскі. “Бусел”.

* Патлумачце значэнні слоў *завоіна, назіркам, шныпарацъ, тапырацца, цельпукавата, бусаком, вірласты, выкрунтасы, старыца, выдма.* Вызначце сферу ўжывання гэтых слоў.

9. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Іншы раз калі гартаеш кнігі па гісторыі Беларусі так хочацца за фактамі і датамі гістарычных падзей убачыць людзей пра якіх у летапісах або дакументах або м…награфіях напісана толькі некалькі радкоў даведацца пра тое як яны жылі чаму радаваліся і аб чым сумавалі прачытаць хоць адно моўл(ен, ян)ае імі слоўца паглядзець на іх партрэты каб наблізіць да сябе той далёкі час і стаць све…кам усяму што не/калі адбывалася.

Нічога новага не а…крыю калі скажу што гісторыя гэта не/толькі даты падзей і ясныя, на па…ставе све…чаняў сучаснікаў факты (хаця іх, безумоўна, трэба ведаць, каб хтос…ці не сп…куляваў на гістарычнай не/адукаванасці народа) але і духоўны скарб які стаго(ддз, дз)ямі збіраўся народам і жывіць ягоную пам…ць абуджае нацы…нальную свядомасць. Гэта так/сама маральныя ўрокі што засцерагаюць нас ад паўтарэння памылак. Гэта і запавет любіць і шанаваць сваю (Б,б)ацькаўшчыну запавет перададзены нам бацькамі і дзядамі.

Вітаўт Чаропка. “Імя ў летапісе”.

* Патлумачце значэнне слова *м…награфія.* Вызначце, да якога тыпу маўлення і стылю належыць тэкст. Абгрунтуйце вывад.

10. Запішыце тэкст пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

У Малым Сяле, дзе ў крайняй хаце ад лесу жыве Дзімка, няма рэчкі. Укруга вёскі цягнуцца засмужаныя сухадолы, гразкія балотцы і камяністыя пагоркі. На сухадолах грыўкамі стаіць бярэзнік, за гразкія імшэчкі і ператочыны ўчэпіста трымаецца шэры алешнік, а на пясчаных выдмах, апрача сіўцу, лебяды і конскага шчаўя, нічога болей не расце.

Напэўна, сотні гадоў жывуць тут людзі – выкошваюць у лагчынах марную траву, пасуць на няўдобіцы статак, але ім, здаецца, і гора мала, што ў Малым Сяле няма рэчкі. А хлопцам нельга без вады. Няма рэчкі, і няма вясёлых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

забаў, няма разгону, а ў самую спёку хоць і праўда ў ночвах купайся. Сорамна прызнацца, але Дзімка рачнога шчупака толькі на малюнку бачыў.

Прырода моцна, бессардэчна пакрыўдзіла маласельцаў. Як быццам у насмешку, яна прыстаралася для іх нешырокую, звілістую канаву, што пацíху струменіцца паўз Дзімкаву хату, цячэ цераз балоцісты поплаў і губляецца ў змрочным алешніку. Дзесьці там, далёка, яна ўпадае ў Цну. Несправядліва ўсё ж: каму – Цна, а каму – гэтая мізэрная канава, у якой вада заўсёды пратухлая, іржавая, з каляровымі скалкамі.

Дзімка сумаваў па рэчцы, зайздросціў дзецям, якія нарадзіліся каля вялікай вады.

Віктар Гардзей. “Каламутная вада”.

***** Растлумачце значэнні слоў *сухадол, ператочына, выдма, ночвы, няўдобіца, поплаў, скалка*. Падбярыце сінонімы да слова *марная* (трава).

11. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Прыгад(ыва, ва)ю Хойнікі пары свайго маленства і юна...тва калі пад рослымі таполямі ўсця... галоўнай ...уліцы хадзіў з першым здзіўленнем ад вялікага паселішча і мно...тва сустрэчных не/знаёмых людзей. Першыя купле(н, нн)ыя ў кнігарні на раг... ...уліцы мастацкія кнігі з вабным свежым пахам друкарскай фарбы. Сцены драўля(н, нн)ага будынка р...дакцыі куды патаемна/жадана хацелася зазірнуць пабачыць як робіцца газета дзе быў ужо зме...чаны і мой першы верш.

Памятаю да драбніц той красавіцкі сонечны дзень калі мая класная аб н...чым па/змоўніцк... пашапталася з мамай на ...уліцы; потым у ма...чыным гаро...чыку дзе капаў грады з не/малым хваляваннем паведамілі мне што званілі з р...дакцыі прасілі заўтра прыехаць. Мама глянула спагаднымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вачамі класная падбадзёрыла: калі клічуць значыць упадабалі вершы едзь смела.

Не/вельмі смела аднак пераступаў я парог хойні...кай раёнкі. Потым ужо часта бываючы тут і нават з паў/года працуючы ў студэн...кім а...пачынку прыгад(ыва, ва)ў багата/астылае ўжо сваё колішняе хваляванне бо зна...шоў у р...дакцыі сапраўдных сяброў, першых літаратурных настаўнікаў.

Мікола Мятліцкі. “Цяпло буслінага крыла”.

* Вызначце стыль і тып тэксту. Звярніце ўвагу на прыметнік *красавіцкі* (дзень). Чаму, на ваш погляд, беларускі мовазнаўца Фёдар Янкоўскі называў назвы месяцаў “гаваркімі” словамі? Патлумачце сваё разуменне назвы *красавік*.

12. Запішыце тэкст пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

У французскай сталіцы, якая ўжо тады грымела сваімі навуковымі і педагагічнымі поспехамі на кантыненце, Ігнат Дамейка час дарэмна не марнаваў. Ужо сталы чалавек, ён нарэшце вызначыўся ў практычным жыцці. У Сарбонскім універсітэце, Каледжы дэ Франс, тамтэйшым батанічным садзе, адным з найлепшых і найбагацейшых у Еўропе, ён паглыбляе сваe веды па фізіцы і хіміі, матэматыцы і батаніцы, геалогіі і мінералогіі – якраз тых навуках, да якіх меў не толькі схільнасці, але і захапленне. Але мала і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гэтага яму, Ігнату Іпалітавічу: у жніўні тысяча восемсот трыццаць чацвёртага года ён паступае ў Горную школу ў Парыжы і менш чым праз тры гады атрымлівае дыплом інжынера горнай справы.

Яшчэ там, у Парыжы, Ігнат Дамейка падпісвае рабочы кантракт. Умова нумар адзін: на працягу шасці гадоў стварыць хімічную лабараторыю і падрыхтаваць спецыялістаў па хіміі ў чылійскім горадзе Какімба. Шукальнік свайго месца ў жыцці, Богам надзелены адкрывальнік тайнаў Зямлі, Дамейка займеў магчымасць праверыць сябе на практыцы.

Анатоль Мяснікоў. "Незапатрабаваны Бацькаўшчынай беларус".

* Падбярыце да тэксту загаловак. Назавіце сінонімы і антонімы да слоў *сталы, захапленне*.

13. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Бадзёрым ядра(н, нн)ым жнівен...скім ранкам бег я на (Ц, ц)нянскае ...озера. Рабіць гэтую прабе...ку ўдаецца (не, ня)/часта: у Мінску бываю летам рэ...ка. ...уліцу подбегам перасек на пераходзе/зебры выбраўся на сце...ку між дамамі і тут спыніўся: каля тарцовай сцяны шэрага дзев...ці/павярховага гмаха расцвілі мальвы – чырвоныя ружовыя жоўтыя белыя. Кветкі густа стаялі па края... шырокай гра...кі на якой лапушылася бульба.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З/за ...угла суседняга шэрага дзев...ці/павярховіка выбл...снула сонца. Мутна/ружовае але ўжо цёплае яно заліло промнямі гра...ку – успыхнулі кроплі расы на шырозным лісц... мальвы, буйныя зоркі/кветкі засв...ціліся мокрымі пялёсткамі.

Маланкай выбл...снуў успамін з далёкага маленства ў нашым п...лісадніку каля тарцовай сцяны новай хаты якую збудавалі ў тысяч... дзевяц...сот сорак шостым годзе бо старую спалілі немцы калі ўцякалі з Прыбясе(дз, ддз)я раслі вяргіні і мальвы. В...ргіняў было два куст...: на адным кветкі цёмна/чырвоныя а на другім – жоўтыя круглыя быццам сонечныя шарыкі. А між гэтымі кустамі высіліся тонкія сцяблінкі мальваў на якіх красаваліся быццам прыклее(н, нн)ыя ружовыя кветкі.

Леанід Левановіч. “Свята мальвы”.

***** Патлумачце значэнні слоў *ядра(н, нн)ы, тарцовы, лапушыцца*. Знайдзіце ў тэксце словы, ужытыя ў пераносным значэнні.

14. Запішыце тэкст пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Андрэй Макаёнак быў вельмі людскім чалавекам. Пра яго таварыскасць, альтруізм складзена нямала легендаў. Прырода шчодра і ўсебакова адарыла яго: ён добра маляваў, быў адмысловым разьбяром па дрэве, меў не абы-якія акцёрскія здольнасці. Ён жыве ва ўдзячнай памяці шматлікіх сваякоў, сяброў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ды знаёмых, у цёпла-захопленых згадках пра вясёлыя гісторыі-прыгоды, выдумляць якія ён і ўмеў, і любіў...

Зыходзячы з вопыту пастаноўкі п’ес, Андрэй Макаёнак сфармуляваў для сябе некалькі драматургічных правілаў: інтрыга павінна быць вострай, займальнай; дзеянне – дынамічным; нельга спадзявацца толькі на сітуацыю; у аснове калізій – праўда. Як бачым, нічога звышнатуральнага, сакрэтнага ў гэтых правілах няма. Драматург эмпірычным шляхам дайшоў да ўсведамлення асноўных законаў драматургічнага жанру, і асабліва перспектыўным аказалася ўсведамленне пісьменнікам важнасці эстэтычнай місіі драматычнага характару. Бяда ўсіх твораў, напісаных па канонах бесканфліктнай літаратуры, заключаўся менавіта ў тым, што ў іх ігнараваўся мастацкі характар і замест паўнакроўнага, жыццёва верагоднага характару манціраваўся муляж рознай ступені праўдападобнасці. Таму Андрэй Макаёнак стаў надаваць асноўнае значэнне псіхалагічнай распрацоўцы персанажаў, іх моўнай характарыстыцы.

Сцяпан Лаўшук. “На творчай арбіце Андрэя Макаёнка”.

***** Падбярыце да тэксту загаловак. Патлумачце значэнні слоў *альтруізм, эмпірычны.*

15. Спішыце тэкст, каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Надвор...е і сапраўды ўсталявалася цудоўнае якое звычайна бывае ў гэтую пару і дзень выдаўся пагодны цёплы. Паветра чыс...юткае і празрыстае хоць і лётаюць у ім (з, зз)яючы на сонцы тонкія па...уцінкі. Яны ...сюды на пожнях лугах і агародах сумна дзівяць чалавечае вока сваім бл...скам. Н... хмаркі н... аблачынкі н... ветрык... а па...уцінкі лётаюць пераносячы на сваіх нітачках плоймы дробных па...учкоў. Відаць здалёк як прыбраліся ў бар...овыя і жоўтыя колеры зарэчныя ляс... зазелянела вераснёвая рунь. Ля дарогі красавалася некалькі арабін а паміж рэ...кага лісц... віселі як дзявочыя за...ушніцы даспелыя гронкі ягад.

Час здавалася прыпыніў сваю хаду а свет нібы пашыры...ся: бачна ва ўсе б...кі. Прасторна мусіць ад таго што ўсё сабралі скасілі а...церабілі. З неба на якім пачалі ўжо з...яўляцца рэ...кія белыя аблачыны на ўвесь гэты свет задумліва пазірала ласкавае ужо крыху асты...ае сонца.

Уладзімір Гніламёдаў. “Валошкі на мяжы”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***** Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце адказ. Знайдзіце ўжытыя ў тэксце метафары.

16. Запішыце пад дыктоўку, каменціруючы правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм.

Падпісаць, абрэзаць, адкапаць, перадсвяточны, надрэзаць, разнесці, расклеіць, узвесці, ускласці, бяздонны, бессардэчны, прэм’ер-міністр, школа-

інтэрнат, экс-чэмпіён, віцэ-прэзідэнт, Бялыніцкі-Біруля, паўслоіка, паў-Мінска, іншамоўны, пяціпавярховы, добразычлівы, урачыста_вымаўлены, беларуска-рускі, музычна-філалагічны, бледна-зялёны, цёмна-блакітны, паўднёва-заходні, дацямна, злева, збольшага, упустую, навошта, затым, за_ тым лесам, гэтаксама, надвае, насцеж, якраз, па-твойму, па-трэцяе, калі-нікалі, абы-дзе, усё_роўна, як след, чытаў_жа, напісаў-такі, нелюдзімы, непрачытаны тэкст, не_прачытаны ўчора раздзел.

***** Складзіце словазлучэнні з 4 словамі (на выбар). Падбярыце антонімы да слоў і спалучэнняў слоў *адкапаць, злева, як след*.

17. Спішыце словы (спалучэнні слоў, словазлучэнні), каменціруючы правапіс прапушчаных арфаграм.

А…скочыць, на…бавіць, па…сохлы, (з,с)берагчы, (з,с)пусцелы, ра(з,с)сыпаць, ра(з,с)квечаны, штаб/афіцэр, тэлефон/аўтамат, мала/эфектыўны, добра/угноены, буда/кашалёўскі, празрыста/ружовы, іван/мележаўскі, кісла/салодкі, хто/ніхто, за/летась, па/роўну, з/усім, з/усім класам, што/дзень, у/двух, у/адно, да/шчэнту, на/ніз, усё/адно, у/даль, па/воўчы, раз/пораз, абы/дзе, толькі/што, даволі/такі, чытала/ж, абы/хто, абы/з/кім, н(я, е)/вольнік, не/абходны, не/жаданне, не/узараныя палеткі, не/закончанае на занятках практыкаванне, не/дабор, не/дасаліць, не/дапісаць да канца артыкул, лекцыя не/закончана, не/мой, а твой, не/варта, не/супраць, ні/кудышны, ні/сцюжа, ні/у/кога.

***** Складзіце 2 сказы так, каб у адным ужывалася слова *зусім*, у другім – словазлучэнне *з усім класам*. Падбярыце сінонімы да слова *н(я, е)/вольнік*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Даведка

1. Нерухома стаяў густы амярцвелы лес, шчыльна прытуліўшы верхавіны да верхавін, пераплёўшы галіны, акрыўшыся белымі шатамі крохкай, шапаткой шэрані. Ні звер, ні чалавек, ні птушка не парушалі яго ранішняга зімняга спакою. Толькі дзесь у гушчары галін суха палусквау мароз, пераскокваючы з дрэва на дрэва. Пачынала святлець. З мроку вырысоўваліся стромкія камлі ялін, каржакаватыя дубы, шурпатыя крывыя бярозы, а паміж іх выступалі, як пачварныя дзяды, зломаныя бураю высокія расшчэпленыя абломкі дрэў і спілованыя пні з белымі круглымі шапкамі, з завостранымі вярхамі, ды белымі капцамі раскідаліся па лесе прыгожа скругленыя снежныя курганкі. Працяты марозам снег хрустка скрыпеў пад нагамі дзеда Талаша і грамозпага Мартына Рыля. Ішлі яны не спяшаючыся, выбіраючы найболей глухія лясныя дарожкі і

сцежкі, абыходзячы небяспечныя мясціны. Ішлі моўчкі, углыбіўшыся ў свае самотныя думкі.

Дзед Талаш – чалавек пераважна замкнуты. Сваімі думкамі не з кожным падзеліцца і думае іх спакваля, грунтоўна, асабліва калі справа ходзіць аб важных рэчах, і планы свае выношвае доўга. Але ўжо калі на што наважыцца, то не адступіцца, покі не дойдзе свайго.

Якуб Колас. “Дрыгва”.

3. Першы раз на вёсцы Алесь не заўважыў, як прыходзіла вясна. А некалі, памятае, ён востра адчуваў раннія подыхі яе яшчэ тады, калі ледзь прыкметна звінелі капяжы са страхі, і нават заўважаў, як пачыналі мяняцца вераб’іныя галасы на сметніку.

Раней ён пазнаваў голас вясны тады, калі вакол ляжалі і рэзалі вочы сваёй белізной снягі і раптам, апоўдні, капяжы са стрэх падалі так, што гук іх нагадваў баязлівы грукат падарожніка, які ўжо з’явіўся, але яшчэ баіцца голасна сказаць аб сваім прыходзе. З нізін, з-пад возера, Алесь прыносіў дамоў, галінкі вярбы – іх слабы і тонкі пах жыў асобна, не хочучы злівацца са звыклымі пахамі хаты, а пупырышкі, якія распускаліся, нагадвалі яму маленькіх гусянят, якія плывуць адно за адным па летняй вадзе. Ён ладзіў млыны на першай ручаіне, якая бегла з-пад белага снегу чыстая і празрыстая, потым, калі адтайвалі ўзгоркі, вечарамі раптам пазнаваў, як востра і па-свойму пахне гліна. Вясна! Адзіная вечная кніга, якую чытаюць ад нараджэння да самай смерці, не адчуваючы смутку і расчаравання…

Пятрусь Броўка. “Калі зліваюцца рэкі”.

5. Любоў да Радзімы мае перадумовай веданне мінулага свайго народа –

яго перамог і паражэнняў, здабыткаў і страт, яго герояў, мысліцеляў, вялікіх

майстроў, помнікаў духоўнай і матэрыяльнай культуры.

Памяць патрабуе клопату. Гэта тым больш тычыцца мінуўшчыны беларускага народа, які так часта апынаўся пад смерчам ваенных дзеянняў і цярпеў незаменныя страты людзей, каштоўнасцей, духоўных скарбаў.

Любоў да Радзімы не з’яўляецца аднак вынікам атрыманых ведаў; хутчэй імкненне да ведаў ёсць вынік любові да Радзімы. Менавіта любоўю да Радзімы дыктуецца жаданне прасякаць загадкі даўніны даведвацца пра тое, што было, але чаго ўжо няма ці што засталося малапрыкметнымі слядамі ў скупых словах летапісаў і нешматлікіх дакументаў, што зацерлася гужам стагоддзяў, зацягнулася глухімі туманамі мінулых эпох.

Цікавасць да даўніны мае духоўны характар, яна караніцца ў сутнасці чалавека, жыццё якога вельмі кароткае, але чый розум жадае агарнуць неахопны час, зазірае ў будучыню і пранікае ў мінулае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Кастусь Тарасаў. “Памяць пра легенды”.

7. Дзе яшчэ, як не ў вандроўцы, можна падзівіцца на краявіды роднага краю! А колькі яшчэ ўсяго цікавага за межамі Беларусі! Падчас вандровак сам таго не заўважаеш, як вывучаеш геаграфію і мову. Як у кап’ютарнай стратэгіі: адкрываеш для сябе новыя землі і гарады на практыцы, а не з падручнікаў, дазнаешся пра розныя дзівы, пра непаўторныя месцы, заўважаеш асаблівасці мясцін, адметнасць насельніцтва таго ці іншага рэгіёна, прыкмячаеш не толькі розніцу ў мовах, але ж нават і ў дыялектах. Вяртаешся дадому – і гаворыш на такой дзіўнай сумесі гаворак, што сябры, калі пастараюцца, змогуць вылічыць, дзе вас увесь час насіла.

А з геаграфіяй усё прасцей: нават калі вы вывучылі ў школе, дзе знаходзіцца тая ці іншая краіна, які там клімат, асаблівасці жыцця, палітычнае становішча, асноўныя гарады, рэльеф і назвы рэк, – усё роўна, пакуль там не пабываеш, словы ў падручніку застаюцца словамі. Можна выдатна ведаць геаграфію, але тым не менш падарожнік – практык, а географ застанецца тэарэтыкам. Гэта ўсё роўна, што быць доктарам і нікога не лячыць.

Крысціна Карчэўская. “Аўтастоп, ці як вандраваць, не марнуючы грошай”.

9. Іншы раз, калі гартаеш кнігі па гісторыі Беларусі, так хочацца за фактамі і датамі гістарычных падзей убачыць людзей, пра якіх у летапісах, або дакументах, або манаграфіях напісана толькі некалькі радкоў, даведацца пра тое, як яны жылі, чаму радаваліся і аб чым сумавалі, прачытаць хоць адно моўленае імі слоўца, паглядзець на іх партрэты, каб наблізіць да сябе той далёкі час і стаць сведкам усяму, што некалі адбывалася.

Нічога новага не адкрыю, калі скажу, што гісторыя – гэта не толькі даты падзей і ясныя, на падставе сведчанняў сучаснікаў факты (хаця іх, безумоўна, трэба ведаць, каб хтосьці не спекуляваў на гістарычнай неадукаванасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

народа), але і духоўны скарб, які стагоддзямі збіраўся народам і жывіць ягоную памяць, абуджае нацыянальную свядомасць. Гэта таксама маральныя ўрокі, што засцерагаюць нас ад паўтарэння памылак. Гэта і запавет любіць і шанаваць сваю Бацькаўшчыну, запавет, перададзены нам бацькамі і дзядамі.

Вітаўт Чаропка. "Імя ў летапісе".

11. Прыгадваю Хойнікі пары свайго маленства і юнацтва, калі пад рослымі таполямі ўсцяж галоўнай вуліцы хадзіў з першым здзіўленнем ад вялікага паселішча і мноства сустрэчных незнаёмых людзей. Першыя купленыя ў кнігарні на рагу вуліцы мастацкія кнігі з вабным свежым пахам друкарскай фарбы. Сцены драўлянага будынка рэдакцыі, куды патаемна-жадана хацелася зазірнуць, пабачыць, як робіцца газета, дзе быў ужо змешчаны і мой першы верш.

Памятаю да драбніц той красавіцкі сонечны дзень, калі мая класная аб нечым па-змоўніцку пашапталася з мамай на вуліцы; потым у матчыным гародчыку, дзе капаў грады, з немалым хваляваннем паведамілі мне, што званілі з рэдакцыі, прасілі заўтра прыехаць. Мама глянула спагаднымі вачамі, класная падбадзёрыла: калі клічуць, значыць, упадабалі вершы, едзь смела.

Не вельмі смела, аднак, пераступаў я парог хойніцкай раёнкі. Потым ужо, часта бываючы тут і нават з паўгода працуючы ў студэнцкім адпачынку, прыгадваў багата астылае ўжо сваё колішняе хваляванне, бо знайшоў у рэдакцыі сапраўдных сяброў, першых літаратурных настаўнікаў.

Мікола Мятліцкі. "Цяпло буслінага крыла".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

13. Бадзёрым ядраным жнівеньскім ранкам бег я на Цнянскае возера. Рабіць гэтую прабежку ўдаецца нячаста: у Мінску бываю летам рэдка. Вуліцу подбегам перасек на пераходзе-зебры, выбраўся на сцежку між дамамі і тут спыніўся: каля тарцовай сцяны шэрага дзевяціпавярховага гмаха расцвілі мальвы – чырвоныя, ружовыя, жоўтыя, белыя. Кветкі густа стаялі па краях шырокай градкі, на якой лапушылася бульба.

З-за вугла суседняга шэрага дзевяціпавярховіка выбліснула сонца. Мутна-ружовае, але ўжо цёплае, яно заліло промнямі градку – успыхнулі кроплі расы на шырозным лісці мальвы, буйныя зоркі-кветкі засвяціліся мокрымі пялёсткамі.

Маланкай выбліснуў успамін з далёкага маленства: у нашым палісадніку каля тарцовай сцяны новай хаты, якую збудавалі ў тысяча дзевяцьсот сорак шостым годзе, бо старую спалілі немцы, калі ўцякалі з Прыбяседдзя, раслі вяргіні і мальвы. Вяргіняў было два кусты: на адным кветкі цёмна-чырвоныя, а на другім – жоўтыя, круглыя, быццам сонечныя шарыкі. А між гэтымі кустамі высіліся тонкія сцяблінкі мальваў, на якіх красаваліся, быццам прыклееныя, ружовыя кветкі.

Леанід Левановіч. “Свята мальвы”.

15. Надвор’е і сапраўды ўсталявалася цудоўнае, якое звычайна бывае ў гэтую пару, і дзень выдаўся пагодны, цёплы. Паветра чысцюткае і празрыстае, хоць і лётаюць у ім, ззяючы на сонцы, тонкія павуцінкі. Яны

ўсюды – на пожнях, лугах і агародах – сумна дзівяць чалавечае вока сваім бляскам. Ні хмаркі, ні аблачынкі, ні ветрыку, а павуцінкі лётаюць, пераносячы на сваіх нітачках плоймы дробных павучкоў. Відаць здалёк, як прыбраліся ў барвовыя і жоўтыя колеры зарэчныя лясы, зазелянела вераснёвая рунь. Ля дарогі красавалася некалькі арабін, а паміж рэдкага лісця віселі, як дзявочыя завушніцы, даспелыя гронкі ягад.

Час, здавалася, прыпыніў сваю хаду, а свет нібы пашырыўся: бачна ва ўсе бакі. Прасторна, мусіць, ад таго, што ўсё сабралі, скасілі, абцерабілі. З неба, на якім пачалі ўжо з’яўляцца рэдкія белыя аблачыны, на ўвесь гэты свет задумліва пазірала ласкавае, ужо крыху астылае сонца.

Уладзімір Гніламёдаў. “Валошкі на мяжы”.

17. Адскочыць, надбавіць, падсохлы, зберагчы, спусцелы, рассыпаць, расквечаны, штаб-афіцэр, тэлефон-аўтамат, малаэфектыўны, добра ўгноены, буда-кашалёўскі, празрыста-ружовы, іванмележаўскі, кісла-салодкі, хто-ніхто, залетась, пароўну, зусім, з усім класам, штодзень, удвух, у адно, дашчэнту, наніз, усё адно, у даль, па-воўчы, раз-пораз, абы-дзе, толькі што, даволі-такі, чытала ж, абы-хто, абы з кім, нявольнік, неабходны, нежаданне, неўзараныя палеткі, не закончанае на занятках практыкаванне, недабор, недасаліць, не дапісаць да канца артыкул, лекцыя не закончана, не мой, а твой, не варта, не супраць, нікудышны, ні сцюжа, ні ў кога.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Навучальныя выбарачныя дыктанты

1. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Патлумачце. Выпішыце з тэксту 5 слоў з арфаграмамі, абумоўленымі фанетычным прынцыпам правапісу.

Яны ішлі доўга. Прайшлі паўз паляну дзе было складзена бярве(н, нне) і дровы. Матка [мядзведзіца] перавярнула некалькі калод знайшла пад імі багата чарвякоў розных і забыўшыся на Мішкава н…паслушэнства частавала яго і ласавала. У пале(н, нн)іцы дроў выпарала нев…лічкае гн…здзечка. У ім было з паўдз…сятка маленькіх сін…ватых яечак. Яны былі на…звычайна смачныя і Мішка аж задзіраў пысу (ў, у)/гору завярнуўшы ў трубачку язык высмоктваў іх і, забыўшыся, глытаў і шкарлупкі.

Пасля пайшлі праз балота старанна абышлі месца дзе чуваць былі конскія балабоны з балабонамі чуваць былі і лю…скія галасы. І хоць Мішка ні разу чалавека н… бачыў але па тым як (ў, у)хілялася старая маці ад сустрэч з чалавекам а…чуваў што гэта няйначай самы хітры вораг, а ма…чыма што нават горшы, чымся жаба альбо чмель ці скажам вожык. З гэтымі ўсімі паспеў пазнаёміцца Мішка і знаёмства не дало яму асаблівай прыемнасці.

Міхась Лынькоў. “Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў”.

***** Патлумачце значэнне слова *балабоны*.

2. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце. Выпішыце з тэксту 5 слоў з арфаграмамі, абумоўленымі фанетычным прынцыпам напісання, і 5 слоў з арфаграмамі, абумоўленымі марфалагічным прынцыпам.

Так, кожная птушка заўзята клапоціцца а пры пагрозе і а…чайна абараняе гняздо сваё. А што ж мы, людзі? Безумоўна большасць з нас рупна ставіцца да сваёй кватэры хаты па…вор’я. На жаль н…мала і такіх якія лічаць: усё тое што знаходзіцца за (у, ў)ласнымі дзвярыма або плотам з’яўляецца чужым і па…трымліваць або наводзіць там парадак н… іхняя справа. Але ж (у, ў)ва ўсіх нас жыхароў планеты ёсць агульны вялізны дом які неабходна бера…чы і бараніць разумна, св…дома, у лепшых традыцыях сусветнай практыкі і векавой культуры. Гэта – прырода, тое, асяро(дз, ддз)е (у, ў) якім мы жывём сё(н, нн)я і якое пакінем нашча…кам.

Прырода н…/ведае дзяржаўных межаў. Паветра вада звер або птушка ігнаруюць кантрольна/прапускныя пункты мытні шлагба…мы. І хаця ў кожнага рэгіёна краіны існуюць свае спецыфічныя экалагічныя праблемы, пасп…хова вырашыць іх ма…чыма толькі сумеснымі намага(н,нн)ямі сусветнай грама…скасці выпрацоўкай агульных мер патрабава(н,нн)яў і адносін да аховы прыроды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мікола Аўсіевіч. "Любіць гняздо сваё".

* Вызначце тып маўлення і стыль тэксту. Вывад абгрунтуйце.

3. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце. Выпішыце з тэксту 5 слоў з арфаграмамі, заснаванымі на фанетычным прынцыпе напісання.

Калі блукаючы па залах музея раптоўна апыне…ся ля партрэта прыгожай жанчыны амаль заўсёды ў…нікае неадольнае жаданне даведацца пра яе лёс. Прыгажос…ць чалавечая, жаночая, ды яшчэ праведзеная майстрам праз прызму мастацтва, прыцягвае як магніт. Так на працягу н… аднаго стагоддзя мастацтвазнаўцы і гісторыкі вышуквалі све…чанні пра славутую леанардаўскую Мону Лізу і рафаэлеўскую Фарнарыну. Так калісьці з-за незвычайнай прывабнай выявы егіпецкай царыцы Нефер…іці ўвесь свет раптам зацікавіўся яе асабістым жыццём.

Са славутай беларускай прыгажуняй XVI стагоддзя Барбарай Радзівіл адбылося інакш. Спачатку мы даведаліся пра яе поўны драматызм… лёс вярнулі ў скарбонку народнай памяці ўжо амаль забытае яе імя і толькі пасля пачалі знаёміцца з яе партрэтамі параўноўваючы складз…ны ўжо ў нашай душы вобраз "першай красуні Вялікага кня…тва Літоўскага і Каралеўства Польскага" з тымі што данеслі да нас мастакі якім пашчасціла на ўласныя вочы пабачыць Барбару.

Ірына Масляніцына. "Першая прыгажуня Рэчы Паспалітай".

* Вызначце, да якога тыпу маўлення належыць тэкст.

4. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце. Выпішыце з тэксту 5 слоў з арфаграмамі, абумоўленымі марфалагічным прынцыпам напісання.

Дзівосна прыгожай на (Н, н)арачанскім узбярэ(ж, жж)ы была кожная пара сутак, але мабыць асаблівая прыродная лагода ўсталёўвалася апоўдні калі ўсё таіла ў сабе рэдкую ўнутраную гармонію і святло што своеасабліва ўтаймоўвалі, здавалася, усе супярэчлівыя думкі і пачуцці.

Мерна зыбаецца ў цёмна/сінім прадонні возера. Коцяцца набягаючы адна на адну то наступаючы на бераг то адступаючы ад яго не/высокія хвалі. Час ад часу цверазіць адчуванні мяккі подых вогкага ветру. Стрыманы водар не такой ужо і цёплай азёрнай вады пераплятаецца з церпкім сасновым пахам. На добрыя метраў сто, а то і болей ад берага – тут зусім не/глыбока. І таму каб а…чуць усім целам гаючую сілу і вабнасць цудадзейных нарачанскіх хваль трэба ісці і ісці. Пакуль ідзеш – звыкаешся з прахалодай і золкасцю і пасля на/поўніцу а…чуваеш усю радасць яднання з жыццядайнай азёрнай стыхіяй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Абавязкова трапляеш і на дз….ве бруістыя крынічкі вуркатанне якіх чуецца здалёк. У гэтым баку прыбярэ(ж, жж)а пабіта хмызоўем і яны прытаіліся ў засені разлапістага арэшніку і ажыны за некалькі дз…сяткаў крокаў ад станцыі пракат… лодак і катамаранаў. Тонкая нітка ручайка ад іх спадае непасрэдна ў возера дзелячы акрайчык прыбалочанай мясцінкі на дз…ве палавіны – усходнюю і заходнюю.

Мікола Мікуліч. "Шумяць нарачанскія сосны…"

* Патлумачце значэнне слова *вогкі*.

5. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце. Выпішыце з тэксту сказы з аднароднымі членамі сказа.

Старая зіма што/дня па-ранейшаму нагад(ыва, ва)ла пра сябе лютаўскім пранізлівым холадам, а з/рэдку і сыпкім вечарамі рыпучым пад нагамі снегам.

Адзінай, бадай, магутнай вясновай прыкметай зрабілася неба. Яно раптам узнялося над горадам незвычайна высока. Гэтакім высокім небасхіл можна ўбачыць над галавою толькі ў сакавіку. І, мабыць ад той чыстай прасторы яшчэ марознае паветра раздалося. І, нарэшце, адразу запахла вясною. Паплыло з дахаў старых дамоў. Старадаўнім адвечным срэбрам навыпера…кі мя(к, кк)а застукалі ўсім прыемныя д…ўгачаканыя і вясёлыя малаточкі капяжу.

"Вяс-на прый-шла! Вяс-на прый-шла!" – дружнымі тонкімі галасочкамі хорам спявалі ў промнях сонца залацістыя, крыштальныя кропелькі. Іх урачыстую святочна/дзівосную песню з асалодай слухалі першыя чорна-бліскучыя шпакі з заміраннем сэрца зачаравана слухалі закаханыя. Вясна непаўторнай сімфоніяй запаланіла ўсе ціхія вулкі (у, ў)се-(ў, у)се ўтульныя закуткі аднапав…рховага драўлянага Мінска. А на шырокіх людных сучасных праспектах на хуткасных магістралях вялізнага сталічнага горада гасцяваў толькі лагодны в…сновы настрой. Што зробіш, тут назойлівай какафоніяй панавалі зусім іншыя гукі народжаныя іншымі пес…нямі іншымі рытмамі…

Мар'ян Віж. "Гарадскія кветкі".

* Патлумачце значэнне слова *какафонія*. Падбярыце сінонімы да слова *магістраль*.

6. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Выпішыце сказы з адасобленымі членамі, патлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Павісла сонца над крутой гарой.

Яно ўсё ніжэй і ніжэй апускаецца над зямлёй вось уселася ўжо на сук вілаватага дуба – на гары, па/над кручай. Здаецца, угінаецца сук пад сонцам і вось-вось скоціцца яно бразнецца на зямлю расколецца на бліскучыя аскялёпкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Але сонца цэлае толькі робіцца ўсё большым і большым абліваючы чырванню верхавіны дубоў ветраковыя махі і статак курганаў. Чырва(нн, н)ю гарыць неба і ў гэтай чырвані губляе сонца сваю залатую празрыстас…ць – можаш смела глядзець у векавечнае сонцава вока гатовае замружыць свае каснікі/вейкі на адпачын на ноч, на сонечны сон. І здаецца пераплятаюцца празрыстыя прамяні з нябеснымі струменямі цішыні з крышталёвым спакоем вечара з ледзь чутнымі подыхамі вячэрняга ветрык… . Ён нясе з паплавоў пах росных красак пах травы медуніцы пах со(нн, н)ага чабору з/па/над кручы. Сіратой праляціць пчала, дзынкнуў і спалохана змоўк выцяўшыся аб сцябліну чмель спяшаючыся на радзімую купіну. Дзесьці ля балот забл…яў баранчык яму адгукнулася над Дняпром кнігаўка і адразу пачалі цямнець і прыб…рэжныя кусты і вілаватыя дубы над крутой гарой і ў кудзеркі туману пачалі спавівацца вядзяныя струмені. Дняпро дыхнуў халадком, вільга(цц, ц)ю ды пахам прыбярэжнае цвілі, гнілога багавіння і рыбнае мелюзгі павыкіданых за дзень рыбалкамі.

Міхась Лынькоў. “На чырвоных лядах”.

* Растлумачце значэнне слоў *вілаваты*, *каснікі*, *замружыць*. Вызначце, да яго тыпу маўлення належыць тэкст.

7. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Выпішыце сказы з аднароднымі азначэннямі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Восень была ў розныя гады самая не/звычайная сонечная і сухая марасяная не/проста дажджлівая але мокрая стылая з прасветам і радасным першым і другім “бабчыным летам”. Былі абмалот збажыны ў калгасным гумне сушка і трапа(нн, н)е лёну, попрадкі калі моладзь, як і іхнія прадзеды, па вечарах гуртавалася ў чыёйсьці не столькі прасторнай, колькі гасці(нн, н)ай хаце, дзе былі прыветлівыя гаспадары і незамужнія дзяўчаты. Ды наступалі і наступалі шэрыя, шэра/цёмныя, усё больш азмрачнелыя, што/дзень карацейшыя дні, што пасля шчасліва абноўліваліся: пасля запускаў і посту пачыналася часіна шчаслівых вясе(лл, л)яў.

Восень маючы моц ад в…сны і лета не хутка здавалася: зляцелі многія птушкі, жоўта/чырвонае лісце апала паступова пачарнела абвадзянела, падгніло на зямлі аціхла поле аглушэў лес пачарнела вада ў блізкай рэ…цы, Нёмане, усё больш сілы набірае непагадзь, і вось першыя ўжо камякі бухмастага снег… .

Генрых Далідовіч. “Сярод поля, сярод лесу”.

* Патлумачце значэнне слоў *попрадкі*, *бухмасты*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

8. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Выпішыце складаныя сказы.  Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Пабудуйце схемы.

Вясна прыйшла неяк раптоўна. З/вечара снег мацаваў даволі востры марозік і нельга было падумаць што ўсё рушыцца раніцаю. Сонца ахутанае шэраю смугою н…смела і ленавата ўставала з/за лесу і здавалася што яму н(е, я)/хочацца прачынацца. А калі ўзнялося ў/гору сажні на тры над лесам усё змянілася. Шэрань знікла як бы яе і не было а сонца расплюшчыла шырока вочы  ды глянула на палі вакол і ўсё скрозь закіпела: снег адруз, з узгоркаў памчалі ручаіны. На рэ…цы ледзяныя брыжы пачалі адставаць ад берагоў. З/поўдня паказаліся чорныя плямы на схілах узгоркаў. Над імі ледз… прыкметна падымалася белая пара. Можна было падумаць што зямля варушыцца і моцна ўздыхае пасля доўгага зімовага сну. Высозны кран на будаўні…тве маркотна падымаў сваю доўгую стралу паглядаючы далёка за лес адкуль плылі цёлыя в…снавыя вятры. Яму ўжо не было чаго рабіць а  ён не прывык прастойваць без работы.

Пятрусь Броўка. “Калі зліваюцца рэкі”.

* Патлумачце значэнне слова *брыжы*.

9. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Выпішыце сказы, у якіх (згодна з правіламі беларускай пунктуацыі) неабходна паставіць двукроп’е.  Растлумачце.

Беларускі народны касцюм набыў завершанасць у XIV – XVI стаго(ддз, дз)ях, калі склаліся яго асноўныя рысы строгасць адзінства кампазіцыі перавага белага колеру спалучэнне яго з чырвоным у арнаменце. Пазней ён удасканальваўся набываў рэгіянальныя адметнасць і выразнасць і пастунова праз вопыт многіх пакаленняў зрабіўся традыцыйным класічным узорам народнага мастацтва, цесна звязаным з іншымі праявамі жыцця з інтэр…ерам сялянскай хаты м…лодыкай музыкі пластыкай танца беларускімі кра…відамі.

Тканіны для народнага адзення выраблялiся з воўны і лён… і ўпрыгож(ыва, ва)ліся набіўным узорам або ткаліся з нітак рознага колеру. Наогул,  лён – адзін з асноўных матэрыялаў на Беларусі грубы, неадбел(ен, ян)ы, аздоблены арнаментам  для летняй спадніцы; тонкі, кужэльны  на кушулю, намітку ці фартух.

Усе часткі строю пашытыя з ільн… аб’ядноўваліся чырвоным ці чырвона/чорным арнаментам (у старажытнасці чырвоны колер сімвалізаваў жыццё, абараняў уладара ад розных няшчасцяў, хвароб і злых духаў), тканым ці вышытым. У хатніх умовах на кроснах ткалі так/сама воўну. З ільн… пасля пэўнай апрацоўкі атрымліваліся ў асноўным  усё ніжняе і летняе верхняе адзенне, з воўны – верхняе. У XVII стагоддзі купіць крамныя тканіны с…ляніну

было амаль што не/магчыма таму святочная вопратка адрознівалася ад будзённай толькі аздабленнем і колькасцю ўпрыгожванняў.

Таццяна Церашковіч. “Лялька беларуская”.

* Патлумачце значэнне слоў *строй, крамны, кужэльны.*

10. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Выпішыце з тэксту простыя сказы. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

У тр... маіх пушчанскіх школах якія трэба было прайсці каб атрымаць с...рэднюю адукацыю настаўнікі траплялiся больш за ўсё строгія. Я кажу пра тую самую выхаваўчую строгасць на якую не варта крыўдзіцца бо ўсё гэта дзеля нашай жа карысці дый сам час пасля/вае(н, нн)ы тр...вожны і не/ўладкава(н, нн)ы відаць вымагаў яе чалавечай строгасці нават суровасці. Таму і здз...віў мяне мой першы паэтычны настаўнік сваёй лагодай прыязнасцю і зусім тактоўнай абыходлівасцю з намі тады яшчэ “з...лёнымі”.

Было гэта ў тым шараватым будынку на/супраць пастамент... з танкам блі...ка ад біблі...тэкі і нашага ...ніверсітэ...кага філфака. Мы доўга не адваж(ва, ыва)ліся пераступіць парог таго пако... хоць дзверы яго былі р...знасцежа(н, нн)ы. Сустрэў нас ён сам Мікола Аўрамчык зага...чык паэтычнага а(дз, ддз)ела часопіса. Н.../смела выцяг(ва, іва)лі мы з кішэні па/палам складзе(н, нн)ыя старонкі вучнёўскіх ...шыткаў клалі яму на стол. А побач с...дзелі яшчэ нейкія людзі супрацоўнікі часопіса але мы апрача яго больш н...кога не заўважалі.

Казімір Камейша. “Вярнуцца ў Плёсы...”

***** Падбярыце да тэксту загаловак. Патлумачце значэнне выразу *дзверы р...знасцежа(н, нн)ы.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

11. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце. Выпішыце з тэксту сказы з адасобленымі азначэннямі.

Вясна ўпарта стукалася ў ...вёрды снежны покрыў сонечнымі промнямі як у шкарлупіну яйка. За дзень снег прыкметна раставаў на...драваты і ашэрхлы шаргацеў пад нагамі нават вецер дз...муў па/вясноваму цёплы. І гэта была не проста а...ліга бо набліжаўся сакавік першы в...сновы месяц калі гаспадар мусіў агледз...ць усё начы...е плуг воз барану ...упраж каб быць гатовым да с...ўбы. Праўда па нача... яшчэ прыпякаў мароз і неба на захадзе было чырвонае і чыстае...

За два сонечны... сакавіцкі... тыдн... расталі высокія гурбы снегу расцякліся зіхоткімі ручаінамі ў сажалкі нізінкі паплавы і бало...цы. Снег чапляўся за зямлю ў цян...ку за хатаю ці пад варотамі ...чарнелы і на...драваты хворы не падобны да сябе а свет радаваўся д...ўгачаканаму ц...плу. І лю...скія душы прыхавана хваляваліся ў пра...чуванні росквіт... і шчасця.

Зінаіда Дудзюк. “Слодыч і атрута”.

* Знайдзіце ў тэксце словы, ужытыя ў пераносным значэнні. Вызначце, на аснове чаго (падабенства або сумежнасці) адбыўся перанос назвы.

12. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Выпішыце з тэксту ўласныя назоўнікі, растлумачце іх правапіс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Той хто бываў у (П, п)олацк... ведае (В, в)ал (І, і)вана (Г, г)рознага. Узвышаецца ён у гістарычным цэнтры горада парослы хмызняком з аднаго бок... абмываемы хуткаплы...ай а...мялелай (П, п)алатой з (Ч, ч)ырвоным мостам праз яе а з другога па...ступае да муроў былога (К, к)адэ...кага корпус... . Велічны і н...калі не/прыступны ён адзін з сімвалаў бацькі гарадоў беларускіх і кожны палачанін хоць раз у жыцці падымаўся на яго вышыню блукаў сярод в...чыстых дрэў па ву...кіх сц...жынках з якіх а...крываецца від на ціхія за...улкі з прыватнымі драўля(н, нн)ымі дамамі сярод якіх у апошні час сталі з...яўляцца ш...коўныя асабнякі "новых беларусаў".

Тысячы разоў я бываў у гэтых мясцінах дыхаў не/параўнальным водарам (П, п)олацкай даўніны любаваўся не/звычайнай прыгажосцю гэтага кутка любага мне горада. І калі не так даўно сівы мой з...мляк (А, а)лесь (А, а)нуфр...евіч (С, с)авіцкі з якім мы чарговы раз прыехалі ў наш (П, п)олацк прапанаваў мне падняцца на (В, в)ал з радасцю згадзіўся.

Навум Гальпяровіч. "Самы высокі паверх".

***** Падбярыце сінонімы і антонімы да слоў *велічны*, *ціхі*, *ш...коўны*.

13. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце. Выпішыце з тэксту адносныя прыметнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Свет "(П, п)але...кай хронікі" гэта (М, м)ележаўскі свет ім створа(н, нн)ы ім узноўле(н, нн)ы аналаг р...альнага нацы...льнага беларускага свет... -- у прыродз... побыц... прац... лю...скіх характарах у чалавечых паводзінах у эмацы...нальна/духоўным ладзе. І гэта напэўна галоўная вартасць твора яна гарантуе яму жыццё сучаснае і будучае. Д...ўгавечнасць "Хронікі" яе пастаянная актуальнасць не толькі вынік мастацкай р...алізацыі высокага талент... бо выключнае значэнне ў яго канкрэтным увасабленні мелі вось якія моманты жыццёвая аснова твора і час напісання. Праблематыкай ідэйна/мастацкай скірава...асцю раманы Мележа народжа(н, нн)ы грама...скімі ўмовамі духоўнай атмасферай другой паловы шасцідз...сятых гадоў...

У перыяды пераломныя ў жыцці народа такія як р...валюцыя грамадзянская вайна кал...ктывізацыя (А, а)йчынная вайна пытанні ўзаема/ адносін чалавечай свабоды і сацы...льнай неабходнасці ўзнікаюць у асабліва ...острай і бескампраміс...ай форме і патрабуюць адназначнага адказ... . Менавіта гэтыя пытанні ў літаратуры тых гадоў а найперш у жыцці набываюць моцнае гучанне і маюць т...ндэнцыю ярка выяўле(н, нн)ую да гуманістычнага іх вырашэння.

Серафім Андраюк. "Зямля Івана Мележа".

***** Падбярыце спрадвечна беларускія сінанімічныя адпаведнікі да запазычаных слоў *аналаг, р...альны, актуальнасць, р...алізацыя, т...ндэнцыя.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

14. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Выпішыце сказы камбінаванай будовы (з рознымі відамі сувязі). Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Пабудуйце схемы.

Піс...меннік не павінен забываць пра сваіх с...айчы...ікаў і многія не абмяжо...ваюцца толькі кантактамі з чытачамі праз саму кнігу імкнуцца сустракацца з імі на пр...зентацыях сваіх твораў выступаць па радыё на тэл...бачанні перапіс(ва, ыва)цца. Дзякуючы такім сустрэчам у піс...менніка не толькі становіцца больш чытачоў якія будуць выб...раць менавіта ягоныя кнігі але і сам ён можа лепей зразумець іх запатрабаванні.

Успамінаюцца два выпадк... . Па...час сустрэчы дзяцей з Янка... Маўрам адзін дапытлівы школьнік пацікавіўся дзе ўзялі Мірон і Віктар на не/населе(н, нн)ым ...остраве вяроўку. І ў наступным выданні "(П, п)але...кіх рабінзонаў" гэта недарэчнасць была аўтарам папраўле(н, нн)а. Пры сустрэчы з Міхасём Лыньков...м дзеці прасілі напісаць пра Міколку/паравоза ў гады (В, в)ялікай (А, а)йчыннай вайны і Міхась Ціханавіч адказаў што не можа гэтага зрабіць бо ў часы вайны Міколка ўжо не быў хлопчыкам але напісаць пра дзяцей на вайне пааб...цаў.

Сув...зь піс...меннік – чытач па...трымліваецца вядома праз тое што напіса(н, нн)ае шырока распаўсюдж(ва, ыва)ецца дзякуючы публікацыям.

Міхась Кенька. "Літаратурныя сувязі".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***** Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце адказ. Растлумачце сваё разуменне сувязі *піс...меннік – чытач*. Якім чынам яна ажыццяўляецца ў вас?

15. Спачатку выпішыце словы, якія пішуцца з *не* разам, а потым – словы, якія пішуцца з *не* асобна.

Ні/ў/кога, не/прыяцель, не/высокі, далёка не/поўны, не/раней чым заўтра, н(е, я)/божчык, н(е, я)/ўрымслівы, ні/з/чым, нічуць не/варты, не/лепшы за яе, н(е, я)/бачаны, н(е, я)/праўда, ні/з/якім, ніколькі не/вузкі, не/горшы за брата, н(е, я)/ўрод, н(е, я)/бачны, не/лягчэй чым сёння, ані/хто, нічуць не/прыгожы, н(е, я)/ўмельства, далёка не/разумны, н(е, я)/блага, не/эфектыўней чым заўсёды, ані/што, ані/колі, н(е, я)/ўмека, зусім не/тоўсты, н(е, я)/важны, не/цікавей чым цяпер, ані/як, нічуць не/большы, не/горш як было, н(е, я)/верны, н(е, я)/веруючы, н(е, я)/стрымана, ані/які, далёка не/рашучы, не/лепш чым тут, н(е, я)/ўстойка, не/вясёлы, ніколькі не/складана, ані/чый, ані/з кім, далёка (не, ня)/лёгкі, не/паўней як у бочцы, н(е, я)/яўка, зусім не/прывабны, не/больш як з гектар, н(е, я)/вораны.

16. Спачатку выпішыце словы, якія пішуцца разам, а потым – словы, якія пішуцца праз злучок.

Водна/маторны, кіна/механік, водна/энергетычны, чалавека/год, астрашыцка/гарадоцкі, ваенна/палявы, контр/агент, мяса/кансервавы, ваенна/палонны, горна/заводскі, мэта/накіраваны, камер/юнкер, кілават/гадзіна, сацыяльна/бытавы, норд/ост, літаратура/знаўчы, ледзь/улоўны, грамадска/палітычны, грамадска/вытворчы, паравоза/зборачны, рабочы/спецыяліст, Масква/Таварная, хлорыста/вадародны, горна/рабочы, грамадска/карысны, бела/палякі, грос/майстар, Масква/рака, паў/Беларусі, светла/зялёны, вытворча/неабходны, вытворча/фінансавы, відэа/тэхніка, Буда/Кашалёва, конна/спартыўны, лічыльна/аналітычны, конна/ручны, гама/пластыка, капіравальна/фрэзерны, азотна/свінцовы, народа/ўладдзе, экс/прэзідэнт, жоўта/лісце, суцэльна/металічны, паўднёва/амерыканскі, глыбока/паважаны, малата/боец, музыкальна/сцэнічны, музыка/знаўства, знешне/падобны.

**Даведка**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Яны ішлі доўга. Прайшлі паўз паляну, дзе было складзена бярвенне і дровы. Матка [мядзведзіца] перавярнула некалькі калод, знайшла пад імі багата чарвякоў розных і, забыўшыся на Мішкава непаслушэнства, частавала яго і ласавала. У паленніцы дроў выпарала невялічкае гняздзечка. У ім было з паўдзясятка маленькіх сіняватых яечак. Яны былі надзвычайна смачныя, і Мішка аж задзіраў пысу ўгору, завярнуўшы ў трубачку язык, высмоктваў іх і, забыўшыся, глытаў і шкарлупкі.

Пасля пайшлі праз балота, старанна абышлі месца, дзе чуваць былі конскія балабоны, з балабонамі чуваць былі і людскія галасы. І хоць Мішка ні разу чалавека не бачыў, але па тым, як ухілялася старая маці ад сустрэч з чалавекам, адчуваў, што гэта няйначай самы хітры вораг, а магчыма, што нават горшы, чымся жаба альбо чмель, ці, скажам, вожык. З гэтымі ўсімі паспеў пазнаёміцца Мішка і знаёмства не дало яму асаблівай прыемнасці.

Міхась Лынькоў. “Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў”.

2. Так, кожная птушка заўзята клапоціцца, а пры пагрозе і адчайна абараняе гняздо сваё. А што ж мы, людзі? Безумоўна, большасць з нас рупна ставіцца да сваёй кватэры, хаты, падвор’я. На жаль, нямала і такіх, якія лічаць: усё тое, што знаходзіцца за ўласнымі дзвярыма або плотам, з’яўляецца чужым і падтрымліваць або наводзіць там парадак не іхняя справа. Але ж ува ўсіх нас, жыхароў планеты, ёсць агульны вялізны дом, які неабходна берагчы і бараніць разумна, свядома, у лепшых традыцыях сусветнай практыкі і векавой культуры. Гэта – прырода, тое, асяроддзе, у якім мы жывём сёння і якое пакінем нашчадкам.

Прырода не ведае дзяржаўных межаў. Паветра, вада, звер або птушка ігнаруюць кантрольна-прапускныя пункты, мытні, шлагбаумы. І хаця ў кожнага рэгіёна, краіны існуюць свае спецыфічныя экалагічныя праблемы, паспяхова вырашыць іх магчыма толькі сумеснымі намаганнямі сусветнай грамадскасці, выпрацоўкай агульных мер, патрабаванняў і адносін да аховы прыроды.

Мікола Аўсіевіч. “Любіць гняздо сваё”.

3. Калі, блукаючы па залах музея, раптоўна апынешся ля партрэта прыгожай жанчыны, амаль заўсёды ўзнікае неадольнае жаданне даведацца пра яе лёс. Прыгажосць чалавечая, жаночая, ды яшчэ праведзеная майстрам праз прызму мастацтва, прыцягвае, як магніт. Так на працягу не аднаго стагоддзя мастацтвазнаўцы і гісторыкі вышуквалі сведчанні пра славутую леанардаўскую Мону Лізу і рафаэлеўскую Фарнарыну. Так калісьці з-за незвычайнай прывабнай выявы егіпецкай царыцы Неферціці ўвесь свет раптам зацікавіўся яе асабістым жыццём.

Са славутай беларускай прыгажуняй XVI стагоддзя Барбарай Радзівіл адбылося інакш. Спачатку мы даведаліся пра яе поўны драматызму лёс, вярнулі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў скарбонку народнай памяці ўжо маль забытае яе імя і толькі пасля пачалі знаёміцца з яе партрэтамі, параўноўваючы складзены ўжо ў нашай душы вобраз "першай красуні Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага" з тымі, што данеслі да нас мастакі, якім пашчасціла на ўласныя вочы пабачыць Барбару.

Ірына Масляніцына. "Першая прыгажуня Рэчы Паспалітай".

4. Дзівосна прыгожай на нарачанскім узбярэжжы была кожная пара сутак, але, мабыць, асаблівая прыродная лагода ўсталёўвалася апоўдні, калі ўсё таіла ў сабе рэдкую ўнутраную гармонію і святло, што своеасабліва ўтаймоўвалі, здавалася, усе супярэчлівыя думкі і пачуцці.

Мерна зыбаецца ў цёмна-сінім прадонні возера. Коцяцца, набягаючы адна на адну, то наступаючы на бераг, то адступаючы ад яго, невысокія хвалі. Час ад часу цверазіць адчуванні мяккі подых вогкага ветру. Стрыманы водар не такой ужо і цёплай азёрнай вады пераплятаецца з церпкім сасновым пахам. На добрыя метраў сто, а то і болей ад берага – тут зусім неглыбока. І таму, каб адчуць усім целам гаючую сілу і вабнасць цудадзейных нарачанскіх хваль, трэба ісці і ісці. Пакуль ідзеш – звыкаешся з прахалодай і золкасцю і пасля напоўніцу адчуваеш усю радасць яднання з жыццядайнай азёрнай стыхіяй.

Абавязкова трапляеш і на дзве бруістыя крынічкі, вуркатанне якіх чуецца здалёк. У гэтым баку прыбярэжжа пабіта хмызоўем, і яны прытаіліся ў засені разлапістага арэшніку і ажыны за некалькі дзясяткаў крокаў ад станцыі пракату лодак і катамаранаў. Тонкая нітка ручайка ад іх спадае непасрэдна ў возера, дзелячы акрайчык прыбалочанай мясцінкі на дзве палавіны – усходнюю і заходнюю.

Мікола Мікуліч. "Шумяць нарачанскія сосны…"

5. Старая зіма штодня па-ранейшаму нагадвала пра сябе лютаўскім пранізлівым холадам, а зрэдку і сыпкім, вечарамі рыпучым пад нагамі снегам.

Адзінай, бадай, магутнай вясновай прыкметай зрабілася неба. Яно раптам узнялося над горадам незвычайна высока. Гэтакім высокім небасхіл можна ўбачыць над галавою толькі ў сакавіку. І, мабыць, ад той чыстай прасторы яшчэ марознае паветра раздалося. І, нарэшце, адразу запахла вясною. Паплыло з дахаў старых дамоў. Старадаўнім адвечным срэбрам навыперадкі мякка застукалі ўсім прыемныя, доўгачаканыя і вясёлыя малаточкі капяжу.

"Вяс-на прый-шла! Вяс-на прый-шла!" – дружнымі тонкімі галасочкамі хорам спявалі ў промнях сонца залацістыя, крыштальныя кропелькі. Іх урачыстую, святочна-дзівосную песню з асалодай слухалі першыя чорна-бліскучыя шпакі, з заміраннем сэрца зачаравана слухалі закаханыя. Вясна непаўторнай сімфоніяй запаланіла ўсе ціхія вулкі, усе-ўсе ўтульныя закуткі аднапавярховага драўлянага Мінска. А на шырокіх, людных сучасных праспектах, на хуткасных магістралях вялізнага сталічнага горада гасцяваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

толькі лагодны вясновы настрой. Што зробіш, тут назойлівай какафоніяй панавалі зусім іншыя гукі, народжаныя іншымі песнямі, іншымі рытмамі…

Мар’ян Віж. “Гарадскія кветкі”.

6. Павісла сонца над крутой гарой.

Яно ўсё ніжэй і ніжэй апускаецца над зямлёй, вось уселася ўжо на сук вілаватага дуба – на гары, па-над кручай. Здаецца, угінаецца сук пад сонцам і вось-вось скоціцца яно, бразнецца на зямлю, расколецца на бліскучыя аскялёпкі.

Але сонца цэлае, толькі робіцца ўсё большым і большым, абліваючы чырванню верхавіны дубоў, ветраковыя махі і статак курганаў. Чырванню гарыць неба, і ў гэтай чырвані губляе сонца сваю залатую празрыстасць – можаш смела глядзець у векавечнае сонцава вока, гатовае замружыць свае каснікі-вейкі на адпачын на ноч, на сонечны сон. І здаецца, пераплятаюцца празрыстыя прамяні з нябеснымі струменямі цішыні, з крышталёвым спакоем вечара, з ледзь чутнымі подыхамі вячэрняга ветрыку. Ён нясе з паплавоў пах росных красак, пах травы медуніцы, пах соннага чабору з-па-над кручы. Сіратой праляціць пчала, дзынкнуў і спалохана змоўк, выцяўшыся аб сцяблінy чмель, спяшаючыся на радзімую купіну. Дзесьці ля балот забляяў баранчык, яму адгукнулася над Дняпром кнігаўка, і адразу пачалі цямнець і прыбярэжныя кусты, і вілаватыя дубы над крутой гарой, і ў кудзеркі туману пачалі спавівацца вядзяныя струмені. Дняпро дыхнуў халадком, вільгаццю ды пахам прыбярэжнае цвілі, гнілога багавіння і рыбнае мелюзгі, павыкіданых за дзень рыбалкамі.

Міхась Лынькоў. “На чырвоных лядах”.

7. Восень была ў розныя гады самая незвычайная – сонечная і сухая, марасяная, не проста дажджлівая, але мокрая, стылая з прасветам і радасным першым і другім “бабчыным летам”. Былі абмалот збажыны ў калгасным гумне, сушка і трапанне лёну, попрадкі, калі моладзь, як і іхнія прадзеды, па вечарах гуртавалася ў чыёйсьці не столькі прасторнай, колькі гасціннай хаце, дзе былі прыветлівыя гаспадары і незамужнія дзяўчаты. Ды наступалі і наступалі шэрыя, шэра-цёмныя, усё больш азмрачнелыя, штодзень карацейшыя дні, што пасля шчасліва абноўліваліся: пасля запускаў і посту пачыналася часіна шчаслівых вяселляў.

Восень, маючы моц ад вясны і лета, не хутка здавалася: зляцелі многія птушкі, жоўта-чырвонае лісце апала, паступова пачарнела, абвадзянела, падгніло на зямлі, аціхла поле, аглушэў лес, пачарнела вада ў блізкай рэчцы, Нёмане, усё больш сілы набірае непагадзь, і вось першыя ўжо камякі бухмастага снегу.

Генрых Далідовіч. “Сярод поля, сярод лесу”.

8. Вясна прыйшла неяк раптоўна. З вечара снег мацаваў даволі востры марозік, і нельга было падумаць, што ўсё рушыцца раніцаю. Сонца, ахутанае

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

шэраю смугою, нясмела і ленавата ўставала з-за лесу, і здавалася, што яму не хочацца прачынацца. А калі ўзнялося ўгору сажні на тры над лесам, усё змянілася. Шэрань знікла, як бы яе і не было, а сонца расплюшчыла шырока вочы ды глянула на палі вакол, і ўсё скрозь закіпела: снег адруз, з узгоркаў памчалі ручаіны. На рэчцы ледзяныя брыжы пачалі адставаць ад берагоў. З поўдня паказаліся чорныя плямы на схілах узгоркаў. Над імі ледзь прыкметна падымалася белая пара. Можна было падумаць, што зямля варушыцца і моцна ўздыхае пасля доўгага зімовага сну. Высозны кран на будаўніцтве маркотна падымаў сваю доўгую стралу, паглядаючы далёка за лес, адкуль плылі цёлыя веснавыя вятры. Яму ўжо не было чаго рабіць, а ён не прывык прастойваць без работы.

Пятрусь Броўка. “Калі зліваюцца рэкі”.

9. Беларускі народны касцюм набыў завершанасць у XIV – XVI стагоддзях, калі склаліся яго асноўныя рысы: строгасць, адзінства кампазіцыі, перавага белага колеру, спалучэнне яго з чырвоным у арнаменце. Пазней ён удасканальваўся, набываў рэгіянальныя адметнасць і выразнасць і паступова праз вопыт многіх пакаленняў зрабіўся традыцыйным класічным узорам народнага мастацтва, цесна звязаным з іншымі праявамі жыцця: з інтэр’ерам сялянскай хаты, мелодыкай музыкі, пластыкай танца, беларускімі краявідамі.

Тканіны для народнага адзення выраблялiся з воўны і лёну і ўпрыгожваліся набіўным узорам або ткаліся з нітак рознага колеру. Наогул, лён – адзін з асноўных матэрыялаў на Беларусі: грубы, неадбелены, аздоблены арнаментам – для летняй спадніцы; тонкі, кужэльны – на кушулю, намітку ці фартух.

Усе часткі строю, пашытыя з ільну, аб’ядноўваліся чырвоным ці чырвона-чорным арнаментам (у старажытнасці чырвоны колер сімвалізаваў жыццё, абараняў уладара ад розных няшчасцяў, хвароб і злых духаў), тканым ці вышытым. У хатніх умовах на кроснах ткалі таксама воўну. З ільну пасля пэўнай апрацоўкі атрымліваліся ў асноўным усё ніжняе і летняе верхняе адзенне, з воўны – верхняе. У XVII стагоддзі купіць крамныя тканіны селяніну было амаль што немагчыма, таму святочная вопратка адрознівалася ад будзённай толькі аздабленнем і колькасцю ўпрыгожванняў.

Таццяна Церашковіч. “Лялька беларуская”.

10. У трох маіх пушчанскіх школах, якія трэба было прайсці, каб атрымаць сярэднюю адукацыю, настаўнікі траплялiся больш за ўсё строгія. Я кажу пра тую самую выхаваўчую строгасць, на якую не варта крыўдзіцца, бо ўсё гэта

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзеля нашай жа карысці, дый сам час пасляваенны, трывожны і неўладкаваны, відаць, вымагаў яе, чалавечай строгасці, нават суровасці. Таму і здзівіў мяне мой першы паэтычны настаўнік сваёй лагодай, прыязнасцю і зусім тактоўнай абыходлівасцю з намі, тады яшчэ “зялёнымі”.

Было гэта ў тым шараватым будынку насупраць пастамента з танкам, блізка ад бібліятэкі і нашага ўніверсітэцкага філфака. Мы доўга не адважваліся пераступіць парог таго пакоя, хоць дзверы яго былі разнасцежаны. Сустрэў нас ён, сам Мікола Аўрамчык, загадчык паэтычнага аддзела часопіса. Нясмела выцягвалі мы з кішэні папалам складзеныя старонкі вучнёўскіх сшыткаў, клалі яму на стол. А побач сядзелі яшчэ нейкія людзі, супрацоўнікі часопіса, але мы, апрача яго, больш нікога не заўважалі.

Казімір Камейша. “Вярнуцца ў Плёсы...”

11. Вясна ўпарта стукалася ў цвёрды снежны покрыў сонечнымі промнямі, як у шкарлупіну яйка. За дзень снег прыкметна раставаў, наздраваты і ашэрхлы, шаргацеў пад нагамі, нават вецер дзьмуў па-вясноваму цёплы. І гэта была не проста адліга, бо набліжаўся сакавік – першы вясновы месяц, калі гаспадар мусіў агледзець усё начынне: плуг, воз, барану, вупраж, каб быць гатовым да сяўбы. Праўда, па начах яшчэ прыпякаў мароз і неба на захадзе было чырвонае і чыстае...

За два сонечныя сакавіцкія тыдні расталі высокія гурбы снегу, расцякліся зіхоткімі ручаінамі ў сажалкі, нізінкі, паплавы і балотцы. Снег чапляўся за зямлю ў цяньку за хатаю ці пад варотамі, счарнелы і наздраваты, хворы, не падобны да сябе, а свет радаваўся доўгачаканаму цяплу. І людскія душы прыхавана хваляваліся ў прадчуванні росквіту і шчасця.

Зінаіда Дудзюк. “Слодыч і атрута”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

12. Той, хто бываў у Полацку, ведае Вал Івана Грознага. Узвышаецца ён у гістарычным цэнтры горада, парослы хмызняком, з аднаго боку абмываемы хуткаплыннай абмялелай Палатой з Чырвоным мостам праз яе, а з другога – падступае да муроў былога Кадэцкага корпуса. Велічны і некалі непрыступны, ён адзін з сімвалаў бацькі гарадоў беларускіх, і кожны палачанін хоць раз у жыцці падымаўся на яго вышыню, блукаў сярод вячыстых дрэў па вузкіх сцяжынках, з якіх адкрываецца від на ціхія завулкі з прыватнымі драўлянымі дамамі, сярод якіх у апошні час сталі з'яўляцца шыкоўныя асабнякі "новых беларусаў".

Тысячы разоў я бываў у гэтых мясцінах, дыхаў непараўнальным водарам полацкай даўніны, любаваўся незвычайнай прыгажосцю гэтага кутка любага мне горада. І калі не так даўно сівы мой зямляк Алесь Ануфрыевіч Савіцкі, з якім мы чарговы раз прыехалі ў наш Полацк, прапанаваў мне падняцца на Вал, з радасцю згадзіўся.

Навум Гальпяровіч. "Самы высокі паверх".

13. Свет "Палескай хронікі" – гэта мележаўскі свет, ім створаны, ім узноўлены аналаг рэальнага нацыяльнага беларускага свету – у прыродзе, побыце, працы, людскіх характарах, у чалавечых паводзінах, у эмацыянальна-духоўным ладзе. І гэта, напэўна, галоўная вартасць твора: яна гарантуе яму жыццё сучаснае і будучае. Даўгавечнасць "Хронікі", яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пастаянная актуальнасць не толькі вынік мастацкай рэалізацыі высокага таленту, бо выключнае значэнне ў яго канкрэтным увасабленні мелі вось якія моманты: жыццёвая аснова твора і час напісання. Праблематыкай, ідэйна-мастацкай скіраванасцю раманы Мележа народжаны грамадскімі ўмовамі, духоўнай атмасферай другой паловы шасцідзясятых гадоў...

У перыяды, пераломныя ў жыцці народа, такія, як рэвалюцыя, грамадзянская вайна, калектывізацыя, Айчынная вайна, пытанні ўзаемаадносін чалавечай свабоды і сацыяльнай неабходнасці ўзнікаюць у асабліва вострай і бескампраміснай форме і патрабуюць адназначнага адказу. Менавіта гэтыя пытанні ў літаратуры тых гадоў, а найперш у жыцці, набываюць моцнае гучанне і маюць тэндэнцыю, ярка выяўленую, да гуманістычнага іх вырашэння.

Серафім Андраюк. “Зямля Івана Мележа”.

14. Пісьменнік не павінен забываць пра сваіх суайчыннікаў, і многія не абмяжоўваюцца толькі кантактамі з чытачамі праз саму кнігу, імкнуцца сустракацца з імі на прэзентацыях сваіх твораў, выступаць па радыё, на тэлебачанні, перапісвацца. Дзякуючы такім сустрэчам у пісьменніка не толькі становіцца больш чытачоў, якія будуць выбіраць менавіта ягоныя кнігі, але і сам ён можа лепей зразумець іх запатрабаванні.

Успамінаюцца два выпадкі. Падчас сустрэчы дзяцей з Янкам Маўрам адзін дапытлівы школьнік пацікавіўся, дзе ўзялі Мірон і Віктар на ненаселеным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

востраве вяроўку. І ў наступным выданні “Палескіх рабінзонаў” гэта недарэчнасць была аўтарам папраўлена. Пры сустрэчы з Міхасём Лыньковым дзеці прасілі напісаць пра Міколку-паравоза ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і Міхась Ціханавіч адказаў, што не можа гэтага зрабіць, бо ў часы вайны Міколка ўжо не быў хлопчыкам, але напісаць пра дзяцей на вайне паабяцаў.

Сувязь пісьменнік – чытач падтрымліваецца, вядома, праз тое, што напісанае шырока распаўсюджваецца дзякуючы публікацыям.

Міхась Кенька. “Літаратурныя сувязі”.

15. Ні ў кога, непрыяцель, невысокі, далёка не поўны, не раней чым заўтра, нябожчык, няўрымслівы, ні з чым, нічуць не варты, не лепшы за яе, нябачаны, няпраўда, ні з якім, ніколькі не вузкі, не горшы за брата, няўрод, нябачны, не лягчэй чым сёння, аніхто, нічуць не прыгожы, няўмельства, далёка не разумны, няблага, не эфектыўней чым заўсёды, аніштo, аніколі, няўмека, зусім не тоўсты, няважны, не цікавей чым цяпер, аніяк, нічуць не большы, не горш як было, няверны, няверуючы, нястрымана, аніякі, далёка не рашучы, не лепш чым тут, няўстойка, невясёлы, ніколькі не складана, анічый, ані з кім, далёка не лёгкі, не паўней як у бочцы, няяўка, зусім непрывабны, не больш як з гектар, нявораны.

16. Водна-маторны, кінамеханік, воднаэнергетычны, чалавека-год, астрашыцкагарадоцкі, ваенна-палявы, контрагент, мясакансервавы, ваеннапалонны, горназаводскі, мэтанакіраваны, камер-юнкер, кілават-гадзіна, сацыяльна-бытавы, норд-ост, літаратуразнаўчы, ледзь улоўны, грамадска-палітычны, грамадска-вытворчы, паравозазборачны, рабочы-спецыяліст, Масква-Таварная, хлорыставадародны, горнарабочы, грамадска карысны, белапалякі, гросмайстар, Масква-рака, паў-Беларусі, светла-зялёны, вытворча неабходны, вытворча-фінансавы, відэатэхніка, Буда-Кашалёва, коннаспартыўны, лічыльна-аналітычны, конна-ручны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гамапластыка, капіравальна-фрэзерны, азотнасвінцовы, народаўладдзе, экс-прэзідэнт, жоўталісце, суцэльнаметалічны, паўднёва-амерыканскі, глыбока паважаны, малатабоец, музыкальна-сцэнічны, музыказнаўства, знешне падобны.

## ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ (ДРУГАЯ ЧАСТКА) ВМК ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”

### Тлумачальны каментарый

ВМК па дысцыпліне **“Актуальныя праблемы беларускай мовы”** прызначаны для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін.

Асноўная **мэта выкладання дысцыпліны** – развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне будучых спецыялістаў-філолагаў; выпрацаваць уменні і навыкі практычнай рэалізацыі атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці; садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў, здольных паспяхова вырашаць праблемы функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму; выхаваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

ВМК “Актуальныя праблемы беларускай мовы” займае важнае месца ў сістэме лінгвістычнай падрыхтоўкі студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, з’яўляецца дадатковай базай для грунтоўнага засваення беларускай мовы. Пры вывучэнні дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і цесная сувязь яго з ВМК іншых лінгвістычных прадметаў і, у першую чаргу з ВМК па дысцыпліне “Сучасная беларуская літаратурная мова”.

Другая частка практычнага раздзела ўключае (згодна “Палажэння аб вучэбна-метадычным комплексе на ўзроўні вышэйшай адукацыі” пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь) матэрыялы для фарміравання ўстойлівых прыктычных уменняў і навыкаў у аб’ёме, устаноўленым тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура, у прыватнасці, сістэму заданняў да практычных заняткаў, змешчаных у дапаможніку “Сучасная беларуская літаратурная мова: Практычныя заняткі. 3-е выд. Мінск: , 1995. – 287 с.”, а таксама асобныя самастойна распрацаваныя выкладчыкамі практыкаванні, якія можна выкарыстаць на этапе фарміравання і ўдасканалення практычных ўменняў і навыкаў у якасці дыдактычнага матэрыялу. Тэматыка заняткаў адпавядае тэмам і падтэмам базавай вучэбнай праграмы па дысцыпліне.

.

### Метадычныя рэкамендацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асноўнымі метадамі пры правядзенні практычных заняткаў па названым курсе з'яўляюцца практычныя метады (практыкаванні аналітычнага, сінтэтычнага, аналітычна-сінтэтычнага характару, лінгвістычны эксперымент і інш.). Як метад можа выкарыстоўвацца і метад самастойнай працы, заснаваны на самаарганізацыі студэнта пры выкананні заданняў.

Асноўныя прыёмы: прыёмы параўнання і супастаўлення, прыёмы аналізу і сінтэзу, прыёмы класіфікацыі і дыферэнцыяцыі і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ДЫДАКТЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ ДА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

### Лексікалогія

**1. Пакажыце на некалькіх прыкладах з верша П.Панчанкі «Беларуская мова», што слова як моўная адзінка з'яўляецца аб'ектам вывучэння не толькі ў лексікалогіі, але і ў марфалогіі і словаўтварэнні.**

Ільняная і жытнёвая. Сялянская.
Баравая ў казачнай красе.
Старажытная. Ты самая славянская.
Светлая, як травы ў расе.

**2. Вызначце, якія словы маюць лексічнае і граматычнае значэнне, якія — толькі граматычнае, а якія не маюць ні лексічнага, ні граматычнага значэння.**

Урэшце памочнік каменданта, відаць, зразумеў, што сілаю рухавіка з багны не вылезці. Уключыўшы малы газ, ён выскачыў з кабіны і забразгаў засовам машыны.
— Ану — падпіхнём! Ты, Мікалай, і ты, Казёл, вылазьце! Яны сядзелі блізка ля дзвярэй і згодна падняліся *(В.Быкаў)*.

**3. Што такое паняцце? Чым яно адрозніваецца ад слова? Якія з пададзеных ніжэй слоў не з'яўляюцца назвамі паняццяў і чаму?**

Цукар, малако, дрэва, гэты, мой, крапіва, Крапіва, вялікі, чорны, чатыры, ісці, ён, Мікіта, Васіль, цётка, Цётка, ды, бо, быццам, ой, Ніна, Кузьміч, Мінск, Гродна, вуха, Шэкспір, Кіеў, Сяргей, Васіль Быкаў, цёмна, гарлахвацкі.

**4. Карыстаючыся «Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы» (у далейшым ТСБМ), вызначце сэнс слоў, пададзеных ніжэй. Лексічнае значэнне якіх з гэтых слоў раскрываецца сінанімічным спосабам (падборам адпаведнага сіноніма), апісальным (нярэдка гэта выдзяленне спачатку родавых, а затым відавых прымет), структурна-семантычным (раскрыццём значэння па частках слова).**

Рынак, рэзультат, стол, базар, вынік, бульбакапалка, моц, рад, сіла, шэраг, храбры, ноша, водар, волакам, смелы, сасна, панядзелак, аўторак, серада, чацвер, пятніца, світаць, шмат, шчыра, днець, сталявар, мацнець, схуднець, многа, сардэчна, казаць, гаварыць, яблыня, вішня, сліва, сельскагаспадарчы, працавіты, працавітасць, планаваць, памятаць, планавы, планаванне, перасіліць, дубовы, сасновы, помніць, ведаць, знаць.

**5. Паназірайце, якім чынам у ТСБМ тлумачыцца лексічнае значэнне лічэбнікаў, некаторых прыметнікаў, аддзеяслоўных назоўнікаў.**

1. Чатыры, пяць, сем, восем, восемдзесят, васемсот, тысяча, пяты, пятнаццаты, шосты, дзевяты, пяцісоты. 2. Белы, блакітны, зялёны, чырвоны, чорны. 3. Выпілоўванне, падгаворванне, валоданне, падзыванне, выконванне, напамінанне, паддобрыванне, падключэнне, паскарэнне.

**6.** Вызначце **тып лексічных значэнняў выдзеленых слоў (па сувязі назвы з прадметам), пры неабходнасці звяртаючыся да ТСБМ.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Шпак вартуе агароды і *вішнёвы* наш садок. *(Ч.)* 2. Бабуля частавала маладых *вішнёвым* варэннем, Сцяпан дзякаваў, расказваў смешныя гісторыі, і ўсе рагаталі. *(А.С.)* 3. Гэй, жаніх, гані нам выкуп і багаты, і вялікі за кужэльныя косы, за блакітныя вочы, за *вішнёвыя* вусны. *(Панч.)* 4. Я не лезу не ў свае 10 справы — я збіраю *грушы. (Пол.)* 5. Тады была позняя восень. *Грушы* стаялі голыя. *(Пол.)* 6. Злавіўшы, усе забраліся ў адзін сарай і наладзілі кату хрышчэнне ў бочцы з вадкай *зялёнай* фарбай. *(Лыньк.)* 7. Ева прайшлася за *зялёнымі* прысадамі. *(Ас.)* 8. І далей — ва ўсе калгасы: «Вам даводзіцца заданне: сорак тон *зялёнай* масы... Забяспечце выкананне». *(Гіл.)* 9. Каля плота хрумсцелі абабранымі *зялёнымі* яблыкамі дзеці. *(В.А.)* 10. — І аўсы яшчэ, гарохі *зялёныя.* — Збірайце хоць *зялёнае. (Крап.)* 11. *Зялёны* стралец яшчэ не быў навучаны навейшым метадам абалваньвання. *(Дам.)* 12. Цяпер Уляна ведае, што ён праводзіў яе, маладую і такую *зялёную.(У.П.)* 13. *Зялёная* ты яшчэ разведчыца. *(В.Б.)* 14. У Хурса — *галава.* Іх там цэлае згуртаванне, усе грашавітыя і маёнткавыя людзі, тутэйшыя родам і выгнаныя адсюль. Хоць Хурс маёнткаў тут і не пакінуў (ён на гандлі мільёны нажыў), але ён у іх за *галаву. (К.Ч.)*.

**7. Як класіфікуюцца лексічныя значэнні слова паводле яго лексіка-граматычнай спалучальнасці з іншымі словамі? Якія тры тыпы лексічных значэнняў (у залежнасці ад таго, з чым звязана іх спалучальная абмежаванасць) уваходзяць у несвабодныя значэнні?**

**8. Выпішыце словазлучэнні, у якіх дзеяслоў мае фразеалагічна звязанае значэнне і рэалізуе яго толькі пры спалучэнні са словам *вочы (вока)*. Як у ТСБМ пры апісанні лексічнага значэння такіх слоў паказваецца абмежаванасць пэўнага значэння ў спалучальных сувязях з іншымі словамі?**

1. Ядвіня заплюшчыла вочы, потым зноў расплюшчыла. *(М.)* 2. Я ляжаў з расплюшчанымі вачыма і думаў. *(Бр.)* 3. Чалавек прачнуўся, расплюшчыў вочы. *(М.)* 4. Вунь ужо кучаравенькі цікуе за ім, прыплюшчыў вока. *(В.К.)* 5. Сплюшчыўшы вочы на мінуту — і ў памяці маёй усплывае Крысцьянгуту — ціхі кут зямлі чужой. *(Н.г.)* 6. «Божа мой, чаго яны спрачаюцца?» — прыплюснуўшы вочы і знаходзячыся ў нейкім паўзабыцці, падумала Ларыса. *(М.)* 7. Калі расплюшчыў вочы, убачыў каля сябе строгага маладога чалавека ў форме — міліцыянера. *(Н.г.)*

**9. Карыстаючыся ТСБМ, параўнайце канструкцыі *няпрошаны госць* і *рэзаць праўду*. У якой з гэтых канструкцый ёсць слова з фразеалагічна звязаным значэннем, а ў якім абодва словы свабодныя па спалучальнасці?**

1. Хай точыць ім сэрца зялёная злосць, — па смерць сюды прыйдзе няпрошаны госць. *(Крап.)* 2. Яна стаяла на падлозе босая і спакойнымі вачыма пазірала на нас, няпрошаных гасцей. *(Чыгр.)* 3. Гаспадар і гаспадыня няпрошанаму госцю так усыплюць, ажно пёркі ляцяць. *(Ц.)* 4. Песня ўзнікае, як няпрошаная госця. *(І.Н.)* 5. Міканор не прамаўчаў, бязлітасна ўрэзаў праўду-матку пра песню. *(І.М.)* 6. Тарашкевіч доўга расказваў, праўду рэзаў. *(Янк.)* 7.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Раз на судзе ў валасным праўленні земскі сказаў на дзеда, як дзед рэзнуў яму адну праўду... *(К-с)* 8. Вы добра пачалі... Так і рабіце далей — рэжце праўду ў вочы. *(Шам.)*

**10. Выпішыце адзінкі, у якіх адно са слоў мае фразеалагічна звязанае значэнне. Звярніце ўвагу на адзінку *львіная доля* (1-ы сказ). Яна ў ТСБМ (т.2, с. 189) кваліфікуецца як фразеалагізм са значэннем ‘вялікая частка’. Выкажыце іншую думку, супаставіўшы першае значэнне назоўніка *доля* з яго ж значэннем у складзе словазлучэння *львіная доля.***

1. Перадавым краінам Захаду дастаецца львіная доля звыш прыбытку. *(Пол.)*
2. Сам таго не заўважаючы, Генік разявіў рот і з нямым захапленнем глядзеў на гэтае відовішча, на гэты казачны цуд. *(Л.К.)* 3. Снег асядаў на шэрую, добра ўмерзлую зямлю, на ўзятыя крохкім лядком лужыны ў каляінах прасёлачнай дарогі. *(У.С.)*
4. Хлопец суседскі нос расквасіў і раве. *(А.С.)* 5. Як ішлі ў лясы партызаны на заклятага ворага-пана, расступаліся долы і горы, шляхі значылі сонца і зоры. *(Куп.)*
6. Закасаўшы штаны, ён апусціў ногі ў жоўтую ваду. *(М.)* 7. Свой — гэта радня, чужынец — можа, і закляты вораг у якім дваццатым калене. *(Пол.)* 8. Летам лужына звычайна прасыхала і аб’яўлялася толькі пасля праліўнога дажджу. *(М.)*

**11. Дзеяслоў *браць* мае 21 значэнне і 37 адценняў, некаторыя з іх фразеалагічна звязаныя. У пададзеных ніжэй сказах рэалізуюцца фразеалагічна звязаныя значэнні гэтага дзеяслова. Адкажыце якія? Праверце правільнасць свайго адказу, звярнуўшыся да ТСБМ (т.1, с. 403–405).**

1. Максімку браў страх адтаго, што ён выбіраецца ў горад за сорак вёрст. *(К.Ч.)* 2. Паноў браў жах: «Чаму расце Расія? Адкуль узяў рубель такую сілу?» *(Панч.)*
3. Смех браў дзядзьку Марціна, як Барбутовіч аглядаў тыя дровы. *(К-с)* 4. І злосць брала Антона, што Сымон ні на хвіліну спакойна не ўсядзіць. *(Бяд.)* 5. Мікалай Пятровіч быў вельмі заспакоены. Браць адпачынак за свой кошт — невялікая радасць. *(Карш.)*

**12. Калі слова мнагазначнае, то адны яго значэнні могуць быць свабодныя, а другія — фразеалагічна звязаныя. У тлумачальных слоўніках гэтыя значэнні звычайна падаюцца пад канец слоўнікавага артыкула. Карыстаючыся ТСБМ, вызначце, які сэнс рэалізуе кожнае з выдзеленых слоў і ў спалучэнні толькі з якім словам (ці словамі). У ТСБМ (т.2, с. 646 і т.3, с. 658) *кароткая памяць* падаецца за знакам ромба як фразеалагізм са значэннем ‘дрэнная, слабая памяць’. Дакажыце, што гэта не фразеалагізм, а словазлучэнне, у якім лексічнае значэнне прыметніка *кароткая* рэалізуецца толькі ў спалучэнні са строга акрэсленым словам**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***(памяць)*. Пры неабходнасці звярніцеся да кнігі: *Лепешаў І.Я.* Фразеалогія сучаснай беларускай мовы. — Мн., 1998. — С. 11–12.**

1. Забылася, што ён, нябожчык, казаў табе перад апошняй сваёй мінутай. Я прыпомню, калі маеш такую *кароткую* памяць. *(Куп.)* 2. Свой *кароткі* прысуд вырак вязню вясной. *(А.К.)* 3. Поўнасцю аднавіць карціну атрыбутыўнага ўжывання *кароткіх* прыметнікаў у жывой беларускай мове старажытнага часу немагчыма. *(Б.л.)* 4. На старонках нашых часопісаў і газет у апошні час усё менш паяўляецца *траскучай* і халоднай рыторыкі. *(Гіл.)* 5. Злобіч з *глыбокай* павагай адносіўся да Коўбеца. *(Тк.)* 6. Нават *глыбокая* старасць не хоча ісці ад жыцця. *(К-с)* 7. Да *глыбокай* восені праляжаў Пятрусь у бальніцы. *(Гр.)* 8. Ужо сам гэты факт усхваляваў *жывы* розум школьніка, навёўшы яго на думку аб магчымасці мець літаратуру на сваёй роднай мове. *(Пол.)* 9. Мясцовы лічбавы матэрыял выклікае *жывую* цікавасць у вучняў, палягчае вывучэнне ўсіх пытанняў народнай гаспадаркі. *(Н.г.)*

**13. Выпішыце выдзеленыя словы, спачатку — з прамым, зыходным значэннем, потым — з вытворна-прамым і вытворна пераносным, адзначаючы ў дужках, якім спосабам (метафарычным, метанімічным ці сінекдахічным) развіліся вытворна-прамыя і вытворна-пераносныя значэнні.**

1. З *дуба* пры могілках узняліся два груганы, з карканнем, сеючы шум і вецер у вяршалінах дрэў, пацягнулі да ракі. *(В.К.)* 2. Немату трывожылі хіба меладычныя перазвоны дарэвалюцыйнага, у багатым, чорнага моранага *дубу,* масіўным футарале гадзінніка. *(Л.К.)* 3. У Жарстана было сем сыноў, і чацвёра з іх такія ж *дубы*, як і бацька. *(К-с)* 4. Лют і строг, глядзіць дапытліва Гужавін. — Я так і знаў!.. *Дубы!..* Разявы! — Ад гневу ажно лоб узмок. *(Бач.)* 5. Яны паставілі маленькі чысценькі домік пад старой ліпай. Пасадзілі некалькі яблынь, *вішань. (Лыньк.)* 6. У зялёным садзе чырванеюць *вішні,* каласы на браклі бурштынавым сокам. *(Панч.)* 7. А мне гэты хлопец даспадобы, праўда, малады ён зусім, *зялёны*, але з гонарам. *(М.)* 8. Побач з Ядвіняю сядзеў юнак гадоў шаснаццаці і чытаў *Джэка Лондана. (М.)* 9. Першае *золата* восені. Бярозы, грунт, ралля — усё нібы памытае імглой. *(Б.)* 10. Памятаю, якім дзівам, якім цудам здаўся мне бабчын агарод — *бульба*, морква, агуркі, буракі, што растуць проста з зямлі. *(Ар.)* 11. Перад касавіцай кончылася ў паграбе *бульба,* і стары загадаў бабам ачысціць пограб ад бруду. *(Б.)* 12. Кравец пацягнуў з пляшкі, ахнуў, зморшчыўся, налёг на *бульбу. (К.Ч.)* 13. Дзмітрый — з простай сялянскай сям'і, *галава* якой быў кавалём. *(ЛіМ)* 14. Злобіч заспяшаў у *галаву* калоны. *(Тк.)* 15. Ведаў: некаторыя вытлумачваюць яго смеласць сваяцтвам і сяброўствам з Ігнатовічам. Маўляў, маючы такую *руку*, можна выказваць любыя думкі і крытыкаваць любога работніка. *(Шам.)*

**14. Вызначце, якія значэнні слова *бульба* рэалізуюцца ў пададзеных сказах. Якімі спосабамі развіліся 2-е і 3-е значэнні ў гэтым слове? Звяртаючыся да ТСБМ (т.1, с. 418), адкажыце, чаму пры раскрыцці 2-га і 3-га значэнняў абавязкова выкарыстоўваюцца сэнсавыя элементы з**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**дэфініцыі папярэдняга лексічнага значэння («гэтай расліны», «з клубняў гэтай расліны»).**

1. Дзед арандаваў старую сялянскую хатку з гародам для бульбы. *(Бяд.)* 2. І маці стала адзявацца, каб за работу тую брацца; пайшла каровак падаіла і бульбу свінням перамыла. *(К-с)* 3. Дзеля госця Марта напякла скавародку сала, і ўсе мачалі ў яго бульбу і елі ачыста, па-святочнаму. *(Б.)*

**15. Карыстаючыся ТСБМ, растлумачце значэнне слова *галава* ў пададзеных сказах. Адкажыце, якім спосабам развілося тое ці іншае значэнне.**

1. Дзед Талаш зняў шапку і бліснуў лысаю галавою. *(К-с)* 2. Першае — нам трэба каровы, галоў дваццаць ужо закуплена. *(Скр.)* 3. — Гандаль патрабуе добрай галавы, — разважна сказаў Іліко. *(Сам.)* 4. — Вось дык галава! — пакутаваў Сімон. — Гэты чалавек умее гандляваць! *(Сам.)* 5. Пасля смерці жонкі, якая была галавой у хаце, Трахім занядбаў гаспадарку. *(Чарн.)* 6. Пятро тым часам выйшаў на гарод. Там цяпер адны качаны капусты бялелі галовамі. *(Н.)* 7. Былы гарадскі галава сустрэў іх з хлебам і соллю. *(Гур.)* 8. Тыя, што ў галаве чаргі, трымаюцца сваіх месц. *(Л.П.)*

**16. Прывядзіце прыклады сцёртых, або акамянелых, мёртвых, метафар (гэта вытворна-прамыя значэнні слоў), агульнапаэтычных метафар (гэта вытворна-пераносныя значэнні слоў). Якія метафары называюцца індывідуальна-аўтарскімі? Ці ўключаюцца яны ў нарматыўныя слоўнікі? Знайдзіце, побач з іншымі, індывідуальна-аўтарскія метафары і метаніміі.**

1. Відавочных знакаў беднасці не было. Наадварот, усе апрануты ў імпарт і айчынны блат. *(В.К.)* 2. Генадзева маці на раўніне стала ўзвяла горы закускі. *(Бар.)* 3. Насустрач — паляны, насустрач — лясы. Кастрычнік расплміў лясам валасы пад золата.., цёмную медзь. *(Крап.)* 4. Крутая гушчыня слова і выбуховая магутнасць вобраза. *(Б.)* 5. І я тут за дзядзьку мушу назад старонку адгарнуць і аб вясне яго ўздыхнуць. *(К-с)* 6. Я — матчын гнеў, які ўставаў на ногі, гнаў смерць на Захад — у нару з нары — трацілаваю пугай перамогі. *(А.К.)* 7. Бацькі глядзяць на свет шпакоўнямі пустымі, адкуль у вырай вымкнулі вясёлыя шпачкі. *(Бар.)* 8. Чарнобылем, як і сосны, падсочаныя, мы чакаем сваёй сякеры. *(Бар.)* 9. Гэткай катаргі і мукі пяром не апішаш. Прамінула. Толькі думку ўспамін калыша. *(Куп.)* 10. На зязюлю крычаць: — Аліментшчыца! *(Бар.)* 11. Усміхаецеся вы гэтак мякка і добра: «Ну, здабудзь корань кубічны, скажам, з лічбы 1937»... Корань мой — у палескай глебе, корань мой — у сэрцы маці... Усміхаецеся вы гэтак мякка і добра: «Корань зла хай не будзе табе вядомы...» *(С.Б.)* 12. У полі сеялася заўтра. *(Бар.)* 13. Грабель мільганнем, звонам кос трымцяць лілёвыя прасторы, і вось, нібы ў зялёным моры, плыве бухматы воз. *(Крап.)*

**17. Калі словазлучэнне складаецца з некалькіх унутрана звязаных метафар, то перад намі разгорнутая метафара. Нярэдка адно метафарычна выкарыстанае слова (напрыклад, *стада* ў апавяданні З. Бядулі «У**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**шалашы») уздзейнічае на семантыку іншых слоў кантэксту, выклікаючы да жыцця цэлы ланцужок метафар: «З недалёкага ўзмор'я *брыло з вадапою* блакітнае *с т а д а* паўночных вятроў. *Па дарозе* гэтае *стада таптала* зялёную шчэць балотнай травы, *скубла* стагі і *навальвалася грудзьмі* на стары рыбацкі шалаш». Або ў «Пінскай шляхце» В. Дуніна-Марцінкевіча: «Каб сарваць такую прыгожую і багатую кветку, не шкода і ў балоце пакачацца», — гаворыць стары шляхціц Куторга, маючы на ўвазе 17-гадовую Марысю і сваю місію «пакрывіць душой», стаўшы за сведку супраць Ліпскага. Знайдзіце разгорнутыя метафары і растлумачце іх сэнсавы змест.**

1. Ходзіць ходырам свет цэлы, смела ў бітву йдзе нясмелы, ў бой за лепшы час. Дык і нам цапы і косы час браць з вышак, покі росы воч не згрызлі ў нас. *(Куп.)* 2. Бальшыня сваякоў і сяброў перасялілася ў царства ценяў. *(Бар.)* 3. Частуецца пойлам атрутным народ наш з катлоў тэлерадыё. *(В.З.)* 4. Час у Парэчча зноў вярнуцца і ў іншых хвалях купануцца. *(К-с)* 5. Калючым дротам сшытая імперыя нядужа разыходзіцца па швах, бо навырост закройшчыкі адмервалі каптан, кааб вольны ў ката быў размах. Зашпільвалі Валодзечкі і Юзікі капкан-каптан, паганячы зямлю, і адрывалі з мясам тыя гузікі, якія не пралазілі ў пятлю. *(Бар.)* 6. Нас кожны дзень, прызнаць мы мусім гэта, цясней абносіць лютым дротам гета, якое сумна старасцю завецца. *(Бар.)* 7. Абмялеў ручэй яе слоў. Размова набыла бытавы характар. *(Шам.)* 8. І сціскаліся марна радкоў кулакі. І баялася восені лета. Палявалі ваўкі... Балявалі Ляўкі — залачоная клетка Паэта... *(Бар.)* 9. Абклаўся кніжкамі, каб вылушчыць з іх якое-небудзь зернетка. Аднак чужыя каласы аказаліся неўмалотнымі. Таму трэба развязваць свой сноп. *(В.А.)* 10. Поўня лье з даёнкі поўнай малако святла... *(Бар.)* 11. — Апошні раз спачування малю, у стане бязважкасці быў я учора. — Спускайся ўжо з космасу на зямлю, а то завяду дублёра. *(Бар.)* 12. Будуць часам ідалы раструшчаны, свет разумны стоміцца ад крыкаў. Васільком у жыце Беларушчыны назаўсёды застанецца Быкаў. *(Бар.)*

**18. Назіраючы за моваю прыказак, К.Крапіва пісаў: «Часамі дзівіцца прыходзіцца, як гэта людзі, не чытаўшы ніякай паэтыкі, маглі дасягнуць такой высокай ступені вобразнасці... Часта метафара не абмяжоўваецца адным ці двума словамі, а пашыраецца на цэлы сказ...» Падзяліце пададзеныя прыказкі на тры групы: 1) прыказкі, у якіх адбылося скразное пераасэнсаванне ўсіх кампанентаў; 2) прыказкі, у якіх адны кампаненты пераасэнсаваліся, а другія захоўваюць свой першапачатковы сэнс; 3) прыказкі з літаральным значэннем іх слоў-кампанентаў.**

1. Баба з воза — каню лягчэй. 2. На адным месцы і камень мохам абрастае. 3. Век жыві — век вучыся. 4. Кашу маслам не сапсуеш. 5. Багатаму чорт дзяцей калыша. 6. На бязрыб'і і рак рыба. 7. У каханкі смаляныя лаўкі. 8. Воўк сабакі не баіцца, але звягі не любіць. 9. Госць госця не любіць, а гаспадар абодвух. 10. Кабыла здыхае, а траву хапае. 11. На злодзеі шапка гарыць. 12. Яблык ад яблыні недалёка падае. 13. Стары вол баразны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

не псуе. 14. Хто дбае, той і мае. 15. Куй жалеза, пакуль гарачае. 16. Мінулася кату масленіца. 17. Хто мажа, той і едзе. 18. Вучыцца ніколі не позна.

**19. У «Лексікалогіі сучаснай беларускай літаратурнай мовы / Пад рэд. А.Я.Баханькова» (Мн., 1994. — С. 31) чытаем: «Здольнасць аднаго слова адначасова, сінхранічна ўжывацца ў розных значэннях прынята называць мнагазначнасцю, або полісеміяй». Ці ўсё дакладна ў гэтым азначэнні?**

**20. Мнагазначнасць слова шырока выкарыстоўваецца ў мастацкіх і публіцыстычных творах, а таксама ў вусным маўленні для стварэння разнастайных стылістычных эфектаў. Можна вылучыць дзве разнавіднасці абыгрывання мнагазначных слоў. Першая, найбольш пашыраная: слова ўжыта два разы ці болей у мове двух персанажаў або ў аўтарскай мове, але кожны раз з іншым значэннем. Якія значэнні паўтораных слоў рэалізуюцца ў пададзеных урыўках?**

1. Іржавы манеўравы паравоз.., забуксаваўшы і забрызгаўшы на ўсе свае жалезіны і жалезінкі, кранаецца з месца. — *Змазаў* бы хоць, вушы праскрыпіш, — не сцерпіць счэпшчык. — Вось я ўжо калі-небудзь ды *змажу*, ну і *змажу,* месца жывога на табе не пакіну. *(Лыньк.)* 2. Куды ж ён, Саўка, ідзе? З чым ідзе? Што скажа? Скажа, дзе знаходзіцца дзед Талаш з сынам і з Мартынам Рылем. Ён проста *прадасць* іх, як *прадаваў* калісь крадзеных коней. *(К-с)* 3. Гаворыце, што *выйшлі* вы з народа? Куды? Чаму? Якой цяпер пароды? Я са свайго народа не *выходзіў* і жыць да скону буду у народзе. *(Панч.)* 4. Пеўня спачатку *рэжуць*, а потым *скубуць*. А аўтара на кінастудыі спачатку доўга і калектыўна *скубуць*, а нарэшце хто-небудзь *зарэжа*. Што выгадней — варта спытацца ў пеўня. *(Б.)* 5. Ёсць наш *час* і *час* даўнейшы, *час* залаты і *час* пракляты, *час* доўгі і *час* кароткі. Адзін у свой *час* быў вялікім чалавекам, а ў нашы *часы* нічога не варт. Другі стаў бы вялікім чалавекам, але ён не мае *часу*, кааб заняцца сваёю вялікаю справаю. Адзін не мае *часу* носа ўцерці, а другі ные ад таго, што не ведае, куды яму дзець лішні *час*. Ёсць людзі, якія «ўбіваюць» *час*, скарыстоўваюць *час,* нават папярэджваюць *час* і проста марна трацяць *час*. *(Крап.)* 6. Хто, я п’яны?.. Таварыш дырэктар! Каб я так заўтра вас *бачыў*, як *бачыў* сягоння паўлітра. *(Крап.)* 7. [Скаромны:] Во гэты *дзед* — народ? Смеху варты такі народ. Падхалім ты, *дзед*. [Дзед Цыбулька:] Які я табе *дзед*?! Унук мне знайшоўся! Шэры воўк табе *дзед,* а дзікая каза — бабка! *(Мак.)* 8. Жонка расказвае мужу нейкую гісторыю, а той, каб не слухаць, вазьмі і скажы: «Ой, не *брашы*». — Што, я *брашу*? — адразу ўзвілася жонка. — Я *брашу*, значыць, я для цябе сабака? Мама, ён мяне сучкай абазваў! *(Вар.)*

**21. У мове мастацкай літаратуры, а таксама размоўным стылі назіраюцца шматлікія выпадкі адначасовай рэалізацыі розных значэнняў аднаго і таго ж слова, г.зн. кантэкст не ліквідуе мнагазначнасці, а, наадварот, стварае яе. Ёсць шэраг прыёмаў, якімі дасягаецца сэнсавая двухпланавасць. Знайдзіце ў прыкладах словы, ужытыя адзін раз, але адначасова ў двух значэннях.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Тут жа такія людзі, што... За тры гады чатырох старшынь з'елі... Старшыня тут адчувае сябе ўсё роўна як бульба... Калі за зіму не з'ядуць, дык вясной пасадзяць. *(Мак.)* 2. Наабапал іх дарогі стаіць лес, пасівелы ад інею, як і дзед Талаш ад старасці. *(К-с)* 3. Хлопчык! Калі ты будзеш дарослы, кім ты станеш? — Пажарнікам. — А што ты будзеш рабіць? — Тату тушыць. Ён учора трэці раз пагарэў на базе. *(Вож.)* 4. Тата такі хітрун! Калі мама спытала, чаму позна з работы прыйшоў, ён адказаў, што замочваў з сябрамі сваё новае паліто. Я памацала паліто, а яно сухенькае. *(Вож.)* 5. Жанчыны, у адрозненне ад шахматыстаў, не любяць ахвяраваць фігурай. *(ЛіМ)* 6. У магазіне «Піва-воды» ўсё было цёплае, акрамя адносін да пакупнікоў. *(ЛіМ)* 7. Сумна падлічваем страты. У прэсе і ў лесе — прагалы... *(Бур.)* 8. Жыў прыпяваючы: кіраваў адразу трыма харавымі гурткамі. *(ЛіМ)* 9. Як я памятаю, а мне ўжо стукнула, як качаргою па лобе, шэсцьдзесят год, там жывуць стараверы — рослыя, рыжабародыя, здаровыя. *(Бяд.)* 10. Аўтар прыкметна вырас: мінулагодні касцюм стаў яму малы. *(Шыб.)* 11. Хваліўся сваім сябрукам графаман, пыхкаючы цыгарэтай: — У выдавецтве ў мяне раман... з перспектыўнай кабетай. *(П.С.)* 12. Меліяратары з вялікай ахвотай асушылі... кілішкі. *(ЛіМ)*

**22. Спішыце сказы, падкрэсліце лексічныя амонімы. Ахарактарызуйце іх паводле супадзення ва ўсіх уласцівых ім граматычных формах (поўныя ці няпоўныя) і паводле марфалагічнай будовы (вытворныя ці невытворныя).**

1. Ды толькі здзівяцца дзеці аднойчы, што нечакана наваліцца праца, што раптам трэба з расой падымацца — даіць карову, у печы паліць, высушыць дровы, гуркі паліць... *(Бар.)* 2. Чую я — «норка залезла ў норку». Дзіўна мне слухаць такую гаворку, гэта ж, па-мойму, проста лухта: хіба ж кот улезе ў ката? *(Крап.)* 3. Хоць адзін разок залячу я туды, дзе вясна вячуе, туды, дзе сонца начуе. Па далях тугу залячу я... *(Б.-З.)* 4. У калгасе ўчора я бачыў рогі бугая — ну і рогі! Не дай бог трапіць вам на гэткі рог. А мне кажуць цёткі дзве: «На рагу каваль жыве». Уявіць я не магу, як сядзіць ён на рагу, і хацеў бы хоць здаля паглядзець на каваля. *(Крап.)* 5. Падумаў Міколка і аж уліп у зямлю, халодным потам абліўся, замёр на якую хвіліну-другую. Не з-за страху за свой жывот, — які там у яго жывот, — а баяўся за справу [вызваленне з пакгауза бальшавікоў, арыштаваных немцамі]. *(Лыньк.)* 6. — Куды пораш?! Я табе зараз парну! — Коні хаваць будзем? — Я табе так дам, што цябе будзем хаваць, а не коні. *(М.Л.)*

**23. Знайдзіце ў сказах і выпішыце амаформы, амафоны і амографы.**

1. Мо спазненні ці прагулы? – Не. Прыходзіць ён на працу акуратна кожны дзень. – Ну падсунуў ты мне цацу – куды хошаш, туды дзень. (Крап.) 2. У майго мілога бакі, нібы ў вожыка бакі. (Г.Ю.) 3. А тут яшчэ на заднім сядзенні прымасціўся хоць і нізкі ростам, але добра акруглены на кіруючых пасадах Качанок. Сапраўдны качанок. (Шам.) 4. Каб добры быў заўжды настрой, на дабрату сябе настрой. (Шыб.) 5. Там зброю кавалі кавалі для

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ганчароў і лесарубаў… (Бял.) 6. Аб прыпісках гаварылі на парадах, а яны з'яўляліся ў парадах. (Шыб.) 7. – Нічога, Захар: перамелецца – мука будзе. – Або мука, або мука, – уздыхае старшыня. (К-с)

**24. Спішыце сказы, выбіраючы адпаведнае слова з прыведзеных у дужках паронімаў.**

1. Становячыся часткай фразеалагізма, імя ўласнае страчвае сувязь з канкрэтнай асобай ці аб'ектам, г.зн. вычэрпвае сваю анамастычную функцыю. Яно пачынае (абагульняць, абагульваць), выконваць функцыю імя агульнага. 2. Прапанова (абагульніць, абагуліць) пасевы была прынята аднагалосна. 3. Здзіўляе маштабнасць мастацкага (абагульнення, абагульвання) у байках Кандрата Крапівы. 4. Развязка занялася з таго дня, як пачалі ў Сіўцы праводзіць (абагульненне, абагульванне) жывёлы. 5. Шчасце ўсіх людзей – вось што павінна быць і нашым (асабовым, асабістым) шчасцем. 6. Я зразумеў, што гэта мая (асабовая, асабістая) справа ў яго на стале. 7. Зямля тут была (ураджайная, урадлівая), найлепшая ў наваколіі. 8. А зараз даводзяць, што кратэры ад падзення (метэораў, метэарытаў). 9. На ясным начным небе можна бачыць звычайна каля дзесяці (метэораў, метэарытаў).

**25. Прааналізуйце наступныя ўрыўкі з тэкстаў. Скажыце, пры дапамозе якіх моўных адзінак дасягаецца выразнасць выказвання.**

1. Кулак, кажуць на мяне нашы засцянкоўцы. Чорт вас бяры, кажу: хоць гаршком заві, адно ў печ не стаўляй. У кулаку, кажу, можа, што-небудзь затрымаецца, а растапырыш пальцы – усё рассыплецца, між пальцаў паплыве. (Крап.) 2. У часопісе "Вожык" пад карыкатурай з сонным вартаўніком крамы – подпіс: "Такая варта нічога не варта". 3. – Раскажы, як у цябе там на вёсцы справа? – Як справа, так і злева – кругом кепска. (Крап.) 4. Як? Не адзначыла цябе журы? Ды ты не іх – сябе журы. (Шыб.) 5. У той сталоўцы на рагу вам ветліва дадуць рагу. Шкада, што мяса ў тым рагу, як у каровы на рагу. (ЛіМ) 6. Урэшце Шышка – невялікая шышка. (Шам.) 7. І моляцца хто каму, адзін – іконе, другі – Мамоне, хто Хрысту, хто Будзе. Так было, так будзе. (Бар.) 8. Іграйце гучна музыку, геройскія музыкі, каб слухаў і дрыжэў ад музыкі ўвесь свет! (Куп.) 9. Дзе пара, там неразбярыха. Засвоіць ісціну пара: хаця кусае камарыха, абэлка ўся на камара! (Бар.)

**26. Перакладзіце сказы з рускай мовы на беларускую і наадварот. Назавіце міжмоўныя амонімы і паронімы, выявіце іх значэнні ў абедзвюх мовах.**

1. Через полчаса на камине закипало уже в горшке какое-то варево, а в ожидании, пока оно поспеет, Валёк поставил на трехногий, кое-как сколоченный столик сковороду, на которой дымились кучки жареного мяса. (В. Корол.) 2. А на працу трэба хадзіць, бо мужчын у калгасе засталося мала: ворыва і касьба, жніво і вывазка лесу – усё гэта легла на плечы падлеткаў. (Н.Гіл.) 3. У Дымова сильно болела голова; он утром не пил чаю, не пошёл в больницу и всё время лежал у себя в кабинете на турецком диване. (А.Чех.) 4. Кватэру яны прыбралі – расставілі, як палічылі найлепш, мэблю, паслалі на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

падлозе дываны і дарожкі, упрыгожылі гардзінамі вокны, павесілі рэпрадукцыі карцін на сценах. (Т.Хад.) 5. Света и в мыслях не держит обвинить их в каком-либо корыстном расчёте. (Е.Дорош) 6. Усіх людзей на свеце калгасны бухгалтар Буза дзеліць на дзве катэгорыі: карысных і некарысных. (Р.Шкраба)

**27. Звярнуўшыся да 3 тома ТСБМ, выпішыце з ніжэйпададзеных слоў спачатку тыя, якія растлумачаны ў слоўніку сінанімічным спосабам, а пасля — тыя, лексічнае значэнне якіх раскрываецца апісальным і сінанімічным спосабамі адначасова.**

Лагодны, лагчына, ладавацца, ландшафт, лапік, люляць, магазін, мазгаваць, маркоціцца, марны, матка, млявы, моднічаць, моц, мурзаты, наадрэз, набытак, навечна, надысці, нажахацца, назнарок, напалам, неадвязны, неадменны, нішчыцца, няўзнак, пабавіцца, паволі.

**28. Спішыце, ставячы замест кропак абсалютныя сінонімы.**

Урач — ..., смелы — ..., дадому — ..., хутка — ..., поезд —..., тапор — ..., дзесьці — ..., полісемія — ..., трапіць ( у мішэнь) — ..., маланка — ..., патушаны (агонь) — ..., жабрак — ..., ікона — ..., гума — ..., мімаволі — ..., пяшком — ..., ведаць — ..., кукіш — ..., празяваць — ..., ваўчыца — ..., чоven — ..., плячысты — ..., шыбеніца — ..., адзнака (на экзамене) — ..., мацярык — ..., сустрэча — ..., хопіць — ..., палярныя (погляды) — ..., пець — ...

**29. Знайдзіце ў сказах абсалютныя сінонімы, звяртаючыся пры неабходнасці да ТСБМ.**

1. Адценне слоў — не глупства, ты ім не пагарджай. Скарынка. Скіба. Луста. Акраец. Каравай. *(Панч.)* 2. Памятаю, што часта збіраліся вяскоўцы ў нашай хаце... Помню, як увосень 1939 года бацька павёў мяне ў гімназію. *(Пол.)* 3. Не трэба ні петрыць, ні кеміць, ні цяміць, ні тумкаць, ні дукрыць, ні дбаць, ні шурупіць, адно, што патрэбна, — этапная памяць патрэбнае ўспомніць тады, калі рупіць. *(Бар.)* 4. Іван адчуваў, што забраліся высока, іначай не прабіраў бы так холад. *(В.Б.)* 5. Было холадна, праймаў вецер да касцей. *(Гур.)* 6. Гудзе завея. Твар пячэ. Пранізвае наскрозь. *(Ст.)* 7. Паветра было вільготнае, халаднаватае, і золкасць працінала старыя плечы дзеда Архіпа. *(П.К.)* 8. А там далёка-далёка дымок белаваты паказаўся. Глядзіць туды Агатка — гэта ж поезд ідзе. *(К-с)* 9. Паравік даў гудок. Страпянуўся цягнік. *(Гл.)* 10. Ёсць прыслужнікаў нямала, што за долар прадаюцца і гатовы да паслуг. *(Бр.)* 11. Фашысцкі прыслугач грэбліва паморшчыўся і, пакінуўшы Сашу ў спакоі, папярэдзіў: — Не ўздумайце марудзіць. *(Шам.)* 12. Кулакі з хутароў, стаўшы паслугачамі акупантаў, нарэшце спагналі сваю ашалелую злосць... *(Віт.)*

**30. Замяніце выдзеленыя словы іншымі — абсалютнымі сінонімамі.**

1. А *вясёлку*, знак той «божы», зробіць нават вучань кожны. *(Крап.)* 2. *Поплеч* з вопытнымі педагогамі працуюць і пераймаюць іх вопыт маладыя студэнты-практыканты. *(Н.г.)* 3. Прыехала «высокае начальства» ... Следам за імі *лакеі* — бургамістр Цішчанка, начальнік паліцыі Лучынскі, іншыя здраднікі. *(Шам.)* 4. Два тыдні ў нашай вёсцы не было старасты, немцы не маглі знайсці *халуя* на гэты пост. *(Кр.)* 5. Працуюць.. былыя палітвязні, *прадаўжальнікі*

нашай з табою справы ў дзевераснёўскім падполлі. *(Б.)* 6. Што можа быць удзячней, як перадаць набыты вопыт сваім *пераемнікам. (Гардз.)*

**31. Выпішыце сінонімы. Адзначце, якія з іх абсалютныя, а якія адрозніваюцца сэнсавымі адценнямі ці стылістычна.**

1. На руінах, папялішчах, на крывавых іх слядах хай груган іх косці ліча, на бяседу соваў кліча, баль спраўляюць на касцях. *(Куп.)* 2. Крумкач глюгу звесіў над згніўшай калодай... *(Куп.)* 3. Плытная аглухлая Ушача мерыцца ўцячы за касагор... Крача воран. Чуеш, воран крача? Да чаго б яно, браток Рыгор?.. *(Бур.)* 4. І пацехі ж было пасля, бо я обера лаяў, чаму за білеты не ўзяў з безбілетнікаў гэтых самых... А ён мяне крыў: — Не меў, кажа, ты аніякага поўнага права без майго свістка шалёны ход пачынаць. *(Лыньк.)* 5. Мілая Наташа! Вы так мяне ашаламілі, ашарашылі, агарошылі, што сёння нічога больш разумнага сказаць вам не магу. *(Крап.)* 6. Паляўнічы ідзе з ружжом па лясной дарозе і раптам — цуп, замёр і стаіць, бы ўкапаны: перад ім крокаў за дваццаць сядзіць заяц ды вушамі пахітвае... «Якая радасць!.. Нарэшце і мне шчасце падваліла, — думае расчулены чалавек. — Заб'ю шарака, здам шкурку, прадам мяса... Куплю свінку, выгадаю. Злучу з кнырам. Свінка апаросіцца. Прадам парасят — узаб'юся на добрыя грошы, вазьму білет і з'еду ў Амерыку... Адтуль прывязу даляры, за якія прыкуплю сабе колькі гектараў зямлі і пабудую хату-пяцісценку...» Відаць, бядак-паляўнічы яшчэ доўга б думаў-разважаў, умольна гледзячы на зайку, які, здавалася, бяспечна сядзеў на ўзбочыне, ды раптам нейкая шалёная сіла ўскалыхнула касога і панесла... Паляўнічы прысеў на струхнелы пянёк і горка заплакаў. *(Мас.)* 7. Жадаючы ўславіць перадавіка, ударніка, паэт паказвае яго як нашчадка, прадаўжальніка гераічных традыцый недалёкага мінулага. *(Бяр.)* 8. Пестрак — цудоўны прадаўжальнік лепшых традыцый, якія склаліся ў беларускай літаратуры. *(Куч.)* 9. Рыгор Піліпавіч забыўся, што мы наследнікі не толькі беларускай культуры, але і лепшага, што стварыла чалавецтва наогул. *(Б.М.)* 10. Наступнікаў грамадоўскага руху ўзначальвае Ігнат Дварчанін. *(Маш.)*

**32. Калі слова мае не адно, а некалькі значэнняў, то кожнае яго значэнне можа ўтвараць свой сінанімічны рад, які складаецца са слоў, розных для кожнага значэння. Адзначце сінонімы да аднаго са значэнняў дзеяслова *ліцца.* Назавіце гэта значэнне, звярнуўшыся да ТСБМ.**

1. З рэпрадуктара лілася вясёлая танцавальная музыка. *(Шыц.)* 2. Праз зачыненыя шыбы плылі гукі піяніна. *(Грах.)* 3. І зноў цячэ, цячэ, як рэчка, песня. Плыве ў душу, у сэрца хлапчука. *(Каратк.)* 4. З рэпрадуктара цадзілася тужлівая музыка. *(К-ч)*

**33. Сярод стылістычных сінонімаў часам асобна разглядаюць эўфемізмы, або так званыя «сінонімы ветлівасці». Яны выступаюць як «намеснікі» непажаданых або непрыстойных у пэўных абставінах назваў. Знайдзіце эўфемізмы ў пададзеных прыкладах.**

1. — Ніхто з архітэктараў не падтрымлівае пасадку «хіміка» ў Белым возеры. Адзін ты. Хто ж ты? Геній ці... — Дурань, — падказала Ніна, хоць ён,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Максім, хацеў сказаць «невук», слова не менш моцнае, але, бадай, інтэлігентнае. *(Шам.)* 2. А ён доўга ні на якай пасадзе не затрымліваецца... Выганяюць. І ў нас месяцы тры парабіў, таксама папрасілі... *(ЛіМ)*

**34. Якія сінонімы называюцца кантэкстуальнымі? Чым яны адрозніваюцца ад агульнамоўных, слоўнікавых? Знайдзіце ў байцы К.Крапівы «Казёл» кантэкстуальныя сінонімы.**

Каб з ім бляяла
Цалютка тая чарада
Няйначай,
Як па-казлячы.
Калі хто — бе, ён кажа: «Не!
Ляпей вучыся ад мяне,
І будзеш ты тады бляяць
На яць».
А хто не ўмеў бляяць так чыста,
Таго ён лаяў шавіністам.
Ці жыў Казёл, ці мо ўжо здох,
Аб тым дазнацца я не змог,
А толькі вось чаго мне злосць:
Яшчэ казлы такія ёсць.
Не помню дзе,
У адной авечай чарадзе
Павадыром хадзіў Казёл.
І нават мне пастух казаў,
Што быў той барадаты
Нішто сабе адміністратар.
Ды ў тым загана ўся Казлова,
Што па-авечы ён — ні слова:
Ці не хацеў, ці мо не ўмеў,
Ці мо што іншае наўме
Трымаў стары,
А толькі факт — не гаварыў.
Дык гэта яшчэ мала,
Дый невялікая бяда —
Ён, кажуць, захацеў, брыда…

**35. Ахарактарызуйце антанімічныя пары паводле структуры (рознакаранёвыя і аднакаранёвыя), семантычнай супрацьлегласці (якаснай, часавай, прасторавай, колькаснай і інш.), прыналежнасці да пэўнай часціны мовы. Якія антонімы называюцца кантэкстуальнымі? Ці ёсць яны ў прыведзеных прыкладах?**

1. І тады зусім не суцяшала, што ён тут не першы і не апошні, што ўжо столькі — ды якіх людзей! — пайшло туды, на той свет... *(Г.Д.)* 2. А колькі палегла знаёмых, сяброў і непрыяцеляў на полі бою!.. *(Г.Д.)* 3. О, каб сустрэць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мне тых, хто б дараваў мне грахі нявольныя і вольныя. *(М.Т.)* 4. Сярэдняя зарплата настаўніка павінна і ў нас быць вышэй за сярэднюю агульную зарплату, а яна ў нас намнога ніжэй. *(Гіл.)* 5. Ранейшага нічога ўжо няма: і лета іншае, і восень, і зіма. *(Грах.)* 6. Дзетдомаўцы расказвалі пра свае поспехі і няўдачы. *(Грах.)* 7. Прываліла ў дварышчы гасцей прошаных і няпрошаных безліч. *(М.Т.)* 8. За аднаго бітага двух нябітых даюць. *(Прык.)* 9. Ранні зайчык зубкі цярэбіць, а позні вочкі прадзірае. *(Прык.)* 10. Адны пануюць, а другія гаруюць. *(Прык.)* 11. Ад ліха ціха, а дабра не чуваць. *(Прык.)* 12. Ніколі не адкладвай на заўтра, што можна зрабіць сёння. *(Прык.)* 13. Блізка відаць, ды далёка дыбаць. *(Прык.)* 14. Высока лятаеш, але нізка сядзеш. *(Прык.)* 15. Яму раніцаю росна, у поўдзень млосна, а ўвечары камары кусаюць. *(Прык.)* 16. Ад усходу да заходу сонца палае. *(М.Т.)* 17. Нідзе ў свеце і ў галаву нікому не прыйдзе разважаць так: спачатку — каўбаса, а потым — культура, або: спачатку цукар, папяросы, панчохі, потым — нацыянальны сцяг, герб, гімн. *(Гіл.)* 18. Струхнеў аднапартыйны гнёт, і пачалі расці, нібы ля пня разлапага грыбы, зноў партыі ўсялякіх згод: згоды тапельца з вірам, мышкі нарушкі з сырам, хваста з аваднём, саломы з агнём, смеху з выццём, смерці з жыццём. *(Бар.)* 19. У галовах [некаторых людзей усё яшчэ сядзіць недарэчнае, нялюдскае перакананне, што шанаваць і любіць беларускую мову — гэта нацыяналізм і адсталасць, а вось выракацца сваёй мовы, пагарджаць і грэбаваць ёю — гэта інтэрнацыяналізм і адзнака культуры. *(Гіл.)* 20. Мне ж за дабро плацілі злом. *(Грах.)*

**36. У прыведзеных сказах і ўрыўках ёсць па дзве і болей антанімічныя пары. Назавіце іх. Асобна адзначце кантэкстуальныя антонімы.**

1. Ад вясны вясёлай, ранняй да восені позняй пяе поле трактарамі весела, пагрозна. *(Куп.)* 2. Ты слухай, паслухай, таварыш і брат: заўсёды наперад! Ніколі назад! *(Куп.)* 3. Лепш горкая праўда, чым салодкая мана. *(Прык.)* 4. Лепей з разумным згубіць, чым з дурным знайсці. *(Прык.)* 5. Аднаму густа, другому пуста. *(Прык.)* 6. Пакуль ёсць праўда і крыўда, ёсць багатыя і бедныя, ёсць сытыя і галодныя, ёсць князі і рабы, ёсць генералы і салдаты, ёсць жандармы і паэты, ёсць асуджаныя і каты, да таго часу будуць зайздрасць, падман, грабеж, нянавісць, барацьба, каварства, кулакі, локці, зубы... *(Мак.)* 7. Патушы ў сваёй душы нянавісць, запалі ў сваёй душы любоў. *(Бур.)* 8. — У вашых словах адна нянавісць. — Нянавісць — гэта сіла, любоў — гэта слабасць, — адказаў паручнік. *(М.)* 9. Надзя верыла, што такая мяжа існуе: па адзін бок — цемра, па другі — святло, як зямны экватар, што падзяляе зямлю на поўдзень і поўнач, цяпло і холад, як Уральскі хрыбет падзяляе мацярык на Еўропу і Азію. *(В.К.)* 10. Не новая думка: усё ў свеце пабудавана па законах сіметрыі. Два вокі, дзве нагі, неба і зямля, зямля і вада, нараджэнне і смерць. За шчасцем ідзе гора, за вялікай радасцю — вялікая туга. І — за вялікім узвышэннем — не менш вялікае падзенне. *(Пол.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**37. Звычайна антонімы — замкнёныя пары слоў. У якіх выпадках антанімічны рад складаецца з трох слоў? Прывядзіце тры прыклады на ўзор:** ***кепска — добра, някепска.***

**38. Падбярыце антонімы да прыметнікаў (там, дзе гэта магчыма).**

Ясны дзень, ясны адказ, ясная дыкцыя; сухі плашч, сухое паветра, сухі хлеб, сухі пераказ; поўны хлопчык, поўны разгром, поўны адказ; гарачы лоб, гарачае жаданне, гарачы характар, гарачая работа; цвёрдае цела, цвёрдае крэсла, цвёрды характар, цвёрдыя цэны, цвёрды намер; голыя дрэвы, голыя сцены; грубае слова, грубая мэбля; кіслая міна, кіслы яблык; высокая мэта, высокі голас, высокі госць; разбітая шыба, разбітыя чаравікі.

**39. Калі слова мнагазначнае, то ў адных выпадках яно сваімі рознымі значэннямі ўваходзіць у склад розных пар, у другіх — ва ўсіх ці амаль ва ўсіх сваіх значэннях утварае антанімічную пару з іншымі аднолькавымі мнагазначнымі словамі, у трэціх — зусім не ўступае ў антанімічныя адносіны з іншымі словамі. Праілюструйце гэта на прыкладах, устаўляючы замест кропак адпаведны антонім. Пры неабходнасці выкарыстайце ТСБМ і «Слоўнік антонімаў беларускай мовы» У.М. Лазоўскага.**

Слабы (конь) — ... ; слабая (вяроўка) — ... ; слабы (вецер) — ... ; слабое (віно) — ...; слабы (працаўнік) — ... .Бедная (гаспадарка) — ... ; бедная (мова) — ... ; бедная (кватэра) ... ; бедны (ураджай) — ... .Вялікі (горад) — ... ; вялікая ( сям'я) — ... ; вялікі (уплыў) — ... ; вялікі (пісьменнік) — ... .

**40. Спішыце, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары, раскрываючы дужкі. Расстаўце неабходныя знакі прыпынку. Вызначце лексічнае значэнне выдзеленых слоў і дайце ім характарыстыку паводле тыпаў лексічнага значэння (прамое або пераноснае (указаць тып); матываванае (вытворнае) ці нематываванае (невытворнае) або эмацыйна-ацэначнае; свабоднае ці несвабоднае (фразеалагічна звязанае, сінтаксічнае абумоўленае, канструкцыйна абмежаванае). Падбярыце да падкрэсленых прамой рыскай слоў аманімічныя (або паранімічныя), вызначце іх тып, запішыце лексічныя значэнні. Падбярыце сінонімы (3-4) да падкрэсленых хвалістай рыскай слоў, вызначце тып кожнага з іх. Запішыце, дзе магчыма, антонімы да кожнага падабранага сіноніма, дайце ім характарыстыку (аднакаранёвы ці рознакаранёвы; поўны або няпоўны).**

Павольна нясмела надыходзіла вясна. (У)начы яшчэ задыхаліся ад сцюжы а (ў)дзень сляпіла вочы зыркае сонца звінелі капяжы (з)пад сумётаў **выбіваліся** каламутныя раўчукі. Біязінка злізвала апошнія закрайкі і набухала празрыстай крынічнаю вадою.

Сібірская вясна бурная іскрыстая сонечная з шумнымі і в..ратлівымі паво..камі. Ла..кі і нізіны становяцца аз..рынамі. Біязінка вырываецца з берагоў а шырокая зарослая чаромхаю тальнікам і глогам Тара ломіць пабурэлы лёд крышыць крыгі і залівае па самыя макаўкі ўсё навакол..е. Мясцовыя рыбакі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спускаюць на ваду лё..кія асінавыя чаўны з даро..камі восцямі “павукамі” плывуць па разво..дзі і вяртаюцца з чырв..напёрымі акунямі д..ўгарылымі шчупакамі і мно..ствам серабрыстых чабакоў. У затопл..ных кустах плёскаецца гукае крычыць і свішча ашалелае ад цяпла вясны і ..часця мно..ства пералётнага пта..ства. А мне ўспамінаюцца вясна на Пцічы набухлыя кусты бэзу бухматыя жоўтыя коцікі на вербах качыны гон над разво..дзем і ..часлівыя поўныя спадзяван..яў гады майго юна..тва. І такі **агорт..вае** сум такі боль гняце сэр..ца што і выказаць нельга (ні)кому.

С..шлі снягі апалі паво..кі пасохлі груды па..вярдзела густая як ас..альт гразь на дарогах. Тайгу завалакла (шыза)з..л..наватая смуга. Пакуль не ўзняліся хмары гнусу усе спяшаюцца на лясныя дзялянкі рэзаць на зіму дровы. За лета яны высыхаюць як звон і загараюцца ад аднае запалкі. Усе вялікія **работы** тут робяць талакою. Так косяць і стагуюць сена ставяць дамы садзяць і выбіраюць бульбу. Гэта самыя працавітыя тавары..ствы ўзаемнай дапамогі. (216 слоў)

Паводле С.Грахоўскага

**41. Параўнайце ўрывак з паэмы Янкі Купалы «Курган» з перакладамі на рускую (М. Браўна) і ўкраінскую (Я. Фаміна) мовы.Выпішыце словы ўсходнеславянскага паходжання. Зверцеся з этымалагічнымі слоўнікамі (Этымалагічны слоўнік беларускай мовы;*М. Фасмер.* Этимологический словарь русского языка; *А. Г. Преображенский.* Этимологический словарь русского языка).**

Паміж пустак, балот беларускай зямлі, // На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай // Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі,— // Удзірванелы курган векавечны.// Дуб галлё распусціў каранасты над ім, // Сухазелле у грудзі ўпілося;// Вецер стогне над ім уздыханнем глухім,— // Аб мінуўшчыне ў жальбах галосе. // На купалле там птушка садзіцца, пяе, // У пиліпаўку воўк нема вые;// Сонца днём распускае там косы свае, // Ночкай зоры глядзяць залатыя. //Хмары неба ўсцілалі мо тысячу раз, // Перуны білі з краю да краю,—

Ён стаіць — гэта памяць людская, паказ... //Толькі гутарка ходзіць такая.

*    * *

Меж болот, пустырей белорусской земли, // На прибрежье реки быстротечной,

Дремлет памятник дней, что ушли-утекли, // Обомшелый курган вековечный.

Ветви дуб распустил коренастый над ним, // В грудь сухие впилися бурьяны, Дикий ветер над ним стонет вздохом глухим, // О минувшем грустит неустанно. // В день Купалы там пташка садится, поёт, // А в филипповки волк завывает, // Солнце в полдень там косы свои расплетает, // Ночью ясные звёзды сверкают. // Тучи в небе прошли

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

может тысячу раз. // Били грозы от края до края,— // Он, как память людская, стоит напоказ... // Только ходит легенда такая.

* * *

В Білоруській землі, де пустир, болота, // Понад берегом шумноі річки, Спить, мов пам'ятка днів, що лягли в небуття. // Мовчазливий курган віковічний. //
Дуб гілля розпустив коренасте над ним, // Сухозілля у груди вп'ялося. //
Вітер стогне під ним все зітханням глухим, // Про минуле він тужно голосить. // На Купала там птушка сідае, співа, // Сірий вовк у пилипівку вие. //
Сонце вдень його світлим огнем залива, // Вночі зорі горять золотіі. //
Хмари небо встилали, як тисячу раз, // З краю в край гомоніли перуни. //
Він стоі'ть, наче пам'ять людська, на показ, // Тільки славу розносять там луни.

**42. З дапамогай этымалагічных слоўнікаў вызначце словы спрадвечна беларускія (падкрэсліце прамой рыскай) і запазычаныя(падкрэсліце хвалістай рыскай).**

Быў у іх свой пакойчык і стол пад электрычнай лям-пачкай, на якім яны то пісалі, кожны сваё, то свабодна і колькі хто хоча чыталі!.. Потым быў — пасля вёскі — горад. З тратуарам, што здорава, то дошкай, то цементам, шаркаў пад новымі чаравікамі; з вясёлымі прысадамі абапал бруку, грымотнага пад вазамі кірмашнікаў і нагамі разгалёканай песняй пяхоты; з кінатэатрам, куды цягнула магнітам; з цэрквамі ды касцёлам, што час ад часу ажывалі над кронамі і дахамі спрадвечным переразвонам; з мноствам па-рознаму пахучых магазінаў: здобай, каламаззю, ваніллю, селядцом; з раскошным святлом у вялікіх, часта затаямнічаных гардзінамі, ча-роўна напоўненых музыкай вокнах дамоў, шматпавярхо-вых, як здавалася Алесю; з вакзалам, адкуль, нагадваю-чы мілы свет маленства, па-сяброўску, па-змоўніцку клікалі ў таямнічую даль гудкі паравозаў.

*(Я. Брыль)*

**43. Спішыце тэкст. Карыстаючыся этымалагічнымі слоўнікамі, высветліце, у якіх мовах ужываюцца выдзеленыя словы. Адзначце лічбай 1 словы агульнаславянскія, лічбай 2 — усходнеславянскія, лічбай 3 — уласнабеларускія.**

Жалезніца, Касцягаўка і Горна, І *вёска маці* — светлыя Мануйлы. *Журба* і радасць ціхая *агорне:* Вы ёсць, не адляцелі, не *мінулі.* Была *радня* аж дзесьці ў Саматэвічах, За Бесяддзю, за *полем* і барамі. У вёсках тут *прыгадваюць* Бялькевіча: «Краёвы слоўнік» разам мы збіралі...
Чытаю, перагортваю я слоўнік, Нібы ў бабульчынай *гасцюю хаце:* — Прысядзь, маё ты дзетка, на *услоне.* А як жа *бацька* твой, а як жа маці?..

А добра мне. І маці не старая.
І брат жывы. І *ходзяць* к нам *суседзі.*
Вайна нікога ў нас не забірае, І дома ўсе *дарослыя* і дзеці.
Яшчэ няўцешна *ўдовы* не галосяць, Яшчэ касцоў гарматы не *гукалі.* І тыя, што забіты, сена косяць, Ядуць на лузе сала з агуркамі.

*(А. Пысін)*

**44. Выпішыце з тэксту запазычаныя словы, растлумачце (вусна) іх значэнне. Адзначце, з якой мовы слова запазычана. Падкрэ-сліце прыметы запазычаных слоў. Напрыклад: эксперыментальны (лац.), прагрэсіўныя (лац.). Пры выкананні задання карыстайцеся «Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы» АН БССР і «Словарем иностранных слов».**

Новая беларуская веска...

Возьмем хаця б Верцялішкі ў Гродзенскай вобласці. Гэта экспертьментальны пасёлак. Будаўніцтва такіх паселішчаў пачалося ў 1967 г. На іх правяраюцца прагрэсіўныя прыёмы планіроўкі і забудовы калгасаў і саўга-саў, правяраюцца тыпавыя праекты жылых і грамадскіх будынкаў (ці зручна жыць і працаваць). Пасля праверкі ўсё ўдалае бяруць ад іх іншыя пасёлкі, што будуюцца па Беларусі і за яе межамі.

Верцялішкі (гэты пасёлак і пасёлак саўгаса «Ленін» на Магілёўшчыне адзначаны залатьшы медалямі ВДНГ) здзіўляюць. Усё ўлічана пры праектаванні: рэльеф, ва-даёмы, зялёныя масівы. Высокая якасць праектаў і выдатная якасць будаўнічых работ і добраўпарадкавання. Тэрыторыя дзеліцца на жылую, грамадскую і вытворчую зоны. Цэнтр — грамадская плошча, а на ёй клуб з залай на 360 месцаў і спартыўнай залай. Тут жа праўленне калгаса, сельсавет, гандлёвы цэнтр, пры якім гасцініца і камбінат бытавога абслугоўвання.

Колькасць паверхаў у дамах розная, і ў кожнага будынка свой цікавы архітэктурны воблік. Усё гэта арыгі-нальна і прыгожа.

За клубам парк з танцпляцоўкай і спортпляцоўкай (стадыён крыху наводдаль). Ля парка дзіцячы сад-яслі. Ёсць дамы для маласямейных і адна-, двухкватэрныя дамы з балконамі і лоджыямі. Перад адміністрацыйным будынкам — вадаём з фантанамі.

Прыемна і прыгожа жыць у такім пасёлку. Нездар-ма тым, хто яго праектаваў, архітэктарам В. Емяльянаву І Г. Заборскаму і старшыні калгаса П. Сянько, у 1971 г. прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР.

(У. *Караткевіч)*

**45. Выпішыце спачатку словы, запазычаныя са стараславянскай, рускай, украінскай і польскай моў, а пасля — аналагічныя індывідуальна-аўтарскія запазычанні, якія не сталі лексічнымі адзінкамі нашай мовы і выкарыстаны пісьменнікамі з пэўнай стылістычнай мэтай. Карыстайцеся пры выкананні задання «Слоўнікам запазычаных слоў. У 2 т.» А.М.Булыкі (Мн., 1999)**
**і ТСБМ.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. [Паўлінка, паірытавана]: Навошта дарэмшчыну вясці. Ён нікому ніякай забастоўкі не рабіў і не робіць. *(Куп.)* 2. Бог мяне пакарае, калі я не дам ёй шчасця адружыўшыся. *(Д.-М.)* 3. Муштарда, хрэн — адно дзяржыся, у рот паложыш — сцеражыся! *(К-с)* 4. Кажуць, што жонак дыпламатаў можна параўноўваць з жонкамі дзекабрыстаў. *(Вярц.)* 5. На меднай спронжцы лось красуе. *(К-с)* 6. Беларусь як брыльянт у пярсцёнку Еўропы, мы болей не хлопы і не халопы. *(Бар.)* 4. Абраз прымацаваны да знарочыстых насілак з чатырма канцамі. *(Крап.)* 8. На могілках ёсць невялікая, струхнелая ўжо, каплічка, дзе поп і адпраўляе кожны год малебен па «ўбіенным». *(Крап.)* 9. А ваенком дык Іванова нават пахваліў: — Ты, — кажа, — Іваноў, сапраўдны падхалім. *(Крап.)* 10. А чы сабралася шляхта з ваколіцы? *(Д.-М.)* 11. — Так, — сказаў Брытвін. — Ну, тады ты, Тоўкач. Падкрадзешся і замры. Паняў? *(В.Б.)* 12. Толькі модлы раслі небу ў сэрцы людзей, і праклящце расло пакрыёма. *(Куп.)* 13. Затое ж пан той, паглядзеце: хто з ім зраўняецца на свеце? Які ён важны, панаваты, выдатны, «мондры», зухаваты! *(К-с)* 14. Усялякіх там жывёлін у тым садзе ёсць даволі — шчыплюць траўку паміж дрэваў. *(Крап.)* 15. У хлопца чупрына спаўзла на бачок. *(М.К.)* 16. Грышка мой — хлапец матарны, малады, відны ды гарны. *(Д.- М.)*

**46. Шматлікія запазычанні з якіх неславянскіх моў — самыя даўнія? Пералічыце іншыя неславянскія мовы, адкуль прыйшло нямала слоў у нашу мову. Прывядзіце прыклады слоў-інтэрнацыяналізмаў. Назавіце асноўныя прыметы запазычанняў з неславянскіх моў.**

**47. У старажытнай Грэцыі слова *філалогія* (phileo + logos) этымалагічна абазначала ‘люблю слова’. У сучасных слоўніках *філалогія* тлумачыцца як ‘сукупнасць навук, якія вывучаюць літаратуру і мову’. Ці адчуваецца сувязь паміж сучасным і першапачатковым значэннем гэтага слова? Якое лексічнае значэнне і адценне мае назоўнік *філолаг?* Растлумачце, што абазначае выдзеленае слова-наватвор у сказе «Як метафары няўлоўныя, сніцеся, *філалагіні*» *(Бар.)*.**

**48. Прачытайце і законспектуйце с. 165 — 171 з кнігі «Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / Пад рэд. А.Я.Баханькова» (Мн., 1994). Карыстаючыся слоўнікамі, вызначце, з якіх моў запазычаны прыведзеныя ніжэй словы, і на некалькіх прыкладах пакажыце, якія графічныя, фанетычныя, марфалагічныя і семантычныя змяненні адбыліся ў працэсе асваення запазычанага слова. Што абазначала слова *decanus* у мове-крыніцы?**

Універсітэт, інстытут, рэктар, прарэктар, факультэт, дэкан, кафедра, прафесар, доктар, кандыдат, аспірантура, студэнт, аўдыторыя, кабінет, дысертацыя, рэферат, дыплом, бібліятэка, каталог, лабараторыя, матэматыка, фізіка, біялогія, анатомія, заалогія, астраномія, філасофія, педагогіка, псіхалогія, хімія, алгебра, арыфметыка, лінгвістыка.

**49. Нярэдка можна без звароту да слоўніка «пазнаць», з якой мовы запазычаны некаторыя словы, па прыналежнасці слова да пэўнай**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**тэматычнай групы. Так, асобныя назвы адзення, бытавых прадметаў — з цюркскіх моў; медыцынскія і мовазнаўчыя тэрміны — з грэчаскай і лацінскай моў; словы са сферы мастацтва — з французскай мовы; тэрміны ваеннай і марской справы — з нямецкай мовы; спартыўныя тэрміны — з англійскай мовы; тэрміны музычнай, тэатральнай, фінансавай, гандлёвай сферы — з італьянскай мовы. Вызначце мову-крыніцу пададзеных запазычанняў.**

Футбол, шапка, халат, акцэнт, афікс, ансамбль, анонс, брута, нета, капэла, гаўбіца, адмірал, астма, гангрэна, дыябет, эўфемізм, уверцюра, інфінітыў, дэрывацыя, апендыкс, аспірын, штаб, генералітэт, тэніс, дуэт, дыягназ, фанема, бюст, сюжэт, каламбур, матыў, трэнер, батэрфляй, банк, квартэт, кампазітар, бас, арыя, фанетыка, марфема, граматыка, інфаркт, гравюра, гол, бокс, амбулаторыя, дыван, аркан, качарга, торба, анестэзія, рэцэпт, чадра, дырыжор, неўрыт, хакей, баскетбол, штурм, вадэвіль, бруствер, кафтан, валюта, фірма, дукат, віяланчэль, чыгун, кісет, атэрасклероз, грым, гаўптвахта, валейбол, інкасатар, адажыо, тулуп, гігіена, афрыката, жанр, неўрыт, ангіна, кантата, апасіяната, армяк, ампутацыя, бурка, флагман, араторыя, фініш.

**50. Вызначце па фанетычна-марфалагічных прыметах мову-крыніцу прыведзеных запазычанняў. Некаторыя з гэтых прымет: канцавы элемент *-інг (-ынг)* — у англійскай мове; пачатковыя спалучэнні *шт, шп, шр* — у нямецкай мове; канцавыя націскныя галосныя *-е (-э), -о, -і,* канцавыя *-эр,-ёр,- юр, -аж (-яж),* спалучэнні *уа, лье, льё, лья,* губны + *ю* — у французскай мове; канцавыя — *ент (-энт), -ум, -ура, -ус (-юс), -ій, -цыя (-ія)* —у лацінскай мове.**

Дыктатура, акварыум, бюджэт, бюлетэнь, кампанент, дыямент, плюс, казус, кансэнсус, шпіянаж, мітынг, спінінг, шпілька, фюзеляж, пюрэ, вяаж, ажыятаж, пляж, саквяж, кіно, метро, казіно, ордэр, суфлёр, манікюр, тратуар, амплуа, мемуары, мільён, трыльён, блюмінг, дэмпінг, допінг, агент, аліменты, вакуум, калёквіум, кансіліум, лігатура, полюс, радыус, градус, стыпендыя, акцыя, геній, галій, алюміній, штаб, брыфінг, рэйтынг, гравюра, камюніке, бюст, вуаль, буржуазія, марсельеза, апанент, аргумент, фундамент, абітурыент, пленум, прэзідыум, практыкум, квадратура, клірынг, холдзінг, штатыў, штопар, штраф, агітацыя, акадэмія, адукацыя, гербарый, санаторый, партэр, манцёр, рэжысёр, акцёр, шафёр, дублёр, більярд, мільярд, медальён, кулуары, сітуацыя, бардзюр, педыкюр, маркетынг, рытуал, муляж, багаж, масаж, аташэ, дэпо, бюро, бістро, купэ, галіфэ, таксі, акцэнт, прэтэндэнт, кансіліум, кворум, карэктура, смокінг, штанга, штапель, штурм, віварый, кадмій, прымус, ляпсус, аблігацыя, рэпрадуктар, натарыус, карбюратар, шпіён, шпроты, барэльеф, батальён, фельетон, туалет, лікёр, дрэнаж, віраж, гараж, макіяж, экіпаж, філе, бардо, фае, шпінат, кемпінг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**51. Знайдзіце словы, запазычаныя з неславянскіх моў. Назавіце фанетычна-марфалагічныя прыметы запазычанняў. Асобна адзначце словы, утвораныя на базе запазычаных.**

1. Вялікім попытам карыстаецца сёння літаратура па эканоміцы, маркетынгу, менеджменту. Узрасла цікавасць чытачоў да такіх галін ведаў, як гісторыя, філасофія, культуралогія, псіхалогія, да замежных моў. *(ЛіМ)* 2. Памятаеце ленінскі лозунг: маўляў, настаўнік у нас павінен быць узняты на такую вышыню, на якой ён не стаяў, не стаіць і ніколі не можа стаяць ні ў адным капіталістычным грамадстве? А што ў рэчаіснасці? *(Н.в.)* 3. У звязку з гэтаю праблемай, якой жылі гаспадары, дыскусій шмат было й палемік на схіле Лысае гары. *(В.-Л.)* 4. Па падліках спецыялістаў, знішчэнне адной міны самым танным спосабам (шляхам падрыву ці спальвання) будзе каштаваць Беларусі 1 даляр. Цяпер на нашай тэрыторыі знаходзіцца больш за 1,5 мільёна супрацьпяхотных мін са скончаным тэрмінам захоўвання. *(ЛіМ)* 5. Сорак літраў бензіну ўваходзіць у празрыстую поліэтыленавую каністру. *(ЛіМ)* 6. Я — паўтарацца не аматар, але і змоўчаць не магу: фальсіфікатар-плагіятар рашыў падставіць мне нагу. *(В.- Л.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**52. Выпішыце словы, запазычаныя з неславянскіх моў, адзначаючы прымету запазычання і мову-крыніцу. Асобна выпішыце ўтварэнні на базе запазычаных слоў.**

1. На адным з будынкаў акадэмічнага Інстытута фізікі ўстаноўлена стацыянарная лідарная станцыя па кантролі за станам атмасферы над Мінскам. *(ЛіМ)* 2. Як паведаміў на брыфінгу прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў, консульскі дэпартамент Чэхіі праінфармаваў беларускі бок, што рашэнне аб увядзенні візавага рэжыму было раней прынята ўрадам Чэшскай рэспублікі. *(Зв.)* 3. Ды ўсе прафесары й дацэнты перад Навуменкам адным — былі, як дробязныя цэнты перад далярам залатым. *(В.-Л.)* 4. Міністэрства аховы здароўя выдала ліцэнзію на аздараўленне і лячэнне захворванняў страўнікава-кішэчнага тракту, ачышчэнне арганізму з выкарыстаннем лекавых траў, дыетычнага харчавання, лячэбнай фізкультуры. Ажыццяўляць курс лячэння будуць вопытныя медыкі, якія прайшлі спецыялізацыю ў дадзеным накірунку. *(ЛіМ)* 5. Днямі быў праведзены фінальны этап конкурсу маладых дызайнераў. *(Н.г.)* 6. Паколькі ўсе былі маэстры і тэарэтыкі былі — пра адпаведнасць формы зместу не дбаць пры гэтым не маглі. *(В.-Л.)* 7. М.Агінскі зведаў і нягоды: эміграцыю, жабрацкае існаванне, адчай, сум, безнадзейнасць. *(ЛіМ)*

**53. Часта як асобны тып запазычання разглядаюць калькаванне — памарфемны пераклад іншамоўнага слова; напрыклад: руск. *единоличник* — бел. *аднаасобнік*; руск. *многоточие* — бел. *шматкроп'е*; нямецк. *weltanschaung* — руск. *мировоззрение* — бел. *светапогляд.* Прачытайце выказванні іншага характару. Ці згодныя вы з імі? Аргументуйце свой адказ.**

1. Калькі, утвораныя з дапамогай беларускага кораня і беларускага афікса...: *абагульваць, адзінкавы, атаясамліваць...* Рускае паходжанне іх мае

толькі ўнутраная форма, знешняя ж форма ўтворана цалкам з беларускага матэрыялу *(Крукоўскі Н.І.* Рускі лексічны ўплыў на беларускую літаратурную мову. — Мн., 1958. — С. 120–121).

2. Словаўтваральная калька... узнікае як вынік перакладу, засваення словаўтваральнай структуры чужога слова. Іншамоўнасць словаўтваральных калек заключаецца, такім чынам, у тым, што яны ўзнікаюць па словаўтваральным узоры і падабенстве да адпаведных па значэнні іншамоўных слоў, але гэтым іх іншамоўнасць і абмяжоўваецца: карані і афіксы, г. зн. будаўнічы матэрыял у кальках, не запазычаныя, а свае, для рускай мовы — спрадвечна рускія *(Шанский Н.М.* Лексикология современного русского языка. — М., 1964. — С. 104).

3. Словаўтваральнае калькаванне нельга атаясамліваць з лексічным запазычваннем, бо гэта зусім розныя з'явы. З'яўляючыся словаўтварэннем, словаўтваральнае калькаванне перадае матываванасць свайму выніку — словаўтваральнай кальцы. Лексічнае ж запазычванне — гэта нематывіруючы спосаб утварэння новых слоў. Словаўтваральнае калькаванне ў дачыненні да свайго аб'екта (іншамоўнага слова) з'яўляецца перакладам, яно не можа і не павінна разглядацца як лексічнае запазычанне, таму што пераклад слова датычыцца толькі яго ўнутранага боку (плана зместу) і не азначае запазычвання самога слова (Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / Пад рэд. А.Я.Баханькова. — Мн., 1994. — С. 123–124).

**54. Акрамя словаўтваральных, поўных калек, у нас ёсць няпоўныя калькі, або паўкалькі — словы, якія складаюцца часткова з прамога запазычання, а часткова з перакладу. Штучнае слова *televisia* (першая частка паходзіць з грэчаскай мовы, а другая — з лацінскай) спарадзіла ў рускай мове слова *телевидение,* у беларускай — *тэлебачанне,* ва ўкраінскай — *телебачення.* Або: руск. *колхоз* — бел. *калгас,* укр. *колгосп.* Калькі *(света-погляд)*, як і паўкалькі *(тэлебачанне, калгас),* «могуць лічыцца ўласна беларускімі» словамі (Гістарычная лексікалогія беларускай мовы. — Мн., 1970. — С. 280), яны «з'яўляюцца новымі словамі, невядомымі ў дадзеным канкрэтным выглядзе ў іншых мовах» (*Шанский Н.М.* Лексикология современного русского языка. — М., 1964. — С. 111). Вызначце, якія з пададзеных беларускіх слоў утварыліся як калькі, а якія — як паўкалькі.**

Абагульваць, абутнік, аглядальнік, адзінкавы, адноснасць, безгаспадарчы, безумоўны, беспрацоўны, бульбакапалка, выдатнік, выпраменьванне, вытворчасць, выяўленне, глядач, даследчык, залік, збожжанарыхтоўка, неад'емны, непасрэдны, нескланяльны, перабольшваць, попыт, суіснаванне, увасабляць.

**55. Знайдзіце ў сказах экзатызмы — чужаземныя словы, якія зрэдку сустракаюцца ў газетных, мастацкіх і іншых тэкстах і абазначаюць прадметы і паняцці, характэрныя для жыцця і побыту якой-небудзь краіны, народа (гэтымі словамі называюць грашовыя адзінкі,**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**разнастайныя нацыянальныя святы, звычаі, віды адзення, пасады, званні, тытулы і г.д.).**

1. Свой Крым, а з ім ханаў і мулаў бяры сабе, крымскі татарын, — мне ж мора пакінеш агулам і ўсе санаторыі дарам. *(Куп.)* 2. У лістападзе я апошні раз прыязджаў да сэра Ісаі і апошні раз бачыўся з ім. *(М.)* 3. Сенатар Хелмс з'яўляецца адным з самых аўтарытэтных у Кангрэсе ЗША. *(ЛіМ)* 4. Ліванская ісламская групоўка «Хезбалах» аб'явіла, што не мае намеру раззбройвацца... *(Н.в.)* 5. Адказнасць за абстрэл узялі на сябе іранскія маджахеды. *(Н.в.)* 6. І плакала Рыва... Яна палюбіла гоя... *(Лыньк.)*

**56. Прачытайце сказы, знайдзіце ў іх варварызмы — іншамоўныя ўкрапванні ў тэкст (яны, у адрозненне ад экзатызмаў, не маюць строгай нацыянальна-тэрытарыяльнай замацаванасці, могуць мець сінанімічнае слова ў нашай мове; нярэдка гэта назвы музеяў, помнікаў, тэатраў, газет, часопісаў і г.д.; варварызмы могуць перадавацца як нашымі літарамі, так і сродкамі іншага алфавіта).**

1. Нагодай для прыезду сербскіх гасцей стала прэзентацыя часопіса «Збіля» («Reality»), які рэдагуе і выдае Момір Лазіч. *(ЛіМ)* 2. Пры рэгіянальным мемарыяльна-культурным таварыстве яўрэяў стаў працаваць дабрачынны аддзел «Хэсад» («Міласэрнасць»). *(ЛіМ)* 3. З галоўным рэдактарам самай папулярнай польскай «Zasety Wyborczej» гутарыць Сямён Букчын. *(Н.в.)* 4. Тэлбат праходзіў летнюю практыку ў лонданскім бюро часопіса «Таймс». *(М.)* 5. На гэтага чалавека я шмат разоў натрапляў у кафэ «Ла Луна». *(Н.в.)* 6. Рэха канцэпцыі «западничества» было ў словах прэзідэнта... Ён сказаў, што хоча бачыць Расію «часткай Захаду». *(М.)*

**57. Сярод слоў іншамоўнага паходжання, якія сустракаюцца ў пададзеных ніжэй сказах, ёсць неасвоеныя словы (экзатызмы і варварызмы) і запазычаныя словы, якія ў выніку іх графічнага, фанетычнага і граматычнага асваення сталі звычайнымі лексічнымі адзінкамі беларускай літаратурнай мовы. Вызначце словы гэтых разнавіднасцей. Пры неабходнасці карыстайцеся «Слоўнікам запазычаных слоў» А.М. Булыкі.**

1. Бачым мэту мы тваю: за касмічны лэнч — сэнк'ю. Лепей ты аб міры дбай. Да спаткання, сэр! Гуд бай. *(Крап.)* 2. Уход пускаліся нагайкі і шампалы. «Двадзесце пеньць!» — крычалі азвярэлыя капралы. *(К-с)* 3. [Будуючы авілонскую вежу] так заложна, так упарта працавалі ўсе дзядзькі. Бог спужаўся не на жарты і... змяшаў іх «языки». Гвалт падняўся, як у сойме, кожны гердае па-свойму, кожны мае свае словы, а народу ж колькі тысяч! Вось калі там пачаліся і замежныя ўсе мовы. *(Крап.)* 4. Толькі ўмей складаць ты акты, каб пасведчыць тыя факты. *(Крап.)* 5. А нашы псеўдаасветнікі, сабраныя на канцылярскіх сметніках, магутныя бюракраты ўласным сцверджаннем рады: «Гаворыш па-руску — інтэрнацыяналіст; гаворыш па-беларуску — нацыяналіст. Вучы дзяцей французскай, ангельскай, эсперанта, але не беларускай...» — палохаюць піраты. І адвучылі дзяцей і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бацькоў, і адлучылі ад родных народных слоў. *(Панч.)* 6. Паводле часопіса Business Week, у канцы ліпеня ў продаж паступяць ноутбукі і кішэнныя камп'ютэры, аснашчаныя працэсарам Crusoe, створаным каліфарнійскай фірмай Transmeta Corporation. *(Н.в.)* 7. І кот марцовы, ці па-латышску рунціс, курняўкаючы, дакладней курмаўкаючы, пытаўся, дзе каханка: — Курмаўка. *(Бар.)* 8. Кыз ямшчэк — пагодныя пагоркі, смутная туга. Кыз ямшчэк — палын палюча-горкі, як туга. *(Бар.)* 9. У гмаху Звонака піялы звінелі так, што чулі ўсе: не чай зялёны аксакалы цягнулі ўслодыч пакрысе. *(В.-Л.)* 10. Паўз «студэбэкера» з гарматамі на прычэпе па ўзбочыне праімчаў «віліс» камбрыга... Трафейнага «хорха», аднак, не было відаць. *(В.Б.)* 11. Фраў Сабіна трохі разумее папольску. *(В.Б.)*

**58. Адкажыце, які пласты слоў уваходзяць у лексіку абмежаванага ўжывання — у залежнасці ад таго, чым абмежавана ўжыванне гэтых слоў (тэрыторыяй, прафесіяй, прыналежнасцю да пэўнай сацыяльнай групы). Выпішыце са сказаў і ўрыўкаў словы абмежаванага ўжывання.**

1. Худы, заганяны калгасны каняга, як быццам нейкі маўклівы загаворшчык. Колькі праз яго прайшло нелегальных паўлітраў? Конюху адзін, аратаму другі. І ўсе яны — міма каня, нарадасць тым, што пілі, і тым, што ўдала ўправіліся з дачнымі соткамі. А ён хоць бы заржаў!.. *(Б.)* 2. Камбат пытаўся, колькі ў мяне снарадаў — асобна бранябойных, асобна асколачных. *(В.Б.)* 3. Беларускае слова ад Бога, слову нашаму Бог дапамог. Хто не любіць яго, ад тога назаўсёды адвернецца Бог. *(Бар.)* 4. Новыя падыходы да методыкі выкладання, многаварыянтныя ўрокі, актыўная вучэбная праца вучняў — за гэтым стаіць найперш высокая культура педагагічнай працы, якая заключаецца, як мы ведаем, у адзінстве сапраўднага прафесіяналізму і творчага пошуку. *(Н.г.)* 5. Многім тэхнікумам дапамагаюць ва ўмацаванні вучэбна-матэрыяльнай базы прамысловыя прадпрыемствы і арганізацыі. Аднак так ставяцца да сваіх сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў не ўсе міністэрствы і ведамствы. *(М.)* 6. — Ужо, мабуць, піп прыехаў: штось забомкалі. — Спавядацісямем? — А мабуць, што так. *(К-с)* 7. Усе, апроч Дзімкі, які вярнуўся вясной з турмы і якога ўладкавалі слесарам, былі вольнымі — нідзе не працавалі. — Куды хіляеш, Сівы? — пераступіў з нагі на нагу даўно няголены —адпускаў бараду — Біба. — На хавіру? — Не ведаю. Можа, і дамоў... — Не млей. Паплывём лепш у булдыр. Піўка сербанём. Далей — пабачым. Сёння жалезка аванс атрымлівае. Смурнякоў навалам будзе. Разжывёмся. А пакуль Дзімка пачастуе... Коль там маеш? Дубы тры збярэцца? — Рубель з капейкамі... — Малавата. Кухаль на рыла толькі. — Жыдка, — глуха азваўся Дзімка і спахмурнеў больш вычайнага. *(Л.К.)*

**59. Якія словы называюць дыялектызмамі? З «Дыялектнага слоўніка» Ф. Янкоўскага выпішыце 30 дыялектных слоў, размяркуйцеіх па групах: лексічныя, семантычныя, фанетычныя, граматычныя, словаўтваральныя дыялектызмы.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**60. Выпішыце са сказаў дыялектызмы, растлумачце іх.**

1. Паставіўшы міску з расолам і чыгун з картопляй, маці прысела на лаўку (7. *М.). 2.* Толькі, можна сказаць, улезлі ў балота, памачылі пасталы *(1. М.).* 3. Тут яны [гукі] упыняліся ў высокі бераг, адскаквалі назад і беглі ўздоўж яго па дузе лукі і заміралі ўжо за лагуном *(К-с).* 4. Пакуль дзядзькі гаварылі з Міканорам, а жанкі растарэквалі каля прыпека, матка з Волькай і Насцяй, а потым і бацькам узяліся клапаціцца каля стала (7. *М.).* 5. Уверсе растае дым — кагадзе прайшоў поезд *(К. Ч.).* 6. Усё ные і ные, бы выстарцаваць скарынку хлеба хоча ( *М.).* 7. Стала чагосьці жалліва, чагосьці стала браць горнасць ( *М.).* 8. Пры гэтым Спірыдон усміхнуўся: узяць бы гаршчок, насыпаць поўны сопухі, наклеіць на ім паперку з надпісам: «Кацярыне Паўлаўне. Мазь на бровы» — і паслаць ёй *(К-с).* 9. Так дражніла іх кампанію школа за аднолькавага колеру істужкі ў косах, па мясцоваму — пахісткі *(Луж.).* 10. Змроку густога на галым прасторы не было *(Чыгр.).*

**61. Спачатку выпішыце сказы з лексічнымі дыялектызмамі, затым з семантычнымі, фанетычнымі, граматычнымі, словаўтваральнымі. Адкажыце, на якой падставе адносім той ці іншы дыялектызм да пэўнай трупы.**

1. Куе кукуля ўсё радзей, радзей, і дрэвы пахнуць першым сном і мірам *(А. З.). 2.* Корч ездзіў у мясцечко па дохтара (*І. М.).* 3. Ад бацькоў засталася яму хатка, сякая-такая будоўля, надоба, худоба і паўчвэрці зямлі *(К-с).* 4. Чулі не такі далёкі подых той помнай восені і зімы (*І . М.).* 5. Ледзь Ганна, акружаная гоманам і тлумам, ступіла ў цяперашнюю сваю дамоўку, вінаватасць перад Васілём адразу прапала *(І. М.).* 6. «Паночкі, што вы робіце? — палахліва загаварыў дзед Талаш,— нашто забіраеце сена?., апошняе сена!.. Чым жа я худобу карміцьму?» *(К-с). 7.* Дзед Талаш быў у ка-роткім кажушку, у суконных з раменнымі латамі майтках, абуты ў чуні *(К-с).* 8. Дзе падзеліся людзі, і досі ніхто нічога пэўнага сказаць не можа *(Сач.).* 9. «Мне страшно...» — «Чаго ето?» ( *М.).* 10. Прайшлі яшчэ адну лаву хат і звярнулі ў глухаваты завулак, на якім сутыкаюцца агароды дзвюх вуліц (У. *Н.).* 11. На голым, незасланым стале ляжалі кускі хлеба, а пасярэдзіне стала стаяла бурае, старое глінянае цёрла з мёдам *(К-с).* 12. Жытка то жытка, ды і самі вінаватыя! *(І. М.).* 13. Васіль марыў: «Кеб з таго кавалка, што каля цагельні, дасталося. То б надзел буў!..» *(І. М.).* 14. Ето ты будзеш бегці, штоб не апазніцца (/. *М.).*

**62. Выпішыце спецыяльную лексіку, вызначце, да якой галіны навукі яна адносіцца.**

І. Хоць марфалогія належыць да найбольш устойлівых кампанентаў мовы, можна назваць нямала асаблівасцей, якімі адрозніваюцца марфалогія агульнаўсходнеславянскай мовы-асновы і марфалогія сучаснай беларускай мовы. Пададзім некалькі прыкладаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У старажытнасці, у агульнаўсходнеславянскай мове, ужываліся іменныя (паводле паходжання) нязменныя формы дзеяслова — інфінітыў (иму ловити рыбу) і супін (иду ловить рыбъ); у беларускай мове замацавалася адна з дзвюх форм — фанетычна зменены інфінітыў (ловити— лавіц', беречи — берагчы), які выцесніў другую форму — супін (ловитъ і г. д.)...

Назоўнікі, прыметнікі і займеннікі скланяліся, а дзеясловы спрагаліся не толькі ў адзіночным і множным ліках, а і ў так званым парным, у сучаснай мове — толькі ў адзіночным і множным ліках; страцілася катэгорыя парнага ліку (дакладней — парны лік выцесніўся множным), запанавалі формы множнага ліку.

*(Ф. Янкоўскі)*

II. Старажытная Кіеўская дзяржава, у якую ў IX—X ст. увайшлі заходнія землі Русі, уяўляла сабой раннефеадальнае палітычнае аб'яднанне ўсходнеславянскіх зямель (княстваў) і некаторых суседніх неславянскіх тэрыторый.

Пачатковая стадыя ў развіцці феадальнага грамадства вызначыла спецыфічныя рысы дзяржаўнасці — слабасць цэнтралізаванага кіравання, асаблівасці ленных адносін. Палітычнае панаванне Кіева за межамі зямлі палян першапачаткова заключалася толькі ў тым, што кіеўскія феадалы на чале з князем збіралі даніну з насельніцтва падпарадкаваных зямель і прыцягвалі яго да ўдзелу ў ваенных паходах за межы Русі.

Значная частка сялянства ў той час яшчэ не знаходзілася ў асабістай залежнасці ад феадалаў, а жыла і працавала на абшчынных землях. Вось чаму дружыннікі першапачаткова атрымлівалі ад князёў не землі з насельніцтвам, якое на іх жыло, а толькі права збіраць з іх даніну.

*(Гісторыя Беларускай ССР)*

III. Калійныя солі — асадкавыя горныя пароды, складзеныя з лёткараствaральных солей калію, звычайна разам з натрыем, магніем і інш. Асноўныя мінералы сільвін, карналіт, радзей каініт, лангбейніт, шэніт, палі-галіт. Калійныя солі — асноўная сыравіна, з якой атрымліваюць калійныя ўгнаенні, металічны калій і яго злучэнні.

Утварэнне калійных солей адбываецца пры выпарэнні ці ахалоджванні расолаў, насычаных каліем, у ізаляваных басейнах, дзе выпарэнне пераважае над паступленнем вады. Паклады калійнай солі звычайна прымеркаваны да верхніх частак разрэзаў галагенных фармацый...

*(БелСЭ)*

**63. Прачытайце. Выпішыце пчалярскую лексіку. Вызначце, да якой падгрупы спецыяльнай лексікі (тэрміналагічнай ці прафесійнай) яна адносіцца.**

I. «Калі пашанцуе, то і з адной калодкі можна раз-весці пчолкі»,— гаварыў Сёмка, абціраючы цыбук проста аб халат.

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Асцярожна везлі мужчыны вулей. Марцін ішоў з ад-нага боку, Гілёрык — з другога і дзяржалі вулей, каб ён не варочаўся і каб не паадпадалі плястры з пчоламі. Даўжнік абвязалі белаю завязкаю, а ў вочка ўваткнулі пучок кулявой саломы, каб праходзіў дух і каб не выляталі пчолы. Гілёрык бачыў, што ад яго залежыць лёс вулля, і, што сілы, налёг на лёсткі. «Што за ліха? Дай, Марцін, сякеру, адчынім голавы». Прынеслі сякеру. Сёмка выняў круг.*(Я. Колас)*
II.

Звон пчаліны стаіць.
Сёння дзень ладзьбавання.
Над калгаснаю пасекай з самага рання
Распагодзіўся неба прастор сіняваты.
Каля домікаў і лежакоў храпаватых Затрымаліся мы.
З куралёў дымок сіні
Уецца, сцелецца, рой суцішае пчаліны.
Асцярожна, падважыўшы, доўж адкрываем.
А ў глыбі — соты поўныя золатам ззяюць...

*(М. Танк)*

**64. Выпішыце з тэксту тэхнічныя тэрміны. Растлумачце іх значэнне.**

Гудзе друкарскі цэх.

Суцэльным гулам ракочуць вялізныя ратацыённыя машыны — камбайны друкарскай справы. Сіпяць і ляскаюць малыя руплівыя «амерыканкі». Да суму аднастайнымі раскатамі гудуць машыны, што называюцца плоскімі. Іх шум нагадвае марскі прыбой. Не толькі шум! Гледзячы ўздоўж лініі дзесятка гэтых машын на тое, як з-пад вальцаў узад ды наперад з мерным грукатам рас-качваюцца талеры,— зрокам памяці бачыш, як кішыць на пяску Тіена, як неспакойна варушыцца галька, як пырскаюць угару ўсплёскі хваль, у бяссільнай злосці штурмуючы валуны...

Думы і вобразы заключаны ў металёвыя радкі набора. Палосы— старонкі будучай кнігі — таксама строга і стройна заключаны ў форму. Па спускавой дошцы на барабан спаўзаюць белыя аркушы. Чорныя вальцы раз-іораз убіраюць пад сябе нагружаны наборам талер. З барабана на доўгія лучыны «пальцаў» сплываюць аддрукаваныя аркушы. Побач з машынай няспынна расце стапа паперы.

Падлетак Міхась Лазунок першую ноч стаіць каля плоскай друкарскай машыны. Ён увесь напоўнены радасцю працы над кнігай.

Праўда, найбольш складаная і адказная частка работы зроблена без Міхася. Майстар сам спусціў і прыправіў форму, сам адрэгуляваў накладку, сам зрабіў заліўку і змазку машыны. Міхасю засталося толькі стаяць ды глядзець — наглядаць за спраўнасцю друкавання. Аднак, нягледзячы на гэта, хлопец адчувае сябе бадай што зусім паўнаякасным майстрам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*(Я. Брыль)*

**65. У адрозненне ад тэрміна як афіцыйнай, узаконенай назвы пэўнага паняцця, «прафесіяналізм — гэта паўафіцыйнае слова, распаўсюджанае (найчасцей у гутарковай мове) сярод людзей якой -небудзь прафесіі, спецыяльнасці. Яно не з’яўляецца строгім, навуковым абазначэннем паняцця» (*Калинин А.В.* Лексика русского языка. — М., 1971. — С. 141). Прафесіяналізмы, як і дыялектныя і жаргонныя словы, не ўваходзяць у лексіку літаратурнай мовы і падаюцца толькі ў спецыяльных слоўніках. Выпішыце прафесійныя словы плытнікаў (1-ы ўрывак), чыгуначнікаў (2-і і 3-і ўрыўкі), паліграфістаў (4-ы ўрывак). Улічыце, што ў апошнім урыўку ёсць і тэрміны (падаюцца ў ТСБМ з паметай «спец.»). Якое прафесійнае слова ёсць у 5-м прыкладзе?**

1. Ад крыку-лаянкі аж дрыжыць паветра: — На «барбару», Янка! — Гартоль бяры, Петра! — Закідай шарыгу! — Прысам папхні ўліва! Варушыся! Мігам! Не спі ў шапку! Жыва!.. А заднік без толку бусаком махае. Галаўнік Міколка бэсціць яго, лае. *(К-с)* 2. Пакуль яшчэ пад’ехаў, пазбягаліся ўсе. Пад’язджаю, трублю і крычу ўжо на станцыі: браткі, бандытаў хутчэй хапайце! І што ж вы думалі — усіх пабралі, як міленькіх. Адзін толькі саскочыў, дый той, небарака, аб сотнік чарапянку зламаў. *(Лыньк.)* 3. Глядзім, ляжыць наш чалавек цалюсенькі, белы толькі, як дыска тая, і не варушыцца. Стукнула яго крыху білам, ды ў самую тую нагу кульгавую. *(Лыньк.)* 4. Палосы — старонкі будучай кнігі — таксама строга і стройна заключаны ў форму. Па спускавой дошцы на барабан спаўзаюць белыя аркушы. Чорныя вальцы раз-пораз убіраюць пад сябе нагружаны наборам талер. З барабана на доўгія лучыны «пальцаў» сплываюць аддрукаваныя аркушы. *(Б.)* 5. У рэдакцыйнай урэзцы паведамлялася, што артыкул друкуецца ў парадку абмеркавання. *(Н.г.)*

**66. Знайдзіце ў наступных урыўках з апавяданняў М.Лынькова «Над Бугам», «Баян» (пад лічбай I) і аповесці В.Быкава «Жураўліны крык» (пад лічбай II) жарганізмы, выкарыстаныя часцей за ўсё як сродак маўленчай характарыстыкі персанажаў — былых зладзеяў.**

I. 1. А людскія заткалы-раты гнусавяць ляніва: — Гэй ты, чалавек... Шантрапа... Замухрыжаны шкет... 2. Пераслуханы сотні гісторый змрочнымі вечарамі, абыдзены сотні шалманаў — у гутарках, у бяседах на нарах, у бяседах бяссонных. 3. Сотні быляў і казак: аб волі, аб шырмачах — дамушніках, чардачніках, аб мокрых і нямокрых справах, аб славутых уцекачах, аб мастацтве дзевятага рабра, аб дзівосным выглядзе воч чалавечых, калі ім паказаць жывую смерць... 4. Ціха лаяліся шэптам за сціркамі вуркаганы. Былі самаробныя сціркі, трэба было асцярожна іграць у іх — бо ні добрага гуку з тых сціpак, ні калянасці ў іх, ні цупкасці, ні добрага смаку ў гульні той. 5. Вот што... годзе, даволі... пафілонствавалі, пабязулілі, хопіць туфту заражаць. 6. Дык гэта ж я адзяялы папёр.. Адзінаццаць адзяяльцаў стырыў... 7. Брыгадзірава гармонь ляжала на нарах, цьмяна паблісквала асірочанымі галасамі, наганяючы сум на ўдарнікаў: туфтачэй былых, філонаў учарашніх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

II. 1. Пшанічны думаў, што трэба было б яшчэ назбіраць быльнягу, каб закапацца ў яго і «прыкімарыць», — як кажа Свіст, — якую гадзіну ўначы. 2. Нейкая банка, новая кашуля, сухія анучкі — на, салага, на падмену трымай. 3. Трудная жытуха, марская, а прывыкнеш — нішто. 4. Кажуць бывалыя: на захад не ткніся: цяпер ты з блямбай на векі вечныя. 5. Сядзяць у турме два басякі. Аблаялі ўрадніка, вось і сядзяць галодныя і пра жратву думаюць. 6. Падаў заяву — давайце разлік — не пушчаюць... «Не ў турме ж я, адсядзеў сваё — давай грошы!» Усё ж выбіў у іх касую і прыкаціў у Маскву.

**67. Прачытайце сказы і ўрыўкі з мастацкіх тэкстаў. Назавіце ўжытыя тут жарганізмы. Якія з іх супадаюць па форме з агульнанароднымі словамі, але адрозніваюцца ад іх значэннем і экспрэсіўна-стылістычнай афарбоўкай?**

1. «Вы, — кажа [студэнт] , — прыйдзіце да нас на экзамен, там гэтымі шпорамі вагон можна грузіць». Аказваецца, студэнты шпорамі шпаргалкі называюць. *(Тул.)* 2. А «блін» — гэта і ёсць «блін», — ну, спытайся ў майго Шуркі: першы дзень у садзік схадзіў, вярнуўся — так шпарыць: што ні слова, то «блін» ды «блін»... Маня спачатку завінулася бліны пячы: во згаладаўся дзіцёнак... А ён: «Мама, блін, мне гэтая жрачка дзярэ...», тоісь, сыты па горла — і ўсё па рэжыму там ды па графіку... Тут толькі мы і ўрубіліся, што «блін» той ну як бы і зусім ніякі не «блін», а гэтакі спосаб, слова, тоісь, каб сказаць і «дзякуй», а іншымі выпадкам і «каціся ты да...» *(В.З.)* 3. Петрык і так мала піў. А пасля выключэння з інстытута зусім завязаў. *(В.К.)* 4. На вочных стаўках з арыштаванымі Коцікаў «закладваў» іх. *(Н.)* 5. Жорык з усяе моцы залімоніў па гэтым бронзавым помніку. *(В.К.)* 6. Неўзабаве бухнулі цяжкія дзверы пад’езда. «Зліняў!» Каб пераканацца, што выйшаў муж, Зіна гоцнула да акна, ад кінула цюль і прыпала да шыбы. *(Л.К.)* 7. Адны жадалі рамантыкі, другія — грошай, гналі, як зэкі, туфту, зараблялі хто памілаванне, хто ордэны. *(В.К.)* 8. Паненка прыводзіць [свайго кавалера], каб «разабраўся» з медсястрой. Маўляў, будзеш «наязджаць», — адпомсцім. *(ЛіМ)* 9. Мы думалі, ты — урка, інтэрнат абкрасці хочаш. *(М.)* 10. Надзя тады яшчэ трохі пакрыўдзі лася. Нейкі зусім няўклюдны хлопец, ці то прарабчык, ці то бугор — брыгадзір-бетоншчык, здаецца. *(В.К.)* 11. Галоўнае, як дамаўляліся: вы — круглыя сіроты, нават не ведаеце, дзе жылі да вайны, а да гэтага — вуркаганілі на чыгунцы, і вось я вас сустрэў там. *(Чыгр.)* 12. Ведаеш, з нашай школы ўсе мужыкі разбегліся. Я апошні застаўся. Зарплаты не плацяць, блін, па некалькі месяцаў. *(Пол.)*

**68. Да пералічаных агульнаўжывальных слоў падбярыце і запішыце стылістычна афарбаваныя словы-сінонімы і сінанімічныя выразы. Адзначце (у дужках, скарочана) стылістычную памету. Пры выкананні задания карыстайцееяя «Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы» АН БССР і «Слоўнікам сінонімаў і блізказначных слоў» М. Клышкі.**

Абшар, адважны, баяцца, віднецца, гаварыць, гля-дзець, дагаджаць, есці, жыллё, лёс, многа, прыгожы, ру-хацца, свавольнік, скупы, упасці, хутка, яда.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**69. Выпішыце размоўныя словы і выразы. Правільнасць іх характарыстыкі паводле стылістычнай афарбаванасці праверце па «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» АН БССР. Растлумачце (вусна) стылістычную ролю размоўнай лексікі ў тэксце.**

1. У кожнай купцы бавілася свая гамонка. 2. Вось Сарока з сынам — хлопец драбнаваты, але ў сіле ўжо, памочнік, нясе з хаты барылца. 3. Уцякаць не спробуй, калі жыць не надакучыла. Ад мяне шчэ ніхто не вылуз-ваўся. Не было такіх здарэнняў. 4. Грамацей ён, ві-даць, таксама быў невялікі, бо літары паяўляліся цяж-ка і крывыя, нязграбныя. 5. Але калі вечарам стары па-вёз у свіран апошні мех, на гумнішчы засталіся толькі Хадоська і Ганна, якім Халімон загадаў падгрэбці, пры-браць усё. 6. Заўважыўшы Міканора, ён кінуў недага-рэлы кулёк саломы, выпраміўся, расчырванелы пры агні, з плямай сажы на шчацэ, весела крыкнуў дзятве, каб прымоўклі. 7. Ганна ўжо надзела жакетку, сабралася ісці, калі бацька, скручваючы цыгарку, напомніў пра пачатак гаворкі. 8. Ледзь маці ўправілася сказаць дзядзьку Цімоху, што, мусіць, будзе задуха, як Васіль, тузануўшы Гуза лейцамі, порстка аб'ехаў Чарнушкаў, пакінуў ззаду. 9. Апейка кіраваў сам, вітаўся з людзьмі, што здароўкаліся з ім і кланяліся. 10. Глядзіце, як ладна шыркае ў яго каса, як кладзецца, даўжэе рад! 11. — Вярніся, неслух! — пачуў ён дзедаў загад, але і не падумаў спыніцца. 12. Іншы раз у цішыню ўбіваўся вясёлы голас ад выгану: падшыванцы — свіныя пастухі дурэлі, забыўшыся пра сваіх свіней. 13. Сышоўшыся ў купкі, дзядзькі і хлопцы смалілі цыгаркі, гаманілі. 14. Спакваля ўціхалі людзі — спачатку старэйшыя, жанатыя, потым і моладзь. 15. Васіль нядобра таўхануў працягнуты клунак назад маці.
(7. *Мележ)*

**70. Выпішыце словы і выразы кніжнай лексікі. Карыстайцеся «Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы» АН БССР і «Беларуска-рускім слоўнікам» (1962).**

Кастусь Каліноўскі — беларускі рэвалюцыянер-дэмакрат і мысліцель, кіраўнік паўстання 1863—64 гадоў на Беларусі і ў Літве. Разам з В. Урублеўскім і Ф. Ражан-скім выдаваў беларускую нелегальную рэвалюцыйна-дэмакратычную газету «Мужыцкая праўда». Выйшла сем нумароў, аўтарам і рэдактарам большасці з іх быў Каліноўскі. «Мужыцкая праўда» ўпершыню на беларускай мове несла рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі ў асяроддзе сялянства, заклікала яго да паўстання.

Царызм задушыў паўстанне. Каліноўскі арыштаваны. На следстве і судзе трымаўся стойка і мужна. Царскія каты патрабавалі, каб ён выдаў сваіх паплечнікаў. Каліноўскі ім адказваў: «Калі грамадская шчырасць з'яўляецца дабрачыннасцю, то шпіёнства апаганьвае чалавека... Усведамленне гонару, уласнай годнасці і таго становішча, якое я займаў у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

грамадстве, не дазваляе мне ісці на іншы шлях». Каліноўскі гераічна загінуў на царскай шыбеніцы ў Вільні.

Каліноўскі — палымяны абаронца свабоды, адукацыі і народнага самакіравання. Радаваўся росту самасвядомасці народа, таму, што людзі з сялян самі могуць пісаць і вучыць народ праўдзе і свабодзе. Шкадаваў, што ў школах не даюць асноўных ведаў навукі, не вучаць дзяцей на роднай мове. Царскія суды называў воўчай ямай, дзе не разбіраюцца, хто правы, хто вінаваты. Не малітвамі, не верай у бога, а шляхам рэвалюцыі заклікаў ён змяніць тагачасны свет.

Каліноўскі быў і астаўся палымяным рэвалюцыянерам, барацьбітом за справу працоўных.

*(БелСЭ)*

**71. Выпішыце з мастацкага твора дзесяць сказаў са стылістыч-на афарбаванымі словамі, абазначце іх стылістычную памету: кніжн., разм., уст., дыял. і г. д. Растлумачце (вусна) стылістычную ролю гэтых слоў у тэксце.**

**72. Выпішыце стылістычна афарбаваныя словы і выразы, растлумачце (вусна) іх значэнне. Адкажыце, да якога стылю мовы на-лежыць тэкст.**

Ваенныя караблі на рэйдзе, выведзеныя для заўтраш-няга парада, былі густа і ярка расквечаны флагамі. Эсмінцы, супрацьлодачныя караблі, ракетаносцы стаялі ў адным страі, падводныя лодкі — у другім. Нізкія, пры-садзістыя падводныя караблі нагадвалі Вераніцы Васільеўне велізарных драпежных рыбін, якія ўсплылі, паднялі грозна плаўнікі і вось зараз у шалёным імпэце кінуцца на бераг, дзе на прычале сабраліся цікаўныя. І яшчэ яе ахапіў страх, калі ўявіла раптам, што такая аграмадзіна можа нырнуць і не ўсплыць. Вераніка Васільеўна ажио рукой правяла каля вачэй, нібы адганяла ад сябе гэтае страшнае відовішча.

З прышвартаванага да галоўнага пірса карабля з дзівосным перапляценнем тросаў, труб, мачтаў, над якімі ўзвышаліся крылы лакатараў, чуліся ўзмоцненыя дынамікам каманды; то выклікалі наверх боцмана, то загадвалі нешта адключыць ці, наадварот, уключыць. А з суседняга, другога карабля лілася песенька пра любоў да марака. Спявачка прызнавалася, што кахае марака і таму за ўсіх маракоў заўсёды ў трывозе. На чыстай вадзе паміж пірсамі плавалі заякараныя, выразаныя з пенапласту, ярка расфарбаваныя дэльфіны, белыя лебедзі і белыя мядзведзі, пальма, кіпарысы і яшчэ розная флора і фаўна далёкіх гарачых тропікаў. У гэтай цацачнай аздобе адчуваўся сум людзей Поўначы па цёплай зямлі.

*(В. Хомчанка)*

**73. Спішыце, падкрэсліце архаізмы, вусна ахарактарызуйце іх (тлумачэнне некаторых слоў падаецца пасля практыкавання).**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Разгорнем рамёны мы шырай і вызвалім край *(К-с).* 2. Ды і ўрокі цяжкаватыя на два панскія дні *(Каратк.).* 3. [Грышка] лапці сам пляце, аборы ўе... Нават дастаў ад панскага сына 'лемантар і чытаць літары навучыўся *(М. Ч.).* 4. У Нью-Йорку быў [землятрус *(М. Л.).* 5. Я пашлю Сцёпку, і а дванаццатай вы спаткаецеся ля дзвярэй ілюзіёна *(Гал.).* 6. Чуць хіснуўся вус гнаркома, а з вачэй плыве цяпло, штось з былога — ім 'вядома —пэўна ў памяці ўсплыло *(К-с).* 7. Ен [Казімір] падаставаў кнігі, нерагледзеў некаторыя знаёмыя балоны, аднак чытаць не мог, хацелася ў адну хвіліну прачы-таць кнігу (А'. *Ч.).* 8. Думка была пра тое, каб разжыцца, план у горадзе купіць і адчыніць заезджы двор *(Гал.).* 9. Судавы, пратрымаўшы нас да вечара, прачы-таў якісь папер аб тым, што Бортак з Бартчыхай купілі Замораўку *(Ф. Б.).* 10. Ззяюць на лузе машэст) аксаміты і ткань залатая шаўкоў *(К-с).* 11. Хлопчык гэтак жа, бывала, ішоў у двор на сенажаць ці наймаўся за падпаска *(К-с).* 12. Тагды ўжо з генералам часта і гарбату піў *(Ф. Б.).*

***Рамёны*** **— плечы.** ***Урок*** **— тут: задание, якое павінны былі выканаць прыгоішыя сяляне.** ***Ілюзіён*** **— кінатэатр.** ***Балоны*** **— тут: запісы, паметкі ў кнігах.** ***План*** **— тут: участак зямлі для пабудовы дома ў горадзе.** ***Машэст*** **— плюш.**

**74. Якія з выдзеленых устарэлых слоў часу з’яўляюцца гістарызмамі, а якія — архаізмамі?**

1. На *пасаг* дам два *гарцы* грошай і *шляхецкую худобу*. *(Д.-М.)* 2. Як толькі ўехаў у *ваколіцу* ды стаў каля Бэркі, дыкзараз і закрычаў: *дзесяцкіх, соцкіх!* Сабраць усю *шляхту* да Ціхона Пратасавіцкага. *(Д.-М.)* 3. Панскія *лёкаі* і *гайдукі* ў ліўрэях з вышыванымі гербамі пана Вашамірскага, пад камандаю бравага *стольніка* ўсё насілі на стол, насілі з такой заклапочанасцю, нібы *маёнтак* павінны сюды перанесці: насілі асцярожна, трымаючы пасудзіны ў белых сурвэтках, каб *хлопскія* рукі не пашкодзілі панскаму апетыту. *(Бяд.)* 4. І *ўрадніцкая* галава строіць складаныя планы, тчэ хітрыя сеці, у якіх павінна заблытацца *крамола. (К-с)*

**75. Ніжэй прыводзяцца розныя віды лексічных архаізмаў. Праз супастаўленне іх з пададзенымі ў дужках сучаснымі адпаведнікамі вызначце, да якой разнавіднасці адносіцца той ці іншы архаізм, і выпішыце асобна ўласна лексічныя, лексіка-фанетычныя і лексіка-словаўтваральныя архаізмы.**

Агрыкультура (агракультура), акалічны (навакольны), адпачывальня (спальня), амбарас (клопаты, непакой), астрог (турма), аэраплан (самалёт), багатнік (багач), багамаз (іканапісец), бібліялогія (кнігазнаўства), ватэрклазет (прыбіральня), вырак (прыгавор), выхрыст (пярэхрыст), лада (каханы, каханая), лемантар (буквар), лік (твар), лілея (лілія), літавальнік (паяльнік), лупняк (сланец), ляхі (палякі), магазын (магазін), малітоўнік (малітвеннік), малітоўны (малітвенны), матрыманіяльны (шлюбны), маціца (перламутр), модлы (малітва), мосенж (латунь), мошаст (аксаміт), мужыччо (мужыкі), мурын (негр), мэтр

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(настаўнік), народазнаўства (этнаграфія), невідочны (нявідны), нечытэльны (нечытальны), падлоўчы (ляснічы), пажуіраваць (жуіраваць), паморак (мор), палаці (палаткі).

**76. Якія архаізмы называюцца семантычнымі? Знайдзіце ў сказах семантычныя архаізмы. Выпішыце іх і растлумачце іх значэнне падборам адпаведнага сіноніма. Пра сэнс слова *галасаваць* (1-ы сказ) гл. у «Слоўніку беларускай мовы» І.І. Насовіча.**

1. Усе лезуць на гару яны і, як у школе, галасуюць. *(Тар.)* 2. Нясе вялікі мех пан гэты, паўным-паўнюсенька набіт, усё там кніжкі ды газеты, ну як каробачнік які!.. *(Тар.)* 3. Пінская ваколічная шляхта... Дзея адбываецца ў ваколіцы О... паміж балотаў, у глушы Пінскага павета. Сцэна паказвае шляхецкую ваколіцу. *(Д.-М.)* 4. У іх ужо такая натура: без капеек і чвэрцяў, як без солі ў страву, ніяк не абойдуцца; капейкі і чвэрці — да скарбу, а рублі — сабе. *(Д.-М.)* 5. Мы з Грышкам паклонімся ў пояс найяснейшай кароне, дык ён пагодзіць нашых бацькоў, а табе за крывое паказанне дасць харошую гонку. *(Д.-М.)* 6. Здуру хочаш крыва прысягнуць? А знаеш, чым гэта пахне? *(Д.-М.)* 7. На кашулю глядзіш крывым вокам... *(Баг.)* 8. Каля пасады лесніковай цягнуўся гожаю падковай стары, высокі лес цяністы. *(К-с)* 9. Дзялянкі лесу карчавалі і на трацяк іх засявалі — капу да скарбу, дзве дадому... *(К-с)*

**77. Ахарактарызуйце неалагізмы, назавіце іх тыпы. Чым адрозніваюцца аказіянальныя словы (індывідуальна-стылістычныя неалагізмы) ад неалагізмаў?**

**78. Знайдзіце неалагізмы, растлумачце іх лексічнае значэнне.**

1. Капітан адчуў незразумелую трывогу, азірнуўся назад — шыхт салдат рушыў за ім. *(М.)* 2. Мяне даўно цікавіла прырода «стукацтва», «стукачоў». Заснавальнікам жанру можна было б лічыць Іуду, але, напэўна, ён быў проста няшчасным слабым чалавекам. Да таго ж без Іуды не было б Ісуса Хрыста. У біблейскай легендзе ўсё прадумана: без здрадніцтва няма подзвігу. *(Пол.)* 3. Мацнейшага зусім неабавязкова перамагаць у сумленнай бойцы. Можна на яго «стукнуць»... *(Пол.)* 4. Я не вельмі дакараў маю суразмоўніцу за тое, што духоўных узаемін з вучнямі ў яе няма. *(Н.г.)* 5. Такія ўжо непераможныя трусы ўдаліся — ад самага дэмбельнага дня не вылазілі, лічы, з гэтых самых — зноў жа салдацкіх — штаноў... *(В.З.)* 6. У адным загадзе было напісана: «Абюсціць чытальную залу...» Гэта значыць — паставіць там бюст Леніна. *(Пол.)*

**79. Выпішыце выдзеленыя словы ў наступным парадку: неалагізмы 20—30-х гадоў, неалагізмы 70-х гадоў, аўтарскія неалагізмы.**

1. *Саўнарком* засядаў позна, гадзін да адзінаццаці. Але і пасля таго, як *наркомы* разышліся, Ленін доўга яшчэ не выходзіў *(Шам.). 2.* Да *саўгаса* «Сосны» па балоце — рэйкі, гэта ад *Камуны* ідзе *вузкакалейка (Куп.).* 3. Вярнуўшыся з арміі, ён [Максім] зараз жа і прыступіў да работы, ён пачаў з арганізацыі *камсамольскай ячэйкі (К-с).* 4. Алесь стаў цярпліва тлумачыць, што *БелАПП* — гэта Беларуская асацыяцыя пралетар-скіх пісьменнікаў, якая цалкам стаіць на платформе савецкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

улады і бальшавіцкай партыі (/. /VI.). 5. І спяваюць *вятры-самагуды* тучным звонам у струнах дратоў, на гітарах слупоў, што бягуць, як ганцы, з *Асінбуду,* каб працоўнаму вольнаму люду прывітанне аддаць хоць без слоў *(К-с).* 6. Кузьма. *Метад"комплекснасці* я адкідаю, у мяне ёсць на гэтае *свае* матывы, а буду я цяпер вучыць *лабараторным спосабам* па *Дальтплану (К-с).* 7. Пры кантакце з паверхняй скуры жывой істоты *ферэ^ зол* выклікае імгненную гібель клетак анамальнага развіцця *(З газет, 1977 г.).* 8. А на рэчцы на Арэсе растуць *ацябраты, піянеры, камсамольцы* — з бальшавіцкім гартам *(Куп.).* 9. І вось цяпер, калі ён [Пракоп] сутык-нуўся нос у нос з *трактарам,* дык мімаволі адчуў някаторы страх, як бы гэта была не проста машына, а нейкая жывая істдта *(К-с).* 10. Як метафары няўлоўныя, сніце-ся, *філалагіні (Р. Б.).* 11. «Гэты год выдатны і тым,— ганарыўся старшыня *ЦБК,*— што даў надзвычайны росквіт *калектывізацыі,* вялікі рост культуры народа» (У. *М.).* 12. Паступова далучаючыся да турбот і клопатаў свайго *супалктніка,* я набываў у ім друга, але не скажу, што і аднадумца *(Віт.).* 13. На *рабфаку* на вячэрнім ву-чацца студенты — сваю цемру, некультурнасць знішчаюць дашчэнту *(Куп.).* 14. *Экарбіт*— новы ізаляцый-ны матэрыял, ён больш трывалы за рубероід *(З газет, 1979 г.).* 15. *Салаўяцца* яры, атаманяць вятры пад тарою ля сцен Магілёва *(Вярц.).* 16. Працяглы сістэматычны пошук процівірусных рэчываў прывёў да адкрыцця хімічнага злучэння, якое актыўна дзейнічала на вірусы грыпу і герпесу. Рэчыва назвалі *тэбрафенам (З газет, 1978 г.).* 17. У 1978 годзе з'явіўся новы антыбіётык — *рубаміцын,* які мае шмат пераваг у нараўнанні з ужо вядомымі *(З газет).*

**80. Аказіянальныя неалагізмы называюць яшчэ кантэкстуальнымі, індывідуальна-аўтарскімі, аўтарскімі наватворамі. Знайдзіце аказіянальныя неалагізмы, растлумачце іх сэнс. Якую функцыю выконваюць яны ў мастацкіх і іншых тэкстах?**

1. Скурганіў бы душу чырвонцам тваім я; гуслям, княжа не пішуць законаў. *(Куп.)* 2. Песня мая не шукае прывету, ласкі ў скурганеным сэрцы чыім. *(Куп.)* 3. Паміж пустак, балот Беларускай зямлі, на ўзбярэжжы ракі шумнацечнай, дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі, — ўдзірванелы курган векавечны. Дуб галлё распусціў каранасты над ім, сухазелле ў грудзі ўпілося. *(Куп.)* 4. У маланках перуновых з гулкім гоманам грымотаў для вякоў дыхтуйце новых нечувалыя ясноты. *(Куп.)* 5. — Мала йшчэ вас гэтыя абскубанды паскубалі. — Не абскубанды, тата, але акупанты, акупанты. *(Куп.)* 6. Цікава толькі, як гэта вы з сваім апошнім саўбураўскім становішчам дапасуецеся да самай навейшай палітычнай сітуацыі, што круціцца ўжо каля Пярэспы? *(Куп.)* 7. [Гарлахвацкі:] Значыць, яна гэтае самае... пабландынілася, а я і не заўважыў... Так улёг у работу, што нават не заўважыў, калі жонка валасы пафарбавала. *(Крап.)* 8. Відаць, нас мала перылі, што цягне да імперыі пад сцягам мусульманістым з палітбюро іваністым. *(Бар.)* 9. Зданямі з'яўляюцца ў «Сне на кургане» відмавы

таварышы, а відмы — хто? Мо — тагачасная апрычыншчына-навуменклатура? *(Г.К.)* 10. Трэба нашармачка як след наканьячыцца, набрэндзіцца, а пасля, як Вярхоўны Савет, прэзідэнціцца, рэферэндзіцца. *(Бар.)* 11. Душаловы чакалі, калі заляціць птах, якога засватала неба. І палын саладзіць, і руку залаціць служкі д’яблавы ўмеюць што трэба. *(Бар.)* 12. Як метафары няўлоўныя, сніцеся, філалагіні. *(Бар.)* 13. У краіне лайдакоў, дружных радасцю, дзеляцца спакон вякоў голазадасцю. *(Бар.)* 14. Двухмоўе дай старому партуну! Дагэтуль пад чырвоным сцягам клымае. Ён толькі за імперыю адну — ядзіную і нецялімую! *(Бар.)* 15. Ад станка, ад бараны крадуны і беруны, краллі, браллі не драмалі, вуха старчаком трымалі. *(Бар.)* 16. Запытаўся воўк у сабакі: — Ці да лесу яшчэ далёка? — Дзве вярсты з невялікім гаўкам. *(Бар.)*

**81. Зрабіце лексіка-стылістычны разбор выдзеленых у тэксце слоў. Прыкладны парадак разбору: 1) лексічнае значэнне; 2) паходжанне: агулькаславянскае, усходнеславянскае, уласнабеларускае, запазычанае; у запазычаным слове назваць прыметы іншамоўнасці; 3) слова адназначнае ці мнагазначнае, з прамым ці пераносным значэннем; назваць іншыя, значэнні мнагазначнага слова; 4) пада-браць да слова сінонімы, антонімы; 5) прыналежнасць да актыўнай ці пасіўнай лексікі; разрад пасіўнай лексікі — гістарызм, архаізм, неалагізм; 6) сфера выкарыстання: агульнанароднае, прафесійнае, дыялектнае, жаргоннае; 7) стылістычны разрад: для вуснай мовы — агульнаўжывальнае, гутарковае, прастамоўнае; для пісьмовай мовы — афіцыйнае, паэтычнае, публіцыстычнпе, тэрміналагічнае.**

Песня *лунае* ў прасторы, душэўная песня пра нашы прыгожыя спакойныя прасторы, пра нашу бела-зялёную вясну, пра наша *залатое* пшанічнае *лета.* І вялікія чор-ныя вочы Алеся глядзяць гэтай песні ўслед.

Акно адчынена. Я сяджу ля акна.

На *пірамідзе гумна* бачу даўно знаёмы выступ буслінага гнязда, а на гняздзе — самога *бусла.* Не дрэмле ён, таксама, відаць, слухае. Далёка быў стары, далей яшчэ за мяне. А ўсё ж ніяк, здаецца, не можа вырашыць, якую старонку назваць радзімай, якім пірамідам аддаць перавагу. Пра гэта думаў ён, *даўганогі* дзівак, на каменных *егіпецкіх* помніках *горкай* няволі, калі тужыў па саламяных пірамідах нашых гумнаў. Пра гэта думае, відаць, *і сёння.*

*(Я. Брыль)*

**82. Выканайце лексічны разбор выдзеленых слоў.**

Нядаўна яшчэ тут шумела залатым калоссем **збажына**, а над ёй, у шырокім блакіце неба, нязмоўклымі званочкамі **ліліся** песні вясновых жаўрукоў. (Р.Ігнаценка)

**83. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары на правапіс *е, ё, я,* звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых зычных. Расстаўце неабходныя знакі прыпынку. Выканайце лексічны аналіз выдзеленых слоў.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Быў ціхі **мяккі** вечар адзін з тых што бываюць толькі ў чэрв..ні калі траскучыя навальнічныя дні зм..няюцца яснымі цёплымі духмянымі калі ўсё з..лёнае расце дружна як бы ўзахапкі.

Аз..рцо л..жала спакойнае і роўнае бы шкло ад цішыні што навісла над ім і здаецца аж звінела. Ці можа гэта звінела ў Вало..ькі ў вушах ад таго што **напружваў** пам..ць узнаўляў у ёй малюнкі дзіцячых гадоў? Тады на месцы аз..рца была звычайная сажалка зарослая "пухоўкамі" так дзеці называлі раго.. . Вало..ька бегаў з с..брамі ламаць гэтыя "пухоўкі" рудыя дзябёлыя таўкачыкі падсушвалі іх і тады з іх лё..ка выскубваўся пух гэты пух чаплялі адзін аднаму на спіны ў валасы і ад яго доўга нельга было атрэсціся. Было гэта даўно. Тады і пагон быў сапраўдная **пожня** якую касілі. На ёй в..ліся кучамі чм..лі а цяпер іх са свечкаю не знойдзеш патруціла **хімія**. Было многа гнёздаў жаўтапу..кі так называлі ам..лушку якую Вало..ька любіў слухаць пасля таго як аднаго разу знайшоў у ягадах падлётка і выкарміў яго.

Цяпер замест канавы роўненькі канал з голымі б..рагамі пя..чаным дном чыстаю, халоднаю крынічнаю вадою. Станеш ногі імгненна нямеюць а хола.. па жылах здаецца падымаецца да самых кончыкаў вушэй. Вось дзе загартоўка! У такой вадзе не толькі рыба ці ўюн а нават звычайны жук-плывунец ці п'яўка ў спячку залягуць. А раней жа ў канаве сажалцы столькі было карасёў уюноў.

**Ц..чэ** м..няецца не толькі вада аказваецца... (224 словы)

Паводле У. Рубанава

**84. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары. Расстаўце неабходныя знакі прыпынку. Выканайце лексічны аналіз выдзеленых слоў.**

Кастравіцкі прыехаў да ..озера ў канц.. ліпеня у гарачы напоўнен..ы сонечным бляскам дзень. Ён ніколі не быў тут раней але многа наслухаўся пра даброты а..пачынку ў тутэйшых мясцінах ціхіх мала кранутых (з)за дал..чыні ўвагай дачнікаў і ўсіх тых хто ..рвецца летам з мітусні гарадоў на прыроду. ..озера сапраўды было цудоўнае вялізнае сярэбранае **люстра** ў зялёнай аправе сасновых бароў. Але асаблівай цішыні не было бо дачнікі і турысты на адлегласць відаць не зважалі. Па ўзбярэж..ы пад соснамі стаялі палаткі а найчасцей проста (М.м)асквічы і (В,в)олгі у якіх спалі ноч..у іх уладальнікі (з)раніцы **дымілі** ў лесе кастры і к..рагазы вясёлага бе..клапотнага табар.. гара..ан.

Па дамоўл..н..асці з (навукова)дасле..чым **інст..тутам** Кастравіцкаму далі пакойчык на бі..станцыі абсталяван..ай для назіран..яў над р..ж..мам ..озера. Побач з бі..станцыяй ра..мяшчаўся спар..ўны лагер студэнтаў і яны загарэлыя да колер.. **бронзы** цэлы дзень **галёкалі** на беразе перакідваючыся мячом (у)а..дымку хлопцы і дзяўчаты вандравалі па прыбярэжным пяску ці купаліся падск..кваючы ў вадзе як д..льфіны і агалошваючы навако..е вясёлымі выгукамі.

З сабой Кастравіцкі прывёз цэлае б..рэмя кніг добрых чытан..ых яшчэ ў юна..кія гады і цяпер (напаў)забытых памятных толькі па тым пачуц..і якое некалі выклікалі. Толькі два ці тры разы на дзень ён падымаўся купацца вада была халодная і празрыстая як ран..шняя раса у возера ўпадала толькі

РЕПОЗИТОРИЙ

маленькая рачулка адна яна не магла яго напаіць але ўзровень не паніжаўся нават ў гэты сп..котлівы месяц калі мялеюць буйныя рэкі. (226 слоў)

Паводле І.Навуменкі

## ФРАЗЕАЛОГІЯ

**1. Акрэсліце значэнне тэрміна «фразеалогія». Параўнайце з тэрмінамі «лексікалогія», «фаналогія», «марфалогія». Якія моўныя звароты вывучае фразеалогія?**

**2. Акрэсліце сутнасць фразеалагізмаў. Пакажыце іх суадноснасць са словам і свабодным словазлучэннем. Прачытайце сказы, вызначце свабодныя і фразеалагічныя словазлучэнні.**

1. Мяне асабліва ўражвае, трывожыць, *збівае з тропу* найболыц незвычайнае і нечаканае, у псіхалагічных і маральных прычынах якога разабрацца цяжэй і складаней *(Віт.), 2.* Чалавек часамі *збіваўся* з простата *тропу,* яго вяло ў бакі, але ён дапоўз да рачулкі *(К. Ч.).* 3. Стаміўся вельмі, не хочацца нават *паварушыць рукою (Кул.).* 4. «Рабіць толькі трэба,— заўважае гаспадар.— *Не паварушыш рукою* — само ў далоні не ўпадзе...» *(Луж.).* 5. Усё зіхцела ў пераспелых росах, калі ля весніц, ціхая, иясмслая, *руку* мне Зося *падала... (Пл.).* 6. Вырашылі, што трэба бліжэй трымацца. Перакінуцца словам, *руку падаць.* І пакрысе весці сваю баразну *(Луж.).* 7. У торбачцы быў *кавалак хлеба,* бутэлька малака, некалькі салёных агуркоў *(Пестр.).* 8. Куды больш агідна стараннымі бываюць тыя, што ўжо маюць *кавалак хлеба,* і добры, але хочуць большага *(Б.).* 9. На све-це толькі той шчасце мае, хто сябе *ў руках трымае.* 10. Глядзім: дзяўчынка *трымае ў руках* невялікі збаночак *(Пестр).* 11. На душы ў яго [лесніка] было цэлае пекла. Злосць на таго, хто ссек дуб, хто, як сумыслу, як на здзек яму, зрабіў гэтую пакражу, не клапоцячыся *схаваць канцы (К-с).* 12. Не спяшаючыся, завязала хустку, *канцы* яе *схавала* пад кажушок, яшчэ раз глянула на хату і выйшла ( *М.).* 13. А *рукі* ты, відаць, дарэмна *апусціў.* Ці ж ужо і ратунку няма *(Маш.).* 14. Узяла ў рукі праклятыя вяровачкі, глянула і *рукі апусціла,* задрыжалі... *(Кр.).*

**3. Знайдзіце ў тэксце фразеалагізмы, растлумачце іх значэнні.**

I. ...Сымон не паддаецца. Скрыпку ён сваю бярэ,— Струнны звон чароўна льецца, То дужэе ён, то мрэ. Адгукнуліся пакоі, Падхаш'лі гожы зык; Спалі жартаў тых настроі, Прыкусілі ўсе язык. А Сымон іграе-творыць, Ён забыўся, ён не тут... Пан Галыга збіты з тропу, І не верыць ён вушам, Ён вачэй не зводзіць з «хлопа», Чарам тым паддаўся сам. *(Я. Колас)*

II. Маўчалі абодва. Пасля ён [Мароз] спыняецца, нядобра зыркае на мяне і кажа: «Мне некалі здавалася, што вы — разумны чалавек».—

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

«Магчыма, і быў разумны».— «Дык не задавайце тады неразумных пытанняў».

Сказаў, як адрэзаў, і змоўк. І, ведаеш, мне стала трохі не па сабе. Адчуў, што, мабыць, даў маху, змарозіў глупства. Сапраўды, як я мог сумнявацца ў ім! Ведаючы, як ён тут жыў, чым быў раней, як можна было падумаць, што ён за тры месяцы перарадзіўся. І знаеш, я адчуў без слоў, без запэўнівання і бажбы, што ён наш чалавек — чэсны, харошы.

*(В. Быкаў)*

***4.* Вылішыце са сказаў тры фразеалагізмы, кампаненты якіх незахавалі слоўнасці. Пакажыце, у якіх фразеалагізмах слоўнасць кампанентаў захавалася.**

1. І смешна цяпер мне глядзець і шкада, як чосу даюць равеснікам *(Пл.).* 2. Пры бацьку і Анісім набіў руку, што сам мог ставіць хаты і ў чысты і ў круглы вугал *(Саб.).* 3. І зноў адчуў ранейшую няёмкасць: улез чалавеку ў душу, разверадзіў яго бяду, а сам назад *(Б.).* 4. Мацей цяпер ужо шкадаваў, што не прывёз з лесу на-рыхтаваных дроў. І збіраўся быў, і каня брыгадзір абя-цаў, ды збіла з панталыку жонка: дровы, бач ты, пачакаць могуць, перш пуньку ўцяпліць трэба *(Стр.).* 5. Маланкай ірванулася здагадка, белым бляскам халоднага жаху напомніла акопны шэпт: «Камандзірам палону няма...» І хлопец як мага хутчэй закрыўся словамі: — Рэкрут! Я рэкрут!.. *(Б.).* 6. Зося — гэта ведаў ён пэўна — сэрцам надта ўжо прыкіпела да яго *(В. Б.).* 7. І пракос у пракос вырастае як стой... *(Куп.).* 8. «Адчапіся ты,— гаварыла Марына.— Лезеш сляпіцаю толькі са сваім» *(Скр.).* 9. Вось табе раз. Адразу відаць, што тры гады хлопец бібікі біў... *(Лыньк.).* 10. Жылі ў гэтай хаце заўсёды душа ў душачку *(Нар. те.).*

**5. Выпішыце спачатку фразеалагізмы з нязменнымі словамі-кампанентамі, потым — са зменнымі.**

1. Я шчаслівы, што ў суджаны час нарадзіўся на гэтай зямлі, дзе такія густыя лясы і такія спакойныя рэкі. Дзе вясной непаўторна штораз зелянеюць разлогі-палі, дзе ўладар гэтай дзіўнай красы — ты, народ мой, на вечныя векі *(Гіл.).* 2. Прырода сама па сабе, яна заўжды без натугі дабром і мірам клалася яму на душу, але цяпер сталі патрэбны *людзі* — іхнія *аблічччы,* позіркі, іх згодная еднасць ці хоць бы абыякавасць — усё роўна хацелася бачыць людзей *(В. Б.).* 3. Быў жа нехта адзін, хто склаў песню, як кажуць, даў ёй крылы, і яна паляцела па краі і па стагоддзях, і ўжо тады кожны песельнік што дадаваў да яе, а што адымаў... *(А. М.).* 4. Я шчаслівы, што ў братняй сям'і ты надзейную дружбу знайшоў, хлебам-соллю часцей што ні год сустракаеш гасцей ля парога, што ў далёкіх і блізкіх краях, дзе ні быў, дзе ні ехаў, ні ішоў, я не чуў пра цябе, мой народ, аніводнага слова благога *(Пл.).* 5. Гаворыць ён удала, на язык востры, калі скажа слоўца ды прыкажа, дык доўга будзеш памятаць, навылет ён пройме цябе сваім словам *(К. Ч.).* 6. Ноч. Ні душы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дванаццаць гадзін *(Пл.).* 7. Потым стары ўспамінае пра свае ранішняе зда-рэнне. Спазніўся вось толькі дарма, выбраўся з дому ў свіныя галасы *(Б.).* 8. Цяпер гоеці ўсе былі на зборнай і рвалі жываты ад смеху *(К-с).* 9. «Гэтак шчыруючы, ты, браток, усе свае набыткі на вецер пусціш»,— пасміхнуўся Канстанцін Міхайлавіч *(Луж.).* 10. Пятнаццацігадовым падлеткам Павел прачытаў «Маці», што адкрыла яму вочы на жыццё... *(Б.).*

**6. Выпішыце спачатку фразеалагізмы са сталым (зафіксава-ным), а потым — са зменным парадкам слоў-кампанентаў.**

Даць рады, лёгкая рука, следам за дзедам, блізкі свет, кату па пяту, з працы рук, розуму набрацца, з ног да галавы, па канец рук, языкамі званіць, на сухі лес, выкінуць на вока, не даваць ходу, на маю галаву, адным духам, давесці да ладу, хоць вады напіся, хварэць на пана, куды ногі нясуць, як мыла з'еўшы, нішто сабе, лахі пад пахі, вочы пазычыць, абое рабое.

**7. Знайдзіце ў сказах фразеалагізмы з факультатыўнымі кампанентамі і фразеалагізмы, кампаненты якіх аддзелены словамі свабоднага ўжывання.**

1. На прыстані ўладзівастоцкай, дзе мы чыталі вершы роднай мовай, стары мужчьша падышоў да нас... Калі ж стрымаў сябе ад слёз нарэшце, назваўся ціха і сказаў: «Даруйце, не спадзяваўся сам, што так раскісну, вы ўсю душу разверадзілі мне» *(Пл.).* 2. Школа — запаветны дом маленства і юнацтва, і ці будзе дарагім, родным ён таму, хто за дзесяць гадоў навучання не кіўнуў пальцам, каб упрыгожыць гэты дом, укласці ў яго сваю працу і клопаты, дагледзець сад, вырасціць у ім свае дрэвы і кветкі? *(Віт.).* 3. Бацька мой, хоць невучоны быў, а меў, брат, галаву *(Пл.).* 4. Дзе гэта сіла, дзе моц тая, што перашкод сабе не мае і ставіць зразу ўсіх па ногі, вядзе на вольныя дарогі і свет праторпы адчыняе? *(К-с).* 5. Сэрца чалавечае не можа жыць у вечнай весялосці. Не ные толькі сэрца бессардэчнае, счарсцвелае ад зайздрасці і злосці *(Пл.).* 6. Палешукі— людзі паважныя, сталыя, асцярожныя, не адразу і не кожнаму расчыняць сваю душу, бо ўжо, мусіць, сама прырода Палесся пала-жыла на іх сваю адзнаку *(К-с).* 7. І, на добры лад, ня-хай бы ішоў большанькі Язэпка на свой хлеб *(Як.).*

**8. Раскажыце пра мнагазначнасць фразеалагізмаў. Параўнайце значэнні выдзеленых фразеалагізмаў.**

1. Хоць бы глянуць *адным вокам,* як будуць жыць нашы дзеці *(Дам.).* *2.* Бывала, у нядзелю, як толькі забразгае маці скавародамі,— усхопішся кулём з пасцелі ды скарэй за конаўку мыцца, а *адным вокам* усё на блін пазірасш *(Кр.).* 3. А як ішоў дадому тата...— чуў я за вярсту. Казаў, бывала, сумпавата, што *гледзячы на лес* расту *(Р. Б.).* 4. Жылі сабе там людзі *на лес гледзячы,* ніхто іх не чапаў, ніхто ім ніякас бяды не рабіў... *(Нар. те.).* 5. Клічуць гудкамі на ўсход магістралі, *вока не зводжу* я з

воблачных веж *(Вял.).* 6. Хлопец даўно з яе *вока не зводзіў (Луж.). 7.* Броня больш хіліўся да рамяства і, як толькі Андрэйка *ўзняўся на ногі* так, што без старэйшага брата мог аходаць зямлю, Броня пайшоў у старую кузню вучыцца за каваля *(К. Ч.).* 8. Бацька ж мой, як толькі *падняўся на* свае *ногі,* дык не толькі зграбаў на рынку сена *(Тар.).*

**9. Раскажыце пра аманімічнасць у фразеалогіі. Параўнайцеаманімічнасць у лексікалогіі і фразеалогіі. Выпішыце з «Фразеалагічнага слоўніка» Н. В. Гаўрош, 1. Я. Лепешава, Ф. М. Янкоўскагаартыкулы *вачэй (вока) не зводзіць, да (апошняй) ніткі.***

**10. Выпішыце з «Фразеалагічнага слоўніка» Н. В. Гаўрош, І. Я. Лепешава,Ф. М. Янкоўскага пяць-шэсць фразеалагізмаў, падбярыце да іх свабодныя словазлучэішi (спалучэнпі слоў). Складзіцеі запішыце сказы з трыма фразеалагізмамі і амамімічнымі свабоднымі словазлучэннямі.**

**11. Параўнайце антанімічнасць у лексікалогіі і фразеалогіі. Ці аднолькава часта сустракаюцца антанімічныя словы і фразеалагізмы? Выпішыце са сказаў антанімічныя пары фразеалагізмаў.**

1. І агеньчык роднай хаты быў, здавалася, недзе далёка-далёка! А ён жа тут ужо, рукой падаць! *(В.).*2.«Блізкі свет, а от бачыце, сама прытупала»,— гаворыць цётка *(Трах.).* 3. Раней я злаваўся на пасажыраў, якія на злом галавы выбягаюць на кожнай станцыі з вагона *(Я. С).* 4. Стаміліся ўсе і ішлі нага за нагу *(Пестр.).* 5. Наперадзе — зноў новае: новая праца, за якую ён гатоў узяцца з той самай настойлівасцю і хваляваннем, новыя людзі, да якіх ён таксама прыйдзе з адкрытай душою *(Б.).* 6. Рабілі ўсё гэта хлопцы, каб было шыта-крыта *(К-с).*

**12. Знайдзіце ў сказах і выпішыце варыянтныя пары фразеалагізмаў. Вызначце фанетычную, марфалагічную, сінтаксічную, лексічную, камбінаваную варыянтнасць.**

1. Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю, так як той чалавек перад скананнем, катораму мову займае, а потым і зусім замёрлі *(Ф. Б.).* 2. Старэнькай маці, калгасніцы, адняло мову. Прыляцеў самалётам вучоны сын, два дні сядзеў над ёю, і толькі на трэці яна апрытомнела, і першае, што сказала — спыталася: «А ці абедаў жа, сынок?..» *(Б.).* 3. Была і ў гміне і ў павеце, у розных следчых і паноў і абхадзіла на ўзві-вецер нямала панскіх устаноў *(К-с).* 4. Бываюць от жа рызыканты — ты яму кол на галаве чашы, а ён адно выскаляецца. 3 такім гаварыць — што на вей-вецер *(Віт.).* 5. Халодныя дажджы прабіралі да самых касцей, даваўся ў знакі голад *(Лыньк.).* 6. «От табе наш баранчык даўся ў знакі»,— не мог змоўчаць Уладзя Якавецкі *(К. Ч.).* 7. Хлеб-соль еш, а праўду рэж *(Нар.).* 8. Паляцім мы і да Вільні, дзе хлеб і соль дзялілі спольна *(Куп.).* 9. Каторы год гляджу на белы свет, а ўсё ніяк не нагляджуся *(Б.).* 10. Здавалася, ішоў бы і ішоў у чысты свет, аж покуль бы не зваліўся з ног *(Пташн.).* 11. І навошта было гэтаму хлапчуку раскрываць душу, выкладваць усё,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

што думаў *(Грах.).* 12. Зноў бянтэжылася, як бы просячы прабачыць ёй, што так душу адкрыла *(Пл.).* 13. Ды, зрэшты, перад кім ён выварочваў сваю душу? *(К. Ч.).* 14. Ходзіць ходырам свет цэлы *(Куп.).* 15. Як зірнеш, дык ажио люба, галава аж ходам ходзіць! *(Куп.).* 16. Цераз дзесятае ў пятае ён [камен-дант] мог гаварыць па-руску *(К. Ч.).* 17. Расказвалі праз пятае-дзесятае *(Віт.).* 18. Пакуль Колька часаў языком, Юрка з Алёшам адсоўвалі цяжкія вагонныя дзверы, хлопцы падцягвалі трапы *(Грах.).* 19. Хопіць ужо часаць язык, працаваць трэба *(Лупе).* 20. Цярэбяць дамаседа, гудуць суладна ўнукі: «Расказвай казкі, дзеда, табе ж і кнігі ў рукі» *(Віт.).* 21. Калі пачалі выбіраць дэлегацыю ў саўгас і выставілі яго [Каржакевіча] кандыдатуру, ён адмахваўся *і* рукамі *і* нагамі, сказаўшы, што тут усе карты ў рукі беднаце *(Кр.).* 22. Бачыш, не трэба вешаць нос. Яшчэ ўсё можа перамяніцца *(Дам.).* 3. Маўчаць яны [хлопцы], насы спусцілі, сядзіць дарэктар, як на шыле *(К-с).*

**13. Падбярыце да наступных фразеалагізмаў варыянтныя і запішыце іх. 3 трыма фразеалагізмамі вусна складзіце сказы.**

За розум брацца, ліха яго ведае, як агню ўхапіўшы, не за гарою, не лезе ў рот, зямельку парыць, бокам вы-лазіць, ні свет ні світанне.

**14. Выпішыце са сказаў фразеалагізмы, аб'яднайце іх у сінанімічныя рады. Раскажыце пра сінанімічнасць фразеалагізмаў.**

1. За культуру ў нас трэба змагацца па-сапраўднаму, трэба нават біць у званы!.. *(Б.).* 2. Зірні, Даніла: такі самы, як ты, і крошачкі пабраў, і губкі гэтак жа зацяў *(К-с).* 3. І рэчка пад бокам, і процьма ў ёй рыбы *(К-с).* 4. Дык што ж я часам б'ю трывогу, чаму, пра што хачу згадаць? Ці не таму, што, узяўшы многа, не змог на столькі ж і аддаць *(Кір.)*- 5. Цяжка, брат, ісці, ужо выбіліся з сілы *(М. Т.).* 6. «На сваю ўдавіную долю злуе, а разам і на тых, хто не ў яе руку гаворыць»,— растлу-мачыла Зося па-свойму *(Кр). 7.* Пісар, як відаць, ста-раўся пусціць трохі пылу ў вочы *(К-с).* 8. Будынкі ўсе на адзін лад *(К-с).* 9. Калі яна зваліцца з ног — каб хоць слова хто ёй сказаў добрае *(К. Ч.).* 10. За хараство І вось за гэту цёплую усмешку і ўзяў Юзік Зосю. Згаладаўся ён у панурай суровай сям'і па ласкавым хлебе ды прыветнай усмешцы. А бацьку ды мачасе гэта не ў нос *(Кр.).* 11. Цяпер вось і вясна не за гарамі *(Б.).* 12. Ды яны ж аднаго поля ягады *(Мак.).* 13. Прабавала Аўдоля, застаўшыся салдаткаю, сама гаспадарыць, дык дзе ж вы бачылі... Натузаецца жанчына за дзень, прыедзе дадому — ні рук ні ног не чуе *(Кр.).* 14. Да дому роднага цяпер адсюль рукой падаць *(Вял.).* 15. У Амерыцы любяць, як кажуць, напусціць туману, замыльваць вочы вонкава прыгожанькім ці занадта пампезным *(Луж.).*

**15. Вызначце, якія з выдзеленых фразеалагізмаў сінанімічныя, якія — варыянтныя.**

1. Над усімі гэтымі пытаннямі Клімёнак не раз *ламаў галаву,* аднак калі зноў даводзілася брацца за такую ўжо звыклую, здавалася б, справу,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пачынаў хвалявацца *(Дам.).* 2. Будзеш *мазоліць галаву,* як найпрасцей вы-канаць такое задание *(Луж.).* 3. Плачуць душы, як каня, *з дня ў дзень* і з *году ў год,* прагнуць душы святла спатканняў і баяцца імглы адзінот... *(Вял.).* 4. Усе лю-дзі, што *ад лета да лета* даўно жывуць тут, ведаюць гэтую легенду *(Каратк.).* 5. Часта здаралася так, што ён [Тодар] забываўся, ад каго пачуў тую ці іншую навіну, і, сустрэўшыся, расказваў яе таму, ад каго пачуў раней сам, і расказваў так, нібы ўсё гэта бачыў *на свае вочы* і чуў *на свае вушы (Кр.).* 6. Спыніўся на парозе, на хату *кінуў востры зрок (К-с).* 7. Вандроўнік не зважае на гэты вычварны ўбор і *вочы кідае* на двор *(К-с).* 8. Васіль і Яўхім сустрэліся *тварам у твар (І. М.).* 9. Тут гаспадар *нос у нос* сутыкнуўся з суседам *(Пестр.).* 10. Мой друг *упадаў душою,* а надзеі не траціў *(Віт.).* 11. Сам агонь у полі тлее, нікагусенькі няма. Хлопчык зразу вееялее,— *духам падаў* ён дарма *(К-с).* 12. Зноў і зноў я думаю пра тых, хто адсюль *за сеет* паехаць мусіў, і ў хвіліну гэтую чамусьці так шкада мне, так шкада мне іх *(Пл.).* 13. Поля мала, ды і тое хоць бы ў адным месцы, а то — дзе яно? *За светам... (К-с).* 14. Адзін толькі белы матьтль ляціць насустрач лодцы... Нябось, намахаешея,— *блізкі свет (Б.).*

**16. Складзіце сказы з фразеалагізмамі *ні жывы ні мёртвы, па са-мыя вушы, вочы калоць,* ужытымі з розным значэннем. Падбярыце да гэтых фразеалагізмаў сінанімічныя.**

**17. Выпішыце са «Слоўніка сінонімаў і блізказначных слоў» М. Клышкі некалькі сінанімічных радоў, у якіх ёсць фразеалагізмы.**

**18. Падбярыце да слоў *разумны, хвалявацца, хутка, малы, дакучаць* сінанімічныя рады, у якіх былі б і фразеалагізмы.**

**19. Выпішыце з «Фразеалагічнага слоўніка» Н. В. Гаўрош, І. Я. Лепешава, Ф. М. Янкоўскага па тры фразеалагічныя зрашчэнні, фразеалагічныя адзінствы і фразеалагічныя спалучэнні. Вусна рас-тлумачце, на якой падставе аднеслі фразеалагізмы да зрашчэнняў, адзінстваў, спалучэнняў.**

**20. Выпішыце са сказаў фразеалагічныя зрашчэнні, фразеалагічныя адзінствы, фразеалагічныя спалучэнні.**

1. І скрозь, куды б мяне ні прывялі шляхі-дарогі пад высокім небам, ты [Нарач] — сімвал любае навек зямлі — была мне ўцехай і надзённым хлебам *(Пл.).* 2. Радыё, кіно, газета настолькі ўвайшлі ў побыт, што, пішучы, мы павінны адчуваць сябе з народам-чытачом з вока на вока *(Б.).* 3. Беларус я! Ох, дам пытлю, хто скажа іначай *(Куп.).* 4. Я цябе прашу, хоць гады ў рады прысніся *(Р. Б.).* 5. Адны трымалі руку Максіма, шкадавалі яго, другія — наадварот, былі рады, бо зайздросцілі яму *(К-с).* 6. Злосць бярэ, калі раяць паехаць куды лячыцца. Быццам недзе ёсць зямля больш лячэбная, як радзіма *(М. Т.).* 7. Толькі б ведаць, а шчаслівы быў бы, што мой сціплы плен не прападзе і на роднай матчынай сялібе хоць камусьці ў сэрца западзе *(Пл.).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

8. «Думаў зрабіць, як чалавеку, а цяпер — вось табе гула асмаленая!» — злосна сказаў Сцяпан *(К-с).* 9. Не трэба вешаць галавы! Ваенная служба ўмацоўвае чалавека *(Луж.).* 10. Урзшце прыйшоў загад здымацца і ісці на захад. Здымацца — значыць працiўнік дае задні ход, падмазвае пяткі *(Дам.).* 11. Ну, і прыйшлося пасля за гэтыя словы пасвяціць вачыма *(Б.).* 12. А якой карысці, скажы мне, выпінацца са скуры, лезці на покут, калі цябе туды не просяць? *(Луж.).* 13. Але дзе крыўда і махлярства— тады дзед меў адно лякарства — не паглядзіць ён, хто такі ты: хоць чорт, хоць д'ябал знамяніты, пляваць яму на тваю масць, але ўжо чапаласу дасць *(К-с).* 14. Ноччу ў хаце за стадом, пакуль выйсці на двор, ён быў звёў вочы на якую мінуту, паклаўшы галаву на рукі *(Пташн.).* 15. А пасля, братка, як паднялі тарарам,— хоць уцякай *(Б.).* 16. Дождж прашыў і плашч і гімна-сцёрку, прашыў мяне ад галавы да пят *(П. М.).* 17. Ён [алень] ідзе да мяне і друга, як сцішаны вецер, галаву падстаўляе, сп'адзяецца, што сэрца кране: «Вы мяне не зачэпіце? Вы мяне зберажэце?» *(Каратк.).* 18. Дзядзюлю пачалі зваць «цэнтральнай душой». І от гзтая «цэнтральная душа» здолела так усадзіць нос у сельсавецкія справы, што Вольчын бацька ніякай даведкі не дабіўся *(К. Ч.).* 19. Юзік з самага малку ўзяў над усімі патолю і нікога не прызнаваў *(Віт.).* 20. Бацькі каторая пара няма дома *(Адам.).*

**21. Знайдзіце ў тэксце фразеалагізмы са структурай словазлучэння, спалучэння, сказа. Вызначце сінтаксічную ролю фразеалагізмаў у сказах.**

Прывёзшы дахаты шэсць кавалкаў дуба, Андрэй, да часу, паскідаў іх на старану, дзе ляжалі яшчэ немалочанае жыта і салома.

Прызнацца, Андрэй нават не рад быў, што ссек гэты дубок: мала што можа стацца. Быць не можа, каб хто не ўбачыў, як ён пхаўся ўначы з лесу. А языкі ў людзей доўгія. Пад уплывам гэтых думак Андрэй быў неспакойны: спаў кепска і часта абуджаўся, прыслухоўваўся, што робіцца на дварэ.

Кожны гук, шум прымушалі трывожыцца і думаць ліха ведае што. І якая гэта схованка — гумно? Усякі дурань першым дзелам паткне туды свой нос. Тут Андрэю прыйшлі на памяць тыя здарэнні, калі ў гаспадароў знаходзілі дубкі, бярэзінкі і ўсякія падобныя рэчы якраз у гумнах... Трэба перахаваць, і чым скарэй, тым лепей — покі не ўзялі яшчэ тропу.

*(Я. Колас)*

**22. Выпішыце э апавядання Я. Брыля «Марыля» тры сказы, у якіх фразеалагізмы выконваюць розную сінтаксічную ролю.**

**23. Выпішьше са сказаў фразеалагізмы і абазначце ў дужках, якой часціне мовы паводле значэння адпавядае кожны фразеалагізм.**

1. Успомнім, як бясстрашна ўставаў за шчасце чалавек і як шануе памяць наша жывое слова з веку ў век *(Віт.).* 2. Усё да сэрца браў я блізка... *(Бр.).* 3. Глухая партызанская дарога, зарослая ўспамінамі, зашыфраваная дзятламі, замаскіраваная лістападам, затканая павуціннем

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

бабінага лета *(М. Т.).* 4. Убіралася ў сілу вясна, і з кожным днём цяплела на вуліцы *(Стр.).* 5. Нават Марусі трапілі на вочы мае вершы значна пазней, калі мы ўжо жылі разам *(К-с).* 6. Такі ўжр гэта быў хлопец, што калі браў што ў галаву, дык не хутка расставаўся са сваёй думкай *(В. В.).* 7. Маці і брат, дзве найбліжэйшыя ў яго жыцці істоты, дзве прычыны яго пякучай і тугі і няўцешнага болю няведання, стаялі перад вачыма такімі, якімі Алесь іх бачыў у апошні раз *(Б.).* 8. Не лыкам шыты петрушоўцы і бачаць панскіх слуг наскрозь *(К-с).* 9. Ляжыць Міколка ні жывы ні мёртвы і толькі чуе, як моцна б'ецца ды вырываецца з грудзей яго маленькае сэрца *(Лыньк.).* 10. І сонца свеціць так, нібы на гэтым белым свеце ўсё спакойна і нават радасна *(Б.).* 11. Душа ў душу жылі ўвесь час... *(Куп.).* 12. «Чаго ты крычыш? — абазвалася пакрыўджаная буфетчыца.— Я старая жанчына. Бач, які герой знайшоўся. Сам кату па пяту, а распараджаецца» *(К. Ч.).* 13. Селязнёў быў мужык асаблівы, але, знаеш, нс без галавы. На ражон не пёр, як некаторыя *(В. Б.).* 14. Другі [хлапчук] зусім саб'ецца з тропу, глядзіць, як выбіты з сядла, а іншы сам насыпле з копу, і дзед не возьме ў сэрца зла *(К-с).* 15. Дзядзька Ігнат 1 ў хаце сядзіць, ля дзяцей, мы без яго як без рук *(В.).*

**24. Выпішыце са сказаў дзеяслоўныя фразеалагізмы, ахарактарызуйце іх.**

1. На беларускую дзяўчыну, калі тут праўду ёй аддаць, ніхто шчэ каменем не кінуў і не наважыцца кідаць *(Куп.).* 2, 3 базару людзі валам валяць, хто мёд нясе, а хто касу, а я — не многа і не мала — сто новых прыказак мясу *(Неп.).* 3. Твой сын другім не прадаваў душы. Ён тут радзіўся, ты [Беларусь] — яго калыска *(Пл.).* 4. І што за Ліпава такое? А гэта — поле маладое сярод лясоў, як скінуць вокам... *(К-с).* 5. Слухас Зося, што расказвае Тодар, а ў самой сэрца аж як не выскачыць... Ніколі ж дагэтуль яна і вока нікому не запарушыла *(Кр.)*- 6. Там ва ўсе званы звоияць пра гэты цуд *(Пестр.).* 7. Яно па ядзе яшчз можна пражыць, але ж нуда чалавека поедам есць. *(Б.).* 8. Таго народ шануе і вялікай уладай надзяляе, хто за яго стаяць тарой гатоў, хто толькі пра свае карыта дбае і ў вочы пыл пускае — скідае з седала далоў *(Вал.).* 9. На вецер не кіну, а чалавеку не пашкадую, калі таго бяда агорне *(К- Ч.).* 10. Страляючы вачыма адна ў адну, Сымоніха з Лявоніхай патроху пачынаюць гутарку *(Бяд.).* 11. Землякі слоў на вецер не кінуць *(М. Т.).* 12. Маўчыць Даніла, збіты з тропу *(К-с).*

**25. Выпішыце з «Фразеалагічнага слоўніка» М. В. Гаўрош, І. Я. Лепешава, Ф. М. Янкоўскага шэсць фразеалагізмаў кампаратыўнага характару. Растлумачце, чаму іх лічаць фразсалагізма.**

**26. Самастойна падбярыце да наступных рускіх фразеалагізмаў беларускія адпаведнікі, праверце па слоўніках. Параўнайце граматычную структуру беларускіх і рускіх фразеалагізмаў.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гляди в оба, нелегкая принесла, два сапога пара, толкнул нечистый, как ни в чем не бывало, уши прожужжать, в кои веки, пустить по миру, белены объелся, дать маху, плестись в хвосте, у черта на куличках, из уст в уста, оказать милость.

**27. Раскажыце пра стылістычныя разрады фразеалагізмаў. Знайдзіце ў «Фразеалагічпым слоўніку» Н. В. Гаўрош, І. Я. Лепешава, Ф. М. Янкоўскага фразеалагізмы рознай стылістычнай афарбоўкі.**

**28. Запішыце некалькі фразеалагізмаў са значэннем 'пакараць', 'анічога', 'уводзіць у зман', 'гультаяваць', 'позна', 'памерці'. Вызначце стылістычную афарбоўку кожнага фразеалагізма.**

**29. Прачытайце наступныя ўрыўкі з мастацкіх і публіцыстычных твораў. Знайдзіце фразеалагізмы, растлумачце іх, вызначце *стылі*стычную афарбоўку.**

I. Ручаёк ніяк не мог узяць гэтага на розум. Праўда,урэшце ён застанавіўся на думцы, што Вецер больш маеўвагі ад Дрэва затым, што ён языком менціць і туды ісюды, не гаворыць праўды, а замазвае вочы розныміБайкамі. *(Я. Колас)*

II. Рана Міхась памёр... Падчапіў недзе тыфусу, паляжаў колькі дзён і памёр...

Які ён там ні быў,— усё ж такі свая кроў. Ды і адзін жа, як тое вока ў ілбе. Гаравала дужа, колькі слёз праліла!.. Неяк яно тады ўсё самае лепшае ўспомніцца, уся тая ласка, якая была. Стаяла яна над ім стаянцом, дзень і ноч.

*(Я. Брыль)*

III.

Даруйце, серп, саха, страха, Мае вытокі і асновы,
Што адцураўся кажуха, Куды ў кішэню лез па словы.
Не сцерпіць малады чытач: «Расчуліўся без дай прычыны. А мне да лямпачкі, прабач, Твой дзедаўскі кажух аўчынны!..»
Ну што ж, І ты даруй мне, друг,—
Ты болей за мяне свядомы,
Бо перакроіў мой кажух
Па новай модзе — на дублёны.

*(В. Вітка)*

**30. Складзіце кароткі слоўнік (10—15 артыкулаў) фразеалагізмаў, якія бытуюць у вашай мясцовасці.**

**31. Выпішыце з кніг «Беларускія народныя прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы» Ф. Янкоўскага, «Беларускія прыказкі, прымаўкі, загадкі» Я. Рапановіча пяць прыказак (прымавак), якія ўжываюцца толькі з пераносным значэннем, пяць прыказак (прымавак), якія ўжываюцца з прамым і пераносным значэннем, і пяць прыказак (прымавак), у якіх адна частка — з прамым, другая —з пераносным значэннем.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**32. Згрупуйце тэматычна і заш'шыце паступныя прыказкі (прымаўкі). Дапоўніце народнымі выслоўямі, якія вы ведаеце.**

I. 1. Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка. 2. Тойне можа быць другам, хто ў бядзе абыдзе кругам. 3. Набытая мазалём капейка перацягне лёгкі рубель. 4. Легкапасварыцца, цяжэй памірыцца. 5. Дома і салома ядома,а на чужыне і гарачы тук стыне. 6. Новых сяброў набывай, а старых не забывай. 7. І шыла, і мыла, і ткала,і прала — і ўсё языком. 8. Адклад не ідзе ў лад. 9. Родная зямелька як змораному пасцелька. 10. Хто з маладосціпрацуе, той на старасці не шкадуе. 11. Благая птушка свайго гнязда не пільнуе. 12. Як дбаеш, так і маеш. Не тое багацце, што далі, а тое, што рукамі нажылі. На чужой старане і на печы холадна. 15. Шчасце ў кожнага пад мазалямі ляжыць.

II. 1. Ад пустота звону карысці нікому. 2. Рада людзейгуртуе. 3. Дарагі не а бед, а прывет. 4. Ёсць што гаварыць, ды няма чаго слухаць. 5. Калі ўлез у дугу, не кажы немагу. 6. Любіць увесь свет лагодны прывет. 7. Дурань недабачыць, а разумны прабачыць. 8. На галаве строй, а ўхаце з лапатай стой. 9. Хто бацьку шануе, той добруюдолю дзецям гатуе. 10. З другой смяецца, а самой бліне ўдаецца. 11. Усё знай, ды не ўсё бай. 12. Самая балючая рана ад свайго дзіцяці. 13. Нашто той клад, калі ўдзетках лад. 14. Шчыраму сэрцу і чужая болька баліць. 15. На языку мядок, а ў сэрцы лядок.

**33. Прачытайце сказы. Назавіце прыказкі (прымаўкі) і фразеалагізмы, якія творча выкарысталі мастакі слова.**

1. Пылінку бачым у суседа, ды што — у яго іх не адна! А ў сваім воку, даўнім следам, не заўважаем бервяна *(Куп). 2.* «От,— адказала Марта.— Воўк сабакі не баіцца, але не хоча звягі слухаць» *(Б.).* 3. Народ пакліча да адказу,— ваду жбан носіць да пары *(Куп.).* 4. А што ж ты, як той казаў, не пад'еў, а толькі замурзаўся *(Б.).* 5. «Не падабаецца, напэўна,— казаў Пятрусь,— праўда вочы коле» *(Б.).*

**34. Раскажыце пра абставіны, сітуацыі, пры якіх могуць ужывацца наступныя прыказкі (прымаўкі).**

1. Няўмелыя рукі і плоту не загародзяць. 2. Чым абы-які, то лепш ніякі. 3. Ніхто не зробіць горш табе, чым сам сабе.

**35. Дапішыце крылатыя выразы, назавіце іх аўтара.**

1. Беларусь — мая маці і ... 2. Добра быць у дарозе, якую ... 3. Забілі зайца, не забілі, але ... 4. І ўсё мілагучна для слыху майго... 5. Дурань таму і блішчыць здалёк, што ... 6. Да славы прагныя, ды ... 7. Спынішся — плынню ... 8. Не скажаш часу ... 9. Гуслям, княжа ... 10. Мой родны кут ... 11. Не шукай ты ... 12. Дзе прайшло маленства ...

**36. Выпішыце з кнігі Ф. Янкоўскага «Крылатыя словы і афарызмы» на выбар пяць — дзесяць крылатых выслоўяў, якія лічыце асабліва яркімі і трапнымі.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**37. Выберыце адно крылатае выслоўе, зрабіце яго загалоўкам (тэмаю) вашага сачынення. У сачыненні выкарыстайце фразеалагізмы, прыказкі (прымаўкі), псрыфразы.**

1. Дзе пройдуць ногі маладосці, дыхне і мёртвая зямля (А. Звонак). 2. Гордасць — таксама, мабыць, жаночае хараство (Я. Скрыган). 3. Любоў і дружба шчасце рос-цяць (А. Александровіч).

**38. Растлумачце ў сказах перыфрастычныя выразы. Пры неабходнасці карыстайцеся слоўнікам Г. М. Малажай «Беларуская перыфраза». Растлумачце, што збліжае перыфразы з фразеалагізмамі, што іх адрознівае.**

1. І гонар шырыцца ў вяках тваіх сыноў, тваёй зямлі, ардэнаносная дачка многапляменнае сям'і *(Ал.). 2.* Помніцца рэху адно прадвесне, калі ў лясах адгрымелі стрэлы і задыхаўся мяцеж балесне ў пятлі Мураўёва і ў здрадзе белых,— імем царскім, катнім загадам прывялі атамана павесіць мужыцкай праўды *(Таўл.).* 3. Сэнс гарачых слоў Купалы заходнебеларускі «пан сахі і касы» таго часу разумеў як палітычны лозунг барацьбы за сваё вызваленне *(Таўл.).* 4. Тут жа, непадалёку ад колішняй крэпасці, помнік таму дзеду, дзякуючы якому многія ведаюць Палессе і горад Петрыкаў, ведаюць больш не па расказах людзей, а па творы бацькі нашай прозы *(Сач.).* 5. Учора — высокі настрой у горадзе маленства і юнацтва Леніна (75.). 6. Вось мінулі гады, даўно адшумела вайна, а лясны салдат, дзе ён ні быў бы, няхай на міг толькі прыпыніць крок, заплюшчыць вочы і аддасца ўспамінам, і вы паўстанеце перад ім, як жывыя,— гаманкія бярозавыя гаі, цёмныя бары і пушчы *(Краўч.). 7.* Фашызм замахнуўся не проста на яшчэ адну краіну, на яшчэ адзін народ. Ён замахнуўся на краіну людской надзеі *(Б.).* 8. А больш за ўсё глядзіце, каб не смеў ніхто слупы гранічныя стаўляць і скарбы гор і вод і *засень* дрэў сваей прыватнай уласнасцю назваць, каб там не паўтарылася калі трагедыя народаў і Зямлі *(М. Т.).* 9. Ні дождж, ні град цябе не песціць, надзейны хлеб маёй зямлі *(Р. Б.).* 10. Ён [Руневіч] вярнуўся ў той час, у свой пачатак жыцця, калі мама была самая найлепшая *(Б.).* 11. Люблю бязмежна прадзедаў зямлю, руплівую і мужную краіну... *(Луж.).* 12. Неба расчысцілася, і восень нарадзіла ясноту хоць перад скананнем дня *(К. Ч.).* 13. Пачалося студэнцкае жніво, самая адказная пара ў моладзі *(«Настаўн. газ.»).*

**39. Вызначце прыёмы індывідуальна-аўтарскага абнаўлення агульнанародных фразеалагізмаў.**

1. Першы крок быў зроблены, а за ім пайшлі далей-шыя крокі, цяжкія, марудныя *(Я. М.).* 2. Без каменя за пазухай я падаю, равеснік, табе руку на дружбу, не адхіляй яе *(Пл.).* 3. Дзяўчына яна добрая, без мух *(Пташн.).* 4. Ну і каша! І нябеснай манне да яе далека ў параўнанне... *(Р. Б.).* 5. І вось, «каб уцалець», пані матка выраншы-ла зрабіць адчайны ход дачкою: прыняць да яе вясковага хлопца *(Б.).* 6. Ужо трэці месяц люты

вораг, сцякаючы сваей паганай крывёю, рвецца да Волгі, да Сталінграда *(Кр).* *7.* Які б ні быў Мароз асцярожны, а, ведама, што-ніпто вылезла, як шыла з мяшка *(В. Б.).* 8. Самі заварылі неўміручую кашу, самі і расхлёбвайце *(Кр.).* 9. Яны [дзеці] з крыкам і смехам задаюць махнідрала на конях *(К-с).*

**40. Знайдзіце ў тэкстах фразеалагізмы. Вызначце стылістычныя прыёмы іх выкарыстання.**

I. Родныя мае нанеслі ў палату цюльпанаў, нарцысаў, бэзу. Унучка Юля, агледзеўшы ўсю раскошу, сказала: — Дзядуля, ты як у раі!

I праўда, я быў як у раі. Я быў на сёмым небе, куды так рэдка-рэдка падымаемся з вамі.

*(В. Вітка)*

II. Пашкадуем, і моцна яшчэ пашкадуем,
Як да розуму прыйдзем (а прыйдзем, відаць), Што пра будучнасць дбаючы, часам бяздумна Завіхаліся памяць сваю абкрадаць.
Ні таўсцейшаю лустай, ні большай капейкай Апраўдаць гэту «чыннасць» не зможам павек, Бо, як правільна ў кнізе напісана нейкай: Не адным толькі хлебам жывы чалавек.

*(Н. Плевіч)*

III. Пра Тоню Базылькевіча прывыклі гаварыць, што ён можа варочаць горы. Ведама гэта было перабольшан-не. У гэтай мясцовасці нават і гор ніякіх няма, шмат толькі лесу. Так што горы не горы, а бярвенне Тоня Базылькевіч мог сапраўды добра варочаць. За свае жыццё ён бярвення папаварочаў і карчоў пакарчаваў.

*(К. Чорны)*

**41. Прачытайце сказы. Пакажыце памылковасць ужывання выдзеленых фразеалагізмаў і прыказак.**

1. Падбіраў словы, якія б палілі ворага, білі б яго *не ў брыво, а ў вока.* *2.* Не гарачыся... *Ран'ща мудрэйшая за вечар.* 3. Калі ж з ім пагаварыць, як не цяпер, пакуль няма хлопцаў? Трэба дурню *ўправіць мазгі. 4.* Ешце з голаду, кахайце змоладу, інакш вы — *ні к сялу ні к гораду.* 5. *З мора чакаць надзор'я,* што *ветру ў полі шукаць.* 6. Вы на смерць ішлі без страху, беларускія жанчыны, у імя Радзімы светлай, міру, шчасця і любві! Гэта ваша бессмяротнасць увасоблена ў Харулсай, з вашай мужнасцю Мазанік *меч дамоклаў* узняла. 7. Елі прагна: вялікая бляшанка кансерваў апусцела *ў міг вока.* 8. *Вылівала* цётка *душу,* цётка плакала па мужу. 9. Нехта адзначыць сумна: «Што ўчора, тое і сёння, *дзень і ноч — прэч суткі».*

**42. Прачытайце ў «Беларускай мове» Ф. Янкоўскага (с. 102— 106) пра асаблівасці перакладу фразеалагізмаў. Вызначце спосабы перадачы фразеалагізмаў ва ўрыўках, перакладзеных з беларускай мовы на рускую.**

1. Чулая душа — яна выдатна сама разбярэцца, дзе добрае, а дзе так сабе. Добрае ўвойдзе ў яе, як свае, а так сабе — хутка забудзецца. Усё

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

раздзеліцца, як на ветры зерне з мякінаю *(В. Быкаў).* Чуткая душа, она прекрасно сама разберётся, где хорошее, а где так себе. Хорошее войдет в нее как своё, а прочес быстро забудется. Отвеется, как на ветру зерно от половы *(пераклад Г. Ку-ранёва).* 2. Развіднела. А певень людзей не будзіў. Цішыня. Мёртвы попел. НІ стуку, ні груку *(П. Панчанка).* Рассвело, а петух никого не будил. Тишина. Мёртвый пепел. Как умерли звуки... *(пераклад Б. Ірыніна).* 3. Ж л у к т а *(да Язвы).* За камедыю! Толькі каб иясёлая была. Выве-дзіце такога тыпуса, каб гледачы аж бакі рвалі *(К. Крапіва).* За комедию! Только чтоб весёлая была. Выведите такого типуса, чтобы зритель за животы хватался *(пераклад К. Крапівы).* 4. Напрацавалася [Хадоська] так, што ішла цёмным балотам к свайму агеньчыку як не сваімі нагамі (7. *Мележ).* Наработалась так, что шла тёмным болотом к своему огоньку не чувствуя ног *(пераклад Д. Ковалёва).* 5. Наш вартаўнік Цупрон падняў сёння на ногі ўсю вёску *(Я. Брыль).* Наш сторож Цупрон поднял сегодня ночью всю деревню на ноги *(пераклад А. Астроўскага).* 6. С к р о б а т. Вунь і круціся паміж нашымі і ва-шымі, пакуль галаву не скруціш *(К. Крапіва).* Вот и изворачивайся между нашими и вашими, пока шею не свернешь *(пераклад К. Крапівы). 7.* Тут на беразе, што так блізка падыходзіў да еяла, збіраліся еяляне і радзілі сваe рады *(Я. Колас).* Здесь, на берегу реки, которая так близко подходила к селу, собирались крестьяне н обсуждали свои дела *(пераклад Я. Мазалькова).* 8. Толькі ж — хіба абавязкова слухаць усіх, мала што каму прыйдзе на язык (7. *Мележ).* Только ж — разве ей обязательно слушать всех, мало что кому на ум взбредёт *(пераклад Н. Кісліка).*

**43. Вызначце спосабы перадачы фразеалагізмаў ва ўрыўках, перакладзеных з рускай мовы на беларускую.**

1. Милое, дорогое, незабвенное детство! Отчего оно, это навеки ушедшее, невозвратимое время, отчего оно кажется светлее, праздничнее и богаче, чем оно было на самом деле *(А. Чехов).* Любае, дарагое, незабыўнае дзяцінства! Чаму ён, тэты навекі беззваротны час, чаму ён здаецца больш светлым, багацейшым і святочным, чым быў у сапраўднасці *(пераклад М. Клімковіча). 2.* Первой красавицей и затейницей была шалунья бурая кобылка ... Она затеяла вскружить голову чалой лошадке, на которой далеко за рекой... проезжал мужик с сохой *(Л. Толстой).* Першай прыгажуняй і завадатаркай была гарэзлі-вая бурая кабылка... Яна ўздумала замарочыць галаву мышастаму коніку, на якім далека за ракой праязджаў мужычок з сахою *(пераклад В. Віткі).* 3. Мы ехали уже более двух часов. Меня пробирала дрожь и начинало клонить ко сну *(Л. Толстой).* Мы ехалі ўжо болей за дзве гадзіны. Мяне бралі дрыжыкі і пачынала хіліць на сон *(пераклад Я. Шарахоўскага).* 4. Само собой разумеется, что при такой скупости на движения Савка был гол как сокол и жил хуже всякого бобыля *(А. Чехов).* Само сабою зразумела, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пры такой скупасці на рухі Саўка быў гол як сакол і жыў горш за ўсякага бабыля *(пераклад К. Крапівы).* 5. Стал я замечать, что в который день не пойду к ней, мне словно не по себе, скучно *(А. Чехов).* Пачаў я заўважаць, што калі каторы дзень не пайду да яе, дык сам не свой, сумна *(пераклад М. Паслядовіча).*

## ЛЕКСІКАГРАФІЯ

**1. Акрэсліце значэнне тэрміна «лексікаграфія». Каго называюць лексікографам? Вызначце марфемную структуру слоў *лексікаграфія, лексікограф.***

**2. Назавіце тлумачальныя слоўнікі беларускай мовы. Якое іх прызначэнне? Якія прыёмы тлумачэння слоў вы ведаеце?**

**3. Раскажыце пра змест і будову слоўнікавых артыкулаў з «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы». Вызначце, якія прыёмы тлумачэнння слоў тут выкарыстаны. Спішыце два-тры тыповыя артыкулы.**

Аблічча, азярод, атлетыка, гарэза, дойлід, камуна, кіях, мініяцюра, падарожнік, пожня, ніва, прыпасы.

**4. Параўнайце артыкулы *аблога, капейка, лістоўніца, маёмасць* у «Беларускай Энцыклапедыі» і ў «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы». Растлумачце розніцу ў тлумачэнні слоў у гэтых даведніках. Запішыце два артыкулы ў сшытку.**

**5. Пракаменціруйце структуру наступных артыкулаў са слоўніка І. Насовіча «Слоўнік беларускай мовы» (Спб., 1870): тлумачэнне слова, граматычныя і стылістычныя паметы, ілюстрацыйны матэрыял, адсылкі і інш. Вызначце тып слоўніка. Якое зкачэнне слоўніка для сучаснай лексікаграфіі?**

**Базаринка,** *и, с. ж, и.* **Базаринок,** *нка, с. м.* 1) Гостинец, купленный на базаре, подарок. *Базаринки нищать скрынки. Поел. Без добраго базаринка и вочей к иконому не показывай.* 2) Погулянка во время торга. *Базаринки справляець. Базаринку хорошую зделали.*

**Барицьца,** *рюся, гл. возвр. обл.* Останавливаться, медлить, мешкать. *Сходи к суседу, да там не барись довго.*

**Витаць,** *сов.* Привитиць (Слав, витати), *гл. д.* Приветствовать. *Чему гостей не витаешь, не привитав? Вита витаци, да нечего даци. Поел. Дружков хохол летаець, чему ж боярок не витаець?*

**Глей,** *ю, с. м.* Ил на дне воды. *В глей утопив ноги, не можно вылезци. На глею ничога не расцець. Глеем заплыв луг.*

**Годзиць,** *жу, дзиш, сов.* Погодзиць, *гл. ср.* Временить, ожидать. *Чего ты будеш годзиць тут, погодзили, да й поедзем.*

**Годзиць,** *жу, дзиш, сов.* догодзиць, *гл. ср.* Угождать, делать угодное. *Годзиш ему, як лихой скуле; в одном не догодзи и усё пропало.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Годзиць,** *жу, дзиш, гл. д.* 1) Мирить две против-ныя стороны. *Ты им годзиш, а ены в вир гледзяць. 2)* Склонять к миру неприятеля. *Тодзи его скорей, не погодзиш, будзець худо.* 3. *сов.* Згодзиць, догодзиць. Договаривать. *Годзиць, догодзиць, згодзиць на год работника.*

**6. Запішыце на асобныя карткі ўсе назоўнікі і прыметнікі з урыўка паэмы А. Куляшова «Сцяг брыгады». Складзіце тлумачальны слоўнік, забяспечце словы граматычнымі і стылістычнымі паметамі.**

Жыў ляснік са сваёй леснічыхай
Каля завадзі ціхай.
Камісара да іхняга ганку
Мы прынеслі на ранку.
Для яго папытаўся вады я,—
У нас яна выйшла,
І бярозавіку гаспадыня
Падала нам увішна:
— Піце, родныя, піце,
Таварыша ў хату нясіце.

**7. З «Дыялектнага слоўніка» Ф. М. Янкоўскага (Мінск, вып. 2, 1960) выпішыце тлумачэнні да наступных слоў: *апалант, апорак, чырка, стаўбун* 1*, шэршань, хадун* 1*, тэўшч.* Вызначце, якія спосабы тлумачзння слова тут выкарыстаны. Пракаменцiруйце будову некалькіх слоўнікавых артыкулаў (граматычныя і стылістычныя паметы, ілюстрацыі, пашпартызацыя, адсылкі і інш.).**

**8. З «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» спішыце тры артыкулы мнагазначных слоў і два артыкулы слоў-амонімаў, параўнайце з адпаведнымі артыкуламі «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» А. Я. Баханькова, І. М. Гайдукевіча, П. П. Шубы. Вызначце агульнае і адметнае ў структуры артыкулаў.**

**9. Прачытайце прадмову ў «Слоўніку сінонімаў і блізказначных слоў» М. Клышкі, каб пазнаёміцца, як ім карыстацца. Акрэсліце спецыфіку слоўнікаў сінонімаў у параўнанні з іншымі слоўнікамі.**

**10. Спішыце са слоўніка паронімаў С. Грабчыкава «Цяжкія выпадкі ўжывання блізкіх па гучанню слоў» артыкулы *маладзейшы — малодшы, прачыніць — прычыніць, адзець — надзець, аўтабіяграфія — біяграфія* і пракаменцiруйце іх. Звярніце ўвагу на спосабы тлумачэння паронімаў, ілюстрацыі, прыклады няправільнага выкарыстання слоў.**

**11. Прадумайце змест і будову слоўнікавых артыкулаў з «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы»: *асада* 1*, бугор, буй, бусел, буякі, алёс, аскавень, астадоліцца.* Звярніце ўвагу на семантыку слова ў літаратурнай мове і ў гаворках, славянскіх і неславянскіх мовах, на меркаванне вучоных пра паходжанне і інш.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**12. Вызначце, з якіх лінгвістычных і энцыклапедычных слоўнікаў узяты наступныя артыкулы. Звярніце ўвагу на асаблівасці тлумачэння слова, умоўныя скарачэнні, граматычныя і стылістычныя паметы, адсылкі, каментарыі і інш.**

**АЗЯБНУЦЬ,** -ну, -неш, -не; *законч.* Адчуць холад, змерзнуць. *А ў чым ты пойдзеш? Ты ж уся азябла. Бяры пінжак.* Глебка. *Дрыжаць і лапочуць чародкі асін: пад ветрам паўночным Азяблі зусім.* Крапіва.

**ЖАЛЁЙКА,** беларускі і рускі духавы музычны інструмент; драўляная трубка з адзінарнай трысцінкай (ні-шчыкам) і галасавымі адтулінамі (пераважна з шаецю), якая канчаецца раструбам з бяросты або каровінага рога. На Беларусі адзін з асноўных традыцыйных народных інструментаў.

**КОСТАЧКА** ж. 1.е *разн. знач.* косточка; *мае ~/сі баляць* мои косточки болят; *абрыкосавая к.* абрикосовая косточка; *адлажыць пяць ~чак на лічыльніках* отложить пять косточек на счетах; 2. лодыжка, щиколотка;

0*перамываць ~кі* перемывать косточки; *разбіраць па ~ках* разбирать по косточкам.

**АМФІТЭАТР—**1. у антычнасці: збудаванне для тэатральных відовішчаў, у якіх мссца для гледачоў узвышалася паўкругам. 2. у сучасных тэатрах: частка гля-дзельнай залы, размешчаная за партэрам.

**АСТАДОЛІЦЦА** 'супакоіцца, сцішыць бег' (Янк., 1). Відаць, звязана з с т а д о л а 'будынак для вазоў на заезным двары' (Бяльк.) і асабліва 'вялікі двор для жывёлы, хлеў' (Нас). Дзеяслоў, відаць, азначаў 'стаць, як у стадолі', прычым пачаткова ўжываўся для жывёлы і толькі пазней для людзей. Паралелі ў іншых славянскіх мовах невядомыя. Магчыма, што ў слове адлюстраваліся некаторыя кантамінацыі з *астанавіцца* 'спыніцца' 1г. д.

**ЛІРНІК** — народны паэт, пясняр у беларусаў і ўкраін-цаў, які выконваў народныя песні і паданні ў суправа-джэнні ігры на музычным інструменце — ліры. Многа лірнікаў было ў XVII—XIX ст. Выхадцы з сялянскай масы, лірнікі ў сваіх песнях адлюстроўвалі пакутную долю беднаты, выказвалі нянавісць да паноў і царскіх сатрапаў.

**КАЧОЛКА** *(качолка)-лк-і, жан.* Адпілаванае ад круглага бервяна ці жэрдкі кольца. *Нагатаваў качолак, буду рабіць каляску.* Кл. Слова *качолка* ад *качаць.* Да нядаўняга часу ў в. Кл. папулярнае было «качание качолкі» — гульня падросткаў і сталых хлопцаў. Такая гульня сустракаецца ў шмат якіх раёнах Беларусі. Качолку называюць на Беларусі *кацёлка, качулка, пакацёлка, каток.*

**АЕР, ПЛЮШН1К.**

Ціха шэпчуцца чароты, і калышацца аер. А. Астрэйка. У пажоўклым плюшніку боўтнуў шчупак, мусіць, ловячы маленькіх рыбак. Р. Мурашка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**13. Параўнайце артыкулы, звярніце ўвагу, як тлумачыцца адно і тое слова ў розных даведніках. Акрэсліце прызначэнне выкарыстаных слоўнікаў.**

I. Адвага — смеласць, рашучасць, бясстрашша. Набрацца адвагі.

**АДВАГА, СМЕЛАСЦЬ, МУЖНАСЦЬ, ХРАБРАСЦЬ, ХАРОБРАСЦЬ, БЯССТРАШНАСЦЬ, ГЕРАІЗМ, ГЕРОЙСТВА; РЫЦАРСТВА** (выс.) (у прыняцці рашэння: **РАШУЧАСЦЬ, РЫЗЫКА).**

Адвага гарады бярэ. Прыказка. Тое, што блізка былі хаты з людзьмі, паддавала яму болей смеласці. М. Гарэцкі. I не такія перашкоды людская мужнасць браць магла. А. Александровіч. А медалі гэтыя дадзены мне за праяўленую ў баях выключную храбрасць. М. Лынькоў. I ад гэтага адчування харобрасць і гераічнасць захапілі ўсю яго маладую істоту. Р. Мурашка. То таіла страх у сабе, аж ляжаць спакойна не магла побач, то чула лёгкасць, бясстрашнасць. I. Мележ. Хіба назавеш проста гераізмам тое, калі за радзіму людзі аддаюць не толькі свае жыццё, але і жыцці родных, блізкіх. I. Навуменка. Не веру я ў тваё геройства... К. Чорны. Рыцарства лепш за ўсё паказваць на полі бою... К. Крапіва. Пры Андрэі ў яе не хапіла рашучасці нават пагаварыць з Юзікам. А. Чарнышэвіч. А на мяне, ведаеш, з кожнай мінутай нейкая рызыка находзіць. Здаецца, нічога на свеце цяпер не баюся. Я. Купала.

**АДВАГА** 'мужнасць, смеласць' (КЭС, Шат., Нас, Касп., Яруш.), ст. бел. *адвага* (1674) (Нас. гіст.), укр. *відвага,* руск. *отвага,* польск. огішада, чэш. осіуала, **славен.**
Іуе^аіі ўзыходзяць да лексічнай трупы, звязанай сваім паходжаннем з ням. ша§еп 'адважыцца'. Гл. Вайян, КЕЗ, 22, 10.

**АДВАГА** *ж.* отвага, смелость; дерзание *ср.,* дерзновение *ср.:* О *а. гарады бярэ поел,* смелость города берет.

**АДВАГА,** -і, *ДМ* -вазе *ж.* Смеласць, рашучасць, бясстрашнасць. *Хваліць за адвагу. Набрацца адвагі. Не капав адвагі.* □ *Для Аленкі была вялікая спакуса прачытаць той верш, але адвагі не хватала.* Колас. / *гэтай пес-ні нельга сутрымаць, Мы з ёю стрэнем наш вясёлы май: Адвагу сіл у росквіце гадоў, Усмешку нашых новых пабудоў.* Панчанка.

**Адваг-а** *(гіст.* ад-ваг-а).

II. Брама — уваход у двор; крытыя зверху вароты. **Брам-а.**

**БРАМА** 'вароты', укр. *брама,* руск. дыял. *брама.* Запазычанне з польск. brama 'тс' (ст.-польск. Ьгапа, Ьгата, Ьгопа, Ьгота)... Бернекер, 74; Брукнер, 38; Фасмер, I, 206; Слаўскі, I, 41; Рыхард, Роіп., 36; Рудніцкі, 192; Кю-иэ, Роіп., 46. Ст.-бел. *брама, брана, брона...*

**БРАМА** *ж.* ворота.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**БРАМА,** частка арх. збудавання ці самастойная манументальная арка. У Расіі і на Беларусі Б. будаваліся з даўніх часоў, асабліва былі пашыраны ў 17—18 ст. Ставіліся пры ўездзе ў гарады (Магілёў, Слуцкая брама ў Нясвіжы), каля манастыроў (Гродна, Слонім), каля магнацкіх палацаў (Ружаны), уваходзілі ў арх. комплексы манастыроў. Разнастайныя паводле тыпаў, Б. мелі **пло**-скасную ці аб'ёмную будову, вызначаліся закончанасцю і прыгажосцю форм. Асобныя Б. былі дэкаратыўныя. *У. А. Чантурыя.* Мінск.

**БРАМА, -ы,** *ж.* Шчыльныя, на дзве палавіны, крытыя зверху вароты, якія закрываюць галоўны ўваход на тэрыторыю завода, двара і інш. *Гарадская брама. Заводская брама.* □ *Ад вуліцы дом адгароджваў шчытны да-шчаны плот з высокий, падобнай на арку, брамай і з масіўнай форткай.* Хадкевіч.

**МАЛАНКА** (б л І с к а в і ц а), электрычны разрад паміж воблакамі і зямлёю. Адрозніваюць лінейную, шаравую і пацеркавую М. Найбольш частая лінейная М. На Беларусі ў кожным месцы ў сярэднім за год бывае 22—36 дзён з навальніцай і М., каля 90 % з іх прыпадае на май — жнівень.

**МАЛАНКА,** -і, *Дм* -нцы; *Р мн.* -нак; *ж.* **1.** Разрад атмасфернай электрычнасці ў паветры, звычайна ў выглядзе яркай звілістай лініі. *Сціхае дождж. Радзей аблокі... Усе далей маланка, гром...* Лойка. 2. Вельмі тэрміновая тэлеграма. *Віншаванняў маланкі, Вітанняў лісты Ліста-носцы разнеслі ўсім адрасатам.* Панчанка. 3. Невялікая наеденная газета, якая выпускаецца ў асоба тэрміновых выпадках і асвятляс неадкладныя і вельмі важныя, надзённыя пытанні. *Аб сесіі напаміналі шматтыражка, са-тырычная газета-плакат «Аса», «маланкі», карикатуры.* Карпаў. 4. Від засцежкі, якая хутка зашморгваецца. *Перад сталом стаяў малады чалавек з папкай на засцежцы «маланка».* «Звязда». 5. *У знач. прысл.* **маланкай.** Вельмі хутка, імгненна. *Нядоўга думаючы, кінуўся Міколка маланкай да цягніка.* Лынькоў.

**МАЛАНКА, БЛІСКАВІЦА, ЗАРНІЦА; БЛІСКАЎКА** (абл.).

Пярун ляцеў за перуном, што міг — м а л а н к а за м а л а н к а й. Я. Купала. Дождж пайшоў з громам, з шалёным посвістам ветру і з б л і с к а в і ц а ю. Я. Скрыган. Над цёмным паркам трапяталі недзе далёкія з а р-н і ц ы. У. Караткевіч. Шпаркі, як б л і с к а ў к а . Пры-казка.

**14. Адкажыце, у якім беларускім слоўніку можна атрымаць найбольш поўныя звесткі па наступных пытаннях.**

1. Якія словы маюць аднолькавае або блізкае значэнне са значэннем лексем *краіна, кроены, склеп, крэпасць?*

2. Якія лексічныя адпаведнікі ў лацінскай і рускай мовах маюць беларускія назвы *бабоўнік, лужайнік, шыльнік?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Якія словы ў гаворках адпавядаюць агульнанародным *жывёла, чапяла, сякера?*

4. 3 якіх моў паходзяць словы *атоса, арэлі, букта, бурак?*

5. Як раней называліся гарады Слаўгарад, Дзяр-жынск, Ельск, Кіраўск?

**15. Акрэсліце значэнне тэрміна «фразеаграфія». Каго называюць фразеографам? Вызначце марфемную структуру слоў *фразеаграфія, фразеограф.***

**16. Ахарактарызуйце наступныя фразеаграфічныя артыкулы зфразеалагічнага слоўніка для сярэдняй школы Н. В. Гаўрош, І. Я. Лепешава, Ф. М. Янкоўскага (Мінск, 1973). Адкажыце, якія спосабытлумачэння фразеалагізмаў тут выкарыстаны.**

Даць пытлю, вешаць галаву, на розных мовах гава-рыць, стаяць у вушах, уздоўж і ўпоперак, з кута ў кут, як ёсць, як гара з плеч звалілася (скацілася, апала), у гадах.

**17. Прачытайце наступныя артыкулы з «Беларускай фразеалогіі» Ф. Янкоўскага (Мінск, 1968). Ахарактарызуйце будову фразеалагічных артыкулаў: падача фразеалагізма, яго варыянты, тлумачэнне сэнсу, ілюстрацыйныя прыклады, іх пашпартызацыя, стылістычныя і граматычныя паметы і інш. Запішыце два-тры тыповыя артыкулы ў сшыткі.**

Браць на вус, добра калош, наверзці сем карабоў, смаловы дуб, даць рады, падымацца на ногі.

**18. Параўнайце, як падаюцца наступныя фразеалагізмы ў «Фразеалагічным слоўніку» Н. В. Гаўрош, І. Я. Лепешава, Ф. М. Янкоўскага {Мінск, 1973) і «Слоўніку народнай фразеалогіі» Е. С. Мяцельскай і Я. М. Камароўскага (Мінск, 1972). Вызначце агульнае іадметнае ў адборы матэрыялу, будове артыкулаў, тлумачэнні значэнняў, падачы ілюстрацыйных прыкладаў і інш.**

Ісці на свой хлеб, душа ў душу, век-вяком, даць пудла, казань казаць, кату па пяту, куды ногі панясуць, лахі пад пахі, лёгкая (добрая) рука, лёгкі на слова (на язык).

**19. Раскажыце, як падаюцца фразеалагізмы ў перакладных ітлумачальных слоўніках. У якіх слоўнікавых артыкулах «Беларуска-рускага слоўніка» падаюцца наступныя фразеалагізмы.**

Свету белага не бачыць, знайсці раду, выйсці сухім з вады, вадзіць за нос, гнуць спіну, глядзець праз пальцы, і нашым і вашым, як ш'ць даць, кату па пяту, за вушамі трашчыць, згарэць ад сораму, як вокам маргнуць, давесці да розуму.

**20. У якіх артыкулах «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» падаюцца иаступпыя фразеалагізмы? Пракаменціруйце гэтыя артыкулы.**

Вадзіць дзяды, вынесці на сваіх плячах, не выпадае, заступіць дарогу, каменя на камені не пакінуць, добра кажаш, душа не ляжыць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**21. Выпішыце са «Слоўніка сінонімаў і блізказначных слоў» М. Клышкі сінанімічныя рады, у якіх ёсць наступныяфразеалагізмы. Прадумайце будову, афармленне артыкулаў.**

Не за гарамі, не верыць сваім вачам, з'ехаць з глузду, лезці са скуры, раскрыць вочы, навесці парадак, у самы раз, убіцца ў ласку, разводзіць рукамі, вырваць з зубоў, разяўляць рот, рассыпацца макам, як у ваду кануць, як укопаны, трымаць язык за зубамі.

**22. Выпішыце са сказаў фразеалагізмы ў пачатковай іх форме. Складзіце слоўнік фразеалагізмаў, забяспечыўшы артыкулы тлумачэннямі, граматычнымі і стылістычнымі паметамі.**

1. Хочаш ты — вучыся ў Мінску, і Масква не за гарамі *(Бр.).* 2. Праўду кажучы, гэта і не лес быў, а проста так зваўся па старой памяці *(К-с).* 3. Супрацоўнік кіўком галавы даў знаць, што ён ужо канчае размову *(П. К.).* 4. Праз хвілін дзесяць бор аглушыўся грымотным выбухам. Гнеды навастрыў вушы, зафыркаў *(Як.).* 5. І ён на брата сэрца мае, бо Уладзя дзядзьку зневажае *(К-с).* 6. За такога каня вунь колькі тысяч можна ўзяць, а ты чорту лысаму аддаеш ні за папюх табакі *(Саб.). 7.* Васілёк учапіўся за спадніцу і заходзіўся ад крыку *(М. Л.).* 8. Ведалі яны і тое, што Ганну не дай бог увесці ў гнеў: тады яна ў момант страціць роўнасць сваю, забудзецца на ўсё, загарыцца адным *(І. М.).*

**23. Аб'яднайце прыказкі і прымаўкі ў тэматычныя групы.**

1. Добры тавар сам сябе хваліць. *Сержп., 17.* 2. Жураўлі ляцяць нізка — зіма ўжо блізка. *Янк. М., 56.* 3. Дзе маці нарадзіла, там і радзіма. *Рап., 13.* 4. Каза не хоча на торг ісці, яе сілаю вядуць. *Фед., 141.* 5. Зіма снежная— лета дажджлівае. *Янк. М., 56.* 6. З'ехаў на чужыну, як зваліўся ў дамавіну. *Сцяшк., 592. 7.* Зіма — свя-круха, лета — матачка. *М. Грынблат, 1974, Валож, 8.74. 82.* 8. Што сяло, то нораў, што край, то абычай. *Сержп., 77.* 9. Карову прадала і бойку аддала. *Янк., Дыял., 111,160, Глуск.* 10. На чужой старане І жук — мяса, І старую бабу маладзіцаю назавеш. *Нас, 90.* 11. Прыйшоў люты — пытаецца, ці абуты; прыйшоў марац — прымарозіў палец. *Бяльк., 255, Мсціcл.* 12. Чужына па шэрсці не гладзіць. *Янк. М., 10.* 13. На чужой старонцы рад сваей варонцы. *Янк. М., 10.* 14. Як тут не мёд, так там не піва. *Фед., 187.* 15. Летам нагою, а зімою рукою. *Фед., 163.* 16. Не хапай-ся з козамі на торг: і коз прадасі і грошы праясі. *Ляцкі, 28; Сержп., 140.*

**24. Выпішыце са слоўніка Г. Малажай «Беларускай перыфраза» (Мінск, 1974) наступныя артыкулы. Прадумайце структуру перыфрастычных артыкулаў.**

Гаспадар зямлі, сонечны край чалавечага шчасця, чорныя дугі, шызакрылыя вестуны, вечнай славы помнік, пчаліны гарадок, пушное золата.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**25. З якіх беларускіх даведнікаў узяты наступныя прыклады?Запішыце асобна прыказкі, фразеалагізмы, крылатыя словы і афарызмы, перыфразы. Растлумачце значэннс фразеалагізмаў і перыфраз.**

1. Астраном літаратурнага неба. 2. Старасць не ра-дасць, **а** маладосць не навек. 3. Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш. 4. Сказаў, як звязаў. 5. На руках насіць. 6. Паддавацца на вудачку. 7. Скача, як птушка па галінах. 8. І ў няшчасці, і ў радасці без дружбы чалавеку нельга быць. 9. Дзе партызаны жывуць, там фашысты мруць. 10. Атаман мужыцкай праўды. 11. Пяты акіян. 12. Шчыт і меч Радзімы. 13. Пан сахі і касы. 14. Прадвесніца вясны. 15. Мой родны кут, як ты мне мілы. 16. Самі з вусамі. 17. Скочыў, як у вар. 18. Чырвоны, як рак. 19. Камуністы — тэта слова, як са сталі. 20. Адно бервяно на двары лепей, як дзесяць у лесе. 21. Чухаць патыліцу. 22. Смелы там знойдзс, дзе баязлівы згубіць. 23. Чорнае золата. 24. Курыца не птушка, гультай не чалавек, балбатун не гаспадар. 25. Мыць языком. 26. Мядзведзь наступіў на вуха. 27. Багата, як расы. 28. Сталіца поўначы. 29. Склаў рукі, як святы. 30. Беларускі шоўк. 31. Здары-лася сляпой курыцы зярня знайсці, і то ўсе ведаюць. 32. Страшная навала. 33. Куды не трапяць беларусы! 34. Добрае слаўцо лепш за піўцо. 35. Дзе прайшло маленства, там пачынаецца Радзіма. 36. Беларусь — мая маці і мова, паветра і хлеб.

## ФАНЕТЫКА. ФАНАЛОГІЯ

**1. Растлумачце значэнне тэрмінаў «фанетыка» і «фаналогія». Якія аспекты гукавой сістэмы мовы вывучаюцца у гэтых раздзелах лінгвістычнай навукі? Калі карыстаюцца тэрмінамі «гук», «фанема»? Вызначце агульнае і адметнае ў гэтых тэрмінах.**

**2. Ахарактарызуйце склад як фанетычную адзінку. Падзяліце наступныя словы на склады.**

Напісаць, добры, несці, цяпер, дзядзька, гутарка, глыбока, зямля, елка, падарунак, чалавек, праўдзіва, сасна, дванаццаты, вясёлыя, яблык, жыццё, грымоты.

**3. Што бярэцца пад увагу пры вызначэнні фанетычных слоў? Што абумоўлівае наяўнасць у вуснан мове фанетычных слоў, якія не супадаюць з лексічнымі адзінкамі? Прачытайце тэкст, вызначце ў ім фанетычныя словы.**

Гартаючы старонку за старонкай багатай спадчыны вялікага беларускага пісьменніка Якуба Коласа, мы як бы робім падарожжа ў свет ідэй і вобразаў гэтага выдат-нага мастака слова, у жыццё і працу чалавека высокай душы. Мы праходзім за пісьменнікам па ўсіх яго шляхах: ад беднай бацькавай старожкі ў лесе да самых высокіх, чутных усёй планеце трыбун. Колас падымаўся на іх, каб заклікаць да міру на зямлі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сцвярджаць духоўную і ма-тэрыяльную магутнасць свае краіны, дзяржавы рабочых і сялян, радавацца і садзейнічаць руху савецкіх народаў у заўтрашні дзень, несці ідэі партыі камуністаў.

*(М. Лужанін)*

**4. Што бярэцца пад увагу пры падзеле вуснай мовы на фразы, моўныя такты? Прачытайце тэкст, падзяліце яго на фразы, моўныя такты, вызначце фанетычныя словы.**

Тут, у класе, дзе над партамі раз-пораз старанна схіляліся галоўкі дзяўчынак і хлопчыкаў, было і цёпла і ўтульна. Настаўніца, Надзежда Пятроўна,— маладзенькая, строгая, з русявай касой,— павольна хадзіла між радоў парт, паглядвала ў сшыткі, сачыла за тым, каб пісалі роўна, акуратна.

— Скончылі? — запыталася яна, акінуўшы позіркам дзяцей.— Паўтараю, праверце ўважліва... «Лодка набліжалася да месца, дзе кіпела не затуленае ад ветру мора...» Праверылі?

Люда правяла вачыма па радку: «не затуленае... не затуленае ад ветру...» Словы гэтыя, тое, для чаго рабілі дыктоўку,— дзеепрыметнік з часціцай «не»,— амаль не затрымалі ўвагі старannай дзяўчынкі з мяккім, добрым тварам, з белымі істужкамі ў заплеценых цёмна-русых косах. Люда спакойна падняла круты белы лобік, яснымі, уважлівымі вачыма стала глядзець на настаўніцу.

*(І. Мележ)*

**5. Акрэсліце патрабаванні да фанетычнай транскрыпцыі. Затранскрыбіруйце тэкст.**

Я магу памыляцца шмат у чым,— у жыцці маім было нямала меншых і большых памылак, але я адно ведаю цвёрда: вышэй за ўсё і перш за ўсё — чалавечнасць. Я веру ў гэта ўсё свае жыццё, і толькі б тэта засталося ў мяне, калі б прыйшло найбольшае і апошняе гора.

*(Я. Брыль)*

**6. Запішыце восем-дзесяць слоў, якія адрозніваюцца толькі галоснай фанемай. Н а п р ы к л а д:** ***сам, сум, сом...***

**7. Запішыце пяць-шэсць слоў, якія адрозніваюцца толькі зычнай фанемай. Н а п р ы к л а д:** ***гара, кара, пара...***

**8. Затранскрыбіруйце пары слоў. Назавіце фанемы, якія іх адрозніваюць.**

Вугал — вугаль, сваты — святы, віць — выць, надрэз — наадрэз, шыць — сшыць, падаць — паддаць (наверх) , стол — столь, патрымаць — падтрымаць, насенне — на сене, расаднік — рассаднік.

**9. Калі галосныя** *фанемы* **знаходзяцца ў моцнай (незалежнай) пазіцыі? Спішыце тэкст, падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя фанемы ў незалежнай пазіцыі.**

Усе рэкі Беларусі вельмі прыгожыя. Дняпро з высокім правым берагам і неагляднымі далячынямі зарэчных паплавоў... Прыпяць з яе празрыстай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вадой, астравамі, прытокамі і шапкамі буслянак на прырэчных дубах. Дзвіна, сціснутая крутымі берагамі, зарослымі мачтавым лесам. Ласкавы Нёман, у воды якога глядзяцца старажытныя вежы і густыя лістоўныя пушчы. Нават невялічкая Шчара са сваімі шлюзамі ў цені серабрыстых таполяў.

*(У. Караткевіч)*

**10. Калі галосныя фанемы знаходзяцца ў слабой (залежнай)пазіцыі? Затранскрыбіруйце словы, вызначце галосныя ў слабой (залежнай) пазіцыі.**

Дажджы, цагляны, шаснаццаць, вясновы, зайсці, навіны, заўвага, хадзіць, дарожны, сямігадовы, пройгрыш, падыграць.

**11. Калі зычныя фанемы знаходзяцца ў моцнай (незалежнай)пазіцыі і калі — у слабой (залежнай) пазіцыі? Спішыце тэкст. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зычныя фанемы ў залежнай пазіцыі. Вызначце, як пазіцыя ўплывае на якасць фанемы.**

Чырвоныя сцены Брэсцкай крэпасці згрызены, здзяўбаны сталлю і свінцом. У музеі — партрэты бессмяротнага гарнізона, партыйныя і камсамольскія білеты, залітыя крывёю, баявая зброя абаронцаў крэпасці, перадсмяротныя надпісы на камнях і запіскі, пакінутыя ў гільзах патронаў.

Патрыятызм, адвага, нязломная воля, пераадоленая пакута, воінская годнасць, вера ў перамогу — усё гэта так канкрэтна, так ярка, так скандэнсавана ў музеі Брэсцкай крэпасці, што былым франтавікам пад канец агляду ўжо няма чым дыхаць, вайна цяжка навальваецца на сэрца, і мімаволі хочацца глынуць вады з Буга. Як тым, першым героям Айчыннай, што знемагалі тут ад ран і смагі.

*(П. Панчанка)*

**12. Фанемы ў моцнай (незалежнай) пазіцыі і фанемы ў слабой(залежнай) пазіцыі ўтвараюць фанемны рад. Вызначце ў парах слоўфанемы ў моцнай пазіцыі і іх варыянты, запішыце фанемны рад.**

Казаць — казка |з| — |с|, несці — нясу |э| — (горы — гара, дубы — дубкі, веліч — вялікі, малады — мо-ладзь, холад — халады, весела — вясёлы, горад — гарадскі, месца — мясціна, колас — калоссе, снег — снягі, жыць — жыццё, іграць — разыграць, лес — лясны, мала-ціць — малацьба, адвязу — адвезці, збор — збіраць.

**13. Затранскрыбіруйце тыя словы тэксту, у якіх гукі [а], [о],[э], [у], [і] абазначаны ётавымі літарамі *я, ё, е, ю, і.***

Здзейснена тое, што здавалася недасяжным, стала яваю тое, што паўставала толькі перад самай смелай мараю.

Наш адважны абраннік паляцеў на сувязь з жыццём светаў, адкрытых намаганнямі дакладных навук, угаданых вылічэннямі, убачаных праз электронный тэлескопы, каб асвоіць іх, гэтыя невядомыя светы, непасрэдным до-тыкам жывой разумнай істоты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Выпраўляючы ў далёкую і цяжкую дарогу дарагога нам чалавека, мы ахінулі яго цеплынёй сваіх сэрцаў, далі дапытлівы калектыўны розум, удыхнулі ў душу зарад нашых ідэй. А гэта і ёсць крылы, якія падымаюць нас над светам!

*(М. Лужанін)*

**14. Спішыце. Падкрэсліце адной рыскай літары, якімі абазначаюцца лабіялізаваныя галосныя.**

Музыка зычная ў свеце,— Моўкнуць нягоды напасці... Хочацца думаць, як дзеці, Верыць, як дзеці, у шчасце. *(Я. Купала)*

**15. Ахарактарызуйце ў словах тэксту галосныя паводле пад'ёму. Вызначце асаблівасці ўтварэння (вымаўлення) гукаў верхняга, сярэдняга, ніжняга пад'ёму.**

Падзьмула з поўначы здаровым халадком. Зямля сушэла, пакрывалася цвёрдаю скарынкаю. А пад поўнач пасыпаў сняжок, заложны, спорны, густы і сухі. Снег ішоў усю ноч і ўвесь дзень. *(Я. Колас)*

**16. Ахарактарызуйце ў словах тэксту галосныя паводле рада. Вызначце асаблівасці ўтварэння (вымаўлення) гукаў пярэдняга, сярэдняга, згдняга рада.**

Песня і казка Ходзяць у пары, Сеюць па свеце Дзівы і чары. *(Я. Купала)*

**17. Назавіце галосны, які характарызуецца як: нелабіялізаваны сярэдняга пад'ёму пярэдняга рада; лабіялізаваны сярэдняга пад'ёму задняга рада; нелабіялізаваны верхняга пад'ёму сярэдняга рада.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**18. Чым адрозніваецца вымаўленне націскных і ненаціскных галосных у беларускай літаратурнай лове? Растлумачце (пакажыце на прыкладах) недысімілятыўны характар акання літаратурнай мовы. Запішыце сказы, урыўкі з апавяданняў жыхароў вашай мясцовасці, вызначце тып акання, характэрны вашай гаворцы.**

**19. Што такое чаргаванне галосных гукаў? Чым адрозніваюцца пазіцыйныя чаргаванні ад гістарычных? Выпішыце асобна пары слоў з пазіцыйнымі, з гістарычнымі чаргаваннямі галосных. Растлумачце прычыну змяненняў якасці гука.**

Вёска — вясковы, гаворкі — гаворак, рэдкі — радзейшы, бярэзіна — бяроза, сотня — сто, ісці — зайсці, горад — гарадзішча, шэсць — шосты, глотка — глытаць, завесці — завяду, жнівень — жніўня, дровы — дрывотня, дзяжа — дзежка, паселішча — пасёлак, стрэл — страляць, ляснік — леснікі, блеск — блішчэць, сохнуць — суха, іграць — падыграць.

**20. Запішыце па тры пары слоў з пазіцыйнымі чаргаваннямі [о]: [а]; [э]: [а]; [і]: [й]; [і]: [ы]. Вызначце пазіцыю, якая абумовіла чаргаванне.**

**21. Запішыце па тры пары слоў з гістарычнымі чаргаваннямі [о]: нуль гука; [э]: [о]; [э]:**

**22. Раскажыце пра пазіцыйныя змяненні націскных галосных (змяненні, якія залежаць ад суседства з цвёрдымі-мяккімі зычнымі). Параўнайце якасць націскных галосных у наступных словах.**

Орша, дождж, вёска, ётавы, сёлета; арка, завадзь, памяць, цяжка, лялька; ланцуг, аул, кузня, людзі, дэбют.

**23. Ахарактарызуйце асаблівасці вымаўлення зычных. Назавіце зычныя гукі ў наступных словах.**

Радзіма, пісаць, школа, брат, аўторак, мужчына, характарыстыка, смеласць, жартаваць, чарот, вучань.

**24. Затранскрыбіруйце тэкст. Назавіце мяккія і цвёрдыя зычныя.**

Купала, услед за Багушэвічам, зрабіў самую важную справу; уліў у жылы народнай паэзіі свежую кроў. Сваю. Мне асабіста давялося бачыдь яго толькі раз, дзіцем, але ўсё жыццё свае бачу я людзей, якія яго блізка ведалі, якіх ён літаральна стварыў сваёй паэзіяй. Сваім асабістым прыкладам ён нібы прыбавіў высакароднасці свайму часу. Гаворыш з настаўнікам, які яго ведаў, з селянінам, якому ён дапамог, і не можаш не думаць, якія гэта чыстыя і высокія людзі. *(У. Караткевіч)*

**25. Выпішыце словы з цвёрдымі зычнымі, якія не маюць адпаведных мяккіх. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі пасля зацвярдзелых зычных.**

Лістападу радуйся і снежню,
І вятрам асеннім, і снягам.
І малая крыўда здасца смешнай,
І як слаўна жыць — адчуеш сам.
Гэта ўсё не штучная бадзёрасць,
Ісціну адну ты зразумей:
Тое, што здаецца нам будзённым,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нібы свята, ўспомніцца пазней.

*(П. Панчанка)*

**26. Затранскрыбіруйце тэкст. Назавіце шумныя зычныя ў словах першай фразы.**

Маляўнічы і хлебны гарадок, адзін з уладароў якога яшчэ за бітву на Калцы трапіў у летапіс, Нясвіж добра вядомы народам, інтарэсы якіх кроўна скрыжоўваліся тут на працягу стагоддзяў. Многа польскай магнацкай раскошы і беларускага паднявольнага гора бачыла гэтая зямля, многа яна ўвабрала нявіннай крыві!..

*(Я. Брыль)*

**27. Параўнайце сістэму санорных гукаў беларускай і рускай моў. Растлумачце, чаму беларускія зычныя [в], [в'], [ў], []] — санорныя.**

**28. Вызначце і ахарактарызуйце ў словах кожны санорны гук паводле спосабу ўтварэння, месца ўтварэння, палаталізацыі.**

1. Адзін амерыканскі падарожнік, што аб'ехаў палову свету, пісаў на пачатку нашага стагоддзя, што пейзажаў, лепшых за пейзажы беларускія, ён не бачыў ва ўсёй Еўропе *(Каратк.). 2.* У сонцы млеюць над верасамі духмяныя сосны. На пясках адцвітае маленькая грэчка. Калоссе спалавелага, зусім празрыстага жыта вось-вось пачне, здаецца, пішчаць і скварыцца, як гарох на патэльні *(Б.).* 3. Зайшлося сэрца ад нечаканай весткі *(Луж.).*

**29. Прачытайце ўрыўкі з паэмы А. Куляшова «Сцяг брыгады». Якія зычныя гукі найчасцей ужываюцца ў тэксце, якую ролю яны тут выконваюць?**

Дні міналі, мінулі. Адкукавалі зязюлі. Мы ў смаляныя лодкі сядалі, Нас клікалі далі. У начныя крычалі мы далі. Лес застаўся глухім, Лес маўчаў. Мы дарэмна гукалі.

**30. Назавіце глухія і адпаведныя звонкія зычныя. Якія глухія не маюць адпаведных звонкіх? Запішыце сем-восем пар слоў, якія адрозніваюцца глухой (звонкай) фанемай. Напрыклад: *біць — піць, дом — том, жыў — шыў ...***

**31. Ахарактарызуйце асаблівасці вымаўлення выбухных (змычных) зычных. Вызначце ў тэксце выбухныя гукі.**

Нёман. Гаючая, родная прыгажосць. Успамінаецца той час, калі яна, гэта прыгажосць, адчувалася і пакола-тымі, патрэсканымі нагамі. Маленства з вечнай аскомай ад няспелых яблыкаў, з назіраннем жыцця ў дробязях, знізу, калі многае, чаго не заўважаеш сёння, заўважаў і многае адчуваў мацней, без наўмыснага падыходу, без прывычкі заш'сваць, хаця б толькі вачыма.

*(Я. Брыль)*

**32. Прачытайце ў кнізе Ф. Янкоўскага «Беларускае літаратурнае вымаўленне» (Мінск, 1976, с. 32—36) пра асаблівасці артыкуляцыі афрыкат. Выпішыце па пяць-шэсць слоў з афрыкатамі [ц], [ц'], [ч], [дз], [дз'], [дж] і па два-тры словы, у якіх літары *дз, дж* перадаюць два гукі.**

**33. Выпішыце з тэксту словы з афрыкатамі. Ахарактарызуйце кожную афрыкату.**

Знаёміць маленькага і юнага чытача з лепшымі тво-рамі літаратуры для дзяцей, напісанай на мовах народаў свету,— справа вялікая і вельмі сучасная.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прыемна адзначыць, што ў гэтым сэнсе ў нас, беларусаў, таксама ёсць свае поспехі.

... Успамінагоцца вочы — мноства чыстых дзіцячых ва-чэй, вясёлых і дапытлівых. І мне даволі часта даводзіла-ся стаяць перад імі — у многіх школах, летніх лагерах і
Дамах піянераў, у беларускіх гарадах і вёсках, далека ўпадарожжах — недзе ў Бірабіджане, у Латгаліі, у Кіеве,Вільнюсе, Магнітагорску... Даводзілася трымаць адказперад строгімі суддзямі, якіх не падкупіш добранадзейнай сумотай, надзённасцю тэмы, якім трэба шчырасць зашчырасць, якім давай сапраўднае, цікавае, вясёлае, і —як найбольш.

*(Я. Брыль)*

**34. Спішыце. Падкрэсліце адной рыскай літары, якімі абазначаюцца губна-губныя зычныя, дзвюма рыскамі — губна-зубныя зычныя. Ахарактарызуйце зычныя выдзеленых слоў паводле ўдзелу голасу і шуму, спосабу ўтварэння і месца ўтварэння.**

Мой дружа сучаснік! Над табою *ярка* свеціць сонца, над табою зіхаціць сваёй чысцінёю мірнае блакітнае неба. Гэта — шчасце! У тым небе *пралятаюць* цудоўныя караблі — срабрыстыя лайнеры. А яшчэ вышэй над імі, за межамі бачнасці, робяць чарговыя віткі вакол планеты касмічныя караблі... Там частачка і тваёй працы, і тваіх бацькоў і дзядоў, і тых, хто аддаў сваё жыццё за тое, каб чыстым было неба над нашымі галовамі, каб ліло яно сонечныя прамяні і празрысты *блакіт* на мой і твой родны горад, каб *вечна* жыло хараство зямное і хараство творчай неўміручай энергіі чалавека цудоўнай нашай эпохі і яшчэ больш цудоўнай і шчаслівай будучыні...

*(А. Звонак)*

**35. Вызначце ў словах тэксту пярэднеязычныя, сярэднеязычныя, заднеязычныя гукі. Знайдзіце шыпячыя і свісцячыя гукі. Якую ролю выконваюць яны ў кантэксце?**

Возера! Возера! Иду к табе смутны Соннаю пушчай, амшалаю сцежкай,— Жоўтае лісце шасціць пад нагамі, Шчокі калючка сасновая шчыпле.

*(Я. Купала)*

Я заўсёды баюся напышлівых выцвілых слоў, Што звіняць, як жабрацкая медзь у асенняй журбе.

*(А. Вялюгін)*

**36. Вызначце словы, у якіх ёсць наступныя гукі.**

1. Зычны — шумны, звонкі, пярэднеязычны, змычны, цвёрды;
галосны — лабіялізаваны, сярэдняга пад'ёму, задняга рада;
зычны — санорны, губна-губны, змычна-праходны, цвёрды.
2. Зычны — шумны, глухі, заднеязычны, змычны,цвёрды;
зычны — санорны, пярэднеязычны, змычна-праходны, цвёрды;
галосны — нелабіялізаваны, ніжняга пад'ёму, сярэдняга рада;
зычны — шумны, глухі, пярэднеязычны, шчылінны, цвёрды.
3. Зычны — шумны, глухі, пярэднеязычны, афрыката,мяккі;
галосны — нелабіялізаваны, верхняга пад'ёму, пярэдняга рада;
зычны — шумны, глухі, заднеязычны, шчылінны, цвёрды;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

галосны — нелабіялізаваны, сярэдняга пад'ёму, пярэдняга рада.
4. Зычны — шумны, звонкі, губна-губны, змычны,мяккі;
галосны — нелабіялізаваны, сярэдняга пад'ёму, пярэдняга рада;
зычны — санорны, пярэднеязычны, дрыжачы, зацвярдзелы;
галосны — нелабіялізаваны, ніжняга пад'ёму, сярэдняга рада;
зычны — шумны, глухі, заднеязычны, шчылінны, цвёрды.

**37. Выпішыце з тэксту словы з падоўжанымі і надвоенымі зычным!. Растлумачце, у выніку якіх з'яў (фанетычных, марфалагічных) узнікла падаўжэнне і падваенне. Параўнайце вымаўленне падоўжанага і падвоенага *н* у словах *пытанне, каменне* і *ранняя, асенняя.***

Дзве радасці падарыла мне жыццё, два дні, азораныя веліччу Кабзара.

Майскае ранне на Дняпры, каля падножжа гары Чарнечай. Зялёны, амаль не да самага неба стромы абрыў, з густой, аціхлай, шчодра акропленай расою лістотай. І высока, высока — першы ў промнях усходу — Тарас.

Летні вечар у Канадзе, на беразе вялізнага, як мора, возера Антарыо. Дамок-музей Шаўчэнкі. Дняпроўскія вербы... Так, яны там выраслі з галінак, прывезеных з Дняпра. Адтуль жа і помнік Кабзару. Знаёмае, простае аблічча геніяльнага паэта, мысліцеля і палымянага рэвалюцыянера, што вырас з прыгоннага хлопчыка, як гэтыя вербы — з маленькіх галінак, што перайшлі бязмежны акіян...

У тую раннюю ўкраінскую раніцу, калі мы, тры беларускія пісьменйікі, падніmaліся па бясконцых драўляных прыступках на Чарнечую, навокал стаяла зялёная, росная, першабытная цішыня, а ў душы маёй ціха, да слёз сурова І пяшчотна не сціхаў напеў...

*(Я. Брыль)*

**38.Выпішыце з тэксту словы з пазіцыйнымі змяненнямі зычных гукаў. Падбярыце да іх аднакаранёвыя словы, у якіх гэты гук быў бы ў незалежнай пазіцыі.**

Бабка Параска цяжка ўздыхнула і выйшла з пакоіка. Не сядзелася ў ім і Лабановічу. Перад тым, як пакінуць сваё трэцяе і апошняе настаўніцкае месца, яму захацелася яшчэ раз абысці ўсе тыя дарогі і сцежкі, дзе не раз вандраваў ён у вольныя хвіліны. Такія вандроўкі шмат прыносілі яму радасці і задавалення, і многія мясцінкі ў ваколіцах Верханя сталіся блізкімі і дарагімі. Не раз паўставалі і не раз паўстануць яны ў вачах Лабановіча, вабячы да сябе, як самыя прыязныя сябры. Дык як жа не развітацца з імі?

*(Я. Колас)*

**39. Выпішыце з тэксту словы з гістарычнымі змяненнямі зычных. Падбярыце аднакаранёвыя словы, якія б ілюстравалі старажытнае памякчэнне заднеязычных або змяненне спалучэнняў зычных з [].**

Лабановіч любіць сваю новую школу. Адразу нейк да душы прыйшлася, бо нават і знадворны выгляд яе такі, як быццам бы яна ўсміхаецца табе прыветнаю ўсмешкаю. І ганачак такі прытульны, просты, без усякіх лішніх выдумак. Ну, вось так часамі і горне пасядзець, паслухаць штодзённае водгулле наўкольнага жыцця, яго адвечную песню, дзе галасы людскога шуму будзяць, жывяць і поўняць прасторы зямлі і нейкім дзівосным водгаласам

закідаюцца ў тваю душу. Асабліва гучна звініць гэтая песня надвячоркам або раніцаю, калі паветра такое пяшчотна-чуллівае, што кожны гук плыве-разыходзіцца па яго струнах у працяглых музычных тонах.

*(Я. Колас)*

**40. Ахарактарызуйце асіміляцыю зычных у наступных словах.**

Подпіс, смеласць, мядзведзь, адчыніць, магчымасць, малацьба, прывезці, гарадскі, пазней, на прызбе, свед-ка, барацьба, бясшумны, экзамен, Мацвей, падцягнуць, прыезджы.

**41. Запішыце па два прыклады на чаргаванні *глухі / звонкі; цвёрды / мяккі; звонкі / глухі; зычны/ нуль гука, свісцячы / шыпячы.***

**42. Вызначце, які фанетычны працэс абумовіў наяўнасць наступных амафонаў.**

Адвезці — адвесці, грыб — грып, нажка — ношка, род — рот, казка — каска, серб — серп, расчапіць — рас-шчапіць, лёд — лёт.

**43. Раскажыце пра дзеканне і цеканне ў беларускай мове. Параўнайце, як вымаўляюцца ў беларускай і рускай мовах наступныя словы.**

Дзіця — дитя, ціха — тихо, мядзведзь — медведь, цяп-лець — теплеть, дзверы — двери, цвёрды — твёрдый, памяць — память.

**44. Знайдзіце ў тэксце і выпішыце асобна словы, у якіх адбылося змяненне [в] на [у], [л] на [у], [у] на [ў]. Растлумачце, у якіх выпадках у сучаснай мове чаргуюцца [в] ; *[ў], [л]:* [ў], *[у]: [ў].***

1. Адзін схіл гары быў пакрыты жоўтым глыбокім пяском, сям-там пракідаліся чэзлыя кусцікі ядлоўцу, купінкі чабору і астраўкі белага баравога моху *(К-с).* 2. Хто з аматараў кнігі не перажываў хвалюючых хвілін, калі ў руках новая кніга, якая яшчэ пахне фарбаю, якая абяцае раскрыць нешта цікавае, узбагаціць і ўзрушыць цябе? *(Панч.).* 3. Размову вялі галоўным чынам падлоў-чы з настаўнікам, а ўсе іншыя слухалі і толькі зрэдку ўстаўлялі свае словы *(К-с).* 4. Уяўленне настойліва ма-люе, падсоўвае, мяняе краявіды — ва ўсёй шматколернай красе *(Б.).*

**45. Запішыце па тры-чатыры словы з прыстаўнымі [в], [г], [о], [і]. Вызначце ўмовы ўзнікнення (развіцця) кожнага прыстаўнога гука.**

**46. Затранскрыбіруйце тэкст. Ахарактарызуйце гукі ў выдзеленых словах.**

I. Родная прырода жыве ў кожнай кнізе Петруся Броўкі, амаль у кожным яго вершы. Смалістыя наддзвінскія лясы і сама Заходняя Дзвіна, Браслаўскія і Лепельскія азёры, *чырвоныя* рабіны, белыя рамонкі, Бярэзінскі запаведнік, зубры і буслы, зялёныя дубы, ніцыя вербы — усё гэта паэт любіць глыбока, з маленства. Ён разумее мову дрэў і траў, яму хораша і *асеннім* лістападам, і ранняй вясной. У яго прырода заўсёды жывая, трапяткая, адухоўленая. Грозная ў часы *нягод* і навальніц і ласкавая ў мірныя дні, з пошумам збажымы, з гулам векавых бароў.

Прырода памагае паэту *выявіць* самыя інтымныя пачуцці, як у вершы «Александрына» — такім чыстым і свежым. Недарма гэты верш стаў адной з лепшых пе-ссснь, якую так хораша спяваюць «Песняры» і якую палюбіў народ.

*(П. Панчанка)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

II. Раскошны, жыццярадасны свет казачных герояў — ад вавёрачкі і зайца да мядзведзя і зубра — свет, вядомы нам даўно, пазнаны як быццам *поўнасцю* і да найменшай драбніцы, зноў, па праву таленту і любові, паўнаўладна мабілізаваны *яшчэ* адным чараўніком, Васілём Віткам, на вялікую службу дзецям, іх чыстай радасці, нястомнай і абаяльнай дапытлівасці, іхняй празе пазнання дабра і зла. Увесь гэты свет зноў прыведзены ў разумны рух творчай фантазіяй яшчэ аднаго майстра высокага класа, надзейна ўзброены яркім і скупым, вясёлым і мудрым словам, увесь гэты шматфарбны і шматгалосы свет жыве сваім арыгінальным беларускім *жыццём.* Як і ўсякая сапраўдная паэзія, *захоўваючы* свае нацыянальныя асаблівасці, паэзія гэтая, як свая, прымаецца чытачом не толькі беларускім і не толькі дзіцячым.

*(Я. Брыль)*

**47. Падзяліце наступныя словы на склады. Ахарактарызуйце кожны склад: адкрыты ці закрыты; прыкрыты ці неприкрыты; націскны ці ненаціскны.**

Кабінет, гасцінсц, белавежскі, заваяваны, матчына, апісваць, камандаваць, бесперастанку, наўмысна, пясняр, востраў, раённы, падкрэсліваць, карабель, падлессе, анатацыя, спадчына, упоцемку, празрысты, старадаўні.

**48. Пакажыце на прыкладах складападзел у інтэрвакальным становішчы пры збегу шумных, шумнага з санорным, санорнага з шумным, санорных (у тым ліку асобна [j], [ў]).**

**49. Спішыце тэкст. Абазначце націскі, падкрэсліце фанетычныя словы. Назавіце ў тэксце праклітыкі і энклітыкі (словы, якія не маюць самастойнага націску).**

Тое, што роля літаратуры ў жыцці грамадства велізарная,— гэта аксіёма, і даводзіць тут, шчыра кажучы, няма чаго. Куды важней падумаць сёння над тым, ад чаго залежыць гэтае месца літаратуры і што трэба было б зрабіць, каб яно не звужалася, каб роля літаратуры, наадварот, узрастала. Пра гэта неабходна думаць таму, што эпоха навукова-тэхнічнай рэвалюцыі з усімі яе вынікамі ў сферах сацыяльнай і псіхалагічнай — як бы ні суцяшалі нас аптымісты — усё-такі больш і больш адбірае ў чытачоў час ды і жаданне чытаць, падсоўваючы ўзамен кнігі іншыя, куды больш спакуслівыя і куды менш працаёмкія спосабы задавальнення духоўна-мастацкіх патрэб.

*(Н. Гілевіч)*

**50. Спішыце наступныя словы і абазначце націскны галосны. Праверце па слоўніку, ці правільна вымаўляеце гэтыя словы.**

Абагульненне, аб'інелы, агрэст, адзінаццаты, аднасастаўны, акунь, алібі, алфавіт, беларусы, выпадак, газіраваны, даследаванне, дыспансер, маленькі, маляр, метанімія, мысленне, каменны, увасабленне, фарміраваць, ясакар.

**51. Абазначце галоўны (знак грава́са —') і пабочны (знак акута — ') націскі ў наступных словах.**

Агіткалектыў, дзеепрыметнік, агульнаадукацыйны, добрасумленна, дзеепрыслоўе, белагаловы, высокаадукаваны, мовазнаўства, ваеннаабавязаны, рознаскланяльны, усходнеславянскі, новабудоўля, высокаразвіты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**52. Зрабіце фанетычны аналіз слоў тэксту. Прыкладны парадак аналізу: 1) затранскрыбіраваць слова; 2) падзяліць яго на склады, вызначыць націскны склад, ахарактарызаваць кожны склад; 3) назваць галосныя гукі, ахарактарызаваць кожны гук паводле ўдзелу губ, рада, пад'ёму; 4) назваць зычныя гукі, ахарактарызаваць кожны гук з улікам цвёрдасці-мяккасці, удзелу голасу і шуму, спосабу ўтварэння, месца ўтварэння; 5) вызначыць, у моцнай (незалежнай) ці слабой (залежнай) пазіцыі знаходзіцца гук; 6) вызначыць і вытлумачыць пазіцыйныя змяненні галосных.**

Перад раніцай прашумела навальніца. На світанні яна сціхла, дождж сышоў на захад, да Прыпяці, а за ім хутка сплылі хмары. Над вымытымі вадой палямі засінела чыстае неба і зазіхацела яркае жнівеньскае сонца. І неба, і сонца, пераліваючыся вясёлкавымі колерамі, адбіваліся ў незлічоных буйных кроплях, што былі шчодра рассыпаны на пожні. Здавалася, што гэта не кроплі, а крупінкі сонца, якія разам з дажджом асыпаліся на зямлю.

(*І. Мележ)*

## АРФАГРАФІЯ

**1. Акрэсліце значэнне тэрміна «арфаграфія». Што вывучае арфаграфія? На якіх прынцыпах заснаваны сучасны беларускі правапіс, у чым іх сутнасць? Прачытайце ўрывак з апавядання Я. Коласа«У старых дубах» 1914 і 1973 гадоў выдання. Выкажыце сваё меркаванне адносна абазначэння мяккасці зычных у двух выданнях. Назавіце, якія напісанні ў выданні 1914 года адрозніваюцца ад сучасных.**

1. Цэлы гай старасьвецкіх дубоў раскінуўся па беразі Нёмна.

Такіх дубоў цяпер рэдка дзе ўбачыш. Іх не чапіла рука людзкая, толькі доўгіе часы палажылі на іх свой сьлед — печаць глыбокай старасьці. І многа ўсякіх зьмен часаў бачылі гэтые нямые сьведкі прошласьці! Жыцьцё многіх людзкіх пакаленьнёў прайшло перад імі і праходзіць, бы тые хвалі Нёмна, што пакручастым зьмеем абвівае тут іх сялібу, іх высокі, роўны груд, а яны ўсё стаяць, спакойные, важные, і жывуць сваім асобным жыцьцём. Прахо-дзяць дні, ідуць сваёю чэрадою зімы і леты з іх халадамі і сьпякотамі, з іх бурамі і навальніцамі, а яны спакойны, як чэлавек, каторы ўсё пераведаў на сьвеці, усё пераажыў...

2. Цэлы гай старасвецкіх дубоў раскінуўся на беразе Нёмана.

Такіх дубоў цяпер рэдка дзе ўбачыш. Іх не чапіла рука людская, толькі доўгія часы палажылі свой след — пячаць глыбокай старасці. І многа ўсякіх змен часу бачылі гэтыя нямыя сведкі прошласці! Жыццё многіх людскіх пакаленняў прайшло перад імі і праходзіць, бы тыя хвалі Немана, што пакручастым змеем абвівае тут іх сялібу, высокі, роўны груд, а яны ўсё стаяць, спакойныя, важныя, і жывуць сваім асобным жыццём. Праходзяць дні, ідуць сваёю чарадою зімы і леты з іх халадамі і спякотамі, з іх бурамі і навальніцамі, а яны спакойныя, як чалавек, які ўсё пераведаў на свеце, усё пераажыў...

**2. Спішыце тэкст, падкрэсліце напісанні, заснаваныя на фанетычным прынцыпе, адной рыскай, а на марфалагічным — дзвюма.**

Студзень — з казкамі снежных аблокаў.
Люты — шчодры на сіні мароз,
Сакавік — з сакатаннем і сокам
Непаўторных вясновых бяроз,
Красавік — час маланак і ліўняў,
Травень — з першым каханнем, сяўбой,
Чэрвень — з ягаднаю зарой,
Ліпень — з мёдам,
З пшаніцаю — жнівень,
Спелы яблычны верасень,
Светлы кастрычнік
У празрыстасці чыстай, крынічнай,
Лістапад — залаты лістапад,
Снежань — першы густы снегапад...
Ці плачу я, ці пяю,
Ці размаўляю з матуляю —
Песню сваю, мову сваю
Я да грудзей прытульваю.

*(П. Панчанка)*

**3. Выпішыце спачатку словы, у якіх напісанне выдзеленых літар заснавана на фанетычным прынцыпе арфаграфіі, затым — словы, у якіх напісанне заснавана на марфалагічным прынцыпе, і, нарэшце,— словы з дыферэнцыраванымі напісаннямі.**

Песня, святло, касьба, малацьба, матчына, казка, расказачь, адбіць, падысці, зайграць, узысці, ззянне, перавозчык, садзіць, чэрвень, Чэрвень, кастрычнік, Кастрычнік, бусел, Бусел Алена, савецкі, гарадскі, грамадскі, выдавецтва, сяўба, вясёлка, мноства, дакладчык, Радзіма, Бацькаўшчына.

**4. Зрабіце графіка-арфаграфічны разбор слоў. Прыкладны парадак разбору. 1) вызначыць, колькі гукаў і літар у слове; 2) назваць літары і абазначаныя імі гукі; 3) вызначыць гукавы і складовы прынцыпы абазначэння гукаў у слове; 4) вызначыць арфаграмы, заснаваныя на фанетычным і марфалагічным прынцыпах; 5) назваць правілы напісання арфаграм.**

Касмічны, асветлены, каляндар, вяселле, крылле, геніяльны, сацыялізм, ідэалогія, методыка, шчаслівы, шчыльны, носьбіт, барацьбіт, мастацтва, ткацтва, дзядзь-ка, возера, падсыхаць, зайсці, узысці, засеяны, заводскі, вучышся, рыжскі, зеляніна, рэкордны, разносчык, дэ-манстрацыя, дэкрэт.

**5. Спішыце тэкст, раскрыйце дужкі, устаўце прапушчаныя літары. Растлумачце, паводле якога прынцыпу беларускага правапісу (фанетычнага ці марфалагічнага) пішацца кожная ўстаўленая арфаграма.**

І. Міхась Ціханавіч Лынькоў вызначаўся заўсёдным а...чуван...ем не толькі сваёй а...казнасці і абавя...ку перад грама...ствам, але і выключнай душэўнай увагай да кожнага чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Той, хто ведаў дысцыпліну яго паводзін, строгасць абыходжан...я з самім сабою, (не) мог (не) даражыць знаёмствам і сяброўствам з ім. Многія пам...таюць, з якой руплівасцю і густам выбіраў ён знакі сваёй увагі. Яшчэ задоўга да свята або асабіста важнай падзеі ў жыцці таварыша ён набываў самы прыгожы канверт, рэ...кую марку, самую лепшую паперу. Хто (не) помніць яго імклівага, (не) звычайнай прыгажосці почырку, (не) забыўных, вясёлых, дасціпных і задушэўных прывітан...яў, напісаных яго рукой! Ужо самім святам было атрымаць яго піс.мо, пачуць яго голас.

*(В. Вітка)*

II. І сапраўды, у кожнага з нас ёсць свой Лермантаў. У кожнага з нас жыве (не) паўторнае пачуц...ё, нават (па) дзіцячы падсвядома р...ўнівае: а я люблю яго больш за ўсіх!..

Каму (не, ні) памагаў (не, ні) сумаваць у бара...ьбе яго (не) параўнаны «Ветразь»! У горкія хвіліны каму (не, ні) рабілася ля...чэй, як толькі дакране...ся душою да болю ягонага — да песні пра зоркі над ціхай з...млёй, над крам...ністым шляхам!.. Каму з нас, літаратараў, (не, ні) даводзілася ў пачатку дарогі да сцішнаты ...часліва прав...раць самога сябе на суровых радках: «Не верь, не верь себе, мечтатель молодой...»! Чыё сэрца, няхай сабе і стомл...нае ад бара...ьбы і працы, (не, ні) здрыганецца ад радаснага а...чува...ня абавя...ку пры гуках в...чавога голасу яго «Паэта»!..

Я маю ...часце быць маленькім, сціплым сведкам ...чырай любові да в...лікага сына Раей, той любові, якую жывіць да яго і да яе мой (не) зменны ў пачу...цях б...ларускі народ. *(Я. Брыль)*

III. Ціха ўсюды. Вецер (не, ні) скалыхне (не, ні) аднаго лісціка, (не, ні) адной травінкі. Ласкавае неба пазірае на з...млю; нідзе (ні) хмурынкі. Ясна і хараша, усё роўна як в...рнулася лета, падарыла людзям вос..нь яшчэ некалькі ясных, светлых і цёплых дзён.

*(Я. Колас)*

## МАРФЕМІКА

**1. Якая частка слова называецца марфемай? Чым яны адрозніваюцца ад фанем, складоў? Што агульнае маюць словы і марфемы і чым яны адрозніваюцца? Якія марфемы вылучаюцца ў словах? Пакажыце на прыкладах.**

**Якая частка слова называецца асновай? Чым адрозніваюцца невытворная і вытворная асновы? Выпішыце з урыўка спачатку словы з невытворнай асновай, а затым — з вытворнай, падзяліце яе на марфемы. Праверце па «Марфемным слоўніку беларускай мовы» А. М. Бардовіча і Л. М. Шакуна (Мінск, 1989).**

З усіх сродкаў выхавання, якія ёсць у нас, самым выпрабаваным і надземным было і будзе слова.

Хто ж, як не школа, павінна не толькі навучыць кожнага свайго выхаванца пісьменнасці, але і абавязкова даць яму трывалыя асновы эстэтычнай культуры, развінь слых і густ да слова, каб потым, кім бы чалавек ні стаў,

якую б спецыяльнасць ні выбраў, у ім жыла патрэба няспыннага духоўнага ўзбагачэння?

Няшчасны на ўсё жыццё той чалавек, якому не трапіўся настаўнік, што адкрыў бы яму радасць і асалоду далучэння да невыказнай прыгажосці слова, да скарбаў паэзіі. Такі чалавек, дажыўшы веку, наўрад ці палюбіць кнігу, ці будзе мець у ёй друга і дарадчыка.

...Звернемся кожны да пачатку свайго жыццёвага шляху. Хто навучыў нас любіць кнігу? Перш за ўсё той, хто ўпершыню чытаў нам яе, чытаў так, што само дзеянне, якое адбываецца на яе старонках, кожны рух і ўчынак яе герояў, кожнае слова, якое вымаўляюць яны і як вымаўляюць, былі для нас сапраўдным адкрыццём, узрушалі нашы душы, поўнілі іх новымі, яшчэ неспазнанымі пачуццямі.

*(Паводле В. Віткі)*

**2. Спішыце, у словах абазначце канчаткі, вызначце граматычныя значэнні, якія выражаюцца праз гэтыя канчаткі. Падкрэсліце словы з нулявымі канчаткамі.**

Нікому не ўдавалася ў такой меры ўвабраць у сябе і выявіць праз сваю творчасць душу народа, духоўнае аблічча нацыі, як гэта было суджана Янку Купалу. Ніхто не прымаў так блізка да сэрца лёсу свайго краю, яго мовы і культуры, і ніхто так горача, так адкрыта і бясстрашна, як ён, не выступаў на іх абарону. І няма каго назваць іншага, каму б належала такая заслуга ў абуджэнні пачуцця нацыянальнай годнасці беларусаў, якая належыць Купалу. Тут сказалася тая асаблівасць яго паэтычнага і грамадзянскага тэмпераменту, дзякуючы якой ён апынуўся ў самай гушчы барацьбы «за волю і долю» свайго народа і якая дазваляе гаварыць пра Купалу як пра самага беларускага з усіх беларускіх паэтаў. Менавіта Купала на доўгія дзесяцігоддзі зрабіўся сцягам нацыі, стаў для беларускага народа тым, кім з'яўляецца Шаўчэнка для ўкраінцаў, Петэфі для венграў, Боцеў для балгар.

*(Н. Гілевіч)*

**3. Падкрэсліце нязменныя словы прамой рыскай, а зменныя з нулявым канчаткам — хвалістай. Вызначце, якія граматычныя значэнні выражаюць нулявыя канчаткі.**

Вечар, увечары, вечарам; унізе, ніз, знізу; летась, улетку, сёлета; ноччу, ноч, уночы; утраіх, тройчы; далека, даль, непадалёку, воддаль; дома, дадому; збоку, бок, убок, побач; верх, уверсе, даверху, вярхом; голас, уголас; след, услед; дзень, штодзень, удзень; спачатку, пачатак; зранку, ранак, рана; брат, па-брацку.

**4. Да наступных слоў з невытворнай асновай падбярыце папяць аднакаранёвых слоў з вытворнай асновай, запішыце іх падзяліце на марфемы.**

Вясна, поле, год, лес, снег, акно, сцяна, лета, дождж.

**5. Запішыце словы, формы слоў, падзяліце іх на марфемы,абазначце карані. Калі ётавыя літары *е, ё, ю, я, і* абазначаюць два гукі, кожны з якіх адносіцца да розных марфем, запішыце іх спрошчанай транскрыпцыяй (ручай-ін-а, ус-край-ек).**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мора — марскі — заморскі — узмор'е; сям'я — сямейка — сямейны; хвоя — хвойны — хвойнік; надзея — надзей — надзейна — надзейны — надзейнасць — абнадзеіць; свой — асвоіць — асвоіцца — засвоіць — засваенне; партыя — партый — партыйны — партыйнасць; экспедыцыя — экспедыцый — экспедыцыйны; армія — армейскі — армеец; станцыя — станцый — станцыйны; са-лавей — салавейка — салаўіны; край — краіна — бяс-крайні — ускраіна — ускраек — краёвы — краязнаўчы — краявід; гай — гаі — гаёк; экскурсія — экскурсійны — экскурсант; пакрой — перакроіць — перакройваць; шыя — шыйка — шыйны; традыцыя — традыцый — традыцыйна — традыцыйны — традыцыйнасць.

**6. Як вы разумееце гукавыя (фанетычныя) варыянты марфем? Прывядзіце прыклады. У выніку якіх фанетычных працэсаў узнікаюць варыянты марфем?**

**7. Абазначце карані ў роднасных словах і іх формах. Растлумачце, у выніку якіх фанетычных змен узніклі варыянты кораняў.**

Дарога — у дарозе — прыдарожны — падарожжа — падарожны — спадарожнік; гром — грымець — грымо-ты — грымучы; блеск — бліскавіца — водбліск— блішчаць — бліскучы; дровы — дрывотня — дрывасек; паглядаць — глядзець — глянуць — разгледжаны — разгледзецца — погляд; мурог — мурожны; жаць — жну — дажынкі; есці — ежа — ела — ем — ясі — ядуць; рука — ручны — у руцэ — заручыцца — заручыны; пячы — пяку — запякаць — печыва — запечаны.

**8. Змяніце наступныя словы або падбярыце да іх роднасныя,каб высветліць варыяиты кораня. Пры выкананні задания выкарыстайце «Марфемны слоўнік беларускай мовы» А. М. Бардовіча і Л. М. Шакуна (Мінск, 1989).**

Бераг, рака, каса, луг, кветка, бяроза, арэх, страха, вока, зара, трывога, перамога, стол, сок, класці, несці, сустракаць, клікаць.

**9. Запішыце словы, падзяліце іх на марфемы, абазначце карані. У выпадках, калі ётавыя літары абазначаюць два гукі, карыстайцеся спрошчанай транскрыпцыяй (За-гор-й-е).**

Зарэчча, зацішша, прыволле, застолле, сузор'е, калоссе, узмежжа, Загор'е, надвор'е, Палессе, здароўе, Прыдняпроўе, палоззе, паўгоддзе, разводдзе, каменне, каменны, карэнне, карэнны, Залессе, Замошша, Забор'е, Загацце, Заполле, Забалоцце, Зароўе, Загалле.

**10. Запішыце спачатку гнёзды роднасных слоў са свабоднымі, затым — са звязанымі каранямі. Абазцачце карані слоў.**

Возера, поле, хата, кніга, сяло, пасёлак, сялянства, прывычка, узняць, пераняць, вуліца, падняць, звычка, эвычайны, азёрны, кніжны, палявы, азярына, Заазер'е, кнігарня, хатні, зачыніць, адчыніць, абутак, абуць, разуцца, завулак, перавулак, прывыкнуць, адвыкнуць, вытрымка, трымаць, дабавіць, дабаўка, прыбавіць, замок, замкнуты, сельскі, селянін, сяліба, сяліцца, вытрымаць, атрымаць, вытрыманасць, згінаць, перагінаць, *перагі*нацца.

**11. Якія марфемы называюць афіксоідамі? Запішыце словы, падкрэсліце афіксоіды. Растлумачце значэнне слоў.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Філолаг, дыялектолаг, заолаг, фізіёлаг, біёлаг; землямер, вадамер, газамер; аэрадром, танкадром, веладром, касмадром, ракетадром; астранаўт, касманаўт, аэранаўт; аўтобус, тралейбус, электробус; мікраскоп, тэлескоп, кінескоп; полудзень, паўмесяц, паўкруг, палукашак.

**12. Выпішыце з урыўка спачатку словы з словаўтваральнымі суфіксамі, затым — з формаўтваральнымі. Вызначце, якія формы зменных часцін мовы ўтварыліся з дапамогай формаўтваральных суфіксаў.**

Галя вельмі любіць Сонечку. Галі ў маленстве ніхто не здымаў. Якія там маглі быць здымкі! Добра хоць, што лгостэрка было ў Батрачыхі. Ды Галя глядзіць на Сонечку сваю, як у люстэрка. Такою, мусіць, толькі такою была яна сама калісьці,— з вялікімі вачыма, чорненькая шчабятушка...

Сонечка стаіць на пасцелі ў кароткай чысценькай кашульцы. Яшчэ ўсё сонная, ды ўжо з усмешкай на прыплюшчаных карых вачах, яна пранягвае да Галі тонкія загарэлыя ручкі. Мама надзявае на іх маленькі крэмавы станік, потым зашпільвае яго, спрытна перабіраючы пальцамі белыя гузікі. А тонкія цёплыя ручкі малой ужо абвіліся за Галіну шыю. Чорнавалосая галоўка сама схілілася на маміна плячо. Ой, як прыпала б яна да падушкі!.. Ды нічога, Сонечка ўстане таксама ахвотна. Яна ведае, што цяпер, у жніво, ёй трэба замяніць Антося — пастуха. У садзе ўжо ходзіць па роснай траве яе сяброўка, ласкавая, спакойная Падласка. У жоўтым чысценькім збанку стаіць на стале каля кубка цёплы сырадой.

*(Я. Брыль)*

**13. Спішыце словы, словаўтваральныя суфіксы і прыстаўкі падкрэсліце адной рыскай, а формаўтваральныя—дзвюма. Адзначце выпадкі лексікалізацыі форм з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі.**

Узгорак, горка, гарысты, гарадскі, вішнёвы, сынок, падлетак, дачушка, марозны, дарожка, спінка *(дзіцяці),* спінка *(крэсла),* елка, хатка, кніжка, ножка *(дзіцяці),* ножка *(стала),* ручка *(дзіцяці),* ручка *(для пісьма),* вочка *(дзіцяці),* вочка *(у дзвярах),* званочак *(памянш. ад* званок), званочак *(кветка),* бярозка, каменьчык, каменны, прачытаўшы, прачытаў, прачытала, прачытаны, раздаць, раздаўшы, раздаваць, хуткі, хутчэйшы, найхутчэйшы, легка, лягчэй, добра, лепш, глядзець, глянуць, сумленны, сумленнасць, шчырасць, дабрата.

**14. Пры спісванні ўстаўце прапушчаныя літары, абазначце ў словах прыстаўкі, вызначце іх ролю (словаўтваральныя ці формаўтваральныя). Назавіце варыянтныя прыстаўкі, растлумачце ўзнікненне варыянтнасці.**

1. Выдатныя раманы І. Мележа будуць жыць доўга, а вобразы, створаныя ім, пойдуць, як жывыя людзі, да новых пакаленняў, каб ра...казаць нашым нашчадкам, як трэба працаваць, змагацца, кахаць, як трэба ўсім сэрцам любіць родную зямлю *(Панч.).* 2. Ёсць цішыня — паўночніца, начная цішыня—дум бя...сонных памочніца, вярхоўны іх старшыня *(Вярц.).* 3. Раптам, у...рваўшыся ў пакой, скаланула музыка Шапэна мой шумлівы гарадскі спакой *(Панч.).* 4. Між цёплых баравін вам песню дораць верасы на дарагі ў...памін *(Віт.).* 5. А...чуванне шчырасці пачуццяў пачалося адразу з таго моманту, калі прызямліўся наш самалёт, калі нас сустрэлі не толькі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кветкамі, але і непрытворнымі ўсмешкамі, і непрыдуманымі словамі *(Б.).* 6. Жнівенькая ноч як звар'ядела, ра...вязала чорпыя мяхі — сотні тысяч зорак пераспелых сыплецца на мокрыя імхі *(Панч.).* 7. Дарогаю зары вяртаюся ізноў у пераклік зязюль, у перасвіст шпакоў, у перашум і звон ра...буджаных крыніц, у зеляніну дрэў, у водар медуніц *(М. Т.).* 8. Я не хвалюся, толькі знаеш ты, які цяжар на абгарэлых трактах у...вальвалі на сэрца мне франты *(Панч.).* 9. Ніхто гэтак, як дзіця, якое пачынае гаварыць, а...крываць тайны слова, не а...чувае мілагучнасці, ласкі, прыгажосці і маляўнічасці роднай мовы *(Віт.).* 10. Дачка ра...слала на край стала абрус і высыпала бульбу — адразу ўсю *(Пташн.).* 11. Яна [Зося] як ад...гнулася глянуць, хто едзе, Кандрат Назарэўскі ўбачыў моцны, як тонка вытачаны, твар з загарам, густыя рыжаватыя валасы, белую хусцінку на самым вершы галавы *(К. Ч.).* 12. Насцечка шпарка а...ступіла на крок ад Сержа і бе...дапаможна азірнулася *(К. Ч.).* 13. Да быляў упляталіся непрыкметна казкі — і ішла, ішла гамана, і ўжо нельга было ра...браць, дзе канчалася быль і дзе пачыналася казка *(Сач.).*

**15. Вызначце, што выражаюць у наступных словазлучэннях словы з прыстаўкай *пера-* : 1) зрабіць нанова; 2) перамяшчацца ў прасторы; 3) ахапіць дзеяннем значную колькасць прадметаў; 4) адольваць перашкоду; 5) перабольшыць пэўную меру).**

Перакласці кнігі на стол, пераехаць у вёску, перайсці дарогу, пераспелі ягады, перагрэцца на сонцы, перарэзаць вяроўку, перагледзець часопісы, пераскочыць праз канаву, пераабуцца пасля дажджу, перасушыць адзенне, перафарбаваць пакой, перабегчы праз мост, перавеяць збожжа, пераліць ваду праз край, перамераць зямлю, перасяліцца на новую кватэру, пераплысці раку, пера-саліць страву, перасыпаць цукар у мяшэчак.

**16. З «Марфемнага слоўніка беларускай мовы» А. М. Бардовіча І Л. М. Шакуна (Мінск, 1989) падбярыце па шэсць рознакаранёвых слоў з прысгаўкамі *вы-, да-, пры-*. Якое значэнне надаюць гэтыя прыстаўкі словам?**

**17. З «Беларуска-рускага слоўніка» (2003) падбярыце 5 пар слоў — назваў асоб, якія адрозніваюцца суфіксамі ў беларускай і рускай мовах. Запішыце іх, суфіксы назоўнікаў абазначце. Узор:** *чытач — читатель, пісьменнік — писатель.*

**18. Якую марфему называюць постфіксам? Яго асаблівасці ўпараўнанні з іншымі афіксамі. Запішыце сказы, падкрэсліце ў словах постфіксы, вызначце іх ролю.**

1. Той, каму быў час і ахвота прыглядацца, хто лепш бачыў Ганну, заўважыў, што перамянілася яна не толькі з аблічча (7. *М.).* 2. Нават смяялася цяпер яна інакш, чым дасюль,— смех быў ужо не бесклапотны, не пусты па-дзіцячы, у ім таксама звычайна чулася кплівасць; і штосьці як бы таілася ў гэтым смеху *(І. М.).* 3. Абмініце наш край, навальніцы, не грыміце на ранняй зары! *(А. П.).* 4. У адным канцы сяла, ад лераезду, спявалі вясковыя дзяўчаты, і водгулле іх аднатоннай песні, адбіваючыся дзесь каля чыгункі, даносілася сюды цэлымі хвалямі мяккіх гукаў *(К-с).* 5. А снег мітусіцца, ляціць, не сціхае, блакітнай становіцца поўнач глухая *{Трах.).* 6. Мне не даюць грыбы спакою, баравікі мне часта сняц-ца, мне з імі трэба паквітацца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*(К-с).* *7.* У тое лета Хадоська як бы нанава пачула спеў жаваранка: цёплым, салодкім болем адгукалася ў ёй даўняя, такая звычайная калісьці песня *(І. М.).* 8. То той, то другі з гасцей падыходзіў да цельшынскага настаўніка і што-небудзь казаў яму *(К-с).* 9. Глядзяць у неба прагна вочы, і сэрца просіцца к агню, яно ляцець кудысьці хоча і адчувае вышыню *(Трах.).*

**19. Зрабіце пісьмовы марфемны разбор выдзеленых слоў. Прыкладны парадак разбору:** 1) **зменнае ці нязменнае слова, часціна мовы; 2) аснова і канчатак (у тым ліку нулявы), граматычныя значэнні канчатка; 3) тып асновы (невытворная, вытворная); 4) корань,яго тып (свабодны, звязаны), варыянты кораня; 5) афіксы (прыстаўка, суфікс, постфікс, інтэрфікс), іх роля ў слове (словаўтваральная ці формаўтваральная).**

*Вясной* і на нашу вёску, *вяртаючыся* хто з Паўднёвай, хто з Паўночнай Афрыкі, а хто з Заходняй Еўропы, *апускаліся* птушкі. Пара буслоў, шпакі і ластаўкі. Асталяваўшыся пасля выраю дома, любыя госці так і не ўмелі толкам *расказаць,* дзе былі ды што бачылі. Хоць і гаварылі яны — хто клёкатам, хто мітуслівa-прастадушным шчэбетам, а хто гуллівым *песенным* пераймaннем — даволітакі многа, аднак усё, як здавалася нам, толькі пра радасць вяртання, сустрэчы з нашай, і для птушак роднай вёскай.

Шпакі і ластаўкі — драбяза, якую, каб і вельмі хацелася, не *падлічыш,* і гэта — прыемнае *адчуванне,* нібы на зоркі гледзячы, таксама *незлічоныя.* А бусел — у нас яшчэ кажуць, бацян,— адзін са сваёю бусліхай, і мы іх віталі, можна сказаць, персанальна. Убачыўшы першага бацяна, мы, хлапчукі, з радасным галёканнем куляліся на *падсохлых* мясцінах. Дзед Богуш, дык той аднойчы, пры мне, нават і павітаўся ўголас:

— Здаровы быў, божая птушка! Каб жа лета нам добра з табой *пералетаваць!*

І глядзеў на *буслянку,* задраўшы белую бараду, *прыжмурыўшы* вочы пад сівымі бровамі.

*(Я. Брыль)*

**20. Вызначце словы з вытворнай асновай, падзяліце іх на марфемы (па табліцы).**

| Слова | Прыстаўка | Корань | Суфікс | Канчатак | Постфікс |
|---|---|---|---|---|---|
| адкінуты | ад- | -кі- | -ну-, -т- | -ы | |
| паласкалася | | паласк- | -а-, -л- | -а- | -ся |

Я глядзеў тады, як пераходзілі Эльбу, на сваіх, савецкіх салдат, што стаялі ланцужком узбоч на мосце. Усе яны былі падцягнутыя, плячыстыя, загарэлыя. І ў кожнага ў руках была вінтоўка з адкінутым вострым штыком.

А наперадзе, на высокім доме, гарэла агнём, паласкалася на ветры вялізнае чырвонае палотнішча. На ім здалёку відаць былі, выгіналіся залацістыя серп і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

молат. То быў наш, савецкі сцяг, якога мы не бачылі праз усе гады фашысцкае няволі.

Тады, я помню, не заплакаў...

Цяпер жа, праз столькі гадоў, згадаўшы той момант — радасны, урачысты момант сустрэчы з усім сваім — сцягам, салдатамі, воляй, не мог, каб не выцерці хусцінкай вочы...

*(Б. Сачанка)*

**21. Запішыце словы, вызначце, якія гістарычныя змены адбыліся ў іх марфемнай структуры (апрошчанне, перараскладанне). Зрабіце марфемны і этымалагічны аналіз будовы слоў. Выкарыстайце «Марфемны слоўнік беларускай мовы» А. М. Бардовіча і Л. М. Шакуна (Мінск, 1989) і «Этымалагічны слоўнік беларускай мовы».**

Абед, абруч, праўда, заутра, унутры, унутраны, снедаць, сняданне, суткі, прымы, пакаленне, абоз, абавязак, дубец, дуброва, вобад, дар, забыцца, спадабацца, добры, апавяданне, аповесць, паведаміць, акно, падчарка, народ, лазня, канец, дасканалы, гасцінец, мястэчка, захад, заможны, перамога, сталіца, рубель, пасада, пасека.

**22. З «Марфемнага слоўніка беларускай мовы» А. М. Бардовіча і Л. М. Шакуна (Мінск, 1989) выпішыце 15 слоў, што змянілі сваю марфемную структуру. Вызначце тып змен у структуры і іх прычыны.**

## СЛОВАЎТВАРЭННЕ

**1. Зрабіце пісьмовы словаўтваральны разбор выдзеленых слоў. Прыкладны парадак словаўтваральнага разбору: 1) часціна мовы, да якой належыць слова, вытворнае яно ці невытворнае; 2) словаўтваральная база вытворнага слова (аснова, слова цалкам, спалучэнне слоў, словазлучэнне); 3) словаўтваральны сродак (прыстаўка, суфікс, постфікс, інтэрфікс); 4) спосаб словаўтварэння.**

І. Красу *птушынага* голасу я ведаў, перш за ўсё, ад жаваранка і шпака. Не лічачы, вядома, спевакоў ледзь не *хатніх* — пеўня ці ластаўку, або выпадковых — шчыгла ці чачотку, што не табе, дык *суседнім* хлапчукам траплялі часамі ў клетку.

Жаваранак і шпак, спяваючы, не хаваліся.

Першага мы *змалку* бачылі не раз. На зямлі, калі ён — недасягальна мілы, шэранькі — *уподбежку* шмыгаў па руні, яшчэ не могучы ў ён *схавацца;* над зямлёй, калі ён уздымаўся над калоссем — ужо налітым ці яшчэ ў красе — адразу з *сярэбраным* звонам; у небе, дзе ён *бясконца* вісеў над табою, жанцом ці касцом, бясконца званіў, як вясёлая *ручаіна,* усё адно і тое ж, і ўсё такое новае, такое шчырае!..

Другі спявак — бліскуча-чорны, *гарэзлівы* шпачок — наогул нікуды, як быццам, не адлучаўся. Калі не на кіёчку перад акенцам *шпакоўні,* дык на галінцы дае свой *штодзённы,* з *ранняга* ранку да позняга вечара, таксама як і жаваранкаў, канцэрт. І з *перапевамі,* і свае, і з кепікамі ўсякімі, з зачэпным посвістам, і ад сапраўднай радасці, з поўнай *сардэчнай аддачай.*

*(Я. Брыль)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

П. Доўгачаканы, белавежскі, пералётны, прыбярэжны, перакладчык, падпісчык, перападрыхтоўка, падлесак, прадзед, праўнук, падводнік, падбярозавік, настольнік, перапісаць, дашкольнік, завочнік, нагаварыцца, сустрэцца, сузор'е, старшакурснік, сёлета, вясёлка, распрацоўка, запіс, сінь, ціш, паехаць, згаварыцца, пераглянуцца, дзяжурны [назоўнік], вечарам [прыслоўе], гасцінец (дарога), гасцінец (падарунак), пяро (сталёвае), пяро (птушкі).

**2. Запішыце словы з улікам ступеняў словаўтварэння. Вызначце, у якіх выпадках утваральнай асновай выступае невытворная аснова, а ў якіх — вытворная.**

Бярозавы, падбярозавік, бярозавік; перабудова, будаваць, перабудаваць; прыгарадны, прыгарад; зямлянка, земляны; садоўнік, садовы; бацькаў, бацькоўскі; размеркаванне, пераразмеркаванне, размеркаваць; перапланіроўка, планаваць, перапланаваць, планіроўка, плані-роўшчык; пагрузка, грузіць, пагрузіць, пагрузіцца, па-грузчык.

**3. Спішыце, падкрэсліце словы, утвораныя марфалагічным спосабам. Адзначце (у дужках пасля слоў) разнавіднасць марфалагічнага словаўтварэння (прыставачнае, суфіксальнае, прыставачна-суфіксальнае, бязафікснае).**

1. Цешылі вочы і сэрца і каса, і вільготна-вясёлая трава, і лагодны павеў ветру, і сонечная бяскрайняя сінь (*І. М.*). *2.* Гэтае чытанне — не толькі выдатны адпачынак, але і работа, і вучоба, і жыццё ва ўсёй яго паўнаце *(Б.)*. 3. А з вышыні ўсю ноч на лес і на мяне сыплецца трывожны ціхі зорны дождж, бясконцы Млечны Шлях *(Панч.)* 4. Вось толькі што нарадзілася дзіця. Першы плач, першы крык. Чым галасней яно плача, тым радасней мы, дарослыя, смяёмся. Чым мацней яно крычыць, тым большая наша ўпэўненасць — новы насельнік зямлі стартаваў удала *(Віт.)*. 5. Я люблю цябе, лес, за тваю чалавечую шчодрасць, калі ты накрываеш абрусам паляны-сталы, а на іх высыпаеш зялёныя поўныя вёдры і суніц, і чарніц, і грыбкоў... *(Я. С)*. 6. Я чую, як у мудрай цішыні то ліпа раптам зарыпіць калыскаю, то скрыпкаю яліна зазвініць *(Бур.)*. 7. Марудна пасоўваючыся пад аблокамі і самотна квола курлыкаючы, ляцеў у невядомую далеч невялікі ланцужок журавоў *(В. Б.)*. 8. Бяру з сабой бяссонныя трывогі, а юны свет — я юным перадам *(А. П.)*. 9. Навекі слава тым, што ў полі ратным загінулі за родныя палі, за наш народ, за лес народаў братніх, за дзень наступны ўсяе зямлі *(Панч.)*.

**4. Вызначце словы, у якіх адбылося зліццё (накладанне) гукаў на стыку ўтваральнай асновы і афіксаў (суфіксаў, прыставак). Як падаюцца такія словы ў марфемным слоўніку? Зрабіце марфемны і словаўтваральны аналіз іх.**

Студэнт — студэнцтва, зямляк — зямляцтва, ляснік — лясніцтва, агент — агенцтва, заступнік — заступніцтва, брат — брацкі, ткач — ткацкі, камітэт — камітэцкі, савет — савецкі, марксіст — марксісцкі, кастрычнік — кастрычніцкі, салдат — салдацкі, беларус — беларускі, Мінск — мінскі, Смаленск — смаленскі, Каўнас — каўнаскі, Тбілісі — тбіліскі, Архангельск — архангельскі, расада, расольнік, ростань.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**5. Раскажыце пра асаблівасці пастфіксальнага і прыставачна-пастфіксальнага словаўтварэння. Пакажыце па ярыкладах.**

**6. Спішыце, падкрэсліце словы, утвораныя спосабам складання. Вызначце (у дужках) разнавіднасць складання (асноваскладанне, словаскладанне (зрашчэнне), складана-суфіксальнае ўтварэнне, абрэвіяцыя). Падкрэсліце ў складаных словах інтэрфіксы, вызначце іх ролю ў словаўтварэнні.**

1. Калі з выраю птушка вяртаецца ў свой небасхіл — у яе ўжо не два, а мільёны крыл *(Я. С).* 2. Вось і снежань. Вятры табуны белагрывыя гоняць па бяскрайніх прасторах сцюдзёных палёў і аселіц *(Панч.).* 3. Першы, доўгачаканы прыезд, першыя, найярчэйшыя ўспаміны *(Б.).* 4. Жанчыны, маці-словатворцы, у час калыханак вы спялі імя вясне, пчале і зорцы, усім добрым дзівам на зямлі *(А. П.).* 5. Надзя прыйшла да мяне ў сне бесклапотнаю пятнаццацігадовую дзяўчынкаю, тонкаю і гнуткаю, як вярбовы пруток *(Сач.).* 6. І хоць не ўсё паўторыцца на свеце, я веру ў гэты лес, я веру ў сад, дзе чысціню нясуць суквецці праз кожны свой барвовы лі-стапад *(А. П.).* 7. Цёмна-шэрыя вочы хлопчыка спакойна глядзелі на імклівую плынь Дняпра *(Каратк.).* 8. З блізкіх і далёкіх дарог я вяртаюся зноў і зноў туды, дзе сярод лясоў раскінулася веска, у якой я нарадзіўся, у якой жыве і сёння мая маці, жывуць браты *(Сач.).* 9. Звычайна Гукан прыходзіў у выканком за паўгадзіны, а то і больш да пачатку работы *(Шам.).* 10. Далека разбегалкя па нашай зямлі, па ўсім свеце мінскія самазвалы, жодзінскія БелАЗы *(ЛіМ).* И. Выхад у свет БелСЭ — вялікае свята беларускай савецкай культуры, беларускага народа *(«Полымя»).*

**7. З беларускамоўных перыядычных выданняў выпішыце 15 сказаў з абрэвіятурамі. Растлумачце ўтварэнне, значэнне і правапіс выпісаных абрэвіятур.**

**8. Запішыце наступныя складанаскарочаныя словы, назавіце адпаведныя поўныя назвы. Вызначце, як утварыліся складанаскарочаныя словы:** з **пачатковых складоў; з часткі слова і наступнага поўнага слова; з пачатковых гукаў; з пачатковых літар; з часткі слова і пачатковых літар наступных слоў.**

РБ, Гомсельмаш, Белдзяржуніверсітэт, гаркам, абкам, гарсавет, агіткалектыў, палітінфармацыя, педсавет, БРСМ, ЦСУ, Дзяржплан, МАЗ, НАН РБ, ВНУ, ЛіМ, БДПУ, прафкам, БелТА.

**9. Запішыце сказы, падкрэсліце словы, утвораныя марфалагічна-сінтаксічным спосабам.**

1. Пакуль старая ішла па двары ды па сцежцы, малая паспела і нацешыцца, і папрасіцца на лаву, глядзець у акно *(Б.).* 2. Не чакаючы штуршка і падказкі старэйшых і вопытных, хто меў адпаведныя даручэнні і на чые плечы была ўскладзена адказнасць, моладзь адчула ў сабе столькі веры і сілы, што пачала дзейнічаць сама, стварыла падполле *(Луж.).* 3. Разам з дарослымі ў партызанскіх атрадах — як ні трывожна, як ні балюча гучыць гэта ў наш мірны час — з ворагам змагаліся і дзеці, больш за дваццаць пяць тысяч беларускіх дзяцей *(Б.).* 4. У мёрзлы грунт ля пярэдняга краю лёг разведчык пад грукат гармат *(А. П.).* 5. Навальніцы грымяць над кручамі, з гор бягуць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ручаі грымучыя *(Бур.).* 6. Пяцьдзясят гадоў — усяго толькі першы прыпынак, на якім дазволена азірнуцца назад, падумаць пра вынікі пражытага *(Б.).* 7. Убачыўшы ацалелае дрэва, Чубар нечакана ажно тварам прасвятлеў, нібыта сустрэў знаёмага *(Чыгр.).* 8. То цяпла не ставала, то чыстай вады, і згадам! рабіўся шыпшыннік калючы *(Грах.).* 9. Колькі радасці чулася ў кожным разбуджаным гуку! *(Пл.).* 10. Колькі птахаў пявучых у родных лясах, колькі нот непаўторных у іх галасах, колькі тонаў, адценняў, ладоў, пераборaў — столькі песень у сэрцы ў дзядзькі Рыгора *(Пл.).* 11. Міхал у лесе як бы дома: дзе не ступала яго ножка, якіх куточкаў тут не знае! *(К-с).* 12. Гады прайшлі, а я ўсё помню твой першы крок насустрач мне... *(Зв.).* 13. Не лічыліся людзі ні з чым для сваіх, і кармілі, і на дарогу давалі (75.). 14. Якраз быў сакавік, канец зімы, пачыналася прадвесне, удзень добра раставала, але ноччу пад ранак дарогі былі як шкло *(В. Б.).*

## ГРАМАТЫКА, МАРФАЛОГІЯ

**1. Вызначце, якімі часцінамі мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы. Акрэсліце спецыфічныя рысы кожнай часціны мовы (семантычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя).**

1. Рака шырокая, *пакуль што* чыстая, трыснёг, лаза і асака, абноўлена зялёныя, сонца зноў, як *штогоду,* грэе па-летняму. І *ліпа ў самай* квецені, *гудзе* ад цямна да цямна. Сяджу пад ёй у *халадку,* а гул пчаліны люба пяе ад высокай травы, да *якое* звісае духмянае голле, і ў *самае* неба, *ажно* тая ліпа варушыцца ўся *(Б.).* 2. Сёе-тое, *1вядома, ужо і забылася,* але многае-многае *і* помніцца *(Сач.).* 3. Пасля гвалтоўнай навальніцы на нашым *неабсяжным* выгане, – у маленстве *ж* усё нам здавалася болыным, – *яшчэ* святлейшым пасля нізкай, *грукатлівай* хмары, на густой, маладзенькай траве ў лагчынах стаіць вада *(Б.).*4. *Часам* мерна, паважна адбівалі ў гняздзе на зялёнай Зайчыкавай страсе свае *«клё-клё-клё»* бусел *ці* бусліха (У. *М.).* 5. *Ды раптам* сэрца *працяло трывожпае: а што,* калі з дарогі хто зблудзіў ці *проста страшна* стала падарожніку, *што ў* непагадзі ён *зусім адзін?.. (Н. М.).* 6. *Адзін* чалавек шукаў у гэтую ноч кветку па-параш', *бо* кажуць, што ў купальскую ноч *зацвітае* яна агнявістым цветам *(К-с). 7.* Гэтае страшнае *«чаму»* я тады, *гледзячы ў* знявечаны вайною твар нашай горкай сяброўкі, адчуў *як быццам* упершыню *(Б.).* 8.. Во жыву я цяпер у *адным* добрым месцы на адзіноце з лесам, во-сеньскай цішынёй, з *не зразумелым пакуль* мне самому набыткам *свае* душы *(Стр.).* 9. І *нішто толькі ў «заўтра»* адгукаецца *«ўчора»... (Н. М.).* 10. *Гэты неспакой* гнаў у дарогу на сустрэчу з *былым... (Хомч.).* 11. Стаяў над высокім берагам *векавы бор* – сасна да сасны, *не раўнуючы як* каноплі *(Стр.).* 12. Кучавыя воблакі ляжалі *ўнізе,* здавалася, на самай зямлі – зямля была *далека* і *далека* было *відно* наўкол *(Стр.).* 13. *Папалуднаваўшы,* яны маўкліва вырашылі, што гадзіну *якую можна* і адпачыць. Месца *якраз* ім трапілася добрае – *гальнае* і сухое. За *колькі* крокаў адсюль баравіна спадала ў нізінку, а там *купчасціўся* ўжо ягаднік ля *струхлелых* пнёў, чарнела *сатлелае* голле *(Стр.).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**2. Спішыце тэкст, падкрэсліце словы, якія без кантэксту цяжка аднесці да пэўнай часціны мовы. Адзначце (у дужках), да якой часціны мовы належаць гэтыя словы ў прыкладах.**

1. Усё навакольнае раскрываецца мне… То поле абапал гасцінца, то луг, то старыя, карэлыя бярозы і шырокацяністыя клёны прысадаў, то танкастволы і пярэсценькі гушчар бярозавай кудзеркі гаю на ўзгорку, то хаты, і платы, і дрэвы, і куры, што купаюцца ў пяску, і людзі, што сядзяць на лаўках абапал вясковай вуліцы, то зноў поле, і луг, і бярозы *(Б.).* 2. У чалавеку жыве патрэба сутыкнуцца з простым, першародным, што ідзе ад зямлі, вады, травы, хмар на небе, ветру, які абвявае твар, дажджу, які да ніткі прамочыць вопратку *(І. Н.).* 3. Старыя расахатыя грушы-дзічкі на ўзмежках скрозь па пагорыстым, пясчаным полі *(Сач.).* 4. Чалавек адзін нядрэнны меў сады і дом каменны *(У. Д.).* 5. Пойдзем лепш у свет шырокі, паглядзім уласным вокам, як жыццё ідзе другое, як яно і дзе я кос *(У. Д.).* 6. У другім баку, за лесьнічоўкай, зялёнае мора хвойных і лісцяных вяршыняў – пушча. Ды ўсё гэта для буслянят – тое «вельмі далека», што яшчэ будзе ў вялікім, хвалюючым іхнім «пасля» *(Б.).* 7. Ад прадзедаў спакон вякоў мне застала-ся спадчына; паміж сваіх і чужакоў яна мне ласкай матчынай *(Куп.).* 8. Пасля поля тут было ад гушчыні маўклівых, нібы прытоеных, хмурных хваін цемнавата і сыра, хоць лясок і рос на пясчаніку *(І. М.).* 9. У кожнага з нас ёсць такі шчымлівы куток – наша Учора. І хто з нас, дарэчы, не думае часам, што там, ва Учора, было ўсё, а тое, чым мы цешымся пасля – і сёння, і заутра, – гэта ўжо нібы нейкі дадатак да нашай зялёнай вясны, да пачатку *(Я. С).* 10. Былі і такія людзі, якія проста стаялі за тое, што камень і павінен быць тут *(К-с).*11. Ідзі ў сад сабе гуляй, але, хлопча, памятай, – помні ты свой лес жабрачы! *(К-с).* 12. І як гэта здараецца, што роднае, свае, мы неяк заўсёды пакідаем на потым, на пасля, саманадзейна ўпэўненыя, што не ўцячэ яно ад нас. І з роднымі мясцінамі так бывае, і з блізкімі людзьмі: не песцім іх увагай і ласкай, упэўненыя, што пачакаюць, што не ўсумняцца ў гэтай нашай увазе і ласцы, і не разумеем, злуёмся, калі блізкія крыўдзяцца на нас і незаўважна, пацiху нас пакідаюць *(Стр.).*

**3. Складзіце сказы са словамі *настаўніцкая, у парадку, выцвілы, дзякуючы, уздоўж, як, весела,* каб яны былі рознымі часцінамі мовы. Напрыклад: *Настаўніцкая прафесія адказная і пачэсная. У настаўніцкай было ўтульна.***

**4. Запішыце дзесяць лінгвістычных тэрмінаў. Пакажыце (пісьмова) на гэтых словах: 1) як у самой назве раскрываецца сутнасць паняцця; напрыклад: *Дзеепрыметнік* – гэта форма дзеяслова, якая спалучае граматычныя адзнакі дзеяслова – мае катэгорыі стану, трывання, часу, адсюль першая частка назвы *дзее-,* і прыметніка – мае катэгорыі роду, ліку, склону, адсюль другая частка назвы *прыметнік;* 2) або што назва не перадае поўнасцю семантычнага аб'ёму слова; напрыклад: *Сінтаксіс* – запазычанае слова, дакладны пераклад – складанне. Тэрмінам «сінтаксіс» у навуковых працах абазначаецца раздзел граматыкі, які вывучае будову звязнай мовы, словазлучэнне і сказ.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ГРАМАТЫЧНЫ СТАТУС НАЗОЎНІКА

**1. Пакажыце на пяці прыкладах з тэксту адметныя семантычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя рысы назоўніка. Ці выяўляецца сутнасць гэтай часціны мовы ў беларускім тэрміне «назоўнік»? Параўнайце беларускую назву з украінскай – «іменник», рускай – «имя существительное».**

Калі верыць старажытным, самы мудры той, хто даў імёны рэчам, гэта значыць, галоўны і адзіны моватворца і мовазнаўца – народ.

Мова – скарб народа, і народ зацікаўлены, каб яна была ёмістая, гнуткая ў рабоце, прыдатная для выражэння думкі, колеру, паху, сутнасці з'явы, накіраванняў часу, памкненняў чалавека. І да таго ж: лёгкая для ўспрымання і звонкая ў гучанні.

*(М. Лужанін)*

**2. Запішыце словы *назоўнік, назыўны, призвание, назва, адазваць, позва, назваць, прыназоўнік, адозва,* падкрэсліце ў іх корань. Выявіце агульнае лексічнае значэннне гэтых роднасных слоў. Да якіх часцін мовы яны адносяцца?**

**3. Выявіце агульнае і адметнае ў значэннях наступных слоў. Вызначце, якія гэта часціны мовы.**

Хада – хадзіць, прыгожы – прыгажосць, пяцёрка – пяць, вучоба – вучыцца, чырвань – чырвоны, бег – бегчы, сталовая – сталовая (лыжка), весялосць – вясёлы, незнаемы – незнаемы (твор), вандраванне – вандраваць, шчыры – шчырасць, рунець – рунь, сто – сотня, мужнасць – мужны.

**4. Прачытайце тэкст. Выпішыце асобна назоўнікі, якія абазначаюць жывыя істоты, прадметы рэчаіснасці, прыродныя з'явы, грамадскія з'явы, апрадмечапыя якасці, апрадмечаныя дзеянні, абстрактныя паняцці.**

І. Юнак, дзяўчына, якім пашчасціла змалку, са школы, сустрэць настаўнікаў і выхавацеляў, чуйных да хараства слова, праз усё жыццё будуць удзячныя ім задушэўнае святло, за чысціню пачуццяў, якія якраз і робяць чалавека шчаслівым. Далікатнасць, сардэчнасць адносін, найтанчэйшыя перажыванні, чарадзейная сіла кахання, захапленне прыгажосцю прыроды, пачуцці адданасці і любові да Радзімы – усё, што, на першы погляд, немагчыма вызначыць і выказаць словамі, аднак жа ўсё, літаральна ўсё знайшло і знаходзіць сваё выяўленне ў слове, у вобразе, у паэзіі, у мастацтве. І навучыцца разумець і адчуваць душэўнае хараство чалавека, аказваецца, можна пры дапамозе таго ж слова, калі яно жыве, гучыць, спявае ў душы настаўніка.

*(В. Вітка)*

ІІ. Мы зберажом і зуброў, і чалавечнасць, і старыявежы, і ўсплёскі бабра, і дзіва сонечных палян, і вуркатанне дзікага голуба, і святую гучную цішыню Пушчы.

Тады будзе мір усім. Усяму жывому. Не будзе каменя ў запазусе і прыхаваных стрэльбаў. Настане такі час. І вось тады ўся зямля, паўсюль, дзе ёсць нечапаныя стэпы, горы, першабытныя лясы, уся зямля стане падобная да цябе, Пушча, бо паўсюль будуць берагчы зямлю, як берагуць яе зараз тут. І

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прырода адплоціць дабром: неўміручымі дубамі, стронгавымі рэкамі, якія так ласка-ва мыюць пыльныя ногі, сонцам і крыштальным небам, якое не захмарваюць дым і пыл.

І не будуць хавацца ад чалавека бабёр і алень.

*(У. Караткевіч)*

**5. Знайдзіце ў сказах назоўнікі, вызначце іх марфалагічныя прыметы (род, лік, склон) і сінтаксічную ролю.**

1. Куды ні пайду я і дзе ні спынюся – спявае жыццё на маёй Беларусі. Прасторы нябёсаў зарой прамянеюць, сінеюць азёры, бары зелянеюць, гамоняць палеткі, *бруяцца* крыніцы... *(Бр.). 2.* Паспрабуй у дарогу забраць тыя пожні, палі і крыніцы, тыя пушчы, што могуць хіба толькі ў сэрцы змясціцца *(А. К.).* 3. Харошае, можа наогул найлепшае пачуццё – радасць новых сустрэч з людзьмі *(Б.).* 4. З-пад ног узлятае жаўрук – і высока, шчаслівы, звініць над сялом *(Р. Б.).* 5. Мяне хвалявала старая Вільня з яе вулкамі, па якіх хадзіў Францішак Скарына, з яе Лукішкамі, каля якіх мужна ўзышоў на шыбеніцу Кастусь Каліноўскі *(А. М.).* 6. У розных кутках беларускай зямлі (там помнікі б з мармуру высечы!) славутыя калісь друкарні былі – гадоў таму ледзь не паўтысячы *(Пл.).* 7. Ты ж, сын, вучыся родны край любіць, як прадзеды любілі *(М. К.)*.8. Маю душу па-свойму ўразіла непаўторная беларуская прыгажосць, абаяльная сіла паэзіі – народнай і таму вялікай *(Б.).*

**6. Выпішыце з тэксту пяць агульных назоўнікаў і ўсе ўласныя. Вызначце, што абазначаюць уласныя назоўнікі.**

Шлях, які ляжыць паміж Масквой і Мінскам, масквічы называюць Мінскай шашой, а мінчане – Маскоўскай. Але яе можна назваць Вялікай салдацкай дарогай. Тут стваралася гісторыя нашай Радзімы. Барадзіно і разгром немцаў пад Масквой; крывавыя баі за Смаленск, Ярцава, Вязьму; першыя залпы рэактыўных мінамётаў пад Рудняй і Оршай. У Оршы і навакольных лясах дзейнічаў адзін з самых адважных беларускіх партызанаў Герой Савецкага Саюза Канстанцін Заслонаў.

Барысаў. Бярэзіна. Гібель напалеонаўскіх войск. У гэтую вайну адгэтуль пачалі рухацца да Мінска і першымі ўварваліся ў разбураную беларускую сталіцу танкісты генерала Бурдзейнага, ганаровага грамадзяніна горада Мінска.

Гэтая дарога памятае конніцу Будзённага.

З Мінскам звязаны легендарный імёны Фрунзе, Тухачэўскага, Убарэвіча, Гая, Жукава, Цімашэнкі і іншых выдатных палкаводцаў. У баях за Мінск праславілася 100-я дывізія Русіянава, якая стала Першай Гвардзейскай.

Недалёка ад Мінска знаходзіцца веска Вязынка. Там нарадзіўся Янка Купала. І побач здзейсніў свой подзвіг Мікалай Гастэла.

Каля Мінска ёсць вёскі з назвамі Каралёў Стан, Каралішчавічы. Тут некалі былі стаянкі шведскага караля Карла. Дарэчы, у Каралішчавічах наш Дом творчасці...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І, нарэшце, на самай граніцы – Брэст. Героі Брэста былі літаральна ўваскрэшаны энергіяй, шчодрым сэрцам і талентам Сяргея Сяргеевіча Смірнова.

І зусім заканамерна, што на гэтай дарозе на сцягах трох гарадоў ззяюць залатыя зоркі Герояў, што каля гэтай дарогі нарадзіліся касманаўты Юрый Гагарын і Пётр Клімук.

*(П. Панчанка)*

**7. Выпішыце з тэксту ўласныя назоўнікі: імёны і прозвішчы, геаграфічныя і адміністрацыйныя назвы, назвы газет і часопісаў.**

Пра красу і сілу нашага слова, пра сваю любоў да яго Адам Міцкевіч гаварыў неаднойчы ў сваіх лекцыях у Калеж дэ Франс. Сучаснікі паэта, у прыватнасці, успамінаюць пра яго любасць да беларускай народнай песні. У гэтым ён не быў адзінокі, гэтая любасць здружыла яго не толькі з Янам Чачотам. На Наваградчыне бытуе легенда пра тое, што ў пецярбургскіх салонах ён, малады выгнаннік, не толькі здзіўляў сваім талентам імправізацыі, але і спяваў беларускія народныя песні і быў аднойчы ўражаны, калі падпяваць яму пачаў... Кандрат Рылееў. Што ж, і гэта тлумачыцца проста. Ведаюць у нас мястэчка Сталавічы і горад Нясвіж, у гісторыю якіх (у Нясвіжа асабліва доўгую і цікавую) увайшло і тое, што тут стаяў калісьці са сваёй батарэяй артылерыйскі прапаршчык Рылееў, будучы дзекабрыст, аўтар і ў гэтых мясцінах любімага «Ермака».

Беларускі рэвалюцыянер-дэмакрат, правадыр паўстання і публіцыст Кастусь Каліноўскі быў паплечнікам і другам выдатных польскіх рэвалюцыянераў Валерия Урублеўскага і Зыгмунта Серакоўскага, дарэчы, сябра Тараса Шаўчэнкі. Але ў той жа час ён, Кастусь Каліноўскі, у паўстанне 1863 – 1864 гадоў прыйшоў з Пецярбурга як палымяны паслядоўнік ідэй Бялінскага, Герцэна, Чарнышэўскага, Дабралюбава. І не выпадковасць гэта, а цудоўная заканамернасць і своеасаблівы сімвал – тое, што першая беларуская рэвалюцыйная газета «Мужыцкая праўда», якую рэдагаваў Каліноўскі, была адзначана і падтрымана на старонках «Колокола».

*(Я. Брыль)*

**8. Выпішыце са сказаў абстрактныя назоўнікі. Растлумачце, што яны абазначаюць (разумовыя паняцці, псіхічныя працэсы, апрадмечаныя якасці, дзеянні, стан).**

1. Да зорак позіркі і тэлескопы з сівых вякоў цярэбяць горды шлях, ды толькі па зямлі спрадвечны клопат, як сэрца, б'ецца ў грудзях *(Р. Б.).* 2. Якая асалода — жыць, знаць вартасць кожнае гадзіны, тым, што адкрыта, даражыць і адкрываць за дзівам дзіва *(Віт.).* 3. Не выхваляйся дабрынёю, рабі дабро ты моўчкі лепш *(Бр.).* 4. Усё, што радасць жыцця нараджае, красой аздабляе вялікі сусвет *(М. К.).* 5. Была самая гарачыня, сухі, бязветраны жнівеньскі поўдзень, але ў засені хвой і елак, пад навіссю густога зялёнага голля, спякота не так адчувалася, дыхалася легка *(Сач.).* 6. Ёсць хуткасць думкі. Дзіва гэта хіба не шчасце для людзей? *(Бр.).* 7. Мабыць, у чаканнях ёсць нейкая частка чалавечага шчасця. А хто ўжо нічога не чакае, таму сумна жывецца на свеце *(Грах.).* 8. Слухаючы «Ой, не кукуй, зязюленька» ў цудоўным выкананні

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Шырмавай капэлы, мне шчасліва хацелася заплюшчыць вочы, працягнуць рукі і абмачыць свае пальцы ў свежасць вясновай раніцы... *(Б.).* 9. Калі мудрыя рукі ў цябе— пад рукамі згубіць цвёрдасць сваю, памякчэе і камень (*П. М.).* 10. Нішто гэтак многа не пакідае бруду, як хараство, наведзенае штучна *(Скр.).*

**9. Назавіце ў сказах адушаўлёныя і неадушаўлёныя назоўнікі. Вызначце лексічныя і граматычныя прыметы адушаўлёнасці-неадушаўлёнасці.**

1. У Белавежы — цэдзяць водар сосны, на баравінах млее рэдкі цень *(Пл.).* 2. Рослы, светлы, чар-набровы люд, неспакойны, малады, смяяўся сінімі вачамі, гарэў вясёлым макам шчок *(М. К-).* 3. У нас адну малую птушку чамусьці кнігаўкай завуць *(Бр.).* 4. Пахнуць па-хатняму грады, сакочуць конікі, стаіць вялікі жніveньскі месяц, яшчэ не яркі, бо ранні вечар *(Б.).* 5. Чорны плюшавы мішка сядзеў побач з ложкам на тумбачцы *(Б.). 7.* Шахцёры і будаўнікі, калгасныя жнеі і агародніцы, настаўнікі і студэнты, сівабародыя вучоныя і маладыя загарэлыя салдаты, дзеці, якія ўжо чы-таюць Талстога, і дзеці, якіх яшчэ чакае гэтае шчасце,— усе па-святочнаму апранутыя і настроеныя, ідуць сюды [у Ясную Паляну], пакінуўшы за белымі вежамі варот свае «Пабеды» і аўтобусы, «Масквічы» і грузавікі з лаўкамі ў кузаве, свой бесклапотны смех і клопаты працоўных будняў *(Б.).*

**10. Са словамі ў дужках утварыце словазлучэнні і запішыце іх. Падкрэсліце адушаўлёныя назоўнікі, назавіце іх граматычныя прыметы.**

Бачыць (хлопцы, дрэвы, зубры, баравікі), даглядаць (дзеці, сады, цяляты), сустракаць (дзядуля, атрад, настаўнік), злавіць (конь, яблык, матыль), любіць (кветкі, людзі, моладзь, кнігі), вартаваць (стагі, кураняты, вішні, статак), разводзіць (карпы, парэчкі), есці (гарох, лешч, брусніцы).

**11. Прачытайце тэксты. Як аўтары раскрываюць значэнне назоўнікаў *чалавецтва, настаўніцтва?***

I. Ёсць у паняцці «чалавецтва» нешта вельмі «абстрактнае» і ў той жа час абавязковае, неабходнае. Чалавецтва — гэта паняцце, пачуццё высокагуманістычнае. Чалавецтва паявілася, узнікла не проста таму, што былі «адкрыты» Кітай, Індыя, Амерыка, што ваенныя і гандлёвыя караблі адкрылі людзям, адзін аднаму, не толькі блізкіх, але і самых далёкіх зямлян. Толькі ўсвядоміўшы, паверыўшы, што чалавек — усюды чалавек і «ўсе мы людзі», толькі адчуўшы і зразумеўшы, што побач з тым, што раздзяляе народы, існуе і тое, што і аб'ядноўвае іх у адзінае «племя людзей», «зямлян»,— толькі ў выніку гэтага механічная сума народаў і краін станавілася (і становіцца) паступова і ўсё больш чалавецтва м.

*(А. Адамовіч)*

II. Мабыць, мы ўсё ж мала ведаем і кепска вывучаем, чым было наша настаўніцтва для народа на працягу ягонай гісторыі. Духавенства — гэта вядома, тут яшчэ ёсць нейкі малюнак... А вось што зрабіла настаўніцтва ў нашых школах, што яно значыла для нашай некалі цёмнай сялянскай краіны ў царскія часы, пры Рэчы Паспалітай, у вайну, нарэшце, ды і пасля вайны? Гэта цяпер запытай якога падшыванца, кім ён будзе, калі вырасце, і ён скажа табе: інжынерам, урачом, лётчыкам, а то і касманаўтам. Цяпер ёсць такая магчы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

масць. I сапраўды так I бывае, аж да касманаўта... А ранен? Калі рос, бывала, харошы хлопчык, добра вучыўся, што пра яго казалі дарослыя? Вырасце — настаўнікам будзе. I гэта была найлепшая пахвала. Не ўсім вартым, вядома, удавалася дабіцца настаўніцкага лесу, але да гэтага імкнуліся. Гэта была мяжа жыццёвае мары. I правільна. I не таму, што легка... Ці заробкі харошыя... Не было нічога больш важнага і карыснага, як тая штодзённая, ціхая, непрыкметная праца тысяч бязвесных сейбітаў на гэтай духоўнай ніве. Я так думаю: у тым, што мы ёсць цяпер як нацыя і грамадзяне,— найпершая заслуга сельскіх настаўнікаў.

*(В. Быкаў)*

**12. Прачытайце сказы і назавіце зборныя назоўнікі. Вызначце асаблівасці назоўнікаў гэтай лексіка-граматычнай катэгорыі.**

1. Мяне заўсёды здзіўляла, якія ў нас разнастайныя, непаўторныя лясы: магутныя пушчы, заўсёды ўсхваляваныя асіннікі, звонкія высокія бары, прасторныя дубровы, вясёлыя бярозавыя гаі, застыўшыя ў непрыступных калонах ельнікі, калінавыя і чарэмхавыя зараснікі *(Панч.). 2.* Яблыні выпростваюць замлелае пад яблыкамі голле, а яблыкі, на дзіва сёлета ўрадлівыя, ружовымі, духмянымі сонцамі кладуцца ў скрыні са свежай дранкі, на свежую жытнюю салому *(В.).* 3. Я ўпарты, не кіну пачатае справы, каменне крышу, разграбаю пяскі, пад кпіны аматараў лёгкае славы капаю рэчышча ўласнай ракі *(А. К.).* 4. Лясы каля Мінска вялікія і вельмі багатыя на ягады, грыбы і дзічыну *(Сач.).* 5. Гулі пчолы ў густым вецці прысад і ў пышных кветніках *(Грах.).* 6. На дубе маім, заслоненыя лістотай, дарослыя буслы ці бусляняты стаялі нябачныя, моўчкі — я толькі здагадваўся, што яны там ёсць *(В.).* 7. Гараць навагоднія ёлкі ў сузор'і святочных агнёў *(М. Т.).* 8. У нас харошая пісьмен-ніцкая моладзь. Многа шчырых, добрасумленных, адукаваных, працавітых, натхнёных работнікаў літаратуры *(В.).* 9. Сам не паклоннік даўніны, сучаснасці равеснік, паміж радні і сябрыны я рады слуцкай песні — і той, што з полымя вайны і што бацькі спявалі, што нашы дочкі і сыны вязуць на фестывалі *(Віт.).* 10. Мы слухаем маўклівае міжзор'е, а блізкіх нам не хочам зразумець *(Бур.).*

**13. Растлумачце, якія граматычныя адрозненні маюць выдзеленыя аднакаранёвыя назоўнікі.**

1. Быць *чалавекам* на зямлі зямля бацькоў дала мне права *(Р. Б.). 2.* Свет людзей не заўсёды ўсведамляў сябе як *чалавецтва,* сваю гісторыю — як частку ўсеагульнай, сваю будучыню — звязанай з будучыняй другіх народаў і краін *(Адам.).* 3. Я пакланіцца кожнай *кветцы* рад, але не так, як той гарэза-хлопчык, што ў *кветнік* уварвецца, як пірат, адну сарве, а паўграды растопча *(П. М.).* 4. Запахла першай клейкай *лістотай (Сач.).* 5. Час ад часу ціха і плаўна ападалі з галін жоўтыя *лісты (А. М.).* 6. Ля ганка на прыбітай рудой траве краталася шырокае, свежае і здаровае жоўтае бярозавае *лісце* — яго нагнала з лесу ветрам *(Пташн.).* 7. Мове роднай маёй *карані* вымывалі славяншчыны рэкі *(Р. Б).* 8. Сенажаць — адно *карэнне,* сівец ды куп'ё *(Куп.).* 9. Лес мой, цуд мой... Я перадам нашу дружбу дачушцы I сыну, каб іх рукі ніколі *галін* не ламалі тваіх *(Панч.).* 10. У калючым сярэбраным *голлі* —

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яшчэ ўсё трымаюцца таксама заінелыя, аранжавыя зморшчаныя ягады *(Б.).* 11. Бяжыць хлапчук, а ў кулачках— *маліны (Пл.).* 12. Згадаць далёкую пару ўжо даўно мне рупіць. Успомніць босага маленства дні, грыбныя пні, *маліннік* і *сунічнік,* і светляковыя агні, і поўныя крыніцы *(Віт.).* 13 Каля самай дарогі выглядаюць чырвоныя *суніцы,* проста хочацца саскочыць з воза *(А. Ч.).* 14. Круглае поле. Узгоркі, *каменне.* Лес па краях, як сцяна *(К-с).* 15. Дзе-нідзе высяцца і мшэюць у спрадвечным сне волаты-калгякі— сляды дагістарычных фінляндскіх ледавікоў *(Скр.).* 16. З вялізнай жоўтай *саломінай* — падгіналіся ногі аж — поўз па галінцы зломленай лупаты, лабаты мураш *(Бур.).* 17. Каля хаты ляжала *салома... (К-с).*

**14. Знайдзіце ў сказах назоўнікі, якія набылі ў кантэксце значэнне зборнасці.**

1. Пацягнуўся лес сцяною — ельнік, дуб і хваіна *(К-с).* 2. Беларусь мая родная, як жа я рвуся яшчэ раз пеша ўсю цябе змераць, увесь і чабор твой і верас! *(А. К).* 3. Звер разумны стаў. Насядаюць на яго і з зямлі і з неба — навучылі. А разумны звер — страшнейшы *(Пташн.).* 4. Рускі, грузін, украінец, розная гаворачы мовай, любяць аднолькава ўсе маці, радзіму маю *(Бр.).* 5.А зірнеш на лес — сэрца сціснецца: і маркотна ў ім і нявесела! Пажаўцеў убор, пышны ліст яго, і ціхусенька асыпаецца *(К-с).* 6. І салдат, і палкоўнік, і маршал навек застануцца ў званні адным — Чалавек *(П. М.).7.* Была б і ягада і грыб, калі б наведаў госць *(У. Х.).*

**15. Выпішыце са сказаў рэчыўныя назоўнікі, вызначце вусна іх лексічныя і граматычныя асаблівасці.**

1. Дзякуй вам, і жалеза, і хлеб,— скажуць далёкія нашчадкі, дзівячыся на молат і серп, старыя прылады нашы *(В. В.).* 2. Дыміся бульбай, край маленства... *(Р. Б.).* 3. Вада ў гэтым месцы хлынула на дарогу, размыла пясок *(Пташн.).* 4. Разгароджаны двор зарос палыном і крапівою *(Грах.).* 5. Глыбей у зямлі жвір быў драбнейшы і белы, і яго капалі перад святамі, вясной і ўвосень, пасыпаючы па двары ля хат сцежкі *(Пташн.).6.* Глушцовым пер'ем тут і мох і ліст прапах *(А.К.).7.* Наш невялікі аўтобус падымаў воблакі мяккага пылу, пятляў паміж даспелага жыта... *(Грах.).* 8. Шуміць авёс, звініць ячмень, і верыш ты ахвотна, што каласы цалюткі дзень красуюць бесклапотна *(А. К.).* 9. Спрачаюцца хітрыя пілы, ляціць пілавінне, як шрот... *(Бр.).* 10. Народ пра сталь і зерне турбуецца *(Панч.).* 11. А любімыя ліпы ля скроняў шумяць без канца... Каб жа ніколі-ніколі на іх лісты не ўпала ні кроплі крыві ці урана, слёз ці свінца!.. *(Бур.).* 12. На станцыі саставы і саставы, нагружаныя цэглаю, вугалем, пяском, металам, машынамі, абсталяваннем *(Б.).*

**16. Запішыце наступныя назоўнікі ў назоўным склоне множнага ліку. Растлумачце, як утвараецца форма множнага ліку.**

Размова, камень, зубраня, чалавек, бераг, пісьмо, грамадзянін, рукаў, медзведзяня, кола, дзяўчына, неба, лён, воблака, інжынер, мох, беларус, кветнік, корань, ліст, курган, таварыш.

**17. Выпішыце са сказаў адзіночналікавыя назоўнікі. Растлумачце, чаму гэтыя назоўнікі не маюць форм множнага ліку.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Шчасце, сапраўднае чалавечае шчасце, у адчуванні, што Зямля — адна для ўсіх, што нам, чалавецтву, трэба яе і добра пазнаць, і разумна абжыць *(В.). 2.* Дык няхай жа не знае спакою ўсё, што здольна гарэць і палаць,— нават самае сэрца малое, калі мае што людзям аддаць *(Віт.).* 3. Рамонкавым пылам і жытам даспелым павеюць на горад начныя вятры... *(Трах.).* 4. Нейкі драбочак чалавечае радасці, і як хораша ўсё наўкруга! *(Скр.).* 5. Чыстым інеем пакрыты на гасцінцы беразняк *(К-с).* 6. Пачынаеш адчуваць неабдымнасць нашай зямлі, бязмежжа яе прастораў *(Трах.).* 7. У песні чуўся то лагодны плёскат, то ўздых цяжкі, то жаласлівы ўсхліп, то посвіст ветру, то гамонка вёсак, то шум бароў, то ціхі шэлест ліп *(Трах.).* 8. Што за карысць з вачэй, у якіх няма дабраты? *(В.).* 9. Кангрэсы міру адбываліся ў Парыжы і Празе, Маскве і Пекіне, Нью-Йорку і Лондане, Будапешце і Улан-Батары і ў многіх іншых гарадах *(Панч.).* 10. У пісьме былі словы, што зноў закінулі ў маю душу зерне надзеі *(А. М.).* 11. Хмарка, дажджом прашумеўшы ў лістоце, з нябёсаў часамі пашле сваю кроплю *(Бр.).* 12. Мяне жыццё не абышло. Пакаштаваць дало даволі, калі яшчэ я быў малы, чмяліны мёд, гаркоту солі, і смак слязы, і пах смалы *(Бур.).*

**18. Знайдзіце ў сказах назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку. Растлумачце, да якой семантычнай групы адносіцца кожны множналікавы назоўнік.**

**1.** Сэрца просіцца ў свет, сэрцу цесна ў грудзях *(Бр.).* 2. Крык і гоман на дарозе, бомы стогнуць і звіняць *(К-с).* 3. Каня запрагаю ў калёсы, дугу закладаю ў гужы... Вязу і сярпы я, і косы, і граблі ў свой стан на Сажы *(А. К).* 4. Сахалін, Курылы, Чукотку, Калыму і Камчатку, прасторы Ціхага акіяна кожны далёкаўсходнік ведае не горш, чым мы ведаем сваю вёску або ваколіцы Мінска *(Грах.).* 5. І дзецюкі Кастусёвы ў бары чакаюць тут жа, за Жупранамі *(Р. Б.).* 6. Учора ў суседняй кватэры спраўлялі праводзіны *(Стр.).* 7. Дружба гасне скора, калі ўзыходзіць на грашах *(М. К.).* 8. Снавалі павукі празрыстыя кроены *(А. К-).* 9. На сцяне ходзікі няўтомна клююць цішыню, і паўзуць, адна адну абганяючы, стрэлкі *(Скр.).* 10. Дзесьці далека ўжо слаліся грымоты *(М. К.).* П. Ты — сусвету ўсяго пясчынка. Абгароджаная Карпатамі і спавітая ў Гімалаі, як далонь чалавека, шурпатая, чалавеку ты ўжо малая *(Р. Б.).* 12. Гісторыя ў свае скрыжалі ўпісала горад мой — герой, і дзе б цябе ні ўспаміналі, стаю я з гордай галавой *(Бр.).* 13. Руіны пад асфальтам ціха стогнуць, і прывіды мінулага ўстаюць, і б'юць гарматы ў маладосць маю, і вусны ад пякельнай смагі сохнуць... *(Панч.).*

**19. Запішыце беларускія адпаведнікі да наступных рускіх слоў. Параўнайце формы ліку гэтых назоўнікаў у абедзвюх мовах.**

Поведение, сумерки, крупа, хлопоты, конопля, черника, грудь, дрожь, ясли, дрова, смотрины, баловство, обручение, хитрость.

**20. Знайдзіце ў сказах і растлумачце своеасаблівае ўжыванне множналікавых форм назоўнікаў.**

1. І калі ты ў шчасці будзеш велічны і ўзляціш да Марсаў і да Вег, дык успомні ўсіх, што сёння мелі мазалі, як гонар, а не грэх *(М. К.).* 2. Маці, маці Радзіма і ты, толькі ты і Радзіма — дзве трывогі на сэрцы... Дзве трывогі, два

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

шчасці з маленства са мною... *(М. К). 3.* Для народаў, для рэспублік, якія непасрэдна спазналі агонь Брэста, Хатыняў, Кіева, Смаленска, Сталінграда, для іх вайна — гэта асабліва балючая памяць *(Адам.). 4.* І жоўтыя пяскі і шум бярозны — мне гэта ўсё знаёма да драбніц... *(А. К.).* 5. Вёска ўстане перад імі, хаткі дарагія, усе куточкі, дзе прабеглі леты маладыя *(К-с).* 6. Усе мы не можам выбраць вольнай хвіліны, каб наведаць свае мясціны — Глыбачкі, Жывалкі, Замошшы *(Р. Б.). 7.* І ўдзень і ўначы з яго [пакоя] было відаць два небы. Толькі ўдзень гэтыя «небы» сінелі блакітам, а ўначы — густым кобальтам, які нехта папырскаў фасфарычным срэбрам *(Каратк.).*

**21. Запішыце 10 множналікавых назоўнікаў, якія абазначаюць: парныя і састаўныя прадметы, аднародную масу рэчыва, апрадмечаныя дзеянні і працэсы, геаграфічныя назвы.**

**22. Растлумачце, якія лексіка-семантычныя адрозненні выяўляюцца ў формах адзіночнага і множнага ліку наступных на-зоўнікаў.**

Холад — халады, час — часы, мозг — мазгі, сон — сны, народ — народы, газ — газы, кадр — кадры, гліна — гліны, звон — званы.

**23. Вызначце род выдзеленых назоўнікаў (па марфалагічных адзнаках — аснове і канчатку, лексіка-семантычным спосабам, па сінтаксічных сувязях).**

1. І хоць свая *зямля* ласкава, далёкі *свет* мне не чужы *(Бр.). 2.* Вы на *смерць* ішлі без страху, беларускія *жанчыны,* у імя Радзімы светлай, *міру, шчасця* і *любві* Чырванець умелі *ружай.* Рассыпаць *дабра* алмазы. Карчаваць *карэнне* зла *(Зв.).* 3. Людзей кранае кожны раз да слёз і радуе іх позірк чалавечы бязвоблачная *чысціня* нябёс сваей ад сонца выцвілай *сінечай (Аўр.).* 4. Усё вакол знаёмае да *болю:* збягаюць незабудкі да вады, сядае важна бусел на *тополю,* ад *ластавак* абвіслі правады *(Бур.).* 5. Да нас выходзіць *старшыня* калгаса, *дэпутат* абласнога Савета, *ардэнаносец* Алена Мінаўна Рунец *(Трах.).* 6. Зачараваны, бадзяюся я па вуліцах душных *Сухумі (Панч.). 7.* Быў ён [Андрэй] сёння ў старым чорным суконным *галіфэ,* у сівой суконнай доўгай рубашцы... *(Пташн.). 8. Жэня* была цяпер у Маскве *(К. Ч.).* 9. Цуды нейкіх *авеню* і сады ружовыя *Сарэнта ў* памяці пераганю, быццам бы старую кіналенту *(Панч.).*

**24. Растлумачце, што бярэцца пад увагу пры вызначэнні роду выдзеленых назоўнікаў.**

1. Тарас Шаўчэнка стаяў, бронзавы, на беразе возера *Антарыо,* каля горада *Палерма (Панч.). 2.* Праехалі краіну ад *Тбілісі* да горнага гарадка *Вардзія,* бліжэй пазнаёміліся з надзвычай працавітымі і шчырымі людзьмі... *(Панч.).* 3 Яны [маладыя] аддана кладуць сягоння ў *Заўтра* шлях *(Бр.).* 4. Касмічныя палёты і Цюмень, цаліна і *КамАЗ,* Саянская *ГЭС* і *БАМ* — гэтым жыве і дыхае ўвесь народ *(Панч.).* 5. Гэта І наш боль — *Сангмі.* Гэта і нашы праблемы, трагедыі — *Чылі,* Блізкі Усход *(Адам.).* 6. У свеце знаюць смутак *Лідзіцэ* і Арадур у чорнай скрусе, а партызанкай першай лічыцца зямля бясстрашнай Беларусі *(Пл.).* 7. Замець, нібы *канфеці,* закружылася ў голлі *(А. К.).* 8. Сёння мы будзем на *Ай-Петры* — у поўдзень, у спёку, аўтобусным гуртам... *(Б.).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9. Мы славім вас, хто ноч развеяў, у неўміручасці імён,— хто ля Дуная паў, ля *Шпрэе,* хто дома нёс фашыстам скон *(Бр.).*

**25. Падбярыце да наступных назоўнікаў прыметнікі, запішыце, у дужках адзначце род назоўнікаў.**

Алібі, амплуа, канферансье, бра, маэстра, жэле, зебу, калье, марабу, лэдзі, кімано, гну, манпансье, лібрэта, ранцье, клішэ, калібры, кулі, пано, парцье, эсэ, табу, рэзюме.

**26. Вызначце род наступных складанаскарочаных слоў.**

Гарана, НАН, БелТА, ВНУ, ААН, загс, ЛіМ, леспрамгас, БелЭн, БДПУ.

**27. Выпішыце з «Беларуска-рускага слоўніка» (2003) дзесяць аднакараневых назоўнікаў, род якіх не супадае ў беларускай і рускай мовах. Падбярыце да назоўнікаў прыметнікі. З некалькімі словамі складзіце вусна сказы.**

**28. Падбярыце да рускіх словазлучэнняў беларускія адпаведнікі, зацішыце. У дужках адзначце род назоўнікаў. Параўнайце род выдзеленых назоўнікаў у абедзвюх мовах.**

Золотая *медаль,* маленький *гусёнок, гроздь* винограда, неправильная *дробь,* потянуло *гарью,* недавняя *запись, комод* для белья, переплетенная *рукопись,* высокая *насыпь,* злая *собака,* высокий *тополь,* вкусное *яблоко.*

**29 Выпішыце са сказаў назоўнікі агульнага роду. Раскажыце пра асаблівасці іх ужывання ў літаратурнай мове.**

1. Я маю шчасце быць маленькім, сціплым сведкам шчырай любові да вялікага сына Расіі [Лермантава], той любові, якую жывіць да яго і да яе мой, нязменны ў пачуццях, беларускі народ *(Б.). 2.* Не сануляй, не пястушкай, не патворай ганарлівай, а ўдалася іх дачушка працавітай і руплівай *(М. К.).* 3. Гэта быў няўрымслівы непаседа, трапяткі і мітуслівы весялун *(Віт.).* 4. Поле ціхае маўчыць сіратой забытай *(К-с).* 5. А гэты Юзік-шаляніца, малы яшчэ, зусім дурніца, так пад нагамі і і таўчэцца *(К-с).* 6. Не маеш права зараз быць няўмекаю *(Луж.).* 7. Аднаму Жэньку было не да смеху *(Б.).* 8. Не будзь, калега, недарэкаю! Паэтам стань! Раней устань! Прайдзіся вуліцаю ціхай, азонам веснавым падыхай *(Вярц.).*

**30. Складзіце вусна па два сказы з наступнымі назоўнікамі, каб яны абазначалі асоб мужчынскага і жаночага полу.**

Інжынер, пераможца, дэпутат, стажор, донар, стараста, дырэктар, канструктар.

**31. Раскажыце пра актыўны працэс утварэння назоўнікаў жаночага роду ад слоў — назваў «мужчынскіх» прафесій і пасад. Калі вы скажаце: лабарант — лабарантка, настаўнік — настаўніца, бібліятэкар — бібліятэкарка, доктар — доктарка, дэлегат — дэлегатка, паэт—паэтэса, герой — гераіня, дыпламант — дыпламантка, касір — касірка, машыніст — машыністка, піяніст — піяністка, сакратар — сакратарка, трактарыст—трактарыстка, фельчар — фельчарка, цымбаліст — цымбалістка, кандуктар — кандуктарка, саліст — салістка?**

**32. Пры спісванні сказаў дапішыце канчаткі. Вызначце вусна род выдзеленых назоўнікаў.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Убачыць родны бераг свой табе да *бол…* хочацца *(Панч.).* 2. І *сведк…* быў увесь абшар, калі на возе навальнічным дадому вёз маланку гром *(Віт.).* 3. Ды не напіша ніколі пушкінскіх паэм аніяк... *ЭВМ (Бр.).* 4. У партызанскіх лагерах настаўнікі былі байцамі. У хвілю вольнае пары — лічыць вучылі жалудамі, пісаць *чарніл…,* што з кары *(Бр.).* 5. Мне люб... *стэп* шырок... і водар сенажаці *(А. К.).* 6. Каля Хабараўска ў Амур упадае шырок... і паўнаводн... *Усуры (Грах.).* 7. На дарогу ярка кладзецца чорн... *цепь* ад плота *(Стр.).* 8. Некалькі подыхаў ветру адтуль, з поля, прынеслі гаркавата-едкі пах *гар… (В. Б.).*

**33. Вызначце ў тэксце склон назоўнікаў. Адкажыце, што дапамагае гэта зрабіць (марфалагічная форма слова, сінтаксічная функцыя, роля прыназоўніка, парадак слоў).**

І. Многа напісана пра вочы, што яны — люстра душы, псіхічнай арганізацыі чалавека... Але, можа, нічога не выяўляе чалавека так, як яго хада.

Вось прайшоў нехта наперадзе, і табе робіцца нядобра ад нейкага адчування, што гэта рушыць цяжкая, упартая, сляпая сіла, якая не знаецца з такімі тонкімі нюансамі душы, як ласка, пяшчота, дабрата, каханне, чуласць, спагада. І ўся гэтая трывога толькі ад таго, што прайшоў непрыгожа, няўклюдна, як кажуць, па-мядзведжы — наскамі ўсярэдзіну.

На жаль, бывае, гэтак ходзяць і жанкі, і нават маладыя дзяўчаты. Дзе ўжо там думаць пра нейкую жаноцкасць.

Хаду таксама трэба выхоўваць. Як інтэлект. А яны звязаны між сабою, я ў гэта веру. Чалавек не мае права быць непрыгожы. І нядобры.

*(Паводле Я. Скрыгана)*

**34. Знайдзіце ў сказах назоўнікі роднага, давальнага і вінавальнага склонаў. Якія значэнні яны маюць у кантэксце?**

1. Запавет настаўніка — шанаваць памяць людзей — стаў высакародным звычаем школы *(Віт.).* 2. Гляньце вы, гляньце на наша багацце, гляньце на поле і на сенажаці, гляньце, паслухайце ўвесну і ўлетку — пераклікаюцца кветкі *(Бр.).* 3. Шлю падзяку вёснам і сябрам, жытнім копам на шырокім полі *(А. К.).* 4. Зноў, родны інтэрнат, да позняй ночы струменіцца святло з тваіх акон — так свецяцца ад шчасця ў бацькі вочы, калі сыноў сваіх сустрэне ён *(Р. Б.).* 5. Навучы любіць зіму, шчыглоў, сініц і слухаць, як над светам днём пагоднім звініць сасна *(Віт.).* 6. Зусім не спалася бацьку ў гэтую ноч *(Шам.).* 7. Кожны чалавек у некім пакідае ўспамін пра сябе. Хто быў знаёмы, хто блізкі, хто любы — кожнага ў свет павяла свая дарога. Як жа не хочацца думаць, што ў чыёй-небудзь памяці мог ты пакінуць горкі след *(Скр.).* 8. З бароў, з дуброў, з крыніц, лугоў, дзе трыснягі, дзе асака — цячэ рака. Цячэ рака праз шум травы, праз паплавы паміж палёў і мурагоў — як ланцужок, як паясок *(Бр.).* 9. Ен даў мне службовае машыны прыехаць сюды, у вёску... *(Б.).* 10. Настала тая хвіліна ніякаватасці, калі непасрэднае выяўленне настрою адчувае на сабе чужую ўвагу *(Скр.).* 11. Дарыце ўсмешкі, ад сэрца дарыце! І самі бярыце, у сэрца бярыце! *(Пл.).* 12. Многа сэрца аддаў Міцкевіч нашым палям і пушчанскім нетрам, яснай Свіцязі, быстраму Нёману,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нашаму небу — усходам і захадам сонца, пяшчотнасці белых аблокаў, цемры і гневу навальніц, высокай мудрасці зорных начэй *(Б.)*.

**35. Якія значэнні маюць у сказах назоўнікі творнага і меснага склонаў? Параўнайце матываванасць беларускага тэрміна «месны склон» і рускага — «предложный падеж». З якімі прыназоўнікамі найчасцей ужываецца месны склон?**

1. Вельмі люблю перасоўвацца па планеце — хадзіць па палявых ды лясных дарогах, плаваць па рэках, азёрах, па моры, лятаць над гарамі, над хмарамі, над траншам! дзяржаў *(Б.)*. 2. Што такое ўсё золата свету перад простай людской цеплынёй? *(Каратк.)*. 3. Калі слязы не знала вока, цаны не ведаеш слязам *(Бр.)*. 4. На карце вялікага свету цябе пазнаём здаля, нават з другой планеты, матчына наша зямля *(Віт.)*. 5. Мая душа — яна не спіць, зялёным полымем шугае, чырвоным полымем гарыць *(Бр.)*. 6. Дажджом, і небам, і ветрам навальнічным заўсёды пахне хлеб наш, цудоўны хлеб пшанічны *(М. К.)*.
7. Нашых землякоў мы пазнаём не толькі па прозвішчах. У звычаях і абліччах ёсць нешта знаёмае, і дзе б ні жыў беларус, у яго гаворцы заўсёды чуецца вымаўленне і мелодыка яго народа *(Грах.)*. 8. Кожны памятае прачытаную ў юнацтве першую кнігу *(Скр.)*. 9. У кроплі расы зіхаціць сонца, у магічным крышталі слова — ключ, якім можна адамкнуць скарбніцу мовы народа *(Віт.)*.

**36. Знайдзіце ў сказах назоўнікі клічнай формы. Вызначце род гэтых назоўнікаў.**

1. Углядайся, мой сыне, пільней углядайся ў святыя абрысы бацькоўскай зямлі *(Пл.)*. 2. І будзе, дружа, у доме шчасце, пакуль ёсць добры свет сяброў *(М. К.)*. 3. Добра знаю, што ўсёй душой любіць цябе, мой краю, мяне з маленства навучыла матчына песня *(Кір.)*. 4. Ты ляці, ляці, саколе, здабываць радзіме волю, у бой ляці, казача *(К. Б.)*. 5. Гэй ты, братка Новы годзе, што з сабою нам нясеш? *(Ц.)*. 6. Ну, заходзь, заходзь, малойча! *(К-с)*. 7. Ля самай сцежкі сядзіць, заламаўшы набакір шапку, глядзіць з-пад ліста на цябе баравік, дзівуецца, адкуль ты ўзяўся тут, чалавеча *(Сач.)*.

**37. Растлумачце, на якіх падставах назоўнікі размяжоўваюцца па скланеннях. Выпішыце з тэксту асобна назоўнікі 1-га, 2-га, 3-га скланенняў і рознаскланяльныя.**

Як часта нашы педагогі ўпэўнены, што чым больш яны ўціснуць у галаву дзіцяці гатовых ісцін, гатовай інфармацыі, тым большая будзе паспяховасць. Кепскі настаўнік падносіць ісціну, харошы — вучыць яе знаходзіць. Гэту простую мудрасць ніяк не могуць засвоіць настаўнікі, якія думаюць, што дзіця можна ператварыць у скарбонку лічбаў, правілаў, формул. Жывая памяць дзіцяці — не лічыльная машына! Перш за ўсё навучыце думаць, разважаць, абудзіце цікаўнасць. Не глушыце безліччу пытанняў. Будзьце больш уважнымі да таго, пра што ў вас пытаюцца вучні. Таму што там, дзе ўзнікае пытанне, там нараджаецца думка. «Дайце дзіцяці падумаць!» — вось шчырыя парады

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

В. Сухамлінскага, парады, якія праверaны яго шматгадовай практыкай настаўніка.

*(В. Вітка)*

**38. Выпішыце са сказаў назоўнікі 1-га скланення, вызначце вусна ў іх аснову. Пастаўце гэтыя назоўнікі ў родным, давальным і месным склонах адзіночнага ліку, запішыце. Растлумачце правапіс канчаткаў гэтых назоўнікаў.**

1. І ў век нейлонавы, век маторны хачу, каб песню маёй матулі і ўнукі ўнукаў маіх пачулі не толькі са сцэны, а ў хаце — блізкую — над ціхай калыскай, над поўнай міскаю *(Р. В.). 2.* Праца — першая патрэба, без працы немагчыма жыць, і так, як піць і есці трэба, штодня нам трэба і рабіць *(Бр.).* 3. Крытэрыі вартасці кожнага з нас — адзіныя: ці жывеш ты клопатам і трывогамі свайго часу, ці ёсць у цябе ясныя грамадзянскія перакананні, ці ставіш ты сваю прафесію вышэй за ўсе, якія мог выбраць сабе? *(Віт.).*

**39. Утварыце і запішыце словазлучэнні з назоўнікамі, запісанымі ў дужках. Растлумачце правапіс канчаткаў у гэтых назоўнікаў.**

Выйсці з (дом, інстытут, парк, лес), выступіць на (мітынг, сход),. няма (гадзіннік, густ, кантакт, твор), ганарыцца (край, горад), схавацца ад (дождж, мароз, брат), вецер з (усход, акно), холадна на (двор), непакой на (сэрца), гаварыць па (тэлефон), адпачываць на (Нёман, поўдзень, узлесак), купіць (вінаград, чай, хлеб), размаўляць пасля (дыспут, канцэрт).

**40. Пастаўце выдзеленыя назоўнікі ў родным склоне адзіночнага ліку, словазлучэнні запішыце. Растлумачце, як сэнс слоў вызначае іх граматычную форму.**

*Загад* па школе, бацькаў *загад; курс* партыі, трэці *курс; з'езд* настаўнікаў, *з'езд* з гары; *ясень* на мэблю, высокі *ясень;* пасеяць *загон* жыта, загон для зуброў.

**41. Пры спісванні сказаў дапішыце канчаткі назоўнікаў. Растлумачце правапіс гэтых канчаткаў.**

1. Хораша, што ў гэтым бязмежжы красы і таямніц ёсць месца, адкуль ты пачаўся, дзе ты прырос душой, дзе ты сумленна прапісаны як грамадзянін сусвет..., адкуль табе добра, як з роднага дом..., хадзіць у людзі, і куды табе добра вяртацца — з чыстай душой, як след зрабіўшы сваю чалавечую справу *(Б.).* 2. Не памыліліся ў асноўным — мы сэрцам з Ленін... жылі *(Бр.).* 3. Самым радасным падарункам была сустрэча з Валер... Паўлавічам Чкалав... *(Панч.).* 4. З дуб... зробіш кадзі — як званы, загудуць паважна *(Р. Б.).* 5. Як добра, калі зморышся, на свежым сене легчы, карэц вады ці квас... з дарогі асушыць *(Пл.).* 6. Зіма ўжо на двар..., за позваю шле позву *(Віт.).* 7.Штаб фронту мы адшукалі пад Магілёв... *(Панч.).*8. Каласы шапочуць, над вухам шалясцяць, як бы, здаецца, хочуць падзяку перадаць зямлі і цёплым ліўн..., і сонцу, і вятрам, а перш за ўсё — руплівым мазолістым рукам *(Пл.).* 9. На калгасным двар... ўжо было многа людзей *(Шам.).* Леніна *(Панч.).* 10. Я пазнаю яго па голас... *(К. Ч.).*

**42. Запішыце наступныя назоўнікі ў форме меснага склону.Растлумачце правапіс іх канчаткаў.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Інстытут, сакавік, поле, вецер, Васіль Дзяцел, трактар, трактарыст, гай, Віцебск, мір, возера, Мазыр, падарожжа, дырэктар, малако, Нёман, хлеб, Мікалай Барысюк, стог, двор, Алесь Дрозд, Валожын, гаспадар, жыта, калектыў, ліпень.

**43. Выпішыце назоўнікі 3-га скланення. Вызначце іх клон, растлумачце правапіс канчаткаў.**

1. Гані мяне, доля, ад перакатных радасцей капрызнай славы да зямнога, ціхага шчасця вялікай, патрэбнай працы! (*Б.*). 2. Чытаючы добрую кнігу, падумаў: апроч усіх падтэкстаў, тут ёсць яшчэ і такі — гэта напісана ў дождж, гэта ў радасці, гэта ў горы... *(Б.).* 3. Леўка ішоў і ўдыхаў гэтую бясконцую веснавую радасць *(Скр.).* 4. А на зямлі, дзе вокам кінь, цвіце, рунее рунь багата *(Куп.).* 5. Дарога вяла цераз самую рунь *(Пташн.).* 6. Над палосамі свежай раллі, над жытняй рунню і травой цэлы дзень не змаўкаюць цудоўныя песні — званочкі жаўранкаў і грукатанне трактара *(Б.).* 7. Як добрая дзедава казка, адзываецца ноч таямнічасцю гукаў і слоў *(Віт.).* 8. Спі, чалавеча, спі, засні. Ты спіш заўсёды ноччу цёмнай, пасля штодзённай мітусні, пасля сваёй турботы дзённай *(Вярц.).* 9. Без маладосці не было б характва, а без характва жыццё змарнела б... *(А. М.).* 10. Над дзённікам Льва Мікалаевіча, наткнуўшыся на яго думкі пра малалецтва, прыемна адчуў успа-мін пра сваю вясковую, даваенную маладосць *(Б.).*

**44. Прачытайце тэксты. Знайдзіце ў іх рознаекланяльныя назоўнікі. Раскажыце пра асаблівасці скланення і ўжывання ў беларускай мове рознаскланяльных назоўнікаў.**

I. Пра дзяцей ёсць вельмі добрая легенда. Жанчына некалі паскардзілася чараўніку, што рукі адвальваюцца: дзеці да году не ходзяць, цяляты, ягняты, жарабяты. Усіх на руках насі. Той узяўся памагчы. Кінуў цераз высокі плот жарабя — пабегла, цяля — таксама, ягня — і яно пабегла. «Ну, кажа, давай дзіця». Матка абурылася: «Эге, так я табе і дам дзіця цераз высокі плот кідаць».— «Ну то тады і насі...»

*(У. Караткевіч)*

II. Сціплая фельчарка, не сказаць каб магутнага складу жанчына, Цётка рабіла цяжкую мужчынскую працу паэта і рэвалюцыянера. Дададзім яшчэ — асветніка. Малады Колас не без яе ўплыву складаў «Другое чытанне» — кнігу для дзяцей. Гонар стварэння «Першага чытання для дзетак беларусаў» належыць Цётцы.

І прозвішча ж выбрала сабе ўдалае! Каб легка вымавілася, запомнілася адразу, усім прыпала да сэрца, як скажам, Купала і Колас.

Вось хто табе яна, дружа-сучаснік,— Цётка! Родная сястра твайго бацькі або маці.

*(М. Лужанін)*

**45. Як скланяюцца назоўнікі мужчыпскага роду з канчаткам -о (-я)? Спішыце сказы, назоўнікі ў дужках пастаўце ў патрэбным склоне.**

1. Спеваком ды (музыка) завуць пяшчотна салаўя *(Бр.).* 2. За хлопцам трэба паглядваць, малы яшчэ... І сёння, у выхадны дзень, як гэта бывала ўжо не аднойчы, Сяргей Іванавіч з (Саша) прыйшоў у парк *(А. М.).* 3. Старшына быў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з Грачанікаў, адной вёскі з (Серада) і адной з ім прафесіі — лесаруб *(Б.).* 4. Хлопцы спакойна пайшлі за (Кірылка)... *(К. Ч.).* 5. Цяпер мы з (дзядуля) адпачываем у вёсцы *(А. М.).* 6. Максім пачаў прыдзірліва адносіцца да ўсяго, што было звязана з (Вася)... *(Шам.).* 7. У гады Айчыннай вайны беларускі лес для многіх стаў надзейным (абаронца) *(Панч.).* 8. Лемяшэвіч не сумняваўся, што сакратар абкома, які прысутнічаў пры яго размове з (Бародка) на лузе, адразу зразумее, чым абумоўлены яго перавод *(Шам.).* 9. Пройдзеш Свіслач, апусцішся па цэментавых прыступках у сквер — і апынешся ля помніка пашаму песняру— (Янка Купала) *(Сан.).* 10. (Дзядзька) Ігнату я даручыў канец шнура, строга наказаўшы не дакранацца да яго... *(Б.).* 11. Хаджу я, браце ты мой, трэці год ужо (старшыня) калгаса *(Б.). 12.* Запраглі і паехалі ў лес. Івана (Мурашка) пусцілі спераду, як камандзіра *(Б.).*

**46. Спішыце тэкст, назоўнікі ў дужках пастаўце ў патрэбным склоне, растлумачце правапіс канчаткаў.**

1. Калі па (дарогі) не ходзяць, яны зарастаюць, перастаюць быць дарогамі *(Сач.). 2.* Якімі б шляхамі ні спасцігалі (вышыні невядомыя) — не выракаюцца (сцежкі) дадому *(Віт.).* 3. Асцеражней, таварыш, са (святыні). Чым замяніць іх думаеш, скажы? Страшней за ўсё, як робяцца (пустыні) палеткі плодныя людской душы *(Пл.).* 4. Асветлены спрадвечнасці нябёсы святым святлом сузор'я (родныя мовы)... *(Р. Б.).* 5. Вечна сонцу купацца ў (лясныя беларускія крыніцы), і няўрымслівай песні ў вечным паходзе звінець! *(Пл.).* 6. Ніякім словам не заменіш шчырасць непадкупную (вочы) *(Неп.).* 7. Заўсёды люба мне спяшацца да (хвалі твае), і (бярозы)... *(Пл.).* 8. Курлыкаючы, раздумна ўзмахваючы (крылы), у далёкую дарогу плывуць журавы *(Скр.).* 9. Сляпы, неразборлівы густ выяўляе толькі ад-настайнасць, стандартнасць, пазбаўляючы чалавека самастойнасці і асабістай адказнасці за развіццё сваіх індывідуальных (схільнасці) і (магчымасці)... *(Віт.).* 10. Голле (яблыні), каб не безліч (падпоркі), так і палегла б на траву *(Б.).*

**47. Якія назоўнікі не скланяюцца? Запішыце па два сказы на ўжыванне нескланяльных агульных і ўласных назоўнікаў іншамоўнага паходжання, славянекіх прозвішчаў на *-о* націскное, скла-данаскарочаных слоў літарнага і змешанага тыпу. Вызначце вусна склон кожнага нескланяльнага пазоўніка.**

**48. Вызначце ў сказах назоўнікі з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі. У якіх назоўніках суфіксы дэсемантызаваліся?**

І. Страціў слова, страціў спадчыннае слова — штосьці страціў у душы абавязкова! Можа годнасці хоць кропельку жывую? Можа — мудрасці хоць дробачку якую? Можа — памяці хоць зернятка-іскрынку? Можа — праўды хоць пылінку-парушынку? *(Пл.).* 2. Бывае выйдзеш на дарожку, глядзіш — а там пасля дажджу чыесьці босенькія ножкі стаптали росную мяжу *(М. К.).* 3. Мабыць, такіх чыстых і добрых вачанят, як у вясковых дзяцей, больш не сустрэнеш нідзе *(Грах.).* 4. Лічыць час у сухой траве, нібы конік, гадзіннік *(А. К.).* 5. Узімку, калі на вуліцы лютуе вятруга, круціць завіруха ці смаліць мароз так, што трашчаць вуглы хат,— як добра пайсці на вячоркі ці на ігрышча, чуючы кароткі скрып пад нагамі *(Скр.).* 6. І наша веска, наш край — пасечаная на кавалкі, затупаная гісторыяй, цяпер уваскрэслая Беларусь са

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сваім мінулым і сучасным павярнулася да мяне яшчэ адным краечкам *(Б.).* 7. Бялелі вялікія рамонкі, пазвоньвалі ліловыя званочкі, спявалі чмялі, упіўшыся ў малі-навыя шары канюшыны... *(Каратк.).* 8. Думаў радасна, прыйшоўшы з праходкі па першым марозіку са сняжком, што і чытаць — вялікае шчасце... *(Б.).* 9. «А як жа ты жывеш, Арсенька?» — спытала Галя, і ў яе голасе, і ў гэтым змяншальна-ласкавым звароце «Арсенька» мне пачуліся дабрыня і спагаднасць да людзей, адвеку ўласцівыя працавітай беларускай сялянцы... *(А. М.).* 10. Ка-жуць, стукні вялікім молатам па маленькім званочку — ён адгукнецца ледзь чутна, стукні маленькім малаточкам па вялізным звоне, і ён прагучыць, як гром *(Адам.).* 11. Нейкі драбочак чалавечае радасці, і як хораша ўсё наўкруга! *(Скр.).* 12. На доўгіх століках, уроссып, як карапузы-хлапчукі, нядаўна вымытыя ў росах, на сонцы спяць баравікі *(Пл.).* 13. А Волечка яго — нічога сакатуха *(Б.).* 14. Кандрат Назарэўскі пакінуў некалькі чалавек наглядаць за гэтым кутком... *(К. Ч.).*

**49. Выпішыце назоўнікі, утвораныя марфалагічным спосабам. Падкрэсліце ўтваральную аснову і словаўтваральны сродак. Вызначце вусна разнавіднасць марфалагічнага ўтварэння.**

1. Шмат і недагаворана, не выказана, натуральна пакінута ў падтэксце думак і пачуццяў, што яднаюць людзей, патрэбных адзін аднаму *(Б.).* 2. Перасохла рэчышча, дзе крыніца бегла. Дзе стаяла печышча — учарнела цэгла *(Віт.).* 3. Хацелася бачыць, як падымаецца рунь *(Скр.).* 4. За полем — Заполле, за лугам — Залужжа, а потым — Залессе, а потым — Загор'е. І вось яна, песня: Прымор'е, Замор'е! Дзівосныя назвы ў лесе ды полі *(Вял.).* 5. Хутка прыйдзе дамоў цымбаліст за сваімі цымбаламі *(А. К.).* 6. Піў бярозавік калісь, заядаючы хлебам *(Бр.).* 7. Сябры, паверце земляку: за век свой некароткі я ўпэўніўся, што случаку ўвесь наш край салодкі *(Віт.).* 8. Як перакласці на іншую мову слова «мудраванне»? А яшчэ ж ёсць «мудрошчы», «мудрагельства», «мудроты», «вымудры» *(Скр.).* 9. Кусты шыпшыны трапляюцца на схілах яраў ды на ўзлобках, ніколі не араных, падобных на агромністыя боханы *(В.).* 10. Кожная ява абавязкова шукае новай мары *(Грах.).*

**50. Запішыце восем назоўнікаў, якія абазначаюць асоб паводле нацыянальнай прыналежнасці, месца нараджэння, жыхарства, прыналежнасці да грамадскай арганізацыі. Падкрэсліце ўтваральную аснову назоўнікаў і словаўтваральны суфікс.**

**51. Выпішыце са сказаў назоўнікі, утвораныя спосабам складання і семангычным спосабам.**

1. Люблю рускіх, Расію, люблю Украіну... Але ніколі яшчэ не пашкадаваў, што я — беларус, ніколі не захацеў быць некім іншым... *(Б.).* 2. У краі тым, дзе я радзіўся (я з магілёўскай стараны), дзе ў расцяробах Сож разліўся, ёсць вёска ціхая — Званы *(М. К.)* 3. Дашчаніку стаяць сярод мураў,— хай будаўніцтва летапісам будзе з аўтографамі рупных муляроў, падсобнікаў вясны на Нафтабудзе *(Р. Б.).* 4. Паглядзі на жаўталісты сад. Вунь ідзе між яблынь лістапад *(Віт.).* 5. Педагог павінен заўсёды памятаць, гаварыў В. А. Сухамлінскі, што дзіця кожную хвіліну свайго жыцця знаходзіцца ў стане

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

самапазнання, самавызначэння, самавыхавання *(Віт.)*. 6. Абкам і гаркам паставілі задачу зрабіць мікрараён найпрыгажэйшым у горадзе *(Шам.)*. 7. Дождж тужліва барабаніў у дрэвы, падаў разам з бярозавым ды асінавым жаўталісцем на сыры дол *(А. М.)*. 8. Навагрудак, як яго чамусьці, на польскі манер, называюць (а мясцовыя людзі кіламетраў на семдзесят у наваколлі называюць Наваградак, і гэта бліжэй да старадаўняга Ноўгарадка), ляжыць на Навагрудскім узвышшы *(Каратк.)*. 9. Яшчэ да Верасня я быў не маладзён: сёй-той ужо тады спрабаваў мяне называць дзедам *(Б.)*.

**52. Раскажыце пра субстантывацыю — пераход слоў іншых часцін мовы ў назоўнікі. Знайдзіце ў сказах словы, якія набылі значэнне прадметнасці.**

1. Народ, што быў простым аратым, цяпер — аграном, інжынер *(М. К.)*. 2. Будзённае І проста цуды цяпер не проста раз'яднаць *(Бр.)*. 3. Не дзіва, што ўсе вялікія педагог — заўсёды майстры слова: Русо, Песталоці, Талстой, Ушынскі, Макаранка, Корчак, Сухамлінскі *(Б.)*. 4. Абапіраючыся на сукаватую палку, Янка Купала ідзе, быццам з пагулянкі,— спакойны, мудры, задаволены тым, што ўбачыў, пачуў ад людзей, тых людзей, у якіх цудоўнае сёння і яшчэ лепшае заутра *(Сач.)*. 5. Выхаванне савецкага патрыёта, грамадзяніна і чалавека з вялікай літары — справа вельмі складаная і шматгранная, аснаваная на глыбокай маральнасці і высокай любові да прыгожага ў жыцці *(Б.)*. 6. Чытай ды пахадзі па свеце і штосьці новае скажы *(Бр.)*. 7. Ну, колькі тут дапаможа мае маленькае «ўра»? *(Б.)*.

**53. Выпішыце з тэксту назоўнікі. Зрабіце пісьмовы марфалагічны разбор у такім парадку: 1) пачатковая форма; 2) лексіка-семантычная група (назва канкрэтнага прадмета, асобы, жывёлы ці птушкі, з'явы прыроды, грамадскай з'явы, абстрактна-разумовага паняцця, рэчыва, стану, апрадмечанага дзеяння, апрадмечанай якасці, уласцівасці і інш.); 3) лексіка-граматычная катэгорыя (канкрэтны ці абстракты, уласны ці агульны, адушаўлёны ці неадушаўлёны, зборны, рэчыўны, адзінкавы); 4) граматычныя катэгорыі (род, лік, склон); 5) скланенне, 6) сінтаксічная функцыя.**

І. Маладосць цягнецца да незвычайнага, да рамантычных падарожжаў, да небывалых учынкаў, да пераадолення нечуваных цяжкасцей, каб выхаваць у сабе смеласць, трываласць, вынаходлівасць.

Гэта цікавы і паважаны, але не адзіны шлях да выяўлення сіл і здольнасцей. Адзін сціплы чалавек, асеўшы ў даўнейшым горадзе Казлове, прысвяціў сваё жыццё пладоваму дрэву і зрабіў у гэтай галіне столькі смелых спроб, што стаў вядомы ўсяму свету, як стратанаўт і падарожнік. Гэта гаворыцца да таго, што дробных спраў не бывае, калі іх рабіць добра. У кожнай, на першы погляд, нязначнай, рэчы закладзена зерне вялікіх магчымасцей, а на кожнай, здавалася б, даўно праторанай, сцяжынцы затоены перспектывы адкрыццяў.

*(М. Лужанін)*

## ГРАМАТЫЧНЫ СТАТУС ПРЫМЕТНІКА

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**1. Спішыце тэкст, падкрэсліце прыметнікі. Назавіце асаблівасці гэтай часціны мовы (семантычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя). Падбярыце аднакаранёвыя словы да тэрміна «прыметнік». Параўнайце беларускую назву «прыметнік» з рускай «имя прилагательное» і ўкраінскай «прикметник».**

Перачытваў «Пана Тадэвуша» Адама Міцкевіча... Здаецца, што добра бачу тую свабоду, з якою ён тасаваў пейзажы, маёнткі, вёскі, замкі, корчмы, прататыпаў — здалёк, з выгнания, у горкім шчасці тугі і творчага аза-рэння ствараючы вобразы свае цудоўнае Наваградчыны.

Гаворачы пра яе, ён думаў, бясспрэчна, не толькі пра той куток, дзе нарадзіўся, дзе прайшло яго дзяцінства і юнацтва,— Міцкевіч думаў пра Беларусь. Наш неласкавы лёс судзіў і яму называць яе афіцыйна, на мове ўладароў — Літвой. Аднак жа ніхто з вялікіх не сказаў пра родную мову прыгнечанага, абяздоленага беларуса так, як сказаў гэта ён, з еўрапейскай трыбуны назваўшы яе найбагацейшай і найчысцейшай з усходнеславянскіх моў, азначанай узнёслай прастатою.

Многа сэрца аддаў ён нашым палям і пушчанскім неграм, яснай Свіцязі, быстраму Неману, нашаму небу — усходам і захадам сонца, пяшчотнасці белых аблокаў, цемры і гневу навальніц, высокай мудрасці зорных начэй. Ад першых юначых балад і рамансаў да мужнай, веліч-най плыні «Пана Тадэвуша» — усюды з вечна свежай і неразгаданай чароўнасцю жыве хараство беларускай прыроды... *(Я. Брыль)*

**2. Прачытайце сказы, вызначце лексіка-семантычныя разрады прыметнікаў. Выпішыце ў асобныя групы словазлучэнні назоўнікаў з прыметнікамі, якія абазначаюць: 1) унутраную ці знешнюю якасць, уласцівасць асобы; 2) унутраную якасць прадмета; 3) колер, смак, форму, памер; 4) адносіны прадмета да часу, месца, матэрыялу, дзеяння, прызначэння; 5) прыналежнасць асобе; 6) агульную ацэнку прадмета.**

1. Нас б'е па сэрцах паскарэкне, сціскаюцца прастора, час, а матчынай зямлі карэнне ніколі не адпусціць нас *(Панч.).* 2. Дубовы ліст, у жылках і расе, мненагадаўабрысы Беларусі *(Грах.).* 3. Не, ты [Радзіма] не толькі ў ар-наменце тым, што на салодкай цукерцы, матчынай мовы словам святым жывеш ты ў сыноўнім сэрцы *(Р. Б.).* 4. Легла ўсё да сэрца блізка: колас буйны і тугі, і усмешка, і калыска, і асеннія стагі *(Панч.).* 5. Усё навокал было белае, па-святочнаму ўбранае, як гэта бывае толькі ў першую ноч зазімку *(В. Б.).* 6. Марозікам пахне капуста, жаўруковаю песняй — яблык, вераснем — сопкая бульба, расой — агурок крамяны *(Я. С).* 7. Падчас і па чужых краях журуся, а хопіць і адзінай Беларусі, каб цэлы век свой да яе ісці *(Н. М.).* 8. Дарэктар сам з свае ахвоты ў гумно любіў рабіць налёты, бо ён быў хлопец працавіты і да работы страх сярдзіты, хоць быў яшчэ малы і кволы,— ну, хвацкі хлопец і вясёлы! *(К-с).*

**3. Спішыце, падкрэсліце прыметнікі, вызначце іх лексіка-граматычныя разрады. Назавіце семантычныя і граматычныя асаблівасці прыметнікаў розных разрадаў.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Каля агню асталіся шэсць гаспадароў ды некалькі цікаўных жанок... Міканорава матка глядзела з вечнай трывогай, і спакойная пастава сястры, Хведаравай жонкі, Міканору была як уцеха.

Спачатку больш маўчалі. Было нешта новае ў тым, што чулі адзін ад аднаго, была нейкая дзіўная, нязвычная паразумеласць, блізкасць. Гэтая блізкасць чулася мацней адтаго, што з вясёлымі надзеямі лез у думкі, у душу клопат, які ў некаторых станавіўся проста такі трывожнасцю: а як яно там будзе пазней, што выйдзе з усяго гэтага, якое пачынаецца тут парнай, душнай гэтай ноччу...

Не адзін у Куранях доўга, бяссонна круціўся ў тэту ноч, паглядваў з цікаўнасцю на Дамецікаў агеньчык, каля якога меркавала, дамаўлялася аб нечым купка тых, якія лаверылі ў вялікую трывогу-загадку. Не ўсе супакоіліся і тады, калі тыя разышліся, калі і сам агеньчык апаў, перастаў зырчаць у цемры чырвоным, неспакойным вокам...

*(І. Мележ)*

**4. Запішыце сказы. Вызначце, да якіх лексіка-семантычных разрадаў адносяцца выдзеленыя прыметнікі.**

**1.** Замірае, сціхае мая *залатая* дуброва, асыпае, скідае на дол свой задумлівы ўбор *(Пл.).* 2. Аўтобусы праклалі першы след у *залатое* чэрвеньскае ранне *(Грах.).* 3. *Залатымі* стануць рэчы тыя, да якіх, як самы цуд вялікі, дакрануцца рукі *залатыя (П. М.).* 4. Хлопец *залатыя* меў рукі, і разумны, і спрытны — такіх пашукай і не знойдзеш *(Панч.).* 5. Мы будзем далека ці блізка, але не забудзем сустрэч вечары, агні *залатыя* над Мінскам... *(Зв.).* 6. Маленькі чытач непадкупна патрабавальны, чулы на праўду і фальш у іх найменшым выяўленні, ён дапускае ў свет сваей чыстай, *паэтычнай* душы толькі таго, хто таксама шчыры і закаханы ў прыгожае *(Б.). 7.* У паэме Віткі «Беларуская калыханка» — высокая культура*паэтычнага* слова *(Б.).* 8. Трэба шчыра вітаць усіх тых прадстаўнікоў нашай магутнай *паэтычнай* раці, што выпрабоўваюць пяро і ў прозе, і ў іншых жанрах *(Б.).*9. Па агульнай культуры верша, па чарадзейным абыходжанні з *паэтычным* радком, са словам і гукам з Купалам можа параўнацца хіба што адзін Багдановіч *(Пл.).* 10. Як гэткі конь імчаў Будзённага, як бліскаў *срэбраны*клінок! *(Панч.).* 11. Ноч абсыпала *срэбным* бляскам галіны стромкае сасны *(Зв.).* 12. Ноч гусцее. Пагасла зара. Зорка *срэбная* ўпала ў ваду *(Панч.).* 13. Трубіць ціша світальная ў свой *сярэбраны* рог *(Вярц.).* 14. І лес, і снег у чыстых зорах, у *срэбных* пацерках — кусты *(Грах.).* 15. Сонца ціха скацілася з горкі, месяц белы заплаканы свеціць, аглядае бахматыя зоркі, цягне з возера *срэбныя* сеці *(Багд.).*

**5. Назавіце тып значэння выдзеленых прыметнікаў: прамое (значэнне колеру выражаецца ў самім слове), пераноснае (значэнне колеру перадаецца праз адносіны да другога прадмета).**

1. Зямля мая *зялёная* — ад ніў бяскрайніх і лясоў, а *сіняя* — ад неба, рэк, азёраў, а *срэбная* — ад звону пераліўнага крыніц *(А. Л.).* 2. Гэта мне *белым* крыллем махаюць завеі, для мяне *белы* коннік зімы мчыць на *белым* кані (Зв.). 3. Спадае *медны* ліст каштанаў на *жоўты* стоптаны мурог *(М. Т.).* 4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пан Сухавараў ускінуў на Ядвісю свае *алавяныя* вочы *(К-с).* 5. Сонца днём распускае там косы свае, ночкай зоры глядзяць *залатыя (Куп.).* 6. Навакол усё паветра ў струнах сонца *залатых (Багд.). 7.* Сяргей ідзе. Яшчэ ўсё малады, як і ў той час, толькі цяпер — у *сінім,* заплямленым камбінезоне, з *пшанічным* чубам над *блакітнымі* вясёлымі вачыма, з кепкай у левай руцэ *(Б.).* 8. А вочы яе [Ганны], *вішнёвыя,* увесь час неспакойныя вочы, у якіх то смутак, то бляск насмешкі, то затоены боль,— што яны адны маглі рабіць са Сцяпанам! *(І. М.).* 9. Хай ад *чорнай,* як смоль, баразны будзе сейбіту светла ў вачах *(Пл.).*

**6. Запішыце сказы, падкрэсліце фразеалагізмы з кампанентамі-прыметнікамі. Растлумачце сэнс фразеалагізмаў.**

1. У савецкі перыяд творы Янкі Купалы і Якуба Коласа ўвайшлі ў залаты фонд сусветнай літаратуры *(Кр.).2.*Работніцы падносілі чырвонаармейцам падарункі — падарункі небагатыя, але ад шчырага сэрца *(Гар.).*3. Д а н і л а. Лёгкія табе ногі, дзядзька Батура. Спяшайся з запіскай, каб мы не спазніліся *(Кр.).* 4. Упаўнаважаны гнеўна паківаў пальцам перад Васілёвым тварам: «Не, рукі кароткія! Савецкая ўлада не такіх уціхамірвала!» (7. *М.).* 5. Калі ж ён [Васіль] не вярнуўся, злыя языкі без літасці асудзяць: не ўправіліся хлопца звесці з сяла, як яна [Ганна] ужо ў гурт з'явілася! *(І. М.).* 6. Збіў Рымша пана на горкі яблык, забраў усе грошы ды і пайшоў сабе ў лес, у сваю зямлянку *(Нар. те.). 7.* Каб не папасціся пад гарачую руку немцам, Міколка з дзедам рашылі пераседзець у лесе ночы са тры *(Лыньк.).*

**7. Падкрэсліце прыналежныя прыметнікі. Вызначце, ад якіх назоўнікаў яны ўтварыліся, што абазначаюць, якія іх граматычныя і словаўтваральныя асаблівасці.**

1. Раён цягнуўся ўздоўж Прыпяці, на карце ў Апейкавым кабінеце, якую намалявалі Апейку ў школе, раён быў падобны на рыбіну, што ляжала ўздоўж ракі *(І. М.). 2.* Больш за стагоддзе прайшло, а сутнасць твора, аўтарава любоў да беднага, простата чалавека, сіла ягонага слова жывуць ва ўсёй сваёй свежасці...(Б.). 3. На ранку дзеці шпаковы песцяцца, збіваюць з галінак ліповы пылок *(Кір.)* 4. А пад гарой Дняпровы хвалі з вясны да восені шумяць *(Куп.).* 5. Мы ўспамінаем светлую радасць малечы, яе сардэчны смех і бляск захопленых вачэй, што многім з нас неаднойчы даводзілася бачыць і чуць на Віткавых сустрэчах з дзецьмі *(Б.).* 6. Хадоська аж дзіва гарнулася да дзяцей. Ігнаціха, Хадосьчына матка, нахваліцца ёю не магла (7. *М.). 7.* Першая не ўтрывала Сарока: павесіўшы касу на дубок, напрасткі цераз рады, цераз някошанае падалася да Міканоравага памочніка (*І. М.). 8.* Толькі як пад'ехалі пад край сяла, пачула Ганна неспакой, адвярнулася, нахілілася над малой. Але і не гледзячы, дзіўна чула, як набліжаецца Васілёў двор (У. *М.). 9.* Мы бачым адны толькі матчыны рукі, адны яе рукі, ад-ны іх рухі *(Вярц.).* 10. Доктар знайшоў бабчыну сухую руку, пагладзіў. Часта чалавечымі словамі нельга сказаць таго, што скажаш маўчаннем *(Скр.).*

**8 Запішыце такія назвы мастацкіх твораў (5), у якіх прыналежнасць выражаецца прыналежным прыметнікам, напрыклад: «Нёманаў дар» Я. Коласа; «Вавёрчына гора» В. Віткі. Перакладзіце на рускую мову.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**9. Вызначце разрады выдзеленых прыметнікаў, што ўтвораны ад асабовых назоўнікаў з дапамогай суфіксаў *-оўск-(-аўсіс-), -ёўск-(-еўск-), -ынск-(-інск-)*. У якіх стылях мовы ўжываюцца прыметнікі з такімі суфіксамі?**

1. Блізкасцю да народна-песенных асноў тлумачацца і такія выдатныя якасці *купалаўскай* лірыкі, як яе надзвычайная музычнасць і пявучасць *(Пл.)*. 2. З тых дзён мяне хвалюе вобраз старое маці, забітай горам і галечай. І тая, *тургенеўская* маці восьужо больш за сорак гадоў стаіць перада мною як вобраз да сцішнаты прыгожы, абагулена-народны *(Б.)*. 3 Муж вярнуўся жывы-здаровы з вайны, абодва сыны таксама — вось яно, *мацярынскае* шчасце, наибольшая ўзнагарода *(Б.)*. 4. Кожны год, як толькі ў долах зацвітае сіні верас, з *мацярынскай* ласкай школа расчыняе насцеж дзверы *(М. К-)*. 5. Сярод успамінаў пра Чорнага і даследаванняў яго творчасці тое, што напісана Віткам, займае свае асаблівае месца, прываблiваючы не толькі належным разумением *чорнаўскага* слова, але і яркімі накідамі партрэта пісьменніка і чала-века... *(Б.)*. 6. Чалавек толькі тады Чалавек, калі ў яго душы ёсць пачуццё любові да Бацькаўшчыны, калі для яго з'ўляюцца святымі такія паняцці, як родны кут і *бацькоўская* хата, як праца і сумленна запрацаваны хлеб... *(Пл.)*. 7. Рамантыку *быкаўскай* «Альпійскай балады» адцяняе не толькі псіхалагічны рэалізм, але і страсная філасофская думка, напружаны роздум *(Адам.)*.

**10. Вызначце, да якіх разрадаў адносяцца выдзеленыя пры-метнікі, утвораныя ад назваў жывёл, птушак, насякомых, рыб з да-памогай суфіксаў *-ін-(-ьм-), -яч-, -j-*.**

1. Тут азёры, як неба, сінія, у чаротах чароды *гусіныя,* а на дне Млечным Шляхам свецяцца трапяткія гурты *язіныя (Бур.)*. 2. Ля чорнай кладкі плавала *гусінае* пяро *(А. П.)*. 3. Чую крык *жураўліны* над полем *(А. П.)*. 4. Плыве над намі *жураўліны* ключ *(Грах.)*. 5. У сівой вышыні *жураўлінай* аж да зор даляцеў беларус *(Бур.)*. 6. Паўтараецца вечна, а гучыць не завучана кожнай но-вай вясной кукаванне *зязюльчына (Панч.)*. 7. У акенца тваё я пастукаў *зязюльчыным* ранкам пасля *салаўінага* вечара і *перапёлчынай* ночы *(Панч.)*. 8. І знямела, як *ар-ліны* клёкат, слова набалелае ў грудзях *(А. П.)*. 9. З вы-сокага замчышча — *арліны* пагляд на зялёна-залацістыя надрэчныя далі, на вялікае сяло з драўлянымі домікамі *(Б.)*. 10. Сыны зямлі *арліным* зрокам у цьме спрадвечнае смугі знайшлі другія берагі, каб волю даць людскім патокам *(К-с)*. П. Гукае нас зялёная вясна таемным. шэп-там і *птушыным* звонам *(Грах.)*. 12. *Птушыныя* гнёзды пад снегам паснулі, дрымотную пражу завеі прадуць *(А. П.)*. 13. Бяроза там — сама краса: царыца над узлессем! І ўся ў *птушыных* галасах, у перазвонах песень! *(Пл.)*. 14. Над Проняй — не вузкай, не мелкай — *чмяліны* малінавы бас *(А. П.)*. 15. Маня і потым, калі гаварыць ужо не было чаго, стаяла, маўчала, лыпала *цялячымі* вачыма, пакуль Хадоська не падалася першая ў бакоўку *(І. М.)*.

**11. Да наступных прыметнікаў падбярыце адпаведныя назоўнікі. Растлумачце, што абазначаюць прыметнікі, якая розніца ў іх значэнні. Вызначце разрады прыметнікаў, складзіце шэсць сказаў з гэтымі прыметнікамі (на выбар).**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лясны, лясісты (дарога, гушчар, сцежка, кветкі, бераг, мясціна, раён, масіў); балотны, балоцісты (прастор, трава, яліна, бераг, птушка, асака, край, мясцовасць); вадзяны, водны, вадзяністы (снег, прастор, шлях, пара, гладзь, паверхня); гліністы, гліняны (посуд, ток, зямля, глеба, падлога); цікавы, цікаўны (артыкул, апавяданне, пытанне, хлопчык); ганарысты, ганаровы (госць, месца, званне, чалавек, абавязак, прэзідыум, грамата, вахта); чалавечы, чалавечны (род, учынак, жыццё, адносіны, голас, жыллё); эфектны, эфектыўны (вынікі, праца, слова, поза).

**12. Раскажыце пра ўжыванне поўных і кароткіх прыметнікаў у беларускай мове. Складзіце па пяць сказаў з прыметнікамі мужчынскага, жаночага і ніякага роду назоўнага склону тыпу *разумны (разумная, раэумнае), добры (добрая, добрае)* у ролі выказнікаў. Вызначце форму прыметнікаў.**

**13. Запішыце сказы, вызначце форму прыметнікаў (поўная, сцягнутая (злітная), кароткая), іх сінтаксічную ролю.**

1. Чытаць — гэта і праца, і свята. Хвалююць, радуюць сустрэчы з новымі праўдзівымі, глыбокімі, сэрцам напіса-нымі кнігамі *(Б.).* 2. Ніколі не страціць для нас цікавасці чалавек, бо праяўленне яго розуму бязмежна, бо дарогі яго не вызначаны, бо формы яго жыцця і адносін да другіх людзей бясконца разнастайныя... *(К-с).* 3. Чорны, родны небу, дараг надзённы хлеб у кмене зорак *(Р. Б.).* 4. Зранку неба было і чыстае, і яснае, і яснасць стаяла доўга ўдзень, але за полуднем проста ўвачавідкі пачыналі пухнуць белыя, потым сіняватыя хмары (/. *М.).* 5. Таксама вечар свае бавы нясе з сабой не менш цікавы *(К-с).* 6. Канчаецца халодны, доўгі студзень, патроху набліжаецца вясна *(Бур.).* 7. Свет быў поўны гукаў, поўны свайго, нябачнага раней жыцця. Ён быў увесь час, дзівосна багаты і розны, з няўціхнай песняй: празрыстай, звонкай — ранкам, гарачай, прытомленай — днём, ціхай, думнай — увечары *(І. М.). 8.* Цемень ночы паблякла, паліняла, зрабілася шэрай, празрыстай *(Лыньк.).* 9. Далёкія агні палескіх вёсак, настылыя блакітныя сады, дзявочай песні звонкі падгалосак мяне ізноў паклікалі сюды *(Грах.).* 10. Гэта спадчына мне засталася ад прадзедаў — матчыных песень дзівоснае прадзіва — і вясёлых, і сумных, і слёзных, І грозных... *(Пл.).*

**14. Запішыце сказы, падкрэсліце простыя (сінтэтычныя) і складаныя (аналітычныя) формы вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання прыметнікаў, растлумачце іх значэнне і ўтварэнне.**

1. Як цуд чужы вачэй ні цешыў, душа шаптала мне сама: ёсць край цяплейшы, багацейшы, але раднейшага няма *(Бур.). 2.* Тут спалучана ўсё: ярасць грому, і гнеў бліскавіцы, і найлепшыя мары, і сны, і празрыстасць крыніцы *(Панч.).* 3. Было так добра далучыцца да самых высокіх пачуццяў, што клічуць да працы і барацьбы *(Б.).* 4. І вось смычок цалуе ціха струны, як быццам праганяе сон апошні і асцярожна выпытаць хоча, дзе песня найзванчэйшая ляжыць *(Бур.).* 5. Трое хлопцаў старэйшых маглі б за сталом за бацькоўскім абедаць *(Я. С).* 6. Няхай жа вечна ў сэрцах б'юць крыніцы таго шчасця, што і ў самых найшчаслівейшых дапытае слёз! *(Пл.). 7.* Раніцай знайду між траў і лісця самых лепшых вершаў цёплы след *(Панч.).* 8. Маладосць — краса людзей, жыцця найлепшы час *(Неп.).* 9. У творах Купалы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

часовае зліта з вечным, нацыянальнае — з агульначалавечым; у гэтым — яго сіла, і хараство, і веліч, і найвышэйшае права на водгалас далёкай і блізкай будучыні *(Пл.).* 10. Пасля таго як пабачыш, колькі зрабілі іншыя, колькі часу ідзе міма галоўнага ў нашым жыцці — творчай працы, ахвота да яе прыходзіць, здаецца, глыбейшая, больш свежая і трывожная (*Б.*). 11. Ён [Алесь] вярнуўся ў той час, у свой пачатак жыцця, калі мама была самая лепшая, калі ў гэтым не бывала найменшага сумнення, не бывала нават патрэбы думаць так і дзякаваць камусьці за ўсё гэта, калі было толькі шчасце, само яно — адно, адзінае — і ў ім, і навакол яго (*Б.*). 12. А праца — жыцця найгалоўная вось *(Панч.).* 13. У зборніку М. Багдановіча «Вянок» заплецены найпрыгажэйшыя краскі душы, успоеныя сокамі родных беларускіх долаў *(Пл.).* 14. Не толькі шчаслівай, а самай шчаслівай лічыла сябе Наталя *(Скр.).* 15. Сонца ледзьве скранулася з зеніту, але далёкі захад пераліваўся ўжо найтанчэйшымі адценнямі фарбаў *(Чыгр.).* 16. Есць нешта незвычайнае і невыказнае ў тым хваляванні, з якім ты набліжаешся да помнікаў народнай славы — да мясцін, звязаных з найбольш вядомымі, найбольш любімымі імёнамі (*Б.*). 17. Усё праходзіць, быццам дождж няроўны,— і боль, і злосць, і дробная брыда, а застаецца важны і галоўны і самы светлы талент — дабрата *(Грах.).* 18. Яны былі вельмі падобныя адна на адну, «канапляначка» і матка. У абедзвюх на тварах быў адзін добры, лагодны выраз, толькі ў Хадоські ён быў больш ясны, чысцейшы. І давер'я было больш у яе вачах, і каса была гусцейшая... *(І. М.).* 19. На поўначы, за полем, была суседняя, найбліжэйшая вёска, адкуль наша мама, дзе жыве яе малодшы брат, дзядзька Алесь *(Б.).*

**15. Сшшыце сказы, ад прыметнікаў, што ў дужках, утварыце адпаведныя формы ступеней параўнання.**

1. Маці з шафы дастае настольнік (добры), сэрцу да-рагі *(Панч.).* 2. Хоць і разлукі горкія былі, а толькі ўспа-мінаюцца сустрэчы і (шчаслівы) часы, што і цяпер зда-юцца нам вясною *(Грах.).* 3. Хоня таксама, хоць і здаваўся (спакойны) за бацьку, запаліўся спрэчкаю... (*І. М.).* 4. Дваццаць чацвёрты год пайшоў з той раніцы, а вось яна жыве, зноў ажывае ў памяці сэрца, як непаўторны, адзін з (светлы) момантаў жыцця *(Б.).* 5. На свеце (добры) кутка няма, чым той куток, дзе маці нарадзіла *(Пл.).* 6. Таму і смутак нам патрэбен, каб радасць (вялікі) была *(Я. С).* 7. У гэтым гуле, у гэтым сонцы, помніцца, сосны былі незвычайныя — мусіць (прыгожы) у маім жыцці *(Б.).* 8. Выходзячы ад Шабеты, поўная вялікай трывогі за Васіля, які зноў зрабіўся (дарагі) у свеце, Ганна раптам на ганку ўбачыла яго самога *(І. М.).* 9. Ночка цёмная глядзела ды (цёмны) стала, адна зорка мігацела, і тая прапала *(Куп.).* 10. Наталька ў вёсцы між сваімі (прыгожы) была *(Куп.).* 11. Была відная зімовая ноч, снег перастаў сыпаць, нібыта (ціхі) стаў вецер, трошкі марозіла *(В. Б.).*

**16. Запішыце магчымыя формы ступеней параўнання наступных якасных прыметнікаў. Ад якіх прыметнікаў утвараюцца толькі складаныя формы ступеней параўнання?**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Смелы, старанны, шчаслівы, сумленны, прыгожы, прынцыповы, гераічны, дакладны, карысны, складаны, вялікі, прыемны, таварыскі, бадзёры, задумлівы, сакавіты, гнуткі, смуглявы, агністы, лясісты.

**17. Запішыце сказы, дапішыце суфіксы і канчаткі прыметнікаў. Вызначце, у якіх граматычных катэгорыях дапасуюцца прыметнікі вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання да назоўнікаў (займеннікаў).**

1. У кожнага свае лясы, і ластаўкі, і песні, і жаночы голас ласкавы — яны мне найрадн... заўсёды *(Панч.)*. 2. Не шмат у каго з нашых паэтаў можна знайсці такую паслядоўнасць у выяўленні пачуцця найглыб... пашаны да роднай бацькоўскай зямлі, як гэта бачым у лірыцы В. Віткі *(Пл.)*. 3. Адна з найлепш... нашых паэм, «Сцяг брыгады», пісалася ваенным карэспандэнтам Аркадзем Куляшовым у франтавой зямлянцы (*Б*.). 4. З табою жылі мы дружна на гэтых шырокіх палях, з табою была мне праца лягч... і весял... *(Панч.)*. 5. Мы ў будучыню ідзём дарогай найясн... *(Зв.)*. 6. Падарожжы бліж..., з даўж... прываламі — над Свіцяззю ці Кроманню, над Нёманам ці Шчарай — заўсёды найраднейшае, што, як вада і хлеб, не прыядаецца ніколі *(В.)*. 7. Ён будзе глядзець за акно, каб не прапусціць ні аднаго кадра з найдзівосн... фільма прыроды *(Скр.)*. 8. Жанчына вясну прыручала, святл... куток выбірала, каб зазелянела галінка, счарнелая ад маразоў *(І. М.)*. 9. Валянцін Таўлай — змагар супраць пілсудчыны, пакутнік-вязень, выдатны рэвалюцыйны паэт — застаўся ў народнай памяці адным з яго найлепш... сыноў *(Б.)*. 10. Таго на кут, у каго мазалі цвярдз... *(Прык.)*.

**18. Запішыце сказы. Адкажыце, у якім склоне і з якімі прыназоўнікамі ўжываюцца залежныя словы пры формах вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання. Вызначце ролю часціц пры формах вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў.**

1. Паэт-воін вярнуўся ў свой горад, каб разам з іншымі былымі франтавікамі і партызанамі ўзняць яго з нябыту да жыцця, каб зрабіць яго яшчэ прыгажэйшым, чым ён быў да вайны *(Пл.)*. 2. Сястра настолькі старэйшая за мяне, што я прывык з маленства слухацца яе, амаль як маці (*Б*.). 3. Пятро адчуваў, нібы зрабіўся сталейшы за ўсіх сваіх сяброў, нават за тых, што старэйшыя за яго па гадах... *(Шам.)*. 4. Цяпер Алесь, успомніўшы свой сон, цяпло яе [маці] слёз на сваім халодным, аброслым твары, падумаў радасна, што пачуцці, якія ён сёння носіць,— куды мацнейшыя, можа, куды чысцейшыя, чым у маленстве *(Б.)*. 5. Жанчына была ў старэйшых ад Зазыбы гадах *(Чыгр.)*. 6. На старасці год я набыў настаўніка, хоць і маладзейшага за сябе, але які адкрыў мне радасць спазнання адвечнай маладосці і шчасця маленства *(Віт.)*. 7. Застаўшыся адзін, Лабановіч акінуў вокам пакоік свайго калегі. Кватэра гэта была многа лепшая ад яго кватэры *(К-с)*. 8. У той час я бачыў сам сябе куды ста-лейшым, чым бачу цяпер, з дыстанцыі пражытага *(Б.)*. 9. У нас, як быццам нейк неўпрыцям, апошнім часам вырасла і пасталела цэлая група маладых апавядальнікаў, роўных якім і лепшых за якіх не вельмі многа ў іншых братніх літаратурах (*Б*.). 10. Перад Казімірам была новая Наталя. Не, не новая, але такая, якой ён яшчэ не ведаў. Яна была яшчэ лепшая, яшчэ даражэйшая яму *(Скр.)*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**19. Высветліце, што абазначаюць якасныя прыметнікі, якія не маюць ні простых, ні складаных форм ступеней параўнання ( 1) стан асобы; 2) колер прадметаў або масць жывёл праз адносіны да іншых прадметаў; 3) знешнюю фізічную прымету; 4) утвораны** ад дзеясловаў; **5) з'яўляюцца складанымі прыметнікамі).**

Карычневы, серабрысты, вараны, жывы, жанаты, дарослы, васільковы, залацісты, ліловы, барадаты, вусаты, босы, няўхільны, сінявокі, цёмна-блакітны, светла-зялёны.

**20. Запішыце сказы, падкрэсліце такія прыметнікі, у якіх су-фіксы *-ейш-(-эйш-),* -ш- не надаюць значэння вышэйшай ступені па-раўнання.**

1. Брыгада вымушана была на золаку вярнуцца назад, заняць свае ранейшыя пазіцыі (*І. М.).* 2. Ён пільна летапіс чацвёрты піша год і спісвае ўсё ад слова і да слова з даўнейшых граматак пра долю Магілёва *(Багд.).* 3. Сам ён цяпер не паказваўся людзям на вочы, чакаючы далейшых падзей *(К-с).* 4. У бліжэйшы суботні вечар Лабановіч узяў курс на процілеглы бок сяла, дзе сярод прасторнага двара з агародам і садам стаяў вялікі і даволі прыгожы дом тутэйшага бацькі Уладзіміра Малевіча *(К-с).* 5. У наша купэ ўвайшлі два новыя пасажыры, два прыгожыя вайскоуцы — капітан і старшы лейтэнант *(Віт.).* 6. Сярод разведчыкаў самы высок! тытул у Смірнова — старшы сержант (7. *Н.).* 7. Па батарэі пранеслася чутка, што нас будуць пасылаць малодшымі камандзірамі ў іншыя батарэі, дывізіёны, нават некуды на поўдзень ці ўсход, дзе фарміруюцца новыя зенітныя часці *(Шам.).*

**21. Значэнне якой ступені параўнання маюць у рускай мове формы тыпу *сильнейшие, ближайшие (Наши шахматисты сильнейшие в мире)}* Перакладзіце сказы на беларускую мову, запішыце іх. Параўнайце ўтварэнне форм ступеней параўнання прыметнікаў у беларускай і рускай мовах.**

1. Бывает так, что нечаянному спутнику открывают то, что не открыл бы и лучшему другу *(Г. Николаева).* 2. В детстве все было другим. Светлыми и чистыми глазами мы смотрели на мир, и все нам казалось гораздо более ярким *(К. Паустовский).* 3. Ярче было солнце, сильнее пахли поля, громче был гром, выше трава *(К. Паустовский).* 4. Сережа видел ближайшую к окнам часть пола в первом этаже *(А. Фадеев).* 5. Муж хозяйки был моложе Филиппа Петровича лет на пятнадцать *(А. Фадеев).* 6. Видишь, что другие люди не боятся, и сам станешь посмелее *(А. Куприн). 7.* Чем угрюмее были тучи, чем холоднее дожди, тем свежее становилось на сердце, тем легче, как бы сами по себе, ложились на бумагу слова *(К Паустовский).* 8. Наталья Алексеевна бесстрашно делала операции, которые не решались делать и врачи-мужчины постарше и с большим опытом... *(А. Фадеев).* 9. Воспользовавшись жаркими прениями, где каждый считал себя умнее других и никого не слушал, Левинсон подменил план Метелицы своим — более простым и осторожным *(А. Фадеев).*

**22. Знайдзіце памылкі ва ўтварэнні і ўжыванні форм ступеней параўнання прыметнікаў. Выпраўце сказы і запішыце іх.**

**1.** Студэнцкія будаўнічыя атрады працуюць на такіх важнейшых аб'ектах горада, як стадыён «Дынама», гас-цініца «Планета», кінатэатр «Масква». 2.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пасля таго як вызначыліся восем мацнейшых каманд, яны былі разбіты на дзве групы. 3. Гул-гром, страшней ад кананады, пачули мы за трыццаць вёрст. 4. Для яго даражэй за ўсё на свеце — родны бацькоўскі кут. 5. Што можа быць вышэй і даражэй за гэтыя шчырыя словы ўдзячнасці? 6. У фондах музея сабраны лепшыя ўзоры жывапісу, скульптуры, керамікі.

**23. Запішыце сказы. У формах суб'ектыўнай ацэнкі і меры якасці выдзеленых прыметнікаў падкрэсліце суфіксы, вызначце, якое адценне яны надаюць.**

**1.** З *маленькага, малюпасенькага* зярняткі, якое іншы раз і разгледзець як след няможна, вырастав куст, а то і *высознае* дрэва *(Сач.).* 2. Хутка ўжо зоркі зірнуць *сіняватыя,* месяц пакрые палі палатном *(Багд.).* 3. З боку раз'езду чыгунка, пралёгшы спачатку *раўнюсенечкаю* сценкаю, праз вярсту рабіла залом і гублялася дзесь у лесе *(К-с).* 4. Сама веска стаяла на *невялічкай* палянцы сярод лесу і хмызнякоў *(К-с).* 5. Здзіўляюся ўсмешцы немаўляці, што цмокае губамі і гудзе, і прыгажосці *маладзенькай* маці, што прытуліла сына да грудзей *(Грах.).6.* Кастрычнік над іржышчам *танюткія* ніткі прадзе *(Зв.).7.* Лес зрэдку разрываўся *невялічкімі* палянкамі, па краях там-сям пападаліся старадрэвіны-хвоі, што пышна разрасліся на прасторы, або развіслыя *таўшчэразныя* дубы *(К-с).* 8. Нельга жорнам і часінку атрымаць для адпачынку, мелюць, мелюць суткі ў суткі, сеюць, сеюць дар *бялюткі (А. П.).* 9. *Ранюткі* час. Нідзе нікога. Між дрэў звіваецца дарога... *(К-с).* 10. Дымок *танюткі, белаваты* ўжо павіваецца над хатай *(К-с).* 11. Лягу з дарогі, а ты пры мне сядзеш, сядзеш, маю галаву ты пагладзіш, скажаш: «Які ж ты, які ж ты *сівенькі»* А я прыгадаю, як быў шчэ *маленькі (Бр.).* 12. У адну раніцу, яшчэ *халаднаватым* поцемкам, Курані ўзварушыліся, захадзіліся адным клопатам — на балота, касіць! (У. *М.).* 13. Ганна туліла да грудзей спавітае дзіця, хіліла да яго *чарнявую* галаву (*І. М.).*

**24. Спішыце сказы, вызначце склон прыметнікаў, падкрэсліце іх канчаткі. Якія варыянтныя канчаткі маюць прыметнікі жаночага роду ў родным і творным склонах адзіночнага ліку?**

I. Чужое зямлі нам не трэба, мы хочам, каб мірнае неба не знала пажараў вайны *(Бач.).* 2. Надзяліў нас мужнасцю нязломнай і мудрасцю высокаю Ільіч! *(Зв.).* 3. Будзеш ты свабоднаю навек), дарагая наша Беларусь! *(Панч.).* 4. Мяне зямля зямным шчадрыла плёнам: дарогай аржаной, хмурынкай ільняной *(Р. Б.).* 5. Мы з пароды мужнай, працавітай, гартавалі нас цяжкія бітвы *(Панч.).* 6. А як прыгожы пуцявінкі ў шаўках зялёнае травінкі! *(К-с).* *7.* Палескія раманы І. Мележа — адна з высокіх і сонечных вяршынь беларускай савецкай літаратуры *(Панч.).* 8. Гаварыў падлоўчы Баранкевіч добраю беларускаю моваю *(К-с).* 9. Шчаслівы, хто жыве пад зорамі Радзімы дарагое! *(Панч.).* 10. Ні сцюжа не палохае, ні спёка, не гнуся ад нялёгкае хады, хоць і адсталі ад мяне далека трывожныя юнацкія гады *(Грах.).* 11. За тыдзень добрае пагоды праходзіць, глухне касавіца *(К-с).* 12. Без дабраты не знойдзеш уначы крутое незнаёмае дарогі, каб чалавеку ў горы памагчы *(Грах.).* 13. Жней невядомых галасы ўсплывуць над постаццю сухою *(А. П.).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

14. Я душой прапісаны ў Мінску з даўняй, даваеннае пары *(Неп.).* 15. Клаліся на белых ручніках роднай нівы фарбы і адценні *(А. П.).*

**25. Запішыце, дапасуйце да назоўнікаў прыметнікі, канчаткі прьшетнікаў падкрэсліце.**

1. Не раз прыходзіў я з (далёкі) дарогі паслухаць звон тваіх (блакітны) хваль *(Панч.).* 2. Пахне хмелем і (дарожны) пылам, водарам (вільготны) раллі *(Грах.).* 3. Плыве над лугам, над вадою кліч (галасісты) трубы *(А. П.).* 4. На прывялай траве ў буданчыку ляжалі два (чырвонаармейскі) шынялі *(Чыгр.).* 5. Сталі сёння нашай (светлы) явай мары, запаветы Ільічовы *(М. Ш.).* 6. Наша барацьба за захаванне міру на Зямлі і наш савецкі патрыятызм у аснове сваёй чалавечныя, патрэбныя ўсім людзям (добры) волі *(Б.).* 7. Міканор паказаў на дзве (вялікі) вехі, пастаўленыя яшчэ зімой (У. *М.). 8.* Наўсцяж увесь прасцяг яднаў зарой бяссоннай, гарэў чырвоны сцяг над (партызанскі) зонай *(Р. Б.).* 9. Бяру ў прыгаршні (празрысту) вады — і сонца (трапяткі) у руках *(Панч.). 10.* Ты чуеш, дружа мой, як плачуць журавы над зарывай (асенні) журавін? Зіма (сцюдзёны) іх гоніць з (цёплы) хатак, ад (родны) ніў, ад (ціхі) ракі *(Панч.).*

**26. Запішыце сказы, падкрэсліце канчаткі прыналежных прыметнікаў. Вызначце, у якіх склонах яны маюць кароткую форму, а ў якіх — поўную.**

1. Хтосьці, выпадкова праходзячы, убачыў, што на тым месцы, дзе расла калісьці Скуратовічава рагатая дзічка, зямля была параскопвана і паразварочана рыдлёўкай *(К. Ч.).* 2. Ірынчын брат біў на вайне паноў, а Ірынка адна жыла ў горадзе *(К. Ч.).* 3. Няма нічога лепшага за раніцу ў матчынай хаце *(Кудр.).* 4. У маленькім Антосевым садку ў гэтую пару вясны было надзвычай хораша — белапенная квецень аздобіла кожнае дрэўца *(Хадк.).* 5. Я хачу, каб называўся камуністам родны сын мой, а таксама сынаў сын *(А. К.).* 6. Ужо як з хвойніку з'язджалі ў мокрыя, з лужынкамі, каляіны між гушчэчы алешніку, Ганна пачула, што ззаду хтосьці даганяе. Потым убачыла паблізу Васілёвага каня, самога яго (*І. М.). 7.* Васіль адарваў вочы, зірнуў на ўзлесак: конь мірна скуб траву, Валодзька гаманіў пра нешта з Чарнушкавых Хведзькам (7. *М.).* 8. У Алесевай памяці, нібы хваля на хвалю, то нагрувашчваецца, то зноў раскочваецца былое *(Б.).* 9. Пад звон-песню жывучых гусляравых струн для ўсіх папараць-кветка ўзыходзіць *(Куп.).* 10. З нецярплівасцю, з дзелавітай заклапочанасцю выглядвала Хадоська ў акно бацькавы сані, узрадавалася, замітусілася, калі ўбачыла знаёмага рудога коніка *(І. М.).* 11. Знайсці сваю радню аказалася куды лягчэй, чым я ўяўляў. Не прайшло і паўгадзіны, як я стаяў на ганку дзядзькавай хаты *(Сач.).* 12. Калі Сцепка бяжыць па вуліцы, яму кожны раз пападзецца на вочы гэтая Аленка, дачка Андрэева *(К-с).*

**27. Замест назоўнікаў, што ў дужках, запішыце адпаведныя прыналежныя прыметнікі, падкрэсліце іх канчаткі. Вызначце, з дапамогай якіх суфіксаў утварыліся прыналежныя прыметнікі; адзначце іх склон і асаблівасці скланення.**

1. Не было нічога дзіўнага ў тым, што надвячоркам, калі стала спадаць дзёнцая ліхаманка, людзей зноў па-цягнула да (Міканор) агеньчыка (7. *М.).* 2.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Уплыў на раз-віццё (Купала) таленту зрабіла, побач з літаратурамі рускай і ўкраінскай, літаратура польская *(Б.).* 3. Мы жылі як адна сям'я: (Патап) дзеці бавілі час у нас, мы — у Патапавых *(Сач.).* 4. І краўца, і Сцепуржынскага здзівіў тон (Несцяровіч) слоў *(К. Ч.).* 5. Такая і асталася Аксеня ў (бацька) памяці назаўсёды — вясёлая, прыбраная, гаварлівая і з густыміваласамі, якім, здаецца, цесна было пад улюбёнай яе стракатай хусцінкай *(К. Ч.).* 6. (Марылька) рэчы ляжалі на возе, а сама дзяўчына перад дарогай поўная была непакою *(Чыгр.).* 7. Як ён і прадчу-ваў, у той неспадзяванай гібелі начштаба была і яго, (Ляўчук), віна *(В. Б.).* 8. Аленка ведае такую мясцінку на сваім двары, адкуль можна добра пабачыць (Сцепка) двор *(К-с).* 9. Васіль прыслухаўся, што чуваць з (Чарнушка) двара, пачакаў, ці не пачуе (Ганна) голасу, але там было ціха (7. *М.).* 10. Задыхаючыся ад радасці, Алесь расказаў свой верш. І нават забыўся прызнацца, што склаў яго з (Марыля) Грышам удвух *(Б.).* 11. Далёкая родная музыка слоў — яна сама прыйшла наверх з глыбіняў (Алесь) памяці *(Б.).* 12. Хто б ведаў, што такі боль ляжа на (Алеся) сустрэчу з Рыгорам? *(Скр.).*

**28. Раскажыце пра ўжыванне ў беларускай мове прыналежных прыметнікаў. Якія словазлучэнні больш уласцівы беларускай мове: *ласка маткі* ці *матчына ласка, хата бацькі* ці *бацькава хата, кніга Сцёпкі* ці *Сцёпкава кніга, хустка Марынкі* ці *Марынчына хустка?***

**29. Замяніце ў словазлучэннях выдзеленыя назоўнікі роднага склону прыметнікамі. Вызначце суфіксы прыметнікаў, растлумачценапісанні з вялікай літары.**

Прэмія імя *Купалы,* стыль *Мележа,* паэма *Коласа,* дзённік *Толі,* хустка *сястры,* падарунак *дзядулі,* кніжка *Валі,* хата *старшыні,* лодка *Сяргея,* вочы *Аленкі.*

**30. Вызначце разрад выдзеленых прыметнікаў, зрабіце словаўтваральны аналіз іх.**

1. Прабілася хвойка з жывога зярняці на *стромкім* адхоне *пясчанай* касы *(Грах.).* 2. Тут пад гамонку хваль *дняпроўскіх* раслі за волю змагары *(Бр.).* 3. Які прастор для думкі *чалавечай,* які размах для *працавітых* рук! *(Зв.).* 4. Звон цымбалаў *былінны* чуюць сёння Памір і Эльбрус *(Бур.).* 5. Гэтай мовай простай і *зямной* з кож-най *чалавечаю* душой размаўляе сёння мудрасць веку *(Зв.).* 6. Ты вернешся аднойчы, як дамоў *вандроўны* сын да роднае матулі (*І. М.). 7. Рамонкавым* пылам і жытам даспелым павеюць на горад *начныя* вятры *(Грах.).* 8. Я люблю тэты *песенны* час — ціхі час *вечаровай* зары *(Панч.).* 9. Высокае неба ў *бяздонным* разліве блакіту *(Зв.).* 10. *Начны зінні* холад пачынаў прабіраць дзеда Талаша *(К-с).* 11. Праз некаторы час Пархвен Катлубовіч прынёс з *зарэчнага* мястэчка *Марылінага двухгадовага* сына *(К. Ч.).* 12. 3 гэтага лета застаўся ў іх на ўсё жыццё ўспамін *неабсяжнай, бязмежнай, бясконцай* радасці *(І. М.).* 13. Разуцца б і пайсці сцяжынкай — то *травяністай, лугавой,* то гладка ўбітай, *палявой (Вярц.).* 14. Жаўцеюць *раскідзістыя* люцікі, квола сінеюць *вастраверхія* зязюлькі *(Сач.).*

**31. Запішыце сказы. Устаўце ў прыметніках прапушчаныя літары. Растлумачце ўтварэнне прыметнікаў і правапіс суфіксаў.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. У кожным слове жыла любоў да краю, для ўсіх святога — радзімы Кастрычні...кага святла *(Р. Б.)*. 2. З Выбар...кай стараны Уладзімір Ільіч накіраваўся ў бок Смольнага *(Тк.)*. 3. У той летні вечар мы, саве...кія турысты,— згубіўшыся ў шматтысячным эмігран...кім на-тоўпе,— у адзіным масавым парыве спявалі магутную, як гімн, песню *(Б.)*. 4. Бранявік з Фінлян...кага вакзала! Мы стаім з пашанай ля цябе... *(Бр.)*. 5. Учора зноў успомнілася сустрэча з індзійскім студэн...кім зямляцтвам, сустрэча, што была чыстым, узвышаным святам пазнавання, агульнасці, дружбы *(Б.)*. 6. Пра славу былую шуміць Белаве...кая пушча *(Зв.)*. 7. Здалося, заіржалі глуха коні з тых Брандэнбур...кіх здымленых варот *(Я. С)*. 8. Я адкрыць хачу, як і ты, у жыцці, а не ў цудах казкі кантыненты людской дабраты, акіяны пяшчоты і ласкі (*І. М.)*. 9. З таемнай красаві...кае глушы зязюлямі гукалі пералескі *(Грах.)*.

10. Мы не забудзем гэту ноч на петрагра...кім рубяжы *(М. К.)*. 11. Ужо з першых класаў, з першых чытанак мы дазнаваліся пра Пары...кую камуну, з кніг глядзелі на нас партрэты герояў-камунараў, на ўсё жыццё запаміналіся прозвішчы — Варлен, Дэлеклюз, Дамброўскі *(Шам.)*. 12. А па зямлі ўсё сцелюцца дарогі — гасцінцы, магістралі, бальшакі — не для пакут, не для люд…кой трывогі — для радасці і шчасця на вякі *(Пл.)*. 13. Здавалася, стралкоў латы...кіх вечнай сдавай і сдавай партызан шумелі кроны дрэў *(Зв.)*.

**32. Перапішыце сказы, складаныя прыметнікі запішыце разам або праз злучок. Растлумачце, ад якіх часцін мовы яны ўтвораны.**

1. Месяц круглы ўстаў на небе, бліпічыць невысока, увесь чырвона/жоўты, быццам пугачова вока *(Багд.)*. 2. Тонкія цёплыя ручкі малой ужо абвіліся за Галіну шыю. Чорна/валосая галоўка сама схілілася на маміна плячо *(Б.)*. 3. На ўзлесках цвіў лілова/сіні сон і аддаваў мне ўсю сваю пяшчоту *(Н. М.)*. 4. Уверсе — блакіт, унізе — цьмяна/попельныя хмары *(Б.)*. 5. Вось і снежань. Вятры табуны бела/грывыя гоняць па бяскрайніх прасторах сцюдзёных палёў і аселіц *(Панч.)*. 6. З глыбінь пластоў зямных узняўся, нібы конь крылаты з грывай чорнай, доўга/чаканай нафты ўздыблены фантан *(Зв.)*. 7. Вострыя верхавіны цёмна/зялёных ялін і святлейшыя шапкі яшчэ болыц высокіх соснаў абліты яркім сонечным святлом *(Б.)*. 8. У навальнічнай цемрадзі бляск маланак быў бела/сіні, праГавіты, грымоты падалі і каціліся магутна і грозна (7. *М.)*. 9. Пятро зноў ляцеў да Сашы. Больш ён ужо не чакаў ні машыны, ні парахода, а проста з цягніка пабег па знаёмай дарозе, і трыццаці/кіламетровы шлях здаўся яму цяпер вельмі кароткім і прыгожым *(Шам.)*. 10. Бліжэй, адразу за агародамі, браліся кусты: круглыя кучаравыя — лазовыя і вастра/верхія, жаўтавата/ліловыя — бярэзнік і алешнік *(Кудр.)*. 11. Чарна/вокі, светла/валосы Юрась нават паўзці адразу не можа: падпаўзе трохі, сядзе і азіраецца. Як тут нова ўсё, як прыгожа! *(Б.)*. 12. Некаторыя маладыя дрэўцы пагнуліся пад цяжарам, прыпалі вяршынкамі да зямлі, утварыўшы сотні' бела/снежных арак, якім так і стаяць у лесе да самай вясны *(Лыньк.)*. 13. Грыбы сядзелі дзе па адным, дзе парам!, а дзе і цэлымі гуртамі. А самае цікавае, што гэта былі не бярозавікі, жоўтыя, як яечня, а чорна/галовыя, самыя лепшыя баравікі, якія растуць толькі ў сасонніках *(К-с)*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

14. Цёмна/карычневыя, нібы абпаленыя агнём, лісты сіратліва трапечуцца на дубах аж да самай вясны, пакуль не надыходзіць час ім саступіць свае месца новым, маладым *(Шам.).*

**33. Адзначце выпадкі поўнай ці частковай субстантывацыі прыметнікаў. Назавіце асаблівасці прыметнікаў, што перайшлі ў назоўнікі.**

1. Успомніў старую ў аўтобусе, на пыльным гасцінцы родных мясцін. Як яна ні з таго ні з сяго развязала чыстую белую хустку і пачала частаваць пасажыраў вялікімі чырванабокімі яблыкамі *(Б.).* 2. Шчаслівы той, хто ў сталасці сваёй ад душы дапамагае жыць прыгожа маладым *(Б.).* 3. Калі Апейка ехаў далей, побач ішло некалькі дзядзькоў, цётак, чародка цікаўных малых — праводзілі (7. *М.).* 4. Ловяць вушы радыёантэн пазыўныя ўсіх шырот дрыготкіх (*І. М.).* 5. Быць толькі сувязной ёй [Валі] надакучыла. Прыйшла ў атрад сама, на кухню не захацела, у санчасць — таксама, засталася байцом *(Б.).* 6. Успаміны пра даўняе бралі Апейку найчасцей, калі ён ехаў к роднай хаце *(І. М.). 7.* Ніхто не ведае, што яна [Наталя] ляжыць вось у гэтай белай палаце, у гэтым далёкім гарадку і памірае адна. А ў яе ж ёсць свае, родныя, сям'я *(Скр.).* 8. Хоць дзядзька наш не паляўнічы, ды меў ахвоту і да дзічы *(К-с).* 9. Ляснічы сам даваў намёкі — праз час не вельмі так далёкі ў другі куток перабірацца *(К-с).* 10. Валошын засцярожліва пазіраў па баках, гатовы да якой неспадзяванкі: усё ж ён быў тут адзін, а ці мала што магло падпільнаваць аднаго на перадавой уначы *(В. Б.).*

**34. Запішыце сказы. Вызначце, якой часцінай мовы — назоўнікам ці прыметнікам — з'яўляюцца выдзеленыя словы. Адзначце выпадкі, калі пры субстантывацыі прыметнікі змянілі сваё значэнне.**

1. Пра *былое* толькі згадкі. Прайшлі суровыя гады *(Бр.). 2.* А што, калі б бярозы апранулі зжаўцелае *былое* лісце і птушкі ўбор злінялы свой вярнулі? *(А. П.).* 3. На дубе маім, заслоненым лістотай, *дарослыя* буслы ці бусляняты стаялі нябачныя, моўчкі — я толькі здагадваўся, што яны там ёсць *(Б.). 4.* Яшчэ заўважылі ў Куранях, што пры такой непрыхільнасці да *дарослых* Хадоська аж дзіва гарнулася да дзяцей *(І. М.).*

5. З *мальті* ён размаўляў, як са *старымі,* і з імі радзіўся, спрачаўся — як роўны з роўнымі трымаўся *(К-с).* 6. Шкада было бацьку і матку, якія станавіліся ўжо зусім *старымі (1. М.).* 7. Мы добра ведаем, што такое фашызм, што такое мір, аплочаны крывёю і невычэрпнымі пакутамі *дарослых, старых і* дзяцей *(Б.).* 8. Накацілася на ціхія вуліцы мястэчка грозная і крывавая хваля, хваля вайны. Адступалі *чырвоныя.* Дні тры ў мястэчку панавалі белапалякі *(Лыньк.).* 9. І рукавіцы вязаныя помню. Хто іх, *чырвоныя,* звязаў? *(А. П.).* 10. Там, дзе *чырвоны* сцяг,— *рабочых* рук улада *(Р. Б.).* 11. На алешнікавым узгорку выбрал! месца, каб будаваць першы барак для *рабочых (К. Ч.).* 12. Мы былі ўжо людзьмі з пэўным *мінулым, перажытым,* людзьмі *маладымі,* ды сталымі *(Б.).* 13. Сядаючы на табурэт, Яраш падумаў, што ў большасці такіх цяжка *хворых* жанчын прыгожыя валасы *(Шам.).* 14. Каб не сустракац-ца позіркам з *хворай,* Яраш разглядаў свае вялікія, ад-беленыя спіртам і эфірам пальцы і слухаў даклад урача

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*(Шам.).*
15. Я тут спыню апавяданне, каб значны крок ступіць назад, жыццё *мінулае* крануць і ў цёмны кут яго зірнуць *(К-с).* 16. *Мінулае, перажытае* хвалюе мяне з новай сілаю *(Б.).* 17. Данік ішоў да станцыі, поўз да складаў, нёс па снезе *раненага* таварыша... *(Шам.).*

**35. Раскажыце пра ад'ектывацыю. Вызначце, ад слоў якой часціны мовы паходзяць выдзеленыя прыметнікі, назавіце іх граматычныя асаблівасці.**

1. Задрамлю, і, можа, зноў прысніцца, што прынесла з лесу аж сюды вечна маладая чараўніца прыгаршчы *гаючае* вады! *(Грах.). 2.* Сцяпан захапляўся спрытам Ганны, зачаравана лавіў удалыя, *калючыя* яе слоўцы — які ў яе дасціпны, востры язык! (7. *М.).* 3. Хто з гімнам на вуснах памёр, той сам, як той гімн, *неўміручы (А. К.)*4. Якая слаўная ты, селавая, вечна маладая і вечна *пявучая* раніца! *(Скр.).* 5. Адшумеў лістапад, адзвінелі дажджы, і зіма панагнала *пякучых* вятроў *(Панч.).* 6. Край вольны харашэе, але па ўсёй зямлі *балючыя* траншэі яшчэ не зараслі *(Р. Б.).* 7. Забаўлялася б, дурэла Ганна з малою цэлы дзень, каб *скрыпучы* голас старога Глушака не пазваў грэбці *(І. М.).* 8. За шырокаю *бліскучаю* дугою Піны ляжыць, як мора, неабсяжны прастор балотных зараснікаў, дзе ўсё згладжваецца, закрываецца роўнаю сцяною высозных чаротаў з бурымі мяцёлкамі *(К-с).* 9. На душы ў Ганны ўсе гэтыя дні было самотна і трывожна, не адыходзіў ціхі, *цягучы* жаль *(І. М.).* 10. Ратоўны дождж, прыйдзі хутчэй сюды і дай *гаючых* кропель, быццам доктар *(П. М.).*

**36. На аснове паказанага парадку марфалагічнага разбору прыметнікаў складзіце табліцу разбору. Па табліцы зрабіце разбор прыметнікаў з тэксту. Прыкладны парадак разбору прыметнікаў: 1) пачатковая форма; 2) лексіка-граматычны разрад; 3) поўны ці кароткі; 4) ступень параўнання (простая і складаная форма); 5) род; 6) склон; 7) лік; 8) форма ацэнкі і меры якасці; 9) назоўнік, да якога прыметнік дапасуецца; 10) сінтаксічная функцыя.**

І. Сярод старэйшых людзей у былой Заходняй Беларусі і сёння амаль не сустрэнеш чалавека, які б не ведаў імя Браніслава Тарашкевіча. Адны ўспамінаюць, што вывучалі родную мову па ягонай граматыцы; другім з даўніх год запала ў сэрца палымянае слова Тарашкевіча-дэпутата, сказанае ім на мітынгу, ці баявая антыўрадавая прамова ў польскім сейме; трэція сустракаліся з кіраўніком Беларускай сялянска-работніцкай грамады на суровых этапных шляхах панскіх астрогаў.

Мужны і таленавіты абаронца інтарэсаў працоўных, выдатны арганізатар мае, вучоны-патрыёт, чалавек вы-сокай культуры і абаяльнасці — такі быў слаўны сын беларускага народа Браніслаў Тарашкевіч, такі застаўся ён у памяці пакалення рэвалюцыйных барацьбітоў 20—30-х гадоў.
*(А. Ліс)*

## ГРАМАТЫЧНЫ СТАТУС ЛІЧЭБНІКА

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**1. Спішыце сказы. Вызначце семантычныя разрады лічэбнікаў, пакажыце іх сінтаксічную ролю ў сказе. Падбярыце аднакаранёвыя словы да тэрміна «лічэбнік». Параўнайце беларускую назву «лічэбнік» з рускай «имя числительное» і ўкраінскай «числівник».**

1. Два снегіры, дзве кропелькі зары — на мокрую га-лінку вольхі ўпалі *(Н. М.). 2.* Нарэшце пісьмо прыйшло: як выявілася, нейкія сто кіламетраў яно ішло пяць дзён *(Шам.).* 3. Колькі гадоў мінула з таго часу, як ён бачыў яе [маці] апошні раз? Два, тры або цэлая вечнасць? Але якім жывым і яркім паўстае яе вобраз!.. Улетку сорак першага года ён зноў наведаўся б дамоў, але грымнула вайна, і ў першы ж дзень яе Аляксей пайшоў на фронт *(Хадк.). А.* Гарадок чысты з прахалоднай, утульнай гасцініцай, з абраслай плюшчом і мальвамі чайной, з трыма азёрамі, якія ўсе відаць навокал гарадка з высокай замкавай гары *(Б.).* 5. Яна [Васіліна] чуе, як шасцяць вялізныя каласы жыта, у якіх, напэўна, не восемдзесят і не дзевяноста зярнят, як яна ўчора налічвала, а, можа быць, сотні, ды такіх буйных, што яна не можа надзівіцца на іх *(Хадк.).* 6. Дваццаць чацвёрты год я чытаю Панчанку, упарта лічу, што ён усё яшчэ як след не ацэнены і ў нас, і за межамі Беларусі *(Б.). 7.* Два высокія клёны каля гумна здаваліся сінімі і мокрымі *(К. Ч.).* 8. Хутка на двор уз'ехала трое саней *(Лыньк.).*

**2. Якімі часцінамі мовы з'яўляюцца аднакаранёвыя словы? Выпішыце лічэбнікі, вызначце іх разрад паводле значэння, семантычныя і граматычныя прыметы.**

Тры, трое, тройчы, тройка, трайны, трэці, тройня, па-трэцяе, траіцца; пяцёрка, пяцёра, пяцярня, пяты, пятак, пяцьсот, упяцярых; чатыры, чацвёрка, чвэрць, чвэртка, чацвёра, учатырох, учацвярых; восем, увасьмёх, восемдзесят, восемсот, увасьмярых, васьмёрка, васьмёра, восьмы.

**3. Якімі часцінамі мовы з'яўляюцца словы *пара, дзесятак, сотня, раз, мільён, мільярд, тысяча?* Складзіце і запішыце з імі сказы, назавіце семантычныя і граматычныя прыметы гэтых слоў.**

**4. Растлумачце ўтварэнне лічэбнікаў *адзінаццаць, дванаццаць, пятнаццаць, дзевятнаццаць; пяцьдзясят, восемдзесят, шэсцьдзесят; дзвесце, трыста, пяцьсот, шэсцьсот, дзевяцьсот.* Да якога структурнага разраду адносяцца гэтыя лічэбнікі ў сучасных школьных падручніках?**

**5. Запішыце лічэбнікі ў наступным парадку: а) уласна колькасныя, б) дробавыя, в) зборныя, г) парадкавыя. Пры спісванні лічбы замяняйце словамі.**

Другі, дзясяты, васьмёра, сёмы, дзясяцера, васьмідзя-сяты, двое, дзявяцера, трое, пяцёра, шасцёра**,** 8, 890, 39, 90, 40, 900-ы, 0,1, 1,5, 600, 96, 152-гі, **,** 999, 1979-ты, 2010-ты, 48, 4/6, 876-ты, 14, 18, 11, 28,3, 667, 27,2, 128-ы.

**6. Спішыце сказы. Падкрэсліце зборныя лічэбнікі. З назоўнікамі якіх семантычных труп яны спалучаюцца? Вызначце сінтаксічную функцыю колькасна-іменных спалучэнняў.**

1. Двое ці трое сяброў, шчырасць павольнай размовы, вецер з лугоў і бароў, сіні дымок сасновы *(Панч.).* 2. Пераезд сціх. За лініяй чыгункі ў траншэі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

стаілася яго чацвёра абаронцаў *(В. Б.).* 3. Двое сутак, як хлопцы ў паходзе *(К-с).* 4. На другой фурманцы сядзела двое мужчын, адзін з іх быў за фурмана *(Хадк.).* 5. У яе [Ганны] двое дзяцей, а муж у арміі *(Шам.).* 6. Атрымалі мы васьмёра коней з воінскай часці *(Кр.).* За купамі аголеных кустоў мітусіліся хлапчукі школьнага ўзросту. Было іх пяцёра *(К.с).* 8. На возе сядзела чацвёра маладых хлопцаў *(Хадк.).* 9. Праз хвіліну яму ўжо добра было відаць, што ідуць двое людзей *(К Ч.).* 10. Абодва хлопцы, убачыўшы Аляксея і азірнуўшыся па баках, прыветліва ківалі яму *(Хадк.).*

**7. Якія з наступных назоўнікаў могуць спалучацца з лічэбнікамі *тры* і *трое,* якія — толькі з адным з іх? Запішыце колькасна-іменныя спалучэнні з гэтымі лічэбнікамі.**

Суткі, брат, сястра, хлопчык, боты, сын, сані, акно, рабочы, коні, дзверы, школьнікі, куры, гусі, рэчы, стол, кніга, ручка, студэнт, верабей, птушка, вёска, дзеці, студэнтка, настаўніца, дзяўчынка.

**8. Складзіце і запішыце сказы з лічэбнікамі *два, дзве, абодва, абедзве.* Праскланяйце (пісьмова) колькасна-іменныя спалучэнні з гэтымі лічэбнікамі. Раскажыце пра скланенне лічэбнікаў *паўтара, паўтары.* Праскланяйце (пісьмова) спалучэнні *паўтара кіламетра, паўтары гадзіны.***

**9. Праскланяйце (пісьмова) колькасна-іменныя спалучэнні. Растлумачце асаблівасці скланення састаўных колькасных і парадкавых лічэбнікаў.**

651 чалавек, 273 студэнты, 559 школьнікаў, 895 кіламетраў, 1979 год, 53 дзень.

**10. Утварыце і запішыце колькасна-іменныя спалучэнні лічэбнікаў *тры, пяць, дзесяць, дваццаць, сорак два, дваццаць пяць, пяцьсот пяцьдзясят пяць* з назоўнікам *кніга* ў назоўным, родным, творным склонах, вызначце тып сінтаксічнай сувязі.**

**11. Спішыце, замяніце лічбы словамі, назоўнікі пастаўце ў адпаведнай форме. Растлумачце сінтаксічную сувязь лічэбнікаў з на-зоўнікамі.**

5 (студэнт), 2 (тыдзень), 3 (чалавек)., 233 (вучань), 32 (сані), 44 (дзверы), 64 (кілаграм), 3 (цяля), 14 (ягня), 18 (курыца), 181 (тона), 3 (літр), 32,3 (цэнтнер), абедзве (родная сястра), 4 (зімовы дзень), 45,5 (гектар), 3/5(кілаграм), 1 1\2 (літр), 38,7 (цэнтнер), 12 1\4 (кіламетр).

**12. Спішыце сказы. Словы, што ў дужках, пастаўце ў адпаведнай форме. Падкрэсліце колькасна-іменныя спалучэнні, вызначце склон лічэбніка і назоўніка. Растлумачце асаблівасці дапасавання прыметнікаў да назоўнікаў у колькасна-іменных спалучэннях з лічэбнікамі *два, тры, чатыры.***

1. Дзве (рыбацкі) вёскі, у якіх жывуць дзед Вячэра і ўнучак яго Міхась, разлучаны вялікай вадою (*Б*.). 2. Дзве (дзявочы) постаці мільганулі на фоне лугавой зеляніны *(Хадк.).* 3. Там, дзе сыходзіліся дзве (лясны) сцяжынкі, дзе згрудзіліся махнатыя елкі, было ціха, утульна *(Лыньк.).* 4. Тры (высокі) кучы жыта, пшаніцы і ячменю выраслі пад павеццю *(Хадк.).* 5. Паабапал ракі дзве (чыгуначны) будкі *(Луж.).* 6. Ужо, відаць, пад поўнач выгнутая дугой траншэя сяк-так злучыла пяць (стралковы) ячэек *(В. Б.). 7.* Дваццаць (гарачы) дзён мы смаглі ў паходзе ад спёкі *(Хвед.).* 8. Зося моўчкі пачала аглядаць:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кухня і тры (невялікі) пакоі *(К. Ч.).* 9. Машыны спыніліся, і далей уніз пайшлі танкі — тры (грукатлівы, сталёвы) аграмадзіны *(В. В.).* 10. Нечакана наляцеўшы, сем (невядомы) коннікаў згрудзіліся, спыніліся *(Лыньк.).* 11. Нават у сне бачыліся тыя расцяробы і печышчы, дзе правёў не адну, а (цэлы) дзве (доўгі) зімы... *(Чыгр.).* 12. Сонца пазалаціла тры (вялізны) дубы, што стаялі тут жа, на ўскрайку поля *(Лыньк.).*

**13. Спішыце, растлумачце, як перадаецца прыблізная колькасць.**

1. Гады са два таму назад мы пазнаёміліся з ім [Максімам] бліжэй, у Мінску, на вечары ў нашага агульнага друга *(В.).* 2. Малады чалавек, які, аднак, быў гадоў на пяць старэйшы за Пятра, сур'ёзна і паважна, з усведамленнем уласнай годнасці, працягнуў руку... *(Шам.).* 3. Дуб пражыў у лесе гадоў трыста, не меней *(Чыгр.).* 4. Да горада было кіламетры тры-чатыры *(Лыньк.).* 5. Падышло чалавек з восем *(Хадк.).* 6. Яр быў метры чатыры ў шырыню, метраў пятнаццаць-дваццаць глыбінёю, а ў даўжыню цягнуўся метраў на шэсцьдзесят *(Каратк.).* 7. Хат за дзесяць ад калгаснай канторы бялеў свежы зруб з незакончанай страхой *(Хадк.).* 8. Дзядзька ішоў не адзін,— чалавек іх ішло з пятнаццаць *(В.).* 9. Яны яшчэ прайшлі далей, Фішар ужо трымаўся побач, і Карпенка скоса разы два зірнуў на яго *(В. В.).* 10. У пярэдні пакой выйшаў малады яшчэ чалавек, гадоў, можа, за дваццаць *(Чыгр.).* 11. Янукевічу было гадоў пад пяцьдзясят *(Хадк.).* 12. Непадалёку, крокаў за пяць ад дарогі, паміж дзвюх бяроз, якія вылучаліся сваёй бяростай сярод хвойных дрэў, стаялі чырвонаармейцы з вінтоўкамі *(Чыгр.).* 13. Пячора была досыць вялікая: метры тры на тры і вышынёю каля двух метраў *(Каратк.).* 14. За паўкіламетш адсюль была веска. А збоку, крокаў якіх за дзвесце/зноў былі відаць кусты *(Чыгр.).*

**14. Спішыце сказы. Прасачыце, як абазначаецца няпэўная, недыферэнцыраваная колькасць. Вызначце граматычныя і семантычныя асаблівасці няпэўна-колькасных слоў.**

1. Зямля Беларусі! Мы знаем — нямала загінула ў бойках адважных сыноў *(Бр.).* 2. Жыві, мілы Колас, многа летаў, зімаў з ясным сонцам побач на зямлі радзімай *(Куп.).* 3. Многа, ой многа дарог у жыцці *(К-с).* 4. Успомніў яе [матчыны] рукі... Колькі яны, тыя рукі, перарабілі ўсякай работы — перадаілі кароў, перапалолі град, акапалі бульбы! *(Сан.).* 5. Зямля Беларусі! Тваімі шляхамі вярнулася ворагаў мала дамоў *(Бр.).* 6. Шмат гора і пакут выпала на долю ўсіх бароўцаў: і тых, хто стаяў тады ў тым натоўпе і бачыў, як займалася агнём, гарэла вёска, гарэла тое, што нажывалася гадамі нялёгкае сялянскае працы, і тых, хто быў на фронце, і тых, хто партызаніў *(Сач.).* 7. Некалькі чалавек у парусінавых спяцоўках і форменных фуражках стаялі ля ўвахода *(Хадк.).* 8. Восень. Пара адцвітання. Колькі красы, колькі смутнага, ціхага хараства ў тваім чароўным, маўклівым задуменні *(М. З.).* 9. Астап паспеў тут шапнуць Піліпчыку некалькі слоў *(Лыньк.).* 10. Наша з музаю вяселле шмат гадоў гуло-грымела *(Пл.).* 11. У яго [Астапа] было ў запасе шмат гісторый: пра ласёў, пра тое, як перахітраваў ён аднаго разу мядзведзя... *(Лыньк.).* 12. Прасядзелі колькі часу ў насцярожанай цішыні *(Чыгр.).* 13. Усё ж, думаў я, пакідаць родных, усіх, з кім гэтулькі гадоў жыў, нядобра *(Сач.).* 14. Некалькі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тыдняў за працай прайшлі, і Лену пазвалі аднойчы на сход *(Бр.).* 15. Хутка прынеслі ўвесь багаж з-пад вываратня: дзесяць парашутаў, некалькі чамаданаў *(Лыньк.).*

**15. Спішыце сказы, вызначце, якой часцінай мовы з'яўляецца слова *адзін.* Прачытайце ў «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» (у 5-ці т. – Мн., 1977-1984) пра гэта слова, яго значэнне.**

1. Бач, бусел адзін стаіць хмуры,— яго аднаго ўсе неяк забылі, адзін ён не змесціўся ў шнуры *(Куп.).* 2. І часта да мяне то адным, то другім, то яркім, то ярчэйшым наплывам, вяртаецца тая ваенная раніца — з меднастволымі соснамі ў сонцы паэзіі, з грозным і справядлівым гулам гармат, з маім, на ўсё жыццё глыбокім хваляваннем *(Б.).* 3. Ішлі пераважна пажылыя... Аднаго высокага мужчыну падтрымліваў падлетак *(Хадк.). 4.* Коні былі падабраны адной вараной масці, сытыя, шпаркія, і здава-лася, людзі ехалі спецыяльна, каб пахваліцца і сваімі коньмі і ўласным выглядам *(Хадк.).* 5. «То як жа быць? — спытаў Антоні: — Давай, брат, думаць, хоць сягоння ці так ці сяк, каб даць параду і к аднаму ўжо прый-ці ладу» *(К-с).*6. Падаў ліст. Адзін. Падаў павольна, пакратваўся і пакручваўся, бы развітваючыся з нажылым месцам *(Пташн.). 7.* Тры партызаны, адзін з якіх паранены і толькі адзін з канём,— вось і ўсё, што засталося ад разведкі іх атрада *(Б.).* 8. Толькі снег адзін бялее, у шэрань лес адзеты *(К-с).* 9. Усе глядзелі і глядзелі на гэты сцяг. Адны цьмяна здагадваліся, што і да чаго тут, другія не інакш, як ведалі, трэція ўспаміналі гады свайго юнацтва *(Хадк.).*

**16. З выданняў перыядычнага друку выпішыце дзесяць сказаў з лічэбнікамі, вызначце іх семантычны і структурны разрад.**

**17. Спішыце, замяніце лічбы словамі. Зрабіце марфалагічны аналіз лічэбнікаў у наступным парадку: 1) пачатковая форма; 2) лексіка-граматычны разрад (колькасны, парадкавы); 3) структурны разрад (просты, складаны, састаўны); 4) для колькасных — склон; 5) для парадкавых — род, лік, склон, назоўнік, да якога лічэбнік дапасуецца; 6) сінтаксічная функцыя.**

У Беларусі больш за 9 мільёнаў 500 тысяч чалавек. З іх беларусаў 7 мільёнаў 286 610 чалавек. У вайну, вы ведаеце, загінуў кожны чацвёрты жыхар рэспублікі... Было ператворана ў попел 9 200 вёсак. 706 з іх —разам з людзьмі. І 187 засталіся неадноўленыя. Акрамятаго знішчана 209 гарадоў і пасёлкаў... Беларусь нездарма называюць краінай класічнай партызанскай барацьбы. Партызанаў было тут 374 тысячы. Падпольшчыкаў каля 70 тысяч чалавек...

Наша Беларусь займае 207,6 тысяч квадратных кіламетраў, больш, чым Балгарыя, больш, чым ЧССР, чым Венгрыя, чым Партугалія, Грэцыя, і больш, чым Бельгія, Галандыя, Данія і Люксембург разам узятыя. Працягласць нашай радзімы з поўначы на поўдзень 560 км і з усходу на захад 650 км.

*(У. Караткевіч)*

## ГРАМАТЫЧНЫ СТАТУС ЗАЙМЕННІКА

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**1. Спішыце сказы, падкрэсліце займеннікі, вызначце іх разрад па суадносінах з іншымі часцінамі мовы (абагульнена-прадметны, абагульнена якасны, абагульнена-колькасны).**

Зноў для кожнай травінкі я свой на мілай бацькоўскай зямлі (*Бур.).* 3. Кожны пісьменнік, якія б ён ні ствараў эпапеі, паэмы, драмы, апавяданні, вершы, усё жыццё піша адну-адзіную кнігу, у якой гаворыць чытачу толькі свае запаветнае слова *(Б.).* 4. Той дзень прапаў і страчаны навекі, калі ты не зрабіў таго, што мог *(Панч.).* 5. Не лічыў я, колькі гімнасцё-рак за гады ваенныя знасіў *(А. П.).* 6. Знаю: няма таго зелля, што хоць на міг ад тугі па Айчыне вылечвае *(Бур.). 7.* Няясныя вобразы ўсплывалі самі сабою, аб чымсьці казалі і клікалі невядома куды, а на сэрцы аставалася адчуванне ўтраты чагось далёкага, чаго ўжо не вернеш ніколі *(К-с).* 8. Той домік нізкі нехта любіў, з тым домікам звязаны нечы лес *(Вярц.).* 9. Ты ўзышла на ганак новай школы, ты гэтым дзецям блізкая, свая і ўжо сябе не лічыш навасёлам, бо тут твой дом і тут твая сям'я *(Грах.).* 10. Трэба нам кожны дзень адчу-ваць прысутнасць сяброў, не спазняцца са шчырай спагадай да іх... *(Б.).* 11. Ты ў такім шчаслівым узрос-це, калі сэрца не знае злосці, калі ўсё яшчэ наперадзе — і дарогі, і маеты, калі ўсё на тым беразе, а на гэтым— толькі ты *(Вярц.).* 12. Мы, не памятаю ўжо, колькі чалавек з нашай разведкі, заехалі вунь туды, у тое зялёнае бязмежжа, рассядлалі і пусцілі коней, а самі паснулі ў цяньку *(Б.).* 13. Нічога не збіраю, не таю, не берагу на чорны дзень і свята, а ўсё, што ёсць, да кроплі аддаю і тым шчаслівы і багаты *(Грах.).* 14. Якая гэта ні з чым не параўнаная краса душы — ча-лавечая сціпласць! *(Скр.).*

**2. Спішыце, падкрэсліце займеннікі, адзначце ў дужках іх граматычныя катэгорыі: для абагульнена-прадметных – склон, абагульнена-якасных — род, лік, склон. Вызначце сінтаксічную ролю займеннікаў у сказах.**

1. Вырас тут усім я — родны, і родны мне тут кожны кут! *(Бр.).* 3. Хоць я ніколі не знайду сваіх слядоў і хісткай кладкі, а ўсё ж лячу к свайму гнязду, к свайму адзінаму пачатку! *(Грах.).* 4. Не пакідай мяне, трывога, будзь спадарожнікам маім! *(А. П.).* 5. Хто так гулка стукаецца ў дзверы? Гэта ты, пасланнік поля — хлеб *(П. М.).* 6. Я прыехаў пажыць у родным свеце майго маленства і маладосці, пажыць са сваімі людзьмі, пра якіх мне заўсёды найлепш пісалася *(Б.).* 7. Паволі, перамагаючы нечаканую слабасць у нагах, Ляўчук устаў з свае лаўкі і пайшоў да пад'езда. Хваляванне ахапіла яго за ўсё разам: за тое даўно ім пражытае, за ягоную радасць і ягоныя страхі, за свае, якое-ніякое, а ўжо пражытае жыццё, за сустрэчу, да якой ён імкнуўся трыццаць гадоў *(В. Б.).* 8. Асоба самога прыезджага хутка была высветлена, бліжнія ад Міканора пазналі, а хто не пазнаў, быў далека — пачулі, што прыезджы не хто іншы, а старшыня райвыканкома Апейка *(І. М.).* 9. Рабіць штосьці добрае таму, хто ўжо ніколі табе не падзякуе,— гэта і сумна, і радасна па-асаб-ліваму *(В.).* 10. Гэтак я і памятаю яго, Кузьму Чорнага: у вечным разгадванні людзей — іх аблічча, характару, лесу, каб пасля жывыя абрысы іх пераносіць у свае кні-гі *(Скр.).* 11. Кожны чалавек — гэта толькі свой, асаблі-вы, нідзе не паўтораны вобраз, толькі свой, ні на каго не падобны духоўны свет *(Скр.).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

12. Зямля мая! На кожным кіламетры — журба і боль гранёных абеліскаў... *(Н. М.)*.

**3. Запішыце сказы, падкрэсліце асабовыя займеннікі, вызначце іх асобу і склон. Пакажыце адрозненне займеннікаў 3-й асобы ад займеннікаў 1-й і 2-й асоб.**

Я ўпершыню так далека ад родных мясцін. І ты мне прабачыш, аміка, калі я раптам заплачу... Гэта — ад радасці, што ёсць на свеце мая пяшчотная, працавітая, мужная Беларусь!..

А ты ўяві цяпер — хоць на момант — варанёную сталь кінжальнага штыка перад грудзьмі тваёй старэнькай маці...
І ты зразумееш тады, як працавіты і лагодны чалавек ператвараецца ў чалавека страшнага, няўмольнага ў сваёй справядлівай суровасці.

Такіх людзей гісторыя назвала народнымі мсціўцамі, а нашу ціхую Беларусь — краінай класічнай партызанскай вайны.

Вораг ведае, што гэта значыць. І сёння старыя, недабітыя генералы Птлера гавораць пра наш незразумелы для іх «фанатызм». Бачыш, аміка, яны незадаволены, ім выгадней было б іншае... Яны змаглі б пасля... ды і цяпер яшчэ могуць падагнаць пад любы параграф любой міжнароднай умовы смерць нашых маці і нашых дзяцей — як стратэгічна неабходную, а нашу свяшчэнную помету фашызму — як юрыдычна беспадстаўную...

*(Я. Брыль)*

**4. У значэнні і марфемнай структуры асабовых займеннікаў роднага склону *нас, вас* і прыналежных *наш, ваш* ёсць агульнае. Чым растлумачыць іх падабенства? Прачытайце пра гэта ў кнізе Ф. Янкоўскага «Гістарычная граматыка беларускай мовы» (Мінск, 1989).**

**5. Запішыце сказы. Вызначце значэнне займеннікаў *сам* і *самі* ў сказах. Падкрэсліце канчаткі гэтых займеннікаў і растлумачце іх правапіс, адзначце асаблівасці націску ў іх.**

I. 1. І які харошы, шырокі, прывабны і поўны хвалявання быў свет ад тых кніжак — простых, напісаных моваю, самаю блізкаю сэрцу! *(Скр.). 2.*. Ад сябе самога не схаваешся, ад сябе самога не ўцячэш *(Ланч.).* 3. Людзі хочуць, каб званні І славу не давалі нікому дарма... Людзі маюць на гэта права, ім дала яго праўда са ма *(Бур.).* 4. Было лета, самая зялёная пара яго. Зялянелі гароды, палі, балоты (*/. М.).* 5. Ад самага красавіка надвор'е спрыяла людзям. Было багата цяпла, і ў час паілі зямлю спорныя дажджы *(І. М.).* 6. Лабановічу стала шкада гзтага няскладнага, сарамлівага і, відаць, здольнага хлопца. У самым тоне яго просьбы гучаў боль чалавечай душы *(К-с).* 7. І ўжо да самае станцыі сябры ішлі моўчкі, замкнёныя ў сабе саміх *(К-с).* 8. Таратайка пракацілася па дарозе ўскрай балота, паўз самы лес і стала каля Міканоравага надзелу (*І. М.).* 9. Бачыць самога сябе з вялікай адлегласці бывае вельмі прыемна, бо бачыш не проста самога сябе, а сябе найлепшага, без памылак-грахоў і балючых дакораў сумлення *(Б.).*

**6. Прачытайце, пастаўце зваротны займеннік *сябе* ў адпаведным склоне.**

*1.* Што ні кажы, а жыццё, ужо само па ёсць ра-дасць, вялікае шчасце, бясцэнны дар *(К-с). 2.* Марына працавала не адрываючыся, каб не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

перашкаджаць ні ні Собічу *(Скр.).* *3*. Лабановіч пачуў, што на душы ў яго неспакойна. То тое, то другое пачынала забіваць душу, адцягваць і раскідваць яго ўвагу, і ён як бы падзяляўся на асобныя часткі, якія не мелі цеснай сувязі між ... *(К-с).* *4*. Спачатку любіла Галя адна, баючыся сама ... прызнацца ў тым *(Б.).* *5*. І раптам убачыш ... на лужку. Лужок гэты невялікі, але роўны-роўны, як стол *(Сач.).6*. Адно вазьмі яго з усюды пойдзе за табою, і ўсё забудзе, усё даруе, на дзядзьку больш не засярдуе *(К-с).* *7*. Антось глядзеў і пацяшаўся і ціха сам ... смяяўся *(К-с).* *8*. Патрабавальны да І. Мележ і ў другіх цаніў перш за ўсё талент, працавітасць, сумленнасць, прынцыповасць *(Панч.).*

**7. Спішыце, падкрэсліце няпэўныя займеннікі, вызначце іх склон. Растлумачце, ад якіх займеннікаў і з дапамогай якіх прыставак і постфіксаў яны ўтвораны.**

1. Можа, свет і любім мы за тое, што ў стрыечнай блізкасці жывём. Штосьці свойскае і штось людское ў гэтых дрэў, камення і жывёл *(А. П.).* 2. Мучыць і тры-вожыць сумленне, і баліць душа мая, бо спадзяваўся — нехта дапаможа, і не падумаў: «А чаму не я?» *(Грах.).* 3. Усё ж яшчэ штось засталося ўнукам з прадзедаў жыцця... *(Куп.).* 4. І раптам нешта цёплае нахлынула на сэрца, агарнула яго ціхаю радасцю з нейкім невыразным смуткам *(Лыньк.).* 5. Уражаны, захоплены бачаным, я ні пра што не думаў, толькі глядзеў, баючыся чаго-небудзь не заўважыць... *(Сач.).* 6. І ўсё, што ён бачыў, было дзіўна сагрэта Ганнінай блізкасцю, яе стомленым дыханием, нечым цёплым, незразумелым, што паявілася ў гэты вечар (У. *М.).* 7. Цяпер трэба было як-небудзь павініцца перад людзьмі, паказаць, што яна [Ганна] не абы-хто, што яна шануе сваю славу, людзей і людскія звычаі (*І. М.).* 8. На гэтай палянцы, за паўвярсты ад дарогі, раскінулася чыясь пасада *(К-с).* 9. Сцёпка доўга стаяў, любуючыся горадам, і нейкае новае адчуванне калыхала яго, прыцягвала да гэтага горада і ў той жа час палохала і непакоіла *(К-с).* 10. Я так хацела б, каб і мне здагадліва агеньчык нечае душы спагадлівай выра-тавальна ў вочы зазірнуў *(Н. М.).* 11. Магутны, мяккі, як гэта ноч, тэнар пачаў з нейкіх асабліва патаемных, глыбокіх тонаў *(Каратк.).* 12. Не дзіва было, што і яшчэ адзін нечы сын назваў яе святым для ўсіх і ўсюды словам *(Б.).*

**8. Запішыце сказы. Вызначце, да якога разраду (адносны, пытальны, няпэўны) належаць выдзеленыя займеннікі, адзначце іх склон. Абазначце каранёвыя элементы займеннікаў *хто, што* ў назоў-ным і ўскосным склонах.**

1. Я глядзеў на ўсіх тых, з *кім* рос, на вачах у *каго* прайшло мае маленства, і ледзь-ледзь пазнаваў, *хто* перада мною *(Сач.).* 2. Сапраўдны друг прыходзіць і тады, калі ад грому трэскаецца неба, калі няма *каму* падаць вады ці падзяліцца чэрствай лустай хлеба *(Грах.).* 3. Ганна папрасіла Васіля ласкава: «Я хутка паснедаць *чаго* зраблю. Прыходзь. Добра?» (*І. М.). 4*. Праз *колькі* дзён Зося трымала Славу на руках пры выездзе з горада: яна чакала грузавой машыны з будаўніцтва *(К. Ч.).* 5. І дзень, і два верамейкаўцы ўсёй вёскай стаялі на скры-жаванні дарог, пільнавалі чырвоных коннікаў — можа, раптам *хто* і свой трапіцца *(Чыгр.).* 6. *Хто* сказаў — вада без паху, *хто* сказаў — вада без смаку? Той, відаць, не смяг у спёку і ад смагі ў суш не млеў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*(Я. С).* 7. Толь-кі таму, *хто* любіць свой народ, народ раскрывае свае векавыя таямніцы *(Б.).* 8. *Што* гэта звініць, Хатынь? *Што* значаць яны, твае званы? *(Вярц.).* 9. Хіба *што* зраўняецца з сэлцам людскім у гневе, у ласцы, у шчырасці? *(Пл.).* *10.* Словы поўныя той высокай пяшчотнасці, на *якую* эдольныя толькі сапраўдная сіла і мужнасць *(Б.).* *11.* Праз *якую* хвіліну і каня, і конніка па-глынула цемра *(Каратк.).* 12. Быў абмен кнігамі, ціхі роздум над імі ў хатняй адзіноце, была перапіска, а по-тым зноў сустрэчы — тое, без *наго* было б сумна і цяжка жыць *(Б.).* 13. А цяпер у яго такое пачуццё, нібы не хапае *каго* ля цябе, з *кім* можна, як з самым найбліжэй-шым, самым дарагім таварышам падзяліцца і горам, і радасцю... *(Лыньк.).* 14. У дарогах знаёмяцца легка, най-больш за ўсё тыя, *хто* любіць заглянуць у незнаемы свет чужой душы *(Скр.).*

**9. Запішыце, раскрыйце дужкі, вызначце склон займеннікаў.Падкрэсліце адмоўныя займеннікі, растлумачце іх утварэнне і правапіс.**

1. (Ні) хто з нас не мае права дый не зможа стварыць для сябе нейкі ціхі аазіс, нейкае сховішча, куды не прыйдуць трывогі часу. (Ні) хто не мае права хавацца ад абавязку барацьбы са злом *(Б.).* 2. 1 расце, і расце, і шырэй, і шырэй узрастае камунараў сцяна, што сабой прыкрывае народы, не зламалі яе (ані) якія буры, нягоды *(Бр.).* 3. Ціхата навокал якая! Мір! Ні (ў) кога (ні) хто не страляе *(Я. С).* 4. А для салдат, чые навек закрыты вейкі, няма ўжо дат, (ні) якіх дат *(Панч.).* 5. Ён ведаў, што болей не ўстане, апошнія злічаны дні. Чаму ж (ані) хто не загляне з вялікай і мілай радні? *(Пл.).* 6. У кожнага чалавека ёсць патрэба абавязкова раскрыц-ца перад другім. Без гэтага няма чалавека, без гэтага ён — (ні) што *(Скр.).* 7. (Ні) хто так дзецям не спагадае, як матка родная *(Прык.).* 8. (Ні) чога асаблівага не было ў гэты вечар, але памяць пра яго грэла і трывожыла іх потым многія гады *(І. М.).* 9. У парыве пяшчоты, спачування, што ў момант залілі ўсю яе, не помнячы (ні) чога, (ні) аб чым не думаючы, нібы падхопленая хваляй, кінулася Ганна да Васіля (У. *М.).* 10. Лабановіч глянуў ёй у вочы, у гэтыя акруглыя цёмныя і такія слаўныя, выразпыя вочы, на яе чорныя тонкія бровы, якіх ён не бачыў ні ў аднае дзяўчыны, ні (ў) кога на свеце *(К-с).*

**10. Спішыце, падкрэсліце займеннікі, вызначце іх разрад, склон, асаблівасці скланення. Назавіце варыянтныя канчаткі займеннікаў у родным і творным склонах адзіночнага ліку. Звярніце ўвагу на суплетывацыю асноў пры скланенні займеннікаў.**

1. Край бацькоўскі, раўнінна-гарысты, аніколі цябе не мінеш, ты лістом, ты расінкаю чыстай і дымком сваім сэрца кранеш *(А. П.). 2.* У нас усе бары і ельнікі — музеі славы несмяротнай *(Пл.).* 3. У спрэчках хлапцоў і ў песнях дзявочых мне чуецца голас далёкіх сяброў *(Грах.).* 4. Хоць і разлукі горкія былі, а толькі ўспамінаюцца сустрэчы і самыя шчаслівыя часы, што і цяпер здаюцца нам вясною *(Грах.).* 5. Прывітанне табе, незнаёмаму, неспакойнаму падарожніку, якому здарыцца падумаць, адпачыць і на маёй невялічкай рацэ!.. *(Б.).* 6. Так ён [Пархвен] перабраў усю вуліцу і, гнучыся, уцягваючы галаву ў плечы, рушыў назад да свае хаты *(К. Ч.). 7.* З'явіся, новы дзень, пачаткам новым і юны свет адкрый перада мной *(А. П.).* 8. Лес гэты ішоў сюды ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

самае Бесядзі, што падзяляла мясцовасць на лясную і бязлесную *(Чыгр.).* 9. Дзе столькі разгону для твае жвавасці, для твайго спрыту, для тваіх забавак, як не на касьбе! *(К-с).* 10. Дзе б ты ні быў, якой бы ні была я і кім бы для цябе ні стала я — хай над табою ластаўкай крыляе, хай *беражэ* цябе любоў мая *(Н. М.).*

**11. Раскажыце пра пераход слоў іншых часцін мовы ў займеннікі і займеннікаў — у іншыя часціны мовы. Вызначце, якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы.**

1. Ляўчук пачуў блізкія галасы і конскі тупат. Па голасе нібыта *нашыя,* але хто ведае — можа, і немцы або паліцаі *(В. Б.).* 2. Не суджана было Грыбаеду ўбачыць нікога са *сваіх.* Не ведаў ён, што жонку яшчэ ў першыя дні закатавалі фашысты, а дзяцей некуды вывезлі *(В. Б.).* 3. Дачуўся я, што *нашы* за Эльбаю, і падаўся туды, да *сваіх (Сач.). 4.* У *адным* з мінскіх паркаў узвышаецца бронзавы хлопчык з вялікай гранатай ва ўзнятай руцэ *(Б.).* 5. *Які* раман можна было б напісаць пра братоў Гарэцкіх! Пісьменнік і вучоны. Два лёсы, цяжкія і прыгожыя *(Б.).* 6. О, *колькі* мы не напісалі вершаў, сапраўдных вершаў пра сваіх сяброў! *(Бур.). 7.* Тры пісьменнікі не змаглі ў нас па-сапраўднаму разгарнуць свае крылы, не сталі тым, чым стаць маглі б,— Багдановіч, Гарэцкі, Чорны. *Колькі* яны сказалі б пра свой народ, *колькі* далі б народу і чалавецтву!.. *(Б.).* 8. І хоць не *ўсё* паўторыцца на свеце, я веру ў гэты лес, я веру ў сад, дзе чысціню вясны нясуць суквецці праз кожны свой барвовы лістапад *(А. П).* 9. Дзівак-чалавек... Са стратаю непа-праўнаю не мірыцца ён *нізашто ў* жыцці *(Вярц.).* 10. Лета, *навошта* так рана нам расставацца з табою? *(Неп.).* 11. Каса станавілася *ўсё* цяжэйшая, рукі наліваліся ўтомаю *(І. М.)* 12. Было выразна чуваць, як недзе працаваў кулямёт... Пасля пачуліся моцныя выбухі. Тады і прыйшло радаснае ўсведамленне: блізка *свае (Чыгр.).* 13. Чалавек падступіўся бліжэй, сказаў: «Але *нешта я* не пазнаю цябе» *(Чыгр.).*

**12. Складзіце табліцу разбору займеннікаў паводле прыкладнага яго парадку: 1) пачатковая форма; 2) разрад займенніка па суадносінах з іншымі часцінамі мовы; 3) лексіка-семантычны раз-рад; 4) граматычныя катэгорыі: для абагульнена-прадметных — склон (для асабовых — склон, асоба); для абагульнена-якасных — род, лік, склон; 5) сінтаксічная функцыя. Зрабіце марфалагічны разбор займеннікаў з тэксту па гэтай табліцы.**

...Кузьма Чорны пахадзіў па пакоі, як бы нешта ўспамінаючы. Падышоў да стала, стаў перад разгорнутаю кнігаю Бальзака... Я ведаў, што гэта было яго новае глыбокае захапленне.

-- Вялікі пісьменнік. Тут, братачка, нічога не скажаш. Увесь падыспад выверне табе. Усё ўбачыш.

А праз колькі хвілін дадаў:

-- От каб з такою сілаю напісаць пра гісторыю нашага народа!

І ён пачаў гаварыць, што гэта вельмі ўдзячная і патрэбная тэма. Колькі тут нікім не кранутага, найбагацейшага матэрыялу! На працягу доўгіх вякоў наша краіна з'ўлялася скрыжаваннем чужых захопніцкіх інтарэсаў. Хто толькі меў сілу — усе гаспадарылі тут, паліваючы нашу зямлю крывёю і потам простата

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чалавека... А народ жыў і змагаўся, шукаў праўды, дамагаючыся яе непакорствам, бунтамі, паўстаннямі, уцёкамі ў чужыя земли Наша зямля поўная касцей, крыжоў, курганоў і крыўды. А народ такі выжыў. Пра гэта проста нельга не пісаць...

-- Калі б гэта хто знайшоўся ды напісаў вось такую мастацкую энцыклапедыю ўсяго таго, што рабілася на нашай зямлі. Тут трэба не адна якая кніга, а многа ра-манаў, каб умясціць усе галоўныя этапы гісторыі аж да нашых дзён...

*(Я. Скрыган)*

## ГРАМАТЫЧНЫ СТАТУС ДЗЕЯСЛОВА

**1. Ахарактарызуйце дзеяслоў як часціну мовы. У славянскіх мовах існуюць наступныя назвы гэтан часціны мовы: у беларускай — дзеяслоў, рускай, балгарскай і сербскахарвацкай — глагол, украінскай — дієслово, польскай — czasownik, чэшскай і славацкай — sloveso. Адкажыце, што легла ў аснову гэтых назваў.**

**2. Назавіце часціны мовы, акрамя дзеяслова, якія абазначаюць дзеянне. Пакажыце, што маюць агульнае і чым адрозніваюцца паміж сабой наступныя словы.**

Малаціць — малацьба; змагацца — змаганне; зялёны, зелень — зелянець; цёмны, цёмна, цемра — цямнець; светлы, светла — святлець; добры, добра — дабрэць; гучна — гучнець; белы, бела, бель — бяліць.

**3. Вышішыце са сказаў дзеясловы па лексічных трупах (канкрэтнае фізічнае дзеянне, стан, абстрактнае дзеянне, змена прыметы ці стану і г. д.).**

1. Перарабіў ён працы мноства, вядома што: касіў, араў... А што такое за геройства—ніколі ён і не ўяўляў *(Бр.).* 2. Калі завея слепіць вочы, калі паводка рве маеты, званіце мне і днём, і ўночы, пішыце спешныя лісты *(Грах.).* 3. Эшалон ішоў на павароце. Вагоны дробненька гойдаліся, ляцелі, нібы за нечым гналіся ці баяліся адстаць *(I. М.).* 4. Дзед Талаш расчуліўся *(К-с).* 5. Садовіч пайшоў далей адзін, а Лабановіч звярнуў з дарогі і накіраваўся на маленькі хутарок, што стаяў адінока ў полі недалёка ад Немана *(К-с).* 6. Сакратар райкома, малады і рухавы хлопец, нібы разгубіўся *(Лыньк.). 7.* Задажджылася раптам на цэлыя суткі *(Б.).* 8. Дзядзьку ў рыбе шанцавала *(К-с).* 9. Перасякаючы гэты круг, з поўдня на поўнач плыў Неман *(Б.).* 10. І паплёўся старэнькі дахаты растрывожаны, злосны такі *(Бяд.).* 11. Куды жывецца вееялей, калі сябры навокал *(Бр.).* 12. Зямля абмытая дыміцца *(Панч.).* 13. З кожным днём жыта бялее ўсё больш і больш *(Хадк.).* 14. Вось з-за рачных заваротаў выплываюць рыбакі са сваімі снасцямі; сур'ёзныя, павольныя постаці. Селянін-гаспадар шыбуе з таго берагу, з душагубкі звешваюцца махрастыя пукі чароту і жмуты жорсткай асакі. Гоніць чайку грабец *(К-с).*

**4. Выпішыце з урыўка дзеяслоўныя формы ў наступным парадку: інфінітыў, спрагальныя формы, дзеепрыметнікі, дзеепрыслоўі. Вызначце іх сінтаксічную функцыю.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Шахцёрскі дом адпачынку, дзе мы сёння начавалі, стаіць на ўзбоччы зялёнай гары. Доўгачаканы дождж пакрапіў, відаць, толькі на досвітку. Бледнае сонца — за павалокай, бо ад дажджу, што не праліўся як след, неба зацягнула светла-журботнай воблачнасцю.
Птушкі гоманам робяць вясну.

Новая зяляніна дрэў, у якіх бярозку бачу — як родную на чужыне.

Слухаючы вясну, якое ў нас, у Мінску, пазаўчора яшчэ не было, гледзячы на яе, дыхаючы ёю, успамінаю тых сяброў, што калісьці прынеслі сюды вызваленне, тут закончылі цяжкі, крывавы паход. А пра таго з маладзейшых, што часта бывае тут і нямала зрабіў для дружбы нашых літаратур, згадваю з намерам — дома спытацца, як ён пачаў любіць Балгарыю.

Унізе, пад нашай гарою, на вялікай паляне, ад мяне завешанай сеткаю лістоты, чуваць — спяваюць дзеці. Пад акардэон.

Незнаемы балгарскі калега, з якім мы прывіталіся на сцежцы, сказаў, што там рэпетыцыя «фальклорнага свята», якое хутка пачнецца.

*(Я. Брыль)*

**5. Спішыце сказы, падкрэсліце дзеясловы адной рыскай, словы, якімі кіруюць,— дзвюма, словы, якія прымыкаюць да дзеясло-ваў,— хвалістай.**

**1.** Рыбалоўства на Беларусі было спрадвечна *(Каратк.).* 2. Красу прыроды хлебароб адчувае інакш, паўней, чым яе староннi назіральнік *(Б.).* 3. На гары на крутой, на абвітай ракой, лет назад таму сотня ці болей, белы хорам стаяў, недаступнай сцяной грозна, думна глядзеў на прыволле *(Куп.).* 4. Над калгаснаю пасекай з самага рання распагодзіўся неба прастор сіняваты *(М. Т.).* 5. Над стрэхамі хат вывіваюцца лёгкія празрыстыя дымкі *(Скр.).* 6. Парыпваюць старыя елкі глуха, ля вокан ходзіць вецер баравы *(Бур.). 7.* Я твае абышоў дарагія прасторы, і лугі, і палі, дзе, як маці, спрадвек ты з людзьмі, Беларусь, так ласкава гаворыш, звоніш звонам бароў, пералівамі рэк *(Бач.).* 8. Клапот нямала і ў салдата, не дрэмле ў ночы ён і ў дні, каб тая, скуль ён выйшаў, хата стаяла заўжды ў цішыні *(Бр.).* 9. Ціха свішчуць крылы позняй слонкі, лесавік падпальвае карчы; з камарынай *талакою* звонкай салаўі спрачаюцца ўначы *(М. Т.).* 10. Далёка адступіла мора, у грудзі хваляў вецер б'е, галосіць і без дырыжора, не замаўкаючы, пяе *(Грах.).* 11. Сябрам ківаю галавою, развітваюся з балылаком, сцяжынкай вузкай палявою спяшу дадому пешаком *(Бур.).*

**6. Выпішыце са сказаў спрагальныя формы дзеяслова, у дужках запішыце адпаведны інфінітыў.**

1. Сонца грэе, колас спее. Каласіста спелай ніве нізка кланяецца жнівень *(Я. П.). 2.* Усё растала ў пасмах белых, аглух трывожных чаек крык, знікае пад нагамі бераг, і карабель на рэйдзе знік *(Грах.).* 3. Чую, як міжзорныя ракеты пралятаюць недзе нада мной *(М. Т.).4.* Гаспадыня распытвала: і куды едзем, і ці не пажывём у яе, як некалі, і чаму гэтак доўга не завітвалі *(Янк.).* 5. Калі ж вяршыні іх гайдаюцца ад ветру, кожная сасна сабе, калі іх шум пяе, густы і дужы, высокую, вольную песню,— тады ўспамінаецца, вось як цяпер, вячэрні хор на вуліцы роднай вёскі *(Б.),* 6. Далека недзе грукатала неба. Чорны вяз яшчэ дрыжаў пад ветрам, быццам скідаў маланак сотні тон, ніяк не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

верачы, што ён такую ўстояў навальніцу і ацалеў *(Бач.).* 7. Калі мы ў прасторы выходзім вясною, у грудзях нязменна такое чуццё: як добра за плугам ісці баразною; спявае, красуе навокал жыццё *(Бр.).* 8. У гэты навальнічна-магутны рокат дзвюх музычных стыхій задушэўна ўпляталіся песні пра слуцкіх прыгонных ткачых, пра Нёман, быстры і чысты, як быццам з расы, пра юнака, што памірае ўтурме, пакідаючы любы свой край у пакуце, пра ясную крынічную ваду, што плешчацца ў залаціста-сасновых вёдрах прысухісуседачкі *(Б.).* 9. На купалле там птушка садзіцца, пяе, у пилипаўку воўк нема вые; сонца днём распускае там косы свае, ночкай зоры глядзяць залатыя *(Куп.).* 10. Калі наш незвычайны госць — бабёр — параўняўся з намі, я зацокаў яму языком. І ён нырнуў, нават пляснуў па вадзе пранікам тлустага хваста. Знік пад люстранай, растрывожанай роўняддзю *(Б.).*

**7. Спішыце сказы, падкрэсліце інфінітыў, вызначце яго сінтаксічную функцыю.**

1. На пагорку стаіць і яшчэ дрэмле вятрак, але, здаецца, ён ужо сіліцца ўзмахнуць паднятымі крыламі *(Скр.).* 2. Восень веццe сухое зграбла і на ўзлессі падпаліла пагрэцца начлежны касцёр *(М. Т.).* 3. І ўрэшце Юрку асвяціла думка — пайсці да цёткі Тарэсы і там заначаваць *(К-с).* 4. Юста ціхенька сядзіць каля печы, голасу яе не чуваць, бо маці не дазваляе ёй ні песні заспяваць, ні громка гаварыць *(К-с).* 5. Алёша падаў знак падрыхтавацца *(К-с).* 6. Ваш абавязак — рабіць сваю справу *(Гал.).* 7. Адвакат запісаў адрас Лабановіча, абяцаў неўзабаве зрабіць усё, што трэба і што можна зрабіць, а потым аб усім паведаміць *(К-с).* 8. На стале было што есці і піць *(Янк.).* 9. Сінім снежным ад-вячоркам Грыбок хадзіў ад акна да акна па сяле, загад-ваў ісці ў Ігнатаву хату на сход (7. *М.).*

**8. Выпішыце з тэксту дзеясловы, якія маюць форму цяперашняга часу, падкрэсліце аснову. Утварыце ад асновы дзеясловаў цяперашняга (будучага простата) часу ўсе ўжывальныя ў беларускай мове формы.**

I. Добрая, гуманная, высакародная і вельмі патрэбная навука экалогія, якая вывучае, аналізуе ўзаемаадносіны чалавека і прыроды. Яна папярэджвае чалавецтва ад небяспечных крокаў і ўчынкаў, якія могуць выклікаць непапраўныя вынікі, вывучае жыццё раслін і жывёл і ўплыў дзейнасці чалавека на іх. Так, усё ў прыродзе знаходзіцца ў раўнавазе, усё адно ад другога залежыць, адно на другое ўплывае. І толькі чалавек, які выключыў сябе з біялагічнага ланцужка, парушае гэту раўнавагу. Будзь разумны, чалавек! — заклікае экалогія.

II. А прыгледзьцеся да свірэпы, той самай свірэпы, што быту не дае нашым палаводам: полюць, паляць, ірвуць, труцяць, чысцяць — а яна расце. Толькі зевані — поле жоўтае будзе, як засеянае. Да чаго ж жывучая яна, гэта свірэпа! З якой настойлівасцю, з якой упартасцю ваюе за свае права быць сярод культурных раслін, быццам настойліва нагадвае хлебаробу: адумайся, што ты робіш, ты ж памыляешся, адкідаючы мяне. А я ж магу даць і корм для жывёлы, і цудоўнае масла свірэпічнае, мёд. Ды ці толькі? Пасябруй са мной, змяні свой гнеў на літасць, і я цябе азалачу.

*(М. Лобан)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**9. Выпішыце з тэксту інфінітывы, падкрэсліце аснову. Утварыце ад асновы інфінітыва (або ад асновы прошлага часу) усе формы.**

Прыйдзе час, калі трэба будзе асвойваць тундры і горы, ацяпляць Запаляр'е і драбіць скалы, не толькі безаглядна спажываць дары акіяна, але і выдаткаваць сродкі на ўсё большае і большае развіццё акіянічнай гаспадаркі, памагаць акіяну вырошчваць кармы для рыб, займацца селекцыяй, планаваць прыплод рыб — адным словам, абжываць акіян. Усё гэта патрэбна будзе рабіць чалавеку. Не сёння, не. Сёння чалавек яшчэ можа падвоіць і патроіць ураджай сельскагаспадарчых культур. Але ўжо ў тумане не такой далёкай перспектывы праглядвае патрэба чалавека ў новых сродках, новых жыц-цёвых адсеках для здабычы дадатковай біямасы. Падлічана, што агульнапланетарны фотасінтэз здольны праду-цыраваць штогод 83 мільярды тон біямасы раслін. Гэта лічба — не мяжа, яна можа быць павялічана, але не бязмежна. *(М. Лобан)*

**10. Выпішыце спачатку пераходныя дзеясловы, потым — непераходныя. Вызначце, чым абумоўліваецца іх пераходнасць — непераходнасць (лексічным значэннем, сінтаксічнай спалучальнасцю, асаблівасцямі суфіксальнага ці прыставачнага ўтварэння, наяўнасцю постфікса *–ся).***

Надышоў 1905 год. Сутычкі з паліцыяй, хваляванні сялян. 18 кастрычніка на прывакзальнай плошчы Мінска тысячы людзей сабраліся на мітынг. Губернатар Курлоў нехаця вызваліў палітзняволеных. Але адначасова да вакзала сцягнулі войска. Пачаўся «курлоўскі расстрэл». 80 чалавек забіта, 300 паранена. У адказ — стачка пратэсту.

Барацьба вялася па-рознаму. З'явіліся і «добраахвот-нікі свабоды». Сярод іх асабліва цікавай асобай быў Аляксандр Савіцкі (1888—1909). Быў выключаны з рэальнага вучылішча за рэвалюцыйныя погляды. У час 1905 года ўдзельнічаў у рэвалюцыі, агітаваў, распаўсюджваў літаратуру, агітаваў у Магілёве ісці на гарадскую турму, удзельнічаў у Мінску ў дэманстрацыі, у Чарнігаве арганізаваў рабочы клуб. Калі рэвалюцыя была разгромлена, калі рэвалюцыянеры адступілі ў падполле, забастоўкі пачалі спыняцца, а сялянскі рух быў прыдушаны, і наступіла сталыпінская рэакцыя, Савіцкі, стыхійны бунтар-народалюбца, стаў на шлях «партызанскай» барацьбы.

Сабраў атрад у 200 чалавек, падзяліў яго на некалькі невялікіх дысцыплінаваных груп. У яго ўсюды былі сябры. Пра кожную аблаву і экспедыцыю ён ведаў загадзя. Нападаў на маёнткі і банкі, а грошы раздаваў бедным сялянам, беспрацоўным, пагарэльцам. Да жорсткіх прыгнятальнікаў народа пісаліся лісты, і, калі тыя не адумваліся, расправа не прымушала доўга чакаць.

Акруга на трыста вёрст, ад Оршы да Украіны, калацілася ад яго імя і блаславуляла гэтае імя чатыры гады. Ні памешчык, ні стражнік, ніхто не смеў пакрыўдзіць беднага.

*(У. Караткевіч)*

**11. Выпішыце пераходныя дзеясловы, падбярыце да кожнага з іх як мага больш слоў — прамых аб'ектаў.**

1. Лабановіч ішоў і ўзіраўся ў цемру, каб не прамінуць гасцінца, бо дзесь тут ён павінен перасекчы чыгунку *(К-с)*.2. Цемра надавала краявіду панурасць: толькі агеньчыкі, што гарэлі, не гаслі ўдалечы, весялілі вочы (*І. М.)*. 3. Прамчала ластаўкаю лета, шукаю кве-цені дарма, і ты сама, нібы ракета, мільгнула, знікла — і няма *(Бр.)*. 4. Цудоўнаю красою здзіўляе Мінск мяне *(Я. П.)*. 5. Дык што ж мяне клічаш, дарога, заўсёды? Дык што ж мяне вабіш ты новаю казкай? *(Маш.)*. *6.* Слуп агню прарэзаў апраметную цемру *(Каратк.)*. *7.* Насця зморана апусцілася на лаўку, паклала абедзве рукі на край стала, нібы ёй самой цяжка трымаць іх *(І. М.)*. 8. У той далёкай маладосці шумелі нашыя сады, і мы, спыніўшыся на мосце, угледзелі свае сляды *(Грах.)*. 9. Загорскі супакойліва гладзіў малога па галаве, і той хутка засынаў **(У.** *М.)*. 10. Хіба я на свеце знайду пекнату, як тут, на маёй Беларусі? *(Бр.)*.

**12. У лінгвістычнай літаратуры марфему *-ся* называюць па-рознаму. Запішыце гэтыя назвы з вядомых вам беларускіх і рускіх дапаможнікаў для ВНУ, з лінгвістычных слоўнікаў. Якая з іх, вы лічыце, больш прыгодная, дакладная?**

**13. Спішыце сказы, падкрэсліце зваротныя дзеясловы, у дужках запішыце, калі магчыма, адпаведныя незваротныя. Вызначце, пераходныя ці непераходныя гэтыя незваротныя дзеясловы.**

1. Галіне дома не сядзелася. Хацелася пабыць адной, пастаяць на халаднаватым марскім ветры, падумаць, праясніць галаву, у якой блыталіся ўстрывожаныя думкі, калі можна, супакоіцца (*І. М.)*. *2.* Сястра, я рад з табою сустрэцца *(Я. П.)*. 3. Калі сонца паднялося вышэй, на зямлю сышла гарачыня *(І. М.)*. 4. Снуюцца думкі рой за роем *(К-с)*. 5. Дзівіўся дз,ядзька тут нямала, ідучы тунелем да вакзала *(К-с)*. 6. Вальс іграе баян на тары за ракой, весяляцца студэнты пад зоркай сваёй *(А)*. *7.* Цяпер Сялібе ясна ўсё было: вярнуліся ваўкі ў Чырвоны Лог *(М. Т.)*. 8. Чуць, як хістаюцца хвойныя нетры, як там купаюцца дрэвы ў паветры *(А. К-)*. 9. Сцелецца красавіковых травінак зялёны дымок *(Зв.)*. 10. Як лагодная усмешка, заяснелася неба на ўсходзе, заяснелася і паружавела *(К-с)*. 11. Мы знаёміліся не толькі з пражскімі музеямі і новымі жылымі кварталамі *(І. М.)*. 12. Мне б вятрамі прычасацца, паружовіцца ў заранкі, сцежкай той падпаясацца, што прыводзіць да каханкі *(Бр.)*.

**14. Спішыце сказы, падкрэсліце дзеясловы, якія ўжываюцца толькі як зваротныя (reflexiva tantum). Па гістарычным слоўніку («Материалы...» І. І. Сразнеўскага) праверце, ці ўжываліся выдзеленыя дзеясловы як незваротныя, якое значэнне яны мелі ў старажытнай мове.**

1. Прывёз хлопец з-пад Рагачова ў кулундзінскія палі сямейку саджанцаў вішнёвых, каб тут дужэлі і раслі, каб караніліся трывала на новай вуліцы сяла *(Грах.)*. *2.* Цёмная восеньская ноч глядзіцца ў шыбы, ціха *слязіцца* дажджом *(Лыньк.)*. 3. Туды, дзе арлы гняздзяцца горныя, дзе сонца ўсміхаецца з вышыні, сэрца ляціць мае непакорнае, прагнучы чысціні *(Вяр.)*. 4. Клубіўся туман над дагчынай і ўзнімаўся купчастымі шатамі над рачулкай, над мостам *(Лыньк.)*. 5. Расце, лапушыцца позняя капуста *(К. Ч.)*. 6. Раннія пасевы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дружна набіралі сілу, кусціліся, гусцелі і былі не на многа горшыя, чым у суседа *(Шам.).* 7. «Міхась Кдрылавіч будзе сталавацца ў нас»,— сказаў Сяргей, каб дапоўніць знаёмства *(Шам.).* 8. Паміж палёў буяў вер ас і купчасціўся ядловец *(К. Ч.).* 9. Хоць нашы хлопцы і не думалі любавацца прыродай, але мімаволі спыніліся перад такім хараством і моўчкі пачалі азірац-ца *(Я. М.).* 10. Эх, выйдзі ў поле, брат, да свету: не бу-дзеш *каяцца* ніколі *(К-с).* 11. Тая воля, на якую Тарас спадзяваўся, загуляла ў буйным стэпе, сонцам абвілася *(Куп.).* 12. Старыя палешукі, сустракаючыся, пачціва кланяліся *(К-с).* 13. Усе ведалі, што Хоня заляцаецца да Ігнатавай Хадоські, жаніх, можна сказаць *(І. М).* 14. Баяцца я не баюся, няхай падпальшчыкі знаюць, нябёсам маёй Беларусі дарэмна яны пагражаюць *(А. К.).*

**15. Да дзеясловаў *баяцца, ленавацца, старацца, слязіцца, ручацца, гняздзіцца, застацца* запішыце з перакладных слоўнікаў адпаведнікі ў рускай, украінскай, польскай, чэшскай, балгарскай мовах. У якіх славянскіх мовах гэтыя адпаведнікі зваротныя дзеясловы, а ў якіх — незваротныя? У якіх мовах яны маюць тое самае значэнне, а ў якіх — іншае?**

**16. Спішыце сказы, у дужках пакажыце значэнне зваротных дзеясловаў (уласна-зваротнае, узаемна-зваротнае, агульна-зваротнае і г. д.).**

І. 1. Пакуль ён [Мікола] апранаўся, мыўся халоднай вадой і выціраўся ручніком — стары сядзеў каля стала і гаварыў *(Б.).* 2. Цэлымі гадзінамі капаецца Лабановіч у школьных кнігах, паперах, прыводзіць у парадак школьную маёмасць *(К-с).* 3. Сыпаўся дробны і мёрзлы снег *(К. Ч.).* 4. Бронька сядзеў на бярэзіне і падхарошваўся *(Луж.).* 5. Глушакі збіраліся ехаць з двара, калі сонца толькі пачало выплішчвацца з-за цёмнага лесу *(І. М.).* 6. Ідучы, настаўнікі дзяліліся сваімі ўражан-нямі, навінамі, і гаворка іх часта перарывалася дружным смехам *(К-с).* 7. І крапіва маладая стрыкаецца, быццам пяшчотны, прыемны ўспамін *(Р. Б.).* 8. Сябры шчыра абняліся. Блізка году яны не бачыліся і за гэты час значна змяніліся *(К-с).* 9. Лабановіч слухае і дзівіцца, як многа рэвалюцыйнага запалу ў гэтай смуглай дзяўчыны *(К-с).* 10. І панёсся стройнай мовай чуткіх струн удалы звон *(К-с).* 11. Сняжок [голуб] балюча дзёўбаўся і біўся крылом *(Б.).* 12. Гні, пане, дрэўца, покуль гнецца *(Гл.).* 13. Барсучаняты вырываліся, нават кусаліся *(Я. М.).* 14. Жанчына спалатнела, збянтэжылася *(К. Ч.).* 15. І хоць яшчэ сонца не выкацілася з-за лесу, а ўсё было відаць, як удзень *(Янк.).*

ІІ. 1. Лета хутка імчалася, быццам у сне *(А. К.).* 2. Павел мыўся на кухні і на поўны голас расказваў Зарыне пра паездку *(Шам.).* 3. Але нядоўга Маша радавалася сваім участкам *(Шам.).* 4. Міхал сабраўся, апрануўся і ў лес павольна пацягнуўся *(К-с).* 5. Будавацца было цяжка, але Антось быў майстар на ўсе рукі *(Луж.).* 6. А пойдзеш у Ліпава лясамі, напэўна стрэнешся з ласямі *(К-с).* 7. Лабановіч, сказаць праўду, гневаўся напанну Ядвісю *(К-с).* 8. З барабанам-звонам ходзіць ён [мароз] шляхамі, барадой калючай шчыплецца да слёз *(Бр.).* 9. Кот бурчыць і гурчыць, лапамі дзярэцца *(К-с).* 10. Дзяры лыкі,калі дзяруцца *(Прык.).* 11. Сынклета Лукінічна глядзела на сына, здзіўлялася і радавалася, па хаце хадзіла на цыпачках, каб не перашкаджаць яму *(Шам.).* 12. Льецца Неман паміж гораў, светлы, чысты, як з расы *(К-с).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

13. Прайшлі жалезны мост, спусціліся з высокага насыпу і пайшлі берагам *(К-с).* 14. Маладзейшыя, відаць, ад радасці, ад удачы дурэлі, дужаліся ў сумётах, кідалі адзін у аднаго снегам *(Лыньк.).*15.Адмысловы рыбак, дзед вяртаўся з ракі заўсёды з рыбаю *(Янк.).*

**17. Спішыце сказы, падкрэсліце зваротныя дзеясловы, якія сваім лексічным значэннем не суадносяцца з адпаведнымі незваротнымі.**

1. Замыкаюцца і адасабляюцца людзі звычайна ад гора, але бывае, што замыкаюцца часам і ад шчасця *(Шам.). 2.* Краўся па чужых загуменнях Антон. Ішоў так ціха, што нават самога сябе не адчуваў *(Бяд.).* 3. Жанчына ўсхвацілася і пайшла да дзвярэй, дзе заўсёды стаяў імбрычак з вадою *(К. Ч.).* 4. Размаўляў Паходня цяпер з ёю як з роўнай і часам прыкметна губляўся, калі позіркі іх незнарок сустракаліся *(Хадк.).* 5. А напрызбе, каля хаты, заліваліся дзяўчаты песняю зычлівай *(Астр.).* 6. Спачатку вучоба не клеілася *(Лыньк.).* 7. Аж жутка на сэрцы, душа ажио млее; там з дзіцем кадета пляцецца дамоўі *(Куп.).* 8. Гнедага кусалі мухі і авадні, што роем віліся каля яго *(Кр.).* 9. Недзе ззаду, цяжка дыхаючы, кашляючы, валокся незнаёмец *(Лупе).*10. Праблукаўшы паўночы па лесе і не знайшоўшы ніводнай вёскі, сапёр выбіўся да шашы *(Лыньк.).* 11. Беларусь мая родная, як жа я рвуся яшчэ раз пеша ўсю цябе змераць, увесь і чабор твой і верас! *(А. К.).* 12. А ты не кіпяціся! *(Лыньк.).*
13. Чаго ты дзьмешся, сястрыца? *(К. Ч.).*

**18. Ахарактарызуйце стан як дзеяслоўную катэгорыю. Якія вы ведаеце класіфікацыі станаў? Якая з іх, на вашу думку, больш абгрунтаваная? Спішыце сказы, вызначце стан дзеясловаў.**

1. Сэрца гора ўсхвалявала, сэрца цешыцца дабром, ды парадзіцца мне з некім, як з табой, мае пяро *(Бр.).*2. Успырхнуў жаваранак над праспектам, затрымцеў, утрапёны і горды, над асфальтным прапыленым пеклам стаў паласкаць дажджынкаю горла *(Бур.).* 3. Любуюся раллёй. Люблю яе, асабліва як свежая *(Б.).* 4. Узнімаліся ў полі дзівосныя сцены далёкіх лясоў, маўчала каля дарогі сухое зелле *(К. Ч.).* 5. Дно гэтага кутка нельга было лічыць дном мора. Яно знаходзілася досыць высока і залівалася вадой толькі ў час прыліву *(Я. М.).* 6. Гаворыш ты, што зніклі краскі, што абляцеў кляновы гай *(Бр.). 7.* Ён [салдат] тут ішоў, акопваўся і поўз у самы вір смяротнай навальніцы, пакуль не зачапіўся, не прырос да нашае заходняе граніцы *(Грах.).* 8. Кніга чыталася ўжо недзе пры канцы: сыходзіў дзесяты дзень падарожжа *(Луж.).* 9. Лірычныя, поўныя душы і сэрца вершы Сцяпана Смалякова ўсюды ўспрымаліся аўдыторыяй з вялікім захапленнем *(Кул.).*

**19. Вышішыце спачатку сказы, у якіх дзеясловы залежнага стану маюць творны дзейнага прадмета (творны суб'екта), а потым сказы, у якіх дзеясловы залежнага стану не маюць творнага дзейнага прадмета.**

1. У вялікі цэх, дзе на адных тачылах наразаліся, на другіх шліфаваліся ўзоры на вазах, графінах, бакалах, увесь гэты посуд, у неапрацаваным выглядзе, зносіўся з вялізнага гарышча *(Б.).* 2. Здзіўлены Тоня хацеў спачатку запытаць, чаму тэта ўсё самім гаспадаром робіцца, але старая закаранелая нянавісць паміж імі і Бірылам не дазволіла яму загаварыць *(К. Ч.).* 3. Птушка

насцярожана пабліsквала ва ўсе бакі чорнымі кропелькамі вачэй. Прарабляўся звычайны манеўр: перад залётам у гняздо трэба было ўпэўніцца, ці не пагражае адкуль небяспека *(Луж.).4* Удзень вучні распускаліся на паўтары гадзіны для Ябеду *(К-с).* 5. Імя Чарвякова вымаўлялася поруч з імем М. І. Калініна *(Луж.).* 6. А з тылу, ад родных і блізкіх, прыходзілі горкія весткі: раслі падаткі, даражэлі тавары, зачыняліся фабрыкі і заводы. Толькі памешчыкі ды буржуі нажываліся ўсё больш *(«Полымя»). 7.* Усё вайною нішчыцца, усё, усё знішчаецца *(А. К.).* 8. «Пераправа», – абвясціў ён [Твардоўскі]. Цэлы раздзел з «Васіля Цёркіна»!.. Паэма не чыталася, а як бы імправізавалася на нашых вачах *(Луж.).* 9. Кдй дарожны выразаецца з дрэва, якое не баіцца марозу *(М. Т.).* 10. Пан Крулеўскі назначаецца павятовым камісарам; войтаў па валасцях ставяць *(К-с).* 11. Васіль намерыўся пагаварыць пра ўсё гэта на партыйным сходзе, дзе павінна была абмяркоўвацца кандыдатура будучага старшыні «Партызана» *(Шам.).*

**20. Ахарактарызуйце тэрміны «творны дзейнага прадмета» («творны суб'екта») і «творны сродку дзеяння». Спішыце сказы, падкрэсліце творны дзейнага прадмета адной рыскай, а творны сродку, спосабу дзеяння – дзвюма.**

**1.** Што аднаму з цяжкасцю даецца, тое калектывам легка бярэцца *(Прык.).* 2. Запаліўшы ў палях электрыч-ныя сонцы, у адказ, што гэта праўда — не мана, гулі, гулі трактары бясконца, і ўздымалася плугамі цаліна *(А. К).* 3. Ірвы гэтыя шырокія, глыбіня іх мераецца сажнямі, і замаскоўвае гэтую глыбіню тонкі пласт прэлага моху, на якім зыбаецца кволае трысцё *(Сам.).* 4. Дарога сціскаецца лесам і спускаецца ў лагчыну, потым ізноў падымаецца на горку *(К-с).* 5. Хмара нібы расшчапілася маланкай, прагучаў магутны ўдар грому *(Хадк.).* 6. Яшчэ а вечара неба з паўднёвага боку заценьвалася дымнаю павалокаю лёгкіх воблакаў, а над далёкімі лясамі звісала тонкая блакітная смуга, прадвеснік адлігі *(К-с). 7.* У «Правілах і абавязках пасажыраў» малады чалавек звярнуў увагу толькі на два пункты: на гадзіны снедання, абеду, чаю і вячэры і на тое, што трэба рабіць у часы трывогі, якая ў выпадку патрэбы будзе абвяшчацца сірэнамі, электразванкамі і па радыё *(«Полымя»).* 8. На пятнадцатым годзе я стаў сацыял-дэмакратам, і настаўнік мой – студэнт Пецярбургскага політэхнікума не забудзецца мной да самай смерці *(Р. М.).* 9. Як пераказаць пачутае? Хіба ж пераказваюцца словамі полымя, гром, паводка? *(Луж.).*

**21. Выявіце розніцу ў значэнні выдзеленых дзеясловаў; у якіх выпадках можна замяніць дзеяслоў з постфіксам *-ся* дзеясловам без яго і наадварот?**

I. У вільгаці зеляніласяя трава, *бялела* наперадзе жві-рыстая дарога *(К. Ч.).* Валасы *бялеюць* у бядзе, нібы тая белая кашуля *(Бял.).* Яго звычаі – арлiныя, яго ўцехі – сакаліныя; пер'і-пер'ечкі *бялеюцца* ды на золаку агнявеюцца *(Багд.).*

II. А на дубах, як шапкі тыя, *чарнеюць* гнёзды бусла-выя *(К-с).* Шнур жывы, загнуты крукам, ледзь *чарнеецца* ўгары *(К-с).* Карэньчык падасінавіка хутка *чарнее (Луж.).*

III. Ужо *чырванеюць* суніцы. Праз тыдзень можна збіраць *(Лыньк.).* Пасярэдзіне плошчы *чырванела* кумачом наспех збітая з дошак трыбуна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*(Лыньк.).* Узыходзіла сонца, і ў першых яго промнях *чырванеўся* на ўзлессі вялікі камень – шматвяковая сведка бур у чалавечых душах *(К. Ч.).*

IV.Паравоз *цягнуў* добры дзесятак пасажырскіх ва-гонаў *(Бр.).* А трымаць там салдат заўсёды – няма рацыі, бо трэба ім дастаўляць усё неабходнае для жыцця, а дзеля гэтага трэба *цягнуцца* дні тры па гэтых пушчах, балотах і гарах *(Я. М.).* Я не знаю, удаўся ў каго я такі: *цягне* дзіўная сіла мяне да ракі *(Бур.).*

V. Запіску шмат разоў чыталі, *круцілі* так яе і сяк *(К-с).* Адзін калгаснік падаваў салому ў жолаб пад зубы і нажы, а другі *круціў* кола спецыяльна прыстасаванаю ручкаю *(К-с).* Вялікі шліфавальны камень пачынае хутка *круціцца (Асіп.).* «Нячыстая сіла – гэты Казюк! – плюнуў са злосці Гумоўскі. – Чаго ён *круціцца* тут?» *(Бр.).*

VI.Вядома, часы змяніліся, але і старога перажытага, як кажуць па-простаму, пад печ не *сунеш,* за парог не вымецеш *(Бр.).* Ляснымі дарожкамі, глухімі і цёмнымі, *сунецца* Амяллян адзін *(К-с).*

VII.Вогнішча прыпала да зямлі, патухала і *дыміла (Бяд.).* Адны скачуць у згарэлы мост, ад якога толькі *дымяцца* галавешкі, другія кідаюцца пераплываць рэчку *(М. Ч.).* Сіні змрок *дыміў* з ягаднікаў і мхоў сівых *(М. Т.).* Вопратка яго з дажджу *дыміцца,* ён яшчэ пад сонцам не прасох *(А. К).* Там, дзе раней былі хаты, – *дымілі* зямлянкі *(А. К).*

**22. Знайдзіце ў сказах дзеясловы, ужыванне якіх не адпавядае літаратурнай норме.**

1. Ледзь толькі немцы пачалі адступацца, Туравец, як падхоплены хваляй, выскачыў з лесу *(І. М.).* 2. Днеўся, можа і нялёгкі яшчэ, заўтрашні дзень *(Луж.).* 3. А як быць з поглядамі тых, чыім словам даражыўся? *(Луж.).* 4. Дзень урэшце скончыўся, ды такі дзень, што думалася – вось выйдзецца на ганак праўлення і тады ўздыхнецца на ўсе грудзі *(Пестр.).* 5. Унадзілі ездзіць поплавам – бліжэй, а дарогай – кружней *(К. Ч.).*

**23. Прааналізуйце параграфы пра катэгорыю трывання ў «Кароткай граматыцы беларускай мовы» (Мінск, 2007), у вучэбных дапаможніках П. Я. Юргелевіча «Курс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі» (Мінск, 1974), Л. І. Бурака «Сучасная беларуская мова» (Мінск, 1974), «Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія» (Мінск, 1989), П. П. Шубы «Дзеяслоў у беларускай мове» (Мінск, 1968).**

**24. Ахарактарызуйце суадносныя трывальныя пары дзеясловаў. Якія практычны прыём можна выкарыстаць пры вьгзначэнш суадноснасці? Вьшішыце толькі суадносныя пары трывання.**

Дзяліць – падзяліць, грэць – нагрэць, бяліць – вы-беліць, гадаваць – выгадаваць, сівець – пасівець, цямнець – сцямнець, ладзіць – наладжваць, чырванець – пачырванець, множыць – памножыць, клеіць – наклеіць, падабацца – спадабацца, купацца – накупацца, гатаваць – згатаваць, мялець – абмялець.

Выкарыстащь, заасфальтаваць, замалёўваць, адпрасаваць, адмяняць, прапрацоўваць, ахалоджваць, выбіраць, перапалоць, зберагчы, падкрэсліваць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**25. У прыкладах з твораў Я. Брыля вызначце трыванне дзеясловаў, назавіце паказчык трывання.**

1. Еду, адпачываю, думаю, набіраюся прагнасці да работы. 2. Толькі што адзудзелі камары, супакоіўся пад аерным берагам бабёр, а ўжо над альховым кустам, за якім я, прытаіўшыся, сяджу, загаманіла звонкая пчолка. 3. Дождж зноў зашамацеў па лісці, парабаціні́ўся наво-кал паплаўкоў. 4. Узыходзіць сонца, а на ўвесь хмарны захад — вясёлка. 5. 3 ранняга ранку хадзіў па ціхім яшчэ Ерэване, сонечным, свежым ад ценю і вады, і гаварыў сам сабе, што ранавата, мусіць, расчульвацца, аднак жа і радасна пазнаваць яшчэ адну краіну, яшчэ адзін народ. 6. Хадзіў і спыняўся, прагна дыхаў, доўга глядзеў. 7. Уранні Шчара памаленьку праявілася для нас з настойлівай імглы, аднаму дала вялікага язя, другому яшчэ большага ляшча, трэцяму нечым парвала вуду... ну, вядома ж, мне, а потым, пасля абеду, сказала: «Годзе». 8. Я моцна спаў у цяпле, так моцна, як можа спаць здаровы сялянскі дзяцюк, які ўвесь дзень праца-ваў на марозе і толькі што заснуў. 9. Дзяўчынка-сірата пасля вайны гадавалася ў дзіцячым доме, потым стала ткачыхай на камбінаце, дапрацавалася да добрай славы. 10. Тады, у дні перадыху на стыку лета і восені, наша веска, сказаў бы, раптам успамінала пра той лужок за крайнімі гумнамі, які, быццам забыты, чакаў свае чаргі.

**26. Дайце характарыстыку дзеясловаў са значэннем абодвух трыванняў (двухтрывальных). Вызначце, дзе магчыма, трыванне выдзеленых дзеясловаў.**

1. Я *адрасую* слова да Аб'яднаных Нацый *(А. К.)*. 2. Якія ж жанры варта *культываваць,* а якія лічыць «уста-рэлымі»? *(Кр.).* 3. Падпалкоўнік адразу насцеражыў-ся — праціўнік, напэўна, пастараецца *атакаваць* справа ці злева, а можа нават адрэзаць брыгаду (*/. М.).* 4. Атрадам было загадана *актывізаваць* баявыя дзеянні на варожых камунікацыях — чыгунках і шасейных дарогах *(Нях)*. 5. Адчуваючы хісткасць свайго становішча ў інстытуце, [Юрка] даў сабе поўную волю ў сям'і — пачаў *ігнараваць* айчыма, маці *(У. К.).* 6. Аўтару трэба было больш дэталёва *даследаваць* некаторыя моманты стылю К. Чорнага *(Р. Ш.). 7.* Раніцай дырэктар атрымаў загад — спешна *камандзіраваць* студэнтаў на граніцу для рамонту дарогі і пабудовы авіяцыйных пляцовак *(Як.).*

**27. 3 «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» (у 5-ці т.—Мн., 1977-1984) выпішыце дзесяць дзеясловаў, якія маюць формы абодвух трыванняў, і пяць — са значэннем абодвух трыванняў.**

**28. Ахарактарызуйце ступеннае ўтварэнне трыванняў. Утварыце такім спосабам трыванні ад дзеясловаў *сініць, сушыць, чытаць, стукаць, хадзіць, сядзець* і запішыце іх.**

**29. Запішыце дзеясловы, побач — дзеясловы іншага трывання.**

Бегчы, ляцець, араць, купіць, сячы, жыць, месці, бачыць, падабацца, крычаць, класці, адрэзаць, лавіць, зачыніць, заплыць, купацца, змаўкаць, згарэць, квітнець, настаўнічаць.

**30. Дайце семантычную і марфалагічную характарыстыку наступных дзеясловаў. Якія назвы-тэрміны ўжываюцца для іх? Вызначце трыванне гэтых дзеясловаў. 3 трыма парамі (на выбар) склазіце сказы і запішыце іх.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Бегчы — бегаць, везці — вазіць, весці — вадзіць, гнаць — ганяць, гнацца — ганяцца, ехаць — ездзіць, ісці — хадзіць, каціць — качаць, каціцца — качацца, лезці—лазіць, ляцець — лятаць, несці — насіць, несціся — насіцца, плыць — плаваць, паўзці — поўзаць, цягнуць — цягаць, цягнуцца — цягацца (са значэннем 'ісці — ха-дзіць').

**31. Ахарактарызуйце спосабы дзеяслоўнага дзеяння як лексікаграматычную кагэгорыю. Вызначце спосабы і трыванне ў выдзеленых дзеясловах.**

1. А калі *нагуляліся* і *нагаварыліся,* госці селі за стол *(К-с).* 2. У рэдкім лесе сосны *разрастаюцца* букетамі *(Б.).* 3. Паблісквалі на сонцы кропелькі расы *(Б.).* 4. Кастусь сядзеў між ім і татам; ён да яды не так быў падак, бо ўжо *намазаўся* аладак *(К-с).* 5. Макушэнка і Ладынін *пераглянуліся* і засмяяліся, зразумеўшы адзін аднаго *(Шам.).* 6. І нашы клёны *разрасліся,* і хуткаплынныя гады памазалі апалым лісцем мае хлапечыя сляды *(Бур.). 7.* Ціха *пераклікаліся* коннікі-разведчыкі, што ехалі ўперадзе *(Лыньк.).* 8. Ціха *патрэсквае* полымя невялічкага цяпельца *(Лыньк.).* 9. Першага верасня над дахам школы ўзвіўся чырвоны сцяг, упершыню *зазвінеў* званок *(Грах.).* 10. *Паглядваюць* мілымі вочкамі кветкі іван-ды-мар'і *(Б.).* 11. Стары *клікнуў* на дапамогу сына: не стала сілы ў руках, у нагах *(Лыньк.).* 12. Цягнула падысці да Ганны, *загаварыць,* але ён не знаходзіў прычыны *(І. М.).* 13. З паўдня *папахадзш* хлопцы, пакуль выбіліся на невялікую лясную дарогу *(К. Ч.).* 14. «Мусіць, *сказануў* не да месца»,— падумаў Алесь *(Б.).*

**32. Ахарактарызуйце катэгорыю ладу. Знайдзіце ў тэксце дзеясловы абвеснага ладу.**

Яшчэ дзесятак метраў быстрыні, і рукавы рэчкі, вырваўшыся з-за вострава на шырыню, злучыліся. Быстран-ка пачала памалу заціхаць, нібы ўжо адчула ўсю важнасць моманту — свае злучэнне з вялікай ракой.

Неман адкрыўся хлопцам урачыста ціхі, велічны. Напрасткі, за шырокай люстраной роўняддзю, відаць быў адхонны бераг, а далей — піла ляснога далягляду. Свет блакітна-ружова-зялёных фарбаў ціхай раніцы, раскошны свет вады, травы і сонца.

— Эх, прыгажосць! — ускрыкнуў Максім. Ён устаў.

Толя падняўся таксама. Без цяжкага вясла яму захацелася раптам або ўзмахнуць рукамі і паляцець над вадой, як лятаюць стрыжы, або падскочыць і нырнуць у гэту блакітна-ружовую глыбіню, як бабёр. А чайка ўжо ішла сама, падхопленая амаль непрыкметным, магутным стрыжнем знешне спакойнай ракі (*Я. Брыль*).

**33. Ахарактарызуйце загадны лад. Знайдзіце дзеясловы загаднага ладу, вызначце іх асобу.**

Т. Век хадзі і любуйся, а стомішся — ля агню на ўзлессі прысяДзь *(Панч.).* 2. Ляці ж увысь, шырэй узмахі, каб зорку ўласную знайсці *(Бр.).* 3. Няхай ужо дзяўчынка расце, няхай красуецца! *(Б.).* 4. Давайце паедзем у Панямонь *(К-с).* 5. Трубі, трубі, пастух! *(Панч.).* 6. Хадзем! Трэба быць паэтам не за сталом, а ў жыцці, адважыцца — і над Сусветам па сцежцы месячнай прайсці *(Грах.).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

7. Хай вунь маці мёду прынясе ад бабы, ды напарым маліны *(Б.).* 8. На ўсякі выпадак дзед падаўся трохі назад, бліжэй да лесу, і раптам пачуў грозны вокліч: «Стой! Хто ідзе?» *(К-с).* 9. Хлопцы, а давайце возьмем яго ў сваю брыгаду *(Шам.).* 10. Давайце я такі павяслую *(Б.).* 11. Хай свята дружбы лепшым будзе святам, хай векам дружбы наш завецца век, хай другу друг заўсёды будзе братам і другам — чалавеку чалавек *(Грах.).*

**34. Ад наступных дзеясловаў утварыце формы загаднага ладу, запішыце іх.**

Пасеяць, схадзіць, крыкнуць, дамовіцца, перамагчы, перапалоць, скарыстаць, трьшацца, адпачываць, сесці, ісці.

**35. Знайдзіце ў сказах дзеясловы загаднага ладу. Якія з іх маюць значэнне іншага ладу?**

1. Каля адкапавярховага каменнага будынка ямской станцыі стаяла запыленая — хоць ты пальцам на ёй пішы — паштовая карэта *(Каратк.).* 2. Пуста ў вёсцы і ціха. Хто на сенажаці, хто ў лесе, хто на рэчцы. Не чуваць нічыйго крыку, піску, смеху. Хоць вазьмі, Васілёк, ды крычы за ўсі.х сам, на ўсё сяло *(Хомч.),* 3. «А браткі ж мае,— гаварыў часам дзядзька, спускаючыся з мокрага ганка,— вось цемрыва, хоць на ваўка ўссунься!» *(К. Ч.).*

II. 1. І для шчаслівага жыцця, чаго ні пажадай, тутзнойдзе ўсё душа твая, і гэта ўсё—мой край *(Р.). 2.* Кожны воляй абагрэты — ці рабі, ці не рабі: хочаш —панскі жні палетак, вепра бі, гай царабі *(Луж.).* 3. Крыўдуй не крыўдуй на мяне, але я мушу сказаць табе шчыра адну рэч *(Хадк.).*

III. 1. Скажы яна [Ганна] адно слова Сцяпану — і ён, здаецца, пойдзе за яе ў агонь і ў ваду! *(І. М.). 2.* І маці, і дачка адчувалі, што, не знайдзіся тая Субота, парвалася б апошняя, можа і невідочная ўжо нітачка дамашнасці, цёплага укладу нярушанай вайною сям'і *(Луж.).* 3. Выпадак, напэўна, так і забыўся б, не пачуй я праз некалькі дзён тую самую песню ў скверыку каля драматычнага тэатра *(Луж.).*

**36. З апавядання Я. Брыля «Галя» выпішыце 10 сказаў з дзеясловамі загаднага ладу, вызначце форму асобы гэтых дзеясловаў.**

**37. Адкажыце, якое значэнне маюць формы загаднага ладу ў наступных сказах.**

1. От згубіцца і сядзіць цэлы дзень у чужых людзей. А бабка ламі галаву, шукай *(Луж.). 2.* Смаж ім [жаўнерам] яечню, скваркі пячы. А чуць што не так, дык бізун у ход пускаюць *(К-с). 3. А* работы многа: і ў хаце прыбяры, і дзяцей сваіх дагледзь, і вядзі работу ў школе *(К-с).* 4. А цесната — ні стаць, ні сесці: — тырчы, як пень, на адным месце! *(К-с).* 5. Вось! За цябе толькі і бойся! Ледзь сышоў з вачэй, то і трывожся *(І. М.).* 6. Ну, працы тут, Нічыпар,— рабі не пераробіш (У. *М.).*

**38. Знайдзіце ў сказах дзеясловы загаднага ладу, звярніце ўвагу на выражэнне асобы** і **ліку.**

1. «Адпачні, хлопцы!» — падае Сцепка каманду *(К-с).2.* Хлопцы, коней ляйцай і на плечы — сяўню! *(Я. П.).3.* Н-но, гнядыя, варушыся *(Лыньк.).* 4. Пішуць гэтых вершаў цэлыя стагі, а я — выдавай *(Луж.).* 5. «Сядай, Мікіта»,— загадаў ён сам сабе і сеў каля падпаска *(Б.).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**39. Вызначце, якое адценне ў наступных сказах надае займеннік *ты і* часціца *не* дзеясловам загаднага ладу.**

1. Не цурайся свайго роду, хлопча! *(Грах.). 2.* «Не забывай жа мяне»,— сказаў на развітанне Турсевіч *(К-с).* 3. Не шкадуйце, хлопцы, пораху, куль гарачых і гранатаў *(М. Т.).* 4. Я перайду сама, не клапаціся, мілы дружа! *(М. Т.).* 5. Не шумі ж ты, цёмны гаю, бо мне й так нялёгка *(Тр.).* 6. Дні, што мінулі, мяне не агоралі, старасць, адпрэчся ты *(Бр.).* 7. «Зірні, ты зірні: якое гэта прыгоства!» — казаў Турсевіч сябру, паказваючы з ганка свае кватэры на роўны шлях і на ўвесь малюнак, што раскрываўся перад імі *(К-с).* 8. «А ты, Ядвіська, ка-лі ласка, заспявай»,— звярнуўся пан падлоўчы да дачкі *(К-с).*

**40. Акрэсліце значэнні ўмоўнага ладу.**

1. Я быў бы шчаслівы бязмерна, калі б удалося мне здзейсніць надзеі маіх незабыўных настаўнікаў і сяброў *(М. Т.). 2.* Хай адшумелі лістапады, вясляр на бераг той грабе, скажу, я быў бы вельмі рады, калі б убачыў зноў цябе *(Бр.).* 3. Калі б з такою меркаю падысці да Мазыра, яго трэба было б назваць горадам-змагаром, горадам, у якім нараджаюцца барацьбіты, людзі, вольныя духам і смелыя сэрцам *(Сач.).* 4. Хоць бы мне па жменьцы сонца, я б сыпнуў туды, дзе цёмна *(Бр.).* 5. Хоць бы схавацца пад якую страху *(Грах.).* 6. Ах, жыць бы, трубіць бы за рэчкай яшчэ вам у нас, журавы, лятаць бы на познюю грэчку! Чаму ж адлятаеце вы? *(Бял.). 7.* Мне б дабегчы і гэты пажар пагасіць, толькі рана баліць і замала сіл *(Панч.).* 8. Выйсці б, стаць плячом да гораў, так часам! сэрца хоча *(Бр.).* 9. Паспець бы толькі, не стаміцца, не збіцца з маладой хады... *(Бур.).*

**41. Спішыце сказы, падкрэсліце дзеясловы ўмоўнага ладу. У дужках адзначце, са значэннем якога ладу ўжываюцца гэтыя дзеясловы.**

1. Браты яго клічуць здалёку ўвесь час, пачуць ім хацелася б Райніса голас *(Бр.).* 2. Я хацеў бы, каб мірна І весела ў добрай працы прайшлі іх гады, самай мірнай жадаў бы прафесіі ім, маім сябрам маладым *(Панч.).* 3. «Сядзіш у духаце,— сказаў дзед, увайшоўшы ў хату.— Ішоў бы ты да ракі: там жа таксама можна чытаць» *(Б.).* 4. Ну, ведаеш, Мікіта, не табе б гаварыць *(Гал.). 5.* Не ішоў бы ты лепш. Дык павячэраў бы хоць *(Б.). 6.* «Ты б паслала тым часам»,— сказаў Дусі Пракоп, матнуўшы галавой на дзверы чыстай палавіны *(Ракіт.). 7.*А той, можа, хай бы лепей і не прыйшоў! *(Куп.). 8.*А можа б яшчэ пагулялі? *(Куп.).* 9. Голас у Насці срэбрам разышоўся па хаце: «Ты чаго, тата, спаў бы» *(К. Ч.).* 10. Хай бы вось ён прыйшоў ды адказаў! *(Б.).* 11. Іван Кузьміч, дык вы б хоць зірнулі на яго спачатку *(Б.).*

**42. Ахарактарызуйце катэгорыю часу. Вызначце час, трыванне, лад дзеясловаў у тэксце.**

Усё вышэй, вышэй узбіраецца наша дарога. Направа паказалася вялікая глыбокая даліна, на якую часта глядзім праз рэдкі, стрункі сасоннік. Недзе там, за далінаю — Татры, пакрытыя снегам вяршыні гор. Як прыкра, што дождж не сціхае, што імглістае неба асела так нізка!

Думаю пра мінчанку Цвяткову, асвенцімскія ўспаміны якой чытаў нядаўна... Асвенцім стаіць на балоцістай даліне. Вельмі часта халодны туман пакрываў нявольніцкі лагер. Былі, аднак, дні, асабліва зімою, калі на поўдні ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сонцы сінелі-бялелі вяршынямі горы. З тугой глядзелі на іх змучаныя, асуджаныя на смерць паланянкі, пра іх гаварылі, адтуль чакалі свабоды. «Там, у гарах, партызаны. І, хто ведае, можа, адтуль прыйдзе да нас вызваленне...» *(Я. Брыль)*

**43. Ад наступных дзеясловаў утварыне і запішыце формы часоў, вызначце трыванне.**

Вырашаць, несці, дачакацца, квітнець, размаўляць, паглядзець, пагаварыць, даглядаць, дагледзець, прапанаваць, калыхнуць, змоўкнуць, сказаць, гукнуць, пра-звінець.

**44. Назавіце значэнні, уласцівыя форме цяперашняга часу. Знайдзіце ў сказах дзеясловы цяперашняга часу, вызначце ў іх значэнне цяперашняга часу. Якія з гэтых дзеясловаў маюць значэнне іншага часу?**

1. Салавей пяе ў маёй дуброве, растрывожыў песняю душу *(Панч.)*. 2. Чую назву Згода і бачу, разумею не выпадковасць, а розум і душу ў называнні *(Янк.)*. 3. Я *часта* прыпыняюся каля сталоў, дзе разлажылі прадаўшчыцы зёлкі *(М. Т.)*. 4. Большую частку свайго жыцця вугры праводзяць у прэснай вадзе, у рэках і азёрах, а для нерасту плывуць у Атлантычны акіян *(В. В.)*. 5. Хлопец сядзіць на прызбе Максімавай хаты, каля вугла, сочыць за паплаўком І час ад часу азіраецца *(В.)*. 6. Рэдка сонца з месяцам страчаецца. Свецяць паасобку *(Панч.)*. 7. Бывала, ідзём у школу ўтрох. За пяць кіламетраў *(Сач.)*. 8. Палявы лунь любіць сухую зямлю і трымаецца на палетках між драбналесся, лётае над палям! і лугамі *(В. В.)*. 9. «Праз тры дні ідзём у турпаход!» — урачыста аб'явіў піянерважаты *(П. К.)*. 10. Каля лесу, па даліне ідуць хлопцы-навабранцы *(М. Ч.)*. 11. Духмяная цішыня густа наплывае з-за вербалозаў на раку *(Юр.)*. 12. Памяць гартае адвечны мудры каляндар прыроды, і кожная дробязь ажывае, хвалюе, як і тады, упершыню, хвалявала *(Вял.)*. 13. І хоць неадкладных многа розных спраў, але твой партрэт, брат, нас усхваляваў, і рашыла дружная сям'я, каб цябе наведаў. Заўтра ж еду я! *(М. Т.)*.

**45. Прачытайце пра формы прошлага часу ў лінгвістычнай літарагуры (Кароткая граматыка беларускай мовы, 2007; Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія, 1997 і інш.). Спішыце сказы, падкрэсліце складаныя формы прошлага часу, вусна прааналізуйце іх.**

1. [Чарняхоўскі] ужо сабраўся быў вярнуцца ў пакой, легчы спаць, калі пачуў гул самалётаў, што хутка рос *(І. М.)*. 2. Іх [партызан] націск быў такі моцны, дружны, што нямецкая ахова, якая была залегла па той бок і паспрабавала працівіцца, зрабіла толькі некалькі бязладных стрэлаў, як была змецена (У. *М.)*. 3. Чуючы сякеру, я быў падумаў: ці не падбірае хто гатовенькае, што засталося пры зямлянках? *(Янк.)*. 4. Лёнька быў наважыўся пайсці да суседзяў, каб там перачакаць, а потым падумаў, што калі ўжо яго выправадзілі з хаты, значыцца, мае быць нейкая цікавая размова (*М. К.)*. 5. Спачатку было з'явілася такое ж жаданне і ў прафесара, але яно цяпер прайшло, прафесар наўмысна не даваў Ягуплу магчымасці загаварыць *(Гал.)*. 6. Кднуўся быў пайсці дадому, але зачапіўся нагамі за грудок трэсак і вярнуўся назад *(Гал.)*. 7. «Чаму ж гэта так?» — аж падняўся з месца той, што

папракаў быў Сузона *(Гал.).* 8. **Ён** [Апейка] забыў, што збіраўся быў ісці; стомлена сеў на край стала і сядзеў у змроку, не варушачыся, думаючы гэтае адно: што там здзеелася? *(І. М.).* 9. Падышоў быў на момант і Яўхім *(І. М.).* 10. Аднаго разу ўжо была надумалася здаць Вадзімку ў дзіцячы дом і развязаць сабе рукі *(Саб.).*

**46. Спішыце сказы, падкрэсліце дзеясловы прошлага часу. Вусна адзначце выпадкі ўжывання формы прошлага часу са значэннем іншых часоў.**

1. Прысеў наш Яська, закруціўся! Ды як пайшоў, ды як пусціўся! *(К-с). 2.* Згаварыўшыся з хлопцамі-равеснікамі, у адзін з вечароў крадком ад сваіх мы дабраліся да станцыі Аўрамская, залезлі ў пульманы, гружаныя лесам, і без асаблівых прыгод гадзін праз пяць былі ў Гомелі *(Сач.).* 3. Мы ўсё пазналі і прайшлі — пакуты, радасці, трывогу, і жменьку роднае зямлі заўсёды бралі ў дарогу *(Грах.).* 4. Хата была ўехала ў зямлю, выгну-лася сцяной, але дзядзька паклаў новыя падваліны, штандары, зрабіў прыбудоўку, перакрыў дах гонтамі, павялічыў вокны — нібы ведаў загадзя, што сыдуцца тут дзве сям'і *(І. Н.).* 5. Далека за далінай снегавымі разводам! сінеў усё той жа высачэзны Мядзведжы хрыбет *(В. Б.).* 6. Песень, помню, не спявалі маткі, а бацькі, браты пайшлі ў лясы *(Бур.). 7.* Танкі, якія вёў Шут"ў, налятталі на нямецкія штабы і тылавыя базы, грамілі іх, перарэзвалі шляхі, па якіх ішлі баявыя прыпасы для фронту (7. *М.).* 8. Надвячоркам, калі горад спяваў і весяліўся, калі не змаўкалі аркестры ў гарадскім парку, мы ішлі на ўскраіну горада *(Грах.).* 9. «Плакаў твой човен, пісьменнік!» — крыкнуў Максім *(Б.).* 10. Міхал Крычаўскі проста ў вочы смяяўся з польскіх паноў, а потвім нечакана для ўсіх кінуўся да акутага жалезам воза і разбіў аб яго сабе галаву; ён памёр, каб у часе катавання не выдаць планаў Багдана Хмяльніцкага *(Сач.).* 11. Паехалі. Паглядзім сенакос *(Хадк.).*

**47. Спішыце сказы, падкрэсліце дзеясловы будучага часу. Вызначце вусна трыванне, назавіце дзеясловы будучага часу, якія ўжываюцца са значэннем іншага часу.**

1. Адступяць горы і напасці, і пасвятлее пакрысе, калі надзею, быццам шчасце, здалёк таварыш прынясе *(Грах.).* 2. Хіба я на свеце знайду пекнату, як тут, на маёй Беларусі? Бывае, як бусел, ізноў паляту, але неўзабаве вярнуся *(Бр.).* 3. Знойдзеш — бачыш: не тая... Без патрэбы тады пра дарогу спытаеш ды папросіш вады *(М. Т.).* 4. Доўга будзе памятаць наша зямля варожую ліхую навалу! *(Кір.).* 5. І пайшоў. А мяне як возьме крыўда ды злосць... *(К. Ч.).* 6. Устанеш, бывала, раненька, пойдзеш у лес, захапіўшы кошык, на аблюбаваныя раней грыбныя баравіны *(К-с).* 7. А пойдзе ў танец Га-лачка — пастой ды паглядзі *(Б.).* 8. Толькі гэта я мінаю масток, аж там, у кустах на балоце, як зашуміць, ну, здаецца, і лісце з кустоў усё пасыпалася! *(К-с).* 9. Сын у яго — равеснік з Яськам. Прыйдуць, бывае, сюды. А Яська — ведама, дзіця — да іх бяжыць, і на хутар бегаў *(Янк.).* 10. Уткнешся, бывала, у жвір, ляжыш і не можаш падняцца *(Гл.).* 11. Гадуе ж тры дачушкі. Скора адна за адной школу канчацьмуць *(Янк.).* 12. Раптам як закрычыць нешта там, у сярэдзіне лесу *(Я. М.).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

**48. Знайдзіце дзеясловы, якія маюць значэнне іншага часу, чым паказвае яго форма.**

I. Хвілін праз дзесяць-пятнаццаць бабёр вярнуўся на рэчку і плыве пад мой куст, выпісвае тут адно, другое кола, падплывае пад самы бераг.

...Бабёр выплыве амаль каля маіх ног і нырне, выплыве— зноў нырне. Я падумаў: ці не разласаваўся ён параным гарохам, не адну жменю якога я сыпануў, як толькі прыйшоў на бераг? Во-во пырскне промнямі сонца. Падрыхтаваныя вудачкі ляжаць побач, ляжаць не-раскручаныя і сухія. А бабёр плавае, плюхаецца, пля-скае хвастом, як цяжкаватым вяслом, па вадзе. Нарэшце, знік.

*(Ф. Янкоўскі)*

II.— У тайгу звычайна ідзём на месяц,— расказвае ён [Сухараў].— Лыжы падбітыя ласёваю скураю, поўсцю па ходу. Ідзеш і сам не чуеш. Тузанеш назад і застыў як укопаны — поўсць задзярэцца і не пускае. А застане ноч, растопчаш снег, назбіраеш сушняку, пакладзеш пад яго бяросты, разуешся, здымеш усё верхняе, улезеш у спальны мяшок з казловай скуры і спіш, як пан,— горача і ўтульна.

*(С. Грахоўскі)*

III. Вада пагойдвае лодку, асабліва калі набліжаецжа наш цеплаход. Каторы рыбак так задумаецца, што забывае падцягнуцца да берага, і яго раптам так шугане хвалямі ад нашага цеплахода, што ён схопіцца завясло і шпарка-шпарка кінецца да берага, спыніцца там і доўга пагражае рукою.

*(Б. Сачанка)*

IV. Выбежыш, бывала, з двара за паркан, акінеш вачыма неабсяжна шырокае неба, на якім то тут, то там стынуць гурбы беласнежных воблакаў, зірнеш на лес, што сінее, зубіцца на даляглядзе,— і ногі самі нясуць цябе на зялёную роўнядзь лужка.

*(Б. Сачанка)*

**49. Выпішыце з тэксту асабовыя дзеясловы. Пакажыце асобу, лік, спражэнне, аснову, ад якой утварылася ўжытая ў тэксце дзеяслоўная форма. Падкрэсліце граматычныя паказчыкі асобы.**

Каторы дзень ідуць дажджы. Не такія дажджы, калі ўдар кожнай кроплі адчуваецца, а дробныя і ўедлівыя, быццам у небе, пад самымі хмарамі, нехта нябачны прасейвае ўсю гэтую безліч вады праз вельмі густое і далікатнае сіта. Стынуць вербалозы па калені ў вадзе, губляючы апошні зжухлы ліст. Стаяць голыя лясы, і ў лугах і ў палях пустэча, адно толькі на стагах, пад дажджом, застылі ў нерухомасці буслы — сёлетнія, яшчэ не выпрабаваныя жыццём вывадкі.

Ночы золкія, пранозлівыя, халодныя. Часам, калі не бывае дажджу, выбліскваюць зоры. Яны буйнейшыя, чымся ўлетку, як факелы, палыхаюць і мігцяць сіняватым загадкавым святлом у загадкавым бясконцым небе. Яны як бы пракладваюць людзям шлях, і... хочацца глядзець і глядзець у таямнічую, поўную цудоўнага характва глыбіню неба, у якой само сабою адгадваецца яшчэ адно невядомае жыццё. І хоць неба чыстае і не ідзе дождж, а вада ўсё роўна адчуваецца; яна ўсюды — у каляінах дарог, у нізінах і па ямінах, пад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

капытом у каня і ва ўласнай кішэні пінжака. Восень усё роўна спявае сваю нудную песню, цемень не хавае маўклівасці бору і навакольнай пустэчы, а вецер прыносіць вільгаць І пах завялага бульбоўніку.

*(М. Лупсякоў)*

**50. Знайдзіце ў сказах безасабовыя дзеясловы, дайце іх граматычную і лексічнуго характарыстыку. Адзначце, у якіх сказах асабовыя формы дзеясловаў ужываюцца з безасабовым значэннем.**

1. На золку ўсё заціхла за акном. Світала і развіднела нясмела, дыхнула з саду маладым він ом, і ўсё наўкол было да болю бела *(Грах.).* 2. Шэранню завалакло сцены Брэсцкай крэпасці *(Вял.).* 3. Надыходзіў вечар, змяркалася *(К-с).* 4. Цямнела, было суха ад лёгкага марозу і холадна *(К. Ч.).* 5. Зноўку павеяла холадам, сцюжай, грозна навіслі крывавыя хмары *(Бр.).* 6. Раніцай яму [Коласу] нядужылася: «у вачах з'явіліся плямы», але ўдзень усё ж «прысеў за работу» *(Луж.).* 7. Наступным вечарам нечпадзеўкі прынесла Дубадзела *(І. М.).* 8. Цямнела ў вачах, а сэрца вугаллем пяклося ў грудзях *(Бяд.).* 9. Цягнула да цёплай печы *(Гал.).* 10. Пахне свежым сенам на Пцічы, месяц за дубраваю знікае *(Грах.).* 11. І раптам заснежыла, замільгацела — віхура лістовак зляцела на нас *(Панч.).* 12. З балот патыхае вільгаццю, халадком *(Сач.).* 13. Раптам наперадзе па ўсім прасторы, відным воку і схаваным за ўзгоркамі і лясамі, забухала, загрукатала *(І. М.).*

**51. Знайдзіце пары незваротных і зваротных безасабовых дзеясловаў, прааналізуйце іх. Вызначце, што надае гэтым безасабовым дзеясловам постфікс *-ся.***

1. У лесе сцямнела рана *(К. Ч.).* 2. Дзень скончыўся, хутка сцямнелася *(Я. М.).* 3. Назаўтра, як ледзь развід-нела, Мікола пайшоў загадваць, каб везлі ў Пагулянку развёрстку *(Гал.).* 4. На дварэ ўжо развіднелася, але раніца стаяла шэрая, падобная на позні досвітак *(А. Ч.).* 5. А на дварэ ўжо вечарэе, і ночка блізка, змрок гусцее, агеньчык колер свой мяняе і счырван-жоўты блеск прымае *(К-с).* 6. Ужо на дварэ вечарэецца *(Нар.).* 7. Сутунела. На захадзе жарам палалі абрыўкі хмар (V. *Д.).* 8. Сутуняецца. Дзікія гусі зноў праляцелі нізка над лесам *(Б.).* 9. Быў вечар, змеркла нядаўна *(К. Ч.).* 10. Вечарам, калі зусім ужо змерклася, бабка Наста сядзела адна ў хаце, запаліўшы газовачку *(К-с). 11.*У канцы месяца нечакана задажджыла *(Лыньк.). 12.*Задажджылася раптам на цэлыя суткі *(Б.).*

**52. Ад наступных дзеясловаў утварыце, калі магчыма, безасабовыя зваротныя. Ад якіх дзеясловаў нельга ўтварыць такіх безасабовых? Ці звязана гэта з дзеясловамі, якія абазначаюць дзеянні неадушаўлёных прадметаў? Зрабіце вывады.**

Чытаць, пісаць, бялець, працаваць, ісці, цвісці, думаць, з'ездзіць, кіпець, гасцяваць, дыхаць, верыць, зіхацець, жыць, блішчэць, свістаць, гутарыць, ваяваць, сумаваць, квітнець, не ўседзець, зелянець.

**53. Спішыце, падкрэсліце безасабовыя зваротныя дзеясловы, утвораныя ад незваротных, ахарактарызуйце іх. Вызначце, ад пераходных ці неперaходных дзеясловаў утвараюцца гэтыя безасабовыя. Назавіце свае прыклады. Зрабіце вывады.**

1. Не сядзіцца мне доўга на адным месцы *(Куп.).* 2. Толькі нам, падарожным, не спіцца, як не спіцца цяпер вартавым *(Гл.).* 3. Дыхалася вельмі легка, Лёня ўзяў Жэню пад руку і павёў яго на вуліцу *(Н.).* 4. Знаеш, дома лягчэй гаруецца, салдат *(Гл.).* 5. А Шарэйку ніяк не маўчыцца *(В.).* 6. Ішлося легка — ці ж цяжка яму несці на плячах свае шэсць гадоў *(Хомч.). 7.* Не загамоніцца .нідзе, ні знаку на сляды *(Бр.).* 8. Але чым болей думалася, тым больш хацелася яму [Лабановічу] пабачыць сваю мілую Ядвіську *(К-с).* 9. І хоць нейкае нечуванае багацце раптоўна і не прыйшло, але праз усе гады добра елася і пілося, добра працавалася і слаўна дыхалася цудоўным скіп'ёўскім паветрам *(К- Ч.).* 10. Ці табе спяваецца, ці табе сумуецца? *(Луж.).* 11. Сярод таварышак маркоцілася Любе *(Р. М.).* 12. Праз колькі чэрвеняў, колькі зім не верыцца ў смерць аніяк *(А. К.).* 13. Ён [Мартын Рыль] туліцца бліжэй да чаротаў, каб спрытней падкрасціся да дзікіх качак. Яму пашчаслівілася настраляць іх штук пяць *(К-с).* 14. Так зажылося і нават прывыклася *(Пестр.).* 5. Памятаю, як легка ўздых-нулася, калі паставіў апошнюю кропку *(Скр.).*

**54. Выпішыце з тэксту ў форме інфінітыва асобна дзеясловы I і II спражэнняў. Запішыце побач формы адзіночнага і множнага ліку цяперашняга часу гэтых дзеясловаў. Падкрэсліце паказчыкі спражэння.**

Адкуль бы ні прывяла вас дарога да Капыля, абавязкова давядзецца ўзняцца па глыбокім рове на круты ўзгорак, дзе шуміць у зяляніне райцэнтр. Ціхая, паслухмяная рачулка Мажа срабрыстым пояском апяразвае Капыль з усіх бакоў. А на высокіх пагорыстых схілах расце малады сасновы лясок. Густыя зараслі ляшчынніку і чаромхі зялёнай сцяной спускаюцца да шаўковых мурожных лугоў, дзе ў гушчарні кустоў, у зацішных прагалках, б'юць з-пад зямлі струмені крыштальных крыніц; Я часта прыязджаю сюды, як госць, да сваіх землякоў. Раніцаю, калі яшчэ не апала раса, калі звонкае паветра напоўнена залатым ззяннем прамяністага сонца, іду я ў шырокія прасторы палёў. Здаецца, што зямля, як жывая, гаворыць з небам і варушыцца пад на-гамі. Шырокія прасторы палёў бруістымі пералІвамі плывуць і плывуць далека за сіні далягляд. Цішыня... Выбіраю мясціну на пагорачку, дзе стаіць старая, разга-лістая дзікая грушка. Тут у летнюю гарачыню, калі ад стомы асядае на вусны горкая смага, можна схавацца ад спёкі і марыць... 1ду далей па вузкай сцяжыне. Абапал цвітуць густыя і высокія жыты. Аж займае дыханне саладжавы пах хлеба. А вось і наша Замлыние. Уздоўж рачулкі, па абодва бакі яе зялёных берагоў, шырокімі квяцістымі ручнікамі сцелюцца сенажаці. А ў чубатых пералесках, якія трошкі далей узбеглі на жвірысты пагорак, мы любілі раскладваць вогнішча, вартавалі коней. У прысаку пяклася бульба.

*(М. Хведаровіч)*

**55. Выпішыце асобна вытворныя дзеясловы і формы дзеясловаў. Пасля вытворнага слова пазначце (у дужках) тып словаўтварэння. Падкрэсліце адной рыскай словаўтваральную аснову і дзвюма — словаўтваральны сродак. У формах дзеясловаў падкрэсліце хвалістай рыскай формаўтваральныя марфемы.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адламаць, адправіць, абяздольваць, ахаць, будаваць, бачыць, бяліць, вудзіць, выглядваць, вызначаць, вячэраць, высвеціць, вызначацца, вяртацца, гукаць, гарачыцца, грузіць, грукаць, гараваць, гравіраваць, дачакацца, думаць, дваіць, дабівацца, жвавець, жывіць, згушча'ць, загартоўваць, заехаць, запамінаць, залаціць, заліваць, заснуць, забуяць, зачараваць, зменьваць, іржавець, карміць, кідаць, накрычаць, натрапіць, прывезці, пасвіць, панавыбіраць, пакрышыць, прыгадвацца, пааранць, прачынацца, пакрыкваць, прадбачыць, прадаваць, перайначваць, паляпшаць, параскідаць, прывабіць, распранаць, раскашавацца, свістаць, саліць, сінець, стукаць, убачыць, укопваць, убельвацца, хвалявацца, чырванець.

**56. Складзіце табліцу аналізу дзеяслова ў адпаведнасці з парадкам разбору дзеяслова як часціны мовы. Спрагальная форма: 1) пачатковая форма (інфінітыў); 2) лексіка-семантычная група: абазначае фізічнае ці адцягненае дзеянне, стан, мову ці думку, пра-яўленне і змену прыметы, пераход з аднаго стану ў другі, адносіны асобы да каго-небудзь; 3) асновы дзеяслова: цяперашняга часу, інфінітыва (калі аснова інфінітыва і прошлага часу не супадаюць, назваць і аснову прошлага часу); 4) пераходны ці непераходны; 5) зварот-ны ці незварогны; 6) стан: залежны ці незалежны; 7) трыванне: закончанае ці незакончанае; 8) лад: абвесны, загадны, умоўны; 9) час: цяперашні, прошлы (просты ці складаны), будучы (просты ці скла-даны); 10) асабовы ці безасабовы; 11) асоба; 12) лік; 13) спражэнне; 14) род (для формы прошлага часу); 15) сінтаксічная функцыя. Інфінітыў: 1) аснова; 2) пераходны ці непераходны; 3) зваротны ці незваротны; 4) стан; 5) трыванне; 6) сінтаксічная функцыя. Выпішыце з тэксту дзеясловы, ахарактарызуйце іх паводле табліцы.**

Каля крыжавых дарог пад узгоркам разрасліся кусцікі: пад'ядловец, сухадрэўка і лаза. Кусцікі былі дробныя. Гулялі ветры лютыя і абрывалі лісточкі з іх; праляталі навальніцы страшэнныя і крышылі галінкі іх; каціліся паводкі глыбокія і падмывалі карэньчыкі іх. Дрэнна, зусім дрэнна стала жыць кусцікам...

Вось у цёмныя ночкі сталі шаптацца паміж сабой кусцікі, каб як долю сваю паправіць. Раіліся, раіліся і, урэшце, прыдумалі ўзгадаваць паміж сябе такое велі-зарнае дрэва, каторае б густымі лістамі сваімі ад ліхіх ветраў закрывала іх, вялікімі галінамі сваімі ад страшенных навальніц сцерагло, тоўстымі каранямі сваімі ад глыбокіх паводак бараніла.

Траплялася не раз, памяталі кусцікі, як паміж іх за-лятали зярняты з вялікіх дрэў, але яны і ўвагі на іх не звярталі: паляжыць гэтакае насенне, паваляецца, і то вецер далей яго гоне, то яно засохне і згіне. Але цяпер — пасля нарады — на першае зерне, якое да іх трапіла, сыпнулі кусцікі сваімі лісточкамі і іголачкамі і, гэтак прыкрыўшы, сталі шанаваць і сцерагчы яго. З пестуна на другі год—на вясну — паказаўся расток, і пагнала яго ўгару. Цешыліся' кусцікі, каб даць выгоду свайму гадунцу, не жалеючы, падсыпалі і падсыпалі яму то лісточкаў сваіх, то іголачак.

Шмат часу прайшло з таго часу, але ўсё ж ткі прыждалі кусцікі, калі іх гадунец-дрэва разраслося на ***здзіў*** высокае, на здзіў шырокае, на здзіў густое.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Надзея кусцікаў, што вось-вось цяпер настане для іх новае, спакойнае, лепшае жыццё, цешыла іх бязмерна.

І праўда. Тоўстае карэнне, вялікія галіны, густыя лісты баранілі іх ад ворагаў: паводак, навальніц, ветраў,— але гадунец гэты закрыў ім і... сонца.
І — пагінулі кусцікі!..

*(Ядвігін Ш.)*

## ДЗЕЕПРЫМЕТНІК І ДЗЕЕПРЫСЛОЎЕ ЯК ГІБРЫДНЫЯ ДЗЕЯСЛОЎНЫЯ ФОРМЫ

**1. Спішыце, падкрэсліце дзеепрыметнікі. Назавіце прыметы дзеяслова і прыметніка, уласцівыя дзеепрыметнікам. Растлумачце, на якой падставе ў некаторых працах дзеепрыметнік разглядаецца як асобная часціна мовы, а не як форма дзеяслова.**

1. І я дамоў, хоць зморапы, вярнуўся, каб маладую змену прывітаць, каб свае песні роднай Беларусі і прыдарожным соснам перадаць *(М. Т.).* 2. Белыя валокны сонейкам заліты, вольны ім дарогі, сцежкі ім раскрыты *(К-с).* 3. За возерам, на сухой імшары, неспадзявана затрубіў лось, б'ючы калытом прымоўклую зямлю *(Чыгр.).* 4. Нельга перабіваць спевака, пакуль ён захоплены песняй *(Б.).* 5. Ласіны востраў быў адрэзаны ад усяго навакольнага *(Шам.).* 6. Дрэмле абсаджана лесам адвечным, цінай засланае возера ў лесе *(Куп.).* 7. На доўгіх століках, уроссып, як карапузы-хлапчукі, нядаўна вымытыя ў росах, на сонцы спяць баравікі *(Пл.).* 8. За-будзь трывогу вечную сваю, прыляж, мая натомленая мама, як некалі ты мне, табе спяю *(Н. М.).* 9. Ёсць плошча на зямлі — няма такой другой,— там Маўзалей стаіць, асветлены зарой *(М. Т.).* 10. Спакойна спіце над затокай, вяршыні неабсяжных гор, дажджом набраклыя аблокі, палёў квітнеючых прастор! *(М. Т.).*
11. Ускрыкнула ад неспадзеўкі кнігаўка: заместа зледзянелае лазінкі ўскалыхнуўся сонечны прамень *(Н. М.).* 12. Не-патрывожаная жнівеньская ноч усё кружыла над саламянымі стрэхамі стоенай вёскі, як зацяты птах *(Чыгр.).*

**2. Спішыце тэкст, падкрэсліце дзеепрыметнікі і залежныя ад іх словы; вызначце стан, час, род, лік, склон дзеепрыметнікаў.**

Хлопец з намаганнем расплюшчыў вочы, і першае, што ўбачыў, была яр'ка-чырвоная кветка ля твару. Нахіленая ў бок святла, яна ўлюбёна падстаўляла сонцу свае чатыры шырокія глянцавітыя пялёсткі, на краі аднаго з якіх ірдзела-іскрылася, гатовая вось-вось упасці, чысцюткая, як сляза, кропля...

Буйныя, лапушыстыя, пэўна, не таптаныя нагой чалавека, узгадаваныя вялікай шчодрасцю прыроды мільёны кветак пераліваліся ўрачыстаю чырванню, ціха варушыліся на слабым ветрыку, імкнулі далёка ўніз, на ўвесь прасцяг гэтага затуленага гарамі луга — аж пад самы цёмна-зялёны хваёвы масіў. Далёка за далінай снегавымі разводамі сінеў усё той жа высачэзны Мядзведжы хрыбет. Мусіць ён быў куды вышэйшы за пройдзены... Не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

заслонены цяпер нічым, ён, бадай, як і ўчора, заставаўся далёкім, аграмадназіхоткім і недаступным.

І тут Іван трывожна схамянуўся — толькі цяпер да ягонай свядомасці дайшоў трывожны сэнс цішыні, у галаў ударыў сполах: дзе Джулія?.. Побач, у вытаптаным сярод маку лаўжы, адзінока ляжала разасланая скуранка. Але першая трывога яго тут жа апала — пісталет і абкрышаная трэць буханачкі, пэўна, захінутыя ад сонца рукавом скуранкі, ляжалі ў траве...

Ён схапіў пісталет, хлеб, згроб пад паху скуранку і сігануў у траву. Росныя высокія кветкі казытнулі яго распухлыя, падзёртыя і пазбіваныя ступні...

*(В. Быкаў)*

**3. Раскажыце пра ўжыванне поўных і кароткіх дзеепрыметнікаў у беларускай літаратурнай мове. Спішыце сказы, поўныя дзеепрыметнікі падкрэсліце адной рыскай, кароткія — дзвюма; вызначце сінтаксічную ролю ў сказе поўных { кароткіх дзеепрымегнікаў.**

1. А пры сцяжыне — сімвалам вечнага абнаўлення — стаяла юнае, нікім не кранутае дрэўца *(Б.).* 2. Чужая старана тугою арана, слёзкамі засявана *(Прык.).* 3. Журботна-ласкавая ўсмешка восені разліта на знямелых, як бы заснуўшых далях *(К-с).* 4. Абрысы хат з заснежанымі стрэхамі зводдалі ў цемры нельга было ра-забраць, і агеньчыкі нагадвалі буйныя зоркі, што ўпалі з неба на снегавое раздолле *(Хадк.).* 5. Хвалююць, радуюць сустрэчы з новымі талентамі, новымі праўдзівымі, глыбокімі, сэрцам напісанымі кнігамі *(Б.).* 6. Растросшы на ветры тонкае голле, жалобна шумелі зрудзелым лісцем бярозы *(В. Б.).* 7. Буслы на ссечаных дубах як напамін, як боль па стратах, па тых, хто ссечан, хто ў баях згарэў, над кім карэнні траў спляліся *(А. П.).* 8. А ўначы, калі выпадала хвіліна заснуць, яму [Дземідзёнку] снілася ўнучка і прыцярушаная снегам сцежкада партызанскіх зямлянак *(Чыгр.).* 9. Зарослая травою алея, паабапал якой стаяў змрочны, як лес, парк, давяла мяне да агароджы *(Каратк.).* 10. Ілюстрацыйныя прыклады, запісаныя руплівым даследчыкам у розных кутках рэспублікі і часткова запазычаныя ім у папярэднікаў, разгортвалі перада мной жывую, паэтычную карту роднай мовы, хвалявалі душу яе нелінючымі фарбамі, крынічным звонам яе несмяротнасці *(Б.).* 11. Кожны мае дружбака такога, захавана ў сэрцы да якога прыязні даўнейшай цеплыня *(А. К.).*

**4. Спішыце сказы, утварыце ад дзеясловаў, што ў дужках, дзеепрыметнікі. Падкрэсліце дзеепрыметныя словазлучэнні, растлумачце знакі прыпынку пры іх.**

1. Эх, шляхі, родныя шляхі! Хто перакажа нам вашы казкі, разгадае думкі, (назбіраць) і (напісаць) часамі на камлях вашых прысад? *(К-с).* 2. Ціхім сумам ахіналіся думкі, калі перачытваў (паліняць), (выцвісці) радкі *(Лыньк.).* 3. Першы выезд у лес на санях. Хораша ўсё гэта выглядае, калі на шэрую зямлю, на лёд ракі і выбоі (разбіць) за восень дарогі пасцелецца вялізнае палотнішча іскрыстай снежнай белі! *(Б.).* 4. Люблю цесны дворык брыгадзіра са студняю 'пасярэдзіне двара, (пасівець) агароджу з дубовымі слупамі, (парасці) белым мохам *(К-с).* 5. Дольцы! Дольцы! Хай цяжка, хай горка жылося, кут мой родны, (забыць) калісьці на свеце, прыгадаць не магу, каб не

білася сэрца *(Бр.).* 6. На тым беразе загарэлася іскра, мусіць, неасцярожны вартавы запаліў папяросу, (закалыхаць) цішынёю ночы... *(Лыньк.).* 7. Раса шукае выйсця — (стрывожыць) вецярком, з (пажоўкнуць) жылкаватых лісцяў, нібы з далоняў, лье цурком *(Панч.).* 8. Свіцязь. (Асланіць) дубам! і ліпамі, ласкава (пакрыць) снегам малое возера, якое праз адну душу ўлілося ў вялікую паэзію *(Б.).*
9. Іх здзівіў цудоўны квартал горада, (абнесці) сцягамі *(Гр.).*

**5. Спішыце сказы, дапішыце прапушчаныя суфіксы, растлумачце правапіс галосных у суфіксах выдзеленых дзеепрыметнікаў.**

1. Напэўна, нашым песням лёс падараваў вітальную, сваю няўрымслівую сілу, *насто…ую* на цяністым шуме траў, на водары малін, крушын і жывасілу *(М. Т.).* 2. Пахла зямля, багата *акропл…ая* расою *(К-с).*3. Дзяўчына з вачамі гарачага поўдня праменнымі пальцамі песціць старанна смычок свой разгнева...ы, усхвалява...ы, галубіць яго, як раўнівага маўра, а ён усё стогне пад рогат літаўраў *(М. Т.).* 4. Каля вежы старое павольна ідзём, ні трывога, ні клопат настрою не засцяць. Вось малая рачулка, а зараз і дом, дзе нам сэрцы і дзверы *адчын…ы* насцеж *(Луж.).* 5. Падпалкоўнік, пазіраючы ў цемру, за якой хаваўся нябачны правы бераг, хвіліну з прагнасцю ўбіраў насыча...ы вільгаццю дняпроўскі вецер (7. *М.).* 6. Узнімаю я коўш вінаграду, *напоўн…ы* цераз кр.ай *(Бр.).* 7. Лясы, лясы і пералескі, ды непра-лазныя кусты; лістом завея...ыя сцежкі; і сініх зораў дождж густы *(М. Т.).* 8. Кожны з нас прыпасае Радзімы куток, каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны — дым над хатай, снапамі прыцісну...ы ток, матчын спеў і гароды, прапах...ыя кмінам *(Панч.).* 9. Над щ'хай *стомл…най* вёскай — шчодра зорнае неба і самотны, сарамлівы маладзік *(Б.).* 10. Мяцеліца сцелецца, кружыць, звонам сцюдзёным налі...ы прастор *(Ал.).* 11. У цвеце нівы, цвітуць асмуг...ыя сады *(Тр.).*

**6. Раскажыце пра ўжыванне дзеепрыметнікаў у беларускай літаратурнай мове. Утварыце ад дзеясловаў уласцівыя беларускай мове дзеепрыметнікі, запішыце, падкрэсліце суфіксы, растлумачце іх правапіс.**

Прыціхнуць, рассыпаць, развеяць, засеяць, парыжэць, пасівець, зарасці, выцвісці, утрымаць, усвядоміць, застыць, пацямн'ець, вывучыць, упрыгожыць, расклеіць, падзяліць, накарміць, аднавіць, расплавіць, скасіць, падвоіць, замкнуць, прапалоць, пасінець, раскалоць, разбіць, вымыць, злавіць, пачырванець, заснуць, паражыць, прыехаць, счарсцвець, адчыніць, зацмець, замігцець, спарахнець, змалоць, абгарнуць, заткнуць, падцягнуць.

**7. Выпішыце дзеепрыметныя словазлучэнні. Зрабіце разбор дзеепрыметнікаў у наступным парадку: 1) пачатковая форма (назоўны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду); 2) трыванне (незаісончанае, закончанае); 3) стан (незалежны, залежны); 4) час (цяперашні, прошлы);5) род (для дзеепрыметнікаў адзіночнага ліку); 6) лік; 7) склон (для поўных дзеепрыметнікаў); 6) сінтаксічная функцыя.**

1. Асірацелыя старыя дубы ў чорных шапках бусліных гнёздаў спакойна стаялі, не варушачы ніводным лістам, і купалі ў сонцы свае адвечныя лапы. На скошаным лузе, недалёка ад дубоў, пасвіліся статкі *(К-с). 2.* Але, як зярняты з угрэтай раллі, слязамі і кроўю палітыя, ізноў прарасталі, буялі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цвілі бяссмертныя родныя літары *(Пл.)*. 3. Заснуў пасёлак анямелы, даўно патушаны агні *(К-с)*. 4. З таемнай красавіцкае глушы зязюлямі гукалі пералескі, а ў поўным запацелым гладышы твае сінелі вочы, як пралескі *(Грах.)*. 5. Вось і май прыйшоў неўпрыкметкі, зноў рассыпаны ля берагоў адуванчыкі — рыжыя кветкі, залатыя вяснушкі лугоў *(Панч.)*. 6. Сярод папераў пастарэўшых, сярод запыленых лістоў радкі даўно забытых вершаў неспадзявана я знайшоў *(М. Т.)*. 7. Нямала ёсць дарог. Я кожную прайсці як найхутчэй імкнуся, бо ведаю: сабе ў жыцці ніколі не даруеш няпройдзенай найменшай сцежкі, як не даруеш несустрэтае вясны ці не прапетай песні *(М. Т.)*.

**8. Раскажыце пра пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі і назоўнікі. Спішыце сказы, падкрэсліце дзеепрыметнікі, што перайшлі ў прыметнікі ці назоўнікі.**

1. Мурог! Ды што за травіца! І шоўк у ёй мяккі і лён, і вечная наша крыніца з гаючай жывіцай-вадзіцай ад бацькаўскіх, дзедаўскіх дзён! *(К-с)*. 2. Цуд не бывае нечаканы, не спраўдзіцца яму раптоўна: жаданы пасля ночы ранак, з карэньчыка ідуць бутоны *(Н. М.)*. 3. Ах, чаму я, калі нарадзіўся, чараўніцтву ў бабулі не ўчыў-ся! Не падгледзеў, якою вадою акрапляла яна ўсё ліхое; скуль прыносіла траваў дрымучых, каб вярнуць сон спакойны, гаючы *(М. Т.)*. 4. Незнаемых залётных гусей прытуліла ракіта густая *(Ал.)*. 5. Вось і цёмны той бор з векавечнымі соснамі, з моцным пахам смалы і лясной цішынёй, дзе з каханым хадзіла шчаслівымі вёснамі *(Бач.)*. 6. Словы нямецкай гаворкі, нямецкай каманды даляталі да сапёра, адразу неяк працверазілі ўсе яго думкі, адхінулі ўбок усё пражытае, усё перабачанае за дзень *(Лыньк.)*. 7. З роўных, як панацягватыя струны, берагоў глядзяцца ў чыстае вадзяное люстэрка ракі рослыя стройныя алешыны *(Р. М)*. 8. Радзіма, Радзіма! Зямля маіх продкаў, гаворка пявучая, песня-душа! Сціскалася сэрца ад болю салодкага, ад горнай любові, пазнанай спярша *(Зв.)*. 9. Ён стаяў спіной да старой, быў у белай міліцэйскай форме, у бліскучых ботах, у фу-ражцы з чырвоным аколышам, з сумкай на баку,— нейкі незнаемы ў новай сваёй вопратцы, але маці па тым, як ён трымаў галаву, па тонкай загарэлай шыі, па сваіх, адной ёй вядомых прыкметах, пазнала, што гэта ён. Сын! *(І. М.)*. 10. Ліпеньскае сонца падымаецца ў поўдзень. Пякучае, расплаўленае — разлівае ліпкую стому і смагу *(Скр.)*. 11. Слава сейбіту мудраму, слава, роднай партыі слава ў вяках за яе неўміручыя справы, за шырокі і сонечны шлях *(М. Т.)*.

**9. Спішыце сказы. Падкрэсліце дзеепрыметнікі з аслабленым значэннем дзеяння і ўзмоцненым значэннем прыметы. Ахарактарызуйце стылістычнае ўжыванне гэтых дзеепрыметнікаў у сказах з твораў Я. Брыля.**

1. Жыццесцвярджальным, радасным смехам іскрыліся радкі Пімена Панчанкі, які па-салдацку ахвотна і шчодра дзяліўся з чытачом сваім тады ўжо шырока-далёка праслаўленым словам. 2. Маладзенькі наборшчык нашай друкарні — цяпер салідны дырэктар вясковай дзесяцігодкі, а тады цыбаты, смяшлівы падлетак — крадком узлазіў ноччу на хрыбет зямлянкі і доўга стаяў там — ці то заслуханы ў даўно і горка чаканы гул, ці то выглядаючы, калі ж яны, таварышы, прыйдуць: цяпер ці пад раніцу? 3. Шчымлівае адчуванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

блізкасці, сваяцтва з бедным украінскім хлопчыкам, які нікога не ўмее, не можа, не хоча пакрыўдзіць, які ідзе ў наш вялізны, загадкавы свет, заслухаўшыся ў яго рассяваную, зіхатліва шматфарбную ашаламляльную красу. Вобраз як быццам і не новы, напамінае нечым і Сянкевіча, і Караленку, і Коласа, і іншых, аднак вобраз жыццёвы, блізкі. 4. За апошнія два з палавінай гады з'явіліся ў выдатных і добрых перакладах паэмы і вершы ўспомненага ўжо Лангфела, Лермантава, Сыракомлі, Зульфіі... 5. З густой імглы, празрыста падрумяненай усходам сонца, на мяне пазірала казуля. 6. Руіны Мінска ўспамінаюцца яшчэ ўсё настылымі ад пажараў ды выбухаў. 7. Апроч падарожжаў успомненых па Югасланіі і Украіне, былі ў нас Карэлія з Кіжамі, Салаўкі, Енісей і Таймыр, Магнітагорск з невялікім узмежкам горнай Башкірыі. 8. Чаму — падумалася цяпер — за сімвал міру ўзяты голуб, а не дзіця? Замурзанае, рассмяянае дзіця!..

**10. Прачытайце сказы на рускай і беларускай мовах. Прааналізуйце пераклад рускіх дзеепрыметнікаў на беларускую мову.**

...Издали уже веяло прохладою, которая казалась ощутительней после томительного, разрушающего жара *(Н. Гоголь)*. -- Ужо здалёк павявала прахалодаю, якая здавалася адчувальней пасля зняможлівай, разбуральнай спёкі *(пераклад М. Лужаніна)*.

Николай бегло оглядел знакомые, осунувшиеся и почерневшие лица *(М. Шолохов)*. -- Мікалай бегла агледзеў знаёмыя, забытыя і пачарнелыя твары *(пераклад М. Лужаніна)*.

Разбежавшийся пароход с мягким стуком ударился в тускло освещенную пристань... *(И. Бунин)*. -- З разгону параход з мяккім стукам ударыўся ў цьмяна асветленую прыстань... *(пераклад Я. Скрыгана)*.

Вспыхивают спички, сверкают красные огоньки папирос, освещая задумавшихся людей, прищуренные или широко открытые глаза *(М. Горький)*. -- Успыхваюць запалкі, паблісквaюць чырвоныя агеньчыкі папярос, асвятляючы задуманых людзей, прыжмураныя ці шырока адплюшчаныя вочы *(пераклад Я. Брыля)*.

Для такого великодушного акта, как уничтожение себя ради ближнего, нужна возмущенная, сострадающая душа *(А. Чехов)*. -- Для такога велікадушнага акта, як знішчэнне сябе дзеля бліжняга, патрэбна абураная, спагадлівая душа *(пераклад К. Крапівы)*.

Вдали глухо, точно изпод земли, слышался все возрастающий грохот *(И. Бунин)*. -- Удалечыні глуха, як знад зямлі, чуўся ўсё большы і большы грукат *(пераклад Я. Скрыгана)*.

— Вы мыслящий и вдумчивый человек *(А.Чехов)*.-- — Вы ўдумлівы і здольны мысліць чалавек *(пераклад К. Крапівы)*.

Успыхваюць запалкі, паблісквaюць чырвоныя агеньчыкі папярос, асвятляючы задуманых людзей, прыжмураныя ці шырока адплюшчаныя вочы *(пераклад Я. Брыля)*. -- ...Для такога велікадушнага акта, як знішчэнне сябе дзеля бліжняга, патрэбна абураная, спагадлівая душа *(пераклад К. Крапівы)*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Я вижу, как Наденька выходит на крылечко и устремляет печальный тоскующий взор на небо *(А. Чехов).* -- Я бачу, як Надзейка выходдзіць на ганак і журботна, тужліва глядзіць на неба *(пераклад У. Шахаўца).*

Неисповедимы пути, по которым доходит до правды ревнующий человек *(И. Бунин).* -- Невядомыя шляхі, па якіх даходзіць да праўды, раўнуючы, чалавек *(пераклад Я. Скрыгана).*

Черевик заглянул в это время в дверь и, увидя дочь свою, танцующую перед зеркалом, остановился *(Н. Гоголь).* -- Чаравік зазірнуў у гэты час у дзверы і, убачыўшы, як дачка яго танцуе перад люстэркам, спыніўся *(пераклад М. Лужаніна).*

Ей было семнадцать лет и жила она у папаши и мамаши, торгующих мылом и свечами *(А. Чехов)..* -- Ёй было 17 год, і жыла яна ў бацькі і ў маткі, якія гандлявалі мылам і свечкамі *(пераклад А. Кулакоўскага).*

Неприятный, сердитый голос доктора и его неуклюжая, заикающаяся речь производили в ее ушах и голове резкий стучащий шум, потом же ей стало казаться, что жестикулирующий доктор бьет ее шляпой по голове *(А. Чехов)..* -- Непрыемны, сярдзіты *голас* доктара і яго няўклюдная, заіклівая гаворка напаўнялі яе вушы і галаву рэзкім, траскучым шумам, а пасля ёй пачало здавацца, што, жэстыкулюючы, доктар б'е сваім капелюшом ёй па галаве *(пераклад І. Грамовіча).*

— Неправда! — выговорила она тихо и умоляющим голосом *(А. Чехов)..*-- — Няпраўда! — вымавіла яна ціха, з мальбой у гол асе *(пераклад І. Грамовіча).*

Но вскоре южный ветер прошелся низом, влажным прахом рассыпался отживший свое кленовый лист, дрогнув, скатилась на землю капля, и тотчас, вся затрепетав, выпрямилась, поднялась травинка — одинокая, жалкая, неприметная на огромной земле, но упорно и жадно тянущаяся к вечному источнику жизни, к солнцу *(М. Шолохов).*-- Але неўзабаве паўднёвы вецер прайшоўся нізам, вільготнай парахнёй рассыпаўся, аджыўшы свае, кляновы ліст; здрыгануўшыся, скацілася на зямлю кропля, і адразу ж, уся затрапятаўшы, вы-прасталася, паднялася травінка, яна была адзінокая, мізэрная, непрыкметная на вялізнай зямлі, але ўпарта і прагна цягнулася да вечнай крыніцы жыцця, да сонца *(пераклад М. Лужаніна).*

**11. Перакладзіце тзкст на беларускую мову. Звярніце ўвагу на ўжыванне дзеепрыметнікаў у рускім і беларускім тэкстах.**

I. Без шапки Стрельцов вышел на крыльцо. Но не так, как в былые годы, воспринял он теперь свист утиных крыльев в темном небе, и уже не с прежней силой охотничьей страсти взволновал его стонущий и влекущий в неведомую даль переклик гусиных стай. Иначе выглядело сейчас все, что окружало Стрельцова. Иным казался ему и весь необъятный, весь безбрежный мир, проснувшийся к новым свершениям жизни...

Дождь все усиливался. Косой, мелкий, спорный, он по-летнему щедро поил землю. Подставив открытую голову дождю и ветру, Стрельцов жадно шевелил ноздрями в тщетной надежде уловить пресный запах оттаявшего чернозема,— нахолодавшая земля была бездыханна. И даже первый после зимы дождь —

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бездушный и бесцветный в предутренних сумерках — был лишен того еле приметного аромата, который так присущ весенним дождям.

Он накинул на голову капюшон плаща, пошел к конюшне, чтобы подложить коню сена. В конюшне было тепло и сухо. Пахло далеким звенящим летом, степным улежавшимся сеном. Стрельцов зажег фонарь, положил в ясли сена, сбросил с головы намокший капюшон.

...Он снял висевший на гвозде фонарь, но не погасил его, а зачем-то поставил на пол, присел на лежащее возле двери седло, закурил. Воронок круто изогнул шею, посмотрел на понуро сидящего хозяина, потом стал лениво пережевывать хрупающее на зубах сено. Грустно пахло увядшими степными травами, по-осеннему шепелявил, падая на камышовую крышу, частый дождь, брезжил мутный, серый рассвет...

*(М. Шолохов)*

**12. Спішыце, падкрэсліце дзеепрыслоўі. Назавіце прыметы дзеяслова і гтрыслоўя, уласцівыя дзеепрыслоўям. Растлумачце, чаму ў некаторых працах дзеепрыслоўе разглядаецца не як форма дзеяслова, а як асобная часціна мовы. Якія ёсць для гэтага падставы?**

1. Думаў радасна, прыйшоўшы з праходкі па першым марозіку са сняжком, што і чытаць — вялікае шчасце, што гэтага шчасця было ў маім жыцці так многа! *(Б.). 2.* Зажурылася вішня ў цішы і чакае кагосьці, свой твар захінуўшы пуховай хусцінкай *(Панч.).* 3. Не адступаючы ніколі, за ўсё, што ёсць, баі вялі — ад першых сеялак на полі да спадарожнікаў зямлі *(Хвед.).* 4. Скончыўшы навучанне і прагледзеўшы работы вучняў, Лабановіч часта падводзіў падрахункі дню *(К-с).* 5. Мінуўшы лес, лейтэнант вывеў групу на раўнінны прырэчны прасцяг, і лыжнікі доўга зморана ішлі па прамой *(В. Б.).* 6. Дарога павярнула ўлева, пайшла грудамі, шчыльней тулячыся да Немана, дзе ён апісваў вельмі зграбную луку, падыходзячы да лесу *(К-с). 7. А* лес, як добры той знаёмы, стаіць збялелы, нерухомы абапал рэчачкі сцяною, над ею сплёўшыся страхою, далека кінуўшы галінкі *(К-с).* 8. Наталя любіла выпраўляць дзяцей у школу, пра кожнага непакоячыся, кожнага аглядаючы, а пасля чакаць — з хвіліны на хвіліну, аж пакуль не паяўляліся яны ў дзвярах, прыносячы з сабой шум, гаману, свае дзіцячыя клопаты *(Скр.).* 9. Міхал ідзе зуды, на поле, дзе Неман, выгнуўшыся дужкай, абводзіць лес прыгожай стужкай *(К-с).* 10. Дзесьці там, далека, на тым беразе, прагудзеў мілагучны звон і пранесліся гукі ў цёмных пахучых туманах ночы, скалыхнуўшы паветра медна-шаўковымі невядомымі хвалямі *(Лыньк.).*

**13. Спішыце, пастаўце знакі прыпынку. Вызначце сінтаксічную ролю дзеепрыслоўяў і дзеепрыслоўных словазлучэнняў.**

1. Шаша перад намі набягае і набягае то вьшучваю-чыся то ападаючы ўніз загінаючы то ўправа то ўлева ледзь пасляваючы паказваць свае падарожныя знакі *(Скр.).2.* Заплюшчыўшы вочы засынаючы ўжо Апейка падумаў што трэба ўсе гэтыя дні пакуль лета аддаць калгасам — памагчы ўмацавацца ім (7. *М.).* 3. Падаючы і ўскокваючы Валошын ужо выбягаў з хмызняку калі спаткаў яшчэ двух байцоў якія перабягалі паміж разрывамі ў тыл... *(В. В.).* 4. Завёўшы каня за хвойнік на выган Гушка прыйшоў у хату сеў радасна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адчуваючы спачын *(К. Ч.).* 5. Роўна а шостай нібы хвалячыся дакладнасцю Міша ступіў у кабінет далажыў што народ сабраўся чакае *(І. М.).* 6. Па ўсім паднябессі ззяючы навыперадкі несліся адна праз адну дзесяткі агняных трас над вышынёй раз за разам узляталі ўгору ракеты *(В. Б.).* 7. На адной з дзвюх бліжэйшых ліп хаваецца ў кроне буслянка. Мноства разоў на дзень жыхары яе зверху абмахваюць бела-чорнымі крыламі зялёна-залацісты гуд то асядаючы на гняздо то зноў узлятаючы *(Б.).* 8. Я выпусціў шпака упершыню адчуўшы шчасце дань камусьці волю упершыню як быццам зразумеўшы што так яно калі ён на дрэве а я на зямлі калі ён шчабеча а я любуюся — што так яно найлепш *(Б.).* 9. Жураўлі праляталі над полем забіраючы лета з сабой *(К-с).* 10. Нечакана спыніўшыся маці азірнулася на свайго хлопца які таксама з сярпом на плячы пачціва ішоў ззаду запавальняючы хаду па-пастушынаму «клюючы» салодкі жытні каласок *(Б.).* 11. Шчыра ён [Майбарада] працуе не шкадуючы ні сваіх рук ні часу *(Скр.).*

**14. Раскажыце пра адноснае абазначэнне часу дзеепрыслоўямі. Запішыце сказы, вызначце, якое дзеянне абазначаюць выдзеленыя дзеепрыслоўі закончанага і незакончанага трывання — адначасовае з асноўным, выражаньш дзеясловам-выказнікам, ці папярэдняе.**

1. Ні пра што *не забыўшы* ад той гераічнай.і грознай пары, больш за ўсё ты [Радзіма] вартуеш спакой, больш за ўсё цэніш міру дары *(Пл.).* 2. На вуліцы гарэў ліхтар, бледнае святло клалася на падлогу, *вырысоўваючы* квадрат акна *(Скр.).* 3. Буслы, *пакружыўшыся* для размінкі над родным дубам, пачалі садзіцца на гняздо *(В.).* 4. Не *хапаючыся, не высільваючыся,* ашчадна *трацячы* сілу, мерным, спрактыкаваным рухам вадзіў Васіль касою (*І. М.).* 5. Каб убачыць я мог, як вяртаецца бацька з сяўбы, *несучы* на плячах змрок вячэрняга неба і надзею на ўраджай і на заўтрашні дзень, часта маці мяне на руках падымала *(М. Т.).* 6. Сонца, *зрабіўшы* свой штодзённы кругабег, апусцілася зусім нізка і, *стаміўшыся,* пачало хіліцца на захад *(Сач.). 7.* Машына імчыць, гудзе, *адкрываючы,* на кожным павароце ўсё новыя і новыя дзівы *(Скр.). 8. Зразумеўшы,* што трапілі ў засаду, хлопцы кінуліся ў розныя бакі і, ужо *бегучы,* пачулі голас Кудраўцава, які крычаў: «Таго, таго лавіце, у кубанцы!» *(В. Б.).* 9. Яшчэ дзесятак метраў быстрыні, і рукавы рэчкі, *вырваўшыся* з-за вострава на шырыню, злучыліся *(Б.).* 10. Дзіву даешся, *чытаючы* гэтыя старонкі [Янкі Скрыгана],— так многа пераЖыць і захаваць зайздросную, амаль юнацкую свежасць пачуццяў, закаханасць у жыццё!.. *(Б.).* 11. Старая вярба, *стоячы* над самай хатай, шумела і хістала галінамі па страсе *(К-с).* 12. *Едучы* аўтобусам з Баранавіч у Навагрудак, я любаваўся прыгажосцю надсвіцязянскай восені — дарогай у залатым тунелі ліп і клёнаў, ірдзеннем рабінавых гронак на фоне свежай, зноў засеянай зямлі *(Б.).*

**15. Запішыце сказы, падкрэсліце дзеепрыслоўі. Вызначце, ад якіх дзеяслоўных асноў (цяперашняга часу, інфінітыва, прошлага часу) і з дапамогай якіх суфіксаў яны ўтварыліся.**

1. Зямля Радзімы! У сэрцы боль салодкі хто не адчуў, сустрэўшыся з табой? *(Зв.).* 2. Нас памяць, нібы кананада, не моўкнучы, дасюль калыша *(П. М.).* 3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пра вечнае, агульналюдское добра думаць, правяраючы гэтай меркай сілу і вартасць сучаснага *(Б.).* 4. Многа гадоў назад Мінск прыняў мяне на свае вуліцы і, падгадаваўшы крыху, кінуў у самы вір гарачай работы *(Луж.).* 5. У тую ноч за возерам, на сухой імшары, неспадзявана затрубіў лось, б'ючы капытом прымоўклую зямлю *(Чыгр.).* 6. Спяшайцеся ў ціхую раніцу гэткую ўсе, хто хоча пачуць, як, слізгануўшы па расіне, звініць першы промень *(Я. С).* 7. Падсілкаваўшыся яблыкамі, узбадзёраны сваім разумным учынкам, Пятро рушыў далей і яшчэ да цямна мінуў балота, густы сасновы лес і прыйшоў у вялікую незнаемую вёску *(Шам.).* 8. Не спяшаючыся і разглядаючыся, пачаў Лабановіч хадзіць ла рынку, шукаючы сялянскіх падвод *(К-с).* 9. Мяккія, ласкавыя гукі стройным сугалоссем паліліся па пакоі, напаўняючы яго прыемным звонам і навяваючы якіясь добрыя, ціхія чары *(К-с).* 10. Апрануўшы халат, які дала ёй галоўны ўрач, Саша ўзбегла на другі паверх і толькі перад дзвярамі знаёмай палаты перавяла дыхание *(Шам.).* .

**16. Замест дзеясловаў, што ў дужках, запішыце адпаведныя дзеепрыслоўі, вызначце іх трыванне, падкрэсліце суфіксы.**

1. Падрыхтавалі пазіцыю, размеркавалі на ёй байцоў, (заняць) два бакі дарогі і (пераняць) яе трохі далей, у лесе *(К-с).* 2. (Дачакацца) раніцы, я пайшоў адведаць сяброў *(Луж.).* 3. Дзедава вёска, Падвалока, стаіць на паўднёвым схіле нешырокай паўвыспы, якая, (урэзвацца) ў возера доўгай касой, падзяляе яго на дзве затокі *(Б.).* 4. Максім зусім аціх і, (заплюшчыць) вочы, без пілоткі на чорным чубе высока ляжаў галавой на белай падушцы, ужо не (глядзець) у неба *(Б.).* 5. І са сцягам былым да сяла, франтавыя прысады (абудзіць), брыгада ішла *(А. К.).* 6. Ляўчук, (прыслухоўвацца) да наваколля, доўга нёс камандзіра праз маўклівы насцярожаны лес *(В. Б.).* 7. А краскі ніжай гнуць галовы, (пачуць) косак звон сталёвы *(К-с).* 8. А як жа добра бывае, калі, (прачытаць) чужое, можна сказаць зусім па шчырасці, што нешта ёсць, што нешта будзе!.. *(Б.).* 9. (Углыбіцца) ў свае думкі, Базыль нічога не заўважаў і сядзеў усё на тым жа дубовым корані *(К-с).* 10. Лес, нерухліва (звесіць) свае галіны, маўкліва слухаў гэты гімн вясне і маладому жыццю *(К-с).*

**17. Ад наступных дзеясловаў утварыце дзеепрыслоўі незакончанага трывання, запішыце іх, падбярыце адпаведныя дзеепрыслоўі рускай мовы. Ці ад усіх дзеясловаў утвараюцца дзеепрыслоўі незакончанага трывання ў рускай мове?**

Гаварыць, ісці, пастукваць, рабіць, сустракаць, асвятляць, браць, шыць, жаць, ліць, біць, віць, піць, несці, чытаць, пісаць, рэзаць, мазаць, касіць, хадзіць, бегчы, званіць, адцвітаць, замярзаць, прыносіць, радавацца, заглядваць, даравацца, вывешваць, перавозіць.

**18. Параўнайце дзеепрыслоўі ў сказах з рамана І. Мележа «Людзі на балоце» і перакладзе на рускуго мову, абазначце суфіксы дзеепрыслоўяў. Дайце гістарычны каментарый да паходжання беларускіх і рускіх дзеепрыслоўяў.**

1. З другога боку, на поўнач, балоты крыху адступалі, дорачы людзям пясчанае поле. --. С другой стороны, на север, болота чуть отступали, даря людям песчаное поле.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Жмурачыся ад сонца, на ганку Васіль ус-помніў пра гэты клёкат, паслухаў — хтосьці блізка адбіваў касу — клё, клё, клё. -- Жмурясь от солнца, Василь на крыльце вспомнил про этот клёкот, прислушался — кто-то поблизости отбивал косу — клё, клё, клё.

3. Абуўшыся, Васіль заклапочана пашаргаў у хату, па-ранейшаму нібы не заўважаючы брата, што, як прывязаны, тупаў услед. -- Обувшись, Василь озабоченно пошаркал в хату, по-прежнему словно не замечая брата, который, как привязанный, топал вслед.

4. Расставіўшы па-мужчынску ногі, моцна ўпінаючыся ў грунт, Васіль размашыста павёў касой, і трава шыркнула, паслухмяна легла злева акуратнай купкай. -- Расставив по-мужски ноги, упираясь в землю, он размашисто повел косой, и трава жвыкнула, послушно легла слева аккуратной кучкой.

5.Хутка Ганна, абняўшы адной рукой брата, другой адбіваючыся ад камарэчы, ляжала каля вогнішча, а Васіль яшчэ сядзеў, праз меру ўважліва пазіраў на агонь. -- Скоро Ганна, обняв одной рукой брата, другой отбиваясь от комарья, лежала у костра, а Василь еще сидел, слишком уж внимательно глядя на огонь.

6. Укрыўшыся з гала-вою ад камароў, ён толькі прыкідваўся, што спіць, але сон не ішоў да яго. -- Укрывшись с головой от комаров, он только прикидывался, что спит, но сон не шел к нему. *(Пераклад П. Кісліка)*

**19. Перакладзіце на беларускую мову, параўнайце, з дапамогай якіх суфіксаў утвараюцца дзеепрыслоўі ў беларускай і рускай мовах.**

1. Падая и вставая, проваливаясь в воронки, Кузнецов пробежал метров пятьдесят в сторону низины. 2. Он несколько раз с ходу падал на колени, выпуская короткие очереди по бугру, а сердце, задохнувшись, звонкими молоточками барабанило в ушах, заглушая внешние звуки... 3. Первый, кого увидел Кузнецов, добежав до пологого ската в низину перед подбитыми немецкими танками, был Уханов. 4. Бессонов резко опустил бинокль, подумав, как выстояла с начала боя эта 76-миллиметровая батарея, которой командовал тот синеглазый, весь собранный, будто на парад, мальчик, готовый, не задумываясь, умереть, и представил на миг, что выдержали люди там, на главном направлении танкового удара. 5. В тоне, во взгляде сумрачная, немальчишеская серьезность, без тени робости перед генералом, будто мальчик этот, командир взвода, ценой своей жизни перешел через что-то, и теперь это понятное что-то сухо стояло в его глазах, застыв, не проливаясь. (*Ю. Бондарев)*

**20. Вызначце, ці правільна ўжыты дзеепрыслоўі ў сказах.**

1. Ён думаў: мала што зямля ў гэтым куточку кепская, але, угнаіўшы яе, урабіўшы, дагледзеўшы, будзе нейк жа расці на ёй. 2. Пасля гэтага Сурвіла пацягся дадому, мармычучы сабе пад нос: — Урабіўшы гэтую камяніцу і гэты лажок, дык тады і паплавец тут можна будзе запусціць. А тым часам, значыцца, перабраўшыся на хутар, тут паша можа быць добрая... 3. І часам, ідучы дадому са станцыі, утаміўшыся выгрузкай дроў з вагонаў, у яго з'яўлялася жаданне як бы хутчэй зноў вярнуцца сюды. 4. Конь ідзе паволі, не спяшаючыся. І, лежачы на мяшках, з заплюшчанымі вачыма, уяўляецца дом.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Гледзячы на вясёлыя твары сяброў, сэрца напаўняецца радасцю. 6. Восенню пад вечар, ідучы дахаты, на мне не было сухой ніткі. 7. Вяртаючыся назад, і здарылася гэта бяда.

**21. Паводле прыкладнага парадку разбору дзеепрыслоўяў складзіце табліцу: 1) зваротнасць — незваротнасць; 2) пераходнасць — непераходнасць; 3) трыванне (незакончанае ці закончанае); 4) дзеяслоўная аснова і суфікс, з дапамогай якога ўтварылася дзеепрыслоўе; 5) сінтаксічная функцыя. Выпішыце са сказаў дзеепрыслоўі, ахарактарызуйце іх па гэтай табліцы.**

1. Бацька сядзіць, задумаўшыся, доўга, і я не чапаю гэтых дум, бо не часта даецца, каб чужое слова кранулася самага дна душы *(Скр.).* 2. Алесь тужыў па свежай баразне, калі яна вясной, нібы ўздыхаючы з доўгачаканай палёгкай, пераварочваецца за плугам з ціхім, песенным вуркатам... *(Б.).* 3. Накрыўшы кепкай нерасчасаную сівізну, дзед выйшаў з хаты, асцярожна рыпнуўшы дзвярыма *(Б.).* 4. Дубы і сосны, не ўмеючы клясціся, заўсёды маўкліва прымалі бой (*І. М.).* 5. Затуліўшыся ад ветру, камбат ціха стаяў ля бруствера, агорнуты ноччу, сцюжай і цішынёй (*Б.).* 6. Мы не пазналі б асалоды, не паспытаўшы гаркаты: здаецца раем тыл заўсёды байцу, які прайшоў франты *(Неп.).* 7. Па нізінах хадзіў туман, сцелючы за сабою сінія халодныя росы *(Скр.).* 8. Асірацелыя старыя дубы ў чорных шапках бусліных гнёздаў спакойна стаялі, не варушачы ніводным лістам (*К-с*). 9. Перакусіўшы, замкнуўшы дзверы і схаваўшы свой ключ у кішэню, Апейка выходзіў на знаёмую вуліцу (/. *М.).* 10. Ён [Толя] і рысаваў, здзіўляючы, радуючы гэтым бацьку, ён быў здатны і штуку якую прыдумаць, і забаўку пацешную зрабіць (*Б.*). 11. Лісцікі, праклюнуўшыся з пупышак, як жаўтароцікі, дзюбкамі ловяць дажджынкі (*Б. М.).*

## ГРАМАТЫЧНЫ СТАТУС ПРЫСЛОЎЯ

**1. Спішыце тэкст. Падкрэсліце прыслоўі. Вусна ахарактарызуйце спецыфічныя рысы гэтай часціны мовы (семантычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя). Параўнайце беларускую назву «прыслоўе» з рускай «наречие» і ўкраінскай «прислівник».**

Па-польску цераспалосіца называецца «шахаўніцай» — ад шахматнай дошкі. Іменна так было б зручней называць вялізныя квадраты і прастакутнікі нашых палёў, бо палосы ў цераспалосіцы — звычайна падоўжаныя і, у большасці, вузкія.

Летась я з групай сяброў-літаратараў быў на Таймыры. Цяпер успомш'лася, з якім хваляваннем, пад прыкры трэск у верталёце, глядзелася зверху на тундру. На яе зялёна-бура-шэрую самотную бязмежнасць, на бліскучую працьму малых і меншых азёр-азярынак, нібы на скуру казачна вялізнага аленя, зусім не казачна пабітую на сотні дзірачак заеддзю, запалярнымі аваднямі. На наша шчасце, як сказалі лётчыкі, дзень быў на рэдкасць сонечны. Хваляванне ўзмацнялася тым, што напярэдадні мы апускаліся ў адзін з нарыльскіх руднікоў. Трэск верталёта спалучаўся ў памяці з магутным грукатам горнага камбайна. Складана было на душы ад такога «вышынна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

глыбіннага» пазнавання гэтай зямлі, незвычайна багатай і сцішна суровай... Назаўтра хваляванне паўтарылася інакш, прасцей. У параўнаўча ціхім пасажырскім лайнеры мы вынырнулі з-за рэдкіх аблокаў у сонечнае, спела-жоўтае, сакавіта-зялёнае Падмаскоўе. Кантраст паміж тундрай і панарамай вялізнай «шахаўніцы» культурных палёў адчуўся па-новаму, як штосьці так па-хатняму ласкава, хораша абжытае... Якраз тады і падумалася пра ёмкасць і дакладнасць польскага азначэння цераспалосіцы.

*(Я. Брыль)*

**2. Выпішыце з тэксту прыслоўі, групуючы іх паводле значэння: азначальныя — якасныя і колькасныя, акалічнасныя — месца, часу, прычыны, мэты.**

I. 1. Назавём гэты ціхі, спакойны, зялёны — з адных толькі хат і садоў пры іх — невялічкі райцэнтр, куды яе даўно ўжо гэтак цягнула, назавём проста і ў той жа час крыху элегічна — гарадок Учора. 2. Ён пачаў гаварыць з госцем на «ты» сумысля — апошнім часам зразумеў, што з усімі гасцямі пачынаць размовы лепей за ўсё менавіта так, проста і бесцырымонна, бо, калі пачынаеш далікатна і дужа культурна, тады цяжка бывае вярнуцца да звычайных чалавечых адносін і нават да звычайных размоў. 3. Нізка над палянаго праляцеў самалёт, і неяк адразу недарэчна запахла бензінам і дымам. 4. Яна плакала неяк супакоена, амаль бязгучна — толькі па плячах, што ўздрыгвалі раз-пораз, ды па слязах якія цёпла мачылі яго далоні, Адам разумеў, што Яна плача.

*(Я. Сіпакоў)*

II. Невялікі цёмна-зялёны двухкрылы самалёт, які тут, як і ўсюды, называюць «страказою», стаяў доўга, пакуль не дачакаўся ўсіх пасажыраў, а потым, ад'ехаўшыся на поле, раскруціў вінт, дрогка падскокваючы, прабег па пожні і ўзняўся ў паветра. У самалёце адразу стала спакойна. Таня нахілілася да акна і ўбачыла, што «страказа» якраз узлятае над іхнім селішчам. Яна заўважыла, як слізгануў на матчыным гародзе цень ад самалёта, убачыла саму маці, якая, узняўшы галаву ўгору і прыкрыўшыся даланёю ад сонца, уважліва глядзіць на самалёт — шчыра выглядае, у якім акне сачыць дачку. Убачыла пеўня на панадворку, слівіну ў садзе, пад якой ляжала пасланая фуфайка — на ёй Таня яшчэ сёння раніцою загарала.

*(Я. Сіпакоў)*

**3. Выпішыце прыслоўі. Побач з вытворнымі прыслоўямі запішыце суадносныя словы зменных часцін мовы.**

Ля дарогі гэтаксама цямнела мярэжа алешніку, кустоўя, далей стаялі спарахнелыя і выпетраныя, даўно ўжо аджыўшыя свой век бураломіны. Па ўсім нагадва -лася, што там, дзе смела працерабіла сабе дарогу асфальтавая шаша, нядаўна яшчэ раскашавалася некранутая чалавечай рукой лясная глуш. Горад пачаўся нечакана. Толькі што было звычайнае поле, і раптам — цагляныя дамы на некалькі паверхаў. Асфальт ляцеў насустрач, а я пільна азіраўся па баках, стараючыся заўважыць прыкметы, якія пацвердзілі б, што мы едзем да нафтаперагоннага завода. Але не знаходзіў іх. У наступную ж хвіліну настолькі нечакана, ажио не паспела ўхапіць вока, ці то з-пад пагорка,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ці проста з-пад зямлі, ірвануўшыся, высягнулі напаверх тоўстыя і дзябёлыя, як бёрны, трубы. Сцелючыся каля самага долу, яны рынуліся, панесліся наперад, абганяючы і ўвесь час пакідаючы за сабой аўтобус. Што яны толькі не выраблялі на сваім шляху! То кідаліся ўбок, заломваючыся калонамі-зігзагамі, то з усяго размаху крута ўзляталі ўгору, робячы над зямлёй дзівосныя аркі-вароты, пад якімі магла свабодна прайсці высакабортная машына; і зноў, слізгануўшы ўніз, лёгка цяклі, ліліся далей, усё больш і больш прыпадымаючыся над зямлёй.

*( «Полымя» )*

**4. Выпішыце прыслоўі, якія маюць формы ступеней параўнання. Запішыце гэтыя формы (простая вышэйшай ступені, складаная вышэйшай ступені, простая найвышэйшай ступені, складаная найвышэйшай ступені).**

І. Не кожны дзень выпадае чалавеку шчасце пахадзіць пад такім цудоўным дажджом, тым больш, што чалавек не паспеў яшчэ нідзе пабыць. Апрануўся ён хутка, па-маладому хвалюючыся і спяшаючыся, быццам ішоў на спатканне. Ён расчыніў дзверы дома адпачынку і апынуўся сярод прахалоды, цішыні і шапацення. Дажджавых струменьчыкаў не было відаць, толькі з неба да зямлі было ўсё заткана вакол празрыстай дымчатай марляй. Нерухома стаялі ў сырым покрыве велічныя хвоі. Ранішняя свежасць прагнала дрымоту. Ён ішоў па бязмоўным пасёлку ўніз туды, дзе паўз возера рос сасновы лес. І трошкі страшнавата было зрабіць першы крок з цвёрдай пясчанай дарожкі ў яго цёмную рлыбіню. Пад нагамі ўздрыгвала і ўгіналася балотная глеба, перарэзаная ўздоўж і ўпоперак канавамі. У іх нерухома стаяла цёмная вада. Высока ўгору выносіліся цяжкія шапкі хвой, у зарасніках кустоў хаваліся густыя цені, і толькі ярка свяціліся ў лясным паўзмроку ствалы бяроз.

*(М. Капыловіч)*

ІІ. Нарэшце ён выйшаў на знаёмую сцежку, якая напрамкі вяла ў Дзебру. Сцежка была непрыкметная для чужога вока, нават і не сцежка, а ўсяго толькі чысцейшая ад зарасцяў нітачка — улукаткі, паміж дрэў. Выйшаў ён на адхон равочка, спусціўся ў той равок, пайшоу ім. Равок шырзў, паглыбляўся, яго ўсё мацней глушылі ляшчыннік, крапіва, леташняя папараць, бурая і сухая. Пад леташняй папараццю ўжо адрастала маладая. Раней, як дзе ў лесе. Бо тут было зацішней, цяплей. У рове пахла вільгаццю, цвіллю, трухлявым валежнікам, збуцвелымі пнямі. Але па адхонах было яшчэ больш птушак, яшчэ весялей ад іх граю, асабліва салаўі шалелі, аж галаву вяло. Як ніколі.

*(В. Карамазаў)*

**5. Растлумачце (вусна), што значыць катэгорыя суб'ектыўнай ацэнкі. Выпішыце прыслоўі, якія ўтвараюць формы суб'ектыўнай ацэнкі. Запішыце побач гэтыя формы, падкрэсліце формаўтвараль-ныя марфемы і ўкажыце, якое дадатковае значэнне яны надаюць прыслоўю— узмацняльнасці, павелічальнасці, непаўнаты якасці.**

Нядобра, калі на не акрытую снегам зямлю вялікі мароз. Тады на свеце робіцца непрытульна, як у лядоўні: вецер пранізліва-бязлітасны, і ад яго нікуды не дзецца, не схавацца, быццам не засталося на зямлі ніводнага цёплага кутка. І зямля тады робіцца пустою і халоднаю, і страшна думаць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

што ў душы ў яе ўсё зледзянела, змярцвела — і больш не будзе на зямлі жыцця.

Анэта чакала, калі зменіцца квадра і пераломіцца надвор'е. Яна нутром чула гзтую перамену, ёй нават здавалася, што незаўважна памякчэў, зрабіўся вольготней вецер. Чамусьці верылася, што пойдзе сухі, марозны снег, а не стане хлюпаць мокры, з даждом,— цяжка было трываць нізкую плывучую шэрань хмар, хацелася чыстага, белага, святочнага, каб зарадаваліся вока і душа. І яшчэ тым, галоўыым, цешыла душу спадзяванне на снег — што не вымерзне рунь. Са снегам адляжа мароз, паменшае вецер...

Удзень крыху пасвятлела, паднялася вышэй каламутная шэрань, але вецер пёк холадам, усё гэтак жа калюча. І бязлюдна было. Нібы гэтае бязлюддзе надоўга, да вясны, пакуль ажывуць, зачарнеюць свежаю раллёю палеткі, якія зараз аднолькава роўна, шэра, спустошана прасціраліся ўдалечыню і ад якіх павявала холадам і асуджанасцю. Але як прасвет, як радасць на смутную душу перад самым небакраем шчодра, густа зелянелася рунь.

Тады неспадзявана ўсхадзілася мяцеліца, дзень і ноч ляпіла мокрым разлапістым снегам, і ад ветру над Анэ-цінай хатаю трывожна і пагрозліва гуў веццем стары вяз. Анэта тае ночы не магла звесці вачэй, усё прыслухоўвалася да лютага, несуцішнага гулу мяцеліцы, як усё роўна хацелася пачуць што за ветрам...

А ўдзень стала нечакана спакойна і сонечна, як і не прападалі сонца і яго вясновая цеплыня. Роўнае яго цяпло растапляла наляпаны ў пазы ў сценах снег.

*(А. Жук)*

**6. Раскажыце пра ўтварэнне прыслоўяў ад назоўнікаў. Спішыце сказы, падкрэсліце такія прыслоўі, вызначце іх марфалагічную структуру і зыходную форму ўтварэння.**

1. Залатымі вузламі карэнне аршанскіх дубоў так глыбока з карэннем смаленскіх сплялося на век *(Вял.)*. 2. Унізе была рэчка з гразкім дном і балоцістым берагам (*І. М.)*. 3. Усярэдзіну не пайшлі, сталі чакаць *(М. Л.)*. 4. Развітаўшыся з Клімам, Наталля Пятроўна забегла на ўрачэбны пункт, пакінула там інструменты, кажух і рушыла дадому *(Шам.)*. 5. Уперадзе на дарозе нічога не было відаць ад сонца *(Пташн.)*. 6. Назаўтра алені зноў прыйшлі да стога *(Пташн.)*. 7. Абедзве першыя навальніцы былі літасцівыя. Але трэцяя спраўдзіла гразьбу: у які момант раптам зіхнула на Пракопавым дубе, расшчапіла ўміг, кінула грымучы агонь свой на гумно Андрэя Рудога (*І. М.)*. 8. Гэта было надвячоркам *(Каратк.)*. 9. [Аляксей] пайшоў у армію яшчэ да вайны, зімою, калі Ніна вучылася ва універсітэце, на апошнім курсе *(І. М.)*. 10. З грузавіка паклікалі: «Праворны!», і ён, спехам пацiснуўшы Лагуновічу руку, пабег да машыны, падтрымліваючы сумку *(І. М.)*. 11. Поле адразу ажыло;, загаманіла *(Хадк.)*. 12. Штогод прыязджаў брат на ваКацыі *(К. Ч.)*. 13. Аляксею мігам прыгадалася дажджлівае поле на Куршчыне *(І. М.)*. 14. Максім трывожна азірнуўся вакол, зняў з плеч сваю старасвецкую стрэльбу і паставіў каля хвоі *(К-с)*. 15. Уранку старшага лейтэнанта Аляксея Лагуновіча выклікалі ў штаб брыгады *(І. М.)*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**7. Запішыце як можна больш прыслоўяў, утвораных ад наступных назоўнікаў, назавіце спосаб утварэння.**

Лета, вечар, дом, раз, век, верх, восень, бок, ніз, голас, ноч, перад, вясна, дзень, рэшта, гара, пачатак.

**8. Якім спосабам утварыліся прыслоўі ад прыметнікаў? Назавіце найбольш прадуктыўныя групы іх. Вызначце марфалагічную структуру прыслоўяў.**

1. Па-вясноваму молада і па-святочнаму ўрачыста выглядае сёння наш працавіты Мінск *(Б.)*.2. Вадзіцель асцярожна крануў машыну, паспрабаваў выйсці на бераг, але мост падаўся яшчэ і танк нахіліўся болей *(І. М.)* 3. Алеся расказвала проста, цікава і сціпла *(Шам.)*. 4. Лодка ўвішна выкручвалася на быстрай плыні стрыжня *(Б.)*. 5. Аб'езд быў далека, і таму рашылі паспрабаваць прайсці па мосце *(1. М.)*. 6. Тым часам непрыкметна пачалася ноч *(Б.)*. 7. Каханне прыйшло да Толі, вядома, пазней *(Б.)*. 8. «Наш летапісец па-ранейшаму карпее над гісторыяй!» — замест прывітання радасна сказаў Туравец, падышоўшы да начштаба *(І. М.)*. 9. Марозны снег пад нагамі парыпвае гучна і бадзёра *(Б.)*. 10. Выбухі сціхлі раптоўна, як і пачаліся *(Пташн.)*. 11. І, напэўна, таму, што рады я захапленню ў вачах дзяўчат, так пяшчотна спявае радыё, так свавольна зві-ніць ручай *(Бур.)*. 12. Завідна дабраліся да месца *(Лыньк.)*. 13. Злева рассцілалася іржышча, даволі стра-катае *(Хадк.)*. 14. У сарочцы з пафарбаванага начырво-на палатна на дарожцы (мяжа поля і кустоў) — чалавек *(К. Ч.)*. 15. Ледзь не ўсе дні Апейка жыў па-паходнаму (7. *М.)*. 16. Даўно не быў Андрэй Даленіч на радзіме *(Грах.)*. 17. Яны дачырвана накалілі на сонцы рукі *(Бяд.)*. 18. Пасажыр ішоў памалу, не зважаючы на дожджык *(Бяд.)*. 19. Навокал пацішэла, толькі зрэдку чуліся стрэлы *(І. М.)*. 20. Наліўка павёў гасцей у парк, які ўшчыльную прымыкаў да будынка праўлення *(І. Н.)*.

**9. Запішыце прыслоўі, утвораныя ад наступных слоў пры дапамозе прыставак і суфіксаў. Вызначце марфалагічную структуру прыслоўяў.**

Добры, лёгкі, дзіцячы, глухі, сухі, чысты, доўгі, ранні, дужы, глыбокі, ручны, адкрыты, пэўны, малы, ціхі, братэрскі, большы, даўні, далёкі, рэдкі, блізкі, высокі.

**10. Вызначце, ад якой часціны мовы ўтварыліся выдзеленыя прыслоўі. Назавіце спосаб утварэння.**

1. Пярэдняя машына заварочвалася, пехацінцы кіраваліся, мусіць, *туды,* дзе быў аб'езд (*І. М.)*. 2. *Цяпер* над вадой стукоча па пятаку малаток (*Б.*). 3. *Вакол* буяла густая трава, чырванелі, жаўцелі, бялелі кветкі *(І. М.)*. 4. *Абапал* ішлі пералескі, што ўбіраліся ў першую светлую дымчатую зеляніну, ад якой усё *навокал* выглядала вясёлым, прывабным *(І. М.)*. 5. Не *ўпершыню* нам шлях перагароджвала Вада *(Б.)*. 6. Максім кладзе спінінг *побач* са стрэльбай і *зноў* бярэцца за вясло *(Б.)*. 7. Ён [Аляксей] ляжыць ранены ў шыю, а *непадалёк* лопаюцца снарады і патроны *(І. М.)*. 8. Алесь і Клемусь увайшлі ў хату не *зусім рашуча,* як уваходзяць спакойныя хлопцы першы раз у незнаемую хату, дзе ёсць дзяўчаты *(К. Ч.)*. 9. Усе брылі *моўчкі,*— адчувалася, што людзі вельмі стаміліся *(І. М.)*. 10. Мікола зразумеў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гэта *па-свойму (Б.).* 11. Баброва галава паказалася *двойчы* і знікла, шост парнуў у пустую ваду *(Б.).* 12. Старшы лейтэнант праводзіў *тады у* хаце нараду з камандзірамі экіпажаў (*І. М.).* 13. На сцежцы і на траве сям-там валяецца чырвоная шкарлупка і *калісьці* куслівыя клешні печаных ракаў, з якімі тут *няшчадна* ваююць хлапчукі *(Б.).* 14. Амаль цэлы дзень хадзілі *ўдваіх (Янк.).* 15. *Наўзбоч* — калюг блішчастыя асколкі *(Бур.).* 16. Яно [пісьмо] было прачытана толькі *сёння* на досвітку, калі ўсё ўжо і так было ясна *(Б.).* 17. Высок! чырвонаармеец трымаў стрэльбу *напагатове і* спакойна і цвёрда ступаў у двух кроках за Алесем *(Кр.).* 18. Пад вечар у дзетсадзе — дзверы *насцеж (Бур.).*

**11. Падбярыце як мага больш аналагічных паводле ўтварэння прыслоўяў да кожнага з наступных словаўтваральных тыпаў, запішыце іх.**

Знізу, спераду, спачатку...;
Наперад, навылет, напаказ...;
Раніцай, вясной, парой...;
Уверсе, уранку...;
Па-суседску, па-людску...;
Смачна, ціха, весела...;
Па-новаму, па-святочнаму...

**12. Знайдзіце ў сказах складаныя прыслоўі, раскажыце, як яны ўтварыліся.**

1. Пахне мятай салодка-салодка, далёка-далёка *(Бур.).* 2. Думаю, што немцы вось-вось вернуцца. Затрымаем іх і з боем адыдзем у лес *(Хадк.).* 3. Штораніцы задоўга да ўсходу сонца Васіль Лазавенка выходзіў у поле *(Шам.).* 4. Аляксей мімаволі зліўся з гэтым вялікім громам, яго напоўніла ўрачыстае адчуванне сваёй магутнай сілы (7. *М.).* 5. І вось недзе глыбока-глыбока ў душы нарадзілася першая іскарка рэўнасці *(Б.).* 6. Чаканнем даўно-даўно жаданай хвіліны быў увесь напоўнены Аляксей. Увесь час раз-пораз нецярпліва паглядваў ён на гадзіннік, на наваколле, на машыны, на неспакойныя, напружаныя твары людзей *(І. М.).* 7. Кандрат у такіх гадах, што не сёння-заўтра ў салдаты ісці *(М. Л.).* 8. Д а н і л а. Я буду прыходзіць час-часам *(Кр.).* 9. Казімір ішоў дахаты паволі-паволі *(Скр.).* 10. І людзям здалося, што выбух цягнецца доўга-доўга *(Лыньк.).* 11. Сям-там упоперак дарогі ляжалі вялізныя дрэвы *(Я. М.).* 12. Дзверы зачыніліся следам за Багуцкім, правішчаў іржавы замок, недзе зніклі прыглушаныя крокі канваіраў, і вязень застаўся сам-насам са сваім жыццём, са сваімі думкамі *(Лыньк.).* 13. А як хацелася прайсціся басанож за плугам! *(Сач.).* 14. Назаўтра ледзь-ледзь паказалася сонца на ўсходзе, як хлопцы былі ўжо на нагах *(Я. М.).* 15. Там хоць калі-нікалі ды сонца грэла, а да нас яно не заглядвала ўсю зіму *(Сач.).*

**13. Складзіце табліцу разбору прыслоўяў у адпаведнасці з прапанаваным парадкам:** **1) лексіка-семантычны разрад (месца, часу, мэты, спосабу дзеяння і г. д.); 2) часціна мовы, ад якой прыслоўе ўтворана, спосаб утварэння; 3) ступень параўнання (для прыслоўяў, утвораных ад якасных прыметнікаў) і яе**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**форма: простая ці складаная; 4) форма суб'ектыўнай ацэнкі; 5) сінтаксічная функцыя. Знайдзіце ў тэксце прыслоўі, разбярыце іх паводле табліцы.**

Раніцай падзьмуў паўднёвы вецер. Ён прынёс па-веснавому мяккую цяплынь і безліч забытых за зіму пахаў. Апоўдні пад несціханы крык пеўняў з-за лесу выпаўзла густая блакітна-шэрая хмара.

Ноччу секануў буйны цёплы дождж. У непрасветнай цемрачы — хоць выкалі вока — ён глуха лапатаў, сіпеў, растапляючы снег; гулі і звінелі імклівыя рўчаіны. Усё навокал набрыняла вадой і цеплынёй.

А назаўтра, абмытыя дажджом, непрывычна чарнелі палі. За ноч снег нібы злізала. Усё навокал памаладзела. Лысы пагорак зелянеў маладой рунню, і канава на імшары таксама зелянела ад асакі, а вярба за ноч пажаўцела, бо набрынялыя пупышкі патрэскаліся і з іх здзіўлена пазіралі на свет жоўтыя коцікі.

*(А. Асіпенка)*

## ЛІНГВІСТЫЧНЫ СТАТУС БЕЗАСАБОВА-ПРЭДЫКАТЫЎНЫХ СЛОЎ

**1. Раскрыйце ўтварэнне і значэнне тэрміна «безасабова-прэдыкатыўныя словы» («катэгорыя стану»). Ахарактарызуйце гэту катэгорыю слоў. Знайдзіце такія словы ў сказах.**

1. Ён [Башлыкоў] і выглядам сваім паказваў, што яму ўсё гэта ясна і проста. Але ў душы яго было і няясна, і няпроста. Супярэчліва было (*І. М.).* 2. Алесік журботна схіляе галоўку і лёгенька перабірае пальцамі па лаўцы. Шкада хлапчука *(К-с).* 3. Добра было ў лесе, поўным птушыных галасоў (*І. М.).* 4. Колькі разоў быў у баі, прывыкнуць, здаецца, пара б, дык не ж,— перад кожным насцярожваешся, падбіраешся, непакоішся! (У. *М.).* 5. У лесе глуха, цесна стала, і смуткам цісне лес Міхала, і нейк маркотна ў гэтым боры, душа імкнец-ца на прасторы, і вочы просяць свету, волі *(К-с).* 6. Ад гулу дрэў на сэрцы Ніны стала трывожней *(І. М.). 7.* Цемнавата было, дый не так яшчэ добра Толя ведаў тады Максіма, каб па вачах пазнаць, што ён думае *(Б.). 8.* Ад Дзвіны да Прыпяці — бела, бела, ад Дняпра да Немана — снег і снег *(Панч.)* 9. Мне трэба доўга-доўга раіцца пра сотні планаў і падзей *(Бур.).* 10. Ранкамі было свежа і роена (7. *М.).* 11. У канцылярыі ціха і нялоўка *(К-с).* 12. І ад успаміну гэтага робіцца неяк па-новаму сумна *(Б.).* 13. Пад гэтымі соснамі неяк асабліва ўтульна і нават цёпла *(Шам.).*

**2. Адкажыце, што агульнае маюць безасабова-прэдыкатыўныя словы і прыслоўі і чым яны адрозніваюцца. Спішыце сказы, безасабова-прэдыкатыўныя словы падкрэсліце адной рыскай, прыслоўі — дзвюма, назавіце сінтаксічную функцыю першых і другіх.**

1. У лесе было зусім ціха *(К-с). 2.* Галя ціха пайшла (*Б.*). 3. Ах, як добра мне сягоння і пад грабам, і пад клёнам (*Б.*). 4. Добра адкармілася мядзведзіца за лета і восень *(Б. В.).* 5. Поўдзень, горача нават тут, на вадзе *(В.).* 6. Усю дарогу Крушынскі горача лаяў кантрабан-дыстаў *(Бяд.).* 7. Аднак на душы было цяжка, і ён [Грэчка], згадаўшы раптам Тураўца,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пашкадаваў, што не пайшоў разам з усімі (7. *М.).* 8. Ноч, доўгая, жудасная, трывожная ноч яшчэ цяжка аблягала зямлю *(К-с).* 9.Спакойна расказваў пра сваю працу Юзік *(Янк.).*10. Калі ж спакойна на душы, парожнім словам не грашы *(Грах.).* 11. Жудасна стала тады на сэрцы Івану Мацвеевічу *(Бяд.).* 12. Жудасна лыпаў светлым! бірузовымі вачыма Міхась *(Бяд).* 13. А Люда, жмурачы вочы ад сонца, сумна ўсміхалася і махала рукой *(Б.).*14. Сумна восенню ў полі *(К. Ч.).*

**3. 3 паэмы Я. Коласа «Новая зямля» выпішыце дзесяць сказаў з безасабова-прэдыкатыўнымі словамі.**

**4. Складзіце табліцу разбору безасабова-прэдыкатыўных слоў у адпаведнасці з прапанаваным парадкам: 1) лексіка-семантычная група (стан чалавека, стан прыроды, ацэнка асяроддзя і г. д.); 2) разрад паводле суадноснасці з іншымі часцінамі мовы (толькі безасабова-прэдыкатыўнае; суадноснае з прыслоўем; суадноснае з назоўнікам; суадноснае з прыметнікам); 3) сінтаксічная функцыя. Знайдзіце ў сказах безасабова-прэдыкатыўныя словы і разбярыце паводле гэтай табліцы.**

1. Як было людна ў хаце, так стала ціха *(Б.).* 2. Мне стала маркотна і сцішана *(К-с).* 3. На лодцы можна дабрацца да самых недаступных мясцін і ўбачыць няма-ла цікавага *(В. В.).* 4. Бачыць самога сябе з вялікай адлегласці бывае вельмі прыемна *(В.).* 5. Позна. Над нівамі змрок *(М. Т.).* 6. Хораша на душы, легка, светла! *(Шам.).* 7. Сонца заходзіць, і кустам у сонцы вельмі добра *(В.).* 8. Дзяўчынцы стала лепш *(Шам.).* 9. На дварэ было свежа і ціха *(І. М.).* 10. А пасля ёй [Раі] зрабілася яшчэ больш пакутліва *(Шам.).* 11. Зелена было на гародах, у полі, на балотах. Зелена было на ўзмежках, абапал дарог, каля куранёўскіх платоў *(І. М.).* 12. Даўно юнаку ажаніцца пара, дзяўчына— бы ягадка тая *(М. Т.).* 13. «На добры лад, дык і каня запрагаць не варта было б»,— казаў Лабановіч *(К-с).* 14. За лесам відней стала *(К. Ч.).* 15. Бабрам сёння пашанцавала *(В. В.).* 16. Глядзець жа на бойкі турухтанаў вельмі цікава і смешна *(В. В.).* 17. Петраку было шкада Джамілю *(Каратк.).* 18. Трэба дома бываць часцей, трэба дома бываць не госцем, каб душою не ачарсцвець, каб не страціць святое штосьці *(Р. В.).* 19. Ветрана з самага рання *(Вярц.).* 20. Холадна і марозна ў студзені, але дзень ужо трошкі павялічыўся *(В. В.).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ГРАМАТЫЧНЫ СТАТУС СЛУЖБОВЫХ ЧАСЦІН МОВЫ ПРЫНАЗОЎНІК

**1. Спішыце тэкст, падкрэсліце ў ім прыназоўнікі. Вызначце вусна спецыфічныя рысы гэтай часціны мовы. Параўнайце беларускую назву «прыназоўнік» з рускай «предлог» і ўкраінскай «прийменник».**

І. Можа быць, гэта і ёсць той адзіны крытэрый, які вызначае настаўніка: ці ёсць у цябе вучні, ці ёсць у цябе паслядоўнікі, ці ёсць у цябе сябры, якім хочацца не толькі вучыцца ў цябе, вывучаць твой вопыт, але і пераймаць тваё чалавечыя якасці? Гэтае пытанне рана ці позна абавязкова задае сабе кожны

чалавек, незалежна ад таго, якую прафесію, якую спецыяльнасць ён мае. Самае вялікае шчасце быць паэтам сваей працы, любіць яе...

Той, у каго найболей вучняў, якраз і ёсць самы леп-шы настаўнік. Успомніце, колькі даверлівых сэрцаў, колькі дапытлівых цікаўных вачанят імкнецца да вас! Нішто не застаецца без увагі — і як вы адзеты, і якая ў вас прычоска, і як вы вымаўляеце кожнае слова.

*(В. Вітка)*

II. Распачаўшы свой бег паміж рускіх узгоркаў, Дняпро перасякае з поўначы на поўдзень усю Усходнюю Беларусь, каб затым шырока і вольна несці свае воды па Украіне. Дняпро — рака вялікага братэрства трох народаў.

Даўным-даўно далятапі да нас вольныя казацкія атрады, і да іх далучаліся нашы паўстанцы. Праплывалі ўверх па Дняпры, Прыпяці, Сожы і ўкраінскія песні. Таму ў беларускім фальклоры так многа казацкіх матываў.

...І вялікі Кабзар прыйшоў да нас спачатку песняй, каб назаўсёды зрабіцца любімым і родным.

Янка Купала пісаў: «Не праз кніжкі, а праз народ дзецьмі пазнавалі мы творчасць Тараса Шаўчэнкі. Цёмныя непісьменныя сяляне спявалі песні Тараса Шаўчэнкі, не ведаючы, хто іх складаў. Песня Шаўчэнкі безыменнай жыла ў беларускім народзе многія дзесяткі год».

Лёс нашага народа падобны да лёсу ўкраінцаў. Таму ўвесь неабдымны свет паэзіі Тараса Шаўчэнкі нам блізкі і зразумелы: любоў да аратаяў і жнеяў, спачуванне да ўсіх прыгнечаных і нянавісць да тыранаў, прага да справядлівасці і волі, сынава ўлюбёнасць у свой народ, у сваю зямлю. Гэта і наш свет, гэта адвечныя думы і пачуцці беларускага народа.

*(П. Панчанка)*

**2. Знайдзіце ў сказах невытворныя і вытворныя прыназоўнікі. Растлумачце, з якой часціны мовы паходзяць вытворныя прыназоўнікі.**

1. У слове не толькі сэнс, у ім — і колер, і гук, слова жывапісуе, нясе думку і музыку *(Сач.)*. 2. Мы адліць усё патрапім, апроч звону векавога, таго звону, які ўсе мы роднай моваю завём *(М. Т.)*. 3. Ніколі змрочныя, злыя таленты, нават геніі, якія дамагаліся права вучыць людзей, не рабіліся любімымі настаўнікамі — ні пад прымусам, ні пад страхам *(Віт.)*. 4. Праз нейкі час да іх далучылася група байцоў на чале з лейтэнантам *(Дам.)*. 5. Як прыйшло, так і пайшло, ціха, непрыкметна, за палеткі, за сяло залатое лета *(М. Т.)*. 6. Для нас прырода — маці, хоць і маці строгая, суровая. Якія ж мы, калі ... ідзём, накшталт варожай раці, скараць і рабаваць багацці (чые багацці? — роднай маці!)... *(Вярц.)*. 7. Некалькі хвоек наводдалек лесу, на полі пры самай дарозе *(К- Ч.)*. 8. 3 рова на дарогу па свежым снезе выбег ланцужок ямак-слядоў *(В. Б.)*. 9. Будуць спрадвеку казаць каласы, песні спяваць спрадвеку пра нашы гады, пра нашы часы, пра кожнага чалавека *(А. К.)*. 10. [Сотнікаў] упаў тады непадалёку ад насыпу... *(В. Б.)*. 11. Лечыцца трава ад спёкі ліўнем, людзі — ласкай лечацца людской *(Ланч.)*. 12. І вось — арэшына пусціла, дзеля свята, белы цвет *(Б.)*. 13. Добра жыць між кніг і кветак *(Панч.)*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**3. Якія з выдзеленых слоў — прыназоўнікі, якія — прыслоўі, якія — назоўнікі з прыназоўнікамі?**

1. Усё вяршыняй шчасця маладога няспелыя гады здаюцца мне, што ад бацькоўскага вялі парога *насустрач* Нёмну, песням і вясне *(Астр.). 2.* Спяшаюцца грудзьмі да ніў сваіх прыпасці, да дрэў, што ім *насустрач* кінулі свой дзень *(М. Т.).* 3. Андрэй пайшоў *насустрач* сыну *(К-с).* 4. Гаспадар адразу выйшаў насустрач *(К. Ч.).* 5. Старыя вітаюцца за руку, садзяцца *побач... (Б.).* 6. *Побач* чыгункі ўжо цягнулася доўгая жоўтая паласа зямлі *(К-с).* 7. Радасна і дзіўна, што ён [Вагушэвіч] — не легенда, не гістарычнае штосьці, а чалавек, які зусім *паблізу* жыў, памёр і пахаваны тут вось, *побач* з маці і сястрой, на звычайных вясковых могілках... *(Б.).* 8. Яны столькі ўжо прайшлі... і калі ішлі правільна, дык павінны апынуцца недзе *паблізу ад* лесу *(В. Б.).* 9. *Пасля ўзгоркаў* ды пералескаў ад Карэліч на Любчу пачынаецца лагодная роўнядзь... *(Б.).* 10. Раскажу падрабязна *пасля,* калі прыедзем дадому *(А. М.).* 11. У лесе густа церушыў лістапад, і восеньскі вецер імжыў *наўкола* нудным сцюдзёным дажджом *(В. Б.).* 12. Я акідаў вачыма ўсё *навокал* сябе, і мне захацелася даўжэй пабыць тут *(К. Ч.).* 13. *Навокал* — над ракой, над кустамі і лугам — нястрымныя, утрапёныя жаўранкі і салаўі *(Б.).* 14. Толькі варта было ім адысціся ад плота крайняе хаты *ў глыб* вёскі, як Рыбак пачуў кашаль *(В. Б.).* 15. Трэба глядзець у корань, *у глыб,* а не так, як вы прывыклі *(Шам.).* 16. На голым алешніку сонца трымалася нядоўга — ціхая ласкавасць спаўзла *ўніз,* на мокры снег, на ўпарты хмызняк... *(К. Ч.).* 17. Спяць кажаны *ўніз* галавой насуперак зямной прыродзе *(А. П.). 18.* Праз дзён два ім далі месца *непадалёку... (К. Ч.). 19.* Батарэю Клімёнак паставіў на горцы, зарослай рэдкім бярэзнікам і кустамі асінніку і вербалозу, *непадалёку* ад рэчкі *(Дам.).*

**4. Выпішыце асобна прыназоўнікава-іменныя канструкцыі з невытворнымі прыназоўнікамі; з прыназоўнікамі, якія паходзяць ад прыслоўяў і ад дзеясловаў; з прыназоўнікамі — былымі спалучэннямі невытворных прыназоўнікаў з назоўнікамі.**

1. Толькі ведаючы народную аснову мовы, можна ведаць, як правільна і проста выказаць думку, як натуральна, паводле законаў гэтай мовы, пабудаваць фразу *(Стр.). 2.* Вядзі, сучаснасць! Не прашу прывалу, апроч таго, што суджана ўсім *(А. П.).* 3. Як у час навальніцы ад дрэва лісток адарваны, пакідаў я сталіцу, пажарам бязлітасным гнаны *(А. К.).* 4. Пейзаж у Чорнага, нягледзячы на яго надзвычайную выяўленчую канкрэтнасць, часта выступае як адухоўленае, валявое ўвасабленне стыхіі прыроды... *(Стр.).* 5. Вечны Рым. Здабыткі чалавечага генія, сабраныя тут на працягу стагоддзяў, ашаламляюць сваёй магутнасцю (*Б.*). 6. Жанчына накіравалася ў бок сяла *(К-с).* 7. Дарожка паміж дрэў ішла ўздоўж ракі *(Б.).* 8. Рука яе ляжала на руцэ дзяўчынкі, якой яна стала замест маці *(К. Ч.).* 9. З даўніх часоў людзі імкнуліся да прыгожага *(Луж.).* 10. Прыехаў сюды пазаўчора, а ў вачах яшчэ ўсё маладзенькія рабінкі ў сонцы, абапал бруку наваградскага гасцінца, на зеля-ніне прысадаў, каля жоўтага ды зялёнага поля... *(Б.).*

11. Неба на захадзе, якое святлела доўгі час пасля за-хаду сонца, пачало агортвацца ў лёгкую летнюю цемру *(К-с)*.

**5. Знайдзіце ў тэкстах простыя, складаныя і састаўныя прыназоўнікі. Вызначце, з якім склонам ўжываюцца яны ў кантэксце.**

Літаратура наша вырасла да такой ступені, што зрабілася фактам не толькі нацыянальна беларускім, а выйшла на ўсесаюзную арэну, стаўшы ўпоравень з лепшымі творамі шматнацыянальных літаратур. Нашу літаратуру ведаюць далека за мяжой, і ў гэтых поспехах — вялікая заслуга нашай дасканалай і спелай літаратурнай мовы.

*(М. Стральцоў)*

**6. Спішыце сказы. Вызначце вусна адносіны (прасторавыя, часавыя, аб'ектныя, азначальныя, прычынныя, мэты, спосабу дзеяння), выражаныя ў прыназоўнікава-іменных спалучэннях слоў.**

1. Я з той краіны, што ў век беспрасветны ясны прамень нарадзіла — Скарыну — і песню для славы дала сусветнай Адаму Міцкевічу — роднаму сыну *(К. Ц.)*. 2. Я сэрца свае неспакойным збярог, каб часу хоць крыху быць вартым, для дальніх паходаў, для новых дарог, для працы, цяжкой і ўпартай *(Панч.)*. 3. Гляджу і гляджу на сталіцу сваю дарагую, пазнаць родны горад пад сонцам вясны не магу я *(Панч.)*. 4. У цяжкія хвіліны ўздымалася, як акіян, душа народа, і хвалі гневу білі ў бераг... *(Віт.)*. 5. Якуб Колас уславіў на вякі працоўны і воінскі подзвіг беларускага народа *(Луж.)*. 6. Начамі бяссоннымі сэрца палілі стваральнікі сонечных кніг не дзеля таго, каб вы дома пылілі сваёй раўнадушнасцю іх *(Панч.)*. 7. Радасна, дзіўна, што ён [Багушэвіч] — не легенда, не гістарычнае штосьці... І здзіўленне, і недаўменне, і пашана да таго, хто блізу сто гадоў таму назад, як парастак паміж плітамі тратуара, пралез паміж дзвюма стыхіямі, рускай і польскай, насуперак усім, уключаючы і сваіх найбліжэйшых, пралез і вырас са сваім і зрэбным, і глыбока, па-народнаму, па-хлебнаму свежым беларускім словам *(Б.)*. 8. Калі стамлюся некалі праз меру, адчуць бы мне падтрымку рук тваіх... *(А. П.)*. 9. Хмары над гэтай зелянінай, ці, лепш сказаць — на гэтай зеляніне, здаюцца дымам вялікіх вогнішчаў, раскіданых дзесьці ў гарах *(В.)*. 10. Значная чалавечая асоба звычайна не крычыць пра сябе на ўсіх скрыжаваннях *(Стр.)*. 11. Як мёд пчала збірае рупна ў соты, збіраем скарб з зямлі і з-пад зямлі *(Куп.)*.

**7. Складзіце і запішыце сказы з наступнымі словазлучэннямі.**

Цешыцца з дачкі, ісці па ваду, зразумець па вачах, смялейшы за ўсіх, ажаніцца з настаўніцай, чуць праз сон, дзівіцца з вынікаў, схадзіць па бацьку, пайсці ў чарніцы, жыць за два кіламегры, атрымаць па сорак рублёў, захварэць на грып, бярэцца на мароз, выдаць па ўсім, расказваць пра тэлеперадачу.

**8. Вызначце, з якім склонам ужываюцца прыназоўнікі ў выдзеленых прыназоўнікава-іменных канструкцыях. Якія адносіны выражаны ў іх?**

І. 1. Перад красою *з радасцю* нямею, і што люблю, пра тое і пяю *(Астр.)*. 2. Ясна, што панна Ядвіся насміхаецца з *яго* *(К-с)*. 3. Жнівень позні ходзіць па мяжы, азірае *з клопатам* аселіцы *(Кір.)*. 4. Да лазні было *з кіламетр*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*(Дам.).* 5. Гэта ж — ці не вярнулася зноў тая хвароба, што мучыла яго некалькі год? *З чаго? З працы, з работы* вялікай *(К. Ч.).* 6. Верка не заснула *з* самага *вечара,* а ён быў звёў вочы і прачнуўся, калі пачуў, што яна апранулася і пайшла з *хаты (Пташн.).* 7. А сам дарэктар, з *вузел* ростам, у сваім уборы бедным, простым, у зрэбных портках і кашулі, стаяў, як бы яго прыгнулі *(К-с).* 8. *Разам з дарослымі* ў партызанскіх атрадах — як ні трывожна, як ні балюча гучыць гэта ў наш мірны час — з *ворагам* змагаліся і дзеці, больш за дваццаць пяць тысяч беларускіх дзяцей *(Б.).* 9. Назвы нашых сёл, гарадоў і вуліц—іх таксама трэба браць пад ахову — *разам з* чалавечымі *прозвішчамі* складаюць самае яркае ў моўным запасе кожнай мовы і нясуць водгукі гісторыі кожнага народа *(Луж.).*

II. 1. Беларусь, *на* усёй на вялікай *планеце* свой пачэсны пасад ты даўно заняла *(Бр.). 2.* Вавёрка грыбочкі *на зіму* збірае *(К-с).* 3. Нарэшце яму, як у смагу піць, захацелася хоць здалёк зірнуць *на* сваю *хату (К. Ч.).*
4. Зара, параскідаўшы косы, *на поле, бор, на луг* плыве *(Бр.).* 5. Над быстрай Шчарай, у пакойчыку з акном *на сосны, пясок* ды *мох* пад імі, чытаю прозу Гётэ *(Б.).* 6. Час склікаці ўжо грамаду *на* вялікую *параду, на* вялік і *сход! (Куп.).*

III. 1. Не легенды, не паданні пра далёкія гады *па сцяжынцы* на світанні прывялі мяне сюды *(М. К. 2.* Хвойнічак, заўсёды юны, *па схілах* сцелецца, як дым *(Вял.).* 3. Леўка палез у кішэню *па люльку (Скр.).* 4. Не трэба ясным быць прарокам, каб зразумець, чаму баліць душа *па любасці* далёкай, якой нічым не замяніць *(Кір.). 5.* Край мой беларускі, край! Дай ты мне прайсціся, дай, *па* тваіх *просторах, па шляхах* бясконцых, уначы — пры зорах, раніцой — пры сонцы *(Пл.).* 6. Я толькі паэт... Але я не адзін, са мною мае пакаленне і сіла, якія не кінуць хадзіць і хадзіць *па песню, па сонца* ў абветраных мілях *(А. К.).* 7. Хмаркі залатыя! Вы — прастору дзеці, ходзіце вы вечна *па* ўсім белым *свеце (К-с). 8.* Паміж вёскамі, *па* лугавой *дальне,* цячэ апетая ў сардэчнай песні рэчанька... *(Б.).*

**9. Запішыце беларускія адпаведнікі да наступных рускіх словазлучэнняў. Параўнайце ўжыванне ў іх прыназоўкікаў.**

Идти за грибами, по случаю встречи, вспоминать о друзьях, ехать лошадью, выходить из школы, думать о будущем, ни над кем не смеяться, гулять по лесу, подойти к дубу, ходить по домам, из глубины комнаты, тоска по родине.

**10. Прачытайце ўрыўкі з кнігі Я. Скрыгана «Ранішнія росы». Выпішыце з іх словазлучэнні з прыназоўнікава-іменнымі канструкцыямі, сінанімічнымі канструкцыям з прыназоўнікамі *за, для, у бок.***

I. Механічна ў творньш склоне пачынаем ужываць прыназоўнік *за:* паслаў за доктарам; паехаў за абсталяваннем, калі тут патрэбен прыназоўнік *па* і назоўнік у вінавальным склоне: паслаў па доктара, паехаў па абсталяванне. Не *за чым* і *за кім* паслаць, з'ездзіць, схадзіць, а *па што* і *па каго.* Прызнаюся, што нядаўна я прачытаў у газеце: «Навошта ездзіць за экзотыкай на край свету» і не адразу зразумеў, пра што сказана. Памятаючы, што *за* —гэта следам за кім, наўздагон за кім, я так і зразумеў, што следам за ёю. І толькі пасля ўжо, дачытаўшы да канца фразу, дзе сказана, што экзотыкі колькі хочаш

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і дома, пад бокам, здагадаўся, што гэта *па* яе. Я не жартую і не прыкідваюся: я прывык за словам бачыць той сэнс, які памятаю з матчынай мовы, з дзяцінства. Гэта яшчэ раз гаворыць толькі пра тое, як небяспечна «падпраўляць» мову.

II.Прыназоўнік *для.* Яго мы зрабілі надта ўніверсальным. Пішам: ён сумленна жыў *для* навукі; цяпер вядома, *для чаго* ён збіраў лекавыя травы; не астаецца часу *для* заняткаў; яна стала *для* яго за маці; яна спявае *для* вас; *для* свайго часу гэта было прагрэсіўнай з'явай; я купіў *для* цябе кнігу; купіў бочку *для* капусты; *для* таго І стрэльба, каб з яе страляць; *для* яго гэта пацеха; *для* чаго гэта патрэбна. Усюды мы абышліся адным толькі *для.* А давайце паглядзімо, ці не лепш было б напісаць так, як таго патрабуе сама мова: цяпер вядома, *навошта* ён збіраў лекавыя травы; не астаецца часу *на* заняткі; яна стала *мне* за маці; яна спявае *дзеля* вас; *на* свой час гэта было прагрэсіўнай з'явай; я купіў *табе* кнігу; купіў бочку *пад* (або *на)* капусту; *на тое* і стрэльба, каб з яе страляць; усё робіцца *дзеля* карысці справы; *яму* гэта цяжка; *навошта* гэта патрэбна; *каму* гэта патрэбна. Вунь колькі прастору і лёгкасці стала ў гэтых фразах.

III.Пра слова «бок». Мы развучыліся ім карыстацца. Вось як пішам часамі: «Ён зірнуў у бок бацькі», «ён пайшоў у бок сяла», «Мы звярнулі ў бок лесу», «Дарога па вярнула ў бок поля», «З боку сенажаці пацягнула ветрам». Пры чым тут і да чаго тут бок? І які — правы ці левы? У нармальнай фразе ён жа абсалютна не патрэбны: «Ён зірнуў на бацьку», «Ён пайшоў пад сяло» (або на сяло, або ў сяло), «Мы звярнулі пад лес» (або да лесу), «Дарога павярнула ў поле» (або на поле), «Ад сенажаці пацягнула ветрам» (або з-пад сенажаці).

**11. Падбярыце і запішыце прыназоўнікава-іменныя канструкцыі з іншымі прыназоўнікамі або без прыназоўнікаў, сінанімічныя выдзеленым.**

Дні ідуць *за працай,* вучыцца *на настаўніка,* сустрэліся *праз год,* снег *да пояса,* чырванец *ад марозу,* дарога *праз лес,* вядомы *на ўсю рэспубліку,* песня плыве *з-над ракі,* сядзеў *поруч з маці,* працаваць *ад ран'шы,* прачнуўся *а сёмай гадзіне,* часопіс *за жнівень,* не спаць *па начах,* настаўніцы год *пад сорак,* вырас *да столі,* бочка *на капусту,* трава *ў калена,* жыць *блізка рэчкі,* дом *на дваццаць кватэр.*

**12. Вызначце ў тэксце прыназоўнікі, зрабіце пісьмовы марфалагічны разбор іх па схеме: 1) разрад паводле значэння (вытворны, невытворны), 2) структурны разрад (просты, складаны, састаўны), 3) функцыянальнае значэнне, 4) з якім склонам ужыты ў сказе.**

У 1828 годзе паўстала супраць пана мястэчка Крошын ля Баранавіч. Прыйшло войска. У ліку іншых пакаралі каваля. Сына яго, парабка, што скончыў пачатковую школу, здалі ў салдаты. За некалькі сшыткаў патрыятычных антыпрыгонных вершаў, якія і дагэтуль не знойдзе-ны. Звалі прыгоннага паэта Паўлюк Багрым. Лёс быў да яго бязлітасны. Не дзесяць, як Шаўчэнка, а поўныя дваццаць пяць год адмучыўся ён у казармах. Без усякага заступніцтва, бо Шаўчэнку ведалі многія ўплывовыя лю-дзі і рабілі спробы заступацца, а хто ведаў Багрыма, звычайнага мужыка? Вярнуўшыся на вёску, ён працаваў у Крошыне кавалём. Меў залатыя рукі. У Крошынскім касцёле ёсць каваная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

люстра яго работы: перапляценне кветкавых бутонаў і жаўрукоў у палёце. Ад Багрыма дайшоў да нас адзіны верш «Заграй, заграй, хлопча малы» — верш гнеўнага бунту супраць прыгону, шчымлівай журбы і глыбокай чалавечнасці. І вось загінуў паэт, як тысячы такіх звялося і да яго і пасля. Згінулі і ляжаць, нікім не аплаканыя, акрамя, можа, палявых вятроў.

*(Паводле У. Караткевіча)*

## ЗЛУЧНІК

**1. Як вы разумееце значэнне тэрміна «злучнік»? Вызначце марфемную структуру гэтага слова. Назавіце тыя функцыі злучнікаў, якія збліжаюць іх з прыназоўнікамі і якія адрозніваюць ад прыназоўнікаў.**

**2. Прадумайце і ахарактарызуйце прыведзеныя прыклады.**

Бацька і сын, бацька з сынам; збліжэнне вёскі з горадам, збліжэнне вёскі і горада; машына з прычэпам, машына і прычэп, машына без прычэпа; жыць і працаваць, жыць дзеля працы, жыць, каб працаваць.

**3. Спішыце сказы, падкрэсліце злучнікі, ахарактарызуйце іх паводле паходжання (невытворныя і вытворныя), саставу (простыя і састаўныя), спосабу ўжывання (адзіночныя, паўторныя, парныя).**

1. Лабановіч хацеў сказаць болей, што зрабіць добрую грэблю зусім не цяжка пры дружнай рабоце грамады, але трохі саромеўся старэйшых таварышаў і адчуваў сябе ў іх кампаніі не вельмі ўпэўнена *(К-с). 2.* У карых вачах чалавека не то свяцілася хітрынка, не то прарывалася лёгкая усмешка *(Лыньк.).* 3. Але ўсюды ціха, толькі шамаціць у страсе халодны вецер ды недзе на дарозе гудзе машына *(В. В.). 4.* Заварожвалі то роўнядзь узбярэжжа, то вялікія пясчаныя ці гліністыя берагі, як паміж Ляскавічамі і Дарашэвічамі, як каля Славінска і Галубіцы, а то — дубы і дубы, а то — купкі вербаў і дубоў, якія здалёк бачыліся прысадамі і садамі пры невялікіх у дрэвах вёсках ці хутарах *(Янк.).* 5. Лабановічу прыкра было слухаць такія скаргі, бо яны як бы ставілі яго ў ролю суддзі і прымушалі так ці іначай умяшацца ў чужое жыццё, а гэтага яму не хацелася *(К-с).* 6. Васіліне цяпер не давалі перадыхнуць, яе клікалі то брыгадзіры, то жнеі, то машыніст коннай жняяркі пытаўся, у які канец поля заязджаць *(Хадк.).7.* Калі хлеб у возе, то няма бяды ў дарозе *(Прык.).*

**4. Спішыце сказы, падкрэсліце ў іх злучальныя злучнікі, вызначце, якія граматычныя адносіны выражаюцца з іх дапамогаю.**

1. Найперш цымбальны звон пачуўся і дружных скрыпак стройны лад, і хор на сцэне разгарнуўся, як быццам той вішнёвы сад *(Бр.).* 2. Ніхто не ішоў адчыняць. Або не пачулі стуку, або не было дома *(К-с).* 3. Сучча на вогнішчы дагарала, і цяпер, то ўспыхваючы, то хмурачыся, тлелі зыркія барвовыя вугольчыкі (У. *М.).* 4. І такія трывалыя выходзілі граблі — гады па тры служылі. І сена зграбалі, і ў копы складалі, і ранняй вясной у спрытных жаночых руках раўнавалі грады на гародзе *(Лыньк.).* 5. Вочы страшацца, а рукі зробяць *(Прык.).* 6. І луг, і поле, і горкі — усё засыпана халодным пухам *(К-с). 7.* Звалі яе Валента. ЦІ гэта прозвішча, ці гэта імя, ці мянушка — я так

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і не ведаю *(Янк.).* 8. Шумна і гучна ўлетку на беразе Немана. Зранку і да самага вечара га-лышамі качаюцца тут дзеці то ў пяску, то ў вадзе *(К-с).* 9. Поле пахне аўсяным іржышчам і вялаю атаваю, а цесныя двары пры маўклівых хатах — коньмі і дзёгцем *(К. Ч.).* 10. Сена ж ты і грэбці, мусіць, не ўмееш, а не то што табе воз таптаць *(Кр.).*

**5. Растлумачце, з якім значэннем (злучніка ці часціцы) ужываецца ў сказах слова *ды.***

1. Воўк, вядома, таксама не спалохаўся чалавека, бо ў чалавека не было стрэльбы, а без стрэльбы ды без сабакі чалавек слабы —гэта воўк ведаў. Ды і абрыдла ўвесь век баяцца *(В. К-).* 2. Ну, спускай сетку на дно ціхенька-ціхутка ды глядзі, каб яна не завісла на корані або на купіне, бо рыба пад ніз пойдзе *(К-с).* 3. Вашымі б рукам! ды машынай кіраваць. Ды мне што? Гэта справа ваша, маладая *(К. Ч.).* 4. Даўно так востра не ўспаміналася жыццё. Наталя заплакала, ды так і заснула з мокрым, знясіленым тварам *(Скр.).* 5. Ды не аднымі забаўкамі захапляўся Якуб: якіх толькі відовішчаў не сустрэнеш на сенажаці *(К-с).* 6. І хаця Павел Дубок, як звалі сапёра, і не быў з баязліўцаў, але, апынуўшыся сёння ў незнаемым лесе ды пасля такіх падзей, адчуваў сябе блага *(Лыньк.). 7.* Але вось аднаго разу негадана-нечакана бяда здарылася, ды такая, якой самы старэйшы селянін вёскі не памятае *(М. Ч.).*

**6. Прачытайце сказы. Вызначце, у якіх выпадках *і* з'яўляецца злучнікам, а ў якіх — часціцаю ці кампанентам часціцы. Выпішыце сказы са злучнікам *і*.**

1. Праўда мовы—гэта і праўда вобраза, і праўда душы, і праўда атмасферы. І нам, пісьменнікам і журналістам, нельга не меець гэтага на першай сваёй увазе *(Скр.). 2.* І бачу дзіва: упоперак ракі, шпаркае Шчары, сунецца роўна і досыць хутка ахапак, нават цэлая паўкапа сена ці травы. А-а-а! Гэта ён, бабёр *(Янк.).* 3. Кожнае дрэва стаяла ў круглай лунцы-праталіне, нібы дыхала дрэва і подыхам сваім прадыхала снег аж да самай зямлі, да леташняй пабурэлай травы і іглiцы *(Лыньк.).* 4. І гзты малады хвойнік, і гэты лес, і гэтыя хвоі зліліся ў адну сцяну лесу, вырысоўваючы прыгожую вычварную лінію паваротаў, разгортваючы сваё цёмна-зялёнае крыло і ахопліваючы пясчанае поле, дзе раскінуліся маўклівыя пагоркі *(К-с).* 5. «Вось і прыйшлі»,— сказаў Лясніцкі, спыніўдшся *і пільна* ўглядаючыся наперад *(Шам.).* 6. І аднойчы на нейкае свята... адчула маці, што ўжо скончылася дзяцінства яе белагаловага хлапчука і з ім — яе, матчына, улада над сынам *(В. В.).*

**7. Спішыце сказы, падкрэсліце злучнікі; у дужках абазначце, які злучнік — злучальны ці падпарадкавальны; вызначце сінтаксічную ролю злучальных слоў.**

1. Каб не далёкі недзе гул самалётаў, каб не страляніна, можна было б сказаць, што на свеце ўсё ідзе ціха і мірна *(Пестр.).* 2. Але Тэкля *ўсё* не магла адцурацца хаціны, дзе нарадзіўся сын і якую яна ўпарта доўгія гады берагла для яго *(В. В.).* 3. Статак хацелі пагнаць цераз мост, што на лясной дарозе, але даведаліся, што такога моста ўжо няма, нібыта згарэў *(Лыньк.).* 4. Чалавек жыве дзеля дабра, для служэння праўдзе, каб ствараць нейкія вартасці жыцця і каб быць карысным для іншых *(К-с).* 5. Сцебанула здагадка, што здарылася нейкае няшчасце, бо звычайна ў гэты час людзей на поплаве не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

было *(І. М.).* 6. Лабановіч быў незадаволены сабою, бо трымаўся, як які-небудзь школьнік у прысутнасці дзяўчыны, што хоць і незнаема з ім, але добра ведас яго, як і ведае ён яе *(К-с).* 7. Жанчына, паправіўшы марлю на кашолцы, якую яна трымала на каленях, пацікавілася, адкуль лейтэнант родам і куды едзе *(І. М.).* 8. Калі ехаў, сябры, на кангрэс я да вас, мне Радзіма ў дарогу давала наказ, гаварыла зямля, што не хоча яна, каб палі арашала крывёю вайна, каб гарматы і танкі ўзрывалі яе, каб слязамі сірот палівалі яе *(М. Т.).*

**8. Вызначце, якой часцінай мовы з'яўляецца слова *што* ў сказах. Выпішыце сказы са злучнікам *што*.**

1. Легенда нябёсы расчуліць да слёз — наплачуць азёр аблачыны таму, хто хоць камень адзіны прынёс, што лёг у падмурак Айчыны *(Р. Б.). 2.* Сорак маленькіх чалавечкаў былі гатовы запомніць не толькі тое, што скажа настаўніца, але ўсё, што будзе рабіць *(Асіп.).* 3. Паходні здавалася, што, працуючы ў Старыцы, дабіваючыся яе росквіту, ён дапамагае і Мінску, і ўсёй краіне расці і прыгажэць *(Хадк.).* 4. А што яшчэ захавала ў сваіх нетрах зямля беларуская, чым яшчэ яна парадуе людзей сваіх? *(М. Ш.).* 5. Лёгкі ранішні ветрык калыхаў загоны жыта, што падступала да самай сцежкі, і яно ... выгіналася і роўна, вусцішна гуло, шумела сівым, яшчэ не налітым коласам *(Сач.).* 6. Лазавенка ведаў, што так толькі здаецца, але хацеў верыць, што гэта жаваранкі, што больш не будзе пахаладання і праз якія два-тры дні такой пагоды трактары змогуць выйсці ў поле *(Шам.).* 7. У размове ўжо не закраналі таго, пра што толькі што гаварылі і што патрабавала яснасці *(Хадк.).* 8. У Карэліцкім раёне, што на Гродзеншчыне, якраз у тых мясцінах, дзе знаходзіцца веска Рудня, геолагі знайшлі жалезную руду *(М. Ш.).*

**9. Спішыце сказы, вызначце, як звязаны даданыя часткі з галоўнымі ў складаназалежных сказах. Якая сінтаксічная роля злучальных слоў?**

1. Бацька казаў, што добра было б падвесці падваліны, перабраць сцены... *(І. М.). 2.* У вечным сваім імкненні скрышыць правы бераг Дняпро падступаў зусім блізка да яго, руйнаваў адхоны, зносіў лазу, каб пасадзіць у другім месцы, гвалтоўна вырываў кавалкі берага або асцярожна падмываў яго, каб раптам абу-рыць у ваду *(Каратк.).* 3. Як жа мне хадзіць па тым бетоне, калі ён на попеле замешаны, калі ён — прыслухайцеся — стогне, як і звон, што ў коміне падвешаны? *(В. З.).* 4. Не запальваючы святла, Астап схадзіў у істопку, дзе стаялі гладышы з малаком, не спяшаючыся павячэраў і ўлёгся спаць у сенцах, дзе не было так душна, як у хаце *(Лыньк.).* 5. Пачаліся гарачыя спрэчкі, абмеркаванні, куды пастунаць вучыцца, дзе працаваць *(Краўч.).* 6. Мама кажа, што бацька, калі наша армія гнала паноў на захад, толькі «вады напіцца» забег *(Б.).7.* Дзень быў некірмашовы, і плошча амаль што пуставала, калі не лічыць адзінокіх сялянскіх каламажак, дзвюх-трох гандлярак, якія цярпліва сядзелі каля просценькіх столікаў пад убогімі стрэшкамі, ды коз, што вандравалі на плошчы ў пошуках спажывы *(К-с).8.* Баклан зірнуў туды І за ніклымі голымі яблынямі, каля высокай бярозы, што схіліла задуменна на бок вершаліну, убачыў зруб Кацярынінай хаты (*М.).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**10. Выпішыце са сказаў злучнікі і ахарактарызуйце іх: 1) разрады злучнікаў паводле паходжання (вытворны, невытворны), структуры (просты, састаўны, парны), ужывання (адзіночны, паўторны), сінтаксічнай функцыі (злучальны, падпарадкавальны, далучальны); 2) якія сінтаксічныя адзінкі звязваюць (члены сказа, сказы).**

1. Няўжо таксама падлічана, колькі на свет патрэбна барвовых пякельных выбухаў і радыёактыўных хмар, каб спапяліць у калысках сотні Эйнштэйнаў і Рэпіных, мільёны ўсмешак, пацалункаў, сустрэч і мар? *(Р. Б.).* 2. Калі я чытаю добрую кнігу, не папракайце мяне ў гультайстве. Не хочаце прызнаць, што я працую, дык думайце, што я малюся — Слову *(Б.).* 3. Я рваў іх [кветкі] з свайго сэрца, а не з лугоў і ніў, я іх слязою чыстай, нібы расой, абмыў *(А. К.).* 4. Мы працуем уважліва, дбала, каб народ наш узнімаўся і рос, каб не ведаў галечы і слёз, каб у золаце поле шаптала, каб увысь узляталі кварталы, каб шумелі бары да нябёс *(Бр.).* 5. Калі-нікалі праляціць з піскам кажан або пракрычыць сава ці прашугаюць чарадою спалоханыя птушкі *(І. Г.).* 6. Гэтыя гутаркі не выходзілі за межы тых пытанняў, якія закранаў сам настаўнік, бо палешукі людзі паважныя, сталыя, асцярожныя, не адразу і не кожнаму расчыняць сваю душу, бо ўжо, мусіць, сама прырода Палесся налажыла на іх сваю адзнаку *(К-с).* *7.* І вось Брэст. Брама краіны. Часам, на жаль, рэдка, у яе ўваходзілі нашы сябры, і тады іх сустракалі з беларускай гасціннасцю. Але найбольш ахвотнікаў было ўварвацца ў тую браму сілай *(Каратк.).* 8. Яшчэ сіліўся нешта ўспомніць Дубок, яшчэ праходзілі перад яго вачыма цьмяныя вобразы: не то мост гарэў, не то грэўся ён [Дубок] ля цяпла з камісарам... *(Лыньк.).*

## ЧАСЦІЦЫ

**1. Як вы разумееце значэнне тэрміна «часціца»? Вызначце марфемную структуру гэтага слова.**

**2. Спішыце сказы і вызначце, якую функцыю выконваюць выдзеленыя словы (дапамагаюць сэнсава вылучыць тое ці іншае слова ў сказе, выказаць пытанне ці выразіць пачуццё, утварыць форму слова).**

1. У суровы век жыву сурова, жыць інакш *не* здолеў *бы* зусім. Сведчаннем таму *вось* гэта слова, што пранёс я праз агонь і дым *(А. К.).* 2. Перадаваць другім адчуванне радасці, красы жыцця, любові да яго — *няўжо* гэта *не* сапраўднае мастацтва, *няйжо у* мяне ёсць яшчэ і такія сумненні? *(У. Ю.).* 3. *Хай* дровы ярчэй разгарац*ца! Хай* добрыя рукі сяброў, грубыя ад сцюжы і працы, да полымя цягнуцца зноў! *(А. К.).* 4. Трэба глыбей увай-сці ў сябе самога і заняцца *чый-небудзь* болей важным і сур'ёзным, не траціць час на такое глупства, як марн-ванне вечароў у кампаніі асоб накшталт Сухаварава, які *нават* нічога добрага *не* бачыць у яго школьнай рабоце *(К-с).* 5. Янка Брыль підіа натхнёна. Яго слова — *як бы* зерне, старанна вымалачанае і адвеянае, самае буйное, важкае і здаровае, з тых, што дбайны гаспадар «пакідае на насенне» *(У. Ю.).* 6. Шутаў ніколі *не* задавальняўся *толькі* поспехам, яму трэба была перамога, сапраўдная, поўная

(У. *М.).7. Вось і* рысунак чалавечага гора. Можа *б,* ён *нават не* запомніўся, каб *не* гэтая невялічкая дэталь... *(Скр.).* 8. Хлеб сеючы, баронячы краіну, ты быў увесь жытнёвы і лясны. І *нават у* апошнюю хвіліну прасіў, каб помнік высеклі з сасны *(Янішч.).* 9. Заляглі валуны ў разоры. Цячэ *сабе* часін рака. Твае спакойныя азёры — халодны пот ледавіка *(Р. В.).*

**3. Спішыце сказы, падкрэсліце часціцы і ахарактарызуйце іх паводле паходжання.**

1. Няхай мацней гучыць іх шчаслівы смех, няхай растуць яны мужнымі і таленавітымі, слаўнаю нашаю зменаю, не знаючы ні выбухаў авіябомбаў і снарадаў, ні гора і слёз ваенных часоў *(Хадк.).* 2. Пакідаю я сягоння можа нават назаўжды і рамонкавыя гоні, і зялёныя сады *(А. К.).* 3. Расказваць пра вучобу трэба хоць бы для таго, каб давесці, што ён, Міхась, нічога не збаяўся, што дамогся свайго: ён хутка закончыць вучобу і будзе па-сапраўднаму друкаваць кніжкі *(Б.). 4.* Мы дамоў вяртаемся, Генадзь, дзе б сцяжынкі нашы ні кружылі. Лелей на зямлі бацькоў канаць, чым раскашавацца на чужыне *(Р. Б.).* 5. Як ні заўзята кідаў Міканор рыдлёўкай, на дарогу ўсё ж паглядаў — там цягнулася купка куранёўцаў (7. *М.).* 6. Вось хоць бы гэты дзед Мікіта. Сівы як *голуб.* Востры погляд, калючыя вочы, гатовыя пранізаць. Старасць прыгнула яго крэпкі стан і кінула на твар і на высокі лоб цэлую сетку маршчын. Але што за дока быў дзед Мікіта ў маладыя гады! *(К-с). 7.* Не, шчасця гэтага ніколі не ведаў наш працоўны люд: займеў ён нафту, сціртты солі, і вось — граніт! Ну проста цуд! *(Бр.).*

**4. Спішыце сказы, падкрэсліце часціцы і ахарактарызуйце іх паводле сэнсавых ці эмацыянальных адценняў, якія яны надаюць словам або сказам.**

1. Сваімі нарысамі Вера Палтаран, няхай сабе сціплей, але ж таксама па-свойму і добра дапаўняе тое маштабнае, грунтоўнае, што сказана пра гэты куток Беларусі, пра тую частку нашага народа, мінулае і сучаснасць якога арыгінальна і красамоўна гавораць пра сусветна-гістарычнае значэнне Кастрычніка *(Б.).* 2. А бацька, нібы баючыся забыцца штосьці ці з чымсьці спазніцца, хуценька і старанна разгладжвае свае русыя багатыя вусы і, не адыходзячы ад парога, пытаецца: «А ці запісаў ты сабе такое слова?» *(Янк.).* 3. Шчасце наша, наша мара і мэта — у разумным яднанні, як бы ні доўгім, як бы ні цяжкім быў шлях да гэтага *(Б.).* 4. Даўно чуў, што рыбацтва — найлепшы спорт і найлепшы адпачынак, што, седзячы за вудаю, можна забыцца на ўсё на свеце, а я нават не ведаю, як трэба закідваць тую вуду *(Скр.).* 5. Лабановіч ускінуў плечы, як бы кажучы гэтым, што ніякіх прэтэнзій школа не мае — ні да пісара, ні да во-ласці *(К-с).* 6. Глянула на неба — можа хоць па зорах можна пазнаць ці здагадацца, дзе веска. Але неба было нізкае, чорнае, зусім без зор. Калі яны і чаму пахаваліся, Юля нават не прымеціла *(Сач.). 7.* Добра было летась, на пачатку кастрычніка, у маёй, з двума сябрамі, паездцы на Петрыкаўшчыну. Успомніўшы, ледзь не ўздыхнецца радасна: «Ах, якія там лясы, якая восень была,— сапраўды залатая!» *(Б.).* 8. Мы прызвычаіліся, што Зямля нас корміць і поіць. Але адсюль, з космасу, асабліва выразна відаць, што яна мае вельмі вялікую патрэбу ў чалавечай ласцы і клопаце *(Г.).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**5. Спішыце сказы, падкрэсліце часціцы, вызначце іх разрады паводле значэння і марфалагічнага складу.**

1. Літаратура — гэта цяжкая работа. Мастак увесь час шукае дасканаласці. Хто хоча звязаць свой лес з лі-таратурай — няхай не адчайваецца ад першых няўдач *(Скр.).* 2. І вось жа дзіўна. Клімук прыбыў у Зорны во-сенню 1965 года. Тым жа годам павінен быў прыбыць туды і Кавалёнак, але — не пашанцавала: нібыта штосьці непажаданае ўгледзела ў ім медыцынская камісія *(Г.).* 3. Быў канец чэрвеня, і ночы амаль не было. Сонца ледзь толькі хавалася за стромкія вершаліны Шапчынскага бору І адразу ж паказвалася зноў, ужо з другога боку — з-пад *Гудагаю (Сач.).* 4. Вось хіба нядобра, што не спаткаў адразу. Але ж не ведаў, што камандзір прыедзе, а каб ведаў, то падводу паслаў бы насустрач, на станцыю (У. *М.).* 5. Не служылі ні ў конніцы мы, ні ў пяхоце, не вінтоўка — рыдлёўка ў нашых руках. Пракладалі мы ўдаль магістраль па балоце, брукавалі каменнем гасцінец-шлях *(А. К.).* 6. Пра Мінск, пра Беларусь людзі ведаюць нават за самымі далёкімі морамі. Беларусь для іх — гэта не толькі мірная і добрая краіна, але і цягавіты трактар, і вынослівы самазвал, і элегантны гадзіннік *(М. Г.).* 7. Вось ты які, Дзіксан, востраў, што вярнуўся да мяне з дзяцінства. Яшчэ са школьных гадоў, з маіх падручнікаў. Тады ты быў для мяне проста назваю, толькі словам, і ніяк не ўяўляўся нечым матэрыяльным, жывым, аб'ёмным *(Я. С).* 8. А ці магло іначай быць?.. Як сонца — сонцам, светам — свет, усё, што варта палюбіць, ці ж мог не палюбіць паэт?! *(А. Л.).* 9. Рэчка выйшла з берагоў, паднялася трохі на ўзровень абрыву, заліла нешырокую пойму, камель старой вярбы, ажио да самага галля і нават некалькі галінак было ў вадзе *(Шам.).*

**6. Спішыце сказы, вызначце разрады часціц паводле паходжання і значэння.**

1. Хай змываюць хмары чыстымі дажджамі след вай-ны нядаўняй, што прайшла лясамі, хай жа тое сонца, што ўстае з усходу, дасць зацвіўшым кветкам ясную пагоду... *(А. К.)2.* Бацьку Юля любіла. Любіла можа нават болей за маму, бо з бацькам ёй заўсёды, куды б яны разам ні ішлі — у лес, па ягады, па грыбы, а то часам і проста так, паблукаць,— было цікава: ён многа ведаў і ўмеў пра ўсё як ніхто расказачь *(Сач.).* 3. Каб нават я забіты лёг на дно сырой магілы, скарыцца б і тады не змог, свае не склаў бы крылы *(А. К.).* 4. Хай ніколі-ніколі ніхто з вас не ведае, што такое вайна *(Сач.).* 5. Дык вось які Мінск! Ой, дый горад жа! *(К-с).* 6. Ён камуніст. А хіба камуніст можа жыць, працаваць, ваяваць без насельніцтва, без народа, асабліва вось у гэтых партызанскіх умовах? *(Лыньк.).* 7. Падзякаваць за такую... ну, вельмі прыемную дробязь проста вось так, непасрэдна — я не мог *(Б.).* 8. Дзе б я ні быў, заўсёды я помніў свой зарок: калісьці абяцаны я сплёў табе вянок *(А. К.).* 9. Ой ты, мае сонца, як жа свеціш ясна! *(Куп.).*

**7. Спішыце сказы, падкрэсліце часціцу *не,* растлумачце, з якім значэннем (адмоўным ці сцвярджальным) яна ўжываецца ў сказах.**

1. Я хацеў бы, каб гэта быў сон. Але гэта не сон. Не, не сон. Гэта — праўда *(Сач.). 2.* Мастак не можа ў наш час не быць публіцыстам, бо надта ж ужо

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вялікая спа-куса быць побач з чытачом адразу, у тую ж хвіліну на-раджэння і актывізацыі надзённай праблемы грамадска-га жыцця *(У. Ю.)*. 3. «Ніхто нічога не казаў»,— флегматычна адказвала старая жанчына, не без цікаўнасці, аднак, пазіраючы праз акенца, як нервуецца гэты поўны мужчына ў пакамечаным парусінавым касцюме *(Шам.)*. 4. Ды яно І не дзіва — парушылі зямлю, і корань ужо не можа ўзяць з яе соку *(В. П.)*. 5. Праз некалькі дзён атрадны старшына Сарокін пытаўся: «Ці не вы, таварыш начальнік разведкі, далі такую інструкцыю?» *(Янк.)*. 6. Ледзь, напрыклад, у Карпатах і на Валыні пойдуць летам асабліва моцныя дажджы — пачынае шалець рака Гарынь *(Каратк.)*. 7. Быць Чалавекам — ці ж гэта не шчасце? *(А. М.)*. 8. Гэтай бялявай худзенькай дзяўчыне нельга было не верыць *(І. М.)*. 9. Цімох Панасавіч стаяў перад акном у адной гімнасцёрцы, не баючыся прастудзіцца, углядаўся ў блакіт вясновага неба, на якім не было ніводнай хмурынкі *(Шам.)*.

**8. Запішыце сказы, выберыце з прыведзеных у дужках патрэбную часціцу. Растлумачце значэнне, ужыванне і правапіс часціцы *ні*.**

1. Тут, што (не, ні) назва — то гісторыя, што (не, ні) ўзвышша ці рэчка — то паданне, што (не, ні) крыніца — то міф (*В. В.)*. 2. Ці яму было «брыдка», «сорамна» за сваю баязлівасць, ці ён адчуў, убачыў маё нежаданне (не, ні) ласаваць, (не, ні) лашчыць, (не, ні) бачыць яго каля сябе *(Янк.)*. 3. Макоўчык нават плаваць (не, ні) ўмее! (Не, ні) вучыўся ніколі: у яго зялёнай вёсачцы на Віцебшчыне (не, ні) было (не, ні) рэчкі, (не, ні) азярца (*І. М.)*. 4. Але стары (не, ні) разу нічога (не, ні) сказаў, быццам (не, ні) чакаваў разведчыкаў і мінёраў, якія ноччу, гучна заявіўшы пра сваю справу, шчасліва вярталіся на базу *(Янк.)*. 5. Так і (не, ні) знойдзецца ніхто, каб растлумачыць, чаму крытык, найдасканальнейшым чынам разумеючы чужы твор, (не, ні) можа напісаць сам *(Скр.)*. 6. А старыя, захопленыя песняй, (не, ні) на што (не, ні) звяртаюць увагі, яны спяваюць — моцна, звонка, працяжна *(В. В.)*. 7. Стары млын стаяў нерухома. (Не, ні) было каля яго (не, ні) людзей, (не, ні) фурманак. (Не, ні) рухалася і велічэзнае многаступянёвае кола... *(К-с)*. 8. Я ў думках цалую гарачыя губы маёй (не, ні) з кім, (не, ні) з чым (не, ні) параўнанай радасці *(Б.)*.

**9. Спішыце сказы, вызначце, якімі часцінамі мовы з'яўляюцца словы *ці, сабе, сапраўды.***

1. Адступалі балоты і на заходнім баку, дзе рунелі ці жаўцелі да краю лесу палі, таксама скупыя, няўдзячныя, хоць у іх глебе і было менш пяску (У. *М.)*. 2. Мітуслівыя думкі не давалі спакою: як там нашы, ці выбрался ўсе, ці ўдасца стрымаць на рацэ вераломнага ворага *(Лыньк.)*. 3. Ці ж мы, хлопцы, рук не маем? Ці ж нам сілы бог не даў? *(К-с)*. 4. Ці ж будуць слухаць мяне дзеці, ці спраўлюся адразу з чатырма класамі, ці хопіць умення? (*П. К.)*. 5. Хлопец прыцяў у сабе зачаткі трывогі — капітана трэба было весці далей — і, страціўшы ахвоту да гаворкі, моўчкі пайшоў уперад *(В. В.)*. 6. «Удзячнасці ў нас малавата»,— думаў сам сабе Андрэй, да болю адчуваючы сябе вінаватым перад некім *(Краўч.)*. 7. Няхай сабе жарты, няхай смех — а не хочацца, каб перад жанчынаю апраставалосіцца *(Скр.)*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*8.* Не стаў ляснік падковы браць, пайшоў ляснік дадому, усё ён можа пажадаць цяпер сабе самому *(А. К.).9.* «А від адгэтуль нішто сабе,— сказаў сусед.— Вось толькі непагадзь...» *(Б.).* 10. Але сабраных самім кветак я ніколі не пастаўлю сабе на стол. У іх не будзе ніякай загадкі, яны нічога не дадуць душы *(Скр.).* 11. Гучны плеск вясла па вадзе павялічвае шум і гулка разносіцца па рэчцы між травяністых берагоў. І сапраўды, некалькі качак узнялося з затокі і свіст іх быстрых крылаў вы-разна чуваць у паветры *(К-с).* 12. «Гэта ж не сабакі, а ваўкі! — закрычаў Сцёпа.— Сюды імчацца!» Сапраўды, ваўкі імчаліся проста на дзяцей *(К. Ч.).* 13. І сапраўды, лепшага месца цяжка было знайсці: зацішак, сонца, чыстае паветра і блізка ад хаты *(К-с).* 14. Тытунь дзед садзіў ля самай хаты, на трасочніку, не ленаваўся штодзень па некалькі разоў кожнае каліва паліваць, і тытунь вырастаў сапраўды на дзіва, як лес — высокі, вышэй за мяне *(Сач.).*

**10. Спішыце сказы, назавіце словаўтваральныя і формаўтваральныя часціцы, растлумачце, для ўтварэння якіх часцін мовы і форм яны ўжытыя.**

1. Падумаў бацька, што з вайны прыйсці б сыны павінны, павінны ў луг пайсці яны хаця б на паўгадзіны *(А. К.).* 2. У той момант Ганне раптам успомнілася, што недзе тут Васіль абганяў калісьці яе з бацькам, недзе тут парвалася ў яго супоня — няшчасны, чырвоны, ён звязаў яе нанава (7. *М.).* 3. Каларытнае слова «цяпершчына». І калі б папракнулі нейкага пісьменніка, што ў яго творах мала цяпершчыны, то ён зразумеў бы, што ад яго патрабуюць сучаснасці *(Скр.).* 4. Ніхто ўжо І не помніць, з якіх пор наша веска Плаксамі завецца *(Грах.).* 5. Цяпер у Івана будзе другі боль — за яе. Але ад гэтага болю ёй будзе спакойна, дзе б яна ні знахо-дзілася *(Шам.).* 6. Ясна, ніхто іх не зваў, ясна, наша справа была святой, і ўсё ж — хай яны будуць праклятыя: вацна, уварванне, пагібель людзей *(Каратк.).* *7.* Тут просторней і як бы вальней трохі, прынамсі нікога не відаць, бо Лабановічу не хацелася б цяпер спаткаць каго-небудзь знаёмага, уступаць у гутаркі, выдумляць прычыны свайго позняга вандроўніцтва ў Пінск... *(К-с).* 8. А як ён [Піліп] іграў на гармоніку! Бывала, як утне са скрыпачом Тодарам полечку, дык ніхто не ўстоіць і не ўседзіць *(Як.).*

**11. Спішыце сказы, вызначце часціцы, выкарыстайце прыкладны парадак разбору іх: 1) разрад паводле паходжання (вытворныя, невытворныя); 2) лексіка-семантычны разрад (узмацняльныя, указальныя, азначальна-ўдакладняльныя, вылучальна-абмежавальныя, пытальныя, клічныя, сцвярджальныя, адмоўныя, параўнальныя, мадальна-валявыя); 3) роля часціц (надае сэнсавае або эмацыянальнае адценне слову, словазлучэнню, сказу; служыць для ўтварэння новага слова ці формы слова).**

1. О Беларусь — мой родны край, мой дзень народзін — Першамай, радзіма любая мая, дзе жыць хацеў бы вечна я! *(А. Л.).* 2. Мінуўшы ўзгорак, Лабановіч апынуўся амаль на самой станцыі. Такая ж яна ціхая і бязлюд-ная, як і тыя станцыі на Палессі, дзе ён садзіўся некалі на паязды *(К-с).* 3. Нават глупства можа набыць славу мудрасці, калі яму не пярэчыць *(Скр.).* 4. Няўжо гэта ён падглядаў у вокны? Не падабаецца дзяк чамусь настаў-ніку. Вось чаму і з візітам да яго не сабраўся да гэтага часу *(К-с).* 5. Дзеці Зямлі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яны сумавалі па ёй і аддавалі ёй шмат увагі не толькі ў час спецыяльных эксперыментаў і даследаванняў. Яны звярталі свой погляд на Зямлю і ў нешматлікія вольныя хвіліны — проста любілі паназіраць за ёй, адшукаць абрысы знаёмых, добрых мясцін... *(Г.). 6.* Як шпарка праходзіць час! Ці даўно ён, Лабановіч, прыехаў сюды упершыню, каб даставіцца да невядомага яму Верханя? *(К-с).*

## МАДАЛЬНЫЯ СЛОВЫ

**1. Прачытайце ў спецыяльнай літаратуры пра мадальнасць, мадальныя словы. Якімі сродкамі выражаецца мадальнасць у беларускай мове?**

**2. Спішыце сказы. Вызначце, якія адносіны асобы да рэчаіснасці выражаюць выдзеленыя словы. Пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку.**

I. Вялікую чарадзейную сілу мае слова. *Сапраўды* варта быць пісьменнікам, каб любіць яго і адчуваць! *(Скр.).* 2. На кірмаш сядзе ехаць I то *здаецца* бегла б на возе, каб хутчэй справіцца *(Б.).* 3. Успрымальнасць ідзе *вядома* ад прастаты апавядальнасці і кампазіцыі. I *мабыць* трэба шукаць сакрэту ў элементах тонкага псіхалагічнага рысунка, нагляднасці, удумлівага адбору чалавечых жэстаў, дэталі і глыбока культурнай, простай народнай фразы *(Скр.).* 4. Трэба *мусіць* да дзяжурнага па часці пайсці, параіцца, а? (У. *М.).* 5. Марыля была ціхая, пакорная работніца і жаль свой дзявочы хавала глыбока: па вачах — што сумнелі *праўда* пасля прыгоды — немагчыма было пазнаць, колькі слёз праліваюць яны ў адзіноце *(Б.).* 6. Стоячы ў тралейбусе, любаваўся, як з дажджлівай вуліцы, цераз пярэднія дзверы дастойна і *здаецца* яшчэ непрывычна *можа* нават і сарамліва карыстаючыся гэтым правам, увайшлі адразу дзве маладзенькія мамы — з малымі на руках *(Б.).*

**3. Растлумачце значэнне наступных мадальных слоў. Згрупуйце іх паводле семантыкі. Выпішыце з мастацкіх твораў па два сказы з мадальнымі словамі кожнай групы.**

Можа, бясспрэчна, праўда, мабыць, здаецца, напэўна, само сабой зразумела, пэўна, сапраўды, няйначай, мусіць, магчыма, безумоўна, канешне.

**4. Спішыце сказы, падкрэсліце мадальныя словы. Вызначце, з якімі часцінамі мовы яны суадносяцца.**

1.Ён, здаецца, быў перакананы, што каня выратаваць не ўдасца, і гэта злавала яго... (*/. М.).* 2. Васіль удзячна глядзеў цяпер мне ў вочы, аднак усё яшчэ, мабыць, не верыў у шчырасць маёй просьбы *(П. К.).* 3. Яна [аўтамашына], відаць, набліжаецца, буксуе, пэўна, у калдобінах тых, ля пагорка *(В. Б.).* 4. У Вепрах прабыў Саўка дзён тры ці чатыры. I, трэба сказаць, дарма часу ён тут не зводзіў *(К-с).* 5. У гэты вечар сцямнела раней, чым звычайна. Хмары, здавалася, паважчэлі і насунуліся ніжэй (*І.М.*). 6. Вядома, можна было адмовіць Крушынскаму, але Стэфа згадзілася ехаць *(Бяд.).* 7. Па гэтым пероне Ліда, напэўна, не раз хадзіла. Магчыма, нават учора (*І. М.).*

**5. Выпішыце спачатку сказы, у якіх мадальныя словы і словазлучэнні выражаюць дакладную ацэнку выказвання, потым — сказы, у якіх яны**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**выражаюць прыблізную ацэнку выказвання. Пастаўце пра-пушчаныя знакі прыпынку.**

1. Там, дзе сінее Свіцязь, сто зім назад, сто лет, ці можа больш,— дзяўчыну кахаў юнак-паэт *(А. К.).* 2. Салаўя, такім чынам, я змалку не чуў, гадоў здаецца да семнаццаці, пакуль не паехаў аднойчы ажно за чацвёртую вёску рэзаць на балоцістым надрэчным лузе лазу *(Б.).* 3. Каб рыба бралася, стары рыбак не парушыў бы мусіць патрэбнае цішыні *(Б.).* 4. За секунды ці можа хвіліны памяць ажывіла вобразы іхніх бацькоў, устала першая мая сустрэча з Углянамі, куды прыехаў настаўнічаць у жніўні 1936... *(Янк.).* 5. З вялікім задавальненнем, з асалодай можна сказаць слухаў Пракоп гэту прамову *(К-с).* 6. Г мне стала вядома няёмка за тэту — як нехта можа падумаць — маю ганарлівасць *(Б.).*

**6. Вызначце, у якіх сказах выдзеленыя словы з'яўляюцца мадальнымі а ў якіх — словамі іншых часцін мовы. Спішыце, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку.**

1. Чуламу чалавеку магло *здавацца,* што цяжкае ўтрапенне не кране чалавечай душы *(К. Ч.).* 2. Так ціха, што *здаецца* нідзе на ўсім белым свеце ніхто не жыве *(Сач.).* 3. Раней, яшчэ ў мястэчку, Юлі *здавалася:* варта толькі ўвайсці ў лес, як адразу ж напаткаеш на партызан *(Сач.).* 4. Мне *здаецца,* што было б вельмі добра, каб на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» мы час ад часу таксама абменьваліся думкамі па пытаннях культуры мовы *(Скр.).* 5. Пані падлоўчай *здавалася* было крыху нялоўка, што панна Габрынька так дурэе пры чужым чалавеку. А гэты чалавек быў Лабановіч *(К-с).* 6. Ёсць на рэчцы месца, дзе *здаецца* сама прырода знарок стварыла ўсе ўмовы для будаўніцтва гідрастанцыі *(Шам.).* 7. Блізка *відаць,* ды далека дыбаць *(Прык.).* 8. Зрэшты і ва ўсіх *відаць* бывае, што першыя ўспаміны расплываюцца ў ружовай, мілай імгле чала-вечага досвітку *(Б.).* 9. Адзін мой знаёмы знайшоў аднойчы ў глеі стары самовы кручок. Выкінулі *відаць* за непатрэбнасцю, бо такіх самоў мабыць цяпер няма *(Каратк.).* 10. Сонца яшчэ не было *відаць,* але яго ружова-залацістыя слупы ўжо высока падымаліся над зямлёй *(К-с).* П. *Відаць* па ўсім, што яна [маці] кагосьці чакае, і гэтае чаканне балючым адбіткам тугі і надзеі свеціцца ў яе слязлівых вачах *(В. Б.).* 12. *Мусіць* у вас нейкая важная справа, калі так? *(К-с).* 13. «Пра што гэта ён? Што хоча ад мяне? — напружваў, сіліў памяць, пакутліва думаў Косцік.— А-а *мусіць* усё пра той камень...» — здагадаўся нарэшце ён *(Сач.).* 14. Цяпер жа ён [Лабановіч] *мусіць* ехаць, бо Дубейка ў старасты яго напэўна чакае *(К-с).* 15. Помню, яшчэ я падумаў, што *можа* і цяпер вось, у гэтую ноч, едзе нехта са сваім бацькам і ма-ці на возе на луг па сена, як некалі ехаў я... *(Сач.).16. «Можа* часамі ў сваты прыехалі да каго?» — мяняючы тон размовы, жартаўліва запытаў Лабановіч *(К-с). 17. Можа* вам прынесці дзяружку? Ці кажух? Ноччу пэўна пахаладае *(В. К.).* 18. Да аўтамашыны зубр ставіцца памяркоўна, але матацыклаў цярпець не *можа* яны яго нервуюць *(Каратк.).*

**7. Спішыце сказы, вызначце мадальныя словы, выкарыстайце прыкладны парадак разбору іх: 1) лексіка-семантычны разрад (перадаюць**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

**упэўненасць, няўпэўненасць, меркаванне і г. д.); 2) разрад па суадносінах з іншымі часцінамі мовы (з назоўнікам, прыслоўем, дзеясловам). Пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку.**

1. Можа ніколі не было ў Ганны такой цяжкай, поўнай супярэчлівых пачуццяў размовы, як у гэты дзень (*І. М.*). *2.* Лабановіч пачуў, як бы яму стала чагось шкала праўду сказаць яму крыху і дакучала за зіму гэта работа *(К-с).* 3. «Гэта ён [вожык] мусіць есці хоча»,— кажа маці і ідзе да паліцы, дастае сподачак, налівае ў яго малако *(Сач.).* 4. Выпрабоўваючы мабыць свае сілы, захапляючыся шырынёй прастораў, ён хутка збег з узгорка *(Сам.).* 5. У абодвух былі такія самыя вусы, абодва хударлявыя, энергічныя і здаецца нястомныя, абодва дарагія мне *(Янк.).* 6. Мажліва больш не вярнуся я, дык ты перадай вось гэта камандзіру (У. *М.). 7.* Праўда Сцепка стараўся ўпэўніць сябе, што нічога благога ў яго ўчынку не было *(К-с).* 8. Леспрамгасаўцы расступіліся, цісонуліся да сцен, давалі месца пасярод хаты. Відаць хацелі паглядзець на Чаркашына — той мусіць умеў танцаваць *(Пташн.).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ВЫКЛІЧНІК

**1. Чым выклічнікі адрозніваюцца ад іншых часцін мовы — знамянальных і незнамянальных? Раскажыце пра спосабы канкрэтызацыі значэння выклічніка ў пісьмовай мове.**

**2. Спішыце сказы, вызначце выклічнікі. Назавіце тыя пачуцці і эмацыянальныя ацэнкі з'яў рэчаіснасці, якія выклічнікі выражаюць.**

1. А-а! Вось якая справа... Ну, дык шчаслівай дарогі вам *(Лыньк.).* 2. Ах, каб мне радасць зноў такую, як першы верш надрукаваў *(Бр.).* 3. Эх, каб знаць-дазнацца, што за лесам-гаем *(М. Т.).* 4. Хітры ты чалавек, Палуян. Недарма цябе і солтысам назначылі. Кхэ! Брр!.. *(Б.).* 5. У хаце баян, акардэон... Але пласцінкі — гэта яно так сабе, ат, трава пры дарозе! *(Янк.).* 6. Зімавец схапіў трубку: «Вайцюк?.. Тэк-тэк... Што?..».(В. *К.).* 7. Божа мой, божа!.. І што ж гэта робіцца? *(Б.).* 8. Ад крытыкі многа залежыць, о-го! *(Ал.).* 9. «Мамачкі мае, а-а-ах, родненькія-я-а...» — стагнала Марыля *(Б.).* 10. А-я-яй! Гэта ж не ўкладваец-ца ў памяці — цэлыя суткі ідзе вайна! *(Сач.).* 11. Ох І любіць жа яна [чарацянка] падмануць слых спевам любой птушкі, ох і майстар яна на дзівосныя перайманні *(Кір.).*

**3. Растлумачце, якія валявыя імкненні і намеры таго, хто гаворыць, выражаюць выклічнікі.**

1. «Даволі! Зрабі такую ласку, даволі!» — запярэчыў Міна Карпавіч *(Луж.).* 2. «Лаві, лаві яго! Каравул!» — крычалі яны і гналіся за Саўкам *(К-с)***.** 3. У лодку! Арш! І каб сядзеў. Пільнуй — і ўсё *(Янк.).* 4. Но-о, ты! Парож-ні воз цягнуць не хочаш! *(Шам.).* 5. Як гром, пранёсся кліч: «Таварыш, прэч цара! Далоў вайну! Далоў людское гора!» *(Ал.).* 6. Сяргей узяў з зямлі каменьчык і шпур-нуў у пеўнікаў. «Акыш вы, дурні гэтакія»,— крыкнуў ён *(Саб.). 7.* Пятрок і Грышка паднялі лямант. «Марш на печ!» — тупнуў на іх бацька *(К-с).* 8. «Мамко, татко, дзядзько,— гучыць над ракой.— Го-о-о,

Васілько-о-о, го-о-о!..» *(В. В.).* 9. «Эйш ты, пайшла, пайшла!..— З-пад капытоў пырскаў і ляцеў камякамі снег.— Эць ты, варушыся, каб ты здаровая была!..» *(В. А.).* 10. «Прэч, прэч з мае хаты, чуж-чужаніца! — закрычаў, шалеючы ад злосці, бацька.— Прэч!» *(Сач.).* 11. «Баба-а, го-оў!» — гукае малы, узнімаючыся на пальчыкі.— «А-го-го! Чаго ты?» — адгукваецца бабуля *(Б.).* 12. Эх, Андрэй... ста-расць — не радасць. Баста! Годзе! Ад'ездзіўся *(Лыньк.). 13.* Стоп! Мікалай Ягоравіч за рулём захроп *(А. К.). 14.* Ён [Шпачок] яшчэ гукнуў наўздагон: «Ату-у!» *(Пальч.).*

**4. Выпішыце спачатку сказы, у якіх адны і тыя выклічнікі выражаюць розныя значэнні, а затым сказы, у якіх аднолькавыя эмоцыі і пачуцці выражаюцца рознымі выклічнікамі.**

1. А! Ото ж грыбкі! І так рана з'явіліся! *(К-с).* 2. Эх! Шырыня якая! Воля!.. Аж дух зацінае *(Хадк.).* 3. «Ой, якія зелянушкі!» — усклікнула яна і пачала зразаць грыбы *(Л. Д.).* 4. О! Гэта называецца зацягнуў невад *(К-с).* 5. Ах, вунь ён дзе, клянок *(Шам.).* 6. Ага! Вось яно што! *(Лыньк.). 7.* «А, такі адгукнуўся»,— ціха пра-мовіў Сяргей Карата *(К-с).* 8. «Эх, каб дожджык!» — не раз думаў Лагуновіч, з надзеяй пазіраючы ўгару (*І М.).* 9. «Эх, разліло, а?» — сказаў чарнігавец, акідваючы вачыма шырокі прастор вады *(П. К.).* 10. О памяць! Памяць! На прывале ніколі не бывает ты (*Я. П.).* 11. Ах ты, дзіця! А ўжо трэба табе ваяваць *(Дам.).*

**5. Вызначце разрады выклічнікаў паводле паходжання і семантыкі. Выпішыце сказы з выклічнікамі моўнага этыкету.**

1. «Ах ты, грэх які! Э-хэ-хэ!» — цмокаў Раман і чухаў патыліцу *(К-с).* 2. Іду да старажыла, кажу: «Салам, стары!..» *(Р. В.).* 3. О, далёкаўсходні госць! Здароў! *(Ал.).* 4. «А-а-а, Андрэйка!..» — задаволена загаманіў дзед *(Бр.).* 5. «Я тут! Я тут! Э-гэ-эй! Гэй!» — крычаў я, і рэха прыносіла хуткі і вясёлы адказ *(Кір.).* 6. Пад страхой трымай месца мне, Тадораўна! А цяпер — бывай!.. *(А. К.). 7.* Ото-та, кажу, так яна [зямля] і круціцца *(Пальч.).* 8. «Рына-Марына, прывет!» — крыкнуў ён, па-раўняўшыся *(Гр.).* 9. І я шукаў удзякі словы, казаў іх шчыра, без прыкрас: «Дзень добры вам, лясы, дубро-вы!» — «Дзень добры!..» — чулася ў адказ *(Бр.).* 10. Ко-ні будуць усё адно як мае! Ей-бо! *(І. М.).* 11. «Але до! — сказаў дзядзька Якуб.— Пара і за юшку... Загаманіў я тут усіх. Пара!» *(Кір.).* 12. Ніна крычыць за кожнай банькай «а-ёй!» і просіцца: «Ах, бабка мая, годзе!» *(Б.).* 13. Нічога не разумеет! Божа мой! *(Шам.).* 14. «А, сябар!.. Добры дзень!» — сказаў ліслівa Авадзень, усеўшыся Валу на спіну *(Кр.).* 15. «Гэй, шчаслівай вам дарогі! У добры час!» *(Ал.).* 16. З ім ты, Настуля, усё страціш, што маеш. Галаву ўжо страціла... Не давядзі божа. Ой-ёй-ёй!.. *(В. К.).*

**6. Спішыце сказы ў такой паслядоўнасці: з выклічнікамі, з гукапераймальнымі словамі, з «дзеяслоўнымі выклічнікамі». Раскажыце, чым усе гэтыя словы падобныя і чым адрозніваюцца.**

1. З двара пачулася яе звычайнае: «А-кыш!..» *(В, К.).*2. «Пі-іць, пі-іць!..»— жаласна просіць канюк *(В. В.).* 3. «А-ёй, колькі сабак!» — зацягнула Насцечка *(К. Ч.). 4.* І раптам — бліcь у лесе агеньчык *(К-с).* 5. Чэпу-тэпу — сумны бусел-недарэка валачэцца з ельніку да хаты *(Вял.).* 6. У гэты смачны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ранішні сон раптам уварваўся лалёкі, быццам з нябёсаў, голас: «Бом-м-м!..» *(В. К.). 7*. Лейцы — трэсь! Толькі кончыкі ў маіх руках засталі-т?я *(К-с).* 8. Рэха панесла па горным схіле, па вадзяной роўнядзі: о-оў-і-і *(П. К.).* 9. І раптам яна [Марына] пачула ззаду: цоп-цоп!.. Відаць, нехта бег *(Гр)*.10. Знойдзе камень, кавалачак цагліны, шкельца — і шпургель у ваду *(Янк.).* 11. З неба зляцеў на зямлю роспачна-абрывісты гук: «Курл!.. Курл!.. Курл!..» *(В. В.).* 12. «Цю-цю»,— прысвіснуў Юшкоў *(Л. Д.).* 13. «Гу-у-ур-р» — да вушэй Рамана даляцеў нейкі глухі гром *(К-с).* 14. У вёсцы па-ухалі адзін за адным у вокнах агні — пых! — і няма *(Сач.).* 15. Цю-га! Вон адсюль! Пайшоў туды, адкуль прывалокся! *(Янк.).* 16. А сініца на дрэве нібы круціла ржавы вінцік: «Чыкі-чыкі!», «чыкі-чыкі!» — на холад *(Гр.).* 17. «А як ета — кахі-ках!—загадваць?» — спытала, усё ніяк не могучы адкашляцца, Параска *(Сач.).* 18. У парку вусцішна шумелі дрэвы, капала, гучна падала з ліста на ліст — шпок-шпок, шпок-шпок-шпок — раса *(Сач.).*

**7. Вызначце, якія стылістычныя функцыі і сінтаксічную ролю выконваюць у сказах «дзеяслоўныя выклічнікі». Адкажыце, што ў іх агульнае з дзеясловамі і з выклічнікамі.**

А копка плыве сабе проста
Туды, дзе канчаецца мост,
Зашылася шчыльна ўскрай моста
І — стоп, бы прыбіў яе гвозд!
І следам з той копкі стралою
Бултых у ваду чалавек!
І згас у ёй іскрай малою,
Як зерне, упаўшы ў сусек.

*(Я. Колас)*

**8. Вызначце словазлучэнні, якія страцілі намінатыўныя функцыі (поўнасцю ці часткова) і перайшлі ў выклічнікі.**

1. «Журавель у руках быў — і на табе»,— закончыў Гарадзец і чакаў, што Раіса хоць паспачувае *(Грод.). 2.* «То-та ж і яно!» — задуменна сказаў дзядзька Хвядос *(Пар.).* 3. «Так яно і ёсць: мароз!.. Ах, ліха ж на яго!» — увесь скалануўся Антось *(Хадк.).* 4. Затое — божа мой! — колькі навокал праз цэлы дзень свяцілася сонцаў у кожнай крыштальнай ільдзінцы... *(Кір.).* 5. «З добрай раніцай, дзеду!» — «А-а... Унучка! Сядай...» *(Лыньк.). 6.* Дзядзька Піліп надзеў на галаву Косці бесказырку: «Бач ты, якраз па табе. Насі на здароўе» *(Пар.). 7.* Зазлаваўшы, мама закрычала: «Ён выскаляецца, ах, божа мой літасцівы!..» *(В. А.).* 8. Дзіва што! — гэта ж толькі з'явіўся чалавек на беразе, толькі закінуў вуду — і на табе! — праз якуюсь хвіліну ўжо і рыбіна выгінаецца ў руках! *(Кір.).* 9. А божачка ж ты мой, забілі хлопца, забілі *(Лыньк.).* 10. А тым часам — о, каб яно патанула! — праз расчыненую фортку кухні дзьмухнула скразняком, і перад самым носам зачыніліся дзверы *(Грод.).*

**9. Выпішыце два-тры выклічнікавыя фразеалагізмы з «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» (у 5-ці т. – Мн., 1977-1984), складзіце з імі сказы.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**10. Складзіце сказы, у якіх бы словы *а, у, ну, ох, алё-алё, цып-цып-цып, жах, годзе, каравул, марш* ужываліся як выклічнікі і як знамянальныя ці службовыя часціны мовы.**

**11. Са значэннем слоў якіх часцін мовы выступаюць і якую сіктаксічную ролю выконваюць у сказах выдзеленыя словы і словазлучэнні. Ахарактарызуйце выклічнікі, карыстайцеся прыкладным парадкам разбору: 1) разрад паводле значэння (эмацыянальныя, волевыяўленчыя, моўнага этыкету) і яго адцення; 2) паводле паходжання (невытворны, вытворны); 3) гукавы склад.**

1. Саяны, кажаце? Э, не — да Саянаў яшчэ *уга кольце* трэба ехаць *(Я. С).* 2. Чыстая вада, прытым у вялікай колькасці, нам *ой-ой* як патрэбна! *(В. В.).* 3. Мікола ўзяў за руку сына і сказаў: «Сынок, хадзем дахаты! І маўчы, нікому нічога ані *шэп\..» (К-с).* 4. У каго не сціскаецца сэрца, калі з яшчэ цёплага неба восені загучыць і тужлівае і жалкотнае *«кур-лы-курлы» (Кір.).* 5. У такім узросце пабываць у Афрыцы — *ого* Хіба не шчасце? *(Шам.).* 6. Сінічка ў сваім зялёным і чорным і жоўтым адзенні сказала б, вядома, сваё *«ці-сік, ці-сік» (Б.).* 7. Мне цяжка, *ой* цяжка *(Ал.).* 8. Што ж, зноў вяртайся ў стан свой дзікі, туды, дзе воля, снег, імжа... Не струнь вачэй на нашы крыкі, на наша *«коею»* не зважай *(Я. С.). 9.* Гоп-гоп! — нехта сарваўся ў ваду. Гучны ўсплёсак і міжвольнае *«ах!»* — ад нeспадзяванасці *(Лупс.). 10.* А вы, скажу вам, хвацкі рыбак! Спачатку ўсумніўся я, каб вам быў шанец. Ажно вы — *раз,* і гатова! Ого! *(Кір.).* 11. Вясёлая гэта работа — драць бяросту з бяроз. Сякеру заткнеш за пояс, узлезеш па астрозе ці драбінах аж у самае голле і — *гах, гах, гах... (Сач.).* 12. Стрэльба, браток, новая, а — *раз]* — асечка, другі *раз* — асечка!.. *(В.).*

## ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ (ТРЭЦЯЯ ЧАСТКА) ВМК ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ "АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ"

### Тлумачальны каментарый

ВМК па дысцыпліне **"Актуальныя праблемы беларускай мовы"** прызначаны для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін.

Асноўная **мэта выкладання дысцыпліны** – развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне будучых спецыялістаў-філолагаў; выпрацаваць уменні і навыкі практычнай рэалізацыі атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці; садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў, здольных паспяхова вырашаць праблемы функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму; выхаваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

ВМК "Актуальныя праблемы беларускай мовы" займае важнае месца ў сістэме лінгвістычнай падрыхтоўкі студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, з’яўляецца дадатковай базай для грунтоўнага засваення беларускай мовы. Пры вывучэнні дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і цесная сувязь яго з ВМК іншых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лінгвістычных прадметаў і, у першую чаргу, з ВМК па дысцыпліне “Сучасная беларуская літаратурная мова”.

Трэцяя частка практычнага раздзела ВМК дысцыпліны “Актуальныя праблемы беларускай мовы” ўключае (згодна “Палажэння аб вучэбна-метадычным комплексе на ўзроўні вышэйшай адукацыі” пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь) матэрыялы для фарміравання ўстойлівых прыктычных уменняў і навыкаў у аб’ёме, устаноўленым тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура, у прыватнасці, сістэму заданняў, змешчаных у дапаможніку “Бурак, І.Л. [і інш.]. Сінтаксіс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: практыкум: вучэб дапам. / І.Л. Бурак, С.С. Мароз, П.А. Міхайлаў, М.С. Ржавуцкая, Н.У. Чайка; навук. рэд. І.Л. Бурак. – Мінск: БДПУ, 2005”, якія можна выкарыстоўваць на этапе фарміравання і ўдасканалення практычных ўменняў і навыкаў.

**Метадычныя рэкамендацыі**

Асноўнымі метадамі пры правядзенні практычных заняткаў па названым курсе з’яўляюцца практычныя метады (практыкаванні аналітычнага, сінтэтычнага, аналітычна-сінтэтычнага характару, лінгвістычны эксперымент і інш.). Як метад можа выкарыстоўвацца і метад самастойнай працы, заснаваны на самаарганізацыі студэнта пры выкананні заданняў.

Асноўныя прыёмы: прыёмы параўнання і супастаўлення, прыёмы аналізу і сінтэзу, прыёмы класіфікацыі і дыферэнцыяцыі і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## СІНТАКСІС

## СЛОВАЗЛУЧЭННЕ

***1. Падзяліце сказы на словазлучэнні. Вызначце лексіка-граматычныя тыпы словазлучэнняў і назавіце сінтаксічныя адносіны паміж іх кампанентамі.***

На даху хаты залівіста выспеўвае шпак новай вясны. А я падграбаю двор і палю леташняе лісце. Рассыпіста бяжыць дымок туды, куды паказвае яму вецер. Халаднаватае сонца нясмела падсушвае за ноч падмерзлую глебу. Падграбаю двор і ўвесь час паглядаю на дарогу, на адзін і другі яе бок. І туды і сюды няспынна снуюць і ціхія, і з натужным выццём машыны. Круцяцца колы, мільгацяць крылы. “Даганяй мяне!” – зноў гукае мая новая вясна. А я чамусьці азіраюся туды, назад, на тое, што пражыта. Што там пакінута, я добра ведаю. Што там, наперадзе, будзем яшчэ бачыць.

*К.Камейша. Паміж кубкам і вуснамі*

***2. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Вызначце іменныя і дзеяслоўныя словазлучэнні, прааналізуйце іх структуру.***

I. Сюда бы руки полоцких мастеров, их бы умение сюда – в Прагу! Но если их навык у него в памяти, их умелость у него в душе, то и желанная красота осенит его буквы, рождаемые тут, как и всё его дело, творимое тут.

Красота его букв перед ним – такая близкая, до каждой изгибинки знакомая. Но от того, что Скорина знает каждую буковку в свежем оттиске заключительной части Псалтыри, их черные абрисы на белизне бумаги не перестают для него быть звездами в темном небе – ослепительно яркими и словно святыми, словно окруженными божественным нимбом. Но ведь божественную книгу они готовят. Так в его предисловии к Псалтыри написано. Как на святую книгу и смотрит на свою Псалтырь Скорина.

*О.Лойко. Скорина.*
*Авторизованный перевод Г.Бубнова*

II. Для того чтобы проявить понимание и быть снисходительным, требуются сильный характер и самообладание. Вместо того чтобы осуждать людей, давайте попытаемся понять их. Попытаемся представить себе, почему они поступают именно так, а не иначе. Это намного полезнее и интереснее, чем заниматься критикой, и развивает в человеке сочувствие к окружающим, терпимость и доброжелательность.

*Д.Карнеги. Как завоевать друзей и*
*оказывать влияние на людей*

***3. Выпішыце са сказаў сінтаксічна несвабодныя словазлучэнні.***

1. Як паказала жыццё, здзяйсненне задумы грандыёзнага маштабу – асушэнне палескіх балот – прынесла шмат шкоды (“Звязда”). 2. У выніку шматлікіх настойлівых пошукаў, карпатлівага селекцыйнага адбору было атрымана насенне марозаўстойлівага гатунку (“Народная газета”). 3. Надзённай задачай машынабудаўнікоў з’яўляецца выпуск вырабаў канкурэнтаздольнай якасці (“Звязда”). 4. Дзяўчына была апранута ў лёгкую шаўковую блузку колеру льнянога

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цвету і выглядала вельмі прыгожаю і цікаваю (Якуб Колас). 5. Падзеяй сусветнага значэння стане вынаходніцтва лекаў супраць анкалагічных захворванняў (“Народная газета”). 6. Асаблівае месца ў спадчыне кожнага паэта займаюць творы высокага грамадзянскага гучання (ЛіМ). 7. Задачай першаступеннай важнасці з’яўляецца вывядзенне эканомікі краіны з крызісу (“Народная газета”). 8. Матэрыялы павышанай трываласці створаны на аснове палімераў (“Звязда”). 9. Праз некалькі год сябры сустрэліся ў сталіцы на курсах павышэння кваліфікацыі (“Народная газета”). 10. Даволі няпроста знайсці ў магазіне сучаснае прыгожае адзенне вялікага памеру (“Народная газета”). 11. На фестывалі прагучала шмат песень патрыятычнага зместу (“Звязда”). 12. Іван Рыгоравіч – чалавек рознабаковага таленту: ён і цацку прыгожую з дрэва выразаць можа, і на гармоніку грае, і карціны малюе (“Народная газета”).

***4. З кожным словазлучэннем складзіце па два сказы так, каб у адным сказе гэта словазлучэнне выступала як свабоднае, а ў другім – як фразеалагізм. Растлумачце, чым адрозніваюцца свабодныя словазлучэнні ад фразеалагізмаў.***

Намыліць галаву, закасаць рукавы, заткнуць за пояс, біць ва ўсе званы, вады не замуціць, зялёная вуліца, дарогу перабягаць, гнуць спіну, абрасці мохам, дражніць гусей, заварыць кашу, зайсці ў тупік, за круглым сталом, зблытаць карты, капаць яму, кідаць цень, між небам і зямлёй, на руках насіць, першая ластаўка, праглынуць пілюлю, сляды замятаць.

***5. Складзіце і запішыце сказы з прыведзенымі словазлучэннямі. Вызначце разнавіднасці падпарадкавальнай сувязі і сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі падпарадкавальных словазучэнняў.***

Першыя ўражанні, ажыццяўленне мары, адчынены для наведвальнікаў, здаць экзамен, пяць паверхаў, вучыцца вечарамі, лепшы па прафесіі, новы рэкорд, падрыхтавацца да свята, даклад вучонага, знойдзеная кніга, усе вучні, вызначыць накірунак, хутка скончыцца, ацэнка адказу, два сыны, выправіць недахопы, пастанова ўрада, слухаць з увагай, свой выбар, адказваць на пытанні, нашы настаўнікі, знайсці выйсце, жоўтае лісце.

***6. Выпішыце асобна простыя і складаныя словазлучэнні.***

Самы высокі будынак, зусім неверагодная гісторыя, добра арганізаванае мерапрыемства, дакладна акрэсленая мэта, больш смелае выказванне, надзвычай шчодры падарунак, цалкам непрымальнае рашэнне, коратка пастрыжаныя валасы, менш складанае заданне, вельмі небяспечнае падарожжа, паспяхова завершанае будаўніцтва, найбольш моцнае ўражанне, абсалютна пераканаўчыя доказы, своечасова адпраўленае пісьмо, хутка праведзены сход, найменш вядомы сярод чытачоў, выключна неабходныя лякарствы, самыя прыгожыя дзяўчаты, канцэрт для фартэпіяна з аркестрам, каханне з першага погляду, найбольш істотныя адрозненні, інфармацыя аб мінулым і сучасным, працаваць да сёмага поту, крочыць па вясенняй вуліцы, атрымліваць асалоду ад працы, гісторыя адной падзеі, апынуцца паміж молатам і кавадлам, арганізацыя працы і адпачынку, дасягнуць значных поспехаў, жыць на шырокую нагу, разлучацца з бацькам і маці, прыйсці на шапачны разбор, святкаваць гадавіну стварэння, крычаць на ўсю Іванаўскую, працякаць між вёскай і лесам, анталогія беларускай паэзіі, тысяча дзевяцьсот сорак пяты год.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***7. Выпішыце са сказаў словазлучэнні, у якіх кампаненты звязаны дапасаваннем. Укажыце формы і сродкі дапасавання.***

1. Купчастыя вершаліны клёнаў нібы полымем ахопленыя (І.Навуменка). 2. Усё мілагучна для слыху майго: і звонкае “дзе” і густое “чаго” (П.Панчанка). 3. Над зямлёй – красавіцкае неба: ахапкі белых воблакаў, халаднаватая просінь і жаўранкі (Я.Брыль). 4. Цягне да большага і пішу цяпер большае ў новых радасцях і ў новым неспакоі (Я.Брыль). 5. Растала расплыўчатым кінакадрам маленькая кропка Зямля (Р.Барадулін). 6. Тыповага беларуса я досыць лёгка адрозню сярод іншых, хаця б ён яшчэ не сказаў ніводнага слова (У.Караткевіч). 7. Ніякая іншая птушка, нават праслаўлены салавей, не можа параўнацца ў спевах з лясным жаваранкам (Якуб Колас). 8. Познім завейным вечарам, апошнім вечарам дваццаць дзевятага года вяртаўся Апейка дадому (І.Мележ). 9. На абедзвюх жанчынах былі па-вясковаму завязаныя хусткі (А.Асіпенка). 10. Добра адпачыць улетку хоць некалькі дзён на цудоўным, услаўленым паэтамі возеры Нарач (В.Вітка). 11. Нашаму карэспандэнту ўдалося атрымаць эксклюзіўнае інтэрв'ю адной вядомай актрысы ("Антэна"). 12. Уладзімір Мікалаевіч Дубоўка нарадзіўся 15 ліпеня 1900 года ў вёсцы Агароднікі Пастаўскага раёна (БМЭ). 13. З 1958 года па 1966 год Пімен Емяльянавіч Панчанка быў галоўным рэдактарам часопіса “Маладосць” (ГБСЛ).

***8. Перакладзіце назоўнікі на беларускую мову, дапасуйце да іх прыметнікі. Параўнайце сродкі дапасавання ў рускай і беларускай мовах у атрыманых словазлучэннях.***

Тополь, дробь, собака, тень, боль, медаль, мозоль, шинель, сажень, степь, насыпь, рукопись, пыль, полынь, подпись, гусь, копыто, перепись, продажа, гвоздика, пион.

***9. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову, дапасуйце да назоўнікаў прыметнікі. Вызначце віды сінтаксічнай сувязі паміж кампанентамі словазлучэнняў у рускай і беларускай мовах.***

Два океана, три друга, четыре яблока, оба брата, две комнаты, три стихотворения, трое котят, четверо солдат.

***10. Выпішыце са сказаў словазлучэнні, кампаненты якіх звязаны кіраваннем. Укажыце формы і сродкі кіравання.***

1. Лечыцца трава ад спёкі ліўнямі, людзі ласкай лечацца людской (П.Панчанка). 2. Я чакаў вясны ў палях радзімы, на пагорках нёманскіх крутых (М.Танк). 3. Восень надавала ўсяму, што мы бачылі вакол, лёгкае адценне чысціні, празрыстасці і журбы (У.Караткевіч). 4. У юнацтве мы некалі перажылі развітанне з зямлёй і тугу па зямлі (П.Панчанка). 5. Шалясцяць галінкі лазняку ад мядовага подыху ночы (М.Лынькоў). 6. Над рэдкімі агнямі горада зноў пераклікаюцца гудкі заводаў (Я.Брыль). 7. Цішыня агартае мне душу (М.Багдановіч). 7. Святло тваёй вясны мае асвеціць сцежкі, каб зазвінеў лясны званец тваёй усмешкі (Р.Барадулін). 8. Ведаць мову – значыць ведаць законы яе будавання, ведаць яе народную аснову (Я.Скрыган). 9. Гэта спадчына мне засталася ад прадзедаў – гэта матчыных песень дзівоснае прадзіва (Н.Гілевіч). 10. Гул сосен, плёскат хваль і слова матчына аздобілі быцця жывую ніць (С.Законнікаў). 11. Беларускаму краю бясконца я слова "люблю" паўтараю (Д.Бічэль-Загнетава). 12. Багацце гісторыі, як вядома, складаюць справы людзей (В.Быкаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***11. Выпішыце са сказаў словазлучэнні, кампаненты якіх звязаны слабым кіраваннем або іменным прымыканнем. Растлумачце, як практычна адрозніць такія словазлучэнні.***

1. Зямля ачышчалася ад снегу, і свежыя, маладыя ручаіны з вясёлым звонам шумелі па ёй (П.Пестрак). 2. Лісце ляжала пад нагамі тоўстым стракатым дыванам (У.Караткевіч). 3. Зайцамі кладуцца цені на сцяне (М.Танк). 4. Перуны грукаталі ў прасторы пустым (П.Панчанка). 5. Бабка ставілася да новага гаспадара з ласкаю роднай маткі (Якуб Колас).6. Пеніцца сярдзіта бульба, закіпае снежнаю завеяй у чорным сагане (М.Танк). 7. Размаўляць па шчырасці было няпроста (П.Пестрак). 8. Да пары збан ваду насіць (Прыказка). 9. Стоячы на палубе цеплахода, дзяўчына заглядзелася на сонечныя блікі, што весела скакалі па паверхні вады (І.Грамовіч). 10. Усхваляваныя людзі сабраліся на плошчы, прачакалі з гадзіну, але марна ("Народная газета"). 11. Нечакана на досвітку пачаўся дождж (М.Зарэцкі). 12. Цёмна-шэрыя шырокія вочы хлопчыка спакойна глядзелі на імклівую плынь Дняпра (У.Караткевіч).

***12. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову. Вызначце сінтаксічную сувязь паміж кампанентамі і сродкі яе выражэння ў рускай і беларускай мовах.***

Благодарить учителя, посмеиваться над знакомыми, бежать быстрее ветра, простить соседа, шутить над другом, болеть ангиной, дороже жизни, поссориться из-за дочери, говорить сквозь зубы, жениться на Свете, активнее других, дом в пять этажей, опоздать из-за сестры, поехать в санаторий за братом, издеваться над неумекой, больной гриппом, умнее сверстников, видеть своими глазами, отправиться за ягодами, заведующий аптекой, лучше тебя, улыбаться сквозь слёзы, похожий на отца, пойти в магазин за хлебом, километрах в десяти от города, помнить до сегодняшнего дня.

***13. Перакладзіце на беларускую мову. Вызначце асаблівасці кіравання з прыназоўнікам <u>па</u> ў рускай і беларускай мовах.***

Встречать по субботам, поступить по закону, знать по газетам, бежать по снегу, сообщить по секрету, построить по типовому проекту, одинаковые по росту, товарищ по университету, пользоваться по праву, лететь по воздуху, разъехаться по домам, старший по званию, ориентироваться по компасу, соревнования по футболу, двигаться по берегу, добрый по характеру, первенство по лыжному спорту, скользить по льду, определить по солнцу, провести по знакомству, ехать по дорогам, выступить по этому вопросу, фильм по Шолохову, пройти по билету, не спать по ночам, бродить по лесам, тосковать по родным, прибыть по приказу, разные по цвету, клуб по интересам, разбежаться по полям, друзья по походам, получить по заслугам, появиться по первому требованию, ходить по лугам, идти по следам, перечислить по пальцам, спешить по делам, интересный по жизненным наблюдениям, лазать по горам, чемпион по боксу.

***14. Знайдзіце памылкі ў сказах, растлумачце памылковасць напісання. Запішыце выпраўленыя сказы.***

1. Усе хутка разышліся па хатам. 2. Хадзіла па вёскам чутка, што хутка наступяць цяжкія часы. 3. Дзеці рассыпаліся па лесу, як гарошыны, у розныя бакі. 4. Агонь поўз па сухім верасам. 5. Імчацца машыны па асфальтаваму пляцу. 6. Дзяўчынка ўсміхалася скрозь сон. 7. Скрозь шчыліну ў плоце дзіця назірала за

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тым, што рабілася на вуліцы. 8. Бацька старэй маці на тры года. 9. Яго папрасілі схадзіць у паліклініку за доктарам. 10. Дрэва расло ў двух метрах ад дарогі. 11. Выбачайце мяне за спазненне. 12. Дзякуем вас за цікавую гутарку.

***15. Выпішыце са сказаў словазлучэнні, кампаненты якіх звязаны прымыканнем. Вызначце сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі.***

1. Шурпаты ствол надрэзаны глыбока, са звонам кропля падае ў гладыш (А.Вялюгін). 2. Добра вядомыя словы прагучалі неяк дзіўна ў гэты момант (Я.Янішчыц). 3. Слухай многа, а гавары мала (Прыказка). 4. Якое шчасце, што ў такую хвіліну самы блізкі чалавек апынуўся побач (І.Грамовіч). 5. Калышуцца воддаль ля спелага бору туманныя воды крынічнага мора (А.Вялюгін). 6. Рэдка-рэдка ў якім акне свяціў, як паміраў, ружовы агеньчык (У.Караткевіч). 7. Дзе-нідзе на небе блішчэлі зоркі (М.Зарэцкі). 8. Ноч была не па-зімоваму цёмная (І.Шамякін). 9. Сябры завіталі ў госці вечарам (І.Навуменка). 10. І заўсёды здалёк, праз прасторы вялікія ўсміхаліся мне і дамоў мяне клікалі сінія касачы (П.Панчанка). 11. Па-сапраўднаму здзіўлялі ягоныя веды, памяркоўнасць і шырокі падыход да з'яў жыцця (У.Караткевіч). 12. Неспраста пачалася гэтая гаворка (Я.Скрыган). 13. Злосны позірк спадылба прымусіў збянтэжыцца (І.Грамовіч). 14. Здольнасць арыентавацца ў самых складаных абставінах не раз ратавала яму жыццё (А.Савіцкі).

***16. Выпішыце са сказаў назоўнікавыя словазлучэнні. Укажыце сінтаксічную сувязь і сінтаксічныя адносіны паміж іх кампанентамі.***

1. Азёры – вочы зямлі (У.Караткевіч). 2. Ранішні туман пачаў рассейвацца ў промнях маруднаватага, нясмелага сонца (К.Камейша). 3. Гаспадары асенняга лесу – дзяцел і наіўна-вясёлыя, бесклапотныя сініцы (І.Навуменка). 4. Чарада дзён, іх адлік не залежалі цяпер ад перамен у пары года (В.Каваленка). 5. Ноч напоена восеньскай стомай (А.Вялюгін). 6. Астравок шыпшыны ў ціхім полі пахавалі хвалі збажыны (А.Вялюгін). 7. Чуцён вясёлых птушак спеў (Ц.Гартны). 8. Красавік – гэта першыя краскі вясны, некранутая сінь танканогай пралескі (А.Звонак). 9. Адзвінеўшая песня лета чабаровым пахне настоем (К.Кірэенка). 10. У паходнай палатцы прысніцца мне светлы гай з залатымі суніцамі, плёскат сініх азёр на зары (П.Панчанка). 11. Мне кожны колас Прыдняпроўя жадае добрага здароўя паклонам русай галавы (А.Пысін). 12. Грыміць напружанай хадой вялікіх творцаў пакаленне... (У.Хадыка). 13. Зара ледзь мачты сосен азарыла (М.Танк). 14. Блудзіць рэха ў соснах Белавежы (Хв.Чэрня). 15. У далях не сціхалі перапёлкі з салаўямі (А.Русак). 16. Сярод сваіх аднагодкаў Сцяпан вылучаўся ўменнем танцаваць (У.Краўчанка). 17. Неўзабаве пачулася каманда спыніцца (І.Мележ).

***17. Выпішыце са сказаў прыметнікавыя, лічэбнікавыя, займеннікавыя словазлучэнні. Назавіце сінтаксічную сувязь і сінтаксічныя адносіны паміж іх кампанентамі.***

1. Рэкі ўжо чыстыя ад ільду на пачатку красавіка (У.Караткевіч). 2. Вецер у асінніку заўсёды шумлівы (К.Камейша). 3. У буры, у навальніцы, у громе, у бліскавіцы, у хваляванні мора, у калыханні бора – многае мне міла, многае мне блізка (Ц.Гартны). 4. Чуцен кропель буйных пераразвон (П.Панчанка). 5 Часамі ён горкі ад пылу быў, часамі салёны ад слёз быў, часамі гарачы ад пораху быў, але і салодкі ад дружбы быў мой хлеб надзённы (М.Танк). 6. Не страшны нам буры, ліхія нягоды (М.Танк). 7. Родны мне і знаёмы пах вясновай раллі (В.Лукша). 8. Я рады

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

слухаць шум вясны (Янка Купала). 9. Двое чалавек сядзела на возе (К.Чорны). 10. Нават калі скінуць гадоў пятнаццаць з плячэй дзеда Талаша, то і тады ён быў ужо немалады: было яму тады гадоў семдзесят з хвосцікам (Якуб Колас). 11. Кожны з нас стараўся працаваць як найлепш (М.Чарот). 12. Мы з сястрой накіраваліся ў вёску (М.Лынькоў). 13. Па чаргаванні гукаў дзед Талаш устанавіў, што гэта ішоў чалавек, але гэта былі не Панасавы крокі: ішоў хтось грамозны грузна і цяжка (Якуб Колас).

***18. Выпішыце са сказаў дзеяслоўныя словазлучэнні. Вызначце сінтаксічную сувязь і сінтаксічныя адносіны паміж іх кампанентамі.***

1. Мы ішлі па супрацьлеглых берагах і махалі адзін аднаму рукамі (І.Шамякін). 2. Памяць зноў вяртае мяне ў нашы вясковыя маёвыя вечары (К.Камейша). 3. Халаднавата і рассыпіста шуміць лісцем малады асіннік. Ён не дае супакаення душы, якая ўжо даўно настроілася на цішыню (К.Камейша). 4. Пахне ціхі прасёлак лясной канюшынай, ціха бусел садзіцца на стог (А.Вялюгін). 5. У Мінску кружыцца паволі над плошчамі сняжынак рой (А.Вялюгін). 6. Паволі спускаецца ноч на зямлю на крылах бясшумных і чорных (А.Звонак). 7. Ціхі дожджык пра нешта шаптаў нам, як друг (К.Кірэенка). 8. Абрушыла сонца за дзесяць хвілін мільярды праменняў на снег (П.Панчанка). 9. Іду між смолак і званочкаў, дзе б'юць крыламі матылі, – і не магу душу і вочы красой забытай наталіць (Г.Бураўкін). 10. Калыша вецер над ракой вярбу (У.Хадыка). 11. Разгневанае, непрыветнае мора сягоння бушуе ўвесь дзень за кармой (М.Танк). 12. Птушыным пер’ем у небе кружыць лісце (М.Танк). 13. Буяюць травы ў буйных росах (В.Жуковіч). 14. Нарачанскае сіняе лета пахам сосен плыло над вадой (П.Прыходзька). 15. Я песні бяру свае ў дальні паход (М.Танк). 16. Паглядае ў ваду млын стары ля ракі (М.Хведаровіч). 17. Радасна віталі новы дзень птушкі (І.Шамякін).

***19. Складзіце сказы з прыведзенымі словазлучэннямі. Вызначце сінтаксічную сувязь і сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі прыслоўных словазлучэнняў.***

Высока ў небе, па-сяброўску шчыра, падкрэслена ветліва, калісьці даўно, абсалютна спакойна, па-свойму прыгожа, заўсёды цікава, утрая больш, сёння ўвечары, надзвычай пышна, крыху тэатральна, па-ранейшаму бесклапотна, вельмі небяспечна, прыблізна пароўну, трохі загадкава, дзесьці ўбаку, неяк недарэчна, незнарок гучна, употай ад людзей, па-хлапечы звонка.

***20. Складзіце і запішыце словазлучэнні, якія б мелі наступную структурную схему. У схеме літарамі абазначаюцца толькі паўназначныя часціны мовы. Даюцца скарочаныя лацінскія назвы часцін мовы: N – nomen substantivum (назоўнік), лічбай унізе абазначаны нумар склону; Adj – nomen adjectivum (прыметнік); Pr – pronomen (займеннік); V – verbum (дзеяслоў); Adv – adverbium (прыслоўе).***

$V(AdjN)_4$, $N_1N_2$, VAdv, $AdjN_1$, $N_1Adv$, (Adj і Adj) $N_1$, $V(AdjN)_5$, $Adv(AdjN)_2$, $V(PrN)_4$.

***21. Выпішыце з тэксту падпарадкавальныя словазлучэнні. Зрабіце іх сінтаксічны аналіз (простае ці складанае, разнавіднасць падпарадкавальнай***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***сувязі і сродкі яе выражэння, сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі, лексіка-граматычны тып).***

Першымі адчуваюць подых вясны Прыпяць і Нёман. Яны бліжэй да Атлантыкі, да яе мяккага подыху. Пасля – Дняпро і толькі потым – Дзвіна з прытокамі. Гарматны грукат ляціць над ракою. Ільды спачатку пасоўваюцца, пасля ідуць трэшчынамі, ламаюцца – і пайшло.

Крыгі грувасцяцца адна на адну. Вокамгненна ўзнікаюць і так жа хутка бурацца ледзяныя замкі, вежы, валы. Ледзяныя гмахі рвуць берагі, калоцяць іх. Рацэ досыць ледзянога прыгону. Яна хоча дыхаць, вольна каціць свае празрыстыя воды, без перашкод адбіваць у сабе сіняе неба і сляпуча белыя веснія аблокі і жаўрукоў, што трапечуць, прывязаныя да гэтых аблокаў нябачнаю гумкай.

*У.Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРОСТЫ СКАЗ

***22. Растлумачце сэнс паняццяў прэдыкатыўнасць, прэдыкатыўныя адносіны, прэдыкатыўнае словазлучэнне. Выпішыце сказы з прэдыкатыўнымі словазлучэннямі.***

1. Архіпу было сумна і неяк трывожна (М.Гарэцкі). 2. Далёка недзе грукала грамамі неба (Г.Бураўкін). 3. Каля агню сядзела некалькі чалавек (М.Чарот). 4. Нельга было нічога разгледзець (П.Галавач). 5. Чалавека забралі і пагналі невядома куды (К.Чорны). 6. У сяле чулася гаворка і песні (Якуб Колас). 7. Збоку глуха шумела рака і поўніла наваколле сваім шумам і маторавым гулам (П.Галавач). 8. Сонца яркае заззяла ў вышыні (М.Танк). 9. Вочы хлопчыка зноў засвяціліся радасцю (Я.Маўр). 10. Схілілася налітае ядраным зернем калоссе (А.Васілевіч). 11. Ідзеш і радуешся вясноваму сонцу (К.Чорны).

***23. Вызначце тыпы сказаў паводле мэты паведамлення і інтанацыі і растлумачце знакі прыпынку ў канцы іх.***

1. Знічка коціцца агністаю слязой (М.Багдановіч). 2. Спявай, душа! У песнях радасць ёсць! (У.Хадыка). 3. Пытаеш ты, якім быць трэба зямлі забытай песняру? (Якуб Колас). 4. Дажджу густую сетку накінуў вечар на муры... (П.Панчанка). 5. Надзеі бліскае святло! (М.Мятліцкі). 6. Ці быў хоць шчаслівы сяголета жнівень? (У.Сыракомля). 7. Вецер нёс матывы песень ненапісаных (У.Хадыка). 8. Неба! Ясных зораў не тушы! (П.Панчанка). 9. Горад... Заўсёды шумлівыя вуліцы... (В.Таўлай). 10. Над Мінскам жаваранак! Чулі? (В.Вітка). 11. Я люблю касачы. Беларускія архідэі. Яны цвілі шалёна над морам разнатраўя (У.Караткевіч). 12. Красавік... Вее ў твар цёплы вецер вясны (А.Звонак).

***24. Выпішыце асобна клічныя сказы і пабуджальныя сказы. Растлумачце адрозненні паміж імі.***

1. О пахкая крошка! О хлеб ты наш чорны! Спрадвеку ты звязаны з доляй людскою! (У.Сыракомля). 2. Песню, душа, заві, словы гучаць прымусь! (У.Хадыка). 3. Маладосць не знікла, не прайшла! (М.Багдановіч). 4. Прастору! Волі мне! (В.Таўлай). 5. Не рабіце ніколі нікому зла, не кідайце развалін і папялішчаў! (К.Кірэенка). 6. Хай слава ніколі Мсціслаў не міне! (М.Аўрамчык). 7. Поўнач! Азёр залатая паверхня! (А.Звонак). 8. Успамяні, маё сэрца, даўнейшыя дні! (М.Багдановіч). 9. Хітры быў чалавек Апанас Мядзведзька! (І.Навуменка). 10. Абшар! Бог мой, які абшар! (У.Караткевіч). 11. Які настрой! Як б'ецца пульс зямлі! (У.Хадыка). 12. Паклянёмся любіць наш край! (З.Астапенка). 13. Пакіньце на беразе смутак і жаль! Песню бярыце з сабою! (Н.Гілевіч). 14. Клічуць дарогі свету, клічуць наперад мяне! (Е.Лось). 15. Дык гартуй жа свае сілы да палёту, мая песня! (М.Танк).

***25. Ахарактарызуйце структуру і значэнні пытальных сказаў (уласна пытальныя, пытальна-рытарычныя, пытальна-пабуджальныя, пытальна-эмацыянальныя).***

1. І адкуль цішыня ў свежым ранку? (П.Пестрак). 2. Хто няшчасце можа здолець? (В.Таўлай). 3. Разбітыя мары словамі хіба вернеш хоць трошкі? (К.Кірэенка). 4. Што шкодзіць тут натхненню? (М.Багдановіч). 5. Чаго ж гэтак позна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сёлета звоніць жаваранак у небе сінім? (В.Вітка). 6. Хіба ж можна сонца рух спыніць? (А.Звонак). 7. Што на свеце роўнага па сіле знойдзецца да шчырай дружбы? (У.Дубоўка). 8. Хочаш ты ні ў чым не памыляцца? (Х.Жычка). 9. Гэй, хто стрымае наш творчы размах? (В.Таўлай). 10. Каму агнямі свеціш, вуліца? (А.Пысін). 11. А далей? Што лёс далей накрэсліў? (М.Калачынскі). 12. Што з табою? Плачаш? (У.Караткевіч). 13. Чаму ты маўчыш, паэзія мая? (В.Вітка). 14. Няўжо прарыпіць сваёй воссю надломленай глобус – Зямля і спыніцца стомлена, быццам гадзіннік, людзі? (Я.Сіпакоў). 15. Дзе ж ты сягоння, дзяўчына мая? (В.Таўлай). 16. Каму, як не табе, паслухаць жывую музыку вясны? (У.Хадыка). 17. Можа, мы маглі б убачыцца заўтра? (К.Чорны).

***26. Растлумачце пастаноўку спалучэння знакаў прыпынку ў канцы сказаў.***

1. Глядзі, якая перад намі гарыць і свеціць зорка!..(У.Хадыка). 2. Маленства, дзе ты?..(А.Лойка). 3. І ўсё памылкі... Як іх пазбегнуць, дружа мілы?! (А.Лойка). 4. Няўжо на свеце нешта ёсць мацнейшае за дружбу, у лютых бітвах не згарэўшую, з якою мы над бурамі ўзняліся?! (К.Кірэенка). 5. Аб той вясне ўспамінаю як аб самай светлай далечы!.. (А.Лойка). 6. Вецер, уздыміся!..(М.Чарот). 7. Ах, думкі, куды паляцелі? (В.Таўлай). 8. Хіба цябе састарылі гады?! (Г.Бураўкін). 9. Ты помніш?.. Не, цяпер ты ўжо не ўспомніш той сквер, дзе мы сядзелі ў летні дзень... (М.Аўрамчык). 10. Пачакайце! Што вы гэтак хутка?! (М.Калачынскі). 11. Дзе ж ля вокан нашыя ялінкі?.. (А.Вялюгін). 12. Франц Шуберт, Штраус, ван Бетховен... І сёння вы жывыя для жывых!.. (А.Бачыла). 13. Калі ўжо, калі адгрыміць на зямлі час граніц, неспакойных граніц?.. (А.Куляшоў). 14. Зямля Радзімы! У сэрцы боль салодкі хто не адчуў, сустрэўшыся з табой?! (А.Звонак).

***27. Запішыце сказы, ставячы ў іх канцы патрэбныя знакі прыпынку. Укажыце магчымыя варыянты.***

1. Зор ранніх знікла дыядэма (У.Хадыка). 2. Праз якія яшчэ нам далечы і ў якую ісці пару (А.Лойка). 3. Убачыць родны бераг свой табе да болю хочацца (П.Панчанка). 4. Хто мне і каму я ў жыцці вінен (У.Хадыка). 5. Як непаўторны кожны міг (А.Лойка). 6. Белая птушка здалёку белым махае крылом (А.Звонак). 7. Цісне сэрца мне песня начная (М.Багдановіч). 8. Над гарачым палеткам, ветрык, вей (В.Вітка). 9. Льны адбіраюць неба фарбы (М.Аўрамчык). 10. Годзе, успаміны, даволі (В.Таўлай). 11. Эх, хутчэй бы вясна (М.Калачынскі). 12. Бяседзе кожнай ёсць мяжа (У.Хадыка). 13. Чаму цябе хвалююць чужыя пачуцці (К.Кірэенка). 14. Ясней свяці, сонца (М.Чарот). 15. Адышлі дні былыя ў песню Дзе сябры мае Дзе яны (П.Панчанка). 16. Ці можаш, песня, ты маўчаць (А.Бачыла). 17. Хай мчаць наперад караблі (У.Хадыка).

***28. Перакладзіце сказы на беларускую мову, пастаўце ў іх канцы патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце тыпы сказаў паводле мэты выказвання.***

1. Сложна, богата, миролюбива, талантлива славянская душа (А.Толстой). 2. Желанья Что пользы напрасно и вечно желать (Ю.Лермонтов). 3. Да здравствует солнце, да скроется тьма (А.Пушкин). 4. Не правда ли, странная пьеса (А.Чехов). 5. Нет человека в мире счастливее меня (И.Тургенев). 6. Разве мы, писатели, не были свидетелями жизни и деятельности великих борцов за мир (К.Федин). 7. Вперёд Не отставай, друзья! (А.Чехов). 8. Слышите ли вы Обещаете ли вы это сделать (И.Тургенев). 9. Любовь красива, злоба безобразна (К.Федин). 10. Разве вы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

можете обойтись и без публики, и без музыки, и без грома рукоплесканий (А.Пушкин). 11. В сумерках проступали неясные контуры строений (А.Фадеев). 12. Любит ли он вас (И.Тургенев). 13. Пусть сильнее грянет буря (М.Горький).

***29. Вызначце тыпы сказаў паводле мадальнасці (сцвярджальныя, адмоўныя: агульнаадмоўныя, частковаадмоўныя).***

1. Не хацелася траціць дарэмна ніводнага дня, ні адной хвіліны (І.Шамякін). 2. Ля гэтых сосен нельга не спяваць (М.Танк). 3. Смутку не знае вясна маладая ніколі ні ў лесе, ні ў полі (А.Александровіч). 4. Ні аднаго голасу на вуліцы (І.Мележ). 5. Андрэй чакаў не такога прыёму (П.Пестрак). 6. Ніхто не сказаў ні слова (Р.Няхай). 7. Маці не вытрымала, каб лішні раз не палюбавацца на дачку (І.Шамякін). 8. Ні броду, ні моста не было (Якуб Колас). 9. Гэту песню не спець не магу я (К.Кірэенка). 10. Сябры мае таксама выбіраюць гармонікі і скрыпкі, на якіх, хіба, вяселле не адно сыграем (М.Танк). 11. Ці не прайсціся нам па вясенніх вуліцах (П.Хадкевіч). 12. Каму не хочацца ў гарачы летні поўдзень апынуцца на беразе возера ці хоць бы невялічкай рэчкі? (В.Вітка). 13. Ад пачутых слоў на душы стала не так трывожна (П.Галавач). 14. Не, не вярнуцца дням былым ужо ніколі (М.Багдановіч). 15. У хату ўвайшоў не Кандрат (А.Савіцкі).

***30. Падзяліце тэксты на сказы, перакладзіце іх на беларускую мову. Пераклад запішыце, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку.***

I. Но какая же непостижимая тайная сила влечет к тебе почему слышится и раздается немолчно в ушах твоя тоскливая несущаяся по всей длине и ширине твоей от моря до моря песня что в ней в этой песне что зовет и рыдает и хватает за сердце Русь чего же ты хочешь от меня какая непостижимая связь таится между нами.

*Н.Гоголь. Мертвые души*

II. Боже как ты хороша подчас далекая далекая дорога сколько раз погибающий и тонущий я хватался за тебя и ты всякий раз меня великодушно выносила и спасала а сколько родилось в тебе чудных замыслов поэтических грез сколько перечувствовалось дивных впечатлений.

*Н.Гоголь. Мертвые души*

***31. Вызначце развітыя і неразвітыя сказы, аднасастаўныя і двухсастаўныя сказы. Растлумачце арганізацыю кожнага з граматычных саставаў.***

1. Вецер сціх. Залаціцца ціхі асенні дзень (У.Караткевіч). 2. Стаяла цішыня і ноч (К.Чорны). 3. Вось, здаецца, і бераг (Я.Маўр). 4. Не чутно было ўжо вясёлых песень (Якуб Колас). 5. Звонкая марозная раніца (І.Грамовіч). 6. Зніклі сум і туга. Хацелася зноў працаваць (П.Пестрак). 7. Бабка Наста, як кажуць, была стрыманай (І.Шамякін). 8. Алеська – дзяўчына бойкая і вясёлая (Р.Мурашка). 9. Настрой быў канчаткова сапсаваны (П.Галавач). 10. Натоўп загуў, заварушыўся (К.Чорны). 11. Было горача (І.Навуменка). 12. Мора ласкавае, спакойнае (Я.Маўр). 13. Абедзве жанчыны ўсміхаліся (У.Карпаў). 14. Лагуновіч – добры камандзір (І.Мележ). 15. Прысутнічае чалавек сем (І.Шамякін). 16. Бярэзнік. Дзе-нідзе блісне верхавіна елкі (К.Чорны). 17. Маці з дачкой пачалі спяваць ("Народная газета"). 18. Світае (А.Якімовіч). 19. Ніхто з нас не спяшаўся (В.Хомчанка). 20. Быць першым нялёгка (А.Савіцкі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***32. Перакладзіце сказы на беларускую мову. Укажыце тыпы аднасастаўных сказаў.***

1. Хорошо в деревнях пекут хлеб (М.Горький). 2. Прислушайтесь к голосу весенней музыки (В.Песков). 3. Не усидеть дома в такое время охотнику (В.Арсеньев). 4. Изморось. Сумерки. Дорога в степь (М.Шолохов). 5. Ласковым словом и камень растопишь (Пословица). 6. С особенным чувством вспоминаю первое охотничье путешествие (И.Соколов-Микитов). 7. Не пора ль за дело приниматься (И.Крылов). 8. Нет здесь ни объездчиков, ни егерей, ни лесников (Н.Почивалин). 9. Жгучим морозом опаляет лицо (А.Фурманов). 10. Полночь. Мгла и ветер (Н.Грибачев). 11. Писателю необходимо быть умным, но еще необходимее быть сердечным (П.Павленко). 12. Это стихотворение в прозе. Со временем к нему напишут музыку (М.Горький). 13. Звезды затянуло мглой (А.Толстой). 14. К вечеру нахмурилось (Н.Бажанов). 15. После короткого совещания решено было идти обратно (М.Шолохов). 16. Вам бы здесь до осени пожить (А.Чехов). 17. С дождями связано много примет (К.Паустовский). 18. В самолете становилось все жарче, все душней (В.Катаев). 19. Вон солнце, голубое небо... Воздух какой чистый (И.Куприн). 20. Можно без лыж идти по хрустящему снежному паркету (И.Соколов-Микитов). 21. Нет, об этих минутах нельзя писать без восторга (В.Песков).

***33. Запішыце тэкст, расстаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Вызначце тыпы сказаў паводле будовы (простыя, складаныя). Падкрэсліце ў сказах граматычную аснову.***

Сядзіба Міцкевічаў здалёк вабіць вока кліча наведаць утульны куток Навагрудка. Усё тут цяпер дагледжана прыаздоблена вычышчана-выгладжана. Праўда сам дом ужо не той які быў пры жыцці паэта многа зменена і ва ўсёй сядзібе. Тут не сустрэнеш ужо тых таполяў што вартай стаялі некалі перад домам я іх бачыў толькі на малюнку Ігната Дамейкі. Няма ручая што цёк каля вокнаў няма маленькай цяністай алеі з каштанаў ды ліп што вяла да ганка замест яе цяпер акуратная забрукаваная дарожка. І ўсё ж гэта тая самая сядзіба. Тут як тыя мімалётныя птушкі праляцелі некалі дзіцячыя і юнацкія гады паэта. Цэлых семнаццаць гадоў кожны дзень чуўся тут яго голас ад нараджэння (сюды адразу ж маці прывезла немаўля з Завосся) і да яго паступлення ў 1815 годзе ў Віленскі універсітэт. На родны падворак імчаў ён кожным разам бавіць канікулы спачатку як студэнт універсітэта а потым як настаўнік ковенскай школы.

Вунь на той высокі ганак сустракаць яго выходзіла маці а з будкі радасна павіскваючы ляцеў насустрач улюбёнец усіх дзяцей чорны як смоль Крук кідаўся на грудзі і ўсё меціў лізнуць у шчаку.

*К.Цвірка. Да ўзгоркаў тых лясных...*

***34. Выпішыце з тэксту сказы ўскладненай будовы. Укажыце, якімі канструкцыямі яны ўскладнены (аднародныя члены сказа, адасобленыя члены сказа, параўнальныя звароты, звароткі, пабочныя і ўстаўныя канструкцыі).***

Наступала бурная вясна. На Сожы сышоў лёд. Пайшлі параходы. Да вайны на рэках быў спорны рух і грузавозаў, і пасажырскіх суднаў, аўтобусаў рэйсавых тады не было...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Недзе ў красавіку, калі разліў Сожа, якім мы любаваліся з крутога берага парка, пачаў спадаць, а на Мельнікавым лузе вылезлі з вады астраўкі, Міхал Бахун сказаў мне:

– Давай з'ездзім у мае Парычы. Пасля практыкі я не дабраўся туды.

Я разумеў яго: чалавеку карцела расказаць пра Заходнюю Беларусь (было што!), прывезці нейкія падарункі, якія мы купілі за нашы мізэрныя камандзіровачныя...

Хіба мог я адмовіцца ад прапановы сябра? Праплыць па Дняпры, па Бярозе! Казка! Шкада, што ад Рэчыцы паплывём не ўніз, не да Холмеч, дзе была мая Маша. А мяне так цягнула туды! З мінулага лета не бачыліся. Як ты там, у Артуках, мая фельчарыца? Нешта сухаватымі пісьмы твае сталі! Рэўнасць да невядомага саперніка ела сэрца, як іржа жалеза, кінутае пад дажджом.

У Рэчыцы мы сядзелі суткі: чакалі парахода. Добра, што там на прыстані пад абрывістым берагам меўся пакойчык, дашчаты, але шчыльны – не прадзімала ветрам, – і вартаўнік дазволіў нам там пераначаваць. На другі дзень пашанцавала ўладкавацца на буксірчык, які цягнуў баржу з нейкім грузам.

Перад заходам сонца высадзіліся ў Парычах – глухім яўрэйскім мястэчку. Хата Бахуноў тут жа над ракой, крокаў за сотню ад прыстані, калі дашчаты масток можна назваць прыстанню. У хату мы зайшлі незаўважанымі. І толькі калі сябра мой схіліўся, як у паклоне, каб прайсці з цесных сенцаў праз нізкія дзверы, маці ўбачыла сына. Яна сядзела на лаве і перабірала дробную бульбачку: набліжалася вясна, сяўба.

*І.Шамякін. Начныя ўспаміны*

***35. Выпішыце з тэксту асобна поўныя сказы і няпоўныя сказы. Укажыце, якія члены сказа прапушчаны ў няпоўных сказах.***

Зала – як суцэльны грот з кветак. На спінках крэслаў гірлянды незабудак, у насценных вазах букеты нарцысаў і цюльпанаў. Столь – як кветкавы шацёр. І ля сцен – маладыя бярозкі.

А на сцэне – дзявочы хор. Ніжэй – вясковы аркестр.

Кумы з дзецьмі садзяцца парамі, ля праходу. І хор пачынае спяваць. Песні яго – тыя песні, што спявае народ пра дзяцінства, пра маці, пра будучы лёс немаўлятка. Музыка, водар кветак. Усе сядзяць трошкі расчуленыя.

*У.Караткевіч. Казкі Янтарнай краіны*

***36. Выпішыце з тэксту няпоўныя сказы. Укажыце, якія члены сказа ў іх прапушчаны. Назавіце бессастаўныя сказы, якія ўжыты ў гэтым тэксце.***

Размовы пра бежанства не аціхалі і ў хатах, і на вуліцы.

– Мусіць, паедзем, – казаў Пятро Ламака (па вясковай мянушцы Багдан) і шкроб за вухам.

– Дзіва што! – як заўсёды няпэўна адгукнуўся Гамон.

Да мужчын падышоў Фэдар-японец:

– Ці сустрэне там хто? Сёння кожны пра сябе думае.

Неяк незаўважна сярод мужчын з'явіўся Трахімаў сын – Косцік, узяў бацьку за полу світкі:

– Хадзем дахаты, мама плача, – сказаў, хлюпаючы носам.

– Чаго? – натапырыўся на сына бацька.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– А таго! – пацягнуў малы за палу і, агледзеўшы мужчын, як бы пахваліўся: – А мы не паедзем!

– Паедзеш, калі казакі папросяць! – зарагатаў Галёнка.

– Не! – стаяў на сваім малы. Чуў, відаць, нешта ад старэйшых, ад сямейнікаў.

Але ж не. Па суседніх на захад ад Прускі вёсках ужо шасталі на конях казацкія раз'езды, прыспешвалі людзей збірацца ў дарогу.

А калі ў пачатку жніўня здалі і Варшаву, дык Пруску зусім запаланілі вайскоўцы і адразу ж за клунямі ўзяліся капаць акопы.

Вечарам, калі Кужалі сабраліся ў хаце, Кірыла сказаў: – Вунь яно што! І на Брэсцкую крэпасць не спадзяюцца. А здаецца, яе зусім нядаўна адрамантавалі...

Неўзабаве кожная прускаўская сям'я атрымала невялічкую кніжачку – "Білет бежанцаў".

*У.Гніламёдаў. Усход*

## ПРЭДЫКАТЫЎНАЯ АСНОВА ДВУХСАСТАЎНАГА СКАЗА

***37. Запішыце сказы, падкрэсліце дзейнікі і выказнікі, вызначце спосаб іх выражэння. Ахарактарызуйце структуру дзейнікаў (простыя, састаўныя, складаныя). Растлумачце значэнні выдзеленых слоў.***

1. Дзве ці тры кабеціны сядзелі ў Амілі Снацкай і ціха ўздыхалі (К.Чорны) 2. Свае, калісьці пражытыя Алесем, цяпер зноў перажытыя ім кадры ўспамінаў нечакана і радасна дапаўняюцца новай канцоўкай (Я.Брыль). 3. Лёс або выпадак дамогся інакшага, і ўсё ж нейкая часцінка майго Я будзе вечна знаходзіцца тут – з Грынюком, Дудчанкам, Усольцавым, Бабкіным (В.Быкаў). 4. У Радашковічах у свой час жыў і працаваў адзін з самых яркіх працаўнікоў на ніве нацыянальнага Адраджэння – Браніслаў Тарашкевіч (П.Гардзіенка). 5 Сам Панцялееў, зрабіўшыся з часам багатым золатапрамыслоўцам, якому толькі ў Пецярбургу належала нерухомасці на некалькі соцень тысяч, даўно адхрысціўся ад светлых, чыстых ідэалаў сваёй рэвалюцыйнай маладосці ("Маладосць"). 6. Ва ўсім яго [Лукашова] абліччы, нетаропкіх і дакладных рухах было нешта ўпэўненае, дужае і надзейнае (В.Быкаў). 7. У кожнай такой зямлянцы жыве па некалькі вялікіх сем'яў, якія належаць да аднаго роду (В.Вольскі) 8. Дзіцячы дом стаяў на канцы сяла за высокім парканам (С.Грахоўскі). 9. Чарнабароды з вінтоўкай моўчкі стаяў ля дзвярэй (В.Быкаў). 10. Тут было багата дзіцячай маёмасці (М.Лынькоў). 11. Калі бывае бабіна лета? (Я.Радкевіч). 12. Пушкінскае "поэзия, как ангел-утешитель, спасла меня" належыць не толькі яму самому ("Полымя"). 13. Аўгуст XXI усё ж такі сабраў сюды значныя сілы сваіх войскаў і шляхецкіх харугваў (М.Ткачоў). 14. Неўзабаве ўжо ў вагоне быў адзіны людскі арганізм (К.Чорны). 15. Можна сказаць, у малых Куранях было сваё вялікае (І.Мележ). 16. У скрыні ляжала матчына святочнае адзенне, спраўленае яшчэ ў дзеўках: ***сачак***, спадніца з густымі фальбонамі, з чырвона-чорнымі шырокімі палоскамі ўпоперак, белая кужэльная кашуля з вышыванымі рукавамі, ***кгарсэт***, цесна скроены ў стане і расшыты на клубах, ***каптур***, аблямаваны зялёнаю стужкаю ў зоркі (Я.Скрыган). 17. Усё гэта майго дзядулю радуе (М.Рамашка). 18. Ф.Скарына і яго паслядоўнікі адыгралі вельмі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

важную ролю ў справе дэмакратызацыі старажытнаславянскай і беларускай моў (“Этнаграфія Беларусі”). 19. Быць адукаванымі – наша мэта (“Звязда”).

***38. Вызначце граматычныя формы каардынацыі дзейніка і выказніка.***

1. Сядзіць Даніла спахмурнелы з сваёй Марынкай за сталом (Якуб Колас). 2. Дзед з малодшымі сядзеў на прызбе (У.Караткевіч). 3. Ад стажар’я была відаць адна Сяргеіха з дзецьмі (І.Пташнікаў). 4. [Сцёпка:] Эх, каб у яго ды былі грошы: кніжак, кніжак накупляў бы ён сабе! (Якуб Колас). 5. А вось там хвалюецца пан Мнішак з яго замучаным тварам і стрыманым гонарам у вачах (У.Караткевіч). 6. Я хапаю Юрку за галаву – на скронях у яго моцна торгаюцца жылы (В.Быкаў). 7. Маткі з парасятамі беглі да лесу ціха – хутка бегчы яны не ўмеюць (І.Пташнікаў). 8. І давер’я больш было ў Хадоські ў вачах, і каса была гусцейшая, цудоўная, русявая, з водбліскам золата каса (І.Мележ). 9. Дзе-нідзе праснуе людская фігура і зараз жа знікне невядома куды (Якуб Колас). 10. Ганна заспявала разам з усімі, заспявала звыкла (І.Мележ). 11. Глядзіце без дакоры і пагарды вы на мяне з экранаў вашых кніг (А.Куляшоў). 12. У хуткім часе БТ прапануе сваім гледачам падзівіцца і з тэлевізійнай версіі Купалавых “Тутэйшых”, праўда, паводле спектакля Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы (“ЛіМ”). 13. Піліпчык частаваў Васільку чмяліным мёдам (М.Лынькоў). 14. Ідуць баркалабаўскія старцы з сінявокімі хлопчыкамі празрыстай іканапіснай прыгажосці (У.Караткевіч). 15. [Бабуля:] – Хай вунь маці мёду прынясе ад бабы, ды напарым маліны (Я.Брыль). 16. Кланя з дзецьмі была ўжо недзе ў Пячным (І.Пташнікаў). 17. Двое рабочых разбілі на кавалкі даўжэзны прэнт (К.Чорны). 18. На ўзлеснай вуліцы, якая была дагэтуль бязлюднай, раптам з’явілася група дзяўчат і хлопцаў (У.Шахавец). 19. Шмат сцяжынак і глухіх дарог разыходзіцца адсюль у лес у розных кірунках (Якуб Колас). 20. У той дзень зранку пяцёра зняволеных у паўразбураным начною бамбёжкаю цэху выкопвалі неўзабаве бомбу (В. Быкаў).

***39. Запішыце сказы, падкрэсліце выказнікі і вызначце спосаб іх выражэння.***

1. Ой, якое ж гэта гора: наша Ганна навек хвора! (Якуб Колас). 2. Гэты камітэт і ўзяў на сябе ўсю ўладу на вёсцы, пачаў свае мужыцкія парадкі наводзіць (М.Зарэцкі). 3. Маўчалі кулямёты і зеніткі пад самым лесам, – іх бачылі на свае ўласныя вочы (М.Лынькоў). 4. Наша Парася на ўсе штукі прыдалася (Прыказка). 5. Мой дзед Куцейка зноў на сцэне і ходзіць гогалем стары (Якуб Колас). 6. Няўжо Чарноў гэты – наш? (В.Быкаў). Весткі пра нашу даўнюю гісторыю вельмі рэдкія (М.Ермаловіч). 8. Усё ж у нашым становішчы здаровы чалавек варты некалькіх параненых (В. Быкаў). 9. І тут яго [Даніка] схапілі пад пахі нечыя дужыя рукі, знялі-сцягнулі з падаконніка на падлогу (Я.Брыль). 10. Маці раз прыслала была Лявону пасылку (К.Чорны). 11. [Сцёпка:] – …Усё народнае, ніхто табе на карку не сядзіць… (Я.Брыль) 12. Алёшавы бацькі былі на ўсе Курані беднякі з беднякоў (І.Мележ). 13. Святлей і ў хаце рыбаковай (Якуб Колас). 14. Пісьмы адрасаваны бацьку, малодшаму брату, сябру, а ў пераважнай большасці – сястры Ганне, у той час – Нютачцы, любімаму, вернаму другу (Я.Брыль). 15. Гэта крычаў на ўсё горла капітан – кулямёт змоўк, і чалавечы голас пад зямлёй аж рэзаў вушы (І.Пташнікаў). 16. Бацькава папруга не мела моды ўмешвацца ў яго, Жэнькавы, унутраныя справы (“Полымя”). 17. Шабета пабачыў усяго за сваю службу, усялякіх нечаканасцей, таму стаяў напагатове (І.Мележ). 18. Лют меў пад сваёй рукой каля дзвюх тысяч чалавек

(Л.Дайнека). 19. На маёй радзіме ёсць невялікі гарадок Слуцак (Я.Скрыган). 20. Лепш нічога няма свайго роднага вугла (Прыказка). 21. Прыемна гэта сказаць: мая хата, мой пад'езд, мой двор (У.Караткевіч). 22. Земгалы былі самым усходнім з падзвінскіх плямёнаў (М.Ермаловіч). 23. Хлеб сірочы, вядома, нялёгкі, аднак пра яго пакуль што больш думала мама (Я.Брыль). 24. Харошая дзевачка – хлапцам занозачка (Прыказка). 25. "Няхай бачаць, чыя сіла! – падумаў [Яўхім], прыгадваючы, колькі працівілася яму. – Няхай знаюць!.." (І.Мележ). 26. Ціха перагаворваючыся аб нечым, суседзі мае пачынаюць сняданак (В.Быкаў). 27. Сёмка Фартушнік выбіваўся ў людзі з бруднай і цеснай бацькоўскай крамкі (К.Чорны). 28. Асцярожны і прадбачлівы бацька не спускаў яе [дачку] з свайго вока (Якуб Колас).

***40. Спачатку запішыце сказы з састаўным іменным выказнікам, затым – сказы з састаўным дзеяслоўным выказнікам. Вызначце, якімі часцінамі мовы выражаецца састаўны іменны выказнік, а якімі – састаўны дзеяслоўны.***

1. З натоўпу вылазіць цётка з кошыкам, ставіць кошык на падлогу і пачынае перавязваць на галаве квяцістую хустку. (В.Быкаў) 2. Адвезці ў Загор'е меўся сам бацька яе, Андрэй Гарнашка (Якуб Колас). 3. На шыю бацьку быў уздзеты цесны жалезны абруч (Л.Дайнека). 4. Антаніна маўчала. Відаць, усё не магла валодаць сабою (Г.Далідовіч). 5. Грушы былі нічыйныя (А.Марціновіч). 6. Князь і яго жонка маглі перадаць права першага стрэлу любой асобе (М.Ткачоў). 7. Урэшце Максіму стала сорамна за ўласную мяккасць (І.Шамякін). 8. І я засталася жыць у сям'і Купалы (Я.Новікава). 9. Зрабіў настаўнік экзамен Сцяпану (Якуб Колас). 10. Цароў фурман умеў з месца пускаць коней наўскач (У.Арлоў). 11. Клімчанку стала незвычайна шкада сваіх, гэткіх усё ж недасяжна далёкіх хлопцаў (В.Быкаў). 12. Грамыкаў Юрка любіць вось гэтак ляжаць і глядзець (Я.Брыль). 13. Нагавіцы ягоныя [Юрася] былі амаль да каленяў мокрыя (У.Караткевіч). 14. Выцягнуў [Бушмар] вядро вады, нагнуўся і стаў ліць празрысты холад сабе на галаву (К.Чорны). 15. Гэтай чужой размове я быў рад, як сваёй удачы (Я.Скрыган). 16. Усціння спярша запарыла сечанку карове, занесла ў хлеў, пасля пачала таўчы бульбу (І.Чыгрынаў). 17. Васіль ехаў цяпер пануры, паглыблены ў свае думкі (І.Мележ). 18. Руневіч, здаецца, больш за многіх рады, што, і не ведаючы чужых моў, можна, выходзіць, усім так здорава зразумець галоўнае (Я.Брыль). 19. Аднак лясы і балоты з'яўляюцца не толькі істотным фактарам нашай прыроды (М.Ермаловіч). 20. І вось пан Канстанцін Кроер асмеліўся патроху парушаць звычай, непрыкметна наступаючы мужыкам на мазалі (У.Караткевіч). 21. Першымі ў акрузе былі чырвоныя абозы з іх, Юравіцкага, раёна (І.Мележ). 22. Галкін служыў у кулямётным узводзе, трымаўся заўсёды сваіх хлопцаў і толькі ўчора быў перададзены стралкам для ўзмацнення галоўнай паходнай заставы (В.Быкаў). 23. Вёска была вялікая і жыла з рыбалоўства (У.Караткевіч) 24. Яўхім як бы не разумеў ці знарок хацеў збянтэжыць, падсмяяцца (І.Мележ). 25. Інжынер Уладзімір Зон стаў маім лютым ворагам (Я.Скрыган). 26. Дарэктар наш быў палахлівы… (Якуб Колас). 27. Як увіхалася ў гэты вечар ля Сашы крамніца Раіса! Як старалася спадабацца, дагадзіць свайму часоваму пастаяльцу (І.Навуменка). 28. Жаночы ж голас увесь час быў спакойны (К.Чорны).

***41. Запішыце сказы з састаўным дзеяслоўным выказнікам, укажыце лексічныя разрады дзеясловаў, якія выступаюць у ролі звязак, вызначце іх час, лад і асобу.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Ганна не стала чакаць Глушаковай каманды, пайшла сама ў гумно, хацела паляжаць на снапах у зацішку (І.Мележ). 2. Махорка хацеў быў учапіцца рукой за ляжэйку, але не слухала рука (І.Пташнікаў). 3. Любіў ён [Кузьма] збіраць грыбы… (Якуб Колас). 4. Хоць гаспадыня і хапалася бегчы ў поле, аднак сняданак сабраць Чубару на стол не забылася, накрыла абрусам (І.Чыгрынаў). 5. Кроер адчуваў сваю слабасць і стаў шукаць вачыма чагосьці больш важкага (У.Караткевіч). 6. Але Ладынін не спяшаўся адыходзіць (І.Шамякін). 7. Я хачу правесці вас па маёй зямлі (У.Караткевіч). 8. Хлопец не здолеў закончыць нават першага класа і цяпер разам з бацькам пасвіць калгасны статак (І.Навуменка). 9. Толькі на трэція суткі ўдалося дагнаць сваіх (В.Сачанка). 10. А свайго лепшага сябра, разведчыка капітана Волаха, Іваноўскі нават не паспеў пахаваць (В.Быкаў). 11. Пачынала світаць (У.Дамашэвіч). 12. Міця пачаў гаварыць упэўнена… (А.Пальчэўскі). 13. Не хацелася развітвацца з людзьмі, якія сабраліся, каб узаемна ўзбагаціць свае сэрцы (К.Кірэенка). 14. Я меўся чытаць “Гартаванне” – верш пра вясковага каваля (В.Вітка). 15. Машы заўсёды падабалася бачыць Максіма ў працы (І.Шамякін). 16. Адно чуваць было, як смактаў [алень] бярозавы сок, ды відаць было, як пры гэтым вочы яго туманіла шчасце (В.Карамазаў). 17. Вясна не хацела мірыцца з упартаю зімою (В.Карамазаў). 18. Я люблю хадзіць па вуліцах невялікіх гарадкоў, глядзець, як жывуць людзі (А.Кудравец). 19. Кузьма Чорны ўмеў і любіў расказваць (М.Лужанін). 20. Гэтую санату Бетховена Валя ведала на памяць і магла яе іграць у любы час і без нот. І слухаць магла бясконца (Я.Сіпакоў). 21. Мальвіне хацелася прыпыніцца каля гэтай ліпкі, але Тычына апярэдзіў яе… (А.Кулакоўскі). 22. Ледзь паспявалі абабраць парэчкі, як паспявалі вішні, наліваліся сокам, жаўцелі грушы, крутабокія яблыкі, слівы… (Б.Сачанка). 23. Крыху засмучаным здаваўся далягляд, а ў сэрцы глыбока, як далёкі ўспамін, пачынала варушыцца тая даўняя, з маленства знаёмая туга, якая ахінае чалавека ў пустым восеньскім полі… (А.Жук). 24. І яшчэ ў Альшанах любяць працаваць (В.Палтаран). 25. Як пачаў узыходзіць [Сяргей] на гару, зямля дыхнула цяплом, пахам летняй іглiцы, чабору (А.Варановіч).

***42. Запішыце сказы з састаўным іменным выказнікам у наступнай паслядоўнасці: 1) з адцягненай, 2) паўадцягненай, 3) знамянальнай звязкай.***

1. Жанчына была звычайнай, з русай каронай валасоў на галаве, з трошкі вінаватай, вельмі жаночай усмешкай на прывялых вуснах (У.Караткевіч). 2. У купцы жанчын, што ціснуліся каля ложка, гамонка ішла такая ціхая, што збоку амаль нічога не было чуваць (І.Мележ). 3. Апошнія словы былі адрасаваны Мулейку і Ступіку (Якуб Колас). 4. У гэты вечар, пасля спрэчкі з Яўхімам, Ганне нават яго хараство, упэўненасць, дасціпнасць здаваліся агіднымі (І.Мележ). 5. Ананьеў крычаў і быў страшны ў гэтым сваім, мусіць, справядлівым гневе (В.Быкаў). 6. Алесь таксама смяяўся, але сядзець вось так апошні раз за іхняй вячэрай было цяжка (У.Караткевіч). 7. У водбліску маланак Верачччын тварык здаваўся белым-белым, без крывіначкі (І.Мележ). 8. Заўжды яна [Драздова] была незадаволеная, раздражнёная, лаяла ўвесь свет і асабліва свайго мужа Арцёма, маўклівага, падатлівага цесляра з будтрэста (В.Быкаў). 9. Гэты канец нашага сяла быў мне куды мілей (Я.Скрыган). 10. Ганна адчувала, што Хадоська ўжо супакоілася, зноў сядзіць шчаслівая (І.Мележ). 11. Ядвіся была дзяўчына сукрытая, мела характар замкнёны і не жалілася на сваю долю (Якуб Колас). 12. Горад здаваўся цёмным і непрытульным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(Я.Сіпакоў). 13. Гэтыя некалькі пагодных дзён, што прыйшлі і ўсталяваліся пасля працяглых нудных дажджоў, і ёсць тое забытае бабіна лета… (Я.Радкевіч). 14. І здаля, з цеплахода, трава здаецца не зялёная, а сівая, шызая (Б.Сачанка). 15. Гаспадар быў з выгляду моцны і дужы (К.Чорны). 16. Ганна не адказала, ішла строгая, непадступная, паказвала гонар свой (І.Мележ). 17. І так добра стала Ганне, быў салодак час спаткання… (Якуб Колас). 18. І повен ён [Уладзя] быў чалавечага задору (К.Чорны). 19. Напісана было крыва, няроўна, алоўкам на карце з вучнёўскага сшытка, прыклеена да дзвярэй хлебам (Я.Брыль). 20. Першая на стук у акно ў Грыбковай хаце прачнулася жонка (І.Мележ). 21. Лес на другім беразе быў густа падсінены смугой… (В.Іпатава). 22. Краявід, пазбаўлены лесу, здаваўся аднастайны і панылы (І.Навуменка). 23. Пачатак тае восені на поўдні Палесся – у міжрэччы Прыпяці і Дняпра – выдаўся пагодлівы, на дзіва сухі і цёплы (Б.Сачанка).

## ДАДАНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА

***43. Спачатку запішыце сказы з прамымі дапаўненнямі, потым – сказы з ускоснымі дапаўненнямі. Вызначце спосаб марфалагічнага выражэння.***

1. Гаспадару кватэры даручылі разведаць, калі будзе аперацыя (К.Чорны). 2. А страх аж вочы дзядзьку муціць… (Якуб Колас). 3. Гаспадыня сама прыбрала са стала медны самавар і панесла яго на кухню (Г.Далідовіч). 4. Грасыльда вынесла сабе з хаты маленькі ўслончык (І.Пташнікаў). 5. У лагеры сваёй, “Камсамольскай”, брыгады Валодзя, не злазячы з каня, раздае хлопцам трохі газет (Я.Брыль). 6. Заяц недаўменна глядзеў проста ў твар Іваноўскаму (В.Быкаў). 7. Бацька баяўся чужых ліхіх вачэй, зляку (Г.Далідовіч). 8. Поле гучала птушынымі галасамі, зелянілася ячменямі і аўсамі (К.Чорны). 9. Піліпчык паказваў Васільку ўсякія іншыя свае сакрэты: барсукову нару пад хваёвым пнём, птушынае гняздо ў кусце (М.Лынькоў). 10. Раман лячыў травамі скурапею і скулы, упраўляў звіхі, выводзіў цяменнік, браў на рукі дзяцей з пярэпалахам і глядзеў ім у вочы (У.Караткевіч). 11. Доўга-доўга, шкадуючы, згадвала Хадоська бездань азярца каля Глінішчаў… (І.Мележ). 12. Яна [Ніна] ніколі не дазволіць узяць сабе хоць маленькую капялютачку таго, што належыць ёй, Марыне (М.Лобан). 13. У гэтым ціхім, але моцным “гм” Толя адчуў нядаўнюю Собалеву ўсмешку… (Я.Брыль). 14. Праз жах, праз гора, сцежкаю любою ішла са мной да перамогі весняй матчына песня (К.Кірэенка). 15. Ад сына ніякае весткі Пятро больш ужо не меў (К.Чорны). 16. Пасля смерці бацькі Альгерд (1341) валодаў Крэвам, землямі на р.Бярэзіне і Віцебскім княствам (БелЭн). 17. Аднак Глеб яшчэ больш заганарыўся і пачаў усяляк ганьбіць Уладзіміравых паслоў… (М.Ермаловіч). 18. Гандлярам порахам забаранялася мець у краме больш за тры фунты пораху (М.Ткачоў). 19. Снеданне Яўмену падавала дачка гаспадыні, шаснаццацігадовая Галя (І.Шамякін). 20. Мужчыны і жанчыны пасміхаліся з іхніх слоў, і толькі мы, дзеці, шчыра верылі дзядам Таўкалу, Петраку, Пракопу (“Полымя”). 21. Алесь з цікавасцю разглядаў спадарожніка, яго жвавы прыгожы твар з аксамітна-цёмнымі вачыма (У.Караткевіч). 22. Арлавец злосна шпурнуў пад нос сувязісту яго неадмысловую курэцкую прыладу (В.Быкаў). 23. Са спакойнай грунтоўнасцю мутэр расказала яму [Алесю] пра сваю сям’ю (Я.Брыль).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***44. Запішыце сказы, дапасаваныя азначэнні падкрэсліце адной лініяй, недапасаваныя азначэнні – дзвюма. Прааналізуйце спосаб выражэння недапасаваных азначэнняў.***

1. Успамін пра апошні, злы Васілёў позірк зноў затушыў агеньчык у сэрцы, вярнуў Ганне горыч неператжытай крыўды (І.Мележ). 2. Гэтую прыязнь Лапка да Бабуры жывіла яшчэ адна акалічнасць: Таклюся Галынка была Цімохава сястра (Якуб Колас). 3. Невысокую пасівелую жанчыну ў лёгкім асеннім паліто можна было бачыць у розных канцах Віцебска (Р.Няхай). 4. Тут, у паэтычна-неахайным пакоі Вацевага спадарожніка гэтых дзён, здавалася цесна і шумна… (К.Чорны). 5. Нарчуковы партызаны з энтузіязмам сустрэлі задуму сабраць на вяселле ў Верамейкі так званых прымакоў з навакольных населеных пунктаў (І.Чыгрынаў). 6. Раздаўся жаласны стогн і гук ад падзення чалавечага цела (У.Караткевіч). 7. Баляслаў запрог лепшага каня і паехаў па апошняга доктара душы чалавечай (К.Чорны). 8. Высокая цёмная чалавечая постаць мільганула ў навісі зацярушаных снегам галін і паволі выплывала на прагал, вырысоўваючыся ўсё болей і болей ясна з лясной вячэрняй цемры (Якуб Колас). 9. Звінеў малады дзявочы смех, радасны і прывабліві (І.Шамякін). 10. Дзіцячы гоман і плёскат вады чуўся трохі далей, уверх па рэчцы (Я.Брыль). 11. Гэта быў малады, крутаплечы хлопец з рэдзенькім пушком на барадзе, у чорнай шапцы-аблавушцы (В.Быкаў). 12. У 70-х гадах XVIII ст. [Тызенгауз] стварыў уласны прыдворны тэатр, пераважна з оперна-балетным рэпертуарам (“Полымя”). 13. Між кустоў лазы кудлатай бегла сцежачка, вілася, а па сцежцы той плялася постаць нейча ў цьме зацятай (Якуб Колас). 14. І ўсё гэтакае ішло цяпер Зыдору ў галаву (К.Чорны). 15. Знаёмая, зведаная стыхія летуценнасці захліствае Веньяміну грудзі (І.Навуменка). 16. Бацюшка прыходзіў у сваёй доўгай чорнай расе, вузкай у паясніцы, шырокай у падоле, з маленькаю рудою бародкаю, з доўгімі рэдкімі, па каўняры раскіданымі валасамі, з ліхаманкавым агнём у вачах, і палахліва аглядаў клас (Я.Скрыган). 17. За час свайго замужжа Ганна прывыкла таіцца, хаваць у душы і пакутны боль, і тугу, і надзеі (І.Мележ). 18. Як і многія, я адчуваў у сабе ў той час ціхі і светлы гонар за свой такі ўдачлівы вайсковы лёс (В.Быкаў). 19. Прыпамінаецца Сцёпку яго размова з бацькам аб рабфаку (Якуб Колас). 20. Пад нашымі нагамі чаўкае, хлюпае ледзь не да падбародка густая шорсткая трава (П.Сабіна). 21. У памятную ноч узрыву электрастанцыі Ігнат быў на заводзе ў сваёй змене (М.Лынькоў). 22. Вось і мне выпала нагода ўспомніць майго даўняга добрага таварыша... (С.Грахоўскі).

***45. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце прыдаткі, вызначце, што яны абазначаюць, як дапасуюцца і злучаюцца з паяснёнымі словамі.***

1. Вось у гэтае мястэчка і накіраваліся нашы вандроўнікі Лабановіч і Садовіч (Якуб Колас). 2. Не забылі Івана Міцевы браты Адам і Пятрусь (І.Навуменка). 3. Следам за сяржантам убеглі сюды яго падначаленыя Ахметаў, Натужны, Тарасаў (В.Быкаў). 4. Гаспадыня кватэры № 22 дзе пасяліўся Грынявіцкі ураднікава дачка Ганна Артамонава і яе прыслуга салдацкая ўдава Акуліна Смялкова на судовым працэсе царазабойцаў апавядалі пра ціхае і самотнае жыццё кватаранта, пра ягоную беднасць і сціпласць (У.Арлоў). 5. А вілы граблі і мяцёлкі малацьбітовы прыяцёлкі каля варот адны стаялі – таксама працы ўжо чакалі (Якуб Колас). 6. Каля Яўхіма

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

апынуўся брат яго Сцяпан (І.Мележ). 7. Інжынер чалавек з дзвюма вышэйшымі адукацыямі вучоны ён не надта любіў сваё дырэктарства (Я.Скрыган). 8. Ізяслаў сеў на вялікакняжацкі сталец вялікае ўпрыгожанае золатам і слановай косцю крэсла… (Л.Дайнека). 9. Попрадкі… Колькі выслухана ў час іх намі вясковымі падшыванцамі жаночых прызнанняў, любоўных гісторый (А.Новік). 10. І ў табакерцы залатая пяцёрка была ўся дзедава маёмасць, яго багацце (М.Лынькоў). 11. Дзеці дзве Хадосьчыны сястрычкі і брат сядзелі на печы… (І.Мележ). 12. Андрэй старэйшы Пракопаў сын быў у Чырвонай Арміі (Якуб Колас). 13. Наступнага дня з'явіўся ў яноўскае наваколле станавы прыстаў вусаты і вельмі прыгожы мужчына (У.Караткевіч). 14. Ран чакалася шмат, бо полаўцы спрадвеку мелі бязлітасныя кіпцюры і зубы трапныя лукі і стрэлы (Л.Дайнека). 15. Гэта быў муж Ядвісі пан Францішак былы ўласнік камяніцы ў ваяводскім горадзе (Я.Брыль). 16. Гэта быў далёкі дзядзька Алеся Пятро Басак-Яроцкі гаспадар невялікага маёнтка былы каўказскі афіцэр (У.Караткевіч). 17. Завознікі слухалі якраз вусаценькага мужчыну, які са смакам і веданнем расказваў пра былога гаспадара млына купца Боруха Бісінкевіча (Я.Брыль). 18. Бацька Францішка Скарыны як гаспадар сям'і быў з той нагоды больш стрыманы, памаўклівы (А.Лойка). 19. Я папраўляю на падлозе маю небараку-нагу (В.Быкаў). 20. Побач з дзядзькам сядзела Ганулямі яго дачка Васілёва равесніца (І.Мележ). 21. Наведваецца часам і сам гаспадар лесу мядзведзь (В.Вольскі). 22. Воблік Бёрнса-паэта спалучаецца для нас з воблікам Бёрнса-чалавека… (М.Лужанін). 23. Памятаю, як звінеў мой голас, калі чытала верш "Новая восень" (Я.Новікава). 24. У Оршы нас сустрэў Міцькоў старшыня Аршанскага райвыканкома і на машыне адвёз у Ляўкі (П.Броўка).

***46. Запішыце сказы, падкрэсліце акалічнасці, ахарактарызуйце іх паводле значэння, вызначце спосаб марфалагічнага выражэння.***

1. Хвілін праз пяць Лабановіч меў на руках карэспандэнцкі білет ад "Виленского вестника" (Якуб Колас). 2. Любка паўтарала механічна нечыя словы (М.Лынькоў). 3. Цьмяна гарэла газоўка (К.Чорны). 4. Ускочыў у гразь Яўхім, адчувала Ганна, таксама з форсу: няхай, маўляў, глядзяць, бачаць усе, які ён… (І.Мележ). 5. Неўзабаве Кацера выбегла на двор, кінулася на шыю брату (Л.Дайнека). 6. У вёску вецер падзьмуў якраз у вуліцу, упіраючыся ў хату Вялічку… (І.Пташнікаў). 7. У другой палавіне чэрвеня, адбыўшы свой месяц, Алесь выйшаў на волю (Я.Брыль). 8. У гэтай пушчы з перадвекаў – што так драмала ўдоўж і ўшыр, – сялібу меў сабе Машэка… (Янка Купала). 9. У Мінск Мікола Кавалюк прыехаў у самым канцы пераможнага сорак пятага года (І.Навуменка). 10. Мой век не прывык валачыцца павольна па багнах пустых (П.Панчанка). 11. Сярод глухога лесу, удалечыні ад магістральных дарог, буйных прадпрыемстваў і шматгалосага людскога натоўпу засталася сіраціна-сіроцінаю мая родная вёсачка Асінаўка… ("Полымя"). 12. Марфа заклапочана паглядзела на свае парусінавыя чаравікі (І.Чыгрынаў). 13. І баец, нервова перасмыкнуўшы вуснамі і адразу забыўшыся і пра сённяшнюю раніцу, і пра канец вайны, і пра свае клопаты-мары, шырока сігануў угору і апынуўся наперадзе (В.Быкаў). 14. Трывожна год звінеў майму дзяцінству нямецкаю трафейнаю трубой (Р.Барадулін). 15. І ўсюды, ля ўсіх беларускіх дарог, – жахлівая спадчына адгрымелай вайны (Я.Сіпакоў). 16. Тручыся паміж новых людзей, Пніцкі нават і сам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пачаў часамі трапляць у тахту іхняй гаворкі (К.Чорны). 17. Не сказаць каб ветлівым вокам зірнуў тут Чмаруцька на свайго дружбака (М.Лынькоў). 18. І аднаго разу спраўдзілася маё жаданне (Я.Скрыган). 19. Крыжацкае войска, церпячы ад голаду, рассыпалася і амаль усё загінула ў непраходных лясах (М.Ермаловіч). 20. Пра язду на таварным поездзе, па сялянскай сваёй хітрасці, Сцёпка дыпламатычна змаўчаў (Якуб Колас). 21. Алесь ненавідзеў гэтага чалавека ўсёй сілай сваёй дзіцячай нянавісці (У.Караткевіч). 22. Шмат паведалі нам пра сваё горкае жыццё-быццё старыя (П.Сабіна). 23. Мы ўсім гуртам кінуліся запаўняць прабелы ў Марыкавай адукацыі… (К.Цвірка). 24. Сцяпан хвіліну для прыліку пастаяў пры бацьку… (І.Мележ). 25. Іван быў яшчэ недзе там, у палоне цяжкай сваёй дарогі (І.Навуменка).

***47. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты ў адпаведнасці з сінтаксічнай функцыяй.***

1. Прывязаўшы каня скінуўшы яму сена патупаў Глушак старэча па сходцах… (І.Мележ). 2. Мурза супакоіўся, нават панюхаў Максіма дыхнуўшы на яго цёплым і казытлівым сабачым пахам (Я.Брыль). 3. Адвярнуўшыся да сцяны Гэля выняла загорнуты ў насоўку, як яна казала, матчын пасаг, аддала настырнай кабеце (І.Чыгрынаў). 4. Некалькі дзён Курані хваляваліся пераказваючы адзін аднаму на розныя лады, як нахаба-воўк напаў на Пракопавага каня (І.Мележ). 5. Я вышукваў чмяліныя соты поркаючыся каля кусцікаў абглядваючы купіны (А.Марціновіч). 6. Боганчык пусціўшы аднаго жарабка стаяў цяпер у нечай позняй бульбе на шнуры… (І.Пташнікаў). 7. Вітаючыся з Хаімам Макар не забыўся аберуч сціснуць ягоную руку (Я.Брыль). 8. Нейкая цётка насадзіўшы поўную лодку ягнят пераплывае на той бераг – акурат дзед Мазай і зайцы (Б.Сачанка). 9. У такія ночы Васю хацелася ўстаць, пайсці да сасны і суцяшаць яе прыціснуўшыся галавой да шурпатага карычневага ствала (В.Іпатава). 10. Убачыўшы маю радасць Янка Купала ўсміхнуўся і сказаў: “Бачу, што білет трапіў па назначэнні…” (В.Гарадзілава). 11. Адзін толькі Якуб быў з ім [Лабановічам] запанібрата і знаёміў яго з колам сваіх інтарэсаў, сваіх забавак і свайго дзіцячага жыцця забаўляючы брата несціханым шчэбетам (Якуб Колас). 12. Расціслаў Глебавіч сеўшы ў Полацку аддаў ва ўладанне ўсе полацкія ўдзелы братам і дзецям (М.Ермаловіч). 13. Стаўшы на дровы што былі складзены пад сцяною я заткнуў насоўкай ляток і зняў з цвіка сінічнік (Р.Ігнаценка). 14. Узяўшы з рук Машы сякеру Васіль абышоў вакол сасны, папляваў у далоні, размахнуўся і ўдарыў сякерай па камлю, каля самага снегу (І.Шамякін). 15. Сібірак ткнуўшыся храпамі Богданчыку ў калёсы стаў і зафорскаў (І.Пташнікаў). 16. Алень замёр, прыслухаўся і пераканаўшыся, што яго ніхто не бачыць, што ён на адзіноце з аблюбаванай бярэзінай, пачаў старанна пілаваць рогам белы ствол… (В.Карамазаў). 17. Краснакуцкі, Лукашоў адразу падняліся ляскаючы сябе па сцёгнах замахалі рукамі (В.Быкаў). 18. Першыя свае апавяданні Мележ піша левай рукой ужо не спадзеючыся на правую (В.Вітка). 19. Пажвавелы ўраз дзядзька ўсцягнуў на калматую галаву барановую кучомку і мякка ступаючы валёнкамі выбег на ганак (І.Мележ). 20. Потым стаўшы пісьменнікам і сустракаючыся з Якубам Коласам я часта ўспамінаў гэты малюнак свайго маленства… (К.Кірэенка). 21. Радасна ўскінуўшы рукі Гушка адною абапёрся на нечае плячо, а другою нагнуўшыся пачаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

скідаць боты з ног (Я.Скрыган). 22. Верасоўскаму хацелася, каб хлапчукі і дзяўчынкі нягледзячы на перажытае заставаліся дзецьмі (Я.Сіпакоў).

## АДНАСАСТАЎНЫЯ СКАЗЫ

***48. Прааналізуйце структуру пэўна-асабовых сказаў і спосабы выражэння галоўнага члена сказа.***

1. Казкай цудоўнаю, песняй вясновай вечна жыві, мая родная мова! (С.Дзядушка). 2. На далёкай зямлі Казахстана земляка выпадкова сустрэну і расказваць з ахвотаю стану пра благія і добрыя змены (А.Бадак). 3. Аснежаная Літва, як сум па табе, павязу часцінку твайго харaства – тваю сняжынку-слязу (А.Лойка). 4. Несправядлівасці ніводнай не пацерпім! (У.Караткевіч). 5. Па здзейсненых казках, радках непаўторных паэм, па колеру шчасця шукаем дарогі свае (В.Лукша). 6. Мой верны дружа, тваёй парадай не праміну скарыстацца (І.Грамовіч). 7. Звіні ж, маё маленства залатое! (В.Вітка). 8. Прачнуся на досвітку, пачну збірацца ў няблізкую дарогу (П.Галавач). 9. Бачу самотны клін жураўоў у восеньскім небе (М.Калачынскі). 10. Пайшлі, дзеці, дадому (А.Васілевіч). 11. Люблю адвячоркам выйсці на двор і ўслухвацца ў далёкую песню салаўя (У.Карпаў). 12. Давайце, добрыя сябры, пагутарым аб шчасці (П.Глебка). 13. Абагрэй маё каханне, сонца, промнямі сваімі (П.Броўка). 14. Хутка мінаем Заслаўе з цудоўнай каменнай вежай на высокай гары (ЛіМ). 15. Давайце перастанем думаць пра ўласныя дасягненні, пра свае жаданні. Паспрабуем ацаніць станоўчыя якасці іншых людзей (В.Вітка).

***49. Прааналізуйце структуру абагульнена-асабовых сказаў і спосабы выражэння галоўнага члена сказа.***

1. Дум не скуеш ланцугамі (Янка Купала). 2. Глыбокую ваду не замуціш (Прыказка). 3. Не зведаўшы гора, шчасце не пазнаеш (Прыказка). 4. Добрага чалавека не перахваліш (М.Лынькоў). 5. З хараства вады не нап’ешся (Прыказка). 6. За спрос платы не бяруць (Прыказка). 7. Раскладайце, паліце Купалля агні! (Н.Гілевіч). 8. Ад хлеба не шукаюць хлеба (Прыказка). 9. Жыві добра з людзьмі: з добрымі для добрасці, а з ліхімі для злосці (Прыказка). 10. Лес не сякуць языкамі (К.Крапіва). 11. На свеце жывучы, усяго нажывеш (Прыказка). 12. Страчанага часу не вернеш (Р.Няхай). 13. Апёкшыся на малацэ, на ваду дзьмеш (Прыказка). 14. Куранят увосень лічаць (Прыказка). 15. Ліхтаром пушчы не асвеціш (У.Галубок). 16. У людзей пытай і свой розум май (Прыказка). 17. Дармоваму каню ў зубы не глядзяць (Прыказка). 18. У бяздонні часу не прыкмеціш зла (А.Звонак). 19. Выраслі, а розуму не вынеслі (Прыказка). 20. Бачаннем не зловіш жураўля (Р.Барадулін).

***50. Выпішыце няпэўна-асабовыя сказы, падкрэсліце ў іх граматычную аснову. Растлумачце, чым адрозніваюцца няпэўна-асабовыя сказы ад абагульнена-асабовых сказаў.***

1. Была вечарынка. Спявалі песні (У.Караткевіч). 2. Спакавалі рукзакі. Адплывалі. Сонца было злева (У.Караткевіч). 3. Рассталіся. Яна адна (М.Танк). 4. Плылі юбіляру кветкі. Ракою лілося віно. І рукі яму паціскалі. І гаварылі прамовы (К.Кірэенка). 5. Восенню ўздоўж дарогі пасадзілі маладыя хвойкі (І.Навуменка). 6. Пераможцаў не судзяць (Прыказка). 7. На полі капалі бульбу (А.Чарнышэвіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

8. Навуку за плячыма не носяць (Прыказка). 9. У суседнім вагоне спяваюць і смяюцца (Б.Мікуліч). 10. Птушку пазнаюць па палёце (Прыказка). 11. У хаце навялі чысціню і па-святочнаму прыбралі (М.Хведаровіч). 12. Па нітачцы клубок знаходзяць (Прыказка). 13. Гучала музыка. У пакоі танцавалі (А.Кулакоўскі). 14. Пазнаюць нашу дачку і ў андарачку (Прыказка). 15. За выключэннем некаторых раёнаў Палесся, беларускую хату ніколі не беляць знадворку, толькі ўнутры (У.Караткевіч).

***51.Запішыце безасабовыя сказы, падкрэсліце ў іх граматычную аснову. Прааналізуйце спосаб выражэння галоўнага члена ў безасабовых сказах. Вызначце семантыку безасабовых сказаў.***

1. Няма на свеце земляў непрыгожых (П.Панчанка). 2. Трэба сурова сеяць свой хлеб, змагацца з градам і навальніцамі, спяваць і не звяртаць увагі на крушэнні, здрады і боль (У.Караткевіч). 3. Садоў намнога пабольшала за апошнія дзесяцігоддзі (У.Караткевіч). 4. Ад ракі павеяла халадком (І.Шамякін). 5. Зусім ужо развіднела (В.Быкаў). 6. Прыемна было адчуваць пяшчоту вясенняга сонца (Якуб Колас). 7. Смешна прагай папракаць няўтольнай зялёную траву (А.Куляшоў). 8. І хочацца вянком прыбраць прыгожым галоўкі юныя бярозак навакол (У.Хадыка). 10. Позна. Над нівамі змрок (М.Танк). 11. Ранак завалакло туманам (А.Звонак). 12. Пачынала брацца на адлігу (М.Лынькоў). 13. Пара не толькі зразумець, але і выправіць свае памылкі (Б.Мікуліч). 14. Лёгка лічыць сябе храбрым (К.Кірэенка). 15. Зосі стала крыўдна (К.Чорны). 16. За шумам нічога нельга было разабраць (І.Гурскі). 17. Сумна без смеху дзяцей (А.Пысін). 18. Шкада мне дзён загубленых маіх (М.Багдановіч). 19. Запрошаных гасцей было нямала (П.Пестрак). 20. Шляхі марскія ўспамінаць не грэх... (П.Панчанка).

***52. Выпішыце асобна безасабовыя сказы і інфінітыўныя сказы, растлумачце адрозненні паміж імі.***

1. Нам толькі б мір, ды хлеб, ды шчасце мець (П.Панчанка). 2. Не выплакацца. Ноччу не забыцца (А.Вялюгін). 3. Нам дружбай, як добраю песняй, заўжды даражыць (В.Лукша). 4. Мне здаралася бачыць стопяцідзесяцігадовыя ветракі (У.Караткевіч). 5. Зберагчы сёння трэба больш святла, цеплыні, дабраты (А.Пысін). 6. Не забыць мне цябе, родны край (Ц.Гартны). 7. Пачынае світаць (Т.Хадкевіч). 8. Нікому весні гул не заглушыць! (М.Танк). 9. Вечна палаць пуцяводным зорам у цемры ночы (М.Танк). 10. Час рыхтавацца да сяўбы (А.Кулакоўскі). 11. Хацелася пагаварыць хоць з кім-небудзь, падзяліцца сваімі трывогамі (І.Мележ).

***53. Вызначце семантыку намінатыўных сказаў (апісальныя, указальныя, эмацыянальна-ацэначныя). Зрабіце сінтаксічны аналіз развітых намінатыўных сказаў.***

1. Спакой. Туман. Тужлівы крык савы (У.Караткевіч). 2. Вось і бераг... Жоўты спад і круча (К.Кірэенка). 3. Вакзальны развітальны звон. Вагоны з песнямі і смехам (А.Пысін). 4. Восень, восень! Стома, шчасце, зоры і спакой (А.Вялюгін). 5. Вось азёрны край. Марэнныя грады, шматкіламетровыя "агароджы" з валуноў на межах. І многія-многія сотні азёр (У.Караткевіч). 6. Што за прыгажосць! (І.Шамякін). 7. Але ж і раздолле! (І.Грамовіч). 8. Бульбяное, жытняе, ільняное поле. Белыя зорачкі, жоўты сухмень, сіняе азерца. А яшчэ малінавая канюшына, белы россып грэчкі, залатое мора лубіну ці сланечніку, бледна-зялёныя кучары гароху. Ну і, вядома,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пашы, выганы з каровамі і авечкамі (У.Караткевіч). 9. Вось і ноч. Нада мной заліліся слязамі нябёсы (М.Багдановіч). 10. Вунь нашая рэчка! Вунь школа ля гаю (П.Броўка). 11. Ціхі след. Зорны шлях. Цішыня (К.Кірэенка). 12. Творчы міг... Напорная імклівасць... Працай тут заняты муляры (П.Трус). 13. Ну і дождж! Ці скончыцца ён калі? (С.Баранавых).

***54. Выпішыце намінатыўныя сказы, падкрэсліце ў іх граматычную аснову. Растлумачце, чым адрозніваюцца намінатыўныя сказы ад няпоўных двухсастаўных сказаў з прапушчаным выказнікам. Знайдзіце сказы, якія ў залежнасці ад актуальнага члянення могуць кваліфікавацца як аднасастаўныя (намінатыўныя) і як двухсастаўныя.***

1. Дуга дарог. Над борам сіні дым (У.Хадыка). 2. Жніво. Смуга над плёсам (А.Пысін). 3. Аэрапорт. Паласаты мяшок, напяты дыханнем пагоркаў ліловых. Антэна і домік. І рыжы стажок, увенчаны конусам жэрдак яловых (А.Пысін). 3. Першабытны іней. Снег няталы (А.Пысін). 4. Гарачыня. Не за гарой зажынкі (П.Панчанка). 5. Па імшарах топкіх – журавінаў жар (А.Звонак). 6. Магілёўская вёска. Курная хата. Год трыццаць шосты (К.Кірэенка). 7. Дарога па вячэрняй вёсцы. Стрэхі ў жыце. Росная, следная трава на вясковых могілках. Плеценыя платы. Вогненны, расплаўлены шафран заходу. І на ім, як цені, як ізваянні – буслы (У.Караткевіч). 8. Ноч. Туман устае над нізінамі. Аднекуль песня (У.Караткевіч). 9. Плот і весніцы. Хаты сонныя. У небе досвіткі. У сэрцы рань (У.Хадыка). 10. Глухая поўнач. Зорны пыл (А.Вялюгін). 11. Вечар. Месяц зоркі лушчыць. Кедрача густы настой (У.Някляеў). 12. Усход. Часам марэнныя грады, часам раўніны. На водападзелах тарфяныя і мохавыя балоты (У.Караткевіч). 13. Поўдзень. Палескае роўнае поле. На гарызонце зубчасты сілуэт лесу (У.Караткевіч).

***55. Выпішыце асобна сказы са звароткамі, аднасастаўныя намінатыўныя сказы і канструкцыі з "назоўным уяўлення", растлумачце адрозненні паміж імі.***

1. О Беларусь!.. Дык што ж ты для мяне? Краіна, дзе жыву? І больш нічога? (І.Клепікаў). 2. Капыль, Капыль! Маё мястэчка, Вялікай Міншчыны куток! Мне міла ўсё тваё: і рэчка, і хаты, і нівы, і гаёк!.. (Ц.Гартны). 3. Зямля!.. Людзей спакою пазбаўляе яна на гэтым свеце і на тым (А.Куляшоў). 4. О неба, ціхае, світальнае... Мы пад шатром тваім стаім з салодкай сённяшняю тайнаю і лёсам заўтрашнім сваім (Г.Бураўкін). 5. Лістоты шэлест, ззянне зараніц, і срэбра хваль, і хваляванне жыта... Хай гэта ўсё ў душы маёй звініць і сэрцам будзе перажыта (П.Марціновіч). 6. Поўнач. Хваёвыя лясы. Пераважна сасна і яліна (У.Караткевіч). 7. Ноч. Дождж. Нябёс імгла (М.Багдановіч). 8. Шляхі, шляхі! О як жа многа было вас пройдзена ў жыцці! (П.Прыходзька). 9. О светлае сонца, прасветлае! Усім ты нясеш і цяпло, і красу (Янка Купала). 10. Ранне! Крыштальнай расою выкупай травы мурожныя (А.Астрэйка). 11. Адвячорак. Змрок рассеяўся... (Ц.Гартны). 12. Адпачынак. Скончан доўгі шлях (П.Панчанка). 13. Асенняя раніца. У паветры яшчэ вісіць дробны шэры пыл (А.Якімовіч). 14. Беларусь, Беларусь... Ні канца і ні краю (А.Вялюгін). 15. Поўнач, Поўнач!.. Стынь ды сопкі. Прорвы нетраў. Немасць зор (У.Някляеў).

***56. Выпішыце з тэксту аднасастаўныя сказы, а таксама складаныя сказы, якія маюць часткі са структурай аднасастаўных сказаў. Зрабіце іх сінтаксічны аналіз.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

I. Мы спазніліся на маладзечанскі поезд і вырашылі ехаць прыгарадным да станцыі “Беларусь”, а ўжо адтуль дабірацца як-небудзь да Радашковіч, шукаць Вязынку, дзе нарадзіўся вялікі паэт.

...І вось праносяцца невядомыя ўзгоркі, рачулкі з празрыстай вадою, вёскі ў лагчынах. Тут прыгожа, і паступова пачынаеш разумець, што толькі на гэтай зямлі мог нарадзіцца чалавек з прыгожай душой.

За станцыяй “Беларусь” тыя ж палі без канца, высокія ўзгоркі, парослыя лесам. Родная, мілая зямля!

Удвух з таварышам пускаемся ў невядомыя краі.

Шмат часу “лічым шпалы”, спяшаемся туды, дзе лес на двух узгорках расхінаецца і стварае браму ў светлую, залітую сонцам зямлю.

Спёка. Жаўранкі звоняць крыллямі ў шкляное празрыстае паветра.

*У.Караткевіч. Вязынка*

II. Я ўраджэнец той часткі Беларусі, якая ляжыць на Дняпры. Люблю беларускае Палессе, і казачна мяккую Навагрудчыну, і адзіную ў свеце Белавежу, і суровую прыгажосць паўночнага азёрнага краю. Іх нельга аддзяліць ад мяне, але ў Прыдняпроўі мне неяк больш прытульна.

На Украіне берагі Дняпра нагія, а тут яны ўсе ў лясах, курганах, у вёсках на ўзгорках, у садах, у забытых гарадзішчах, густа ўкрытых шыпшынаю і чортапалохам, у запушчаных парках.

Калі раніцаю плывеш на чаўне праз рачны туман і бачыш след за галавою выдры, што пераплывае раку, або ўсплёск бабра – адчуванне шчасця, адзінства з гэтай зямлёй і любоў да яе перапаўняюць цябе.

*У.Караткевіч. Дарога, якую прайшоў*

III. Хутка цямнела, наступала сцюдзёная ноч, снегапад канчаткова пераставаў, і лейтэнант заспяшаўся. Дзюбін, здавалася, надта доўга пракорпаўся з лыжамі гэтага Шалудзяка, пакуль звязаў іх. Насупраць у цярплівым чаканні, азначаным на цёмных пад капюшонамі тварах, стаялі яго байцы. За Шалудзяком высіўся Краснакуцкі, мажны прыгажун у вастраверхім, як і ў Дзюбіна, шлеме-будзёнаўцы, побач застыў даўгашыі Кудравец і ля яго – непрыкметны маўклівы Заяц. Апошні на сцежцы стаяў, напэўна, самы малады тут, баец Піваварaў. Лейтэнант недастаткова ведаў іх, тых, з кім неўзабаве прыйдзецца яму падзяліць славу або смерць, але выбару ў яго не было. Вядома, было б куды лепш адправіцца на такую справу з добра знаёмымі, выпрабаванымі ў баях хлопцамі, але дзе яны, тыя яго добра знаёмыя хлопцы? Цяпер цяжка ўжо і прыпомніць усе вёскі, магільнікі, усе ляскі і пагоркі, дзе ў брацкіх і адзіночных магілах пазаставаліся яны, яго батарэйцы. За пяць месяцаў вайны ўцалела няшмат, тыдзень назад з ім разам прабілася цераз лінію фронту ўсяго чацвёра. Двое пры тым аказаліся абмарожаныя, аднаго паранілі пры пераходзе каля Аляксееўкі; да самага канца з ім аставаўся вылічыцель сяржант Варанок. Гэты Варанок вельмі спатрэбіўся б цяпер, але Іваноўскі не мог адшукаць яго. Вылічыцеля адправілі ў стралковы батальён на перадавую, адкуль, як вядома, не ўсе вяртаюцца...

*В.Быкаў. Дажыць да світання*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***57.*** ***Перакладзіце тэксты на беларускую мову. Параўнайце арыгінал і пераклад. Вызначце адметнае ў граматычным ладзе, што адрознівае пераклад ад арыгінала. Зрабіце сінтаксічны аналіз аднасастаўных сказаў, а таксама тых частак складаных сказаў, што маюць форму аднасастаўных сказаў.***

I. Мне было тогда лет двадцать пять, начал Н.Н., – дела давно минувших дней, как видите. Я только что вырвался на волю и уехал за границу, не для того, чтобы "кончить мое воспитание", как говаривалось тогда, а просто мне захотелось посмотреть на мир божий. Я был здоров, молод, весел, деньги у меня не переводились, заботы еще не успели завестись – я жил без оглядки, делал что хотел, процветал, одним словом. Мне тогда и в голову не приходило, что человек не растение и процветать ему долго нельзя. Молодость ест пряники золоченые, да и думает, что это-то и есть хлеб насущный; а придет время – и хлебца напросишься. Но толковать об этом не для чего.

*И.Тургенев. Ася*

II. Я не могу себе представить, какие ощущения в мире могут сравниться с тем, что испытываешь на глухариной охоте. В ней так много неожиданного, волнующего, таинственного, трудного и прелестного, что этих впечатлений не забудешь никогда в жизни… Мы находимся в старой, заброшенной "угольнице", в самом центре Полесья, в сорока верстах от какого бы то ни было жилья, кроме одиноких лесных сторожек, затерянных среди непроходимой чащи. Нас окружает со всех сторон вековой бор, равный по величине доброму немецкому княжеству… Мы подымаемся по трем земляным ступенькам, вылезаем из угольницы и сразу попадаем в такую глубокую темень, что кажется, будто нас внезапно окунули в какую-то гигантскую чернильницу. Я остановился в нерешительности, почти в страхе. Чтобы обмануть себя, я нарочно на несколько секунд закрываю глаза и потом быстро раскрываю их. Нет! Ночь по-прежнему черна. Я подымаю голову вверх. Но на небе нет ни одной звезды…

*А.Куприн. На глухарей*

## НЯПОЎНЫЯ І ЭЛІПТЫЧНЫЯ СКАЗЫ

***58. Запішыце кантэкстуальныя няпоўныя сказы. Падкрэсліце члены сказа, прапушчаныя потым ў кантэксце.***

1. Па тым, як нашы рэкі дыхаюць хвалямі, лясы – лістотай, палі – каласамі, хмары – громам, а людзі – роднымі песнямі, пазнаеце, як ім жывецца (М.Танк). 2. Лес часам загараецца ад перуна, любоў ад мімалётнага позірку, сляза ад болю (М.Танк). 3. У месяцы збегліся ночы, а сны – у чародку гадоў, дзе сінія-сінія вочы смяюцца з маіх халадоў (Р.Баравікова). 4. Была маёй матуляю адна, матуляю маіх дзяцей – другая (Г.Бураўкін). 5. Злятае бэз духмяны ў сны, а ў дні апошнія – сняжынкі (Р.Баравікова). 6. Васіль ужо не раз сам сабе адзначаў, што Ганна прыбіраецца, ідучы на спатканне. Стараецца, каб падабацца яму, стараецца, як перад сапраўдным кавалерам (І.Мележ). 7. Гэтая задзіра ў апошні час Васілю проста жыць не давала. От жа толькі пазаўчора пры ўсіх абсмяяла (І.Мележ). 8. У грудзях замірае дыханне, а на вуснах – экспромтны куплет (Р.Баравікова). 9. Прынеслі шустрыя вавёркі са сховішчаў сваіх арэхаў, сушаных грыбоў. Казулі і ласі – наскубленага са стагоў духмянага, як лета мурагу, а сойкі – гронкі арабін (М.Танк). 10. Вось што

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

добра – вада цёплая. Не студзіць ног, не гоніць дрыжыкаў па целе, як у іншыя дні ўвосень або зімою, калі ад халодных мокрых ануч аж дух займае (І.Мележ).

***59. Прачытайце ўрыўкі з твораў. Растлумачце, якім чынам моўная сітуацыя ўдакладняе апушчаны член сказа і дапамагае вызначыць семантыку выдзеленага няпоўнага сказа.***

1. Таня [Новікавай]. Калі ласка, мама просіць вас на абед.
Ляшчук. ***Ну што ж, да Кацярыны, лепшай даяркі, – ахвотна!***

(А.Дзялендзік).

2. У праломе, без каскі, шэры ад пылу, скорчыўшыся, з'яўляецца Салянік...
Дулін [да Адуванчыка]. ***Хутчэй – па Ліду. Яна – на КП.***

(А.Дудараў).

3. Мы падышлі да дзвярэй і пастукалі.
***– Хто там,*** – пачуўся голас з глыбіні кабінета.

(А.Дудараў).

4. Антановіч... Давайце будаваць метро! Жанчына ў квяцістай хустцы. Ты што, дзед, звар'яцеў?
Антановіч. Толькі падумайце: ***да любой фермы ў любое надвор'е...***

(А.Дзялендзік).

5. Ліда. Падумаць толькі! Якая прыгажосць, якія будынкі навокал!
Антановіч. ***Усё, што бачыш, – сваімі рукамі.***

(А.Дзялендзік).

6. Зязюля. А хто мне дасць навейшае абсталяванне для кармацэха? Вы?! Суседзі?!
Правяраючы. Дзіўна! ***З такой псіхалогіяй – і столькі гадоў на чале калектыву.***

(А.Дзялендзік).

7. Іван убачыў яшчэ здалёк, што трое набліжаліся да іх. Гэта былі немцы. Сэрца ў хлопца ледзь не спынілася ад страху: ***няўжо да іх, у хату?***

(В.Быкаў).

***60. Запішыце няпоўныя сказы з прапушчанамі дзеясловамі быць, знаходзіцца. Укажыце, што абагульняе семантыку названых сказаў. Падкрэсліце ў сказах дэтэрмінаваныя акалічнасці.***

1. На камні – няволі мінуўшыя дні, курганы ў палях адзінокія; на цвёрдым жалезе – акопы вайны, разбітыя сосны высокія (М.Танк). 2. Побач са сталом – канапа (Я.Брыль). 3. У паветры – салома і снег (В.Быкаў). 4. Палеткі ў сонечным убранні, між сосен – вецер, што гусляр (П.Броўка). 5. Зноўку ў ліпавых начоўках – дзіця і песня: толькі гайдані (Т.Бондар). 6. Поле шумнае – за вёскай у імклівых ручаях (П.Броўка). 7. Аблога цішыні вакол; абломак месяца – у аблоках...(Т.Бондар). 8. Там, за ціхім сінім борам, – шмат засмучаных суніц (А.Куляшоў). 9. У кожным двары – авечкі, куры, гусі (А.Дзялендзік). 10. Ну, вядома, перш трэба разведаць: а раптам у вёсцы – немцы (В.Быкаў). 11. Знекуль выскачыў газік, пабег сургунём, на ім – дзядзька Тамаш з велічэзным снапом (П.Броўка).

***61. Запішыце эліптычныя сказы. Назавіце прапушчаныя выказнікі.***

1. Павучае старая варона:
– Калі вада – з неба, людзі кажуць: дождж (М.Танк).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Птушка патрывожаная свішча, і настылі з раніцы кусты. Я хутчэй – на ціхае гарышча, дзе схаваны даўнія лісты (Р.Баравікова).

3. Прабег шарак, узняўшы хруст, прачнуўшыся ад сну. Птушыны піск – з куста на куст, бы спудзіў хто жаўну (П.Броўка).

4. Убегла ў пакой. Кнігі, сшыткі са стала – на падаконнік. Стол – ад сцяны. На стол – чысты настольнік (І.Мележ).

5. А перад ім яснее неба, а перад ім – машын гудкі. Насустрач – поле, поле з хлебам. Насустрач – дзеці, як званкі (П.Броўка).

6. Яна ж – ні слова, ні паўслова. Але глядзела... божа мой! (Н.Гілевіч).

7. Да Новікавай падыходзіць Міхась.

Міхась. Таварыш сакратар, не трэба сходу. Вы не ведаеце нашых хлопцаў. Сядуць на трактары, на камбайны і жалезнай калонай – у вобласць (А.Дзялендзік).

8. На покуць трэба юбілярку! – напомніў Лёкса Томашу (Н.Гілевіч).

9. І вісельні – слупамі верставымі. І лепшыя сыны – на эшафот... Ніводнае мы не забудзем імя – усіх герояў будзе знаць народ (Г.Бураўкін).

10. Ён кінуў позірк на Альжбэту – і сэрца кроіў боль скразны: амаль – нічога, ані следу ад той дзяўчынкі, з той вясны! (Н.Гілевіч).

***62. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Знайдзіце няпоўныя сказы. Вызначце іх віды.***

Золотые Сады спускались широкими террасами. Каждая терраса сверкала в лунных лучах своими золотыми деревьями, листьями, плодами, феерическими цветами. Все это было сделано из золота и серебра. На цветах сидели бабочки, раскрыв свои крылья. На ветках – птицы. В золотой траве – свернутые ужи, громадные ящерицы и улитки. Далее – поля маиса. По обе стороны дорожки, усыпанной золотым песком, дремали громадные золотые львы.

Сель долго не могла оторваться от этой картины. Её няня в восторге хлопнула в ладоши.

– Всё это – мой внук!

– Я не знала, что Мастер – твой внук, – ответила Сель.

Сель подошла к юноше в черной короткой рубахе, с густыми черными вьющимися волосами.

– Скажи, Мастер, как тебе пришла в голову мысль создать столь прекрасный сад?

– Золотые Сады – это символ. Вокруг – роскошные плоды, но не можешь насладиться их вкусом. Повсюду – диковинные цветы, но не можешь сорвать их. Здесь всё чарует глаза, но ничто не доступно для обладания. Жизнь – это тот же Золотой Сад.

Сель и Мастер стояли молча и любовались картиной заходящего солнца в Атлантиде: они думали о смысле жизни.

*А.Беляев. Атлантида*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## УСКЛАДНЕНЫ ПРОСТЫ СКАЗ

## АДНАРОДНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА

***63.** Вызначце сэнсава-граматычныя адносіны паміж аднароднымі выказнікамі са спалучальнымі злучнікамі (адначасовасці, паслядоўнасці, выніковыя адносіны)*

1. Кніга Міколы Ермаловіча "Па слядах аднаго міфа" выйшла ў 1989 г. і адразу знікла з паліцаў кнігарняў, ператварыўшыся ў бібліяграфічную рэдкасць (А.Грыцкевіч). 2. Я буду адпачываць ды слухаць музыку (А.Якімовіч). 3. Чыстая вада, сціснутая абкошанымі берагамі, баялася некуды спазніцца і ўсё плыла-плыла, падганяючы сама сябе (К.Чорны). 4. Вецер выхапіў з рук паперы і ў момант падняў вышэй за хвою (М.Лужанін). 5. Алесь размаўляў са старой і ў той жа час прыглядаўся, ці змянілася што ў хаце (П.Броўка). 6. Іваньчыкаў ступіў да дзвярэй, каб выйсці, і ў гэты ж час пачуў голас начальніка станцыі (В.Хомчанка). 7. Ападзе барвяніцай рабіна на дол і застыне ў чаканні спатканняў вясновых (К.Кірэенка). 8. Антону стала патрэбна яшчэ раз пабачыць Зоську і пасля з палягчэлай душой адпраўляцца за Нёман (В.Быкаў). 9. Па траве шапоча ды шастае дождж (Зм.Бядуля). 10. Галіны дрэў церліся адна аб другую і скрыпелі (К.Чорны). 11. Зірнуў тады дзед на злоўленага ментуза – і ледзь не самлеў (М.Лынькоў). 12. Стары хваляваўся і ў выніку сказаў не тое, што трэба было (П.Галавач). 13. Яснае, як сонца, святло залівае зямлю і крылата лунае ў прасторах (У.Караткевіч).

***64.** Выпішыце з тэксту сказы з аднароднымі членамі. Падкрэсліце аднародныя члены ў адпаведнасці з іх сінтаксічнай функцыяй.*

Янка Купала Кіславодск любіў. Ён спрыяў ягонаму здароўю і падабаўся сваёй асаблівай велічнай прыродай. Чырвоныя камяні, цудоўны парк, выключна дагледжаныя прагулачныя дарожкі і ўдалечыні велічны белагаловы Эльбрус цешылі яго сэрца, і я заўсёды адчуваў, з якім задавальненнем Купала хадзіў на “Храм воздуха” і радзей на “Красное солнышко”, куды было значна далей і не заўсёды выпадала схадзіць туды па часе, ды і па дазволу ўрачоў.

У Янкі Купалы было ўсюды шмат шчырых прыхільнікаў і добрых сяброў. Ён адразу ўвёў і мяне ў іх кола. Я часта хадзіў з ім да сям’і Калітоўскіх, з якой Купала быў дружны яшчэ з часоў, калі яны жылі ў Мінску. Сябраваў ён і з медыцынскімі сёстрамі і афіцыянткамі, якія абслугоўвалі яго. Помню, як аднойчы, накупіўшы падарункаў, ён павёў мяне ў госці да сваіх афіцыянтак. І з усімі ён добра адчуваў сябе і знаходзіў прыязную, патрэбную гутарку. Гэта было пэўнай навукай і для мяне, бо апрача ўсяго я адчуваў, што ў такіх сустрэчах Янка Купала чэрпаў для сябе пазнанне, чым жыве народ, якія ягоныя настроі і інтарэсы.

Гэта ж жаданне прыводзіла яго і ў месцы, дзе найбольш шырока раскрывалася ў той час народная душа. На рынак. У Кіславодску рынак быў вельмі шумны і разнастайны. Каго-каго толькі на тым рынку не было і чаго-чаго толькі не было на яго шматлікіх сталах, ды і на арбах і вазах.

*П.Броўка. Вы клікалі нас, маладых арлянят...*

***65.** Вызначце сэнсава-граматычныя адносіны паміж аднароднымі членамі з супастаўляльнымі злучнікамі (супраціўныя, неадпаведнасці).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Бабка спіць – а гусей пасе (Зм.Бядуля). 2. Экспанаты нікога не зацікавілі, а зніклі? (А.Асіпенка). 3. Ведаеш яго грахі, а тоіш (К.Чорны). 4. Адно гаворыць табе ў вочы, а другое ў думках мае (Якуб Колас). 5. Яна баіцца, а ўсё ж ідзе (Я.Брыль). 6. У мастацтве важна не колькасць, а якасць (ЛіМ). 7. З печы дым не ў комін, а пад столь нясе (Янка Купала). 8. Не агонь і меч выратуюць чалавецтва ад гібелі, а мір, супрацоўніцтва, узаемная павага інтарэсаў адзін аднаго (А.Глобус). 9. Гэтыя дзве акалічнасці цяпер не ўзаемавыключалі, а, наадварот, дапаўнялі адна адну (І.Чыгрынаў). 10. Невялікая, але бурная рэчка пеніцца між скал (Э.Самуйлёнак). 11. Я прыпамінаю пакоі, але пазнаю іх не адразу (П.Галавач). 12. У хаце было цесна, але затое весела (П.Броўка). 13. Пірог свежы, але нясмачны (Я.Маўр). 14. Яна слухае, але ўсё маўчыць (К.Чорны). 15. Гаспадар ужо ўстаў, але яшчэ не снедаў (М.Зарэцкі). 16. Гэта было не курлыканне, а працяжныя воклічы расстання (М.Капыловіч).

***66. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце сэнсава-граматычныя адносіны паміж аднароднымі членамі з пералічальна-размеркавальнымі злучнікамі (узаемнае выключэнне, пералічэнне аднолькава магчымых з'яў, пералічэнне аднолькава немагчымых з'яў, папераменнае чаргаванне з'яў, пералічэнне ўзаемна выключальных з'яў з адценнем меркавання або няпэўнасці).***

1. Школы Еўфрасінні Полацкай былі перадавымі для свайго часу і праграмай навучання і складам вучняў значная частка якіх набіралася з дзяцей простых гараджан (У.Арлоў). 2. Вера старалася нічым не пакрыўдзіць ці не раззлаваць старую (А.Кулакоўскі). 3. Слухачам падабаліся і словы песні і яе мелодыя (І.Шамякін). 4. Ад сустрэчы з роднымі мясцінамі ў душы абуджалася не то ціхая радасць не то смутная туга (А.Васілевіч). 5. Ні сцежак ні дарог не было відаць пад тоўстай коўдрай снегу (А.Савіцкі). 6. Ці то сініца ці якая другая птушка пераляцела цераз дарогу і звонка зацілікала (М.Лынькоў). 7. Хацелася ці гучна загаварыць ці заспяваць (Н.Маеўская). 8. Праз дзень або праз два трэба будзе вярнуцца дадому (А.Якімовіч). 9. З узгорка добра было відаць як на далоні і камбайны і поле (А.Жук). 10. На сотні вёрст ні жывой душы ні сяла ні заімкі – тайга і тайга (С.Грахоўскі). 11. То жывіцай то чабаровым настоем дыхае з кручы высозны бор (К.Кірэенка).

***67. Прааналізуйце спосабы выражэння аднародных членаў сказа, вызначце сродкі іх сувязі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа.***

1. Міф пра літоўскую заваёву тэрыторыі Беларусі быў створаны яшчэ ў 16 стагоддзі і звязаны з імкненнем вялікіх князёў маскоўскіх давесці іхнія правы на землі Украіны і Беларусі (А.Грыцкевіч). 2. Сад хоць і невялікі, але дагледжаны (А.Жук). 3. Сёння на душы ў Вікі было неяк асабліва ціха, спакойна, нават урачыста (А.Федарэнка). 4. Узгоркі то разбягаюцца, то выстройваюцца ў дзівосныя каскады (Я.Пархута). 5. Ён не такі хворы, як рабіць лянуецца (К.Чорны). 6. Дзяўчына закрыла вочы, прыпала тварам да красак, і вось, як жывыя, усталі перад ёй радзімыя палі і лугі, лясы і азёры, жаданым прывідам усплыло роднае палескае сяло і бацькава хата (У.Краўчанка). 7. Летам хлопчык хадзіў у ягады і грыбы ці гуляў з дзецьмі на вуліцы або купаўся з імі ў возеры (У.Краўчанка). 8. Стары быў не столькі здзіўлены, колькі расчараваны (М.Лынькоў). 9. Машына забуксавала – і стоп!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(І.Мележ). 10. Каля лесу б'е крынічка, срэбрам ззяе ды каменьчыкам на ўцеху воды гоніць (П.Панчанка). 11. Хацелася думаць пра дрэвы, кветкі і траву ды сонца, што так высвеціла надвячорак (Н.Маеўская). 12. Пайшлі перад намі хаты новыя ў сёлах, пераправы з чаўнамі, пераправы-паромы, ды сады ў белым цвеце, ды высокія стромы, ды рыбацкія сеці (К.Кірэенка). 13. Люблю беларускае Палессе, і казачна мяккую Наваградчыну, і адзіную ў свеце Белавежу, і суровую прыгажосць паўночнага азёрнага краю (У.Караткевіч).

***68. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Растлумачце ўмовы аднароднасці і неаднароднасці азначэнняў.***

1. Воддаль ад вуліцы стаяла новая хата з серабрыста пафарбаваным дахам сіняй ашалёўкай вялікай верандай і вясёлымі вокнамі (А.Жук). 2. Я зірнуў на пясчаную глухую вуліцу (В.Адамчык). 3. Дуб ціха шумеў перада мной яшчэ не скінутым леташнім лісцем (К.Кірэенка). 4. А над усім расло шырылася неба неагляднае бясконцае роднае (Т.Бондар). 5. Серабрыстыя высокія таполі цесна абступілі дарожку (П.Галавач). 6. Нямераная няходжаная тайга жыве шуміць стракоча і дыхае далёкім прыглушаным водгуллем (С.Грахоўскі). 7. Агонь выклікаў у яго дзіўную супакоенасць і нетаропкія без прывычнай мітуслівасці думкі (А.Асіпенка). 8. Хата была зроблена з тоўстых чыста пагабляваных бярвенняў (І.Шамякін). 9. У лесе буяла мноства злой калючай лясной крапівы (І.Мележ). 10. Хлынуў лівень шумны быстры (А.Бялевіч). 11. Думкі плылі ў даўнішняе далёкае і мілае дзяцінства паўгалоднае цяжкае але памятнае сваёй уражлівасцю пазнаннем свету і прыроды (А.Камароўскі). 12. Цераз паркан на абцяжараных галінах звісалі буйныя яшчэ зусім не даспелыя яблыкі (В.Быкаў). 13. Арэал арэха вадзянога плывучага скарачаецца, ён занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі (Г.Вынаеў).

***69. Выпішыце сказы з аднароднымі азначэннямі. Вызначце сінтаксічную функцыю аднародных членаў у астатніх сказах.***

1. Хата даволі прасторная, з нятоўстых круглякоў, пад новым гонтавым дахам (А.Жук). 2. Далячынь ружавела краямі цёмнага, захмаранага неба (П.Галавач). 3. Няхай вам добрым будзе гэта жніво, самым умалотным, самым багатым (А.Жук). 4. Павольныя, ціхія, нібы сарамлівыя гукі адажыо адразу ж прыносілі нейкі супакой, ціхамірнасць (Я.Сіпакоў). 5. Зямля вакол сухая, парэпаная, як спрацаваная далонь хлебароба, попельна-шэрая або блакітная (У.Караткевіч). 6. За акном вагона ціха калыхалася ноч, цёмная, без прасвету, без пробліску (М.Лынькоў). 7. Сцяжынка была вузкая, у адзін крок (А.Федарэнка). 8. Сонца прасвечвае праз мокрае пасля дажджу, бліскучае лісце бяроз (Я.Брыль). 9. Адвячорак выдаўся ціхі, мяккі, празрысты (Т.Хадкевіч). 10. Там-сям паважлівае стаўленне да валуноў і вера ў іх жыватворную, цудадзейную сілу захаваліся да нашых дзён (Э.Ляўкоў). 11. Лясная дарога была зусім ціхая, бязлюдная (К.Чорны). 12. Трава каля бяроз схілілася долу, стала цёмнай, пабурэлай (Т.Хадкевіч). 13. За многія стагоддзі вятры ператварылі бераг у адвесную, непрыступную сцяну (А.Марціновіч).

***70. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Вызначце сінтаксічную функцыю аднародных членаў у сказах.***

Около костра было тепло, светло и уютно, но там, дальше, куда не достигал освещенный круг, там ночь стала непроницаемо черной, и временами до нас доносилось ее холодное, сырое дыхание. Обступившие нас вокруг деревья слились в

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

одну сплошную, темную – темнее ночи – живую толпу, точно со всего леса сбежались сюда ночные тени и с любопытством глядели сверху, покачиваясь и перешептываясь. Иногда на мгновение выделялся из этого заколдованного круга голый прямой ствол сосны, внезапно облитый красноватым светом, но тотчас же пугливо прятался в густую толпу ночных призраков.

Я лег на спину и долго глядел на темное, спокойное, безоблачное небо, – до того долго, что минутами мне казалось, будто я гляжу в глубокую пропасть, и тогда у меня начинала слабо, но приятно кружиться голова. А в душу мою сходил какой-то томный, согревающий мир. Кто-то стирал с нее властной рукой всю горечь прошедших неудач, мелкую и озлобленную суету городских интересов, мучительный позор обиженного самолюбия, никогда не засыпающую заботу о насущном хлебе. И вся жизнь, со всеми ее мудреными задачами, вдруг ясно и просто сосредоточилась для меня на этом песчаном бугре около костра, в обществе этих трех человек, несложных, наивных и понятных, почти как сама природа.

*А.Куприн. Лесная глушь*

***71.*** ***Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа. Вызначце характар сэнсава-граматычных адносін паміж аднароднымі членамі з бяззлучнікавай сувяззю (сумеснасць, адначасовасць, паслядоўнасць, неадпаведнасць, супраціўныя адносіны).***

1. Васіль Аляксеевіч пастаяў, паглядзеў навокал, нібы шукаў каго вачыма, наставіў каўнер плашча, глыбей засунуў рукі ў кішэні (А.Жук). 2. З палявога гасцінца адкрывалася шырокая панарама з пралескамі, дубровамі, прытоенымі вёсачкамі ў лагчынах, цёмна-зялёнымі велічнымі дубамі на пагорках, разложыстымі дзікімі грушамі на межах (В.Адамчык). 3. Ціха каціла, перакочвала свае хвалі Дзвіна (Т.Бондар). 4. Усё будзе красавацца, абнаўляцца на свеце (Я.Пархута). 5. Не светлыя – змрочныя колеры запоўнілі наваколле (Б.Мікуліч). 6. Не ў будынку – на дварэ было больш цёпла і ўтульна (М.Зарэцкі). 7. Не рабочы пасёлак – сучасны горад раскінуўся на беразе шырокай ракі (І.Грамовіч). 8. Я слухаў музыку – наслухацца не мог (П.Панчанка). 9. Хацеў Арцём войкнуць ад болю – ледзь стрымаўся (Зм.Бядуля). 10. За ваколіцай, дзе канчаліся хаты, Ігар збочыў з дарогі, нагнуўшыся, зачэрпнуў снегу (А.Федарэнка). 11. Пад абрывам камяністым плыла, бурліла вольная рака (А.Пысін). 12. На лісце прыдарожных дрэў, на збажыну, на траву аселі першыя кроплі расы (А.Чарнышэвіч). 13. Мы працай багаты – не золатам (М.Лужанін). 14. Крылатая машына сарвалася з месца, памчала па полі, з гулам пайшла ўгару (Э.Самуйлёнак).

***72.*** ***Запішыце сказы, падкрэсліце аднародныя члены з абагульняльным словам у адпаведнасці з іх сінтаксічнай функцыяй у сказе. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.***

1. І ўсе іхнія патаемныя выхады ў лес, і чаканне, і радасць – усё засталося лёгка і проста там, за паласой халоднага дажджу (А.Жук). 2. Матчын агародчык запрашае, цягне да сябе, каб пачаставаць самымі смачнымі вясковымі ласункамі: морквай, агуркамі, бобам (М.Капыловіч). 3. Андрэйка выбраўся на шлях і пайшоў туды, дзе яго чакалі снеданне, абед і вячэра – усё адразу (Я.Сіпакоў). 4. Узнікала адчуванне, што яна гаспадыня ўсяго гэтага: і хаткі, і дабра ў ёй, і вакольнага лесу (А.Федарэнка). 5. Доўгі рад старых і высокіх дрэў: ліп, дубоў, явараў і вязаў – ішоў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ад паўстанка проста ў чыстае поле і там канчаўся (К.Чорны). 6. І гэтыя кветкі, і маладая светла-зялёная трава, і лёгкае паветра – усё было ўрачыста-святочным, усё ўсміхалася ласкавым промням вясновай раніцы (М.Паслядовіч). 7. Усё тут, у гэтай мясціне, дыша ўспамінамі аб паэце: хата, сяло, навакольныя пушчы (У.Караткевіч). 8. Па краях насыпу смяюцца кветкі: легкадумныя званочкі, сіні, як неба, васілёк, палявая "грэчка", ліпкія смолкі (У.Караткевіч). 9. Усё, што бачыў Слышэня над сабой: і светлыя аблачынкі, і глыбокі, нібы крыштальны, блакіт неба, і ўгрэтыя сонцам кучы пяску над ровам, і леташнюю счарнелую былінку палыну, і вясёлы струменьчык вады, – усё гэта стала яшчэ больш прыгожае, яшчэ больш захапляючае, як было раней (М.Лынькоў). 10. Усё: і маўклівыя, прыбраныя ўзгоркі, і пыл, што за цэлы дзень назбіраўся ў паветры, а цяпер асядаў на зямлю, і сырасць, што пацягнула ад прырэчнага алешніку, – было ўжо вераснёвым, асеннім (І.Грамовіч). 11. У пушчы ўстаноўлены найстражэйшы нагляд за пасадкамі і спелымі лясамі, за гнёздамі, норамі, вадаёмамі – за ўсім, што складае стракаты калейдаскоп яе жыцця (У.Караткевіч). 12. Людзі варты шчасця, дзе б яны ні жылі: на Ацэ, у Прыдняпроўі, па берагах сініх латышскіх азёраў або ў наваколлі Відрыджы (У.Караткевіч). 13. І даражэй нам, як ніколі, усё, што мы запрацавалі: і колас, вырашчаны ў полі, і дом, які мы збудавалі (А.Русак). 14. Дажджу прасіла ўсё пад небам: густое голле вішняку, бары, патрэсканая глеба і абмялелая рака (А.Вялюгін).

***73. Перакладзіце сказы на беларускую мову. Пераклад запішыце, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку.***

1. Все вокруг хаты подсолнухи акации и сухая трава было покрыто шершавой пылью (К.Паустовский). 2. К озеру лучше всего выйти в поздние сумерки, когда всё вокруг слабый блеск воды и первых звезд сияние гаснущего неба неподвижные вершины деревьев все это так прочно сливается с настороженной тишиной, что кажется рожденным ею (К.Паустовский). 3. Стога сена дерево, растущее поодаль, перелесок шалаш старика все виднелось особенно выпукло, ярко (В.Солоухин). 4. Повсюду в кустах в траве запели зачирикали птицы (А.Толстой). 5. По опушкам лесов еще растут грибы красноголовые подосиновики и зеленоватые и розовые сыроежки скользкие грузди и душистые рыжики (И. Соколов-Микитов). 6. Он был мастер на все руки слесарь столяр плотник и даже механик (В.Короленко). 7. Я как-будто вижу перед собой эту картину тихие берега лунную дорогу прямо от меня к баржам понтонного моста и на мосту длинные тени людей (В.Каверин). 8. Ничего не заметно было оживляющего картину ни отворяющихся дверей ни выходивших откуда-нибудь людей никаких живых хлопот и забот дома (Н.Гоголь). 9. Для всего что существует в природе воды воздуха неба облаков солнца дождей лесов болот рек и озер лугов и полей цветов и трав в русском языке есть великое множество хороших слов и названий (К.Паустовский). 10. Ничего не видно ни массива ни скал ни лесов (А.Серафимович). 11. Все пахло кусты акации листья сирени лопухи цветы трава земля (И.Бунин). 12. В траве в кустах кизила и дикого шиповника в виноградниках и на деревьях повсюду заливались цикады (А.Куприн).

## АДАСОБЛЕНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА

**74. Знайдзіце адасобленыя члены, растлумачце пастаноўку знакаў**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**прыпынку пры іх і ўмовы адасаблення (камунікатыўныя, граматычныя, семантычныя).**

1. Сыпнуўшы косы залатыя, блакіт на дне тваім заснуў, калыша ў сэрцы далі тыя – загонаў плужную вясну (П.Пястрак). 2. Палае восені пажар – адны над рэчкай лозы, адчуўшы раптам нейкі жар, льюць сіратліва слёзы (М.Калачынскі). 3. Дождж асыпаў зямлю; асмяглая ад спёкі, яна глытала свежае пітво і дыхала, багатая, з палёгкай духмянасцю, пяшчотай і цяплом (К.Кірэенка). 4. Хмары ўсё накіпалі, чорныя, нізкія, дажджавыя; над раўнінаю цягнуўся прыцемак, такі непрытульны і халодны, што станавілася страшна (У.Караткевіч). 5. Кавалішын Толя, старэйшы брат Марыі і Наталлі, выйшаў трохі пазней, не заўважыў мяне, стаў каля брамы (Я.Брыль). 6. Пасярод вёскі, ля Івана на гародах, былі чуваць стрэлы (І.Пташнікаў). 7. З другога боку вёскі, на поўнач, балоты крыху адступалі, дорачы людзям пясчанае поле (І.Мележ). 8. Усе вяскоўцы, акрамя старасты, пісаць не ўмелі (Якуб Колас). 9. Сказаўшы ўсё, хлопец пайшоў, пакінуўшы ў душы Казімера след новых думак аб усім (К.Чорны). 10. У дзіцячым пакойчыку паставілі яшчэ адну калыску, наспех збітую дваравым сталяром і надта невыгодную побач з прыгожанькай люлечкай паніча (М.Гарэцкі). 11. Вера кідае яму адвітальную ўсмешку і, задаволеная, выбягае з аптэкі (М.Зарэцкі). 12. Над вяршаллем хвой угары лёгка слізгаў вышчарблены маладзічок месяца, аздабляючы змрочнае, без зор, неба (В.Быкаў).

**75. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце адасобленыя дапасаваныя азначэнні. Вызначце, якімі часцінамі мовы яны выражаны. Растлумачце ўмовы іх адасаблення.**

1. Парахневіч павярнуў калону на бакавую дарогу абсаджаную вербамі (В.Быкаў). 2. Сотнікаў выйшаў з кустоў і па-над ніўкай аўса нікім не заўважаны падышоў да жанчыны, калі яна выбірала бульбу (В.Быкаў). 3. З паўночнага боку Далёкая Ляда межавала з разлеглым балотам зарослым лазой (І.Навуменка). 4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Невясёлы адзінокі як мала хто ў свеце няшчасны пайшоў ён [Валодзька] дамоў, пайшоў цераз бульбоўнік, цераз агароды, толькі б нікога не сустракаць, нікога не бачыць (І.Мележ). 5. Калі Наста ўбачыла здалёку Міронаву хату высокую, светлую і старыя дубы, што раслі насупраць, на душы жанчыны зрабілася лёгка (І.Пташнікаў). 6. Над стрэхамі старых хатак заваленых снегам віліся дымы (Я.Брыль). 7. Я стаяў ля аднаго старажытнага партрэта зачараваны той дзіўнай незразумелай усмешкаю, якую так непераймальна рабілі часам нашы старыя мастакі (У.Караткевіч). 8. Ты ўсё, ты ўсіх, мой брат, успамінаеш: і словы маці сказаныя з ласкай, і даўні дзень, што быў дзівоснай казкай (К.Кірэенка). 9. Зямля знаёмая такая плыве пад самы небакрай скуль сонца выйшла – хоць рукамі бяры, як цёплы каравай (М.Калачынскі). 10. Знямелы здзіўлены трывожны стаю заслуханы ў цябе – квяцісты луг, куток твой кожны жальбой расстання ў грудзі б’е (П.Пястрак). 11. Навокал на многіх дзесяцінах шумеў і хваляваўся пад асеннім дажджом парк закінуты глухі чорны ад старасці і вільгаці (У.Караткевіч). 12. Маці маўклівая і паслухмяная пайшла ўслед за Васілём (І.Мележ). 13. У абедзвюх будках размешчаных ля пераезда жылі надзіва цікавыя людзі (І.Навуменка).

**76. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Ахарактарызуйце структуру адасобленых дапасаваных азначэнняў.**

1. Іван, які ведае ўсе хады-выхады, знік у дзвярах каменнага падобнага на барак будынка (І.Навуменка). 2. Васіль адчуваў, што ззаду стаіць маці, назірае ўслед маўклівая гордая, і ад гэтага ў руках і нагах сілы нібы пабольшала (І.Мележ). 3. Тут бачны былі свежыя сляды нашага вазка, і агароджа чыгунная вітая была павалена, разбіта на кавалкі і адцягнута ў бакі (У.Караткевіч). 4. Ён шукае вобмацкам лісцё медзяное звонкае тугое, каб хутчэй падкінуць у касцёр, што застаўся ў лузе пасля бою (К.Кірэенка). 5. Хлопчыкі румяныя з марозу ўбеглі ў хату і пачалі збірацца: Косцік у лес, а Шурка ў школу (Я.Брыль). 6. Вочы яго блакітныя, як у дзіцяці, назіралі ўдумліва і маўкліва (І.Пташнікаў). 7. Доўга не спалася Васілю ў гэту ноч такую звычайную і незвычайную (І.Мележ). 8. Блішчынскі і Цімошкін чакалі ў лесе раніцы запарушаныя снегам акалелыя з трывогай і напружаным чаканнем у сэрцах (В.Быкаў). 9. Хутка ў Сівец вярнулася яго сястра прыгожая маладая растаропная – яна і была падтрымкай брату ў той нялёгкі час (М.Гарэцкі). 10. Цівунчык паспешны і рухавы патрымаўся за казырок летняе шапкі пакланіўшыся Казімеру і пайшоў, паспеўшы кінуць некалькі слоў (К.Чорны). 11. Доўга стаялі тут сяляне з сваёй крыўдаю адзінокія закінутыя, і нідзе іх вока не знаходзіла апоры і падмогі супраць гэтай кроўнай несправядлівасці (Якуб Колас). 12. І нечакана пасля вечара на лузе адкрылася ўсё, і, убачыўшы, адчуўшы такое, збянтэжаны уражаны стаў Васіль як сам не свой (І.Мележ).

**77. Растлумачце, чаму ў адных выпадках азначэнні адасабляюцца, а ў другіх – не.**

1. Перада мной быў прыгожы пакой з падлогай з дубовых цаглін – зараз даволі пашарпаных, неабсяжна высокія сцены, ашаляваныя чорнымі ад старасці бліскучымі дошкамі, разьбованымі па краях, вокны амаль пад столлю, маленькія, у глыбокіх стрельчатых нішах (У.Караткевіч). 2. За дзвярыма ў глыбіні вестыбюля – уваходныя дзверы, масіўныя, дубовыя, акутыя пацямнелымі бронзавымі левікамі, з квадратнымі галоўкамі (У.Караткевіч). 3. Мы доўга ішлі па загароджаных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГПУ

велізарнымі дамамі вуліцах сярод фабрычных комінаў і каля высачэннага плота (М.Гарэцкі). 4. У знаёмым акне гарыць прыветны агеньчык. Сымон Карызна парыўна спыняецца перад ім і з хвіліну стаіць, жыва ўяўляючы прытульны куточак, сагрэты ціхім, недасяжна-чыстым хараством Веры Засуліч (М.Зарэцкі). 5. Захопленая думкамі-трывогамі, узрушаная невядомасцю, Ганна ўсё стаяла на агародзе, апусціўшы рукі з закасанымі рукавамі, не выпускаючы бурака (І.Мележ). 6. Неба і зямля патанулі ў густым цёплым вячэрнім змроку і маўчалі (Якуб Колас). 7. У дамах, пакрытых чарапіцай, спяць землякоў маіх сыны; што цяпер вам, немаўляты, сніцца, якія сны? (П.Пестрак). 8. Васіль часта ўспамінае станцыю – драўляны, крыты шыферам будынак, у якім размяшчаецца пакой дзяжурнага, тэлеграф, білетная каса (І.Навуменка). 9. Добры ціхі бацька таксама, здаецца, супакойваў яе сваёй стомленай, як бы непадуладнай ніякаму смутку постаццю (І.Мележ). 10. Прыгожых сноў, лятункаў залатых і парыванняў шчырых і нясмелых мне не вярнуць назад – жніво маё даспела (К.Кірэенка). 11. Цімошкін успамінае сціплых цудоўных сваіх землякоў, з якімі праваяваў ён два доўгія партызанскія гады (В.Быкаў). 12. Цёмная мокрая ноч паволі ахутвала зямлю, суседнія вёскі і ўвесь белы свет (Я.Брыль).

**78. Перабудуйце сказы так, каб неадасобленыя выдзеленыя азначэнні сталі адасобленымі. Запішыце перабудаваныя сказы. Растлумачце ўмовы адасаблення азначэнняў.**

1. У лесе было ціха, толькі ўгары стаяў ***глухі*** і ***маркотны*** шум старых хвой і асін (Якуб Колас). 2. З неба імжыць ***дакучлівы, халодны*** дождж (Я.Брыль). 3. На небе спакваля праяснела, хмары спаўзлі з небасхілу, пакінуўшы за сабой рэдкую бялявую смугу, якая абвалакла ***нізкае сцюдзёнае*** сонца (В.Быкаў). 4. ***Абуджаныя словамі песні*** сум, крыўда зноў ажылі, падступіліся горкай хваляй (І.Мележ). 5. Уявіце сабе ***высокага, вельмі добра складзенага, апранутага па апошняй модзе*** маладога чалавека – так выглядаў Андрэй Свеціловіч (У.Караткевіч). 6. Скончыўся святочны дзень; заціхла вясёлая і гаманкая ўдзень пасялковая вуліца, і ўсё было пад уладай ***цёплай*** і ***ласкавай*** жніўеньскай ночы (М.Гарэцкі). 7. Дзіва дзіўнае, як маглі пасябраваць (ды і моцна пасябраваць!) гэтыя дзве жанчыны, такія розныя, далёкія адна ад аднае: ***глуха замкнёная, гордая ў сваім няшчасці*** Марына Паўлаўна, якую балюча ўражвала нават найменшая праява чужой спагады, і ***адкрытая, простая, вясёлая*** Таццяна (М.Зарэцкі). 8.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Распаранае за дзень сонца паўзло на захад – і спакваля апускаўся на зямлю ***празрысты*** і ***звонкі*** ліпеньскі вечар (І.Пташнікаў). 9. Канчалася ноч – і ***затуманены***, ***заклапочаны*** і ***клапатлівы*** дзень паступова агортваў сыры і халодны горад (К.Чорны). 10. І маўчалі коннікі, а гукі палявання даляталі аднекуль з другога боку, і перад усімі скакаў ***асветлены месяцам***, ***туманны*** і ***вялізны*** кароль Стах (У.Караткевіч).

**79. Перабудуйце сказы так, каб адасобленыя выдзеленыя азначэнні сталі неадасобленымі. Запішыце перабудаваныя сказы. Вызначце, якімі часцінамі мовы выражаны азначэнні.**

1. У акопчыках, ***выграбеных на скорую руку***, збіраецца вада, і пры кожным руху кроплі яе ляцяць у розныя бакі (Я.Брыль). 2. Царква поўна народу. Плашчаніца, ***абстаўленая маладымі елачкамі і залітая бляскам свечак***, стаіць пасярод царквы (Якуб Колас). 3. Трэба было правесці манеўры, ***не прадугледжаныя ні камандзірам палка, ні статутам***, і яшчэ да пачатку бою пераправіць роту на той бераг (В.Быкаў). 4. Недалёка за паваротам завіднеўся папоўскі дом, за якім трохі ўбаку за хатамі, ускрай поля, забялела сценамі, зазелянела купаламі і паддашкамі царква, ***акружаная частаколам і бярозамі*** (І.Мележ). 5. Вялізныя змрочныя залы з траскучым паркетам, змрок па кутах, пах пылу і холад, такі холад, што стыне сэрца, холад, ***настоены стагоддзямі***, холад адзінага замка, ***вялізнага*** і ***збяднелага***, амаль вымерлага за апошнія гады роду (У.Караткевіч). 6. У пакоі каля сцяны стаяў стол – ***вялікі, доўгі, увесь закладзены кніжкамі, нотамі і рознымі паперамі*** (М.Гарэцкі). 7. Марыя ўпершыню ад невядома якога часу зірнула проста яму ў твар, і ў яе вачах, ***блакітных, асветленых раптоўным ажыўленнем***, Карызна ўбачыў радасць – ***маладую,***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

***ясную, падобную на маладую вясну*** (М.Зарэцкі). 8. На загоне можна было пазнаць старое поле ржышча, сівое і пачарнелае, яно ляжала на цвёрдай зямлі, ***аціхлай і спакойнай*** (І.Пташнікаў). 9. Цяжка і панура прыпыніўся поезд – і на пероне Казімер убачыў людскія спатканні – ***радасныя, сумныя, вясёлыя, нудныя*** (К.Чорны). 10. Прыблізна на сярэдзіне танца я заўважыў, што твар яе, ***засяроджаны і няпэўны***, стаў раптам простым і вельмі мілым (У.Караткевіч).

**80. Запішыце тэкст, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце азначэнні (адасобленыя і неадасобленыя). Растлумачце ўмовы адасаблення названых членаў сказа.**

За лагчынаю ляжалі пусткі роўна асветленыя ўсё тым жа самым няпэўным святлом, а за імі – дарога. Калі павярнуцца назад, то далёка ў правым баку мігцеў апошні агеньчык у хаце Дубатоўка мірны і ружовы, а ў левым баку таксама далёка за кустамі віднеліся верхавіны Яноўскай пушчы разложыстыя і агромністыя.

Я стаяў і слухаў. Нейкае пачуццё неспакойнае і незразумелае падказвала мне: коннікі недзе тут. Я ж не мог паверыць у прадчуванні: павінна была быць нейкая рэальная прычына для гэтага душэўнага стану. Я не мог нічога бачыць: туман лёгкі белы ўкрываў раўніну патануўшую ў начным змроку восеньскай ночы. Я вырашыў чакаць.

Хутка з боку пушчы па кустах паказалася нейкая цёмная маса даволі вялікая і рухавая. Пасля я пачуў пошчак капыт дробны і роўны. Коннікі імчаліся бязгучна, быццам плылі ў паветры, рабіліся ўсё бліжэй і бліжэй. Яшчэ хвіліна – і я ўражаны застыў у нямым здзіўленні. У хвалях туману слабога празрыстага ўжо ясна вымалёўваліся сілуэты коннікаў, якія імчалі шалёным намётам, аж конскія грывы веялі ў паветры. Іх было дваццаць. Дваццаць першы апрануты ў старажытную царскую велеісу скакаў наперадзе.

Цені коннікаў цьмяныя пад месячным святлом беглі ад дарогі наўкос да дрыгвяной лагчыны. Веялі на ветры плашчы-велеісы, коннікі прама сядзелі ў сядле, і ніводны гук не далятаў адтуль. Дзікі верас спяваў пад іхнімі нагамі. Бязгучна скакала па версе дзікае паляванне караля Стаха, імчалі постаці шэрыя туманныя нахіленыя наперад.

*У.Караткевіч. Дзікае паляванне караля Стаха*

**81. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Запішыце пераклад. Параўнайце ўжыванне формаў дзеепрыметнікаў у беларускай і рускай мовах. Знайдзіце ў перакладзе адасобленыя дапасаваныя азначэнні, вызначце спосаб іх**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

**выражэння, структуру і ўмовы адасаблення.**

В назначенный час, чистый, красиво одетый, князь вышел в столовую, где ожидала его невестка, княжна Марья, Бурье и архитектор князя, по странной прихоти его допускаемый в семью. Князь, твёрдо державшийся в жизни различия состояний, вдруг на архитекторе Михайле Ивановиче, стоявшем в углу, доказывал, что все люди равны, и не раз внушал своей дочери, что Михайла Иванович ничем не хуже нас с тобой.

В столовой, громадно-высокой, как все комнаты в доме, ожидали выхода князя домашние и официанты, стоявшие за каждым стулом. Дворецкий, с салфеткой на руке, оглядывал сервировку. Князь Андрей глядел на золотую раму с изображением генеалогического дерева князей Болконских, огромную, новую для него, висевшую напротив портрета князя в короне, который должен происходить от Рюрика и быть родоначальником рода Болконских. Князь Андрей, покачивающий головой и улыбающийся, смотрел на это генеалогическое дерево. Княжна Марья с удивлением смотрела на брата и не понимала, чему он улыбается. Всё, сделанное её отцом, возбуждало в ней благоговение, не подлежащее обсуждению.

В это мгновенье большие часы пробили два, тонким голоском отозвались в гостиной другие – и все увидели князя, спускавшегося в столовую к обеду.

*Л.Н.Толстой. Война и мир*

82. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце прыдаткі. Ахарактарызуйце спосаб іх выражэння (назоўнік або словазлучэнне з назоўнікам).

1. Які ён шустры сонечны прамень – ніяк у рукі не даецца ўзяць: таго не знае ён, што любая мая прасіла ёй каралі нанізаць (К.Кірэенка). 2. Казімер устрывожыўся, прачытаўшы нечаканую вестку ад Мані стрыечнай сястры (К.Чорны). 3. На плячах Надзеі Яноўскай быў тонкі рубок з белага табіну; валасы былі ўзяты ў сетку і ўпрыгожаны шлягавым вянком старажытным жаночым уборам (У.Караткевіч). 4. Пятрусь Грыб адзін з багамолаў мястэчка Дварок дачуўся, што лес ягоны сякуць напавал (Я.Брыль). 5. Васіль знарок не паглядзеў на Ганну, але і не пазіраючы ён адчуваў сябе ў поўнай меры шчаслівым: вось ён як “абступіў” яе задзіру (І.Мележ). 6. Праз чвэрць гадзіны наперадзе, мусіць, у лагчынцы, зашарэла нейкае кустоўе лаза ці які хмызняк па-над рачулкай (В.Быкаў). 7. Два браты старэйшыя Тарасавы сыны выбралі самы ўтульны куток у хаце і пачалі весці гутарку, чакаючы каляд (Якуб Колас). 8. На двары нікога не было відаць – ні дзяцей, ні ўласаўцаў, і яна падумала, што дзеці Іра і Валодзя недзе ў хаце (І.Пташнікаў). 9. За некалькі дзён новыя знаёмыя былі ў яго з некалькімі дактарамі, што працавалі тут: гэта былі маленькія з’явы вялікага руху, на шырыні якога ўжо з’явіўся ён Казімер Ірмалевіч (К.Чорны). 10. Дэмабілізаваўшыся з арміі, Васіль вярнуўся дадому: хатай, дваром валодаў Стражнік іхні далёкі родзіч (І.Навуменка).

**83. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Падкрэсліце прыдаткі, вызначце, якімі часцінамі мовы яны выражаны.**

Когда Константин Демидович, выучив наконец этюд, спустился из своей чистой и весёлой комнаты в гостиную, он уже застал всё домашнее общество собранным. Приём уже начался. На широком диване, держа в руках новую французскую брошюру, расположилась хозяйка – молодая приятная дама; у окна за

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пяльцами сидела девушка – дочь Марьи Михайловны и гувернантка – женщина лет шестидесяти; в углу, возле двери, поместился Батистов – помещик соседней деревни – и читал газету; подле него играли в шашки Петя и Ваня – родственники Батистова, курсанты кадетского корпуса; а прислонясь к печке и заложив руки за спину, стоял господин небольшого роста, седой, со смуглым лицом и чёрными глазами – некто Афанасий Семёнович Пигасов.

*И.С.Тургенев. Дворянское гнездо.*

**84. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Знайдзіце і падкрэсліце недапасаваныя адасобленыя азначэнні. Прааналізуйце спосаб іх выражэння.**

1. Сцяпан збегаў дамоў і пераапрануўся: у рабочых штанах старой сарочцы вялікіх чаравіках ён быў падобны на сапраўднага будаўніка (І.Навуменка). 2. Праз якую гадзіну пачалі і на гэтай раўніне трапляцца астраўкі лесу чорнага ў мхах і павуцінні толькі часам роўнага а больш за ўсё скарлючанага як на малюнках да страшнай казкі (У.Караткевіч). 3. Дарогу, па якой Мікола ішоў узлескам, перасякала другая ад вёсачкі за Нёманам у лес (Я.Брыль). 4. За домам – зямля пусты без кветак і расліннасці пануры агарод (К.Чорны). 5. Ганна хвіліну стаяла так выпрастаная нерухомая у выцвілым зрэб'і з падаткнутым фартухом з хустачкай – чакала, калі перастане балець, памякчэе здранцвелая спіна (І.Мележ). 6. Калі ўласавец у пілотцы астаўся ў хаце адзін, Наста агледзела, што ў руцэ ў яго белыя пальчаткі тонкія з воўны (І.Пташнікаў). 7. Цімошкін ішоў па іхніх слядах ужо прысыпаных снегавой пацярухай у замёрзлых камках гразі ледзь відных у зімовых прыцемках і думаў: хоць бы не спатыкнуцца, не пакаўзнуцца, бо тады наўрад ці знайшоў бы ў сабе сілы ўстаць (В.Быкаў). 8. Шэра і аднастайна было наўкола – ані жывой душы, прыдарожныя бярозы снежныя ў мутна-бялёсым месячным святле безуважна нудзіліся ў сваім сярэбраным прыбранні (М.Гарэцкі). 9. Марыя Паўлаўна хутка амаль спалохана зірнула на Веру, убачыла яе глыбокія з іскрынкай непаўторна-чыстыя вочы і страсянулася ўся ў злосным абурэнні (М.Зарэцкі).

**85. Запішыце сказы. Падкрэсліце ў іх адасобленыя недапасаваныя азначэнні і вызначце ўмовы іх адасаблення (адносяцца да асабовых займеннікаў; знаходзяцца ў адным радзе з дапасаванымі азначэннямі; падкрэслены з асаблівай сілай; выражаны інфінітывам).**

1. Дом выглядаў так змрочна і холадна, што сэрца сціснула: двухпавярховы, з вялікім бельведэрам і невялікімі вежкамі па краях, стары, пануры ад восеньскай вільгаці, ён вызначаўся той адсутнасцю архітэктуры, якая была тыповай для беларускіх пабудоў тых часоў (У.Караткевіч). 2. Вянок, вэлюм. Убачыўшы іх, Чарнушка, як ніколі яшчэ, пачуў бяду. Ён здалося, убачыў гэтую бяду – у вянку, у вэлюме (І.Мележ). 3. Вочы яе, прамяністыя, ціхія, з іскрынкай, заблішчалі раптам (У.Караткевіч). 4. Ноч была светлая, ціхая, цёплая. Яна, уся ў зорках, у месячным святле, плыла над супакоенай зямлёю, над заснуўшымі вёскамі (Якуб Колас). 5. Вазы – з ільном, з цэбрамі, з дошкамі, са збожжам – стаялі каля праезду ў чаканні невядомага (Якуб Колас). 6. Усю дарогу іх суправаджалі музыкі – у лапцях, зрэбных сарочках, з гармонікамі ў руках (І.Мележ). 7. Усіх непакоіла толькі адна думка – выстаяць у гэтай нялёгкай барацьбе супраць фашыстаў (В.Быкаў). 8. Дзяўчынка,

Репозиторий БГПУ

прыгожая, з яснаю ўсмешкаю, з цёмнымі вачыма, не магла не падабацца (М.Зарэцкі).

**86. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Знайдзіце ў перакладзе адасобленыя недапасаваныя азначэнні і ўкажыце, якімі часцінамі мовы яны выражаны.**

Тёплое, ласковое, в золотых искрах, южное солнце склонилось к западу. Вечерний береговой ветер доносил до самого корабля ароматы апельсиновых деревьев, магнолий и душистых горных трав.

Пассажиры вышли на верхнюю, длинною в пять дюймов, палубу пассажирского корабля и любовались величественной картиной.

Перед ними дремали в лучах горячего солнца берега великой Атлантиды.

У самого берега возвышался знаменитый Посейдонский Маяк – одно из мировых чудес. Он имел форму конуса, вершина которого – усечённая, площадью 100 квадратных метров, казалось, упиралась в небесный свод. Маяк был сложен из громадных, в рост человека, каменных кубов красного, чёрного и белого цвета, расположенных красивым узором. Вокруг Маяка спиралью вилась широкая, в пять колесниц, дорога, по которой доставлялось всё необходимое.

Маяк стоял у гавани, окружённый садами, среди которых были разбросаны дома кубической формы из камней белого, чёрного и красного цвета.

На склонах горы, как расплавленное золото, сверкали под солнцем золотые, из прозрачных лучей, здания Посейдониса – столицы мира и Атлантиды. Ещё выше, как сторожевой дозор, высился полукруг таких же, до неба, гор со снежными вершинами.

*А. Беляев. Атлантида*

**87. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце адасобленыя акалічнасці і ахарактарызуйце спосаб іх выражэння.**

1. Углядаючыся праз голы затуманены прыцемкамі хмызняк Рыбак усё больш пазнаваў гэтую пуцявіну, якую ён памятаў яшчэ з восені, калі пад нагамі плюхалі лужыны, а ў лесе густа церушыў лістапад, і восеньскі вецер імжыў наўкола нудным сцюдзёным дажджом (В.Быкаў). 2. Вярнуўшыся з арміі ў галаднаваты пасляваенны год Васіль прыязджаў у саўгас купляць бульбу (І.Навуменка). 3. Алёша, мусіць, успомніўшы дзе ён, схапіўся дзвюма рукамі за лейцы (І.Пташнікаў). 4. Берман стаяў схіліўшы лялечную галаву шырока раскрыўшы шэрыя вялізныя вочы і прыўзняўшы галаву (У.Караткевіч). 5. Асыпаўшы зямлю спорным дажджом ідзе вясна рана-рана у цёмныя досвіткі (М.Гарэцкі). 6. Марына Паўлаўна стаяла ўкленчыўшы на канапе перад акном роўна нерухома як на шчырым маленні і ўзіралася ў сіні вечаровы змрок (М.Зарэцкі). 7. Яшчэ свой чорны парасон трымала цемра над зямлёй, а мы падняўшы батальён ішлі ў бой (М.Калачынскі). 8. Ноч снежная ў акно загадкай лезла, па хаце палыхаў ледзь бляск лучыны, а ты тужлівая сядзела за кудзеляй нахмурыўшы над бровамі маршчыны (П.Пестрак). 9. Калі Ганна пераадзеўшыся ў каморцы выйшла ў чырвонай сацінавай кофце, што пералівалася агнём на яе плячах на грудзях у белым фартуху у высока зашнураваных хромавых чаравіках у якіх хадзіла нябожчыца-маці, калі Чарнушка ўбачыў яе прыбраную стройную дужую чарнабровую красуню, мужны твар яго мімаволі асвяціўся захапленнем (І.Мележ).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**88. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Знайдзіце адасобленыя акалічнасці, укажыце іх значэнне (спосабу дзеяння, часу, месца, прычыны, мэты, умовы, уступкі).**

1. Я быў у зношаным палатаным шынелі, а ногі мокрыя сагрэла цеплыня, і абапершыся вінтоўкай на каменне я ціха думкаю ў даль жыцця лунаў (П.Пестрак). 2. Хадоська перабраўшыся цераз падмерзлую грэблю, за якой блізка чарнелі алешніцкія хаты, пайшла не сялом, а па ўзбалотку, сцежкай (І.Мележ). 3. Дубатоўк выцягнуў з кішэні вялізную срэбную з сіняй эмаллю цыбуліну гадзінніка і зрабіўшыся афіцыйным і падцягнутым сказаў: “Сем гадзін. Пара пачынаць!” (У.Караткевіч). 4. Сотнікаў і Рыбак ішлі моўчкі цераз прыгуменне ўздоўж плота і выйшлі на касагорыну ля хмызняку (В.Быкаў). 5. Вада перапоўніўшы малое рэчышча хлынула на палі поячы зямлю веснавой вільгаццю (К.Чорны). 6. На прыпынку чакаючы аўтобуса стаялі дарослыя і дзеці (В.Быкаў). 7. Не зважаючы на дрэннае восеньскае надвор’е Надзея ўсё ж вырашыла прагуляцца па парку (У.Караткевіч). 8. Узяўшы з сабою карту мясцовасці можна смела выпраўляцца ў цікавае падарожжа (Я.Маўр). 9. Цімошкін замахаў шапкай з-за стога патрабуючы ад салдатаў вярнуцца назад (В.Быкаў). 10. Восень апусціўшыся на зямлю апранула дрэвы ў залатыя світы (П.Пястрак). 11. Не дачакаўшыся канца сходу дзед Дзяніс пайшоў дахаты (І.Мележ). 12. Выплыў з-за лесу месяц і асвятляючы зямлю вісеў ля цёмнай хмары (І.Пташнікаў).

**89. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Прааналізуйце, якімі канструкцыямі беларускай мовы перакладаюцца адасобленыя акалічнасці рускай мовы.**

Равнина темнела, зажигаясь в деревьях, светились огоньки. По дороге между овсами проскакал, поднимая пыль, на ночное запоздавший паренёк. Последний отблеск зари блестел на тучах, догорая. День закончился, надвигалась, наполняя землю, тёплая и тёмная облачная ночь.

Сергей Андреевич стоял, оглядывая даль; он чувствовал, как дорога и близка ему эта окружающая его бледная, тихая жизнь, сколько удовлетворения испытывал он, отдавая на служение ей свои силы. И он думал о Киселёве, думал о сотнях рассеянных по широкой русской земле безвестных людях, делающих в глуши своё трудное, полезное и невидное дело.

Через всю свою жизнь, полную ударов и разочарований, он пронёс нетронутым одно – горячую любовь к народу и его душе, облагороженной и просветленной великой властью земли.

*В.В. Вересаев. Без дороги*

**90. Запішыце тэкст, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце адасобленыя акалічнасці, вызначце спосаб іх выражэння і значэнне.**

Калі яна схавалася за вуглом хлеўчука ён марудна губляючы рэштку адабраных бяссонем сіл пратупаў да вуліцы агледзеўся. Нікога быццам паблізу нідзе не было. Тады трохі счакаўшы вярнуўся на кухню і ўсеўся на скрыпучае крэсла каля стала. Ягоны позірк слізгануў па карціне на сцяне насупраць якую любіла Марыя спыніўся на вымытым ею і прыбраным посудзе акрай стала і яму зрабілася невыносна горка. Ён сядзеў так доўга невідушчым позіркам тупа ўставіўшыся ў чыста памытую Марыяй падлогу слухаў. Час адмерваў свае хвіліны – апошнія яго

хвіліны спакою ў гэтым доме ў якіх было чаканне і надзея. Аднак чаканне яго стала непамерна расцягвацца запаўняючы сабою свядомасць паралізуючы волю і па меры яго разрастання меншала вузела надзея. Мабыць мінула ўжо абяцаная Марыяй гадзіна затым скончылася і другая. Аднекуль з-пад стала вылез ягоны Гультай выйшаў на сярэдзіну кухні пацягнуўся і сеў выпрабавальна пазіраючы на Агеева. Што ён хацеў сказаць гэты стары і мудры кот? І што ён разумеў з таго што рабілася на душы ў Агеева? Яшчэ праз гадзіну ён пачаў ужо думаць што зрабіў недаравальную памылку адправіўшы Марыю што ён проста не меў права на тое ні боскага ні чалавечага што трэба было пачакаць або ісці самому. Але калі справа зроблена і дапушчаную памылку ўжо не паправіць застаецца адно – прымаць на сябе заўжды суровы і не заўжды справядлівы ўдар лёсу.

***В.Быкаў. Кар'ер***

*91. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце адасобленыя дапаўненні. Вызначце, якімі часцінамі мовы яны выражаны.*

1. Васіль нікога не ўбачыў акрамя сястры Аляксандры, і ўсё ж ён крыху хваляваўся (І.Навуменка). 2. Хутка Аля даведалася, што Ігналік паехаў вучыцца, але не ад яго самога а ад маці (М.Гарэцкі). 3. У гэты момант ён, здавалася, мог напужацца любога шолаху толькі не голасу Марыі Іванаўны (М.Зарэцкі). 4. Вера стаяла на ўзмежку: яна трымала ў руках апроч каша з яблыкамі пусты мех (І.Пташнікаў). 5. Замест адказу хлопец пачуў ціхі плач (К.Чорны). 6. Цімошкін высунуўся з-за стога і замест Івана ўбачыў немца, які хутка ішоў да іх (В.Быкаў). 7. Надзея Яноўская не наведвала нікога акрамя старога добрага Дубатоўка (У.Караткевіч). 8. Хадоська азірнулася і не ўбачыла на ўзболатку ніводнага дрэўца апрача дзвюх панурых вербаў ля самай вады (І.Мележ). 9. Я ўвайшоў у клас і ўбачыў акрамя пафарбаваных парт прыгожую кніжную шафу (Я.Брыль). 10. Бабуля апроч казак расказвала малым у доўгія калядныя вечары легенды і паданні пра вужыную каралеву і ўладарку бурштынавага палаца (Якуб Колас).

**92. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце адасобленыя дапаўненні. Укажыце сродкі сінтаксічнай сувязі, з дапамогай якіх яны ўводзяцца ў сказ.**

1. Быў гарачы жнівеньскі полудзень, можа таму Васіль і не ўбачыў на станцыі нікога акрамя двух стрэлачнікоў, што корпаліся каля рэльсаў (І.Навуменка). 2. Настрой ў паненак быў надзвычай вясёлы асабліва ў Алі (М.Гарэцкі). 3. Зелянюк раззлаваўся на ўсіх прысутных толькі не на Таццяну (М.Зарэцкі). 4. Таццяна нічога не ўбачыла на небе апрача нямецкага самалёта (І.Пташнікаў). 5. Маразы густа пакрылі дрэвы інеем замест лісця (К.Чорны). 6. Замест Валошына камандзірам батальёна быў прызначаны Гунько (В.Быкаў). 7. Дзікае паляванне магло запужаць каго заўгодна апрача яго Андрэя Беларэцкага (У.Караткевіч). 8. У гэтыя калядныя вечары людзі апрача дробязных хатніх спраў нічога не рабілі (І.Мележ). 9. Прыйшла восень і апранула дрэвы акрамя елак і сасонак у залатое ўбранне (Я.Брыль). 10. Я не ўбачыў у пакоі нікога апрача бабкі Насты (Якуб Колас).

**93. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Знайдзіце і падкрэсліце адасобленыя ўдакладняльна-паясняльныя члены. Акрэсліце іх значэнне (удакладняльныя, паясняльныя, абмежавальна-вылучальныя ці**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**далучальныя).**

1. Там у бібліятэцы я ўбачыў даўнія пергаментныя кнігі, кнігі на першай порыстай паперы, кнігі на жоўтай ад старасці гладкай ільняной паперы (У.Караткевіч). 2. Сумненняў не было: яго Васілёва хата стаяла на месцы, як і трыццаць год назад (І.Навуменка). 3. Яму Сцяпану давялося доўга ісці лясным бездарожжам, пакуль хлопец не ўбачыў вёску (Я.Брыль). 4. Маня паглядзела на Казімера і ўсміхнулася адкрытай дзіцячай і юнай усмешкай (К.Чорны). 5. Роўна праз тыдзень гэта значыць дваццаць пятага снежня я прызначыў сустрэчу сябрам (Якуб Колас). 6. У хаце акрамя дзеда Дзяніса нікога не было (І.Мележ). 7. Апроч Таццяны ніхто не мог так добра разумець Марыю Паўлаўну (М.Зарэцкі). 8. Замест адказу дзяўчына ледзь прыкметна ўсміхнулася (Б.Сачанка). 9. Вучні стараліся вырасціць на сваім участку свой хоць і невялікі ўраджай (ЛіМ). 10. Хадоська цяпер быццам знаходзілася ў нейкім сваім цудоўным свеце: яе цікавіла ўсё нават кветкі (І.Мележ).

***94.** Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце адасобленыя ўдакладняльна-паясняльныя члены сказа ў адпаведнасці з іх сінтаксічнай функцыяй.*

1. Тут за бульбянішчам стаяла тая самая пунька, а цяпер быў толькі бялюткі снегавы пагорак, з-пад якога месцамі віднелася нешта чорнае – недагарэлыя галавешкі, ці што? (В.Быкаў). 2. На той лясной дарозе былі дзве падводы – Боганчыка і Махоркі (Я.Брыль). 3. Ён [Панок] адстаў ад іх яшчэ на прагале: ззаду дарогу бамбілі (І.Пташнікаў). 4. Для вяскоўцаў гэта быў зручны выпадак ліквідаваць гэтых маслакоўцаў або проста бандытаў (І.Мележ). 5. З надзвычайным узрушаннем менавіта з хваляваннем успрыняла Вера гэтую навіну (М.Зарэцкі). 6. Ты ўсміхалася. Ну, а я… Пра ўсё ж я табе скажу: я пад клёнам адзін стаяў і зайздросціў яму дажджу (К.Кірэенка). 7. Але раптоўна лёгкі на ўспамін ён зводдалля амаль за гарызонтам загаварыў як верхавод грамін, што сунецца-вядзе дажджы-грымоты (М.Калачынскі).

**95. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Укажыце, пры якіх акалічнасцях размяшчаюцца адасобленыя ўдакладняльныя акалічнасці (часу, месца, спосабу дзеяннія і інш.).**

1. Першы снег – гэта сэрцу навіна, гэта – раны пакрыла зямля; там ля студні прабегла дзяўчына – смех на снезе і скрып жураўля (П.Пестрак). 2. Па-над Сажом на дворышчы сырым дзе ўчора бой грымеў заўзята, гамоняць сёння звонка тапары: вяскоўцы новую будуюць хату (П.Пестрак). 3. А яна спускалася ніжэй да зямлі, да траў яе вясёлых, як святая у вачах людзей, як адважны сонечны анёлак (М.Калачынскі). 4. Калісьці яшчэ ў фінскую Таццянін бацька таксама ваяваў (І.Пташнікаў). 5. Даўно у гады вайны Агееву даводзілася бываць у гэтым мястэчку (В.Быкаў). 6. Увечары пасля прагулкі па старому парку мы з Надзяй зайшлі ў бібліятэку (У.Караткевіч). 7. Дзіўны гук уразіў мой слых: недзе далёка ў правым баку ад мяне гучаў паляўнічы рог (У.Караткевіч). 8. Мы доўга прастаялі так моўчкі без адзінага слова (Н.Гілевіч). 9. Я пабыў у гасцях нядоўга ўсяго пару гадзін але і гэта падалося мне пакутным (В.Быкаў). 10. Я прабыў у засадзе нядоўга хвілін пятнаццаць-дваццаць, але і гэтага было дастаткова: я ўбачыў іх на свае вочы (У.Караткевіч).

**96. Запішыце тэкст, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце адасобленыя ўдакладняльныя члены сказа. Акрэсліце іх**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**семантыку (удакладняльныя, паясняльныя, абмежавальна-вылучальныя і далучальныя).**

Першага верасня школьны званок паклікаў малых у тры новыя школы. Апейка ў той вераснёвы дзень даехаў да адной з іх у Мокуці сам бачыў колькі радасці-ўцехі было ў бацькоў і дзяцей. Усё сяло старыя і малыя сышліся як на свята заняткі доўга было нельга пачаць таму што бацькам хацелася паглядзець як будуць вучыцца іх дзеці. Потым разышліся па хатах па гумнах па палосах але вечарам усе былі вельмі ўдзячны настаўніку адзінаму пакуль на ўсю школу. Свята сапраўднае было і Апейка не дзівіўся раней трэба было ісці ў школу за цэлых сем кіламетраў ды ледзь не ўсё лесам па незлічоных лужынах цераз балота за Куранямі. У Юравічах зрабілі інтэрнат для дзяцей з далейшых сёл школ другой ступені ў раёне не густа пакуль што поўная толькі адна, дык вось няхай будзе сталы прытулак усім тым хто хоча вучыцца.

Сам-насам Апейка радаваўся ганарыўся нават што у гэтым годзе школы і местачковыя ў тым ліку будуць не толькі з апалам але і з гарачымі абедамі. Ва ўсіх школах цяпер акрамя цёплых печак ды грубак ёсць тытаны ці бачкі гатаваць чай. Ёсць хлеб і ёсць цукар!.. А гэта ўжо нешта ад будучыні…

*І.Мележ. Подых навальніцы*

**97. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Падкрэсліце ў перакладзе адасобленыя ўдакладняльна-паясняльныя члены ў адпаведнасці з іх сінтаксічнай функцыяй.**

В мирные времена, ещё до войны, никому из ленинградцев не могло бы прийти в голову разгуливать ночью по крышам или просиживать целые часы у трубы, разглядывая небо и город.

Теперь все крыши, даже на невысоких домах, были обжиты. Тысячи ленинградцев – от мала до велика – проводили все ночи на крышах. Там, наверху, они приготовили щипцы, чтобы хватать ими зажигательные бомбы, багры, чтобы сбрасывать эти бомбы с крыш. Тушили крыши просто так, без масок и рукавиц, потому что их не хватало всем.

В городе было тихо – ни звука, было слышно, как внизу, у самой дороги, едут военные машины. Ни одного огонька не блестело нигде, ни в окнах, ни на улицах. Ночь была мирной. Вверху, над городом, плыли атласные облака, по краям которых бегали прожекторные лучи, перекрещивались и клонились к земле. Ветер шумел листвой, казалось, везде – в парках и садах. Люди на крышах говорили тихо, шёпотом, как будто их могли услышать летящие на город немецкие самолёты.

*Н.Тихонов. Ночи Ленинграда*

## ПАРАЎНАЛЬНЫЯ ЗВАРОТЫ

***98. Выпішыце спачатку сказы з параўнальнымі зваротамі, затым – з параўнальнымі даданымі часткамі, пасля – з прэдыкатывамі-параўнаннямі. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Ахарактарызуйце структуру параўнальных зваротаў (развітыя ці неразвітыя, якімі часцінамі мовы выражаны).***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Рогі ў аленя ляжалі аж на спіне як загнуты абруч на вялікі кошык (І.Пташнікаў) 2. У небе хмарачкі дзянныя плылі як гускі маладыя (Якуб Колас). 3. Ноч – як сажа а святло цяпельца зрабіла яе яшчэ цямнейшаю (К.Кірэенка). 4. Над белай атласнай кофтачкай, у вэлюме так добра, прыгожа віднеецца смуглявасць яе [Ганны] твару, дужкі броваў вільготныя як спелыя вішні ранкам вочы. “І ўся яна – як вішня! Як кветка вішні!..” – падумаў Чарнушка, чуючы, што душу сціснула вялікая журба (І.Мележ). 5. Цецярук сядзеў на сваёй бярэзіне як цар гэтага балота і чырвоным вокам цікаваў за людзьмі (Л.Дайнека). 6. Полымя лізнула кабіну; загарэўся над кузавам брызент як у хаце страха ў пажар (І.Пташнікаў). 7. Абсыпалі са сваіх парудзелых чачотак жаўтлявыя як проса бубачкі высокія рабіны (В.Адамчык). 8. Дзевяць калгасаў у раёне – як астраўкі сярод даўняга балота (І.Мележ). 9. Рука ў ігумена была празрыстая жоўтая быццам вылепленая з воску (Л.Дайнека). 10. А дрэвы ў гаі – быццам у казачным палацы (М.Шыманскі). 11. А гэты ветрык дураслівы траве зялёнай чэша грывы, у садку жартуе з верабінай як хлопец-голец з той дзяўчынай (Якуб Колас). 12. У такія дні буйны калючы вецер нібыта па даліне ляцеў па рэчышчы Нёмана (В.Іпатава). 13. Сонца яшчэ ярка-белае, хоць паветра робіцца ўсё болей празрыстае як бы вымытае наліваецца той здаровай крышталёвай яснасцю, ад якой на душы лягчэй і святлей (В.Гілевіч). 14. Заняўшы свае акопы, немцы зусім сціхлі на вышыні нібы ўсё астатняе іх не цікавіла (В.Быкаў). 15. Вольныя гоні засеяў зярном, чыстым як слёзы маці (К.Кірэенка). 16. Такі няроўны як гэты дзень быў і настрой у Васіля, у якім мяняліся добрыя спадзяванні і злыя сумненні (І.Мележ). 17. Зацвіла шыпшына! Дзве кветачкі як дзве чырвона-ружовыя зорачкі пазіралі з захапленнем на цэлы свет (К.Кірэенка).

***99. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Ахарактарызуйце параўнальныя звароты паводле выражэння сэнсавых адносін (уласнае параўнанне, градацыйнае параўнанне, азначальная рэпрэзентацыя,ураўноўванне).***

1. На падвязаны кусцік сівага нібы палын дрэўца завіўся і зацвіў пустацветам гарбуз (В.Адамчык). 2. Пятро як і кожны ў яго гады быў паэт у душы (І.Шамякін). 3. Вочы ў абодвух чорненькія як вугельчыкі (К.Чорны).4. І гэта смеласць, гэта раптоўная як усплёск сіла пачуцця рабілі яркія як вішні вочы яе [Ганны], смуглявы твар такімі прыгожымі, што хараство іх быццам асляпіла Башлыкова (І.Мележ). 5. Змрок як і заўсёды ў познюю восень наплываў хутка (А.Кулакоўскі). 6. Дрыгва з іржавымі вокнамі крыніц. Куп’ё з вострай як нож асакой (І.Грамовіч). 7. Сажалка замярзае раней чым рэчка (І.Шамякін). 8. У цьмяным небе, нізкім, навіслым як дзіравая страха над вялікай пуняй рэдка і скупа што праз туман мігцелі зоркі (І.Пташнікаў). 9. Людзей у лесе было больш як грыбоў (Якуб Колас). 10. Ты такая радня як Саўка Кузьме родны Хведар (Прыказка). 11. Сакавіта зелянела вузкая палоска азіміны, вецер гнуў высокую тонкую бярозу, абсыпаную як жоўтым пухам маладым лісцем… (Л.Арабей). 12. Пракоп як і кожны селянін крыху дыпламат (Якуб Колас). 13. Ясна, друк у Цяпінскага быў не той што ў Скарыны (У.Караткевіч). 14. З усіх бакоў некалі была акружаная мая Асінаўка як вока вейкамі лесам (“Полымя”). 15. А калі поп здароўкаўся і падаваў руку настаўнікам, асабліва ў такім лапсярдаку як у Лабановіча то ў гэту хвіліну шчыра шкадаваў, што ў яго ёсць рукі (Якуб Колас). 16. Вады ў рэчцы было крыху больш чым да кален (І.Мележ). 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У Асы як і ў Рагнеды ёсць сын (М.Ермаловіч). 18. Увесь ніз сонца быў у буйной і чыстай як слёзы расе (Я.Сіпакоў).

***100. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Устанавіце, у якіх выпадках словы як, быццам, нібыта, нібы, і пад. з'яўляюцца параўнальнымі злучнікамі, у якіх – параўнальнымі часціцамі. Сказы з параўнальнымі зваротамі падкрэсліце.***

1. Але Пракоп прывык да гэтых малюнкаў свае вёскі як прывыкае прусак да абжытае шчыліны (Якуб Колас). 2. Дол, усланы што коўдраю сухім зеленаватым мохам, дзе-нідзе аздабляўся чаборам, рамонкамі і медункамі (П.Броўка). 3. Толькі Васіль і Ганна не ўцякалі, туліліся адно да аднаго каля плота, як бы і не заўважалі напасці… (І.Мележ). 4. Ён [Сымон] бліжэй на крок ступае і ў няясным парыванні зазірае ў вочы Ганне, а яна нібы сляпая (Якуб Колас). 5. Дарма як і іншыя хлопцы з Галынкі не проста сябраваў з раўкоўскімі хлопцамі: з мінулага лета ён быў членам камсамольскай арганізацыі (Я.Брыль). 6. Раптам нечы дужа знаёмы твар як бы ўспыхнуў перад ягонымі [Ізяслава] вачыма (Л.Дайнека). 7. Лапку здалося, што ў пpoразі цёмнага акна як бы нешта мільганулася, чыйсьці няясны абрыс прыпаў да шыбы, на дзве трацiны затканай марозам (Якуб Колас). 8. Мы сядзелі і перакідваліся нязначнымі сказамі, і гэта было як на ўласным пахаванні як на пахаванні чагосьці страшэнна значнага (У.Караткевіч). 9. Старшыня павярнуўся і з напружанай увагай на бурым нібы апечаным твары зірнуў у вочы Іваноўскаму (В.Быкаў). 10. У прагнасці сваёй да новага малы як быццам забыўся нават пра мора (Я.Брыль). 11. Памятаю нашу настаўніцу Лідзію Сулкоўскую, стройную маладую жанчыну з пакорлівымі як бы вінаватымі вачыма (Я.Скрыган). 12. Гэта Чаркашын быў спыніўся, стаў як укопаны… (І.Пташнікаў). 13. Недалёка мяжа. Роўная як струна перарэзала поле ад лесу да лесу (К.Чорны). 14. Бор задумна загуў кожным лісцікам, кожнай галінкай нібы ўнучку сваю прыхіліў да сябе ручаінку (К.Кірэенка). 15. І вось для ажыццяўлення сваёй мэты Ізяслаў нібыта і ўвайшоў у зносіны з Усяславам (М.Ермаловіч). 16. [Жаваранка] убачыў, як праз кусты яму на руку свеціць месяц і рука белая як папера 17. Засыпае вецер сцежку белымі струменьчыкамі дробнага, пухкага як мука снегу (Якуб Колас). 18. Сапраўды, зрабілася неяк трохі цяплей, а галоўнае – быццам весялей нават, з душы нібыта зваліўся гнятлівы цяжар… (В.Быкаў).

***101. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Ахарактарызуйце параўнальныя звароты паводле вобразнасці (вобразныя ці параўнальна-раўналежныя).***

1. Жыццё ў замку ішло без змены. Раз заведзены там лад не парушваўся бы сцены… (Якуб Колас). 2. У хаце ў яго [Пліцкага] было яшчэ чарней як у Самоцькі (К.Чорны). 3. – Панскае паляванне, – сказаў нечы нерэальны бы праз дрымоту голас (У.Караткевіч). 4. Лабановіч быў пакрыўджан як мужыцкі сын (Якуб Колас). 5. Янук толькі гудзеў сабе пад нос, не сціхаючы як аса ў акне заляцеўшы ў хату (І.Пташнікаў). 6. На току ў дзядзькі бы ў святліцы маркотна свеціць блеск газніцы (Якуб Колас). 7. Лазар Рэйда чалавек чорны і хмуры як асенняе неба (І.Чыгрынаў). 8. Шабета падсунуў да сябе кавалачак жоўтай абгортачнай паперы і, паказваючы Васілю, што як і раней сочыць за ім, стаў нешта пісаць (І.Мележ). 9. Перад намі стаяла невялічкая бабулька ў шырокай як звон сукні, ліловай шнуроўцы, у якой,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

напэўна, хадзілі нашы прапрашчуры пры каралі Сасе, і ў вялікім крухмальным чапцы (У.Караткевіч). 10. З другога боку валюхае танкіст – чорны як грак чубаты хлапчына ў прамазучанай целагрэйцы (В.Быкаў). 11. Там-сям па кругавіне горада стаялі бы вытачаныя фабрычныя трубы з хвастамі цёмнага дыму (Якуб Колас). 12. Мабыць, ніколі не паўзлі так марудна, нецікава дні ў Міканоравым жыцці як у гэты калядны тыдзень (І.Мележ). 13. Над дваром, над самым асверам, махаў крыллем чорны як збіты з дошак самалёт з жоўтым крыжам ля хваста… (І.Пташнікаў). 14. Як заўжды даўшы выказацца камандзіру роты, у спрэчку ўступіў яго намеснік (В.Быкаў). 15. – Я не жабрак і не галадранец, – сказаў даўжэзны як калядная свяча Юллян Раткевіч… (У.Караткевіч). 16. А прычына гэтага ў тым, што Яраслаў як і ў свой час бацька яго Уладзімір добра зразумеў, што Полацк – гэта ўжо асобная дзяржава… (М.Ермаловіч). 17. На лучніку гарыць карчажка, агоньчык весела шуміць нібы жывы нібы жар-пташка ды пра сваё штосьць гаманіць (Якуб Колас). 18. Вада была прэсная і халодная як усягды ў студні са сваім смакам… (І.Пташнікаў). 19. Пасля згасання гэтага роду ў 1542 г. Быхаў як і Шклоў аказаўся ў магутных магнатаў Хадкевічаў (М.Ткачоў). 20. Свайго поля было ў іх няшмат: для такой жняі як Данікава мама няма дзе і разгарнуцца (Я.Брыль).

***102. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце сінтаксічную функцыю параўнальных зваротаў у сказах.***

1. Тады паднялася, момант пастаяла, потым ціха пайшла к сталу Міхаленка Вольга, смуглявая, чорная як цыганка швейніца з арцелі (І.Мележ). 2. І тады між дзігання куль і траскоцця чэрг, прыглушаны як з невядома якой далечы данёсся з-за рачулкі знаёмы, здушаны голас (В.Быкаў). 3. Тады ён [Завішнюк] адчуў, што ў яго больш няма ніякай сілы, адчуў, што баляць ногі і нічога не бачыць як аслеп (І.Пташнікаў). 4. І людзі ведалі Сымона, Сымон людзьмі не злоўжываў, людскіх жа звычаяў і праў трымаўся цвёрда як закона (Якуб Колас). 5. У такі час Курані выглядалі як нейкі дзікі табар, як бы вярталіся на тысячы гадоў назад… (І.Мележ). 6. Скрыначка ў немца была пашарпана, і на ёй стаялі нямецкія літары як і на касцы (І.Пташнікаў). 7. Грушы то маўчаць, то шалясцяць, шэпчуць між сабою як даверлівыя сяброўкі шэпчуць, вядома, аб шчасці згоды, аб цеплыні рук дзявочых, аб гарачых юнацкіх пацісках (І.Мележ). 8. Вечарамі падслепаватыя вокны сялянскіх хат мільгалі сваімі цьмянымі бляскамі з-пад стрэх як прыжмураныя і патускнелыя старэцкія вочы з-пад навіслых брывей (Якуб Колас). 9. Твар у Жэнькі тады быў такі ж белы як і цяпер (І.Пташнікаў). 10. Помніў Міканор пра свой васпаваты твар, пра белаватыя бровы і блеклыя нібы выцвілыя вочы (І.Мележ). 11. Ёй [Валі] нават чамусьці здавалася тады, што гукі музыкі былі каляровыя: і жоўтыя як лісце пад нагамі і блакітныя як неба над галавою і зялёныя як трава пад лісцем і нават паласатыя як матроская цяльняшка (Я.Сіпакоў). 12. У лесе гэтак жа ціха як і ў полі толькі зрэдку цінькае сініца (А.Жук). 13. Белая нібы абкладзеная ватай зямля (Б.Сачанка). 14. Дрэвы таксама насцярожана драмалі, гледзячы праз сон у празрыстую, чыстую як шкло ваду, пакрытую лёгкім вэлюмам туману (У.Дамашэвіч). 15. Мы з Пятровічам хадзілі ад сасны да сасны, на кожнай грэючы далоні, вочы, душы, хадзілі быццам нямыя, бо ёсць хвіліны, калі нашы словы нічога не вартыя ў параўнанні з нашымі пачуццямі, думкамі (В.Карамазаў). 16. Дубы стаялі трывала як волаты… (М.Шыманскі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***103. Прачытайце ўрывак з паэмы "Новая зямля". Знайдзіце і выпішыце сказы, у якіх параўнанні выражаны назоўнікамі творнага склону. Устанавіце агульныя рысы і адрозненні паміж творным параўнання і параўнальным зваротам.***

Зялёны луг, як скінуць вокам,
Абрусам пышным і шырокім
Абапал Нёмна рассцілаўся –
За хатай зараз пачынаўся
Ды йшоў квяцістай раўніною
З мурожнай слаўнаю травою
І ззяў на сонцы ў пералівах
Пяшчотных тонаў. Як на нівах
Жыта збажынкі лёгка гнуцца
І людзям радасна смяюцца
Сваім прыемным, мілым спевам
Пад лёгкім ветрыку павевам, –
Так гнуцца, гойдаюцца травы,
Як пройме ветрык іх ласкавы,
І пойдуць хвалі травяныя
З прыемным спевам чарадою,
Зашэпчуць краскі між сабою,
Нібы дзяўчаткі маладыя,
Эх, луг шырокі! Як жывы, ты,
Праменнем сонейка заліты,
Увесь стаіш перад вачыма,
Ты міл і смуцен, як радзіма,
Як наша ціхая старонка,
Дзе смугі сіняя пялёнка
У летні час дымком звісае
І даль задумай спавівае.

*Якуб Колас. Новая зямля*

***104. Запішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя параўнальныя звароты і знакі прыпынку пры іх. Пракаменціруйце, як змяніўся тэкст.***

А там вунь вавёрка пераскоквае з галінкі на галінку. Уселася ды не зважае на Мішку. Той і сяк, і так, і зубамі лясне, лапай зямлю дзярэ, і голас прабуе падаць, а вавёрка нічога, хоць бы зірнула раз, матляецца толькі хвост ______________. Узлаваў тады Мішка, да хвойкі кінуўся, стукнуў лапай па ёй. Вавёрка пераскочыла на другую хвойку, з той – на трэцюю. Мішка – за ёй. Спрабаваў на хвойку ўзабрацца. І вось-вось, здаецца, зловіць вавёрку, але дзе ты яе возьмеш, калі яна скача ______________. Раз такі скочыў з дрэва і сам Мішка. Думаў, што паляціць _________________ услед за вавёркай. І вось-вось, здаецца, зубамі за хвост учэпіцца, раскрыў ляпу шырэй, каб хваста не ўпусціць. Дык дзе ж ты бачыў! Секунда, дзве – і повен рот зямлі, ды нагу падбіў, такляснуўся аб зямлю. Добра яшчэ, што дрэва было нізкае, маглі б Мішкавы палёты кончыцца куды горш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*М.Лынькоў Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў*

***Для даведкі:*** *як матыль, як мяцёлка, як блыха.*

***105. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Укажыце магчымыя пунктуацыйныя варыянты.***

1. Чорны як смоўж Максімаў Петрык спрачаўся (К.Чорны). 2. Чмаруцьку ведалі як чалавека з фантазіяй (М.Лынькоў). Усё відаць як на далоні (М.Лынькоў). 4. У каморцы было холадна амаль як на дварэ (Т.Хадкевіч). 5 Менш чым праз хвіліну Несцяровіч вярнуўся ў хату (К.Чорны). 6. Гушчар быў цёмны, непраходны зусім як у пушчы (П.Пестрак). 7. Нямецкі кулямёт лескатаў быццам над самай галавой (І.Мележ). 8. Абоз расцягнуўся больш як на вярсту (Якуб Колас). 9. Санітары ўжо былі салдату як ворагі якія (К.Чорны). 10 Вясёлая гаваркая прынадная дзяўчына як з неба звалілася разам з бацькам сваім (І.Мележ). 11. Размова не спыніцца па крайняй меры раней чым праз паўгадзіны (М.Лынькоў). 12. Махорка бег вулачкай да Сяргеіхі на двор як толькі мог (І.Пташнікаў). 13. Лапко прыглядаўся да работы як гаспадар (Якуб Колас). 14. Алёшу калола ў вочы што вострымі шпількамі (І.Пташнікаў).

***106. Прачытайце тэкст. Прааналізуйце ўжытыя ў ім параўнальныя звароты: а) вызначце структуру; б) ахарактарызуйце іх паводле вобразнасці і паводле выражэння сэнсавых адносін; в) вызначце сінтаксічную функцыю параўнальных зваротаў у тэксце.***

Дрыжыць агонь, як смех крывавы,
Дрыжыць агонь у цьме густой,
У цьме варожай і пустой,
Як адбіццё даўнейшай славы,
І зліўся з мрокам дым бялявы
Над гэтай плямкай залатой.
Дрыжыць агонь, як песня жалю,
Дрыжыць агонь у цьме начной
Пад адзінокаю сасной,
Як плеск апошні рэчнай хвалі.
У мроку нікнуць сонна далі,
Крычыць сава ў цішы лясной.
Дрыжыць агонь, як плач прашчальны,
Дрыжыць агонь, забыты тут,
Скрозь мрок нямы, скрозь чорны мут,
Як звон жалобы пахавальны,
Як песні голас развітальны,
Як струн дрыгучых ціхі гуд.
Гарэў агонь, былі тут людзі,
Вянок плялі яму з галін.
Цяпер загас ён тут адзін,
І цёмна стала на тым грудзе.
Ніхто і ведаць-знаць не будзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Яго апошніх тут гадзін.
Цянюе змрок густы, як сіта,
На месцы тым, дзе быў агонь,
І вецер попел знёс на гонь,
Ад лесу дзьмухнуўшы сярдзіта.
І ўсё вакол у цьму спавіта:
Гарэў агонь – пагас агонь!

*Якуб Колас. Сымон-музыка*

***107. Прачытайце сказы на рускай і беларускай мовах. Прааналізуйце пераклад параўнальных зваротаў (урыўкі з твораў І. Мележа) на рускую мову.***

1. У двор каля ліпы пажылы чалавек уводзіў з пашы каня, з двара насупроць выганялі парасят, і ішло за імі пакорлівае мурзатае дзіця, **як старое**, угінаючы плечы… — Во двор возле липы мужчина вводил коня, со двора напротив выгоняли поросят, и шло за ними покорное замурзанное дитя, **по-стариковски** ссутулив спину (пераклад Н.Кісліка).

2. Кваканне іх [жаб] поўніла дзённую млоснасць, вечарамі і ўночы дралі яны горла, **як асатанелыя**, на ўсе лады. — Кваканье их полнило размореные дни, вечером и ночью драли они глотки, **как осатанелые**, на все лады (пераклад Н.Кісліка). — Кваканье их наполняло дневной зной, вечером и ночью на все лады, **как осатанелые,** надрывали они горло (пераклад М.Гарбачова).

3. Васіль Дзяцел на Міканораў загад незадаволена засоп, адвёў вочы ўбок: “Тут са сваім няўпраўка… І без таго, **як шкурат**, круцішся…” — Василь Дятел в ответ на Микаворов приказ недовольно засопел и отвёл глаза: “Тут со своим неуправка. И без того **ужом** вертишся…” (пераклад Н.Кісліка).

4. Ганна ўзяла, але ела так, **нібы не чула ніякага смаку**. — Ганна взяла, но ела, **не чувствуя никакого вкуса** (пераклад Н.Кісліка).

5. Калі паснедалі, мачыха не загадала Ганне, **як звычайна**, прыбраць са стала, не ўсхапілася і сама. — Когда позавтракали, мачеха **против обыкновения** не велела Ганне убирать со стола, не поспешила вскочить и сама (пераклад Н.Кісліка).

6. Вочы пачырванелыя ад слёз, скрыўлены болем рот, мокрыя, дрыготкія, **як студзіна**, шчокі… — Глаза, покрасневшие от слёз, перекошенный болью рот, мокрые, трясущиеся, **как студень**, щёки… (пераклад Н.Кісліка).

7. **Як згаладалы за акрайчык хлеба**, учапіўся Васіль у выслізганае дубовае цапільна… — **Как изголодавшийся за краюшку хлеба**, ухватился [Василь] за вытертое до блеска цеповище… (пераклад Н.Кісліка).

8. – А, Хадзюля! Канаплянка! – прамовіў ён [Яўхім] весела, падсмейваючыся з яе твару, абсеянага, **як канапляным насеннем**, рабацінкамі. — А, Хадюля! Коноплянoчка! – промолвил весело, подсмеиваясь над веснушками, **словно конопляное семя**, усеявшими её лицо (пераклад Н.Кісліка). — А, Хадюля! Коноплянка! – воскликнул он весело, насмехаясь над её лицом, усыпанным веснушками (пераклад М.Гарбачова).

9. – Мяне таксама – міліцынер, Шабета, – уступіў у гаворку Васіль, як бы паказваючы гэтым, што прыстае да кампаніі. – Насеў **смалою** – і ўсё… — Меня таксамо – милицинер, Шабета, – вступил в разговор Василь, как бы показывая этим, что пристает к компании. – Прилип **смолою** – и все… (пераклад Н.Кісілька). —

Меня тоже, милицанер, Шабета, – вступил в разговор Василь, как бы показывая этим, что присоединяется к компании. – Прилип, **как смола** – и все… (пераклад М.Гарбачова).

10. Многія людзі жылі, **як на плыце**, які злая нягода адарвала ад берага і занесла ў мора… — Долгие дни люди жили **как на плоту**, оторванном ненастьем от берега и унесенном в открытое море… (пераклад Н.Кісліка).— Много дней люди жили **как на плоту**, который злая непогода оторвала от берега и унесла в море… (пераклад М.Гарбачова).

11. Дзеці, **як чарада**, што выпушчана з загарадкі, з галасам вывалілі на ганак. — Дети, **как отара**, выпущенная из загородки, с шумом, с гомоном повалили на крыльцо (пераклад Д.Кавалёва).

12. Ён [Гайліс] глядзеў у залу, **як суддзя**, чакаў адказу. — Он смотрел в зал, **как судья**, ждал ответа (пераклад Д.Кавалёва).

13. [Ганна пра Башлыкова:] І не відны вельмі, і плечы, **што ў маралетка.** — И не очень видный и плечи, **как у подростка** (пераклад Д.Кавалёва).

14. З выгляду рашучая, **нібы ганарлівая**, той цвёрдай хадою, якою кіравала звычайна ў клас, на заняткі, [Параска] падалася ў свой пакой. — С виду решительная, **даже заносчивая**, той твердой походкой, которой направлялась обычно в класс, на занятия, пошла в свою комнату (пераклад Д.Кавалёва).

15. Параска адразу захадзілася **гаспадыняю**. — Параска **по-хозяйски** сразу засуетилась (пераклад Д.Кавалёва).

16. Хвіліну [Аўдоцця] глядзела на сына няўцямна, **як непрытомная.** — С минуту глядела на сына **невидящим взглядом** (пераклад Л.Шапіры). — Минуту смотрела на сына не понимая, **как безумная** (пераклад Л.Ракоўскага).

17. Аляксей падумаў: яму заўсёды здавалася чамусьці, што дарога мае свой адзіны кірунак, **як рэчка.** — Алексей подумал: ему всегда почему-то казалось, что у дороги есть только одно направление, **как у речки** (пераклад І.Мележа). — Алексею всегда почему-то казалось, что дорога имеет только одно направление, **как течение реки** (пераклад Л.Шапіры). — Алексей подумал: ему всегда казалось почему-то, что дорога имеет одно направление, **как река** (пераклад Л.Ракоўскага).

18. Цемра, **як бяздонне**, праглынала ўсё. — Темнота, **как бездна**, поглощала всё (пераклад І.Мележа)— Темнота **бесследно** проглатывала их (пераклад Л.Шапіры). — Темнота, **как пропасть,** проглатывала их (пераклад Л.Ракоўскага).

## ЗВАРОТАК

***108.* Запішыце сказы, расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце семантыку зваротkаў (асоба, названая па імені, прозвішчу, роду заняткаў, пасадзе, узросту, сваяцтву, якой-небудзь унутранай ці знешняй прымеце; адушаўлёная істота; неадушаўлёны прадмет ці з'ява).**

1. Дыхайце грудзі спявайце вусны спяшайцеся ў дарогу ногі (У.Караткевіч). 2. Мора супакой нашы душы! (У.Караткевіч). 3. Бывай Вязынка! (У.Караткевіч). 4. Люблю лугі квяцістыя за полем шумны гай палеткі каласістыя цябе мой родны край (А.Русак). 5. Правяду дадому цябе чараўніца (А.Русак). 6. Дык чаму ж ты паэт пяеш пра іспанку? (К.Кірэнка). 7. Малады чытач ты не чуў пра слёзы Мадрыда

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

малады чытач ты не бачыў ран Беларусі (К.Кірэенка). 8. Вось здаецца ты Ігнатка-хлопец заўтра ў школку першы раз ідзеш (В.Таўлай). 9. Арлы маладыя я вас пазнаю бясстрашных і мужных у грозным баю (Якуб Колас). 10. Трэба дапамагчы людзям Віктар Міканоравіч... (П.Місько). 11. Мы сынок з табой усім багаты (А.Вялюгін). 12. Ты кніжка запісная – дом, дзе свішча скразняк гадоў, віхор няспелых дум, кладоўка для зярнят і папялішча пачуццяў марных, пушчаных на глум (А.Куляшоў). 13. Дзень добры паважаны Віктар Старжыцкі (А.Куляшоў). 14. Заспявай і ты мая сястрыца песню надыходзячага дня! (П.Панчанка). 15. Як блізка і далёка ты радзіма! (М.Танк).

***109. Ахарактарызуйце структуру звароткаў (неразвітыя або развітыя), спосаб іх выражэння, асаблівасці ўжывання (адзіночныя, паўторныя, аднародныя).***

1. Дзе ты, цёплае лета, сонцам яркім сагрэта? Дзе ты, шыр каляровай красы? (А.Русак). 2. Дык бывай жа, родны мой, ды чакай мяне (А.Русак). 3. Цалуйцеся, людзі, часцей, не адкладайце галубіцца (К.Кірэенка). 4. Суровы і цвярозы век дваццаты, люблю цябе да скону і кляну (Г.Бураўкін). 5. На песню, і думка і сэрца, ляціце (А.Вялюгін). 6. Пакуль у целе чуецца душа, не веру я ў таемны сэнс другога яе жыцця. Таму дазволь, дарога, Варшаўскі шлях, Варшаўская шаша, звяртацца да цябе, а не да бога радком, што просіцца з карандаша (А.Куляшоў). 7. Спыніся, падарожны! (А.Куляшоў). 8. Вы, песні юныя і смех, былі тады зямлёй і снегам, кастром салдацкім пры сасне (А.Пысін). 10. Ты, рачулка, шнурочак Дняпра, гэты лес ціхім смуткам абві! (А.Пысін). 11. О, якой непаўторнай красою цвіцеш, край братоў маіх, край песняра – Казахстан! (М.Танк). 12. Красуй, збожжа майго краю, каласісь багата! (Ц.Гартны). 13. Сам-насам хочацца пабыць з табою, шчыры бор, з тваімі жыхарамі (В.Вітка). 14. Жывеш ты, каханая, дзесьці далёка (А.Звонак).

***110. Прааналізуйце сэнсавую сувязь зваротка са сказам (адносіцца да ўсяго зместу сказа ці да асобных яго кампанентаў). Падкрэсліце члены сказа, якія ўдакладняюцца звароткам, у адпаведнасці з іх сінтаксічнай функцыяй. Зрабіце сінтаксічны аналіз сказаў, у якіх зваротак адносіцца да ўсяго зместу сказа.***

1. Мы збяражом цябе, алень, і мудрых зубраў, і старыя вежы, і ўсплёскі бабра на Лясной, і дзіва сонечных палян, і тваю святую, гучную цішыню, пушча (У.Караткевіч). 2. Дарагія ўзмежкі, мае родныя сцежкі, яшчэ болей вас сёння люблю (А.Русак). 3. Ці ты помніш, сястра Марселіна, як нашай маме ты сказала ўпершыню па-беларуску: “Матуля...” (К.Кірэенка). 4. Слаўся, радасць хлебнага дня, спорся ў дзежцы рашчынай! (В.Таўлай). 5. Кланяюся табе, мой горад (Г.Бураўкін). 6. Спі, засні, мой голуб яснавокі, замаргалі зоранькі над хатай (А.Вялюгін). 7. Навек, сябры, запомню гэту дату (А.Вялюгін). 8. Ты лечыш раны, суцішаеш боль, надзеяй апаясваеш, дарога, ты шар зямны (А.Куляшоў). 9. Не спазніся, наша навальніца, высакосным ліўнем зазвіні! (А.Пысін). 10. Я вам, мае дзеці, пакідаю самы даражэйшы скарб на свеце: волю і любоў да свайго краю, славу – і вы гэта беражэце! (М.Танк). 11. Не пакінь ты, надзея, мяне (Ц.Гартны). 12. Цябе не магу забыць я, маленства майго ідылія (В.Вітка). 13. Што ж, сябры, у глебе гэтай ёсць і нашай працы зерне (А.Звонак).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***111.*** ***Запішыце сказы, расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце звароткі адной лініяй, ахарактарызуйце іх структуру, спосаб выражэння і асаблівасці ўжывання.***

1. Расцвітай жа край ты наш палескі родны край у шчасці расцвітай (А.Русак). 2. Як дзіўна мора як крыўдна мора што ўсё аб чым мараць гады маладосці усё гэта маем парою так позна... (К.Кірэенка). 3. А калі ж калі ты Занямонне радасцю ўквеціш берагі? (В.Таўлай). 4. Расступіся далеч расступіся цёмная... (В.Таўлай). 5. О таямніца кніг скажы з якіх людскіх глыбінь ты цуды здабывала? (А.Куляшоў). 6. Дзякуй лес мой і луг мой зялёны і агонь што на ім не патух (А.Куляшоў). 7. Пачакай жа вецярок нязнаны не дзьмухні нязваны вецярок... (А.Пысін). 8. Непакой за цябе зямля мая за твой ураджай спакойны сон за дрэва кожнае ў гаях за весніх песень перазвон непакой за цябе зямля мая – мой хлеб надзёны (М.Танк). 9. Восень ты нудная восень дажджлівая ты немінуча заўсёды (Ц.Гартны). 10. З дзіцячых год запомніў я шырокі ліст прыкметны і добрае тваё імя мой дружа запаветны зялёны мой пакутнік трывалы мой трыпутнік! (В.Вітка). 11. Даруй за слова грубае прабач за крыўды круг адзіная і любая мой свет мой мудры друг (У.Хадыка).

***112.*** ***Вызначце сродкі, пры дапамозе якіх павышаецца эмацыянальна-экспрэсіўная выразнасць зваротkaў (ужыванне пэўных форм суб'ектыўнай ацэнкі, далучэнне да зваротkaў асобных выклічнікаў і часціц, паўтарэнне зваротkaў).***

1. Вакол спакой і мір, і твая рука на маім плячы, дружа (У.Караткевіч). 2. О край мой любімы, як многа прыволля, і думам і працы бяскрайні прастор (А.Русак). 3. Ой, скажы, кудою пойдзеш ты, дзяўчына, ці каля дубровы, ці каля крыніцы? (А.Русак). 4. Ой, дарога ж ты наша, ты найлепшая ў свеце (А.Русак). 5. Ах, любая, як я табе буду ўдзячны, калі ты напоіш каня са студні вадой чыстай (К.Кірэенка). 6. Дзеткі, шануйце заўсёды хлябок, стойце за чорны гарою! (В.Таўлай). 7. Народзе мой! О, Беларусь-дзяржава, крутымі сцежкамі цябе вякі вялі (В.Таўлай). 8. О неба, зорнае і ціхае, крыху пабляклае ад сну, табой, як сіняю хусцінкаю, я любай плечы ахіну (Г.Бураўкін). 9. Не пачуць табе, орле, ніколі ветру посвіст у жнівеньскім полі, рэчкі плёскат ды шолах таполі: непрабудны твой сон непарушны... (А.Зарыцкі). 10. У хмарах, зямляча, шляхі перайначь (А.Вялюгін). 11. Буйны вецер, ой, вятрыска слаўны! Не карай, самотную, мяне (А.Вялюгін). 12. Ах, людзі, людзі, каб наперад зналі вы шлях, крывёй паліты і слязьмі, то не пакутвалі б і не кахалі, не плакалі і не былі б людзьмі (А.Куляшоў). 13. Эх, лепш бы, яблынька, расці табе ля палявой дарогі! (М.Танк). 14. Гэй, казача, не хадзі ў туман на пераправу (М.Танк).

***113.*** ***Прааналізуйце ўзаемасувязь месца звароткa ў сказе і яго інтанацыйнага афармлення.***

1. Мора! Вецер перапаўняе цябе, і вочы, каб не слязіцца, самі прымаюць твой прыжмур, які ўласцівы какеткам і прасоленым "марскім ваўкам" (У.Караткевіч). 2. Паклон табе нізкі, Нява, ад Нёмана-брата прынёс, дзе сцелецца шоўкам трава, дзе льюцца крыніцы між лоз (А.Русак). 3. Пад любой пагрозай жылі вы ў імя чалавека! Паэты! Паэты! Гучныя чую вашы песні (К.Кірэенка). 4. Дзе вы, на ўсё гатовыя дзеля жыцця, паэты?! (К.Кірэенка). 5. Расступіся, далеч! Бандурыст, прачніся, апусці на струны звонкую далонь (В.Таўлай). 6. Мінск! Скажы, як знайсці запаветныя словы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

для цябе, адзінага на ўвесь свет? (Г.Бураўкін). 7. Вы выйшлі ў далеч, маладыя, вам доўга крочыць праз гады (П.Броўка). 8. Ой, Дняпро Славуціч! Са спагадай, можа, ты паслухаеш мяне (А.Вялюгін). 9. Ты кожнаму слову, патомак, што я гавару табе, вер (А.Куляшоў). 10. Няхай, мой шлях, твайго агню іскрынак не гасіць куль трасіруючых рой!.. (А.Куляшоў). 11. Маладосць мая! Навошта ценем так нясмела ходзіш ты за мной? (А.Пысін). 12. Вядзі, сучаснасць! Не прашу прывала апроч таго, што суджана ўсім (А.Пысін). 13. Бывай, віхор зямны! (А.Пысін). 14. Вам, браты дарагія, прывет шле мой край (М.Танк).

***114. Запішыце тэкст, расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Прааналізуйце структуру звароткаў, вызначце іх функцыю ў сказе (намінатыўна-звяртальная, удакладняльная).***

... Імкне ручаінамі празрыстая вада калыша ў сабе срэбнае цельца маленькай вясёлай міроны. І каб міроне было добра жыць цягнуцца з неба да ручаін і палёў празрыста-дымныя фіранкі далёкіх дажджоў.

Стань ціха! Чуеш? Гэта мірона кажа журліва-салодкім нячутным галаском:

– Дзякуй вам добрыя дажджы! Дзякуй табе дарагая зямля! Дзякуй і вам добрыя людзі за тое, што ідзяце берагамі і не хочаце злавіць мяне!

... Мы ідзём туды дзе далёка-далёка ўзносяцца раскошныя шаты дрэў... Дзе ты дом добрай Ганны? Ага напэўна вунь там дзе квітнеюць дрэвы ля агароджы дзе вада з канавы разлілася маленькім азяркам... А вось і яна. Ганна выходзіць нам насустрач і запрашае ў дом.

– Піенс, – кажа яна, і я разумею: малако.

– Майзе, – кажа яна, і я разумею: хлеб.

Будзьце благаславёныя малако і хлеб Відземе! Будзьце благаславёныя добрыя зморшчынкі гаспадыні!

*У.Караткевіч. Казкі Янтарнай краіны*

***115. Перакладзіце сказы на беларускую мову. Пераклад запішыце. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры зваротку.***

1. О первый ландыш! Из-под снега ты просишь солнечных лучей!.. (А.Фет). 2. Ах ты степь моя, степь привольная! (А.Кольцов). 3. Принимаю тебя, неудача, и, удача, тебе мой привет! (А.Блок). 4. Да, мы с тобой встречались, Марков, но ты никогда не видал меня (А.Куприн). 5. Здравствуйте, легкие звезды пушистого первого снега! (И.Тургенев). 6. Шумите, сады, нам на радость, вставайте в тайге, города! (Е.Долматовский). 7. Спой нам, ветер, про дикие горы, про суровые тайны морей... (В.Лебедев-Кумач). 8. – Ох, и постарел же ты, братушка! – сожалеюще сказала Дуняшка (М.Шолохов). 9. О солнце, раскаленное чрез меру, угасни, смилуйся над бедною землей! (Н.Заболоцкий). 10. Скажи, моя великолепная, чего тебе еще хочется? (А.Н.Толстой). 11. Приходите, Анна Васильевна, вот мама обрадуется! (Ю.Нагибин). 12. Услышите вы, Настенька, что в этих местах проживают странные люди – мечтатели (Ф.Достоевский). 13. Боже! Как ты хороша подчас, далекая, далекая дорога! (Н.Гоголь). 14. О природа, природа! Я так тебя люблю (И.Тургенев).

***116. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Прааналізуйце стылістычную ролю зваротаў у тэксце.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Эх, тройка! Птица тройка, кто тебя выдумал? Знать, у бойкого народа ты могла только родиться, в той земле, что не любит шутить…

Не так ли и ты, Русь, что бойкая необгонимая тройка несешься? Дымом дымится под тобою дорога, гремят мосты, все отстает и остается позади. Остановился пораженный божьим чудом созерцатель: не молния ли это, сброшенная с неба? Что значит это наводящее ужас движение? И что за неведомая сила заключена в сих неведомых светом конях? Эх, кони, кони, что за кони! Вихри ли сидят в ваших гривах?.. Русь, куда ж несешься ты? Дай ответ. Не дает ответа. Чудным звоном заливается колокольчик; гремит и становится ветром разорванный в куски воздух; летит мимо все, что ни есть на земле, и, косясь, постораниваются и дают ей дорогу другие народы и государства.

*Н.Гоголь. Мертвые души*

***117.*** ***Запішыце сказы, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Зрабіце сінтаксічны аналіз сказаў са звароткамі.***

1. Андрэй Пятровіч, навучыце ж мяне, як жа размеркаваць работу так, каб можна было добра весці яе. 2. Ведаеш, дружа, калі зашумяць бярозы сваім голлем, то я чую нейкі жаль, мне здаецца, што яны чагось смуткуюць і аб чымсьці скардзяцца. 3. Скажы ты мне, братка Максім, для чаго чалавек на свеце жыве? 4. Вось што, дзеці, сёння па абедзе прыходзьце з рыдлёўкамі: будзем капаць ямкі, а заўтра ўсе пойдзем у лес, прынясём маладых дрэўцаў і абсадзім нашу школу. 5. Добрае ў цябе сэрца, бабка Параска, ты мяне шкадуеш, як родная маці. 6. Дзівосныя справы, браце Яне, і навіны якія! 7. Ці не праўда, ластавачка: жыццё – гэта самае большае шчасце на зямлі! 8. Вы, сябры мае, перасталі жыць у дружбе і згодзе паміж сабой, а таму і страцілі сваю радасць. 9. Скажы ты нам, рачулка, развяж нашу спрэчку: чаму ты такая спакойная, а вадаспад такі ганарысты? (З твораў Якуба Коласа)

## ПАБОЧНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ

***118. Запішыце, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Знайдзіце ў сказах пабочныя канструкцыі; ахарактарызуйце значэнні, якія імі ўносяцца ў асноўную частку сказа.***

1. Кажуць што першыя плытагоны прынеслі свайму паселішчу ўласнае імя, ахрысцілі Глускам, бо яно паселішча ў пракаветнай лясной глушэчы, дзе шмат птаства і дзічыны а векавечныя дубы з небам гамоняць (С.Грахоўскі). 2. Словам Нупрэй праявіў усе дакторскія і санітарскія здольнасці (Якуб Колас). 3. Тым не менш хлопцаў як кажуць не разліць было вадой (А.Капусцін). 4. Далёка-далёка ад нас на другім баку зямлі можна сказаць супраць нашых ног на поўнач ад Аўстраліі ляжыць вялікі востраў Новая Гвінея (Я.Маўр). 5. Лес што падковаю апаясваў Чмялі здаецца памаладзеў… (Л.Дайнека). 6. На жаль страта Полацкага і другіх беларускіх летапісаў пазбавілі нас звестак аб канкрэтных праявах язычніцкага адпору хрысціянству… (К.Тарасаў). 7. На шчасце бераг выдаўся вельмі ўтульны (Я.Маўр). 8. Калі ёсць што найпрыгажэйшае ў свеце то напэўна гэта воблакі (І.Грамовіч). 9. У чарнакніжжы напрыклад абвінавачваліся Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец заснавальнікі друкарні ў Маскве; друкарню разграміў і спаліў невуцкі натоўп які

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

разумеў друкаваную кнігу як “сатанінскую” выдумку (К.Тарасаў). 10. Да месца сказаць зімнія святы адраджэння сонца адзначалі ўсе еўрапейскія народы (К.Тарасаў). 11. Не было помню межаў нашаму шчасцю калі тагачасны старшыня калгаса прыгнаў у вёску экскаватар які непадалёк пачаў неўзабаве капаць сажалку (П.Сабіна). 12. Відаць Андрэй нешта надумаўся (Якуб Колас). 13. Задумаўшы будаваць для свайго манастыра сабор Еўфрасіння натуральна звярнулася да Іаана які да таго часу ўжо стварыў такія адметныя храмы як цэрквы Параскевы-Пятніцы ды Барыса і Глеба ў Бельчыцах (У.Арлоў). 14. Адным словам дзеду Талашу ніяк няможна варочацца дадому – такі быў нязменны прыпеў Панасавых навін (Якуб Колас). 15. Як мы ведаем дынастыя Рагвалодавічаў была ў блізкім сваяцтве з візантыйскімі імператарамі Комнінамі (У.Арлоў). 16. Цяпер Саўка злез з печы ажывіўся парухавеў, – словам другім стаў чалавекам і думак у яго поўная галава (Якуб Колас). 17. Як вядома заказчыцай фрэсак у пабудаваным Іаанам храме была Еўфрасіння (У.Арлоў). 18. Такіх прыгожых месцаў якім быў гэты куток рэдка дзе можна знайсці. Прынамсі так думаў даўганосы бусел каторы меў тут на старадрэвіне пышны палац (Якуб Колас). 19. Была ўжо пэўна позняя восень бо добра памятаю што ў тую раніцу сыпаў калючы сняжок дзьмуў халодны вецер (А.Марціновіч). 20. Веліч подзвігу вымяраецца вядома небяспекаю якую пераадольвае чалавек (У.Карпаў).

***119. Запішыце, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце пабочныя словы, ахарактарызуйце іх значэнні. Назавіце словы, якія хоць і падобныя да пабочных, але іх функцыі не выконваюць.***

1. Нарэшце ранічкаю, калі не зусім яшчэ развіднелася Саўка асмеліўся зайсці ў Цімохаў двор (Якуб Колас). 2. Трэба ж нарэшце пачаць і болей сур’ёзную работу (Якуб Колас). 3. Здавалася і птушак больш стала мацней разлягаліся па лесе іх галасы (Я.Маўр). 4. Усё было прыбрана гладка але Максіму здавалася што варта толькі зірнуць аб'ездчыку каб прымеціць што не хапае аднаго дуба (Якуб Колас). 5. Даўно павыгаралі павыліналі кветкі трава дрэвы паблякла нават неба і ўсё гэта здавалася было зараз аднаго рыжага колеру як сонца (Я.Сіпакоў). 6. Дзеду здавалася што гэта весць усхваляе людзей і ён яшчэ болей упэўніўся ў правільнасці свайго ўчынку (Якуб Колас). 7. Вясна сапраўды шпарка каціла скрозь па абшарах на касагорынах і ўзмежках порстка прабівалася зялёная траўка (В.Быкаў). 8. Беларускае мора. Так нярэдка называюць Нарач. І сапраўды гэта самае вялікае возера Беларусі (В.Вольскі). 9. Нарэшце мы знайшлі нашу сасну не тонкую не тоўстую не гнутую і не сукаватую (І.Сяркоў). 10. Вёсачка да якой я нарэшце дабраўся напэўна не толькі самая далёкая але і самая малая ў сельсавеце (І.Шамякін). 11. Нарэшце хлопцы натрапілі на адзін абрыў дзе з-пад пяску відаць была гліна (Я.Маўр). 12. Калі ж кіёск нарэшце адчыніўся я завалодаў тою кнігаю – гэта быў “Мінскі напрамак”… (Б.Сачанка). 13. Нарэшце сляды збочылі пад тоўстую густую елку дзе амаль што не было снегу (Якуб Колас). 14. Усюды чакалі дажджу і ён недзе пад абед нарэшце зашумеў (Я.Сіпакоў). 15. Нарэшце падышоў самы вялікі, урачысты і адказны момант здабывання агню (Я.Маўр). 16. Аднак не паспела яна [Сцепаніда] дайсці да парога як да яе слыху быццам з-пад зямлі данёсся прыглушаны але магутны нутраны вуркат (В.Быкаў). 17. Грыбоў аднак з кожным годам усё меншала яны адступілі ў глыб лесу… (А.Асіпенка). 18. Можа з гадзіну

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цягнулася навальніца і ішоў такі праліўны дождж што здавалася мог заліць які хочаш пажар (Я.Маўр). 19. Аўтамабіль так чадзіў бензінам, што здавалася дзівам як у ім сядзяць і едуць людзі (Я.Рамановіч). 20. Здавалася што там у вадзяным блакітным прадонні было штось жывое, таемнае (В.Шымук).

***120. Складзіце або выпішыце з твораў мастацкай літаратуры сказы, у якіх словы аднак, відаць, можа, напэўна, праўда з'яўляюцца пабочнымі, і сказы, у якіх гэтыя словы функцыі пабочных не выконваюць.***

***121. У сказы замест пропускаў устаўце патрэбныя, на вашу думку, пабочныя словы, спалучэнні слоў, сказы. Прасачыце, як пры гэтым змяняецца семантыка сказаў.***

1. Партызанскі доктар Талейка падыходзіў да лячэння раненых па-свойму. Галоўнае, ___________, абнадзеіць іх, узняць іх дух, прымусіць паверыць, што выздаравеюць, а розныя таблеткі, пілюлі, мікстуры – справа другарадная (Т.Хадкевіч). 2. Але вось у гэтай цішыні пачуўся тонкі галасок. Няўжо, ___, рабчык адклікаецца? (Р.Ігнаценка). 3. Дзед Талаш, ____, быў задаволены, слухаючы водгулле труб (Якуб Колас). 4. ____, нідзе так хораша не адчуваў сябе пісьменнік, як у родных беларускіх вёсках, сярод родных людзей (І.Мележ). 5. ____, узгорак гэты – часовы штаб дзеда Талаша (Якуб Колас). 6. Пагасіць вогнішча, _____, трэба (Я.Маўр). 7. ____, сам свет гатовіўся як можна лепш сустрэць калядны вечар (Якуб Колас). 8. Іншы раз, ____, вецер невялічкі, грымоты ў меру, а выйдзеш назаўтра ў лес, дык вываратняў не злічыць (С.Александровіч). 9. ____, памеркаваўшы ды падумаўшы, можна да чаго-небудзь і дадумацца (Якуб Колас). 10. Было ўжо за поўнач, але паветра не толькі халаднела, а, ____, нават цяплела (Я.Маўр).11. Пад час высылкі Рагвалодавічаў ігумення Еўфрасіння заставалася, _____, адзінаю прадстаўніцаю полацкай дынастыі на радзіме (У.Арлоў). 12. ____, справа ніколькі не высветлілася (Я.Маўр). 13. Найвышэйшы ўзлёт полацкай архітэктурнай школы, звязаны з творчасцю дойліда Іаана, прыпадае на гады асветніцкай дзейнасці Еўфрасінні, што, ____, зусім невыпадкова (У.Арлоў). 14. _____, хто сее вецер, той пажынае буру (Якуб Колас). 15. Дзяцінства князёўны праходзіла, ____, не толькі ў бацькавым хораме (У.Арлоў). 16. На адзіноце прыходзяць думкі, якія, _____, ніколі не наведваюць чалавека, запрэжанага ў цяжкі воз паўсядзённасці (І.Навуменка). 17. Надвор'е, ___, было добрае (А.Кажадуб). 18. Я нарадзіўся ў драўляным Мінску, ___, драўлянымі былі тады пераважна ўскраіны (Я.Рамановіч). 19. Вершаліны бяроз, ___, абліты золатам, густым ярка-барвовым полымем гараць макаўкі асін (І.Навуменка). 20. Да вандроўкі я доўга і клапатліва рыхтаваўся. ___, яшчэ ўзімку купіў лыжны касцюм, лёгкія гумавыя балеткі, набыў кацялок, ранец (Б.Сачанка).

*Параўнайце з арыгіналам: 1) на яго думку, 2) думаю, 3) відавочна, 4) мабыць, 5) словам, 6) безумоўна, 7) здаецца, 8) здаецца, 9) словам, 10) здавалася, 11) магчыма, 12) адным словам, 13) вядома, 14) кажуць, 15) вядома, 16) здаецца, 17) і праўда, 18) праўда, 19) здаецца, 20) памятаю.

***122. Прачытайце ўрыўкі з тэкстаў. Выпішыце з іх сказы з пабочнымі канструкцыямі, прааналізуйце іх семантыку. Укажыце, да якіх груп належаць пабочныя словы па суадноснасці з часцінамі мовы? Растлумачце знакі прыпынку ў складаных сказах.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Княжбор. Так завецца вёска, хаця ніякага бору каля яе няма і ў паміне. Мо ад суму па гэтым бары і назвалі так людзі сваё селішча, таму што княжборцы радаслоўнай не памятаюць. Адкуль яны прыйшлі, ёсць, канечне, у іх свае паданні і сказы, але паданні гэтыя мала што растлумачваюць, бо яны складваліся ўжо тут. А Княжбор – вёска вандроўная.

*В.Казько. Неруш*

2. Максім тупаў па двары. Тая бяда, што навалілася на дзедаву хату і яго сям'ю, здавалася, абмінула Максіма і не налажыла на яго свайго адбітка. Прынамсі, на Максімавым твары не заўважалася нічога такога, што сведчыла б аб згрызотах і трывогах душы. Але і не вечна ж заставацца твару адным і тым жа, а ў Максіма, быць можа, была прычына праясніць свой твар.

*Якуб Колас. Дрыгва*

3. Калі ёсць што найпрыгажэйшае ў свеце, то, напэўна, гэта воблакі. Як яны збіраюцца, як плывуць і растаюць у сіняве – не наглядзецца, не налюбавацца!

Ляжыш на пагорку, глядзіш у неба, а над табою – позіркам не абняць – блакітная шырыня. Ты адзін перад усёй гэтай бязмежнай, нямой глыбінёй, з вока на вока, толькі, здаецца, матухна-зямля злёгку трымае цябе за плечы.

*І.Грамовіч. Воблакі*

4. Дзед Талаш не проста праваднік у Букрэевай разведцы. Па-першае, ён сам паўнапраўны ваяка: ён мае "настаяшчую" ваенную стрэльбу і сорак пяць патронаў, па-другое, у яго ёсць свая каманда, цэлых восем чалавек сялян з Высокай Рудні.

*Якуб Колас. Дрыгва*

5. Якуб Колас не быў бы тым Якубам Коласам, якога мы сёння ведаем, калі б ён не паказаў "вобразы мілыя роднага краю" – цудоўную красу беларускай прыроды ва ўсе поры года, ва ўсіх мнагалікіх праявах. Сапраўды, перад намі вялікі і тонкі мастак-пейзажыст, які, як ніхто з беларускіх паэтаў, адчуваў прыгажосць роднай Беларусі і які ўмеў проста, але з незвычайным майстэрствам перадаць шматколерныя, каларытныя фарбы дарагога Наднямоння.

*С.Александровіч. Сейбіт песні і мудрасці*

***123. Перакладзіце тэкст на беларускую мову, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце пабочныя канструкцыі.***

1. Достопримечательности

Это – киевские вывески. Что на них только написано, уму непостижимо.

Оговариваюсь раз и навсегда: я с уважением отношусь ко всем языкам и наречиям, но тем не менее киевские вывески необходимо переписать.

Нельзя же в самом деле отбирать в слове "гомеопатическая" букву "я" и думать что благодаря этому аптека превратится из русской в украинскую. Нужно наконец условиться как будет называться то место где стригут и бреют горожан: "голярня", "перукарня", "цирульня" или просто-напросто "парикмахерская".

Мне кажется что из четырёх слов – "молошна", "молочна", "молочарня" и "молошная" – самым подходящим будет пятое – "молочная".

Ежели я заблуждаюсь в этом случае то в основном я всё-таки прав: можно установить единообразие. По-украински, так по-украински. Но правильно и всюду одинаково.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А то: что например значит “С.М.Р. іхел”? Я думал что это фамилия. Но на голубом фоне совершенно отчётливы точки после каждой их трёх первых букв. Значит это начальные буквы каких-то слов? Каких?

Прохожий киевлянин на мой вопрос ответил:

– Чтоб я так жил, как я это знаю.

Что такое “Кагасик” – это понятно, означает “Портной Карасик”. “Дитячій притулок” понятно благодаря тому, что для удобства национальных меньшинств сделан тут же перевод: “Детский сад”, но “смеріхел” непонятен ещё более, чем “Коуту всерокомпама”, и ещё более ошеломляющ, чем “Ідальня”.

*М.Булгаков. Киев-город*

2. В Петербурге в числе многих прекрасных обыкновений есть обыкновение строить дома с подвалами то есть оно если хотите не совсем с подвалами а как бы вам сказаць – с нижними жильями которые до половины находятся в земле а другою половиною смотрят на свет божий через небольшие окна опирающиеся с улицы на мостовую. В них как надобно полагать жить чрезвычайно приятно. Во-первых одно удовольствие нанимать квартиру ни на земле, ни под землёю и притом за довольно дешевую цену. Это в отношении к ценности других квартир должно возвышать человека до самого верхнего этажа дома в подвале которого жить имеет он счастие.

Во-вторых его должно услаждать то что он уже никогда не будет страдать чахоткою если не получит ее во время обитания в вышеупомянутом жилище “ни на земле ни под землей”. В-третьих … но всех причин не перечтешь и до завтра … Чем предполагать войдем лучше в один из таких подвалов и проверим предположения. Вот мы и вошли. Комната довольно чиста и опрятна; пол вымыт, выметен, мебель … Но где же тут мебель? Два плетеные стула один кожанный диван турецкий зачиненный в разных местах русской выбойкой; столик маленький некрашенный с отверстием в боку напоминающим что в нем некогда был ящик. Другой стол побольше в углу; на столе глиняная кружка кувшин несколько тарелок три деревянные ложки и одна … позвольте … точно серебряная … что за роскошь? серебряная ложка! Налево от двери русская печка которая как можно заметить несколько дней уже топлена. На припечье сковорода в углу дружно с кочергою ухват; в печурке серенький кремень и огниво. Направо от двери вешалка с женской одеждой ее немного три ситцевых платья драдедамовый выношенный салоп и … позвольте … точно … бархатный черный капот почти новый и прекрасно сделанный … опять роскошь!.. Но вот кажется и все …

*Н.Некрасов. Жизнь Александры Ивановны*

## УСТАЎНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ

***124. Знайдзіце ў сказах устаўныя канструкцыі і вызначце іх структуру (слова, словазлучэнне, спалучэнне слоў, сказ).***

1. Я назіраў за турлачкамі – так называюць у нас дзікіх галубоў – і ціхенька сам сабе смяяўся (У.Рубанаў). 2. З-за думак сваіх Ганна амаль не чула ні зайздрослівага мачышынага войкання – вой, якая хустка! – ні бацькавага неспакою аб тым, што людзі ўжо раз'язджаюцца (І.Мележ). 3. У Паўла і Васі (адзін – сакратар райсавета, другі – старшыня раённага аддзела асаавіяхіма) была бронь, аднак

хлопцы вырашылі ісці на фронт (Я.Брыль). 4. Колькі Міканор ні стараўся, а перадсвяточная вясёлая ліхаманка ў Куранях не толькі не ападала а – было́ чу́тна – усё мацнела (І.Мележ). 5. Адны ішлі на чыгунку – а яна праходзіла тут непадалёку – рамонтнымі рабочымі, другія складалі кадры батракоў і служачых у заможнікаў-кулакоў (Якуб Колас). 6. Цяпер ён ехаў і пазнаваў, успамінаў дарогу: вось скора будзе паваротка, там прысады, пахіленыя ў адзін бок (некалі сагнула ветрам), далей масток праз ручай (Л.Арабей). 7. Антон ужо ведаў, што да чалавека з заложнікам – сям'ёй, дзецьмі, маці – немцы ставіліся куды з большым даверам, чым да адзіночкі, у якога ні кала, ні двара (В.Быкаў). 8. Нешта ў ім ажывала, адтайвала, неяк непрыкметна (а мо нават занадта хутка!) капітан пачынаў рабіцца другім чалавекам… (У.Дамашэвіч). 9. Пад нагамі – Махорка згледзеў – на пяску былі сляды ад машыны (І.Пташнікаў). 10. Страляў Бушмар добра (разам з бацькам найлепшымі паляўнічымі былі), але палітграмата – дык гэта была для яго пакута (К.Чорны). 11. У рэкрэацыйнай чакалі ўжо Фельдбаўх і швейцарскі француз monsier Jannot (гэтаму, як найбольш тэндэтнаму, дазвалялася снедаць у сваім пакоі) (У.Караткевіч). 12. Усё ж вочы маці – жаласць, трывога і любоў – запалі ў сэрца (І.Мележ). 13. Чысты пакой у Буяна – на старасвецкі манер – з вялізнай печчу і палацямі (І.Навуменка). 14. Іначай – пасля грымотаў – бачацца і свецяцца поле і сенажаць, сад і дуброва, чалавек і птушка (Ф.Янкоўскі). 15. Мы ўжо ў свой час паказалі, што трэба адрозніваць Старажытную (летапісную) Літву ад сучаснай (М.Ермаловіч).

***125. Выпішыце спачатку сказы з устаўкамі неканструкцыйнага тыпу (удакладненні, якія можна граматычна ўключыць у асноўную сінтаксічную канструкцыю), а потым сказы з устаўкамі канструкцыйнага тыпу (такія ўстаўкі не ўпісваюцца ў структуру сказа).***

1. Дзед – чамусьці Барысавіч быў перакананы, што наперадзе ішоў дзед, – цюкаў па зямлі кіем (А.Кажадуб). 2. Мелодыя (гэта чулася ў кожным яе адценні) ішла з самай глыбіні вякоў (А.Ліс). 3. Мільён купін з каржакаватымі (нязграбнымі) хвойкамі рассыпаліся па балоце (Якуб Колас). 4. Старажытны род магнатаў Сапегаў, што паходзіў ад полацкіх баяр і лічыўся другім па значнасці (пасля Радзівілаў) родам на Беларусі, даў Бацькаўшчыне шмат вядомых людзей (У.Арлоў). 5. Надзіва, Лазар даволі хутка выйшаў да рэчкі – яна выглядала незайздросным ручаём, які і цяпер, у мароз, весела булькаў на абледзянелым каменні, – перабраўся на той бераг і ўзрадаваўся, што ідзе верным шляхам (А.Асіпенка). 6. Малая дзяўчынка Галя, – якая плакала, – згубіла сваю маці (І.Мележ). 7. Глінішчы (мы гэта ведалі) былі за балотам, непадалёку ад Вялікага Бору (Б.Сачанка). 8. Бацькаў позірк чакаў, патрабаваў і разам з тым – загадзя – асуджаў (І.Мележ). 9. І добра, што печнікі, Валуй з Парэпкам – яны адны складалі на вёсцы печы, пліты і грубкі – былі людзі з выдумкай (А.Кажадуб).
10. Мужчынскі касцюм дапаўняўся паясным (штаны, споднi, порты, шаравары), плечавым (кафтан і жупаны) і верхнім (кажухі, шубы, дылеі, армякі, апончы, даламаны, ферэзі) адзеннем (Этнаграфія Беларусі). 11. Мне не лёгка расставацца з табою (хоць даўно ўжо мінуў аўдыенцыі час) (М.Танк). 12. Змураваная за адзін будаўнічы сезон Спасаўская або Спаса-Прэабражэнская (цяпер яе часта не зусім правільна называюць Спаса-Еўфрасіннеўскай), царква – вяршыня архітэктурнай думкі Полацка (У.Арлоў). 13. Ікон такіх ваявода Глеб напісаў дзве – адну для

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

манастыра, другую сыну (яна цяпер вісела ў старога дзеда Загорскага) (У.Караткевіч). 14. У саміх Юравічах (тут былі і Апейкава задума і яго кіраванне) зрабілі інтэрнат для дзяцей з далейшых сёл (І.Мележ). 15. І з гэтага часу меч узнімаюць Рагвалодавы ўнукі (г.зн. полацкія князі) супроць унукаў Яраслава (г.зн. кіеўскіх князёў) – такімі словамі заканчваецца летапіснае апавяданне (М.Ермаловіч). 16. Белы – проста праз клумбу – падскакаў да тэрасы, зноў узняў Алеся і лёгка перасадзіў яго цераз парэнчы на рукі жанчыне (У.Караткевіч).

***126. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце сэнсавую функцыю ўстаўных канструкцый (тлумачальна-ўдакладняльная, прычынна-вызначальная, мэтава-ўдакладняльная, даведачна-адсылачная, мадальна-ацэначная).***

1. Асновай як жаночага, так і мужчынскага касцюма была кашуля сарочка (Этнаграфія Беларусі). 2. У Махоркі расшпілілася на грудзях чорная рубашка раз'ехаўся замочак і спаўзла з плячэй (І.Пташнікаў). 3. Валока не хацеў паказваць немцу свае слабасці крый божа, не застагнаць і, дапамагаючы сабе рукамі, устаў на ногі (В.Быкаў). 4. Паслалі Загорскія яшчэ і трыста рублёў грашыма, каб хоць раз на дзень карміць гарачым дзяцей, жанчын і слабых у цёткі было нешта каля васьмідзесяці душ (У.Караткевіч). 5. Выняў Сцёпка з кішэні ліст, палажыў на разгорнутую кнігу ну, на ўсякі выпадак і стаў чытаць (Якуб Колас). 6. Міканор бачыў, як – мабыць, не ў першы раз – каля печы Алёшава маці выцірае слёзы як сумная ціснецца да падаконніка Алёшава сястра як дыміць люлькаю спусціўшы ногі з печы яго бацька (І.Мележ). 7. Тады, калі Данік насіў пану Цабу грыфель таксама дурань: не мог спытацца сам у класе, чый ён!.. у пана Цабы яшчэ наймічкі не было (Я.Брыль). 8. У адведкі прыходзілі жанчыны праз дзень-два пасля родаў (у наш час, як прывязуць парадзіху з раддома), несучы з сабой у клуначку ці місачцы таму на Магілёўшчыне гэты звычай называецца “пайсці з міскай” печыва, што-небудзь варанае, бліны, сыр (Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі). 9. Пасля з дарогі запахла сенам перастояла трава і здалёку ў твар дыхнула настоем спелага ячменю (І.Пташнікаў). 10. Узболатак і балота не якія-небудзь далёкія, а зараснікі алешніку і лазы, можа, за сто крокаў ад Ганнінага агарода кішэлі гадаўём (І.Мележ). 11. Адназначнасць тэрмінаў, знакаў – найважнейшая ўмова канкрэтызацыі любой тэорыі, хоць у змястоўных, г.зн. нефармальных, нефармалізаваных, тэорыях гл. Фармалізацыя тэорый гэтае патрабаванне выконваецца часта толькі прыблізна (БелСЭ). 12. Неўзабаве Вольчына чарада – асабліва “кабанчыкі” – расхадзілася так, што скакалі і на печы, і на палацях, і пад палацямі лазілі (І.Мележ). 13. Шынялёк на Юрку салдацкі, але акуратна прыгнаны па росту на гэта ён быў мастак і ў вучылішчы, бо трошкі фарсун і акураціст (В.Быкаў). 14. Усё сяло, старыя і малыя, сышліся як на свята: заняткі доўга нельга было пачаць ад таго, што кожнай матцы, кожнаму бацьку хацелася паглядзець, як будуць іхні – ці іхнія – вучыцца (І.Мележ).

***127. Выпішыце спачатку сказы з устаўнымі канструкцыямі, у складзе якіх ёсць злучнікі (злучальныя ці падпарадкавальныя), затым сказы з устаўкамі без злучнікаў. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Растлумачце функцыю злучнікаў у складзе ўстаўных канструкцый.***

1. Скарынка пахла тавотам, мусіць, формы змазвалі тавотам, каб буханкі лепей адставалі добра вымаліся, але, нягледзячы на гэта, хлеб быў такі смачны, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

хацелася сесці тут жа, ля дарогі, на пыльную траву і есці, есці, есці (Я.Сіпакоў).2. Сёння ўсё Верасава, як змовіўшыся, выйшла на жніво выгнала ясная сухая пагода і кругом на кароткіх яшчэ загонах цемнавага ржышча свяціліся жаўтлявай саломай першыя дзесяткі нажатых і пастаўленых пад пякучае сонца снапоў (В.Адамчык). 3. Каб аблягчыць працу перавозчыкаў а іх звычайна было два: адзін у пярэднім, а другі ў заднім носе жэўжыкі запальвалі паходні і асвятлялі вадзяны прастор аж да небакраю (У.Калеснік). 4. Я зрабіў некалькі здымкаў яны шмат разоў з'яўляліся ў нашым друку і мы пайшлі далей (С.Грахоўскі). 5. Кожны, хто сустракаўся, гутарыў з Пятром Клімчуком а я належаў да такіх шчаслівцаў несумненна зведаў цёплае пачуццё ўлюбёнасці (“Маладосць”). 6. А над гэтым верасам, над гэтай празрыстасцю, над палямі і лугамі недзе да абеду Верасоўскі чамусьці ніколі не бачыў, каб птушкі ляцелі ў вырай з раніцы чарада за чарадою спяшаліся туды, куды сплывала цеплыня, пералётныя вандроўнікі (Я.Сіпакоў). 7. Юнаком я доўга жыў непадалёку ад цяперашняга возера, на Старажоўцы, так называўся драўляны раён з невялічкаю пякарняй і цеснай цэркаўкай на могілках (М.Лужанін). 8. Нашчадкі не вераць а можа і вераць падсвядома, памяццю тысячагоддзяў у лясных багоў. (У.Караткевіч). 9. Гэты гарадок ляжаў на маёй дарозе з Мінска дамоў, недзе на яе сярэдзіне, і калі ехаць чыгункай усё роўна куды – дамоў ці з дому, тут абавязкова трэба было рабіць перасадку (А.Кудравец). 10. Тканы ў рознакаляровыя дробныя шашачкі андарак быў як трохі прыглушаны бо так патрабаваў узрост жар і дзівосны па спалучэнні колераў (У.Караткевіч). 11. Вулей звычайна ставіўся на рыштунку, што зваўся і завецца няхітра і зразумела: стайла там, па-над Прыпяццю, – стайло (Ф.Янкоўскі). 12. Доўга бадзяўся алень па гушчарах, ужо іншым, правым рогам кляйміў дрэвы – дзе бярэзіну, дзе асіну, дзе алешыну, дзе клён, – пакуль нарэшце і той рог не скінуў (В.Карамазаў). 13. Праўнучка Хруцкага, кіеўская мастачка Ядвіга Мацієўская яе дзяцінства прайшло ў Захарнічках, а таксама полацкія краязнаўцы мараць, што некалі з Полацка можна будзе з’ездзіць у мемарыяльны музей-сядзібу водбліз возера, якое тутэйшыя сяляне, забыўшы яго афіцыяльную назву, звычайна называюць Хруцкім (У.Арлоў). 14. А да таго часу ягоныя суседзі (і, напэўна, дзеці), трохі маладзейшыя за яго [дуб], стануць такія самыя, а тады значыцца і падаць можна (У.Караткевіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

## СКЛАДАНЫ СКАЗ

### СКЛАДАНАЗЛУЧАНЫЯ СКАЗЫ

**128. Вызначце разнавіднасці спалучальных адносін паміж часткамі складназлучаных сказаў (адначасовасць, паслядоўнасць, прычынна-выніковыя, умоўна-выніковыя). Назавіце сродкі, з дапамогай якіх выражаюцца разнавіднасці спалучальных адносін.**

1. Агонь баязліва дрыжаў і ледзь прыкметна скакаў, і пераліваўся змрок на сцяне (Якуб Колас). 2. Стрыечная сястра жыве недалёка ад пераезда, і да яе найлепей ісці пуцямі (І.Навуменка). 3. Поезд прыйшоў у Маскву раней, і прапаршчык Абдзіраловіч быў задаволены раннім прыездам (М.Гарэцкі). 4. Марына Паўлаўна асцярожна ўсміхаецца, і гэтая ўсмешка доўга застаецца ў яе на твары (М.Зарэцкі). 5. Заплюшчыш вочы, і дзіўныя абразкі маленства плывуць перад табой (З.Бядуля). 6. Застылі на дарогах сінія туманы, і здзіўлена ўзыходзіць сонца над зямлёй (П.Пестрак). 7. Гарманіст іграў, і з дрэў са звонам лісцвяная сыпалася медзь (К.Кірэенка). 8. Жухнуць травы, і ў сады, на поле вецер ліўні золкія прыносіць (М.Калачынскі). 9. Раптам адчыніліся дзверы, і Казімеру давялося пазнаёміцца з самім гаспадаром двара і дома (К.Чорны). 10. За Рыбаком саступіў Сотнікаў, і яны абапал сцежкі пайшлі па снезе да хаты (В.Быкаў). 11. Лес пачаў чэзнуць, радзець, і хутка бязмежная раўніна адкрылася нашым вачам (У.Караткевіч). 12. Дарога пачала паніжацца, і сыпкі пясок яе змяніўся мяккім, падатным забалочаным грунтам (І.Мележ).

**129. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Растлумачце, чаму ў адных выпадках трэба ставіць коску паміж часткамі складаназлучанага сказа, а ў другіх – не.**

1. У гэтай радасці ночы не плылі а ляцелі і світальныя зоры прыходзілі заўсёды вельмі рана (І.Мележ). 2. На сенажаці звінелі косы і працавалі касцы (З.Бядуля). 3. Невялічкія ляскі з’яўляліся і знікалі і зноў цягнулася раўніна, бурая раўніна (У.Караткевіч). 4. Таццяна паспешліва накрыла стол і сама прысела побач (М.Зарэцкі). 5. Дарогі нідзе не было відаць і Сотнікаў падумаў пра недалёкую вёску (В.Быкаў). 6. Ноч ляжала над усёй зямлёй і ўсё здаецца патанула ў ёй (К.Чорны). 7. Вечарэе і бярэцца на мароз (Я.Брыль). 8. Пусты-пусты аэрадром… Гляджу і сэрдца стыне (М.Калачынскі). 9. Прагуляемся па гэтых мясцінах і настрой стане лепшым (Э.Самуйлёнак). 10. Над вёскай толькі бліскаў месяц ды дзе-нідзе мігцелі зоры (П.Трус). 11. Паклаў свае сілы рабочы немала і вось зерне домам цудоўным устала (К.Кірэенка).

**130. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце, якія разнавіднасці супастаўляльных адносін выражаюцца паміж прэдыкатыўнымі часткамі складаназлучанага сказа (уласна супастаўляльныя, супраціўныя ці неадпаведнасці).**

1. Пры сустрэчы запрасілі на вячэру і Абдзіраловіча але ён спазніўся (М.Гарэцкі). 2. У глыбіні душы Вера безумоўна толькі смяялася з Матруны Іванаўны але разам з тым дзяўчына адчувала да яе найшчырэйшую сімпатыю і сябравала з ёй (М.Зарэцкі). 3. Старых хат даўно няма а памяшканне пад жалезным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дахам яшчэ трывае (І.Навуменка). 4. Першыя зоры ўжо замігцелі ў небе а з-за лесу залатым пажарам узнімаўся кругам блішчасты месяц (Якуб Колас). 5. Ноч была без месяца і зор але дарога выразна вымалёўвалася сярод лесу (Т.Хадкевіч). 6. Стоячы на краі хмызу, Рыбак хвіліну ўглядаўся-ўслухоўваўся ды нічога падазронага быццам не было чуваць (В.Быкаў). 7. Ночы былі светлыя а ў такія ночы балотная рысь пакідае сітнягі і ходзіць па нашай раўніне (У.Караткевіч). 8. Халімон гаварыў ціха, роўна але Ганна пачула яго незадаволенасць (І.Мележ). 9. Яноўская пайшла ў свой пакой а я ўсё глядзеў на маленькую фігурку ў старажытным убранні (У.Караткевіч). 10. Сонца ўжо пачало паказвацца з-за лесу але шэры змрок яшчэ не рассеяўся (Якуб Колас). 11. Месяца не было відаць за хмарамі але нейкая няпэўная хваравіта-шэрае святло залівала пусткі (У.Караткевіч). 12. Лета закончылася ды спёка ніяк не спадала (Т.Хадкевіч).

***131. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Укажыце разнавіднасці пералічальна-размеркавальных адносін паміж часткамі складаназлучанага сказа (пералічэнне адналькава магчымых з'яў і падзей; пералічэнне адналькава немагчымых з'яў і падзей; папераменнае чарговае з'яў і падзей; узаемнае выключэнне з'яў і падзей). Падкрэсліце сродкі, з дапамогай якіх выражаюцца названыя адносіны.***

1. Няярка свеціць восеньскае сонца або халодныя дажджы набягуць і сеюць нудную, шэрую смугу (М.Гарэцкі). 2. Вера падоўгу ўглядалася ў зімовы змрок за акном або яе проста непакоіла становішча ў вёсцы (М.Зарэцкі). 3. То вячэрні змрок кладзецца на зямлю то лье бесперапынна нудны дождж то туманы плянёнкай ахінаюць зямлю (У.Караткевіч). 4. Ні дрэвы не шумяць ні птушкі не спяваюць такой ціхай ноччу (Якуб Колас). 5. То ўсплеск пачуецца чаўна то вецер запяе (К.Кірэенка). 6. Ці ўспомніў ты гэтых людзей ці можа ты ўбачыў дзе іх? (М.Калачынскі). 7. Ці то шуміць ля печы калаўрот ці то віхура за вакном вядзе свае песні? (Якуб Колас). 8. Вясной ў нашых краях сонца свеціць або дождж лье (В.Быкаў). 9. Не то дзяцел стукае дзесь у пушчы не то хтось дрэва сячэ (І.Навуменка). 10. Дзяўчыну заўсёды сустракалі ля пераезда ці сусед падвозіў на кані (І.Навуменка). 11. Або мы пойдзем на пераезд або сястра сустрэне нас амаль за вёскай (Я.Брыль). 12. То мароз за ноч скуе ўсе лужыны то ўдзень зноў сонца падагрэе і ваду растопіць (Якуб Колас).

***132. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах з далучальнымі часткамі. Злучнікі падкрэсліце.***

1. Восеньскія вечары ў Балотных Ялінах былі надзвычай доўгімі і сумнымі ды і зімой тут было маркотна (У.Караткевіч). 2. Дождж хутка перастаў а гэта было цяпер самае галоўнае (В.Быкаў). 3. Нарэшце выпаў першы снег але снег быў мокры і адразу ператвараўся ў дождж (М.Калачынскі). 4. Вёска была яшчэ далёка ды і ісці трэба было лесам ды ўзболаткам (І.Мележ). 5. Ноччу мароз быў нямоцны ды і то некаторыя мелкаводныя рэчкі пазамярзалі (К.Кірэенка). 6. Перад намі быў сапраўдны змешаны лес прычым размяшчаліся дрэвы ярусам (І.Навуменка). 7. Засынае вёска і над вёскай запальваюцца адзінокія зоры (Якуб Колас). 8. На полі засталося ўсяго некалькі чалавек ды і тыя збіраліся дадому (І.Пташнікаў).

**133. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Падкрэсліце складаназлучаныя сказы. Назавіце сэнсава-граматычныя адносіны, якія выражаюцца паміж іх часткамі.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дорога от Москвы до Троицкой лавры, а от Лавры до Александровой Слободы представляла самую живую картину. Беспрестанно скакали по ней царские гонцы, и толпы людей всех сословий шли пешком на богомолие. Отряды опричников спешили взад и вперёд, да и охотники отправлялись из Слободы в разные деревни за живыми голубями. Ехали с товарами купцы, сидя на возах или провожая верхом длинные обозы.

Немалым богатством сияли Слободские церкви. Славный Храм Богоматери накрыт был снаружи яркою живописью, а на каждом кирпиче блистел крест, и церковь казалась одетою в золотую сетку.

Очаровательный вид этот разогнал на время мрачные мысли, не оставлявшие князя Серебрянного всю дорогу, но вскоре он опять вспомнил о кручине. Подъехав к валу, князь и его товарищи спешились и привязали лошадей к столбам, однако оружия дружина не стала брать с собой и оставила подле лошадей. Приезжие вошли на огромный двор, наполненный людьми, но никто не обратил внимания на них. Или люди пели псалмы, или они громко молились, не замечая никого вокруг.

***А.Толстой. Князь Серебряный***

## СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫЯ СКАЗЫ

***134. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Ахарактарызуйце будову сказаў (расчлянёная ці нерасчлянёная) і тыпы дадзеных частак.***

1. Вярнуўшыся ад печы, Захарыха глянула зноў так строга што Хадосьцы стала боязна (І.Мележ). 2. Зачалося ўсё з пустога, але скончылася так што наш дока, зух і гога сам уклюкаўся, бядак… (Якуб Колас). 3. Спатканне адбылося ў горадзе, у цесным нумарным пакойчыку драўлянай жактаўскай гасцініцы дзе спынілася Галена (К.Чорны). 4. Баюся падшавельваць Петрусёву душу бо яна і так кіпіць… ("Полымя"). 5. Сцежкай ад вёскі агароды, дрэвы і хаты якой відаць з вышэйшага берага прыйшоў сюды хлопец (Я.Брыль). 6. Валялася тоненькае карэнне ад маладых сасонак бы яго хто надзёр на кошыкі (І.Пташнікаў). 7. Раніцай таго дня калі Саколіч і яго спадарожнікі спыніліся на балотным астраўку адбылося першае пасяджэнне абкома (М.Лынькоў). 8. Чым далей ён [Васіль] так ступаў, мерна, лапаць за лапцем тым больш цела яго – рукі, ногі, спіна – наліваліся зняможнай стомай… (І.Мележ). 9. Той хто валодае верою народа той валодае і ягонаю душою ("Маладосць"). 10. Жаваранка ўбачыў што на падводзе мужчына з белай павязкай на галаве (І.Пташнікаў). 11. Як мужыку бяда дак пану каляда (Прыказка). 12. Зямляк з Мазыра вельмі разумна гаварыў пра тое што зарастаюць вакол Прыпяці рэкі і сплаўныя каналы… (І.Мележ). 13. Тое, што робіцца ў Веньямінавай душы цяжка назваць пэўным словам (І.Навуменка). 14. Калі сям'я была бяздзетнай уся яе маёмасць пераходзіла да сваякоў (Этнаграфія Беларусі). 15. Мы вяртаемся таму што нас праводзяць вочы мілых, губы іх і любы смех… (К.Кірэенка). 16. Глушак хоць улавіў нібы намёк на Яўхіма засмяяўся невясёламу Цацураваму жарту (І.Мележ). 17. Бегала Алеся туды каб убачыць асаднікавага сына (В.Адамчык). 18. У тоне Сцёпкавага адказу была мяккасць і пашана да стрэлачніка што таму вельмі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спадабалася (Якуб Колас). 19. Жамчужна-блакітная рака ледзь шалахцела млявымі хвалямі якія на пяску здаваліся зусім ружовымі (У.Караткевіч). 20. Што б і дзе ні здарылася ён [Несцяровіч] успрымаў усё як яшчэ адзін крок наперад, і не да горшага, а да лепшага (Б.Сачанка).

***135. Выпішыце спачатку складаназалежныя сказы з дададзенымі дапаўняльнымі часткамі, потым – з дададзенымі дзейнікавымі. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку.***

1. Васілю было чутно як трапеча, б'ецца каля яго рукі Ганніна сэрца…(І.Мележ). 2. Крыніцы нічога не гавораць ці аказаў Усяслаў якое-небудзь супраціўленне сваім ворагам (М.Ермаловіч). 3. І тады яму, Завішнюку, падумалася што для яго цяпер гэтая светлая палоска на тым канцы лініі ягонае прыстанішча ягоная мара (І.Пташнікаў). 4. Як патрабавальна ставіўся У.Карпаў да сябе сваёй працы гавораць многія ("Маладосць"). 5. Але я ўспомніў колькі ўжо мала засталося хвілінак з майго часу і махнуў рукой (В.Быкаў). 6. У гэты момант пачулася як зашоргалі па ржэўніку чыесьці ногі (І.Чыгрынаў). 7. Алесь не мог зразумець адкуль гэтаму хлопцу стала вядома яго таямніца, ягонае адкрыццё (У.Караткевіч). 8. Хацеў тады бацька каб і Іван завод у Гудове кідаў, назад, да зямлі, вяртаўся, дбаў пра свой уласны кавал поля (В.Адамчык). 9. У хлопца было тое чаго ў Даніка ніколі не будзе бацька і браты (Я.Брыль). 10. У Ермалковіча мы таксама папыталіся ці чуў ён пра свайго славутага земляка Францішка Багушэвіча? (К.Цвірка). 11. Зазыбу зноў прыйшло ў галаву думаць чаму раптам аднекуль вярнуўся Чубар… (І.Чыгрынаў). 12. Алесі здалося раптам што ў бацькі змянілася хада… (В.Адамчык). 13. Зірнуўшы ў твар Цішку, можна было зразумець што гэты чалавек, як той кажа, "сам сабе наўме" (М.Зарэцкі). 14. Нават тое як спакойна сядзела, чакала свайго дачка таксама вярэдзіла яго [Чарнушкі] душу (І.Мележ). 15. Цяпер мы ведалі што нямецкую мову будзем любіць. Нават двойкі будзем любіць ад такой настаўніцы (Я.Скрыган). 16. Тое што Васілька прыходзіўся ўнукам Манамаху магло пэўным чынам абараніць яго ад высылкі з іншымі полацкімі князямі (М.Ермаловіч). 17. У хісткім чырвоным святле ад агню Апейка стаў расказваць якія машыны бачыў нядаўна ў Мінску выпушчаныя для сялян (І.Мележ). 18. Так і выйшла што маім хрышчоным бацькам стаў абшарнік (Я.Скрыган). 19. Дзед Піліп, бабка Цынклета і ўся іхняя хеўра, і іх правадыр Чыкілевіч спачатку не ведалі што значыць усё гэта (Якуб Колас). 20. На двары чуваць як скрыпяць вяроўкі ад калыскі (К.Чорны). 21. Адсюль добра было відаць як двое ў чорных пілотках з расхрыстанымі каўнярамі мундзіраў краліся па жыце да тока (В.Быкаў). 22. [Конан:] – Што не ў меру тое ў шкоду (М.Лобан).

***136. Выпішыце спачатку складаназалежныя сказы з дададзенымі выказнікавымі часткамі, потым – з дададзенымі азначальнымі. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку.***

1. Пасцель у яго [Сцёпкі] такая што ў Заборцах магла яму толькі прысніцца (Якуб Колас). 2. На полі корпаліся людзі, цешыліся з новых дзяляначак зямлі што натрапіліся ім пасля панскага продажу (К.Чорны). 3. Сягоння мы ўжо не тыя што калісь хадзілі ў яслі… (Я.Пушча). 4. Але Вейсу добра гаварыць аб місіі, маючы на радзіме багаты маёнтак, салідныя ўклады ў банку, сям'ю якая мае ўплыў на ўсё жыццё невялікага гарадка (М.Лынькоў). 5. Цвяткоў які ўжо збіраў у сумку сваё медыцынскае начынне здзіўлена варухнуў брывамі (В.Быкаў). 6. Словы такія як

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

некалі маці мне гаварыла (М.Чарот). 7. Мароз такі што скоўвае дыханне… (А.Звонак). 8. Тым часам вакол леснiковай хаты, на лугах на якiх стаяла некранутая трава ад рання і да позняга вечара бадзялася плойма кароў (І.Чыгрынаў). 9. І адно на сэрцы турбаванне каб гарачай ядзернай пургой не змяло зязюлі кукаванне і жыццё дзяцей зямлі маёй (П.Панчанка). 10. Васілю прыйшла на памяць у гэту ноч ужо амаль забытая юравiцкая каморка, недалужная ноч якою гналі яго між чорных гумнаў (І.Мележ). 11. Увесь яго выгляд быў такі быццам ён прыбег аднекуль (К.Чорны). 12. Пакой у якім жыве Веньямін тыповы для іхняга інтэрната (І.Навуменка). 13. Яблыкі з тых дзе соку шмат (Б.Мікуліч). 14. Старыя пройдзены дарогі і сцежак тысячы людскіх дзе і мае хадзілі ногі і ногі родзічаў маіх (Якуб Колас). 15. Яе [Ганну] мала хвалявалі размовы якія раз-пораз ішлі ад розных людзей… (І.Мележ). 16. Якое поле такі і ўраджай (Прыказка). 17. Таварыш той хто дапаможа заўсёды ў бядзе (М.Гарэцкі). 18. Зайшлі спярша да даўніх Валодзевых знаёмых – Субачаў якія прыехалі сюды з-пад нашых Пастаў (К.Цвірка). 19. Здаецца, я не замешаны ў такіх непрыемных справах, як Кротаў рота якога нядаўна заначавала ў адным сяле з немцамі (В.Быкаў). 20. Дзяўчаткі і хлопцы з пятага класа якія сядзелі па чацвёра-пяцёра на адной парце заціхлі і загледзеліся на настаўніцу (Я.Брыль). 21. Які ты ў быту такі ты і на справе (У.Корбан).

***137. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Слова <u>калі</u>, ужытае ў ролі злучніка, падкрэсліце адной лініяй, а ў ролі злучальнага слова, – дзвюма. Вызначце тыпы дадзеных частак.***

1. Зусім іначай пачуваўся б ён [Талаш] калі б у яго руках быў надзейны друг – добрая стрэльба (Якуб Колас). 2. Нешта трывожнае затрымцела ў хлапечым сэрцы калі ён [Матузка] пралазіў хмызняк на ўзмежку і набліжаўся да камандзіраў (В.Быкаў). 3. Мсціжаўцы калі іх распытваць помняць лес яшчэ і да нашага стагоддзя (І.Пташнікаў). 4. Калі ён [доктар] прыязджае дадому, да свайго старога бацькі то з вялікім задавальненнем размаўляе з ім па-беларуску (Л.Арабей). 5. Калі паднімаўся вецер і гайдаў сосны ўнізе ёй [сасне] даставалася найболей (В.Іпатава). 6. У момант калі ён [Уладзімір Ільіч] нізка схіляўся над паперай Надзежда Канстанцінаўна нічога не сказаўшы ціхенька выйшла (І.Шамякін). 7. А калі Сцёпка бег назад то ўжо за некалькі крокаў да Аленчынага дворыка грозна паварочваў галаву ў бок Аленкі (Якуб Колас). 8. Схільнасць гэтая развілася і разгарнулася ў ім [Апейку] з той пары калі яму выпала на долю стаць чырвонаармейскім агітатарам, адным з першых пачынаць новае ў родных мясцінах (І.Мележ). 9. Калі я падышоў бліжэй да сцяны з сінічніка адзін за другім вылецелі тры вераб'і і зніклі за хлевам (Р.Ігнаценка). 10. Мне дагэтуль помняцца яго [бацькавы] простыя мелодыі, прывычка ціха насвістваць сабе пра нешта калі яму стане сумна (К.Кірэенка). 11. Калі Веньямін набраўшы ў кубавой кіпятку сеў вячэраць у пакой увайшлі яшчэ два яго тубыльцы – Змачынскі і Варывончык (І.Навуменка). 12. Быў той час калі краскі паскідалі ўжо свае ярка-святочныя ўборы зараз будзённа і задумліва шуршэлі поўнымі каробачкамі спелых зярнят беражліва хаваючы іх ад дажджу і туману (Я.Сіпакоў). 13. Калі мы расказалі пра мэту нашай экспедыцыі Леанарда Феліксаўна з вялікай ахвотай узялася нам памагаць (К.Цвірка). 14. Пад той час калі дзеці сыходзіліся ўсе грубкі былі выпалены… (І.Мележ). 15. І калі я гляджу сёння на вёску Гайшын дык на кожным кроку бачу сляды рук працавітых і руплівых… (К.Кірэенка). 16. Хай таму дзіцятку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

язык адваліцца калі на людзях бацьку няславіць (Прыказка). 17. Калі на сцэне з’явіўся прэзідыум з’езда ў зале ўсталявалася цішыня (В.Гарадзілава). 18. Ніхто акрамя калгаснага рахункавода не ведаў калі ён [Максім] купіў гэту рэч (І.Шамякін). 19. Быў збег пор года калі цяплынь перамагала… (В.Карамазаў). 20. А праз некалькі дзён калі гаспадыня пайшла адведаць стрыечную сястру Валя замкнула дзверы на завалу завесіла акно ў сваёй баковачцы і выцягнула чамадан (Л.Арабей).

***138. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце сродкі сувязі і тыпы даданых частак.***

1. Дык як жа не ўспомніць сягоння лес роднай зямлі дзе людзі ад чорнай пагоні прытулак знайшлі! (Якуб Колас). 2. Дождж зараз відаць ліў там дзе толькі што Алег дзівіўся мокрым тралейбусам (Я.Сіпакоў). 3. Думкі ляцелі далёка ляцелі аж на той бераг юнацтва дзе ў рукі аднойчы трапіла невялічкая кніжка пра мае родныя крычаўскія лясы… (В.Карамазаў). 4. Толькі там дзе працякала туманная рака Млечнага Шляху зоркі былі цьмяныя і мільгалі не так ярка (І.Шамякін). 5. Барыс Аляксеевіч усё не мог згледзець дзе яму прыпыніцца (Л.Дайнека). 6. Дзе недастаткі там жонкам сваркі (Прыказка). 7. У кухні поруч з пакоікам настаўніка дзе ён спаў стаяў глухі шум ад галасоў цельшынскага жыхарства (Якуб Колас). 8. Адзіны выхад здаваўся там ззаду дзе засталася наша канава ў рэдзенькай маладой пасадцы (В.Быкаў) 9. На акне каля бабулінага ложка дзе ляжыць Ніна цьмяна гарыць укручаная лямпа (Я.Брыль). 10. Ён [Сёмка] кінуўся ў свой пакой і замкнуў грошы ў стол туды дзе ляжалі яго ўласныя пачкі (К.Чорны). 11. Завішнюк спыніўся якраз на тым месцы дзе павінен быў стаяць капец (І.Пташнікаў). 12. Дзе калісьці вада займала купіны і асаку зараз раскашуюць буракі збажына канюшына (В.Жуковіч). 13. Цяпер цяжка ўжо і прыпомніць усе вёскі магільнікі ўсе ляскі і пагоркі дзе ў брацкіх і адзіночных магілах пазаставаліся яны, яго [Іваноўскага] батарэйцы (В.Быкаў). 14. Яна [Ганна] вобмацкам асцярожліва выставіўшы ўперад рукі дайшла на цыпках да свайго ложка ў куце каля акна дзе чутно было бесклапотнае сапенне Хведзькі хутка скінула кофту спадніцу і нырнула пад коўдру (І.Мележ). 15. Як прыемна дзе б ні быў пачуць знаёмую назву знаёмае прозвішча! (К.Кірэенка). 16. Асабліва хвалююся там дзе наш прычал… (Я.Брыль). 17. Вокны той камеры дзе сядзела яна [Галена] выходзілі на астрожны двор (К.Чорны). 18. Ён [Юрка] усхапіўся і сеў утаропіўшыся ў страху туды дзе праз шчыліну свяцілася цьмяная ўжо чырвоная палоска ад месяца (І.Пташнікаў). 19. Падзівіўшыся [алень] зноў павольна ўзняў галаву уставіўся на бярэзіну на тое месца дзе вісела белая разадраная кара… (В.Карамазаў). 20. Вёска Раўкі дзе ён [Дарма] раней служыў хавалася ў яры трошкі больш кіламетра ад іхняй Галынкі (Я.Брыль). 21. Раса была не чапаная толькі тут дзе ляжаў Верасоўскі (Я.Сіпакоў). 22. Дзе б ты ні быў вабяць да сябе крыніцы твайго маленства (В.Шымук).

***139. Выпішыце спачатку сказы з даданымі выніку, потым з даданымі прычыны, нарэшце – з даданымі мэты. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку, пабудуйце схемы 3, 10, 17 сказаў.***

1. І Сцёпка стаў разглядацца дзе б выбраць лепшую мясціну для адпачынку (Якуб Колас). 2. Жыццё вучыць нас быць дбайнымі гаспадарамі прыроды таму не варта захапляцца вялікімі букетамі (Р.Ігнаценка). 3. А рашылі яны [Кагуты] праз некалькі дзён ехаць на Павічоў млын з першым збожжам бо ў сваім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

азярышчанскім млыне было завозна (У.Караткевіч). 4. Дарога, даўней абсаджаная грушамі-дзічкамі, цяпер пустая і таму яна здаецца мне як незнаёмая (А.Марціновіч). 5. Каб трэба было яна [Ганна] і не такое зрабіла б для сваёй Параскі (І.Мележ). 6. Немцы абыходзілі мой узвод каб ударыць па ім з тылу ды налезлі ўначы на палкавы КП (В.Быкаў). 7. Каля Мікітавых гулялі бо гэта было ў нядзелю (Я.Брыль). 8. Тут леснікі бягом да брычкі бо знаюць панскія прывычкі (Якуб Колас). 9. Захоплены ўласным спрытам і жвавасцю, ён [Матузка] на час забыўся пра пагрозлівыя абставіны таму зусім нечакана для яго ўгары заверашчала нешта страшнае (В.Быкаў). 10. Жоўты пясчаны абрыў наперадзе здаваўся размытым шэрым, густым паветрам ад чаго абрысы яго дрыжалі і плылі перад Васевымі вачыма (В.Іпатава). 11. Сцёпка дастаў з кішэні некалькі памятых лісткоў, азірнуўся каб не было лішніх сведак (Якуб Колас). 12. Ізяслаў Уладзіміравіч не мог гэтага зрабіць таму што памёр раней за бацьку (М.Ермаловіч). 13. Нумар дома я, дзівак, забыўся запытаць таму іду цяпер наўздагад, спадзеючыся на адну сваю назіральнасць (М.Вышынскі). 14. Каб добра спаўняць свае абавязкі, [Нітку] неабходна было мець удосталь злосці і быць зусім непераборлівым у сродках (Я.Брыль). 15. Пніцкі хапіў у яго [Няхлябіча] з рук канверт і рушыў бегчы бо ўжо гучаў сігнал станавіцца на работу (К.Чорны). 16. Жаваранка ўзяў абедзвюма рукамі Ушакова за галаву каб падняць з зямлі (І.Пташнікаў). 17. Учора прайшоў добры дождж дык за ноч, відаць, грыбоў нарасло (З.Бядуля). 18. З нецярплівасцю, з дзелавітай заклапочанасцю [Хадоська] выглядвала ў акне бацькавы сані, узрадавалася, замітусілася калі ўбачыла знаёмага рудога коніка (І.Мележ). 19. Я зноў да вас, мае героі, мае тры блізкія душы, іду цішком у Петрушы бо сэрца ваша ў непакою (Якуб Колас). 20. Трапіўшы ў цяжкае становішча, Міндоўг каб аблегчыць яго вырашыў перацягнуць на свой бок Ордэн (М.Ермаловіч).

***140. Выпішыце спачатку складаназалежныя сказы з даданымі спосабу дзеяння, потым – з даданымі меры і ступені. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Пабудуйце схемы 2 і 8 сказа.***

1. І ва ўсёй яго [дуба] постаці столькі важнасці, гонару што бярозы нават баяцца падысці да яго (М.Шыманскі). 2. Настаўнік ідзе па снежнай дарозе вуліцы паціху так каб дзеці маглі паспяваць за ім (Я.Ермаловіч). 3. Ён [дзяцел] выбраў высозную сухадрэвіну і з такой сілай сыпануў пошчак ажно снег з ялін пацерушыўся (В.Карамазаў). 4. Усё вакол так чыста, так бела што на душы становіцца святлей і радасней (З.Бандарына). 5. Вада чыстая як сляза і сцюдзёная аж сківіцы зводзіць (І.Навуменка). 6. Сошка крывенькая дол рэжа плытка толькі пясочак шарсціць (Якуб Колас). 7. І столькі было адвечнасці і першабытнасці ў гэтай мелодыі што нешта сціскала каля сэрца і не адпускала… (М.Чарняўскі). 8. І тады ў палях і лугах рабілася так празрыста і чыста што была відаць кожная капа сена і кожны крыжык ячменю кожны кусцік і кожны гаёк… (Я.Сіпакоў). 9. Свішчуць птушкі над балотам аж гамоніць лес і гай (Якуб Колас). 10. Бацька навучыў мяне чытаць буквар і разам з маці так настроіў на вучобу што я з радасцю пераступіў школьны парог… (К.Кірэенка). 11. Яна [Майка] сядзела маўклівая і такая танюткая ў сваёй сукенцы што яму [Алесю] стала шкада яе (У.Караткевіч). 12. Кроплі [расы] такія важкія што аж панагіналіся да самай зямлі травінкі (Б.Сачанка). 13. Колькі я жыву я не забываю сваёй вёскі, бываю там часта… (К.Кірэенка). 14. А

ідучы каля Сцёпкавай хаты, яна [Аленка] так захапілася чытаннем што ішла зусім памаленечку чуць-чуць ногі перастаўляла (Якуб Колас). 15. Настала ноч – такая салаўіная якой і ў маладосці не было (К.Кірэенка). 16. Навучыцца б чытаць як ён [настаўнік] чытае (Я.Ермаловіч). 17. Воз стаяў так каб Прыбыткоўскаму было як найзручней узлезці на яго (К.Чорны). 18. На дварэ – бела аж вочы коле (Б.Сачанка). 19. Але бывае і так што ў адным руху душы ў адным учынку чалавека можа раскрыцца духоўная веліч соцень і тысяч людзей (В.Вітка). 20. Нехта крыкнуў так моцна што дзеці спыніліся (Я.Брыль).

***141. Запішыце складаназалежныя сказы ў наступнай паслядоўнасці: 1) з даданымі далучальнымі; 2) з даданымі параўнальнымі; 3) з даданымі супастаўляльнымі; 4) з даданымі ўступальнымі. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Пабудуйце схемы 1, 5, 8 і 13 сказаў.***

1. Лабановіч сабраўся паблукаць па верханьскіх ваколіцах тым болей што не ўсе яны былі даследаваны ім (Якуб Колас). 2. Глядзелі з вокнаў аганькі мне ўслед з трывогай шчырай нібы ў далёкі і цяжкі я падымаўся вырай (А.Куляшоў). 3. Якая ні суровая прырода Паўночнага Казахстана а вясна брала сваё (Л.Леванові). 4. Поўсць [у аленя] блішчала, гладкая-гладкая бы яе пачасаў хто (І.Пташнікаў). 5. Хаця паводка сплыла але Валмянка асабліва пры запрудзе яшчэ глыбокая (М.Вышынскі). 6. Чым бліжэй яны [Міканор і сяляне] падступалі тым больш расло ў Васілю супярэчнае хваляванне (І.Мележ). 7. І камроты ні слова не сказаў мне, быццам ужо назаўжды выкрасліў мяне са свае памяці і свае роты нібы я ніколі не клапаціўся пра яго ўтулак не падшываў яму каўнерыкі не бегаў па абед не гібеў з ім усю зіму ў баях! (В.Быкаў). 8. Чым болей такіх цудоўных нечаканак пакідае ён [Купала] нам тым больш перарастае памеры паэтычнай планеты ператвараецца ў неабдымны паэтычны сусвет (М.Лужанін). 9. Радасна бліснулі вочы быццам іх сонца прамень запаліў (М.Танк). 10. Пісьменніцкага таленту ў мяне не аказалася хоць як і ўсе мае равеснікі ў той час пісала вершы (В.Гарадзілава). 11. Крайнія хаты стаялі амаль пад самымі соснамі так што шышкі і хвоя заляталі ў двары (І.Шамякін). 12. Чым бліжэй да лесу тым цікавей (М.Шыманскі). 13. Мы сустрэліся выпадкова як могуць сустракацца колішнія аднавяскоўцы на вуліцы некалі незнаёмага і аднаму і другому гарадка (А.Кудравец). 14. Хоць гаспадарка ў бацькі была не такая і вялікая але таўкоты хапала (Б.Сачанка). 15. Дзед Талаш цяпер проста шчаслівы чалавек калі толькі ёсць на свеце шчаслівыя людзі (Якуб Колас). 16. Але колькі ён [лейтэнант] ні ўзіраўся ў карту тая не адказала ні на адно з ягоных пытанняў (В.Быкаў). 17. Чым далей тым цяжэй касіць (І.Навуменка). 18. І хоць яго [Максіма] дзяцінства не было такое бесклапотнае як у іншых але яно нарадзіла нямала светлых мар (А.Бачыла). 19. Дзе б ні жыў беларус у яго гаворцы заўсёды чуецца вымаўленне і мелодыка мовы яго народа (С.Грахоўскі). 20. У тоне Сцёпкавага адказу была мяккасць і пашана да стрэлачніка што таму вельмі спадабалася (Якуб Колас).

***142. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце тыпы даданых частак. Злучнікі падкрэсліце адной рыскай, злучальныя словы – у адпаведнасці з іх сінтаксічнай функцыяй.***

1. Пісьмо Андрэю Мікіта пастараўся напісаць як наймудрэй каб не скасавацца перад братам не ўраніць свае годнасці ў яго вачах (Якуб Колас). 2. А як пачалі гаварыць дык мужчынскі голас часта рабіўся ўстрывожаным (К.Чорны). 3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Леснікова старожка у якой жыў Дземідзёнак у тыя дні была поўна раненых (І.Чыгрынаў). 4. З дзедавых слоў выходзіла што цяпер ні звера вартага не засталося ў лесе ні рыбы ў балоце (І.Мележ). 5. Не збаіцца ніхто самай лютае смерці пакуль кліча ў жыццё нас матуліна сэрца (К.Кірэенка). 6. Пасля маці вярнулася да сцяны ў запечак дзе ляжала на ложку Таня і паклала ёй руку на лоб (І.Пташнікаў). 7. Туман з рэчкі ці лагчыны або дым з пастушковага вогнішча калі ўзнімецца дык невысока стаіць над зямлёю (К.Чорны). 8. З бацькам пазнаў я радасць першай разоры хоць праўда ён і рэдка пускаў мяне за плуг (К.Кірэенка). 9. Пад галавой у яе [маці] дзве падушкі каб было вышэй (І.Пташнікаў). 10. Калі сталі сварыцца прыпеўкамі сваты і дзеўкі Ганна неспадзеўкі зноў убачыла Васілёвага браціка (І.Мележ). 11. Грынявіцкія вярнуліся ў свой маёнтак пасля таго як аціхла паўстанне 1863г. (У.Арлоў). 12. А ўсё што не было маёй ротай здавалася мне [Васюкову] непатрэбным, нецікавым, пастылым (В.Быкаў). 13. Маці наставіла на стол усяго што толькі было ў іх (К.Чорны). 14. Са студэнцкіх гадоў мне запомнілася як у бібліятэках хавалі нават ад нас, будучых газетчыкаў, падшыўкі даваенных гадоў (А.Сілянкоў). 15. Пакуль князі ў цямніцы няма шчасця дружынніку Раману (Л.Дайнека). 16. Пайшоў Сымон сваёй пуцінай бо ён прыроджаны пясняр (Якуб Колас). 17. Вецер які мацнеў прынёс аднекуль здалёк воўчае выццё (М.Лынькоў). 18. Бяльковіч выбраў месца на палянцы там дзе травы было меней (Л.Гаўрылкін). 19. Калі грэчка зацвіла ўзнік малюнак незвычайны ніколі нікім не бачаны (І.Навуменка). 20. І хоць чуткі з вайны прыходзілі не зусім радасныя Вялікі Лес жыў надзеяй (Б.Сачанка). 21. Калі адыходзіць ад нас чалавек заўсёды горка і сумна… (К.Кірэенка). 22. Бядулю пазнаў [я] як толькі ўбачыў (С.Грахоўскі). 23. Беларусы біліся каб зберагчы і пасля ўпрыгожыць нашу маці-зямлю, абараніць гэтыя азёры і нівы, сівыя пушчы і сінія воды, старадаўнія і новыя кнігі, сваю песню і слова, веды свае (У.Караткевіч). 24. Сцяпан чуў як па спіне цячэ пот… (М.Воранаў).

***143. Выпішыце з тэксту складаназалежныя сказы з адной даданай часткай, зрабіце іх пісьмовы сінтаксічны аналіз у наступным парадку: 1) назавіце галоўную і даданую частку ў складаназалежным сказе; 2) вызначце сродак сувязі прэдыкатыўных частак; 3) вызначце тып даданай часткі; 4) пабудуйце схему сказа.***

Двухмоўе

Двухмоўе (білінгвізм) – гэта папераменнае карыстанне дзвюма мовамі. Калі ж ва ўжытку знаходзяцца тры і больш моў, прынята гаварыць пра шматмоўе, або полілінгвізм. Сэнс паняцця “двухмоўе” вынікае з выразу дзве мовы. Такая ж структура яго лацінскага эквівалента білінгвізм (bi двойчы і lingua мова).

На нашай планеце жывуць многія народы. Яны знаходзяцца ў пастаянным кантакце адзін з адным, асабліва этнасы суседнія, якія часта маюць адну тэрыторыю пражывання або знаходзяцца ў складзе адной дзяржавы. Вядома, напрыклад, што 3 – 4 тысячы народаў зямлі сёння ўтвараюць усяго каля 200 дзяржаўных аб’яднанняў. Моўныя кантакты, якія дыктуюцца эканамічнымі, культурнымі і іншымі сувязямі, патрабуюць вывучэння і выкарыстання ў моўнай практыцы дзвюх і больш моў. Існуюць і іншыя матывы авалодання дзвюма ці некалькімі мовамі (атрыманне адукацыі, патрэбы навуковай дзейнасці і г.д.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вылучаюць наступныя разнавіднасці двухмоўя: індывідуальнае, калі дзвюма мовамі валодаюць толькі асобныя члены калектыву; групавое, калі двухмоўнымі з’яўляюцца цэлыя групы або асобныя сацыяльныя слаі; поўнае, ці суцэльнае, калі двухмоўе з’яўляецца характэрным для ўсіх сацыяльна-культурных груп народа. Можна гаварыць і пра нацыянальнае двухмоўе, калі яно пашырана сярод прадстаўнікоў усёй нацыі. Дзяржаўным двухмоўе называюць тады, калі ў адной краіне статус дзяржаўнай, ці афіцыйнай, маюць дзве мовы. Напрыклад, у Фінляндыі дзяржаўнымі мовамі з’яўляюцца фінская і шведская, у Канадзе – англійская і французская. Пры гэтым дзяржаўнае двухмоўе можа суправаджацца індывідуальным аднамоўем, калі насельніцтва краіны распадаецца на некалькі аднамоўных калектываў.

*Энцыклапедыя “Беларуская мова”*

***144. Выпішыце спачатку складаназалежныя сказы з паслядоўным падпарадкаваннем дадаых частак, потым – з сузалежным і, нарэшце, – і з паслядоўным, і з сузалежным. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Пабудуйце схемы першых чатырох сказаў.***

1. Ён [Сцёпка] памятае як трудна была тая дарога што прывяла сюды і якую адказнасць узяў ён на сябе, кінуўшы бацькаў дом (Якуб Колас). 2. У самым цэнтры Мінска, у зацішным і ўтульным куточку над Свіслаччу, там дзе калісьці стаяў яго дамок цяпер музей і парк што носіць імя паэта – Купалаўскі, як любоўна завуць яго мінчане (В.Вітка). 3. І двор дзе радзіўся Мікітка дзе хата стаяла і хлеў і градак цягнулася нітка сягоння зусім апусцеў (Якуб Колас). 4. Не паспеў лось глянуць на неба як у тым баку дзе вісеў над ракой мост грымнула нешта на ўсю моц ажно скаланулася на многа кіламетраў пушча (І.Чыгрынаў). 5. Веліч бёрнсаўскай паэзіі, хараство свету простых людзей які нёс і раскрываў ён прымушалі схіліцца перад паэтам і тых каму быў чужы дэмакратызм яго творчасці (М.Лужанін). 6. Алень замёр, прыслухаўся і, пераканаўшыся што яго ніхто не бачыць што ён на адзіноце з аблюбаванай бярэзінай пачаў старанна пілаваць рогам белы ствол (В.Карамазаў). 7. Некалі па гэтай кніжцы дзе над кожным словам стаялі націск каб дзеці правільна вымаўлялі словы хлопчык Ігнась вучыўся чытаць па-беларуску, завучваў на памяць беларускія вершы (Л.Арабей). 8. Колькі я жыву я не забываю сваёй вёскі, бываю там часта бо там жыве мая любая маці там усё маё – роднае, дарагое (К.Кірэенка). 9. Нам нічога не аставалася як толькі збавіць ход каб ненарокам не перакуліць лодку (Б.Сачанка). 10. Яна [Антаніна] згадала як учора на калгасным полі нябачна вісела ў паветры, пяшчотна дакраналася да твару, лёгка казытала шчокі і вусны павуцінне як высока ў небе крычалі журавы як гарэлі ў лесе гронкі чырвонай арабіны (Я.Радкевіч). 11. Хай будуць сцежкі невядомы і гору і бядзе ў той дом што мы завём бацькоўскім домам што хатай матчынай завём (Р.Барадулін). 12. І вось я рад што нікога няма што малюнак мой будзе зноў неспадзяванкаю для дзядзькі (Я.Брыль). 13. Тэрарыстам стала вядома што кожную нядзелю Аляксандр II прысутнічаў на ўрачыстым разводзе каравула ў Міхайлаўскім манежы адкуль заязджаў у палац да вялікай княгіні Кацярыны Міхайлаўны (У.Арлоў). 14. Дбайны гаспадар спяшаўся прывезці з лесу, скінуць пад плотам крамнёвай моцы драўніну пакуль сокі зямныя не пайшлі дружна ў рух, не шуганулі ў дрэва пакуль дрэва стаяла смолкае і звонкае хоць пры дарогах і на ўзлесках дзе снягі сплывалі дружней і зямля адтавала шпарчэй

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вялікі пярэсты дзяцел ужо заганяў дзюбу пад белую кару на бярозах, кальцаваў іх чорнымі луначкамі – ласаваўся першым бярозавым сокам (В.Карамазаў). 15. Людзі апусцілі галовы бо ўсе ведалі якая цяжкая чаша Кроераўскай гасціннасці (У.Караткевіч). 16. Можа не было б гэтага жадання, гэтай ласкі да Ганны калі б было ёй добра калі б бачыў [Сцяпан] што душа яе поўна сваім шчасцем (І.Мележ).

***145. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Пабудуйце схемы сказаў, вызначце разнавіднасць сузалежнага падпарадкавання (аднароднае ці неаднароднае).***

1. Лабановіч загадаў выхаванцам прынесці кнігі, сшыткі якія ў іх ёсць і ўсё што патрэбна для навучання (Якуб Колас). 2. Вада выбівалася з-пад невысокай выспачкі, збіралася ў ямку якую нехта спецыяльна выкапаў і адтуль сцякала ў балота што ён [Цімафей] касіў (І.Навуменка). 3. У ліпені і жніўні калі шумелі цёплыя дажджы а ўночы ападалі туманы і зямля проста-такі набухала вільгаццю з ранку да вечара мы прападалі ў лесе (М.Шыманскі). 4. Толькі цяпер як угледзеў трактар Каляда ўспомніў што чуў яго даўно але не выдзяляў маторнага гулу з палявое цішыні (А.Жук). 5. Каб папасці ў склеп трэба было зайсці на кухню, адтуль вузенькім праходам дзе, праўда, лёгка маглі размінуцца два чалавекі спусціцца па ступеньках уніз і адчыніць шчыльныя дзверы што аддзялялі склеп ад кухні (Якуб Колас). 6. Набедаваўшыся за дзень, Ігнаціха таксама сабралася лажыцца калі на ганку пачуліся немагчыма знаёмыя крокі патрабавальна ляснула клямка (І.Мележ). 7. Калі яна [Фруза] зноў адчыніла свае дзверы святло ў пакоі было выключана, пэўна каб лепей бачыць у акно (В.Быкаў). 8. Зноў успомніў [Чарнушка] як хавалі малую як упала [Ганна] на дочаччыну труну як чаплялася без памяці за яе як нікла нема над свежаю магілкаю на другі ранак (І.Мележ). 9. Новы перыяд нашай гісторыі які прыпадае на другую палову X ст. з поўным правам можа быць названы рагвалодаўскім бо ён непарыўна звязаны з імем і дзейнасцю першага гістарычна вядомага полацкага князя Рагвалода (М.Ермаловіч). 10. Мясціна дзе я нарадзіўся дзе ўслед за маці сказаў першае слова дзе вучыўся ў школе садзіў дрэўцы ў садзе гэта вёска Гайшын на Магілёўшчыне (К.Крапіва). 11. Калі ён [Мікола] пад'ехаў да берага то ўбачыў што ўся рака была ў руху (У.Краўчанка).

***146. Запішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце галоўную частку, вызначце тыпы даданых.***

1. Я ўдзячна гляджу на фотаздымак майго дзеда, чыгуначніка які тысячы дзён і начэй цёр вагонныя буксы каб у мяне быў разумны, пісьменны бацька (Я.Брыль). 2. У кожнага лонваўскага падшыванца быў "свой" шафёр які катаў у кабіне браў з сабой аж на бераг на Вілію даваў "кіраваць" машынай пасылаў за грашыма да лонваўскіх баб па гуркі а калі хто чапляўся за прычэп, вешаючыся на дышаль, даваў такой дзягі што "аж скура смылела" (І.Пташнікаў). 3. І якая б экскурсія ні прыязджала ў пушчу заўсёды знойдзецца чалавек які абавязкова папытае чаму гэта раптам алень жыве не з аленямі а з зубрамі (Б.Сачанка). 4. Каб не бацькі якія цяпер трымалі сынаву гаспадарку пад пільным прыглядам конь, карова Яўхіма век былі б няпоены і някормлены (І.Мележ). 5. Аднекуль прыйшла шчымлівая турбота што калі ён [хлопец] сёння не паедзе то дома можа здарыцца нешта благое (А.Кудравец). 6. Чубару неабходна было як найхутчэй пакуль не села сонца трапіць сёння на той бераг Бесядзі каб апынуцца пад аховай лесу (І.Чыгрынаў). 7. Прыпыніліся разведаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

што з паяздамі ці не ўдасца сесці на каторы (М.Лобан). 8. Чалавек кідаўся ў вочы тым што быў невялікі і апрануты неяк так што ўсё на ім нібы не мірылася з сабою (Я.Скрыган). 9. Дзе б ты ні быў вабяць да сябе крыніцы твайго маленства тыя струменьчыкі што не ведаюць спакою што заўсёды ў няспынным руху (В.Шымук). 10. Хто не меў пчол ці не ведаў як іх даглядаць той, можа, і не разумеў пчалярскай работы (Г.Далідовіч). 11. Як толькі выдаралася вольная раніца Баляслаў выбягаў з хаты яшчэ зацемна, трымаючы ў руках зялёны ракітавы кошык, і праставаў у лес што пачынаўся тут жа непадалёку, за горадам (В.Дайліда). 12. Падалося што нехта накрыў гарадок цёмным купалам неба ды яшчэ прыціснуў купал да зямлі каб ніводзін гук не пранік у сярэдзіну, не парушыў глыбокага асенняга спакою (М.Дзелянкоўскі). 13. Ужо тое што Паўлышская школа сама, сваімі рукамі стварыла ўсе машыны, трактары, жняяркі, сеялкі, веялкі і прылады, неабходныя для апрацоўкі школьнага ўчастка паказвае на што здольны працоўны энтузіязм дзяцей (В.Вітка). 14. Маці дайшла да таго ўзгорка да якога заўсёды праводзіла нас калі мы ішлі на аўтобус пешкі спынілася усё гэтак жа няўпэўнена махала машыне рукою і, мусіць, плакала (Я.Сіпакоў). 15. Калі грыміць калі б'юць перуны ведаў і я не будзь пад дрэвам (Ф.Янкоўскі). 16. Пакуль маладыя трэба думаць пра тое як жыць (Н.Гілевіч). 17. Калі ў гэтым жарце шукаць тую долю праўды якая ў кожным з жартаў то яна, гэтая праўда, далёка не смешная (В.Палтаран). 18. Калі пачыналіся заняткі і з-за дзвярэй класаў чутны былі адно ціхія галасы каго-небудзь з малых ці настаўніц ёй [Ганне] хацелася крыкаў дзіцячых, іх весялосці (І.Мележ). 19. Цяпер, падышоўшы да праварыны дзе стаяў Сібірак Андрэй убачыў што праварына пустая (І.Пташнікаў). 20. У святле таціўчаўскіх звестак аб тым што Глеб ваяваў Новагародскую вобласць гэтыя паведамленні выглядаюць не такімі ўжо і фантастычнымі бо, зразумела, каб адваяваць Літву ці частку яе трэба было ваяваць з Новагародкам які належаў некаму з "дзяцей Уладзіміравых" (М.Ермаловіч).

***147. Складзіце або выпішыце з твораў Якуба Коласа, Івана Мележа, Васіля Быкава, Янкі Брыля і інш. складаназалежныя сказы з некалькімі дададзенымі часткамі, якія б адпавядалі наступным схемам (па два сказы на адну схему).***

1. […], (злуч. сл….), (злуч. сл…), (злуч. сл…).
2. […], (злучнік…), (злучнік…), (злучнік…).
3. […], (злуч. сл…), (злучнік…), (злучнік…).
4. (Злуч. сл…), […], (злучнік…), (злучнік…).
5. (Злуч. сл…), (злуч. сл…), […].
6. (Злучнік…), […],(злуч. сл…).
7. […, (злучнік), …, (злучнік), …], (злуч. сл…).
8. […, (злуч. сл…), …], (злучнік).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***148. Знайдзіце і выпішыце з тэксту складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі, зрабіце іх сінтаксічны аналіз у наступным парадку: 1) назавіце колькасць прэдыкатыўных частак, вызначце галоўную частку ў складаназалежным сказе з некалькімі даданымі; 2) вызначце сродкі сувязі прэдыкатыўных адзінак; 3) вызначце тыпы даданых частак; 4) назавіце тып падпарадкавання даданых адзінак; 5) пабудуйце схему сказа.***

Лоша прабягае непадалёк. У цяні вербаў і ліпаў. Зялёная ад іх, але там, дзе яна вырываецца на сонца, дзе не мые і без таго чыстыя рэдкія косы водарасцяў, там адразу відаць, якая яна. Слязістая, як дыямент найчысцейшай вады. Жывы, ледзяны, імклівы дыямент.

Лоша – азначае па-літоўску стронга, фарэль. Рака, дзе імчыць лоша, віруе стронга, упіваецца ў плынь фарэль.

А можа, гэта і не з літоўскай, а з беларускай? Жонку лася называюць сям-там таксама “лоша”. Самка лася, ласіха, ласіца – “лоша”. П’е гарбаносай пысай ваду вось з гэткай рэчкі, і кроплі падаюць з цёплых вуснаў.

Хто ведае? Дый ці трэба гэта ведаць? Лоша – рэчка, з якой п’юць ласіхі і ў якой гуляе стронга.

А над рэчкай, над амаль нябачнымі ў зелені хутарамі, над раскошнымі, мокрымі – аж, здаецца, вазьмі і выцісні з іх расу – дрэвамі крыху бляклае паўночнае неба.

Дзень цудоўны, блакітна-шэры і весела-журботны. Дарога мяккая. На ўспылі звіняць званочкі, а ў небе – самотны жаўрук. Далягляд хвалісты і бязмежны. Лясы і палі, палі і лясы. … … …

І ўсё ж ва ўсім нейкі лёгкі сум, што ніадкуль не праменіцца, а нібыта раўнамерна – і спрадвеку – рассцелены ў гэтай прыродзе, у гарбах, палях, срэбных стронгах, у небе, ва ўсім, што навокал.

*У.Караткевіч. Крыж Аняліна*

## БЯЗЗЛУЧНІКАВЫЯ СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ

**149. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных бяззлучнікавых сказах. Вызначце характар адносін паміж прэдыкатыўнымі часткамі (з аднатыпнымі часткамі, з разнатыпнымі часткамі).**

1. Васіль успомніў: завуць яго Мікалай Мікалаевіч (І.Навуменка). 2. Па небе хадзілі хмары; ужо церусіў ля закапцелых фабрычных комінаў дробны дожджык (М.Гарэцкі). 3. Гвардыян стаяў сярод хаты: Галілей і не думаў запрашаць яго сесці (М.Зарэцкі). 4. Зірнуўшы на мех, Таццяна згледзела: зверху ляжыць белая цынкавая скрынка ад патронаў (І.Пташнікаў). 5. Іду і дзіўлюся: ні крыўды, ні гора – пад сонцам шчаслівa жыццё расцвітае (М.Калачынскі). 6. Адно нас хвалюе сёння: краіна яшчэ ў агні (К.Кірэенка). 7. Сіняя ноч стаяла каля дзеравяных сцен; вільготны снег паволі падаў на белую зямлю (К.Чорны). 8. У 1560 годзе ў Нясвіжы была заснавана друкарня, там выдаваліся творы Сымона Буднага і іншых філосафаў (К.Я. Шышыгіна-Патоцкая). 9. На шэрую прамерзлую зямлю бязгучна і густа сыплецца першы снег: ён, белы і лёгкі, ціха кладзецца на стрэхі, двары і загоны (Я.Брыль). 10. Агееў зразумеў: гэта не проста расказ, а споведзь спакутаванага чалавека, рэквіем па

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

жыцці (В.Быкаў). 11. Наступны дзень быў звычайным шэрым днём – яны часта бываюць увосень на Беларусі (У.Караткевіч). 12. З кожнай хвілінай Курані ўсё больш поўніліся людскімі галасамі, людскім рухам: на адным двары маці клікала сына, на другім плакала, залівалася не ў час разбуджанае дзіця (І.Мележ). 13. Апусцілася вясна на зямельку – за выганам на мяжы кветка расцвіла (З.Бядуля). 14. Прыехаўшы да места, Пятрусь выпраг каня, агледзеўся: усё навокал было застаўлена вазамі (Якуб Колас). 15. То не кветкі на бэзе нам шчасцем зардзелі – у нарачанскіх лясах верасы зацвіталі (П.Пестрак).

**150. Запішыце складаныя бяззлучнікавыя сказы з аднатыпнымі часткамі. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Зрабіце поўны сінтаксічны аналіз выдзеленых сказаў.**

1. ***На конях сядзелі маўклівыя коннікі балотныя агні кацiліся наперадзе дзікага палявання караля Стаха якраз праз дрыгву*** (У.Караткевіч). 2. Хадзіў я па хаце да раніцы золкай таполі за хатай шапталіся з ветрам. Я думаў пра шчасце я шчасця вытокі шукаў нібы скарбы ў няведаных нетрах (М.Калачынскі). 3. Ужо скрозь развіднела дзесьці за магутнай сцяной дрэў узыходзіла нябачнае дагэтуль сонца нетаптаная трава ля абрыву матава серабрылася ў расе не надта тугая парусіна яго палаткі правісла набрыняўшы роснай вільгаццю (В.Быкаў). 4. Стаяць паабапал заасфальтаванай дарогі старасвецкія крытыя саломай хаты на дварах агародах узвышаюцца вялізныя разгалістыя ігрушы-дзічкі гуляюць у дварах малыя (І.Навуменка). 5. Восень. ***На клёне ўжо амаль што няма лісця бяроза ж яшчэ ўсё калыша ад ветрыку доўгімі залацістымі косамі*** (Я.Брыль). 6. На думку некаторых даследчыкаў Нясвіж узнік на адным з водных гандлёвых шляхоў аб гэтым сведчаць шматлікія запруды на рацэ Ушы (К.Я. Шышыгіна-Патоцкая). 7. Пяць дзён свяціла сонца дарогі чорныя з жоўтымі адценнямі гліны пахлі вільгаццю пасля дажджоў (К.Чорны). 8. Залатымі зарніцамі наша доля яшчэ запалае сіл салдацкіх крыніцаю стала ты для мяне, дарагая (К.Кірэенка). 9. Вёска тулілася ля берага вострава платы агародаў дзе-нідзе забягалі на куп'ё ўзболатка (І.Мележ). 10. Дубатоўк кінуў позірк у мой бок вельмі выразны і шматзначны позірк мой твар не выразіў нічога (У.Караткевіч).

**151. Запішыце сказы, расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце, якія сінтаксічныя адносіны выражаюцца паміж часткамі складанага бяззлучнікавага сказа з разнатыпнымі часткамі (другая частка раскрывае або паясняе змест першай, змяшчае вывад, абагульненне ці прычыну, нечаканую або хуткую змену падзей і інш.).**

1. Не змаўляючыся ўзялі яны кожны сабе абавязак і глядзелі яго Ганна здымала накіп з вады сачыла за кацялком Васіль падкладваў дровы ў вогнішча (І.Мележ). 2. Абдзіраловіч бачыў сонейка схавалася зямлю спакваля спавівае вечар (М.Гарэцкі). 3. Вера Засуліч не здзівілася прыходу Карызны яна прывыкла ўжо да частых ягоных візітаў (М.Зарэцкі). 4. Прыйшла восень лясы зжаўцелі ў хмурнасці сініх дзён маўчалі шырыліся празрыстыя алеі поле сумавала пад густымі вятрамі пашарэла ралля узрунела жыта (К.Чорны). 5. Вуліца маленства… Не пазнаць нізашто яе ўсюды змены правады пад стрэхамі звіняць гушкаецца сонца на антэнах (М.Калачынскі). 6. Гэта было сапраўднае дзіва нябачаны цуд два чалавекі ў старажытных вопратках стваралі перад намі гэтую казку (У.Караткевіч). 7. Я з

трэскам адчыніў акно халоднае паветра лінула ў пакой (І.Навуменка). 8. Высунуўшы галаву я глядзеў на ўсе бакі нікога! (У.Караткевіч). 9. Салдаты ўгледзеліся ў прыцемак наперадзе ў лагчынцы віднелася вёска (В.Быкаў). 10. У апошнія гады Нёман задумаў новую штуку ў канцы сяла ён пачаў рабіць заварот пракладаць новую дарогу адразаючы шырокую луку да сяла (Якуб Колас). 11. Паглядзелі сяляне на мяжу і адразу замерлі ўся лука была адрэзана да скарбу (Якуб Колас). 12. Сяляне заканчваюць працу ў полі пастухі са сваімі "выхаванцамі" вяртаюцца ў вёску сонца павольна сплывае за лес на вёску апускаецца спакойны летні вечар (К.Чорны). 13. Рассыпаў нехта на небе кошык з каралямі усё неба адразу засвяцілася зорачкамі (З.Бядуля). 14. У вёску ісці было нельга там маглі чакаць іх немцы (В.Быкаў). 15. Рыбак ледзь высунуўся з-за сцірты раптам цішыню скалыхнуў выбух снарада (В.Быкаў).

**152. Перабудуйце сказы так, каб яны набылі бяззлучнікавую сувязь. Расстаўце знакі прыпынку ў адпаведнасці з сэнсава-граматычнымі адносінамі паміж часткамі складаных сказаў.**

***Узор**: Калі прыходзіць раніца ў вёску, то ўсе спяшаюцца ў поле (Б.Сачанка). Прыходзіць раніца ў вёску – усе спяшаюцца ў поле.*

1. Замак наш вельмі халодны, бо продкі забаранялі рабіць у ім печкі (У.Караткевіч). 2. Сотнікаў дакладна ведаў, што трэба абыходзіць вёску за вярсту (В.Быкаў). 3. Ганна заўважыла, што за клопатным роздумам пра яе таілася ў бацьку ганарліва-задаволенная думка (І.Мележ). 4. Летам у лесе заўсёды многа ягад, а ў лузе краскі цвітуць прыгожыя (Я.Брыль). 5. Доўга шукаў хлопец лясную вёсачку, ды так ён нічога і не знайшоў (Якуб Колас). 6. Зірнуў Васіль на палянку, а грыбоў як насыпана! (І.Навуменка). 7. Не паспела маладзіца і вохнуць, а кошык ужо быў перавернуты ўверх дном (З.Бядуля). 8. На даляглядзе сінелі лясы, і новае жыццё красавала на месцы старой вёскі і хутароў (К.Чорны). 9. Ваця Браніславец добра ведаў, што пачуцці – гэта каханне (К.Чорны). 10. Дзяўчына позна прыйшла дахаты, бо яна дапамагала бацьку малоць жыта (Я.Брыль). 11. Прыйшоў жнівень, і напаілі зямлю спорныя дажджы (К.Чорны). 12. Ганна нічога не адказала бацьку, заўважыла, што з хаты выбегла мачыха, подбегам, рашуча рушыла да іх (І.Мележ). 13. Не паспеў салдат схавацца ў траншэі, як воддаль пачуліся выбухі (В.Быкаў). 14. Выбліснула сонейка, і ўвесь свет патануў у залатым святле (З.Бядуля). 15. Калі прыйшло на гэтую зямлю дзікае паляванне караля Стаха, то людзі пачалі ўсяго баяцца (У.Караткевіч).

**153. Запішыце складаныя сказы, расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце граматычныя асновы ў сказах. Зрабіце поўны сінтаксічны аналіз першых трох сказаў.**

1. Канчалася ноч затуманены, клапатлівы і заклапочаны з'яўляўся дзень (К.Чорны). 2. Грыміць на карэннях цялежка мігцяцца стракатыя ветравыя слупы бягуць лясы гаі мяняюцца палі рассцілаюцца шырокія лугі блішчаць азёры срэбрам пераліваюцца рэкі золатам рассыпаюцца песні (Якуб Колас). 3. Ранак і на самой справе быў цудоўны за хмарамі ўгадвалася блізкае сонца (У.Караткевіч). 4. Ганна думала балела душой як багата бяды выпадае чалавеку за іншы крок (І.Мележ). 5. У лесе пачуліся прыглушаныя галасы мусіць людзі ладзіліся ісці ў вёску (В.Быкаў). 6. Выглянула яркае студзеньскае сонца уся зямля заіскрылася

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

мноствам брыльянтаў (Я.Брыль). 7. Досвіткам пайшоў дождж раніца спазнілася (Я.Брыль). 8. Неба завалаклося тучамі раптам апанаваў Абдзіраловіча сум сярод смутнай імглы восені на нядрогкіх калёсах (М.Гарэцкі). 11. Карызну разбудзіў асцярожны бразгат дзвярэй нехта пэўна гаспадар выйшаў з хаты на двор (М.Зарэцкі). 12. Агееў не паспеў яшчэ сабрацца з думкамі раптам у сенцах пачуліся галасы паліцаяў (В.Быкаў). 13. Усё навокал было знаёмае і звычайнае даверліва шапацелі грушы дрымотна чарнелі на могілках кусты вербаў і акацый шарэў ледзь відны ў цемры туман на балоце (І.Мележ). 14. Я ўбачыў паляванне разгарнулася пасля сабралася ў натоўп бязладны імклівы і пачало зварочваць (У.Караткевіч). 15. Доўга не мог заснуць Міхалка ў суботу вечарам перад Сёмухай заўтра досвіткам выбіраецца ён у дарогу (Якуб Колас). 16. Вецер сціх у вёсцы зноў стала спакойна і ціха (К.Чорны).

**154. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Падкрэсліце складаныя бяззлучнікавыя сказы. Пабудуйце іх схемы.**

Я удвоил шаг, чтобы скорее дойти до мельницы. В воздухе чувствовалась уже свежесть: она свидетельствовала о приближении к Оке. Дорога начинала опускаться – бока долины понижались, расходились амфитеатром и сглаживались с дальней местностью. Немного погодя на огненном, постепенно бледнеющем небе обозначилась фиолетовая, слегка зарумяненная линия горизонта; ещё несколько шагов вперёд – передо мной распростиралась серебристая Ока. Следом за Окой выступили луга с красивым заворотом Волги; ближе всего, почти под ногами, возносились неправильные тёмные кустарники; кое-где сквозь сучья проглядывало багровое небо; тут же, между стволами деревьев, чернела плотина; на одном конце её рисовался причудливый профиль мельницы с амбаром, спуском для воды и колёсами; на боку лежала опрокинутая лодка. Деревья, освещённые огненно-яркими лучами солнца, плотина с шестами, мельница – всё полностью отражалось в широком сверкающем пруде; на поверхности его, гладкой, как розовое зеркало, играла рыба. Окрестность между тем темнела – в ясном небе начинали зажигаться звёзды. До слуха доносились какие-то неясные, замирающие звуки – наконец всё смолкло и окуталось тенью. В окне мельницы мелькнул огонёк и заиграл в воде вместе со звёздами.

Минуту спустя я стоял на плотине и бросал прощальный взгляд на засыпающую долину.

*Д.В. Григорович. Деревня*

**155. Запішыце тэкст. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце бяззлучнікавя сказы. Вызначце характар адносін паміж часткамі складаных бяззлучнікавых сказаў (аднатыпныя ці разнатыпныя). Зрабіце поўны сінтаксічны аналіз выдзеленага сказа.**

Ішла пара якая заўсёды хвалявала Апейку восень. Ён заўважыў яе подступ здаля са жніўня калі сонца яшчэ падымалася высока і ад гарачыні іншымі днямі аж млелі дрэвы бабкі недажатыя палосы агароды за платамі.

Подступ восені радаваў добрым надвор’ем палі дружна пусцелі зелянелі толькі палосы з бульбаю. Дарогі былі поўныя працоўнага руху усюды рыпелі вазы ехалі да сяла па загуменных дарогах. Не толькі ў халаднаватых гумнах а і на гарачых прыгуменнях пахла жытам аўсом ячменем там і тут рады снапоў пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сценах аздаблялі чорныя гумны як паясы снапы сушылі. Восень далічвала летні плён...

Восень пакуль не прыдумаеш лепшай. Золата не восень. Дні сонечныя лагодныя неяк надзіва чыстыя усё навокал у ласкавай дзівоснай яснасці. Усё агорнута млявым велічным спакоем белаватае неба далёкія і блізкія лясы трава пры дарогах. Усім гэтым восень як бы кажа я папрацавала нямала намарылася за вясну ды лета вось і хачу адпачыць.

У гэтым асеннім спакоі стаяць пагодныя дні чыстыя і вельмі ціхія. Усюды плавае "бабіна лета" ім абчапляны рудыя кусты бульбоўніку трава пры дарозе. І спакойная мудрая журлівасць над усім. Усюды пахне дымам на полі паляць бацвінне і пякуць бульбу. ***Малыя радуюцца печанай бульбе старэйшыя грэюцца каля вогнішча зямля ўжо не летняя стынуць рукі***. Днём яшчэ цёпла ночы ж сырыя халодныя ранкам на бульбоўніку на траве белыя махры інею.

***І.Мележ. Подых навальніцы***

## СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ З РОЗНЫМІ ВІДАМІ СУВЯЗІ

***156. Вызначце сродкі сувязі частак у складаных сказах камбінаванай будовы; расстаўце патрэбныя знакі прыпынку, пабудуйце схемы трох сказаў (на выбар).***

1. Тут ужо Сцёпка не мог стрымацца і прызнаўся Аленцы што ён вучыцца што ў яго ёсць шырокія планы толькі ён нічога аб іх не кажа а Аленка аб іх не павінна нікому казаць бо ён толькі ёй адной і сказаў аб гэтым (Якуб Колас). 2. У зямлянцы стала прахладна печка ўжо не свяцілася агністымі шчылінамі скупа шарэла заклееная недарэчнымі плакатамі сцяна на якой выразней адзначыўся галавасты, да столі, цень ад Чарнова (В.Быкаў). 3. Як і раней, не было, здавалася, такой хвіліны каб вочы яе [Ганны], вільготна-цёмныя, падобныя на спелыя вішні, былі абыякавыя, нудлівыя увесь час бліпчэла ззяла ў іх няўціхнае хваляванне (І.Мележ). 4. Студэнт вельмі жыва адчуў цяпер тыя хлапечыя слёзы ён нават вочы заплюшчыў і страсянуў галавой каб вярнуцца ў сапраўднасць (Я.Брыль). 5. Толя ўжо не сядзіць над Максімавым рукапісам: ён ходзіць па хаце, ад стала да парога і ў хаце цесна як цесна ў яго душы пачуццям якія ўжо неабходна выказаць (Я.Брыль). 6. Зноў, родны інтэрнат, да позняй ночы струменіцца святло з тваіх акон – так свецяцца ад шчасця ў бацькі вочы калі сыноў сваіх сустрэне ён… (Р.Барадулін). 7. Калісьці князь замак якога відаць адгэтуль у гарадку вандруючы па Еўропе прыслаў адтуль добрага аўчара па княжацкіх маёнтках пачала шырока практыкавацца гадоўля мерыносных авец (К.Чорны). 8. У Аляксея да горла падкаціўся тугі камяк ён адчуў усю глыбіню гора гэтых спрацаваных прыгожых маладзіц чые мужы не вярнуліся з вайны (С.Грахоўскі). 9. Вецер крочыць у замець пожняю трэба ў лес мне за ім паспець, зазірнуць там пад хвою кожную мо зямлянка дзе ёсць парожняя ці касцёр каб радок сагрэць? (Г.Кляўко). 10. Акрамя гэтага, была і яшчэ адна выгода на Паківачоў млын людзі стараліся не ездзіць бо ў гаспадара была незайздросная слава чараўніка і ведзьмара (У.Караткевіч). 11. Старая, вядома, ведала дзе працаваў яе чацвёрты хлопец але не хваліцца ж перад усімі што недалёка, у бацькі Мірона ў атрадзе (М.Лынькоў). 12. На дарожку выбег смуглявы, з рашучымі жарсткаватымі вачамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чалавек з нямецкім аўтаматам у руцэ на ягоных грудзях целяпаўся вялікі бінокль і Ляўчук здагадаўся што, мабыць, гэта нейкі камандзір кіраўцаў (В.Быкаў). 13. Як на тое шчасце, у Эстоніі аказаўся знаёмы і на маё пісьмо што хацелася б перамяніць геаграфічнае месца я атрымаў запрашэнне на работу ад сланца-хімічнага камбіната (Я.Скрыган). 14. Дружа Дняпро, прыпыні свае воды, паслухай як мы жывем, гаспадарым ты не ўсё яшчэ ведаеш таму і такі адкрыты, даверлівы (П.Сабіна). 15. Грымнуў гром і дажджу накапала быццам з радасці хмарка заплакала (Е.Лось). 16. Праходжу я не першы на зямлі ісці мне лёгка светлымі шляхамі тут да мяне мае бацькі прайшлі і я трапляю крочыць іх слядамі (Ю.Свірка). 17. Касцюкевіч уявіў усё гэта і з нечаканай злосцю, з лютасцю, з жаданнем каб рассыпалася, разляцелася на кавалачкі ўся бранявая шкарлупа газаваў, рэзка выжымаў і адпускаў шчапленне і нічога не было больш чуваць, акрамя дзікага трубнага крыку магутнага танкавага рухавіка (А.Жук). 18. Там дзе жыў у маленстве Адам Ружанцоў (а гэта было на паўднёвым усходзе) хлопцаў называлі Іванамі і Янка быў адзін на ўвесь раён гэта сын ветфельчара Галкоўскага (І.Чыгрынаў). 19. Лісце шумела пад нагамі і Наташы часам здавалася што нехта шэпчацца з дрэвамі (І.Шамякін). 20. Нам хочацца быць ля высокіх зораў каб з імі разам цвісці нам хочацца тых бязмежных прастораў дзе можна бясконца ісці (К.Кірэенка). 21. З гэтым настроем ён [Васіль] даехаў да свайго надзелу спыніў каня саскочыў з воза цвёрдым гаспадарскім тонам загадаў усім – матцы, Мані, Валодзьку – здымаць з воза прывезенае; сам выняў касу мянташку торбу з салам прасачыў як маці паставіць на траву калыску для малога (І.Мележ).

***157. Выпішыце з тэксту складаныя сказы з рознымі відамі сувязі. Зрабіце сінтаксічны аналіз камбінаваных складаных сказаў у наступным парадку: 1) назавіце колькасць прэдыкатыўных частак; 2) вызначце тып сувязі і сродкі сувязі прэдыкатыўных адзінак; 3) вызначце тыпы дададзеных частак (калі яны ёсць); 4) пабудуйце схему сказа.***

Кольку Бурава нібы падмянілі ў той лістападаўскі дзень, аўтамабіль для яго стаў марай, ён пільнаваў кожную машыну на вуліцы, хоць іх было яшчэ мала, і яму яшчэ мо разы чатыры шчасціла бачыць іх пераважна на станцыі, ля грузавога двара. Яшчэ гады праз чатыры, калі ён добра падрос, на машыне стаў працаваць дзядзька Ігнат, бацька ягонага аднакласніка Стася, і тут ужо Колька ўвесь вольны час прападаў на сядзібе сябра, калі той прыязджаў на абед, і яны мелі кароценькую магчымасць пасядзець трохі ў цеснай, напечанай сонцам, але такой утульнай кабінцы. Але Стась не дужа захапляўся машынай, яму болей даспадобы былі трусы, якіх была процьма ў іхняй варыўні і якія зусім не цікавілі Кольку. І калі неяк летам дзядзька Ігнат узяўся за рамонт свае трохтонкі, яго першым добраахвотным памочнікам стаў Колька. Спярша ён адціраў ад гразі рысоры, пасля мыў у газе балты і гайкі, памагаў дзядзьку Ігнату разбіраць задні мост – дзе патрымаць ключ, дзе падаць шплінт і шайбу, а то і падлезці дзіцячай рукой туды, дзе не пралазіла рука дарослага чалавека. Затым яны тыдзень корпаліся ў рухавіку, і дзядзька Ігнат тлумачыў хлопцу, навошта патрэбны шатуны і поршні і як яны круцяць каленчаты вал, як перадаецца ягоная энергія на колы, адкуль і куды ідзе электрычнасць і як яна запальвае гаручае ў цыліндрах. Коля быў хлопец кемлівы і запамінаў усё да драбніц – слава богу, тады ўжо вучыўся ў сёмым класе. Праўда, затым у яго шафёрскай адукацыі настаў перапынак, аж гады тры ён рабіў у леспрамгасе, затое, прызваны на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вайсковую службу, адразу папрасіўся ў аўташколу: сказаў камандзіру, што ведае будову аўтамабіля, трэба толькі навучыцца ездзіць. Камандзір трапіўся добры, і месяцы праз чатыры, маладога чырвонаармейца Бурава залічылі ў аўташколу, дзе ён паказаў найлепшыя здольнасці і па сканчэнні атрымаў шафёрскія правы і па два трохкутнічкі ў пятліцы. Пасля ён ужо ні пра што не марыў, як атрымаць машыну і ездзіць на ёй хоць да скону жыцця.

У жыцці, аднак, усё сталася болей складана і меней шчасліва, чымсь у марах.

*В.Быкаў. У тумане*

***158. Запішыце тэкст, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Пабудуйце схемы складаных сказаў з рознымі відамі сувязі.***

Агледзеўшыся што машына цэлая і крыху супакоіўшыся Касцюкевіч з палёгкаю ўздыхнуў. Можна спакойна паехаць назад і ніхто нічога не будзе ведаць бо ад усяе яго смеласці засталіся на бетоне толькі белыя з сіняватым металічным адценнем пісягі да гразь на траках машыны.

Нейкі раптам спустошаны быццам раздушаны машынаю Касцюкевіч млява вярнуўся на сваё месца яшчэ дрыжачымі ад хвалявання і перапалоху рукамі выбіў перадачу націснуў на кнопкі запуску не здзівіўся і не зарадаваўся што матор завёўся. Яму раптам падумалася а што каб яго прыдушыла ці прыбіла ў машыне да вечара ні адна б жывая душа не ведала пра гэта і дайшоў бы ён тут на гэтым бязлюдным палігоне! Якому чорту лысаму і што збіраўся ён даказаць? Дaслужыць ён год які застаўся вернецца дадому і ніхто там нічога не ўведае ні пра гэты праклятьі мост ні пра ягонае няўмельства і страхі. Не спадзе з галавы карона калі хто і пасмяецца лепш сцярпець насмешку чым на той свет трапіць без перасадкі.

Касцюкевіч сядзеў нерухома глядзеў як падалі і раставалі на камбінезоне незвычайна бухматыя сняжынкі. Яны спачатку меншалі быццам сціскаліся потым і зусім знікалі і ад кожнае спачатку заставалася толькі кропелька а потым усяго чорны петнячок на мацерыі. І які салодкі халаднаваты і малады быў пах у гэтага снегу. Касцюкевіч яшчэ ніколі не чуў такога паху і не спазнаваў такога шчасця бачыць як роўна і хараша ідзе над зямлёю снег. І за радасцю і палёгкаю што ўсё так добра скончылася здаецца і не засталося ў душы ні сораму ні злосці якая была на калейны мост за тое што ён нібы заступіў Касцюкевічу дарогу да далейшага жыцця.

Касцюкевіч уключыў перадачу паддаў абаротаў матору чакаў што машына лёгка выскачыць з гразі на роўнае поле але нечакана калі быў адпушчаны фрыкцыён матор натруджана завыў усю машыну закалаціла зазвінела браня ад удараў аб бетонныя апоры моста. Здалося што рассыплецца сталёвая каробка. Не зразумеўшы што здарылася спалохана Касцюкевіч выхапіў фрыкцыён збавіў абароты і зноў матор завуркатаў роўна і машыну перастала калаціць.

*А.Жук. За белым снегам*

***159. Прачытайце ўрыўкі з эсэ А.Адамовіча “Браму скарбаў сваіх адчыняю…” і іх пераклад на рускую мову М.Тычыны. Прасачыце, якія змены адбыліся ў структуры складаных сінтаксічных канструкцый пры перакладзе.***

1. Сёння, калі мы чытаем Бялова і Шукшына, Распуціна і Друцэ, Мележа, Брыля, Сіпакова і Матавасяна і ўсю вакол сучаснай “вясковай прозы” палеміку, крытыку, мы ўсё больш цвёрда згаджаемся з ісцінай, якая пракладвае сабе шлях праз нашу літаратуру. Ісціна гэтая вось у чым: велізарны мацярык сялянства

беспаваротна змяншаецца, але нельга страціць час, непаўторна адказны, важны, нельга згубіць магчымасць (якой заўтра ўжо не будзе) – мы абавязаны зберагчы і перадаць далей духоўны, маральны, чалавечы вопыт, што тысячагоддзямі збіраўся тут, іменна на гэтым мацерыку. Колькі суму і фантазій пра Атлантыду, якая, можа, была, а можа, і не, але адна вераемнасць, што быў цэлы мацярык, са сваёй культурай і жыццём, і знік поўнасцю, не можа не мучыць, не прымушаць нас сумаваць, шукаць, аднаўляць нешта хоць бы ва ўяўленні.

*** Сегодня, когда мы читаем Белова и Шукшина, Распутина и Друцэ, Мележа, Брыля, Сипакова и Матевосяна и всю вокруг современной “деревенской прозы” полемику, критику, мы всё больше утверждаемся в истине, которая прокладывает себе путь через нашу литературу. Истина эта вот в чем: огромный материк крестьянства бесповоротно уменьшается, но нельзя терять времени, неповторимо ответственного, важного, нельзя упустить возможность, которой завтра уже не будет, – мы обязаны сберечь и передать дальше духовный, нравственный, человеческий опыт, который тысячелетиями собирался здесь, именно на этом материке. Сколько грусти и фантазий об Атлантиде, которая то ли была, то ли нет, но одна вероятность, что был целый материк, со своей культурой и жизнью, и исчез целиком, не может не мучить, не заставлять нас печалиться, искать возможность восстанавливать нечто хотя бы в воображении.

2. Ролю беларускага літаратара малады Максім Гарэцкі расцэньвае як нешта вельмі адказнае, высокае, што патрабуе ад чалавека вялікай грамадзянскай, нацыянальнай свядомасці, але ёй чужая правінцыяльная замкнёнасць.

*** Роль белорусского литератора молодой Максим Горецкий расценивает как нечто чрезвычайно ответственное, высокое, требующее от человека большого общественного, национального сознания, но чуждое провинциальной замкнутости.

3. Супрацьлегласць характараў бацькі і маці праявілася і ў характары Максіма; бацькаў і матчын пачаткі змагаліся ў істоце Максіма ўсё жыццё, але матчына спадчына звычайна перамагала.

*** Противоположность характеров отца и матери обнаружились и в характере Максима: отцовское и материнское начала сражались в душе Максима всю жизнь, но наследие матери обычно побеждало.

4. Усеагульнае, усёй літаратуры, імкненне да сваёй аповесці, да нацыянальнага рамана падштурхнула М.Гарэцкага да напісання ў 1918 – 1919 гг. аповесці “Дзве душы”, дзе ён пайшоў, здаецца, нават супраць уласнага таленту і набытку: піша сюжэтна-рамантычную гісторыю, адрываючыся ад таго, без чаго пазней (ці раней) і кроку не ступаў – ад жывой рэальнасці і праўды, як у вялікім, так і ў дробным.

*** Всеобщее, всей литературы, стремление к своей повести, к национальному роману подтолкнуло М. Горецкого и к написанию в 1918 – 1918 гг. повести “Две души”, в которой он, кажется, пошел даже против собственного таланта и опыта: пишет сюжетно-романтическую историю, отрываясь от того, без чего позже (да и раньше) и шагу не делал – от живой действительности и правды, как в большом, так и в малом.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Пісьменніку ж можа проста балюча быць, што ён цяпер толькі тут і нідзе больш, а там, блізка і далёка, у гэты вось момант – таксама людзі, жыццё, нешта адбываецца.

***Писателю же, может, просто больно станет, что он теперь только здесь и нигде более, а там, близко и далеко, в этот момент, – тоже люди, жизнь, что-то происходит.

6. Чалавек з вясковай прагай бярэ тое, што дае яму адукацыя, кніга, і ўсё гэта не адгароджвае яго ад свайго, ад народнага, забыта-нацыянальнага, а наадварот толькі павышае нацыянальна-культурную ацэнку і самаацэнку.

*** Человек с деревенской жадностью берёт то, что даёт ему образование, книга, и всё это отнюдь не отгораживает его своего, от народного, забыто-национального, а, наоборот, лишь повышает национально-культурную оценку и самооценку.

## КАНТРОЛЬ ВЕДАЎ ВМК ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”

### Тлумачальны каментарый

ВМК па дысцыпліне “Актуальныя праблемы беларускай мовы” прызначаны для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін.

ВМК “Актуальныя праблемы беларускай мовы” займае важнае месца ў сістэме лінгвістычнай падрыхтоўкі студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, з’яўляецца дадатковай базай для грунтоўнага засваення беларускай мовы. Пры вывучэнні дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і цесная сувязь яго з ВМК іншых лінгвістычных прадметаў і, у першую чаргу з ВМК па дысцыпліне “Сучасная беларуская літаратурная мова”.

Асноўная **мэта выкладання дысцыпліны** – развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне будучых спецыялістаў-філолагаў; выпрацаваць уменні і навыкі практычнай рэалізацыі атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці; садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў, здольных паспяхова вырашаць праблемы функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму; выхаваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

Прапанаваны раздзел кантролю ведаў уключае (згодна “Палажэння аб вучэбна-метадычным комплексе на ўзроўні вышэйшай адукацыі” пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь) для выніковага кантролю -- залікова-экзаменацыйныя матэрыялы (пералік пытанняў) па курсах ў аб’ёме, які адпавядае базавай вучэбнай праграме па спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура, для бягучага кантролю -- сістэму кантрольных дыктантаў (дыктантаў для самакантролю і дыктантаў з дадатковымі заданнямі) аўтары-складальнікі: Мароз С.С., Ржавуцкая М.С., Старасценка Т.Я.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Метадычныя рэкамендацыі

Для атрымання аб’ектыўнай інфармацыі аб ўзроўні паспяховасці студэнтаў па названай дысцыпліне мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: апераджальны, бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю ўжываецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

Дыягностыка кампетэнцый па дысцыпліне можа мець розныя формы.

Вусны кантроль: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках, калёквіумы, даклады на канферэнцыях, вусныя залікі і экзамены.

Пісьмовы кантроль: тэрміналагічныя дыктанты, дыктанты з дадатковымі заданнямі, дыктанты для самакантролю, кантрольныя апытанні, кантрольныя работы, пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях, рэфераты, пісьмовыя залікі і экзамены.

Графічны кантроль: моўны разбор з дапамогай графічных сродкаў, графічны дыктант (запаўненне табліцы па пэўнай тэме).

Тэставы кантроль: падбор каротких адказаў у адпаведнасці з заданнямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Залікова-экзаменацыйныя матэрыялы**
**па дысцыпліне “Актуальныя пытанні беларускай мовы”**
(прыкладны пералік пытанняў )

**1 курс**

1. Мэта і задачы курса.
2. Сувязь з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі.
3. Нацыянальная мова як гістарычная катэгорыя. Нацыянальная мова як сістэма.
4. Кампаненты сучаснай беларускай нацыянальнай мовы.
5.Навуковыя дасягненні вядомых беларускіх лінгвістаў.
6. Беларуская літаратурная мова на сучасным этапе.
7. Беларуская мова як першааснова нацыянальнай культуры.
8. Лексікалогія. Асобныя разнавіднасці лексікалогіі.
9. Аспекты вывучэння лексікалогіі.
10. Слова як адзінка лексічнай сістэмы.
11. Праблема азначэння слова. Праблема лексічнага значэння слова. Праблема мнагазначнасці слова. Пытанні аб упарадкаванні тыпаў лексічных значэнняў мнагазначнага слова.
12. Сістэмна-семасіялагічная характарыстыка лексікі. Праблема сістэмнай арганізацыі мовы ў сучаснай лінгвістыцы.
13. Парадыгматычныя адносіны ў лексіцы.
14. Фармальна-семантычная структура слова.
15. Асноўныя тыпы слоўных апазіцый па семемах і лексемах.
16. . Асобныя слоўныя апазіцыі ў межах лексіка-семантычных катэгорый.
17. Амонімы, якія паявіліся ў выніку выпадковага супадзення спрадвечна розных слоў. Словаўтваральныя амонімы. Семантычныя (гамагенныя амонімы). Аманімія па дэнатату. Аманімія па сігніфікату.
18. Сінанімія як універсальная моўная з’ява. Праблема азначэння сінонімаў у лінгвістычнай літаратуры. Пытанне аб абсалютных сінонімах.
19. Семантычная класіфікацыя антонімаў. Антонімы, якія выражаюць якасную процілегласць. Камплементарныя антонімы. Антонімы, якія выражаюць супрацьлеглую накіраванасць дзеянняў, уласцівасцей, прымет. Антонімы-канверсівы. Энантасемія.
20. Класы слоў як з’ява лексічнай парадыгматыкі. Паняцце класа слоў. Тыпалогія класаў. Прадметна-тэматычныя групы слоў (ПТГ). Лексіка-семантычныя групы (ЛСГ). Семантычныя палі.
21. Гісторыка-этымалагічная характарыстыка беларускай лексікі. Спрадвечная лексіка.
22. Лексіка перыяду беларускай народнасці.
23. Лексіка перыяду беларускай нацыі.
24. Роля народных гаворак ва ўзбагачэнні лексікі літаратурнай мовы.
25. Разнавіднасці іншамоўнай лексікі.
26. Прычыны запазычвання іншамоўнай лексікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

27. Шляхі пранікнення і спосабы ўвядзення іншамоўных слоў у беларускую мову.

28. Лексіка беларускай мовы з пункту гледжання сфер яе выкарыстання. Дыялектная лексіка. Пытанне аб узаемадзеянні літаратурнай мовы і народных гаворак у беларускім мовазнаўстве.

29. Узаемадзеянне тэрміналагічнай лексікі з агульнаўжывальнай лексікай беларускай мовы. Наменклатурныя назвы. Адрозненні паміж тэрмінамі і прафесіяналізмамі.

30. Сацыялінгвістычная сістэматызацыя сучаснай беларускай лексікі. Паняцце стылю і стылістычных сродкаў. Кароткая характарыстыка стыляў. Афіцыйна-дзелавы стыль. Навуковы стыль. Публіцыстычны стыль. Мастацкі стыль. Гутарковы стыль. Стылістычныя сродкі лексікі. Экспрэсіўная лексіка.

31. Лексіка актыўнага і пасіўнага запасу. Паняцце аб актыўным запасе лексікі. Паняцце аб пасіўным запасе лексікі.

32. Фразеалогія. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Змест фразеалогіі, прадмет вывучэння.

33. З гісторыі вывучэння фразеалогіі. Аспекты даследавання фразеалагічнага фонду беларускай мовы.

Аналіз фразеалагічных адзінак.

34. Лексікаграфія. Лексікаграфія як раздзел мовазнаўства. Змест лексікаграфіі, прадмет вывучэння.

35. Стан, праблемы і кірункі сучаснай беларускай лексікаграфіі. Даследаванні ў галіне гісторыі беларускай лексікаграфіі. Распрацоўка тыпалогіі слоўнікаў у сучаснай лнгвістыцы.

36. Аналіз слоўнікаў розных тыпаў (аднамоўных, двухмоўных, шматмоўных).

37. Фанетыка. Фаналогія. Прадмет і задачы фанетыкі, прадмет і задачы фаналогіі.

38. З гісторыі вывучэння фанетыкі і фаналогіі. Даследаванні фанетычнай сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Даследаванні фанетычнай сістэмы беларускай дыялектнай мовы.

39. Фаналагічная характарыстыка гукаў у залежнасці ад пазіцый у слове. Фаналагічная характарыстыка галосных гукаў у залежнасці ад пазіцый у слове. Фаналагічная характарыстыка зычных гукаў у залежнасці ад пазіцыі ў слове.

40. Арфаграфія. Прадмет і задачы арфаграфіі. Сувязь арфаграфіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства.

41. З гісторыі беларускай арфаграфіі. Станаўленне і развіццё сучаснай беларускай арфаграфічнай сістэмы.

42. Цяжкія выпадкі напісання. Перадача акання на пісьме. Правапіс а, о, э ў складаных словах. Перадача якання на пісьме. Правапіс е, ё, я ў складаных словах. Правапіс у і ў у словах іншамоўнага паходжання. Правапіс складаных слоў. Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў, блізкіх да прыслоўяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Залікова-экзаменацыйныя матэрыялы**
**па дысцыпліне “Актуальныя пытанні беларускай мовы”**
(прыкладны пералік пытанняў )

**2 курс**

1. Марфеміка. Марфеміка як раздзел мовазнаўства. Прадмет і задачы марфемікі.

2. Аспекты вывучэння марфемікі. Паняцце марфемы, аламарфемы, морфа, аламорфа.

3. Тыпалогія марфем.

4. Словаўтварэнне. Словаўтварэнне як раздзел мовазнаўства. Прадмет і задачы словаўтварэння.

5. Кірункі даследавання.

6. Адзінкі словаўтварэння. Утваральная аснова, утваральная база, словаўтваральныя сродкі.

7. Словаўтваральная пара, словаўтваральны ланцужок, словаўтваральная парадыгма, словаўтваральны рад, словаўтваральнае гняздо.

8. Паняцце словаўтваральнага тыпу і словаўтваральнай мадэлі.

9. Граматыка. Марфалогія. Падзел граматыкі на марфалогію і сінтаксіс. Змест і прадмет марфалогіі.

10. Кірункі даследавання.

11. Асноўныя граматычныя паняцці і адзінкі. Граматычнае значэнне, граматычная катэгорыя, граматычная форма, словаформа.

12. Паняцце парадыгмы. Спосабы і сродкі выражэння граматычных значэнняў.

13. Слова як адзінка марфалогіі. Словы і іх граматычныя групоўкі. Сістэма часцін мовы ў беларускай мове.

14. Дыскусійныя пытанні класіфікацыі часцін мовы ў навуковай літаратуры. Безасабова-прэдыкатыўныя словы (прэдыкатывы). Няпэўна-колькасныя словы. Мадальныя словы. Выклічнік. Гукапераймanні. Звязка.

15. Граматычны статус назоўніка. З гісторыі вывучэння назоўніка.

16. Прадметна-сэнсавая аснова катэгорыі назоўніка. Лексіка-семантычныя групы назоўнікаў.

17. Узаемадзеянне паміж катэгорыяй назоўніка і катэгорыямі прыметніка, лічэбніка, займенніка, прыслоўя.

18. Асноўныя граматычныя катэгорыі ўнутры катэгорыі назоўніка. Асноўныя тыпы скланення назоўніка, сфарміраваныя на аснове родавай класіфікацыі.

19. Скланенне асабовых імёнаў, прозвішчаў і геаграфічных назваў.

20. Граматычны статус прыметніка. Аспекты вывучэння прыметніка.

21. Семантычныя асновы катэгорыі прыметніка. Разрады прыметніка. Узаемадзеянне розных разрадаў прыметніка, недакладнасць межаў паміж імі.

22. Граматычны статус лічэбніка. З гісторыі вывучэння лічэбніка.

23. Граматычныя асаблівасці катэгорыі лічэбніка ў беларускай мове.

24. Граматычны статус займенніка. З гісторыі вывучэння займенніка.

25. Займеннік як асаблівы лексіка-семантычны тып слоў. Граматычныя асаблівасці катэгорыі займенніка ў беларускай мове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

26. Граматычны статус дзеяслова. Шляхі вывучэння дзеяслова ў граматычнай традыцыі.

27. Граматычныя асаблівасці дзеяслова. Пытанне пра стан у лінгвістычнай літаратуры.

28. Узаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць граматычных катэгорый дзеяслова.

29. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як гібрыдныя дзеяслоўныя формы.

30. Граматычны статус прыслоўя. Традыцыйныя пункты гледжання на прыслоўе. Вызначэнне катэгорыі прыслоўя.

31. Граматычныя асаблівасці прыслоўя.

32. Лінгвістычны статус безасабова-прэдыкатыўных слоў (слоў катэгорыі стану). Граматычныя асаблівасці безасабова-прэдыкатыўных слоў.

33. Граматычны статус службовых часцін мовы. З гісторыі станаўлення службовых часцін мовы.

34. Аспекты даследавання. Граматычныя асаблівасці службовых прыназоўнікаў.

35. Граматычныя асаблівасці службовых злучнікаў.

36. Граматычныя асаблівасці службовых часціц.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Залікова-экзаменацыйныя матэрыялы**
**па дысцыпліне “Актуальныя пытанні беларускай мовы”**
(прыкладны пералік пытанняў )

**3 курс**

1. Сінтаксіс. Сінтаксіс як узровень мовы і раздзел граматыкі.
2. Адгалінаванні сінтаксісу.
3. Аспекты вывучэння сінтаксісу.
4. Сінтаксічныя адзінкі (сінтаксема, словазлучэнне, сказ, ЗФА і інш.).
5. Словазлучэнне. З гісторыі вывучэння.
6. Лінгвістычны статус словазлучэння.
7. Перабудова і парушэнне падпарадкавальных сувязей словазлучэння ў кантэксце.
8. Просты сказ. Аспекты вывучэння сказа.
9. Мадэль сказа і сінтаксічныя пазіцыі.
10. Паняцце прэдыкатыўнасці як асноўнай прыметы сказа.
11. Вербацэнтрычная тэорыя сказа.
12. Прэдыкатыўная аснова двухсастаўнага сказа.
13. Праблема каардынацыі дзейніка і выказніка.
14. Даданыя члены сказа. Традыцыйнае вучэнне аб даданых членах сказа.
15. Сінкрэтызм у сістэме даданых членаў сказа.
16. Дэтэрмінаваныя і недэтэрмінаваныя члены сказа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Залікова-экзаменацыйныя матэрыялы**
**па дысцыпліне “Актуальныя пытанні беларускай мовы”**
(прыкладны пералік пытанняў )

**4 курс**

1. Аднасастаўныя сказы. Лінгвістычны статус аднасастаўных сказаў.
2. Праблема класіфікацыі аднасастаўных сказаў.
3. Сінтаксічная кваліфікацыя галоўнага члена аднасастаўнага сказа.
4. Лінгвістычны статус вакатыўных сказаў.
5. Месца генітыўных сказаў у сістэме простага сказа.
6. Сінтаксічна непадзельныя сказы. Тэрміналагічнае абазначэнне сінтаксічна непадзельных сказаў.
7. Няпоўныя і эліптычныя сказы. Лінгвістычная сутнасць няпоўных сказаў.
8. Лінгвістычная сутнасць эліптычных сказаў.
9. Ускладнены просты сказ. Пытанне аб кампанентах ускладнення простага сказа.
10. Класіфікацыя адасобленых членаў. Сінтаксічная сувязь адасобленых членаў у сказе.
11. Пабочныя канструкцыі. Сувязь пабочных канструкцый з асноўнай часткай сказа.
12. Класіфікацыя сказаў з пабочнымі канструкцыямі.
13. Устаўныя канструкцыі. Сувязь устаўных канструкцый з асноўнай часткай сказа.
14. Далучальныя канструкцыі. Лінгвістычны статус далучальных канструкцый.
15. Складаны сказ.
16. З гісторыі вывучэння.
17. Сінтаксічная сутнасць складанага сказа.
18. Кампаненты складанага сказа.
19. Класіфікацыя складаных сказаў.
20. Канструкцыі з прыметамі простага і складанага сказа.
21. Складаназлучаны сказ. Агульная характарыстыка.
22. Сувязь частак у складаназлучаным сказе пры дапамозе злучнікаў.
23. Выражэнне розных сэнсавых адносін паміж часткамі складаназлучнага сказа.
24. Часткі адкрытай і закрытай структуры ў складаназлучаным сказе.
25. Складаназлучаныя сказы са спалучальнымі часткамі. Праблема дыферэнцыяцыі.
26. Складаназлучаныя сказы з пералічальна-размеркавальнымі часткамі. Праблема дыферэнцыяцыі.
27. Складаназлучаныя сказы з далучальнымі часткамі. Праблема дыферэнцыяцыі.
28. Складаназлучаныя сказы з супастаўляльныямі часткамі. Праблема дыферэнцыяцыі.
29. Складаназалежны сказ. Агульная характарыстыка.
30. Складаназалежныя сказы з даданымі дзейнікавымі і даданымі дапаўняльнымі. Праблема дыферэнцыяцыі.
31. Складаназалежныя сказы з даданымі выказнікавымі і даданымі азначальнымі. Праблема дыферэнцыяцыі.
32. Складаназалежныя сказы з даданымі спосабу дзеяння і даданымі меры і ступені. Праблема дыферэнцыяцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

33. Складаназалежныя сказы з даданымі часу і даданымі ўмовы. Праблема дыферэнцыяцыі.
34. Складаназалежныя сказы з даданымі мэты і даданымі прычыны. Праблема длыферэнцыяцыі.
35. Складаназалежныя сказы з сінкрэтызмам значэнняў.
36. Складаныя злучнікавыя сказы прамежкавага, або пераходнага, тыпу.
37. Камунікацыйны аспект сказа.
38. Актуальнае чляненне выказвання. З гісторыі распрацоўкі пытання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# КАНТРОЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ
## Дыктанты для самакантролю

1. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

У Кастуська была неадольная цяга да птушак, раслін і кветак. Канечне, ён мог пабегчы на пагулянку да хлопцаў, насіцца па лужынах, будаваць на ручаях запруды, назіраць, як расцякаецца тонкай markerнакалёрнаю плевачкаю бензін, але гэтага было мала. Яго цягнула на адзіноту, хацелася мець сваю таямніцу, далучэнне да якой і разгадка якой давалі б волі фантазіі, роздуму. Клікала кудысьці ў невядомасць нез'яснёная ўнутраная сіла. Уладу над ім узялі расліны. Іх смелы, надзвычай дружны выхад з зямлі, неўтамаваная прага расці, развінаць лісцікі, выкідваць кутасікі і расцвітаць моцна хвалявалі Кастуська, дзе б ён ні быў: на пагоне, у лесе, ішоў па дарозе альбо капаў з маці грады.

Дарэчы, пра грады… Бацька, яшчэ слабы, да іх не прычыняўся. Кастусёк з маці выносілі з хлява гной, растрасалі і ўскопвалі зямлю. Потым дзялілі яе на роўныя прастакутнікі. Перш-наперш садзілі цыбулю. Загадзя маці пазразала з цыбулін вяршкі з хвосцікамі, пакідала ў міску з вадою. Граду расчарціла на квадраты, у куточкі якіх торкала цыбуліну зрэзаным уверх. На гэтых мясцінках ужо выпнуліся светла-зялёныя тугія расточкі. Буркі, моркву, агуркі садзіць было прасцей. Цапком маці праворвала лунку, брала жменьку разбрынялага ў вадзе насення і сыпала ў яе. Услед Кастусёк загортваў зямлю.

Займеўшы навыкі агародніка, ён задумаў завесці сваю маленькую зялёную гаспадарку. Ускапаў пры хляве, адкуль назіраў за шпакамі, лапік зямлі, дбайна ўзрыхліў, перабраўшы пальцамі кожны камячок, і нават абгарадзіў калкамі. Навыкопваў, а то проста навырываў усялякага зелля і перасадзіў на свой агародзік. Браў з лужыны пад страхою бляшанкаю ваду і паліваў. Травінкі перш падвялі, сагнуліся, а пераначаваўшы, выструніліся гэтак, быццам у кожную хтосьці ўставіў сталёвы дроцік. Сачыць за іх ростам, новымі лісцікамі, што вылазілі невядома з якіх мяшэчкаў, было не менш цікава, чым за шпакамі. Маці пасміхалася з Кастуськовага занятку, а ён раўніва аберагаў свой гадавальнічак. (286 слоў)

Уладзіслаў Рубанаў. "Не аднойчы забіты".

2. Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак.

…Цяпер маё роднае Заброддзе дзе толькі ў чатырох хатах цепліцца жыццё ціхае састарэлае занядбанае, як, дарэчы, і многія беларускія вёсачкі аднес(ен, ян)ыя некалі да не/перспектыўных. Дасталося яму вядома і чарнобыльскіх "пачастункаў".

Не такая ўжо і наша бацькоўская хата з якой у свой час вылецелі ў далёкі свет мае пяць сясцёр і пяць братоў. Ды і бацькі пакінулі яе ў пачатку васьмідз…сятых перабраўшыся на ма…чыну радзіму ў вёску Ямнае што не/падалёку ад Быхава. Пэўны час з розных гарадоў нашы пуцявіны кіравалі ў Ямнае а душы вельмі сумавалі па Заброддзі… . Цяпер калі мама і тата спачываюць на ямніцкіх могілках мы дзеці зая…джаем туды толькі на паклон ім бацькам нашым каму абавязаны да

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

апошняга кроку. А частку а…пачынку абавязкова праводзім у мілым сэрцу Заброддзі. Бацькоўскую хату, наша незабыўнае “гняздо” глядзіць прыгожыць старэйшая сястра Валянціна якая наязджае сюды з Мінска і знаходзіцца з вясны да позняй восені.

Некалі паехаўшы з роднай вёскі на вучобу душой я назаўсёды застаўся ў ёй. У апошнія гады гэтыя сувязь пашыраецца мацнее. (Ня, не)/рэдка выступаю перад землякамі ў Глухах, Быхаве. Падтрымліваю сувязь з кіраўнікамі раённых структур краязнаўчым музеем СПК “Глухі” роднай школай… . Усё часцей а…чуваю ў сталіцы як не хапае мне тут да болю роднага невымоўна/светлага шчымліва/крынічнага, таго што ёсць толькі на радзіме. Ніколі так не імкнуся ў экзатычная мясціны далёкага замежжа як у сваё чароўнае Заброддзе дзе сустракаючыся з людзьмі зліваючыся з прыродай адчуваю сябе ўзнёслым і шчаслівым. Дзе тысячамі нябачных нітачак маё сэрца звязана усім наваколлем з зямлёю і небам. Тут лёгка дыхаецца прыгожа марыцца вольна крочыцца. Тут а…чуваю як пульсуе мая першая і галоўная крыніца харacтва і любові. А на любові і харастве трымаецца свет, а ў гэтым – наша чалавечае прызначэнне і сэнс жыцця…

Жыві, маё Заброддзе! (281 слова)

Міхась Пазнякоў. “І роднай вёсцы пакланюся”.

3. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

Слухае Мішка [медзведзяня] і дрэмле, зіму ўспамінае, калі шумелі дрэвы, як гэты авёс. Праўда, шум той быў куды мацнейшы і грозны, хоць і чуў яго Мішка праз сон, праз сваю зімовую спячку. Не шумела, а гуло па верхавінах, па аснежаных лапах елак… І было тады страшна холадна. Памятае Мішка, як курылася пара над бярлогай, і ад пары тае звісалі празрыстыя ледзяныя сасулькі – аб іх наколваў нос Мішка, калі намагаўся пад самую вясну выпаўзці з бярлогі.

Любіць Мішка слухаць аўсяныя шолахі. А яшчэ больш даспадобы яму аўсяныя калосікі. Салодкія яны, пахучыя, як матчына малако. І аскубае Мішка авёс, поўнымі жменямі заціскае ў рот, а калі прытаміўся хадзіць на задніх лапах, калі наеўся, тады прылёг і, прымяўшы лапай колькі сцяблінак, лянiва перабіраў іх губамі, смакаваў кожны колас.

На паляне яны былі не адны. Прыйшоў яшчэ адзін стары мядзведзь. Быў ён надзвычай пануры, сярдзіты. Без усякай прычыны накінуўся на Мішку і так скубануў яго зубамі, што той аж зайшоўся ад рову. Тады заступілася матка [мядзведзіца] і так грозна пачала наступаць на мядзведзя, так моцна ўдарыла яго пярэдняй лапай, што стары мядзведзь бегма кінуўся ў лес, затрашчала толькі ламачча ды кусты алешніку. Па рыжай падпаліне на баку ў мядзведзя Мішка пазнаў у ім свайго бацьку і здзівіўся: вось дык бацька, добра выхоўвае ён сына, выскаляючы на яго зубы…

Без асаблівых прыгод пайшлі яны назад. Мядзведзіца ішла побач з Мішкай, старанна залізвала яму шыю, дзе былі сляды ад бацькавых зубоў, і ціха вурчала пад нос аб нечым сваім, мядзведжым. Калі пераходзілі праз ручай, мядзведзіца ўзяла Мішку ў пярэднія лапы і пачала купаць яго. Не асабліва паважаў Мішка гэтую аперацыю і ў другія разы з усіх сіл намагаўся наўцёкі, спрабаваў кусацца. Але

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цяпер, узгадаўшы матчыну абарону і клопаты, паслухмяна цялёпкаўся ў вадзе і падстаўляў пад матчыны лапы то адзін, то другі бок. Пасля купання весела бегаў па лесе, ганяўся за белымі матылямі, куляўся па зялёнай траве, каб хутчэй асушыцца. (310 слоў)

Міхась Лынькоў. " Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў".

4. Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак**.**

Багацце запаведніка – не толькі жывёлы. Цікавы і разнастайны свет раслін запаведніка. У кожным яго кутку  ў лесе на лузе ў вадзе  можна сустрэць рэдкія прыгожыя кветкі якія ўжо зніклі ці на мяжы знікнення ў іншых мясцінах рэспублікі. Тут яны беражліва ахоўваюцца за папуляцыямі вядуцца пастаянныя назіранні. На жаль па віне чалавека і знішчаюцца многія расліны якія ўпрыгожваюць прыроду.

Большас…ць рэдкіх раслін аблюбавала тутэйшыя лясы якім няма, бадай што, роўных у Еўропе. На сухіх пя…чаных грудках узносяцца да нябёсаў стройныя хвоі а невялічкія да пяці метраў у вышыню зачапіліся за балоты. На лясных палянках на яркім дыване імхоў растуць сон/трава грушанкі сумнік казялец раскіданы кучкі злакаў. А ў чарнічных і арляковых сасняках можна палюбавацца пралескай выс…кароднай, геранню мар'яннікам чынай канюшынай.  На марэнных грудках у сасняках захаваўся такі цуд прыроды як архідэі. Самыя рэдкія сярод іх пылкагаловік чырвоны і гайнік цёмна/чырвоны. Кветкі вельмі прыгожыя але на жаль не ўтвараюць насення. Таму могуць знікнуць у першую чаргу. Вось чаму іх ахова ў запаведніку  гарантыя таго што прыгажосць не знікне.

(Ня, не)/многія ведаюць што (Б, б)ярэзінскі запаведнік – амаль скрозь балотны край. Не кожны адважваўся ступіць на балота дзе, па павер'ях, жыла (ня, не)/чыстая сіла адбываліся не/зразумелыя праявы  балотныя агні загадкавы туман што гойдаецца над паверхняй багна якая бя(сс, с)ледна зацягвала і звера і чалавека. Ды, відавочна, такія ўяўленні пайшлі на карысць прыродзе ў непраходнай багне выжылі многія звяры і птушкі захаваліся цікавыя расліны знішчаныя ў іншых мясцінах. Так што можна сказаць дзякуй балотам.

І цяпер вучоныя ашчадна ахоўваюць тое багацце якое засталося тут. У паўночнай і цэнтральнай частцы запаведніка найболей вядомыя вярховыя сфагнавыя балоты – Жары, Слабодскае, Саўскі Мох, Пастрэжскае, Домжарыцкае. Цікавы штрых колісь тут былі азёры але прыкладна шэсць тысяч гадоў назад вадаёмы пачалі зарастаць, на вялікія плошчы наступалі балоты.

У паўднёвай частцы запаведніка ляжаць нізі(нн, н)ыя балоты якія ў любы час года не/праходныя. Можна толькі ўявіць сабе колькі тут дзічыны якую ніхто не мае права ні пужаць, ні страляць. (308 слоў)

Алесь Дзятлаў. "Дзе струменіць Бяроза-рака".

5. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

Нездарма казалі: буйная, як боб, раса – да пахаладання, да перамены надвор'я. Спачатку доўга прыпарвала, паветра ўсё больш насычалася вільгаццю, і вось

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аднойчы вялікая попельная хмара, выплыўшы з-за Агарэвіцкага балота, цалкам накрыла Малое Сяло. Абвальны лівень з грымотамі і маланкамі ўспучыў перасохлую, сасмяглую зямлю, напаіў пажухлыя сады, абмыў на дрэвах руды пыл. Пасля зацяжных дажджоў, што пачаліся ўслед за доўгачаканай і выратавальнай навальніцай, увачавідкі паправілася, зазелянела паша, у водмаладзь пайшла бульба, ажылі пакрысе вясковыя агароды. Працяглая засуха, аднак, нарабіла шкоды, чакаўся значны недабор ураджаю, і, не спадзеючыся на вельмі жытны калгасны працадзень, маласельцы з журботай думалі, што і гэтай зімой ім давядзецца жыць надгаладзь, не маючы нічога лішняга ні сабе, ні на продаж.

Цёплымі маладзіковымі начамі, дзякуючы ўсё тым жа зацяжным дажджам, на пачатку верасня ў маладых сасонніках і на параслях з зямлі палезлі праўдзівікі (хоць касой іх касі), у верасовых нерушах спорна пракінуліся чырвонагаловікі, у сіўцы вакол палян і на ўзлесках знайшліся тлустыя маслякі, старыя пні ў змрочных ельніках кучна абсыпаліся цыбатымі апенькамі. Шчодры вераснёўскі лес прынёс людзям усё ж нейкае суцяшэнне: мала хлеба, дробная бульба, марныя агуркі, дык узімку на стале будзе хоць вараная капуста з сушанымі грыбамі. На баравіны, у дубровы і бярозавыя гаі, забыўшы пра іншыя неадкладныя справы, кінуліся незлічоныя чароды грыбнікоў з пудовымі кашамі і вялікімі, сплеценымі з луцця карзінамі. Маршрут у маласельцаў адзін і той жа: паўз Капцы, паўз Імшэчак, а там, далей, пачынаюцца самыя цікавыя грыбныя мясціны. Вось толькі Імшэчак, яшчэ нядаўна прыгожы і маляўнічы, цяпер не пазнаць: пасля летняга пажару ён стаў нязвыкла чужы і незнаёмы.

Змрочным і непрыглядным Імшэчак будзе да першага снегападу, пакуль нацянькі цераз гаці і брады на святое Увядзенне сюды не прыблытаецца расхрыстаны, басаногі Зюзя. Валадар холаду сярдзіта зачмыхае ў сівую бараду, і снежаньскія мяцеліцы аж да вясны схаваюць пад белай коўдрай жахлівую і злавесную чарнату лясной балацявіны. (287 слоў)

Віктар Гардзей. “Бедна басота”.

6. Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак**.**

Тамаш Зан больш вядомы ў нашай гісторыі як адзін з кіраўнікоў віленскіх згуртаванняў моладзі н…зломны змагар за народную волю. Гэта ён актыўны член славутага (Т, т)аварыства філаматаў (сяброў навук) і старшыня больш шырокага і прадстаўнічага (Т, т)аварыства філарэтаў (сяброў дабрачыннасці), атрымаў самае суровае пакаранне пасля праведзенага сенатарам Навасільцавым следства цэлы год турэмнага зняволення ў крэпасці на (У, Ў)рале і б…стэрміновае пасяленне там разам з двума іншымі “злачынцамі” – Янам Чачотам і Адамам Судзіным. Імя Тамаша Зана ўвекавечыў у сваіх сусветна вядомых “Дзядах” яго блізкі сябар і паплечнік па тайных згуртаваннях вялікі паэт беларускай зямлі Адам Міцкевіч які паказаў нязломнасць духу і самаахвярнасць гэтага галоўнага бунтара спакою на Беларусі ў першай чвэрці XIX стагоддзя.

Значна менш мы ведаем пра Тамаша Зана як паэта. І гэта не дзіўна раскіданыя па шматлікіх польскамоўных перыядычных выданнях мінулага стагоддзя яго творы

амаль не/даступныя сённяшняму беларускаму чытачу. Між тым яны заслугоўваюць самай шчырай нашай увагі і прыхільнасці хаця пісаліся на польскай мове. Для нас (З, з)анавы творы цікавыя перш за ўсё тым што ў іх мы знаходзім шырокае выкарыстанне матываў і вобразаў багатай вусна/паэтычнай творчасці роднага аўтару беларускага народ…. Гэты зварот да фальклору меў важны вынік. Тамаш Зан а разам з ім Ян Чачот і Ануфры Петрашкевіч якія так/сама звярнуліся ў сваёй творчасці да чыстых крыніц беларускага фальклору зацікавілі вуснай паэзіяй беларусаў яшчэ аднаго сябра/філамата – Адама Міцкевіча які быў на пачатку сваёй літаратурнай дарогі ў палоне канонаў класіцызм…. Гэтым самым яны памаглі яму выйсці на дарогу рамантызм… больш прагрэсіўнага напрамку ў літаратуры.

Сярод твораў Тамаша Зана найбольшую вядомасць атрымалі яго балады камедыя “Грэцкія піражкі” паэма “Табакерка” асобныя вершы трыялеты песні элегіі. (261 слова)

Кастусь Цвірка. “З паэтычнай кайстры Тамаша Зана”.

7. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

Раніца, між тым, разгаралася ў пагожы ліпеньскі дзень. Нерухома, нібыта спавітыя нядаўняй навальніцай, стаялі раскошныя, да пояса, лугавыя травы, і промні сонца, якое ўсё болей і болей размывалася над ракой, праламляліся ў матавых каралях расы, жамчужна зіхацелі ў напоеным азонам паветры. І мяне раптам да слёз узрушыла гармонія жыцця, якая панавала наўкола.

Палессе… Мы ішлі сенажацямі, з ног да галавы ахінутыя духмяным разнатраўем, і за плячамі дыміўся шырокі калматы след на траве. Я крочыў замыкаючым у нашай звязцы, і мяне не гэтак хлістала па твары пякучым пылком кветак, як Міхайлавіча, які крочыў наперадзе. На падыходзе да возера, у нізінным алешніку, дзе нават у спёку бывае сыра, без асаблівых цяжкасцей накапалі халодных ружовых выпаўзкаў. Пакуль здабывалі чарвякоў і жыўца на шчупака, пакуль знайшлі човен на непадступным забалочаным беразе, што густа парос хмызняком, чаротам і дзягілем, а потым пакуль прымяраліся, куды лепей паставіць жарліцы, дзе прытапіць жакі, – непрыкметна перайшло на другую палову дня, якая, як вядома, карацейшая за першую нават у ліпені.

Мае спадарожнікі, відаць, вырашылі далей не выпрабоўваць лёс і, параіўшыся, пачалі рыхтаваць мяне да адпраўкі дахаты.

Возера Царкоўнае злучаецца з Прыпяццю, таму мяне без лішніх клопатаў уладкавалі на маторку знаёмага гарадчука, якая ішла знізу, – на ахапак свежаскошанай травы, што паспела ўжо прывянуць на сонцы і рачным ветры і сачылася духмяным настоем. Уздоўж па Прыпяці конусам пралегла да павароту серабрыстая дарожка з асляпляльных сонечных блікаў. Вада цёплая і ласкавая, калі незнарок апусціць руку ў яе тугую зеленаватую тоўшчу, затое веер халодных пырскаў і вядзяны пыл – бр-р! – умомант засявае твар і шыю пухіркамі. Гэта таму, што над вадой ужо прахалодна.

Воблакі рэльефна і маляўніча адбіваюцца ў вадзе, і, калі стомлена прыкрыеш вочы, здаецца, што лодка адрываецца ад паверхні вады і ты ўзлятаеш ў паднябессе, і сэрца міжволі сціскаецца і замірае ад салодкага страху. (291 слова)

Уладзімір Глушакоў. “Расплата”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

8. Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак**.**

Цяплее. Поле сушэе шарэе і ўсмоктвае ў сябе ваду; выпырсквае каля плота маладзенькая, яшчэ не/пякучая крапіва (хутка з яе і буракоў ды костачкі будзе спажыўное варыва) на заплесненых узгорках імкнуцца ў/высь дз…мухаўцы і падбел і ўжо хутка зацвітаюць с/прасоння лётае басавіта гудзе адзінокі бухматы, ахаладнелы і агаладалы за зіму чмель. Пасля дажджу змываюцца цвіль і плесень а тыя прасторы дзе жыта нібы накрытыя зялёнай коўдрай, ажно ўпівае…ся вачыма той зеленню. Ужо не толькі курэй але і авечак карову і цяля каня не ўтрымаць у цесным хляве ўсе рвуцца на сонечны двор, а з яго на загуменне і не хочуць вяртацца ў цесныя, з утаптаным, але ўсё роўна высокім подсцілам загарадкі.

Ды не заўсёды за яснотай і прыгрэўкам выцепліваецца. Бывае раптоўна хмурэе сцюдзёнее і ашмоццем падае мокры снег а то нават і закружыць замяцеліць ім. Пасля можа задоўжыцца яшчэ сіверны дождж, а з ім і не/прыемны сыры холад. Перастае цурчэць бярозавы сок, нават абвісае ледзяшамі, пакутуюць паўраскрытыя, прыбеленыя пупышкі/кветкі на слівах, а яблыні ўвогуле застылыя як і зімой ні кветак ні лісця. Паніклі не толькі прылётныя на першы цёплы подых шпакі але і перазімаваныя тут вёрткія (асабліва каля курынага карытца) вераб'і. Як толькі ўз…юшаная непагадзь усё ж мусіць здацца зноў падвысіцца паблакітнее неба заласкавее, заярчыць і пальецца цяплом сонца абкінецца празрыста/зялёным вэлюмам і пачне апушвацца лісцем наша бяроза, – маці (не/высокая, бацьку па плячо, рухавая, рупная, гаваркая і пры добрым настроі жартаўлівая і песністая), Генік і яго сястрычка Ганначка (па-янкавінскаму Гандзя, Гандзечка) з узнёслым настроем ідуць у гародчык.

У "добры" (спрыяльны) дзень матуля дае ім дзецям апускаць у загадзя падрыхтаваныя ёй раўчучочкі днямі замочанае і цяпер крыху па…сушанае насенне морквы буракоў гароху а пазней летняга часнаку цыбулі агуркоў і гарбузоў. Маці ведае "ўрадныя" дні як бацька знае калі араць сеяць у/восень жыта а вясной – авёс садзіць бульбу. (305 слоў)

Генрых Далідовіч. "Сярод поля, сярод лесу".

9. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

Як толькі раставаў, сцякаў гаманлівай ручаістай вадою снег, падсыхалі дарогі, зелянелі лясы, балоты, палі, цераз Вялікі Лес ехалі цыганы. Ехалі звычайна ў канцы дня, перад самым заходам сонца, калі людзі, напрацаваўшыся, былі ўжо дома, у сваіх хатах, сядзелі сем'ямі за сталамі, елі тое, што каму паслаў бог. На вуліцу адразу ж высыпалі дзеці. Беглі за цыганскімі вазамі, на якіх былі напяты з тоўстага палатна ці крамніны буды, галёкалі, крычалі. Цыганы, цыганкі, а таксама іхнія заўсёды мурзатыя чорнагаловыя прадаўжальнікі роду глядзелі на ўсё, што трапляла на вочы, з нейкім як бы зацятым спакоем, думнасцю. З гэтага спакою, думнасці іх нішто-нішто не магло выбіць. Нават галёканне, крыкі басаногай вясковай дзятвы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ляскочучы вазамі, рыпучы сухімі раменнымі гужамі, цыганы міналі вёску, выязджалі на луг, што быў за невысокім, спадзістым пагоркам, і там, у рэдкім маладым бярэзніку спыняліся. Распрагалі коней, путалі ім ногі і пускалі на траву папасвацца. Самі ж рабілі з вазоў табар, раскладалі агні. Варылі есці, і калі наядаліся, то выносілі з будаў бубны, гітары, іншыя, толькі ім вядомыя галаснікі. Пачыналася цыганскае ігрышча. Увесь Вялікі Лес ад малога да старога збіраўся да цыганскага табара. Цікава было паглядзець зблізку на гэтых крыху дзікаватых людзей, якія ніяк не хацелі асесці і жыць, як жывуць усе, а валацужнічалі, вандравалі з месца на месца, цягнула і паглядзець на іхнія імклівыя скокі, калі цела быццам без касцей і не разабраць, дзе ў чалавека рукі і галава, а дзе ногі, цікава было паслухаць іхнія то аж занадта вясёлыя, то зусім панылыя, сумныя песні.

І сёлета калі не ўвесь Вялікі Лес, дык ва ўсякім выпадку большая палавіна яго сабралася надвячоркам на лузе ў бярэзнічку. (269 слоў)

Барыс Сачанка. “Вялікі Лес”.

10. Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак**.**

Людзі ў нашым краі, на Капыльшчыне сталі жыць аседла больш за два…аць стагоддзяў назад. Да такога вываду можна прыйсці калі меркаваць па курганах і старых гарадзішчах, якія захаваліся на рэ…цы Выня. Тут ажно тры гарадзішчы: каля вёскі Мыслі, на месцы цяперашніх могілак (каля шашы на Капыль) і ў лесе, насупраць вёскі Ржаўка.

Гэта былі сялібы/крэпасці абнесеныя насыпам ровам і частаколам. Пахавальныя курганы даўно разбураны. На ўсю акругу захаваліся толькі два – на полі між вёскамі Лотвіны і Печураны. Менш прыкметныя гарадзішчы захаваліся таксама ў мястэчку Бабоўня, на пагорках, там дзе сёння канюшня аптэка і магазін панскія і яўрэйскія могілкі, а яшчэ каля аўтастанцыі (цяпер зруйнаваны).

Калі меркаваць па гэтых помніках то паселішча на месцы м…стэчка было ўжо ў пачатку новай эры. Узгоркі паміж балотаў былі зручным месцам для жыцця нашых продкаў/крывічоў. Назва мястэчка пайшла ад расліны бабоўнік ці канюшына што расла паміж узвы(шш, ш)амі.

Суседнія вёскі маюць назвы Печураны (ад старaславянскага слова печур – крапіва) Выня (раней завыенне – ад словы выня – паляна, дзе вынялі карэнне) Каласаўшчына (каласавое поле ці нават сховішча) Лавы (месца загону) Клецішча (месца, дзе ўтрымлівалі дзічыну) Осава (оса – асіна па-стараславянску) Пнівада (плаціна) Руднікі (месца, дзе здабывалі руду) Гута (месца выплаўкі руды) і інш. Некаторыя м…сціны вакол мястэчка яшчэ і сёння называюць як некалі: Лядзішча (выжарына) Попелева (ад слова попел, які тут атрымлівалі дзеля ўгнаення), побач поле – Процераб (выкарчаваны лес) Отступ (заказнік, месца разводу і нагулу дзічыны), Стэпы (бязлесная прастора), Калюга (лужына). Тут толькі адна назва вёскі Лотвіны (лотва – нізіна) сугучная назве балтыйскага племя лотва.

На поўдзень ад Капыля ёсць яшчэ дз…ве вёскі – Вялікія і Малыя Прусы. Сюды мабыць, перасяліся прусы, яшчэ пры Вітаўце недзе ў XIV стагоддзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Некаторыя гісторыкі с…цвярджаюць што да славян у нашых месцах жылі я(ц, т)вягі. Славяне прыйшлі з Карпат у VI – VIII стагоддзях. Беларусамі нас кажуць пачалі называць гадоў дз…весце назад калі далучылі да Расіі. (295 слоў)

Вячаслаў Піліпчык. "Бабоўня любая мая".

11. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

Вясна ў лесе раскашавала ўсімі колерамі вясёлкі. З дупла ў высозным дубе, дзе зрабіла сабе ўтульнае гняздзечка старая вавёрка Рыжуха, адкрывалася цудоўнае відовішча. Унізе павольна хісталіся бялюткія кветкі ветраніцы і жаўтлявыя галоўкі пралесак, крыху наўзбоч, за кустамі ляшчыны, на ледзь прыкметным пагорачку прабіліся бліскучыя парасткі ландышаў. А яшчэ далей, у вечна шумлівым бары, ціха тлелі сінія цяпельцы сон-травы. Сосны стаялі тут рэдка, і на дол шчодра ліліся залацістыя патокі сонечнага святла. Суседнюю высечку ахутваў зялёны туман: там імкліва і дружна распускаліся клейкія лісцікі маладога бярэзніку.

Але пошум вясны – шырокі, яркі і магутны – кранаў сёння сэрца Рыжухі зусім не так, як заўчора і ці нават учора. Раней яна не магла нарадавацца сонцу, свежай зяляніне, скакала сярод кветак, выгінаючы пытальнікам доўгі і пушысты хвост. А сёння з самага ранку Рыжуха хвалявалася, амаль не выглядвала з дупла. У яе сэрцы нарастала шчымлівая трывога. Будзіла гэты неспакой новае жыццё, якое Рыжуха адчувала цяпер у сабе асабліва востра.

Пад вечар полымя нізкага сонца ахапіла аблокі, заліло пунсовымі фарбамі перапоўненае вадой суседняе балотца, прыбавіла радасці векавому бору. Прырода па-свойму, зіхаценнем сакавітых колераў і суладдзем птушыных спеваў, адзначыла паяўленне ў цеснаватым цёплым дупле пяцярых вавёрачак. Рыжуха, стомленая, але радасная і вясёлая, увішна шчыравала ля малых. Старанна вылізвала ледзь прыкметную поўсць, ласкава туліла крывінак да свайго схуднелага цела. Быццам цалуючы ці бясконца іх пералічваючы, Рыжуха па чарзе дакраналася да вавёрачак носам, здавалася, шчыра і шчасліва ўсміхалася.

Ноччу пад дубам прашумела першая красавіцкая навальніца. Цёплы і дружны дождж абмыў траву, кветкі, памаладзелы лес. Вясна забуяла з новаю сілай.

Спачатку Рыжуха пакідала малых у дупле вельмі рэдка. Прыкрые іх мяккаю травою, выслізне на волю, падсілкуецца і зноў у дупло. Усё песціла дзетак, саграваля, да бляску вылізвала гладкую поўстку. А ў поўдзень, калі сонца набіралася моцы, па чарзе выносіла вавёрачак на тоўсты сучок і дазваляла крыху папоўзаць па шурпатай кары, падыхаць свежым паветрам. Сама ж ні на момант не спускала з іх вачэй. (309 слоў)

Васіль Жушма. "Гарэза".

12. Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак**.**

Пачуццё бацькаўшчыны пачынаецца з усведамлення што родны кут – найлепшы ў свеце. Неадступныя думы пастаянна вядуць мяне на (М, м)агілёўшчыну

у (Ш, ш)клоўскі раён дзе ў зялёнай і вечна святочнай вёсцы Нова/Аляксандраўка я нарадзіўся. І хоць я ў/досталь наглядзеўся на хараство зямлі магу, паклаўшы руку на сэрца, кожнаму давесці, што такога здаровага паветра гаючай вады і лагоднага сонца я не сустракаў нідзе.

Вось – некалькі абразкоў з дзяцінства.

Расчыніш акно – і ў хату ломіцца бэз. Ці то ад хмельнай квецені, ці то ад слабасці кружыцца галава зняможана прыпадаеш да падушкі і ў вачах – адно неба. Такое празрыстае і тонкае што яго здаецца можа ра(сс, с)еч імклівы цень ластаўчынага крыла, і тады гэта загадкавая шыбіна асыплецца шкляным дажджом на кволы яблыневы цвет і ўжо ніколі не дачакаешся крамяных антонавак.

І зноў – успамін. Вятрыстая раніца. Струменіцца паветра ў палявой далечы. Я трымаюся за грыву высачэзнага каня якога бацька вядзе за аброць. З мяхоў дзядзькі насыпаюць жыта ў ліпавыя сявенькі абвязаныя вышытымі ручнікамі кашулі на сейбітах – гармонікамі. Гэта – сяўба.

А пасля быў луг з сярдзітымі чмялямі дзе хараша схавацца з галавой і заблудзіцца сярод рамонкаў; лес што вабіў таямнічымі вываратнямі дупламі і незлічонымі гнёздамі; цяністыя джунглі гарох… у якім зашыўшыся добра ласавацца не пакідаючы голас… І, галоўнае былі незабыўныя святы касьба і жніво. Дагэтуль у маіх грудзях не моўкне прамяністы пераразвон кос і саладка тае шырокая і няўлоўная журботная жніўная песня – найв…лікшыя напевы зямлі.

Я ведаў птушак па галасах мог распазнаць дрэва па шолах…

Можна сказаць што ў тыя дні ў мяне было ледз…ве не язычаскае светаўспрыманне. Гэта – памятна але слава дзвярам бацькоўскай хаты якія ніколі не зачыняліся перад добрым чалавекам хвала залатой саламянай страсе пад якой знаходзілі прытулак многія людзі каго прывёў сюды дажджлівы вецер ці дзябёлы мароз. Колькі і чаго (не, ні) наслухаешся ў бясконцыя вечары! (287 слоў)

Сцяпан Гаўрусёў. “Трываласць грунту”.

13. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

Дуб увесь час сярдзіта стагнаў, шумеў, як шуміць лес у час буры, і не сціхаў нават у самыя ціхія, спакойныя дні.

Цяжка сказаць, чаму стагнаў дуб. Але даўнейшыя людзі думалі, што гэта ён спрачаецца з нябеснымі духамі, і стараліся, чым толькі маглі, задобрыць гэты дуб, каб заступіўся ён за іх перад невядомымі сіламі.

Вясною кожнага года ў самы разліў, калі шлях да Траян-дуба быў асабліва цяжкі і небяспечны, з усёй зямлі палескай прыходзілі сюды людзі, каб пакланіцца магутнаму дрэву-заступніку, вымаліць у яго да сябе спагаду і перадаць свае дары-ахвяры.

У магічную сілу Траян-дуба верылі прасталюдзіны і князі вялікія. Верылі таму, што другой веры не было. А без веры чалавеку цяжка, усё роўна, што сокалу без крылаў, што рыбе без вады. А вера ўсялякая добра: яна акрыляе чалавека, дапамагае здзейсніць яго мары і задумы, пастунова і ўпэўнена вядзе яго да вялікай мэты жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Праўда гэта ці не, але кажуць старыя людзі, што князі тураўскія садзіліся на свой трон княжацкі  толькі пад Траян-дубам. Адсюль і назва пайшла: Тронны дуб – Траян-дуб. Але другія сцвярджаюць,  нібы назвалі яго Траян-дубам за тое, што рос ён на тры вялікія какаты і здалёк здавалася, быццам там не адзін, а тры магутныя, гіганцкія дубы. Трайны дуб.

Ёсць яшчэ адна гаворка – трэцяя, пэўна, самая праўдзівая, верная. Як быццам у глыбокай старажытнасці, калі люд палескі толькі чуў-ведаў пра князёў кіеўскіх, пра імперыю дзівосную Візантыйскую, пра дзяржаву Вялікую Палянскую, а сам жыў сабе вольнай вольніцай і не дбаў аб сваёй дзяржаўнасці, наваліла-насунула з поўначы навала грозная, навала чорная. (280 слоў)

Іван Шальманаў. “Траян-дуб”.

14. Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак.

З/малку я палюбіў капыльскія ваколіцы поўныя нейкага чароўнага харaства. Мясціны тут узгоркавыя краявіды вельмі маляўнічыя і каларытныя. Адразу кідалася ў вока што мястэчка стаяла на беразе вялікага рэчышча на самым дне якога блішчэла пакручастая Каменка. Хоць рэчышча зарасло др…бналессем на схілах зеленела збажына а дзе было і забудавана але профіль яго добра вырысоўваўся, асабліва калі глянеш з высокага замчышча. Па/свойму дзівосна выглядалі адсюль з замка вузенькія гарыстыя (К, к)апыльскія вуліцы і вулачкі (не, ня)/зграбныя купецкія муры і крамы касцельныя вежы.

У/летку я часта блукаў па (К, к)апыльскіх палетках ездзіў з бацькам зімою гойсаў на лыжах.

Неўзабаве сталася так, што яшчэ больш я зжыўся з роднымі ваколіцамі яны сталі для мяне другім домам. Калі я вучыўся ў пятым класе было гэта ў цяжкую вясну 1933 года, адна за адною бяда прыйшлі ў нашу сям’ю. Давялося мне са старэйшым братам ісці ў заработкі з пугаю ў руках.

Чатыры гады я адгакаў на пастухоўскай “службе”. Даводзілася н…соладка: прыходзілася прапускаць урокі, а…ставаць жа ад хлопцаў не хацелася. Але самае цяжкае было ў тым што ў торбе часам толькі кніга і некалькі сырых бульбін. Добра калі якая-небудзь спагадлівая гаспадыня дасць “выганяльнага” – кавалак хлеб… і бутэльку малака (каровы свае ў нас тады ўжо не было).

Аднак тыя пастухоўскія гады далі мне многае. Я яшчэ больш а…чуў і глыбей зразумеў красу беларускай прыроды. Ад самай вясны і да позняй восені прыходзілася быць на лясным прыволлі ў полі і на лузе. На маіх вачах з’яўлялася ў Раўку першая кволая зеляніна пасля яна буяла і набывала розныя фарбы і а…ценні каб потым пера…сці ў залацістыя колеры. Мне падабаліся цёплыя летнія навальніцы калі маланка пісагавала неба моцна ляскаў пярун ліло як з вядра а ты схаваўся дзе/небудзь у зацішку і назіраеш што дзеецца навокал. Здаралася, дождж заставаў у полі  і тады на табе ніводнай сухой нітачкі. (290 слоў)

Сцяпан Александровіч. “Радзіма мая –  Капыль”.

15. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дуб быў галоўным дрэвам не толькі славян і балтаў. Зеўс таксама сядзеў на дубе, і нічога дзіўнага ў гэтым няма. Самае прыгожае, моцнае і даўгавечнае дрэва на гэтых землях, яно проста павінна было ўяўляцца нашым продкам боскім. Сапраўды, успамінаеш розныя мясціны Беларусі – і перш за ўсё бачыш дубы. На высокім беразе Дняпра паміж вусцямі Бярэзіны і Сожа дубовыя гаі цягнуцца на многія кіламетры. Дубы тут стаяць вольна, цвёрда, нікога не пускаюць сабе пад ногі; танкастволыя бярэзнічкі ціснуцца да лагчынак, асіннікі загнаныя ў вярховыя балоты, гонкія сосны, дзе аблітыя меддзю, дзе ўбранзавелыя, пазіраюць на шырокую рачную абалону з далёкага бору, – а дубы як зубры сярод дробненькіх статкаў сарнаў ды ланей. А наднёманская Мікалаеўшчына, дзе нарадзіўся Якуб Колас? Таўшчэзныя дубы таксама стаяць далёка адзін ад аднаго, з густа-зялёнага дзірвана выпіраюць карані, падобныя на падземных цмокаў, і ніхто не ведае, куды гэтыя дубы крочаць. У Налібоцкую пушчу? Да сваіх братоў на Дняпры?

Прысвіцязскія дубы больш задумлівыя. Відаць, яны закахаліся ў пяшчотна-сарамлівую, засмужаную ранішнім туманам і падсвечаную вечаровым сонцам прыгажуню-Свіцязь і не могуць ужо сысці з месца. А ўжо як расплюшчыць яна сінеглыбокія вочы – волаты зусім губляюць галаву і заходзяць у яе празрыста-халодную ваду, нізка схіліўшы магутнае голле. Плюскоча ў карэнні гуллівая хваля, смяецца, жартуе з анямелымі кавалерамі, якія растапырылі няўклюдныя рукі-катакі і не ведаюць, што рабіць далей. Чарот і той смяецца з гэтых залётаў, аж кладзецца на ваду. Харошыя яны хлопцы, гэтыя дубы, высокія, дужыя, хмару за хвост злавіць могуць, а ніяк не ўлагодзяць наравістую дзяўчыну, самую з самых сярод гэтых пагоркаў. Зрэшты, Свіцязь адна, а дубоў вунь колькі, не можа выбраць, бедная. То засмяецца, то аціхне ў тужлівым одуме…

У Налібоцкай пушчы таксама дубы, але там больш самотнікаў, якім недаспадобы гурты і рады. Гуляюць яна на волі самі па сабе, знойдуць прыдатную паляну ў лясной гушчыні і цешацца на ёй, клічуць, вабяць да сябе звера і птушку, падкармліваюць галодных, лечаць хворых. (308 слоў)

Алесь Кажадуб. “Рака вады жывой”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

16. Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак**.**

Са шматлікіх талентаў Караткевіча ўсе хто добра ведаў яго цанілі яшчэ адзін – талент сяброўства. Народны піс…меннік Беларусі Васіль Быкаў сказаў што Караткевіч быў рыцарам чалавечага дух… У сяброўстве ён таксама быў рыцарам верным самаахвярным гатовым заўсёды падзяліцца як апошняй скарынкай, так і ўсім багаццем сваёй натуры. Характэрная (К, к)араткевічава рыса: ён ніколі не выказваўся адмоўна пра сваіх сяброў і забараняў іншым гаварыць пры ім хоць нешта благое пра адсутных. Ён вельмі рэдка ўжываў спосаб гаворкі “паміж намі” і то – не пра сяброў. Трэба было моцна папрацаваць супраць Уладзіміра Сямёнавіча ужываючы не/прыстойныя прыёмы каб узрушыць яго прымусіць даць а…пор. Пры гэтым ён быў вельмі даткліва а…чувальны да крыўды тонкія даспехі безумоўнай інтэлігентнасці слаба абаранялі яго ад чорнай зайздрасці помслівасці злас…лівай

крытыкі, сам ён гэткай погані быў пазбаўлены начыста. Напярэдадні апошняга падарожжа сказаў (Ч, ч)алавек, які робіць крыўду другому, урэшце рэшт крыўдзіць себе".

Ён дзяліўся сяброўствам са шматлікімі людзьмі: піс…меннікамі мастакамі кінематаграфістамі артыстамі настаўнікамі навукоўцам, журналістамі – гэта па працы, "па інтарэсах", як кажуць. Але меў сяброў з іншых і часам не/чаканых колаў не праводзячы паміж імі мяжы бо цаніў перш за ўсё людскасць. Сябраваў са старэйшымі за сябе і маладзейшымі да тых і другіх ставіўся аднолькава прыязна, з усімі быў "на ты", цярпець не мог калі сябар звяртаўся да яго з залішняй павагаю.

Мы здружыліся ў чэрвені 1969 года калі "Маладосць" наладзіла нам экспедыцыю на Пале(сс, с)е. Магчыма, слова "экспедыцыя" занадта ёмкае (у навуковым сэнсе): мы ўладкаваліся на агітцеплаход "Уладзімір Маякоўскі" ва ўтульную каюту нас везлі, а мы пазіралі камфорту ставала бракавала самадзейных маршрутаў і самастойнасці. Хутка мы зразумелі як не трэба падарожнічаць і катэгарычна вырашылі пакінуць утульны борт "Маякоўскага" рызыкнуць на сапраўдныя прыгоды. Паспелі да таго часу прайсці Сож ад Гомеля да Лоева па Дняпры – да Кіеўскага вадасховішча Прыпяць – да Гарыні. У Давыд/(Г, г)арадку высадзіліся на сушу. (286 слоў)

Валянцін Ждановіч. "Белы човен".

17. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

За акном вагона ўжо ад самых Баранавіч замільгалі знаёмыя краявіды: чэзлыя ўздоўж чыгункі, пакурчаныя хвоі, мізэрныя сваёй беднасцю пасёлачкі тых, яшчэ першых, дачнікаў, густа зарослае чаратамі рэчышча ціхаплыннай Шчары, але чым далей, то ўсё выразней прыкметы сапраўднага Палесся. Абапал двухпуткі часцей і часцей трапляюцца белыя бярэзнікі, адзінокія ў полі дубы, неасушаныя гразкія балацявіны, а ў прамежку паміж імі на сухіх пагорках вабяць зрок гонкія грыбныя ды ягадныя бары. Прыгарадны дызель-поезд, мерна пастукваючы коламі на стыках рэек, пачынае замаруджваць імклівы бег і нарэшце спыняецца на бязлюдным паўстанку ў вядомай мне змалку вёсцы, чыгуначным палатном раздзеленай на дзве неаднолькавыя палавіны.

Дзень добры, Цельшына!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пасажыры, найбольш хлопцы і дзяўчаты, выкульваюцца на пясчаны насып, што служыць тут перонам, бягуць на пераезд, а мне чамусьці мроіцца: у іхнім гаманкім, вясёлым натоўпе матлянуўся на момант і знакаміты паношаны "лапсярдак" маладога настаўніка Андрэя Лабановіча. Але раптоўная мроя знікла, як і прыйшла, вочы паступова звыкаюцца з палескімі малюнкамі, якія набываюць першапачатковы, рэальны сэнс. Так, гэта не Цельшына, а славутая вёска Люсіна, дзе ў мясцовай школцы працаваў Якуб Колас. І нават цяпер, на размежжы двух стагоддзяў, яго тут любяць і помняць, бо вось і сціплы паўстанак, дзе спыніўся наш дызель-поезд, ужо даўным-даўно носіць імя народнага песняра Беларусі. Што ні кажы, а ўсё ж прыемна сам-насам прайсціся па тых сцежках і дарожках, па якіх у такой жа скрушнай адзіноце калісьці блукаў галоўны герой трылогіі "На ростанях", вялікі праўдашукальнік і рамантык Андрэй Лабановіч. У першай частцы твора – аповесці "У палескай глушы" – Якуб Колас надзвычай маляўніча і сакавіта апісаў побыт і звычкі палешукоў, іх гаротнае жыццё ў часы царызму, а многія жыхары Люсіна сталі прататыпамі непаўторных персанажаў кнігі – тутэйшай інтэлігенцыі і сялян. Даўнія з'явы і малюнкі выразна паўсталі ў вачах, і ўжо на пераездзе, паблізу невялічкай пачакальні з акенцам касіра і раскладам руху цягнікоў, нешта змушае прыцішыць крок, азірнуцца вакол сябе. (299 слоў)

Віктар Гардзей. "Падарожжа ў Цельшына".

18. Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У лісц… той колішняй тапола святочна глядзелася сонца цешачы вочы Купалы; у тую колішнюю таполю ўразаліся ў крону шч…рбячыся аб яе магутныя сукі маладзікі і ветахі. А весніцы на панадворак былі по/руч з таполяй; на весніцах прыбітая прыржавелымі ад восеньскіх дажджоў цвікамі бляха з профілем сабачай морды – вушы натапыр(ан, анн)ыя надпіс на бляс… папярэджваў "У двар… злы сабака". Але гэтым злым сабакам у два…атыя гады па панадворку бегаў не/вялічкі вёрткі Султан які лашчыўся каля ног дзяцей і дарослых у тры…атыя гады пахаджваў па двар… вялізны пясочна/жоўтай поўсці задум(ен, енн)ы ў сваёй непаспешлівасці Журан.

На дах дома схіляла голле чаромха як нявеста ў вэлюме ў маі, у густым засеве чорных ягадак павабных для птушкі -- зімою. Рухавыя і розныя яны паважна і ўвішна дз…балі дары былой маладухі чаромхі. Перад вокнамі на вуліцу і ў сад рос бэз кусцісты высокі. Якраз у пройме гэтага бэз… стаяў нібы спаконвечны тапчан на якім з самай ранняй вясны як толькі пачынала прыграваць сонейка днямі праседжвала бабуня як у хаце пад таполяй называлі маці Купалы. Яна заўсёды першаю запрыкмечвала госця які кранаўся крамкі на весніцах уваходзячы ў двор хаты пад таполяй і была нібы добрым духам што сустракаў тут кожнага.

Веранда была зашкл(ён, ённ)ая. Гэта была і веранда і тое што на вёсцы называлі б сцёпкай ці каморкай бо на сценках тут віселі не толькі вялікія вянкі/вязанкі пукатай залацістай цыбулі мен…шыя вяночкі дзюбаватага ружова/малочнага часнаку але і прыпасы якім у вясковых хатах раней месца было звычайна на гарышчы ў а…вяза(н, нн)ых кужал…м кошыках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Свойска… вяскова… не з крамы а зробл(ен, енн)ае ў хаце выл…жалае ў сваім кубел…цы густым расоле прыпраўл(ен, енн)ае перцам часнаком шалфе…м кал…ндрай пасыпа(н, нн)ае чорненькімі ядлоўцавымі ягадкамі насыч(ан, анн)ае духам дубовага і хрэнавага лісця мяты зуброўкі вішні смародзіны пятрушкі усё гэта ў хаце вельмі любілі. (282 словы)

Алег Лойка. "Як агонь, як вада..."

19. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

Прыгажосць, нікім не заўважаная, -- гэта яшчэ не прыгажосць. Яна робіцца нашай светлай радасцю толькі тады, калі мы – можа, неспадзявана, а можа, у нецярплівым чаканні – раптам, узрушаныя і ўражаныя, спыняемся перад ёю. Але і радасць, калі яна толькі ў табе, толькі для цябе аднаго, -- гэта яшчэ таксама не радасць. Яна праменіцца, нібы свята, толькі тады, калі нам ёсць з кім падзяліцца ёю. І якое шчасце мець на гэты час даверлівага і адданага субяседніка – чытача, які шчыра разумее тваё хваляванне!

Якуб Колас, зачараваны хараством прыроды і красою жыцця, верыць у свайго чытача і, нібы спяшаючыся выгаварыцца, хутчэй дзеліцца з ім хваляваннем, убачанай прыгажосцю. Яму цесна ад гэтага хвалявання, яму няёмка цешыцца радасцю аднаму, і таму паэт кожнаму свайму чытачу нанава адкрывае сваю зямлю: зірніце, маўляў, якая яна непаўторная! Здаецца нават, што ён проста расказвае свайму сябру ці, можа, зусім невядомаму чалавеку, які выпадкова

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сустрэўся на дарозе, пра адкрытую ім прыгажосць, убачыўшы якую, цяжка і недаравальна маўчаць не толькі паэту, але і кожнаму чалавеку.

Паэзія Якуба Коласа – такая ж натуральная, простая і складаная, як і сама прырода. Зліццё чалавека і прыроды ў яго вершах вельмі непасрэднае і непадзельнае. Бо сама творчасць – найвышэйшы ўзлёт чалавечага розуму і пачуцця – відавочна, такое ж самае таінства, як і жыццядайная, нябачная праца прыроды. Бо напоўніць вечным зместам толькі адзін радок сапраўднага верша ці нават адно-адзінае слова – гэта, мусіць, такая ж нялёгкая работа, як і ўзрадаваць зялёным хларафілам, магутнаю сілаю існавання найвялікшы цуд свету – звычайны зялёны лісток.

На кожную пару года, амаль на кожную з'яву ў прыродзе ёсць у паэта свая радасць – ці то светла-журботная, ці то пранізліва-захопленая. Усход і захад сонца, зіма і вясна – усё гэта "вобразы мілыя роднага краю", без якіх бы вельмі збеднена адчувала сябе наша сённяшняя літаратура. (282 словы)

Янка Сіпакоў. "Свята на кожны дзень".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

20. Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак.

Мы з таварышам выбраліся ў лес у выхадны дзень яшчэ поцемкамі лёгкі як павуцінка туман заблытаўся ў нізовінках сярод густога падлеск… з ядлоўц… крушыны лазняк… зябка павявае прэлым лісцем сырой зямлёй і тонкім амаль няўлоўным духам сасны. Не/вялічкія лужынкі ў калюжынах зацягнула за ноч

тонкім лядком; ня…знак патрапіш нагой трэск на ўвесь лес чорная быццам дзёгаць вада хлюпоча пад ботамі выступае напаверх.

Неба пакрысе святлела але ў лес… стаяў шэры змрок хоць і можна было адрозніць камлюкаватыя ствалы сосен струхлелыя пян…кі і сям/там на палянках малады асінавы падрост.

Пятро мой спадарожнік кінуў пад куст ру…зак і ў той жа момант імкліва пырхнула ў/верх уздоўж ствала нейкая вялікая пярэстая птушка мільганула белымі пёрамі і там у/высі у густых кронах пачуўся рэзкі пранізлівы голас быццам двое катоў не падзяліўшы здабычы …чапіліся і шкуматаюць адзін аднаго. Мы застылі ад нечаканасці слухаючы не/звычайны ў гэтым сырым і не/прыветным перадзімовым лесе які здавалася спаў гл…бокім сном канцэрт. Мы пад…шлі бліжэй добра разгл…дзелі птушку. Яна была сапраўды прыгожая нават не верылася што ў гэтым лес… ўбачым такі цуд. Прырода быццам знарок пажартавала ў шэрыя колеры перадзім…я ўпляла яркія фарбы. На фоне шэрага неба выдзяліліся блакітныя з чорнымі і белымі палоскамі пёры крылаў птушкі спінка ружаватая а бліжэй да хваста святлейшая. Сойцы відаць не спадабалася што мы яе разгляд(ва, ыва)ем узмахнула крыламі і белай мітуслівай плямкай матлянулася ў/бок зрабіла не/шырокі плаўны паў/круг і села на другім баку палянкі ў голле шырокай кроны сасны зноў пранізліва закрычала на ўвесь лес. Сойка крычала на розныя лады верашчала быццам яе хочуць схапіць пагрозліва крычала рэзка пасвіст(ва, ыва)ла; у яе крыках чуўся ўвесь птушыны гармідар лес… які птушка запомніла  і ўмела ўпляла ва ўласны р…пертуар. (272 словы)

Алесь Дзятлаў. “Зарок”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

21. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

Паміж дрэў пачаў зыбацца месяц, белы і круглы. Ён часта хаваўся з вачэй, але кожны раз зноў і зноў аказваўся на дрэве і трапятаў там, пашматаны рэдкімі галінамі. Часам ён зусім хаваўся за густым лісцем, а часам падымаўся над дрэвамі і зноў на поўную сілу ззяў, круглы і чысты. Цяпер мне свяціла наперадзе не толькі бялёсая поўня Сярожкавай галавы, але і поўня месяца, і я ведаў, што гэтага святла нам хопіць, каб і ўначы знайсці ўсё, што шукаем.

Быў шырокі прагал, за ім – лапіна лугу. Сярожка вёў мяне ўздоўж падросту бярозы і хвоі на дыбачках, час ад часу згінаючыся і на хаду шоргаючы рукой па траве: ён правяраў, ці не кладзецца раса.

Як не пад самым вухам хрупнуў сушняк -- мы спыніліся і тут жа ўбачылі, як з лесу выйшаў вялізны рагач. Ён пастаяў, павёў галавой у наш бок, насустрач нам пагрозліва варухнуў магутнымі рагамі і калі не ўбачыў, дык напэўна адчуў, як небяспеку, нашу прысутнасць, бо раптам дзіка захроп, і з-за ягонай спіны на асветлены месяцам луг выйшлі самкі, гладкія і блішчастыя. Яны таксама, як па камандзе самца, крутнулі галовамі ў наш бок і лёгенька, дружна, нібы танцуючы, патупацелі ў луг. Рагач цяжка ўдарыў заднімі нагамі ў зямлю, ёкнуў, што здаровы конь, і кінуўся следам за самкамі.

Яшчэ гадзіну назад меркавалі нанач вярнуцца дахаты, наесціся перад сном малака з хлебам, спаць на высушанай атаве, дзе, напэўна, пасланы ўжо льняныя посцілкі і цёплыя коўдры, а цяпер пра гэта я ўжо не думаў, адчуваў сябе, як на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

імклівым кані, якога паганяў Сярожка і які закружыў, затуманіў голаў, кінуўшы нас у пагоню за нечым новым, загадкавым.

Копы стаялі пасярэдзіне лугу, і мы абралі канцавую, бліжэйшую да лесу, у які неспадзявана загналі табун. Трохі разваяваўшы верх, у ботах і кажухах паўшываліся ў сена, якое там, усярэдзіне, абдавала сухасцю і цяплынню. (296 слоў)

Віктар Карамазаў. “Прыліпала”.

22. Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак.

Халодны густы туман яшчэ з/вечара павіс над аблогамі (Б, б)елавежы нібы бязважкая коўдра ахутаў кожнае дрэва кожны кусцік кожны выварацень. Паветра так насыцілася вільгаццю што нават адзенне паступова становіцца набр…нялым цяжкім. Прамень ліхтара ўпіраецца ў белую муць і нічога амаль не высвеч(ва, ыва)е. Святлее хіба што пад нагамі а перад самым тварам зусім нечакана нібы рукі дзіўных істот узнікаюць галіны дрэў.

Раніцою туман засвяціўся нейкім ружаватым колерам нібы хтос…ці па…паліў яго і той паволі радзеў ціха ўзнімаўся ў/гору. Гэта сонца сваёю цёплай ласкавай рукою праганяла яго з лес… адкрываючы перад вачамі прыгажосць асенняй пушчы. Промні кранулі вяршаліну старога/старога дуб… высока ўзнеслася яна над кронамі сасновага бор… . Кажуць больш як сем стаго(дз, ддз)яў стаіць гэты велікан, і н…якія н…годы не зламалі гордага волат… .

Промні заглянулі ў самы гушчар выганяючы адтуль апошнія пасмы туман… якія не ўпарцяцца паслухмяна ўсплываюць і нясуцца над лесам белымі воблачкамі. За…скрыліся на сонцы нібы грані каштоўных камянёў расінкі. Цяжкія буйныя кроплі павіслі на галінках кон…чыках лістоў траве быццам пацеркі нанізаліся на тонкія амаль (ня, не)/бачныя нітачкі павуціння. А вось і сапраўдны гамак у якім гойдаецца сам гаспадар/павук. Але (ня, не)/доўга яму любавацца сваім скарбам хутка сонца высушыць расу і замест ды…ментаў застанецца звычайнае павуцінне.

Вывеў зуброў на паляну магутны важак а сам пад…шоў да дуб… скінуў крутым рогам паркан…чык што збудавалі вакол дрэва/помніка ег…ры пачаў церціся аб яго шурпаты ствол. Выпрабаваўшы сілу зубр лёг пад старой ялінай з годнасцю аглядае статак які раз…шоўся па палянц… паскуб(ва, ыва)ючы яшчэ зялёную траву.

Апошнія лісткі а…трасае з бяроз асін клёнаў вецер/лістабой. Пушча на вачах святлее пусцее толькі дубы не здаюцца восені. Усю зіму будуць стаяць яны захута(н, нн)ыя ў рыжыя кажухі пакуль вясна не скіне не абновіць убор дубровы. (272 словы)

Васіль Жушма. “Восень у пушчы”.

23. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

Цяпер Юрка адзначыў, што месца тут вельмі зручнае: тры невялікія, але густыя алешыны над самай вадой ахоўвалі мясціну ад ветру і ад староннiх вачэй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Экскаватар дзядзькі Валянціна, відаць, зрабіў добрую справу, калі разварушыў дно, ачысціўшы тым самым пясок і жвір. Якраз на гэтым месцы была даволі моцная плынь, якая і сагнала бруд і смецце. З тылу, за спінай, да самага алешніку былі высокія зараснікі крапівы, таму чалавека, які сядзеў на беразе, зусім не відаць ад дарогі.

Адсюль было зручна назіраць за жыццём вадзяных насельнікаў. На паверхні плавалі, падняўшы ўгору ногі, жукі-гладышы; цэлымі чародкамі, як вялікія камары, бегалі па вадзе вадамеры; імкліва кідаліся ўніз, убачыўшы ахвяру, драпежныя плывунцы; упарта ўзбіраліся па травінках і палачках марудныя слімакі. Выплыўшы да паверхні, асцярожна выстаўлялі свае джалы – дыхальныя трубкі – бяскрыўдныя вадзяныя скарпіёны. Уважліва паназіраўшы, міжвольна пачынаеш думаць, што ўсе заняты нейкай разумнай, патрэбнай і неабходнай дзейнасцю, зусім невыпадковай, як здаецца на першы погляд. Юрка любіў гартаць бацькаў часопіс “Родная прырода” і часам здзіўляўся, якія адмысловыя рэчы сустракаюцца ў прыродзе.

Вось снуе-завіхаецца на кветцы рудая пчала. Яна беспамылкова, лепей за службу прагнозаў, прадказвае надвор’е: на дождж сядзіць і гудзе ў сваім вуллі. Калі пчолы з восені залепліваюць уваход у вулей, пакідаючы ледзь прыметную шчыліну, -- чакай суровай зімы. Гэткай жа звышадчувальнасцю валодаюць і руплівыя лясныя мурашы, якія выдатна адчуваюць радыяцыю, быццам у іх ультрамініяцюрныя “лічыльнікі Гейгера”. Дасканалая, мэтазгодная ўся арганізацыя жыцця ў мурашоў, і вучоныя дагэтуль не могуць разгадаць усе іх тайны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Відаць, калі займацца навукай, трэба перш за ўсё вывучаць гэты загадкавы свет, гэту таямнічую, невядомую галіну – біёніку. Гэта ж на зямлі каля мільёна відаў насякомых, толькі ў нашай краіне іх сто тысяч. І кожная казюрка па-свойму цікавая, мае свае механізмы і прылады, якія могуць стаць карыснымі для чалавека, павялічыць у дзясяткі разоў яго разумную ўладу над прыродай. (292 словы)

Анатоль Шаўня. "Аляпка".

24. Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак.

Памаленьку але з кожным днём усё смялей і ўладарней наступала вясна снег проста ў/вачавідкі асядаў змрачнеў і адсоўваўся як мага далей ад платоў і прызбаў у/дзень капала са стрэх паветра вільгатнела святлела прасторнела ў небе. Н… з таго н… з сяго сярод белага дня галасіста спявалі пеўні і на пачарнелых сметніках жвава капашыліся вераб…і. Зіма праўда не хацела здавацца храбрылася. На ноч уедліва браўся яршысты марозік сушыў сцягваў тонкім празрыстым лядком лужы ранкам ц…русіў дробны як манка сняжок. Але саўладаць з цяплом ужо не магла старая і ледзь паказвалася сонца ад злосці і бяссілля плакала …чодрымі слёзнымі кап…жамі. А потым н…як у адзін дзень снег набрак вадою і шухнуў у раўчукі усюды загаманілі забул…калі ручаі і ў шмат/галосным імклівым шум… і звоне… панеслі вясну н…куды далей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Памятаю што ў Вепры мы з Мальвінаю ішлі не па шпала… а па лясной караністай дароз… . Абапал усюды рыжэла прымятая зімою трава чарнела збуцвелае леташн…е лісце. У ла…чынах было бела адураслеп… сіні кашлаты сон аж …рваў бор. Маладыя бярозкі не ўтрымаліся ад спакусы каб не пафарсіць у сваіх летніх абновах – над імі ўжо калыхаўся шугаў квола/зялёны дым. Старыя дрэвы не спяшаліся – н…чага чакалі а ў глушэчы нясмела крычала першае ку/ку зязюля.

Ля самай дарогі пад тоўстаю карыстаю бярозаю мы натрапілі на невялічкае дубовае кары…ца поўнае бярозавік… і ўзрадаваліся як дзеці. Навыпера…кі пусціліся да балац…віны вырвалі па ч…рнагаловіне і праз іх сеўшы на ўколенкі пілі гэты чысты як сляза сок вясны.

Потым мы збочылі з яз…жалай дарогі і пайшлі лесам. Пад нагамі блытаўся зялёны і порсткі ягаднік качаліся мокрыя шышкі пахла хво…й дурна п…яніў багуннік.

Спусціліся ў ла…чыну і спыніліся ўража(н, нн)ыя на брусьнічных барвенках сям/там чырванелі ягады буйныя і сакавітыя якія прабылі зіму пад снегам і н… толькі н… сапсаваліся а яшчэ болей пасмачнелі. (290 слоў)

Барыс Сачанка. “Мальвіна”.

25. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

Гэта была незвычайная дзяўчына, ва ўсякім разе, па яго паняццях і ўяўленнях. То была нейкая незямная істота, зусім не такая, якіх ён бачыў вакол сябе дагэтуль і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

якія не выклікалі ў яго душы моцных пачуццяў – зрэшты, нічога падобнага дагэтуль ён не сустракаў. Гэта была нібы істота з другога свету, другой планеты. Вось цяпер ён убачыў яе ў аўдыторыі, яна была першакурсніца, а ён, як ні лічы, быў на другім. Гэта само па сабе надавала смеласці і ўсяляла надзею, але смеласці якраз і не хапала Пашку: калі ён убачыў яе, проста закамянеў. Пашка Крыцкі стаяў адзінокі і ні да кога не падышоў, тым больш – да яе. У яго нібы адняліся ногі, і ён не здольны быў скрануцца нават з месца. Да яго слыху даляцела, як яна звонка і прыгожа засмяялася, бліснуўшы белымі роўнымі зубамі, іскрыстыя яе вочы звузіліся, шчокі адразу заружавелі, яе светлая прыгожая галава, здавалася, выпраменьвае святло, ад якога робіцца так незвычайна на сэрцы, што хочацца ўскрыкнуць ад радасці. Фея, німфа, русалка – што яшчэ можна параўнаць з ёю?

Думкі Пашкі Карыцкага былі заняты тою светлавалосаю прыгожаю дзяўчынай. Ён бачыў яе ўсмешку, яе белазубы рот, прамяністыя жывыя вочы, бачыў да дробязі, у што яна была апранута: доўгую бэзавую сукенку перахоплівае у тонкай таліі шырокі белы пояс, па шыі блішчалі, пераліваліся іскрамі зелянцовыя крыштальныя пацеркі, ножкі яе былі абуты ў лакіраваныя туфлі на высозных абцасах, ад чаго яна здавалася яшчэ больш высокай і стройнай...

Ён ніколі не лічыў сябе прыгожым. Сярэдні рост, віхрасты русы чуб, поўныя, як прыпухлыя, вусны, па-вясковаму ружовыя шчокі, шырокі ўпарты лоб, шэрыя ўважлівыя вочы – усё ў ім здавалася яму самому такім звычайным, што ён баяўся за сябе: хіба можна спадабацца такой незвычайнай дзяўчыне? (274 словы)

Уладзімір Дамашэвіч. “Німфа”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

26. Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак.

Крокаў за дз…весце ад самога дрэва быў куток дзе не ездзілі з каляс…мі куды не дабівалася жывёла дзе не хадзіла каса. Год за дзесяць да (А, а)йчыннай вайны да гэтых дзён калі завяршыліся і да…шлі да новых сваіх ператварэнняў справы крыўды прыкрасці і радасці людзей з Сумліч да шашы забрукавалі выезд і ў адным месцы клалі мост цераз лог даволі/такі вялікі. Падымалі насыпам дарогу і зямлю на гэта бралі з таго месца што крокаў за дз…весце ад вялікага дрэва. Там стварылася вялікая яма і два дугаваты… равы – як дзе капалі.

З самай вясны тут стаяла вада, і ў/восень таксама. Берагі да вады былі крутыя да таго ж засталося тут скрозь каменне кучамі і рассып(ан, анн)ае і ў гэтым месцы патомства вялікага дрэва за дзесяць год густа ўзялося...

Над не/праходнай расліннасцю ўзнімалася колькі даволі ўжо высокіх таполяў ужо сапраўдных вялікіх дрэў а наводдалек як асілак і аглядальнік на цэлую навакольнасць узвышалася вялікае дрэва усёй вышынёй зялёнае і ўпартае ў бесперапынным змаганні з навакольным светам за сваё патомства. Толькі адна адзінюсен…кая галіна на ім пад сярэдзіну яго вышыні была сухая і вытыркалася з густой зяляніны. Чалавек павінен быў крута закідаць галаву і трымаць шапку каб глянуць на гэтую сухую галіну. На ёй нагледз…лі с…бе месца адпачываць у/дзень ад клапатлівай стомы палявыя каршачкі і заблудныя з/далёку птушкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гэты куток на скрыжаванні дарог быў як бы месцам ратунк… ад ц…жару доўгага падарожжа па вялікі… дарогах і ад цяжкіх думак аб не/вядомасці канца дарогі. Больш як за дзесяць кіламетраў ад гэтага месца падарожныя ўгадвалі ці хутка ўз…дзе сонца. Яшчэ змрок ночы вісеў над зямлёю а вершаліна дрэва ўжо была ў сонцы. На ёй ляжала сонечнае праменне хоць сонца было яшчэ дзес…ці глыбока і далёка. (277 слоў)

Кузьма Чорны. “Пошукі будучыні”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

27. Запішыце пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

Скрыгатаць, обер-яфрэйтар, мэтазгодна, леснічоўка, сямейства, белапольскі, прэс-аташэ, медыум, гаўбіца, гулялі ўтраіх, на Урал, пакгаўзны, Багамы (астравы), Дзень друку, брылёўскі радок, Шчучынскі (раён), заслужаны дзеяч навукі, Марсель, дзьме, куп’ё, Васільеў, раз’юшаны, паравозазборачны, міні-матч, параўнальна-гістарычны, мікракантэкст, пяцідзесяціпрацэнтны, па-летняму, перш-наперш, спярша, запанібрата, за пазухай, нябачны, не лягчэй чым сёння, аніхто, нічуць не прыгожы, не лепшы за іх, па-дзясятае, генетыка, тэлебачанне, святло, смятанка, з разгону, зрэдку, звонку, з гарачкі, з налёту, удвайне, паасобку, удоўжкі.

28. Спішыце, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак.

Антары(а, о), н…добранадзейны, стр…птацыд, пап…лішча, рэнам(э, е), свежа/змолаты, Халхін/Гол, н(е, я)/утоіш, тэрары(ў, у)м, да (Ў, У)барці, усходне/сібірскі, фіна-(ў, у)гры, (П, п)анямонне, (С, с)алавецкія астравы, (С, с)увораўская тактыка, (З, з)аслужаны настаўнік, (Ш, ш)клоўскі раён, куж…льны, м…льхіёр, м…зальянс, аб…яднанне, аб…ява, паў/Беларусі, вытворча/фінансавы, вытворча/неабходны, відэа/тэхніка, камер/юнкер, за/мяжой, за/жыва, з/наскоку, з/лева, па/першае, ані/колі, (не, ня)/умека, зусім (не, ня)/тоўсты, (не, ня)/важны, не/цікавей чым цяпер, с…цвярджаць, з…нянацку, языч…к, м…вазнаўца, трох/тысячны, на/ўзрыд, на/чале, па/часе, на/ўздагон, на/скрозь, на/смак, на/сцеж, на/спех, з/боку (на бок).

29. Запішыце пад дыктоўку. Праверце. Зрабіце аналіз памылак.

Айчынны, іон, мэбліроўка, попел, канапэ, свежавымыты, Ханты-Мансійск, экзатарыум, размова ўсур’ёз, ва Усходне-Кітайскім моры, да Уэльса, птушка-ўюрок,

Міжземнае мора, венерын чаравічак (кветка), танкаўскі верш, Ядвігін Ш., Бермуды (астравы), мальберт, соллю, людзьмі, вальера, пад'ём, коннаспартыўны, лічыльна-аналітычны, конна-ручны, гамапластыка, мэтанакіраваны, дзе-нідзе, удвая, па-воўчы, як след, увечары, няспраўнасць, аніяк, нічуць не большы, не горш як было, нічуць не меншы, няверны, сертыфікат, горад, прыгарад, галава, галоўны, спаднізу, спадцішка, пад ніз, за паўцаны, замнога, зверху ўніз, з году ў год .

30. Спішыце, устаўляючы патрэбныя арфаграмы і пунктаграмы. Праверце правільнасць напісання па даведцы. Зрабіце аналіз памылак.

Стара/грэчаскі, н…цотны, бухгалт…р, н…ўцешны, тун(э, е)ль, бела/блакітны, Камянец/Падольскі, да (Ў, У)зды, пачуў (ў, у)сплёск, э(ў, у)рыка, арна(ў, у)тка, прыемна (ў, у)трайне, (Р, р)азанаўскі радок, (М, м)агілёўская вобласць, (Н, н)ародны артыст, (Д, д)зень медыцынскага работніка, (А, а)хоцкае мора, (Т, т)альяці, інтэрв…ю, марсел…еза, з…весці, кіпен…, г…рнарабочы, грамадска/карысны, бела/палякі, грос/майстар, нявеста/красуня, без/упынку, бяс/конца, на/двое, на/памяць, на/нава, (не, ня)/умельства, далёка не/разумны, (не, ня)/блага, не/эфектыўней чым заўтра, ані/што, в…рашчака, р…дакцыя, м…даль, граб…нёк, ж…тон, па/простаму, па/просту, па/некалькі, па/парадку, па/паўдні, да/зарэзу, да/пары, да/рэчы.

**Даведка**

2. … Цяпер маё роднае Заброддзе, дзе толькі ў чатырох хатах цепліцца жыццё, ціхае, састарэлае, занядбанае, як, дарэчы, і многія беларускія вёсачкі, аднесеныя некалі да неперспектыўных. Дасталося яму, вядома, і чарнобыльскіх "пачастункаў".

Не такая ўжо і наша бацькоўская хата, з якой у свой час вылецелі ў далёкі свет мае пяць сясцёр і пяць братоў. Ды і бацькі пакінулі яе ў пачатку васьмідзясятых, перабраўшыся на матчыну радзіму ў вёску Ямнае, што непадалёку ад Быхава. Пэўны час з розных гарадоў нашы пуцявіны кіравалі ў Ямнае, а душы вельмі сумавалі па Заброддзі… Цяпер, калі мама і тата спачываюць на ямніцкіх могілках, мы, дзеці, заязджаем туды толькі на паклон ім, бацькам нашым, каму абавязаны да апошняга кроку. А частку адпачынку абавязкова праводзім у мілым сэрцу Заброддзі. Бацькоўскую хату, наша незабыўнае "гняздо", глядзіць, прыгожыць старэйшая сястра Валянціна, якая наязджае сюды з Мінска і знаходзіцца з вясны да позняй восені.

Некалі паехаўшы з роднай вёскі на вучобу, душой я назаўсёды застаўся ў ёй. У апошнія гады гэтыя сувязь пашыраецца, мацнее. Нярэдка выступаю перад землякамі ў Глухах, Быхаве. Падтрымліваю сувязь з кіраўнікамі раённых структур, краязнаўчым музеем, СПК "Глухі", роднай школай… Усё часцей адчуваю ў сталіцы, як не хапае мне тут да болю роднага, невымоўна-светлага, шчымліва-крынічнага, таго, што ёсць толькі на радзіме. Ніколі так не імкнуся ў экзатычная мясціны далёкага замежжа, як у сваё чароўнае Заброддзе, дзе, сустракаючыся з людзьмі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зліваючыся з прыродай, адчуваю сябе ўзнёслым і шчаслівым. Дзе тысячамі нябачных нітачак маё сэрца звязана усім наваколлем, з зямлёю і небам. Тут лёгка дыхаецца, прыгожа марыцца, вольна крочыцца. Тут адчуваю, як пульсуе мая першая і галоўная крыніца хараства і любові. А на любові і харастве трымаецца свет, а ў гэтым – наша чалавечае прызначэнне і сэнс жыцця…

Жыві, маё Заброддзе!

Міхась Пазнякоў. “І роднай вёсцы пакланюся”.

4. Багацце запаведніка – не толькі жывёлы. Цікавы і разнастайны свет раслін запаведніка. У кожным яго кутку – у лесе, на лузе, у вадзе – можна сустрэць рэдкія прыгожыя кветкі, якія ўжо зніклі ці на мяжы знікнення ў іншых мясцінах рэспублікі. Тут яны беражліва ахоўваюцца, за папуляцыямі вядуцца пастаянныя назіранні. На жаль, па віне чалавека і знішчаюцца многія расліны, якія ўпрыгожваюць прыроду.

Большасць рэдкіх раслін аблюбавала тутэйшыя лясы, якім няма, бадай што, роўных у Еўропе. На сухіх пясчаных грудках узносяцца да нябёсаў стройныя хвоі, а невялічкія, да пяці метраў у вышыню, зачапіліся за балоты. На лясных палянках на яркім дыване імхоў растуць сон-трава, грушанкі, сумнік, казялец, раскіданы кучкі злакаў. А ў чарнічных і арляковых сасняках можна палюбавацца пралескай высакароднай, геранню, мар’яннікам, чынай, канюшынай. На марэнных грудках у сасняках захаваўся такі цуд прыроды, як архідэі. Самыя рэдкія сярод іх – пылкагаловік чырвоны і гайнік цёмна-чырвоны. Кветкі вельмі прыгожыя, але, на жаль, не ўтвараюць насення. Таму могуць знікнуць у першую чаргу. Вось чаму іх ахова ў запаведніку – гарантыя таго, што прыгажосць не знікне.

Нямногія ведаюць, што Бярэзінскі запаведнік – амаль скрозь балотны край. Не кожны адважваўся ступіць на балота, дзе, па павер’ях, жыла нячыстая сіла, адбываліся незразумелыя праявы – балотныя агні, загадкавы туман, што гойдаецца над паверхняй, багна, якая бясследна зацягвала і звера, і чалавека. Ды, відавочна, такія ўяўленні пайшлі на карысць прыродзе: у непраходнай багне выжылі многія звяры і птушкі, захаваліся цікавыя расліны, знішчаныя ў іншых мясцінах. Так што можна сказаць дзякуй балотам.

І цяпер вучоныя ашчадна ахоўваюць тое багацце, якое засталося тут. У паўночнай і цэнтральнай частцы запаведніка найболей вядомыя вярховыя сфагнавыя балоты – Жары, Слабодскае, Саўскі Мох, Пастрэжскае, Домжарыцкае. Цікавы штрых: калісь тут былі азёры, але прыкладна шэсць тысяч гадоў назад вадаёмы пачалі зарастаць, на вялікія плошчы наступалі балоты.

У паўднёвай частцы запаведніка ляжаць нізінныя балоты, якія ў любы час года непраходныя. Можна толькі ўявіць сабе, колькі тут дзічыны, якую ніхто не мае права ні пужаць, ні страляць.

Алесь Дзятлаў. “Дзе струменіць Бяроза-рака”.

6. Тамаш Зан больш вядомы ў нашай гісторыі як адзін з кіраўнікоў віленскіх згуртаванняў моладзі, нязломны змагар за народную волю. Гэта ён, актыўны член славутага Таварыства філаматаў (сяброў навук) і старшыня больш шырокага і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прадстаўнічага Таварыства філарэтаў (сяброў дабрачыннасці), атрымаў самае суровае пакаранне пасля праведзенага сенатарам Навасільцавым следства: цэлы год турэмнага зняволення ў крэпасці на Урале і бестэрміновае пасяленне там разам з двума іншымі “злачынцамі” – Янам Чачотам і Адамам Судзіным. Імя Тамаша Зана ўвекавечыў у сваіх сусветна вядомых “Дзядах” яго блізкі сябар і паплечнік па тайных згуртаваннях, вялікі паэт беларускай зямлі Адам Міцкевіч, які паказаў нязломнасць духу і самаахвярнасць гэтага галоўнага бунтара спакою на Беларусі ў першай чвэрці XIX стагоддзя.

Значна менш мы ведаем пра Тамаша Зана як паэта. І гэта не дзіўна: раскіданыя па шматлікіх польскамоўных перыядычных выданнях мінулага стагоддзя яго творы амаль недаступныя сённяшняму беларускаму чытачу. Між тым яны заслугоўваюць самай шчырай нашай увагі і прыхільнасці, хаця пісаліся на польскай мове. Для нас Занавы творы цікавыя перш за ўсё тым, што ў іх мы знаходзім шырокае выкарыстанне матываў і вобразаў багатай вусна-паэтычнай творчасці роднага аўтару беларускага народа. Гэты зварот да фальклору меў важны вынік. Тамаш Зан, а разам з ім Ян Чачот і Ануфры Петрашкевіч, якія таксама звярнуліся ў сваёй творчасці да чыстых крыніц беларускага фальклору, зацікавілі вуснай паэзіяй беларусаў яшчэ аднаго сябра-філамата – Адама Міцкевіча, які быў на пачатку сваёй літаратурнай дарогі ў палоне канонаў класіцызму. Гэтым самым яны памаглі яму выйсці на дарогу рамантызму, больш прагрэсіўнага напрамку ў літаратуры.

Сярод твораў Тамаша Зана найбольшую вядомасць атрымалі яго балады, камедыя “Грэцкія піражкі”, паэма “Табакерка”, асобныя вершы, трыялеты, песні, элегіі.

Кастусь Цвірка. “З паэтычнай кайстры Тамаша Зана”.

8. Цяплее. Поле сушэе, шарэе і ўсмоктвае ў сябе ваду; выпырсквае каля плота маладзенькая, яшчэ не пякучая крапіва (хутка з яе і буракоў ды костачкі будзе спажыўное варыва), на заплесненых узгорках імкнуцца ўвысь дзьмухаўцы і падбел і ўжо хутка зацвітаюць, спрасоння лётае, басавіта гудзе адзінокі бухматы, ахаладнелы і агаладалы за зіму чмель. Пасля дажджу змываюцца цвіль і плесень, а тыя прасторы, дзе жыта, нібы накрытыя зялёнай коўдрай, ажно ўпіваешся вачыма той зеленню. Ужо не толькі курэй, але і авечак, карову і цяля, каня не ўтрымаць у цесным хляве, усе рвуцца на сонечны двор, а з яго на загуменне і не хочуць вяртацца ў цесныя, з утаптаным, але ўсё роўна высокім подсцілам загарадкі.

Ды не заўсёды за яснотай і прыгрэўкам выцепліваецца. Бывае, раптоўна хмурэе, сцюдзёнее і ашмоццем падае мокры снег, а то нават і закружыць, замяцеліць ім. Пасля можа задоўжыцца яшчэ сіверны дождж, а з ім і непрыемны сыры холад. Перастае цурчэць бярозавы сок, нават абвісае ледзяшамі, пакутуюць паўраскрытыя, прыбеленыя пупышкі-кветкі на слівах, а яблыні ўвогуле застылыя, як і зімой, ні кветак, ні лісця. Паніклі не толькі прылётныя на першы цёплы подых шпакі, але і перазімаваныя тут вёрткія (асабліва каля курынага карытца) вераб’і. Як толькі ўз’юшаная непагадзь усё ж мусіць здацца, зноў падвысіцца, паблакітнее неба, заласкавее, заярчыць і пальецца цяплом сонца, абкінецца празрыста-зялёным вэлюмам і пачне апушвацца лісцем наша бяроза, – маці (невысокая, бацьку па

плячо, рухавая, рупная, гаваркая і пры добрым настроі жартаўлівая і песністая), Генік і яго сястрычка Ганначка (па-янкавінскаму Гандзя, Гандзечка) з узнёслым настроем ідуць у гародчык.

У “добры” (спрыяльны) дзень матуля дае ім, дзецям, апускаць у загадзя падрыхтаваныя ёй раўчучочкі днямі замочанае і цяпер крыху падсушанае насенне морквы, буракоў, гароху, а пазней летняга часнаку, цыбулі, агуркоў і гарбузоў. Маці ведае “ўрадныя” дні, як бацька знае, калі араць, сеяць увосень жыта, а вясной – авёс, садзіць бульбу.

Генрых Далідовіч. “Сярод поля, сярод лесу”.

10. Людзі ў нашым краі, на Капыльшчыне, сталі жыць аседла больш за дваццаць стагоддзяў назад. Да такога вываду можна прыйсці, калі меркаваць па курганах і старых гарадзішчах, якія захаваліся на рэчцы Выня. Тут ажно тры гарадзішчы: каля вёскі Мыслі, на месцы цяперашніх могілак (каля шашы на Капыль) і ў лесе, насупраць вёскі Ржаўка.

Гэта былі сялібы-крэпасці, абнесеныя насыпам, ровам і частаколам. Пахавальныя курганы даўно разбураны. На ўсю акругу захаваліся толькі два – на полі між вёскамі Лотвіны і Печураны. Менш прыкметныя гарадзішчы захаваліся таксама ў мястэчку Бабоўня, на пагорках, там, дзе сёння канюшня, аптэка і магазін, панскія і яўрэйскія могілкі, а яшчэ каля аўтастанцыі (цяпер зруйнаваны).

Калі меркаваць па гэтых помніках, то паселішча на месцы мястэчка было ўжо ў пачатку новай эры. Узгоркі паміж балотаў былі зручным месцам для жыцця нашых продкаў-крывічоў. Назва мястэчка пайшла ад расліны бабоўнік, ці канюшына, што расла паміж узвышшамі.

Суседнія вёскі маюць назвы Печураны (ад старaславянскага слова печур – крапіва), Выня (раней завыенне – ад словы выня – паляна, дзе вынялі карэнне), Каласаўшчына (каласавое поле ці нават сховішча), Лавы (месца загону), Клецішча (месца, дзе ўтрымлівалі дзічыну), Осава (оса – асіна па-стараславянску), Пнівада (плаціна), Руднікі (месца, дзе здабывалі руду), Гута (месца выплаўкі руды) і інш. Некаторыя мясціны вакол мястэчка яшчэ і сёння называюць як некалі: Лядзішча (выжарына), Попелева (ад слова попел, які тут атрымлівалі дзеля ўгнаення), побач поле – Процераб (выкарчаваны лес), Отступ (заказнік, месца разводу і нагулу дзічыны), Стэпы (бязлесная прастора), Калюга (лужына). Тут толькі адна назва вёскі Лотвіны (лотва – нізіна) сугучная назве балтыйскага племя лотва.

На поўдзень ад Капыля ёсць яшчэ дзве вёскі – Вялікія і Малыя Прусы. Сюды, мабыць, перасяляліся прусы, яшчэ пры Вітаўце недзе ў XIV стагоддзі.

Некаторыя гісторыкі сцвярджаюць, што да славян у нашых месцах жылі яцвягі. Славяне прыйшлі з Карпат у VI – VIII стагоддзях. Беларусамі нас, кажуць, пачалі называць гадоў дзвесце назад, калі далучылі да Расіі.

Вячаслаў Піліпчык. “Бабоўня любая мая”.

12. Пачуццё бацькаўшчыны пачынаецца з усведамлення, што родны кут – найлепшы ў свеце. Неадступныя думы пастаянна вядуць мяне на Магілёўшчыну, у Шклоўскі раён, дзе ў зялёнай і вечна святочнай вёсцы Нова-Аляксандраўка я нарадзіўся. І хоць я ўдосталь наглядзеўся на хараство зямлі, магу, паклаўшы руку на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сэрца, кожнаму давесці, што такога здаровага паветра, гаючай вады і лагоднага сонца я не сустракаў нідзе.

Вось – некалькі абразкоў з дзяцінства.

Расчыніш акно – і ў хату ломіцца бэз. Ці то ад хмельнай квецені, ці то ад слабасці кружыцца галава, зняможана прыпадаеш да падушкі і ў вачах – адно неба. Такое празрыстае і тонкае, што яго, здаецца, можа рассеч імклівы цень ластаўчынага крыла, і тады гэта загадкавая шыбіна асыплецца шкляным дажджом на кволы яблыневы цвет і ўжо ніколі не дачакаешся крамяных антонавак.

І зноў – успамін. Вятрыстая раніца. Струменіцца паветра ў палявой далечы. Я трымаюся за грыву высачэзнага каня, якога бацька вядзе за аброць. З мяхоў дзядзькі насыпаюць жыта ў ліпавыя сявенькі, абвязаныя вышытымі ручнікамі, кашулі на сейбітах – гармонікамі. Гэта – сяўба.

А пасля быў луг з сярдзітымі чмялямі, дзе хораша схавацца з галавой і заблудзіцца сярод рамонкаў; лес, што вабіў таямнічымі вываратнямі, дуплам і незлічонымі гнёздамі; цяністыя джунглі гароху, у якім, зашыўшыся, добра ласавацца, не пакідаючы голасу. І, галоўнае, былі незабыўныя святы – касьба і жніво. Дагэтуль у маіх грудзях не моўкне прамяністы перазвон кос і соладка тае шырокая і няўлоўная журботная жніўная песня – найвялікшыя напевы зямлі.

Я ведаў птушак па галасах, мог распазнаць дрэва па шолаху.

Можна сказаць, што ў тыя дні ў мяне было ледзьве не язычаскае светаўспрыманне. Гэта – памятна, але слава дзвярам бацькоўскай хаты, якія ніколі не зачыняліся перад добрым чалавекам, хвала залатой саламянай страсе, пад якой знаходзілі прытулак многія людзі, каго прывёў сюды дажджлівы вецер ці дзябёлы мароз. Колькі і чаго ні наслухаешся ў бясконцыя вечары!

Сцяпан Гаўрусёў. “Трываласць грунту”.

14. Змалку я палюбіў капыльскія ваколіцы, поўныя нейкага чароўнага хараства. Мясціны тут узгоркавыя, краявіды вельмі маляўнічыя і каларытныя. Адразу кідалася ў вока, што мястэчка стаяла на беразе вялікага рэчышча, на самым дне якога блішчэла пакручастая Каменка. Хоць рэчышча зарасло драбналессем, на схілах зелянела збажына, а дзе было і забудавана, але профіль яго добра вырысоўваўся, асабліва, калі глянеш з высокага замчышча. Па-свойму дзівосна выглядалі адсюль, з замка, вузенькія гарыстыя капыльскія вуліцы і вулачкі, нязграбныя купецкія муры і крамы, касцельныя вежы.

Улетку я часта блукаў па капыльскіх палетках, ездзіў з бацькам, зімою гойсаў на лыжах.

Неўзабаве сталася так, што яшчэ больш я зжыўся з роднымі ваколіцамі, яны сталі для мяне другім домам. Калі я вучыўся ў пятым класе (было гэта ў цяжкую вясну 1933 года), адна за адною бяда прыйшлі ў нашу сям’ю. Давялося мне са старэйшым братам ісці ў заработкі з пугаю ў руках.

Чатыры гады я адгакаў на пастухоўскай “службе”. Даводзілася нясоладка: прыходзілася прапускаць урокі, адставаць жа ад хлопцаў не хацелася. Але самае цяжкае было ў тым, што ў торбе часам толькі кніга і некалькі сырых бульбін. Добра, калі якая-небудзь спагадлівая гаспадыня дасць “выганяльнага” – кавалак хлеба і бутэльку малака (каровы свае ў нас тады ўжо не было).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аднак тыя пастухоўскія гады далі мне многае. Я яшчэ больш адчуў і глыбей зразумеў красу беларускай прыроды. Ад самай вясны і да позняй восені прыходзілася быць на лясным прыволлі, у полі і на лузе. На маіх вачах з’яўлялася ў Раўку першая кволая зеляніна, пасля яна буяла і набывала розныя фарбы і адценні, каб потым перайсці ў залацістыя колеры. Мне падабаліся цёплыя летнія навальніцы, калі маланка пісагавала неба, моцна ляскаў пярун, ліло як з вядра, а ты схаваўся дзе-небудзь у зацішку і назіраеш, што дзеецца навокал. Здаралася, дождж заставаў у полі – і тады на табе ніводнай сухой нітачкі.

Сцяпан Александровіч. “Радзіма мая – Капыль”.

16. Са шматлікіх талентаў Караткевіча ўсе, хто добра ведаў яго, цанілі яшчэ адзін – талент сяброўства. Народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў сказаў, што Караткевіч быў рыцарам чалавечага духу. У сяброўстве ён таксама быў рыцарам, верным, самаахвярным, гатовым заўсёды падзяліцца як апошняй скарынкай, так і ўсім багаццем сваёй натуры. Характэрная Караткевічава рыса: ён ніколі не выказваўся адмоўна пра сваіх сяброў і забараняў іншым гаварыць пры ім хоць нешта благое пра адсутных. Ён вельмі рэдка ўжываў спосаб гаворкі “паміж намі” і то – не пра сяброў. Трэба было моцна папрацаваць супраць Уладзіміра Сямёнавіча, ужываючы непрыстойныя прыёмы, каб узрушыць яго, прымусіць даць адпор. Пры гэтым ён быў вельмі дакліві, адчувальны да крыўды, тонкія даспехі безумоўнай інтэлігентнасці слаба абаранялі яго ад чорнай зайздрасці, помслівасці, зласлівай крытыкі, сам ён гэткай погані быў пазбаўлены начыста. Напярэдадні апошняга падарожжа сказаў: “ Чалавек, які робіць крыўду другому, урэшце рэшт крыўдзіць сябе”.

Ён дзяліўся сяброўствам са шматлікімі людзьмі: пісьменнікамі, мастакамі, кінематаграфістамі, артыстамі, настаўнікамі, навукоўцамі, журналістамі – гэта па працы, “па інтарэсах”, як кажуць. Але меў сяброў з іншых і часам нечаканых колаў, не праводзячы паміж імі мяжы, бо цаніў перш за ўсё людскасць. Сябраваў са старэйшымі за сябе і маладзейшымі, да тых і другіх ставіўся аднолькава прыязна, з усімі быў “на ты”, цярпець не мог, калі сябар звяртаўся да яго з залішняй павагаю.

Мы здружыліся ў чэрвені 1969 года, калі “Маладосць” наладзіла нам экспедыцыю на Палессе. Магчыма, слова “экспедыцыя” занадта ёмкае (у навуковым сэнсе): мы ўладкаваліся на агітцеплаход “Уладзімір Маякоўскі”, ва ўтульную каюту, нас везлі, а мы пазіралі, камфорту ставала, бракавала самадзейных маршрутаў і самастойнасці. Хутка мы зразумелі, як не трэба падарожнічаць, і катэгарычна вырашылі пакінуць утульны борт “Маякоўскага”, рызыкнуць на сапраўдныя прыгоды. Паспелі да таго часу прайсці Сож ад Гомеля да Лоева, па Дняпры – да Кіеўскага вадасховішча, Прыпяць – да Гарыні. У Давыд-Гарадку высадзіліся на сушу.

Валянцін Ждановіч. “Белы човен”.

18. У лісце той, колішняй, таполі святочна глядзелася сонца, цешачы вочы

Купалы; у тую, колішнюю, таполю ўразаліся ў крону, шчэрбячыся аб яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

магутныя сукі, маладзікі і ветахі. А весніцы на панадворак былі поруч з таполяй; на весніцах – прыбітая прыржавелымі ад восеньскіх дажджоў цвікамі бляха з профілем сабачай морды – вушы натапыраныя, надпіс на блясе папярэджваў: “У двары злы сабака”. Але гэтым злым сабакам у дваццатыя гады па панадворку бегаў невялічкі вёрткі Султан, які лашчыўся каля ног дзяцей і дарослых, у трыццатыя гады пахаджваў па двары вялізны, пясочна-жоўтай поўсці, задуменны ў сваёй непаспешлівасці Журан.

На дах дома схіляла голле чаромха, як нявеста ў вэлюме, у маі, у густым засеве чорных ягадак, павабных для птушкі, -- зімою. Рухавыя і розныя, яны паважна і ўвішна дзюбалі дары былой маладухі чаромхі. Перад вокнамі на вуліцу і ў сад рос бэз, кусцісты, высокі. Якраз у пройме гэтага бэзу стаяў, нібы спаконвечны, тапчан, на якім з самай ранняй вясны, як толькі пачынала прыграваць сонейка, днямі праседжвала бабуня, як у хаце пад таполяй называлі маці Купалы. Яна заўсёды першаю запрыкмечвала госця, які кранаўся крамкі на весніцах, уваходзячы ў двор хаты пад таполяй, і была нібы добрым духам, што сустракаў тут кожнага.

Веранда была зашклёная. Гэта была і веранда, і тое, што на вёсцы называлі б сцёпкай ці каморкай, бо на сценках тут віселі не толькі вялікія вянкі-вязанкі пукатай залацістай цыбулі, меншыя вяночкі дзюбаватага, ружова-малочнага часнаку, але і прыпасы, якім у вясковых хатах раней месца было звычайна на гарышчы ў абвязаных кужалем кошыках.

Свойскае, вясковае, не з крамы, а зробленае ў хаце, вылежалае ў сваім кубельцы, густым расоле, прыпраўленае перцам, часнаком, шалфеем, каляндрай, пасыпанае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чорненькімі ядлоўцавымі ягадкамі, насычанае духам дубовага і хрэнавага лісця, мяты, зуброўкі, вішні, смародзіны, пятрушкі – усё гэта ў хаце вельмі любілі.

Алег Лойка. "Як агонь, як вада..."

20. Мы з таварышам выбраліся ў лес у выхадны дзень яшчэ поцемкамі; лёгкі, як павуцінка, туман заблытаўся ў нізовінках сярод густога падлеску з ядлоўцу, крушыны, лазняку, зябка павявае прэлым лісцем, сырой зямлёй і тонкім, амаль няўлоўным духам сасны. Невялічкія лужынкі ў калюжынах зацягнула за ноч тонкім лядком; няўзнак патрапіш нагой – трэск на ўвесь лес, чорная, быццам дзёгаць, вада хлюпоча пад ботамі, выступае напаверх.

Неба пакрысе святлела, але ў лесе стаяў шэры змрок, хоць і можна было адрозніць камлюкаватыя ствалы сосен, струхлелыя пянькі і сям-там на палянках малады асінавы падрост.

Пятро, мой спадарожнік, кінуў пад куст рукзак, і ў той жа момант імкліва пырхнула ўверх уздоўж ствала нейкая вялікая пярэстая птушка, мільганула белымі пёрамі, і там, увысі, у густых кронах пачуўся рэзкі, пранізлівы голас, быццам двое катоў, не падзяліўшы здабычы, счапіліся і шкуматаюць адзін аднаго. Мы застылі ад нечаканасці, слухаючы незвычайны ў гэтым сырым і непрыветным перадзімовым лесе, які, здавалася, спаў глыбокім сном, канцэрт.

Мы падышлі бліжэй, добра разгледзелі птушку. Яна была сапраўды прыгожая, нават не верылася, што ў гэтым лесе ўбачым такі цуд. Прырода быццам знарок пажартавала: у шэрыя колеры перадзім'я ўпляла яркія фарбы. На фоне шэрага неба выдзяліліся блакітныя, з чорнымі і белымі палоскамі, пёры крылаў птушкі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спінка ружаватая, а бліжэй да хваста – святлейшая. Сойцы, відаць, не спадабавалася, што мы яе разглядваем, узмахнула крыламі і белай мітуслівай плямкай матлянулася ўбок, зрабіла нешырокі плаўны паўкруг і села на другім баку палянкі ў голле шырокай кроны сасны, зноў пранізліва закрычала на ўвесь лес. Сойка крычала на розныя лады, верашчала, быццам яе хочуць схапіць, пагрозліва крычала, рэзка пасвіствала; у яе крыках чуўся ўвесь птушыны гармідар лесу, які птушка запомніла  і ўмела ўпляла ва ўласны рэпертуар.

Алесь Дзятлаў. “Зарок”.

22. Халодны, густы туман яшчэ звечара павіс над аблогамі Белавежы, нібы бязважкая коўдра, ахутаў кожнае дрэва, кожны кусцік, кожны вываранець. Паветра так насыцілася вільгаццю, што нават адзенне паступова становіцца набрынялым, цяжкім. Прамень ліхтара ўпіраецца ў белую муць і нічога амаль не высвечвае. Святлее хіба што пад нагамі, а перад самым тварам зусім нечакана, нібы рукі дзіўных істот, узнікаюць галіны дрэў.

Раніцою туман засвяціўся нейкім ружаватым колерам, нібы хтосьці падпаліў яго, і той паволі радзеў, ціха ўзнімаўся ўгору. Гэта сонца сваёю цёплай ласкавай рукою праганяла яго з лесу, адкрываючы перад вачамі прыгажосць асенняй пушчы. Промні кранулі вершаліну старога-старога дуба – высока ўзнеслася яна над кронамі сасновага бору. Кажуць, больш як сем стагоддзяў стаіць гэты велікан, і ніякія нягоды не зламалі гордага волата.

Промні заглянулі ў самы гушчар, выганяючы адтуль апошнія пасмы туману, якія не ўпарцяцца, паслухмяна ўсплываюць і нясуцца над лесам белымі воблачкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Заіскрыліся на сонцы, нібы грані каштоўных камянёў, расінкі. Цяжкія, буйныя кроплі павіслі на галінках, кончыках лістоў, траве, быццам пацеркі нанізаліся на тонкія, амаль нябачныя, нітачкі павуціння. А вось і сапраўдны гамак, у якім гойдаецца сам гаспадар-павук. Але нядоўга яму любавацца сваім скарбам: хутка сонца высушыць расу і замест дыяментаў застанецца звычайнае павуцінне. Вывеў зуброў на паляну магутны важак, а сам падышоў да дуба, скінуў крутым рогам парканчык, што збудавалі вакол дрэва-помніка егеры, пачаў церціся аб яго шурпаты ствол. Выпрабаваўшы сілу, зубр лёг пад старой ялінай, з годнасцю аглядае статак, які разышоўся па палянцы, паскубваючы яшчэ зялёную траву. Апошнія лісткі абтрасае з бяроз, асін, клёнаў вецер-лістабой. Пушча на вачах святлее, пусцее, толькі дубы не здаюцца восені. Усю зіму будуць стаяць яны, захутаныя ў рыжыя кажухі, пакуль вясна не скіне, не абновіць убор дубровы.

Васіль Жушма. “Восень у пушчы”.

24. Памаленьку, але з кожным днём усё смялей і ўладарней наступала вясна: снег проста ўвачавідкі асядаў, змрачнеў і адсоўваўся як мага далей ад платоў і прызбаў, удзень капала са стрэх, паветра вільгатнела, святлела, прасторнела ў небе. Ні з таго ні з сяго сярод белага дня галасіста спявалі пеўні, і на пачарнелых сметніках жвава капашыліся вераб’і. Зіма, праўда, не хацела здавацца, храбрылася. На ноч уедліва браўся яршысты марозік, сушыў, сцягваў тонкім празрыстым лядком лужы, ранкам церусіў дробны, як манка, сняжок. Але саўладаць з цяплом ужо не магла старая, і ледзь паказвалася сонца, ад злосці і бяссілля плакала шчодрымі слёзнымі капяжамі. А потым неяк у адзін дзень снег

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

набрак вадою і шухнуў у раўчукі, усюды загаманілі, забулькалі ручаі і ў шматгалосным, імклівым шуме і звоне панеслі вясну некуды далей.

Памятаю, што ў Вепры мы з Мальвінаю ішлі не па шпалах, а па лясной каранiстай дарозе. Абапал усюды рыжэла прымятая зімою трава, чарнела збуцвелае леташняе лісце. У лагчынах было бела ад кураслепу, сіні кашлаты сон аж ірваў бор. Маладыя бярозкі не ўтрымаліся ад спакусы, каб не пафарсіць у сваіх летніх абновах – над імі ўжо калыхаўся, шугаў квола-зялёны дым. Старыя дрэвы не спяшаліся – нечага чакалі, а ў глушэчы нясмела крычала першае "ку-ку" зязюля.

Ля самай дарогі, пад тоўстаю, карыстаю бярозаю, мы натрапілі на невялічкае дубовае карытца, поўнае бярозавіку, і ўзрадаваліся, як дзеці. Навыперадкі пусціліся да балацявіны, вырвалі па чорнагаловіне і праз іх, сеўшы на ўколенкі, пілі гэты чысты, як сляза, сок вясны.

Потым мы збочылі з язджалай дарогі і пайшлі лесам. Пад нагамі блытаўся зялёны і порсткі ягаднік, качаліся мокрыя шышкі, пахла хвояй, дурна п'яніў багуннік. Спусціліся ў лагчыну і спыніліся ўражаныя: на брусьнічных барвенках сям-там чырванелі ягады, буйныя і сакавітыя, якія прабылі зіму пад снегам і не толькі не сапсаваліся, а яшчэ болей пасмачнелі.

Барыс Сачанка. "Мальвіна".

26. Крокаў за дзвесце ад самога дрэва быў куток, дзе не ездзілі з калясьмі, куды не дабівалася жывёла, дзе не хадзіла каса. Год за дзесяць да Айчыннай вайны, да гэтых дзён, калі завяршыліся і дайшлі да новых сваіх ператварэнняў справы,

крыўды, прыкрасці і радасці людзей, з Сумліч да шашы забрукавалі выезд і ў адным месцы клалі мост цераз лог, даволі-такі вялікі. Падымалі насыпам дарогу і зямлю на гэта бралі з таго месца, што крокаў за дзвесце ад вялікага дрэва. Там стварылася вялікая яма і два дугаватыя равы – як дзе капалі.

З самай вясны тут стаяла вада, і ўвосень таксама. Берагі да вады былі крутыя, да таго ж засталося тут скрозь каменне, кучамі і рассыпанае, і ў гэтым месцы патомства вялікага дрэва за дзесяць год густа ўзялося...

Над непраходнай расліннасцю ўзнімалася колькі даволі ўжо высокіх таполяў, ужо сапраўдных вялікіх дрэў, а наводдалек, як асілак і аглядальнік на цэлую навакольнасць, узвышалася вялікае дрэва, усёй вышынёй зялёнае і ўпартае ў бесперапынным змаганні з навакольным светам за сваё патомства. Толькі адна адзінюсенькая галіна на ім, пад сярэдзіну яго вышыні, была сухая і вытыркалася з густой зеляніны. Чалавек павінен быў крута закідаць галаву і трымаць шапку, каб глянуць на гэтую сухую галіну. На ёй нагледзелі сабе месца адпачываць удзень ад клапатлівай стомы палявыя каршачкі і заблудныя здалёку птушкі.

Гэты куток на скрыжаванні дарог быў як бы месцам ратунку ад цяжару доўгага падарожжа па вялікіх дарогах і ад цяжкіх думак аб невядомасці канца дарогі. Больш як за дзесяць кіламетраў ад гэтага месца падарожныя ўгадвалі, ці хутка ўзыдзе сонца. Яшчэ змрок ночы вісеў над зямлёю, а вяршаліна дрэва ўжо была ў сонцы. На ёй ляжала сонечнае праменне, хоць сонца было яшчэ дзесьці глыбока і далёка.

Кузьма Чорны. “Пошукі будучыні”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

28. Антарыя, нядобранадзейны, стрэптацыд, папялішча, рэнамэ, свежазмолаты, Халхін-Гол, не ўтоіш, тэрарыум, да Убарці, усходнесібірскі, фіна-угры, Панямонне, Салавецкія астравы, сувораўская тактыка, заслужаны настаўнік, Шклоўскі раён, кужэльны, мельхіёр, мезальянс, аб'яднанне, аб'ява, паў-Беларусі, вытворча-фінансавы, вытворча неабходны, відэатэхніка, камер-юнкер, за мяжой, зажыва, з наскоку, злева, па-першае, аніколі, няўмека, зусім не тоўсты, няважны, не цікавей чым цяпер, сцвярджаць, знянацку, язычок, мовазнаўца, трохтысячны, наўзрыд, на чале, па часе, наўздагон, наскрозь, на смак, насцеж, наспех, з боку на бок.

30. Старагрэчаскі, няцотны, бухгалтар, няўцешны, тунэль, бела-блакітны, Камянец-Падольскі, да Узды, пачуў усплёск, эўрыка, арнаутка, прыемна ўтрайне, разанаўскі радок, Магілёўская вобласць, народны артыст, Дзень медыцынскага работніка, Ахоцкае мора, Тальяці, інтэрв'ю, марсельеза, звесці, кіпень, горнарабочы, грамадска карысны, белапалякі, гросмайстар, нявеста-красуня, без упынку, бясконца, надвое, на памяць, нанава, няўмельства, далёка не разумны, няблага, не эфектыўней чым заўтра, аніштo, верашчака, рэдакцыя, медаль, грабянёк, жэтон, па-простаму, папросту, па некалькі, па парадку, папаўдні, да зарэзу, да пары, дарэчы.

**Кантрольныя дыктанты з дадатковымі заданнямі**

1. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Зрабіце лексічны аналіз выдзеленых слоў.

Ахіналі ноч туманы.

Вільготныя, цёплыя, якія бываюць хіба толькі ў красавіцкія ночы, калі чуеш, здаецца, як дыхае зямля, як прачынаецца яна ад зімовага сну, ад зімовае скутае нерухомасці. Цурчаць гучныя ў цішыні ручаіны, шумяць вадаспады лагчын, і ў хмялявым паветры, напоеным сокамі абуджанай вясною ***зямлі***, узнікаюць таемныя галасы, таемныя гукі. То шархане аб бераг нерасталая крыга, то сава кігікне раптам у кусце, напалохаўшы нечаканасцю сваёй стомленага падарожніка, то падасца лёд на балоце, асадзе альбо ўздымецца, узадраўшы прымерзлыя купіны. І гук той, як цяжкі ўздых, ляціць павольна над полем, над ***дарогай*** лесавой, балацянаю.

Тады насцяражваецца сэрца і б'е ў такт узбуджаным сілам зямлі і цямрынь ночы насцяражвае вуха. І чалавек прыслухаецца да начы, да зямлі, да яе вялікага і таемнага подыху, у якім захавана неўміручая радасць – радасць нараджэння жыцця. Новага, з новай зелянінай палёў і лясоў, з новай чырванню красак, з новай цеплынёю сонца, з пяшчотамі веснавога ветру, з росамі, туманамі, дажджамі, з ***радаснымі*** нястрашнымі грымотамі. Грымне раз – і набрыняюць сокам вербалозы, у свірысцёлак загудзіць дзетвара, свірысцёлак, гукі ў якіх, як кволыя палявыя званочкі, як цурчэнне ручаёў пад ценькімі шкельцамі ледзяных убораў.

Грымне два – ахінуцца берагі кураслепам, нібы сонца ападзе на лугі, жаўцізну сваю цёплую скіне з недасяглых вышынь.

Грымне тры – і кволая зелень убярэ палі, будзе буяць рунь, расвітуць мурагі пахучымі краскамі – сінімі, чырвонымі, блакітнымі. І над краскамі тымі будзе пчаліны гуд, гуд, бадзёры, як жыццё, як змаганне, як слодыч узвіхуранай працы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ахіналі ноч туманы. Цёплую красавіцкую ноч. (251 слова)

Міхась Лынькоў. “На чырвоных лядах”.

2. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Зрабіце лексічны аналіз выдзеленых слоў.

Горад у гэтым месцы спускаўся з в…лізнага груда, які вянчала гара Міндоўга і ішоў у поле. Дз…вяц…сот год ***горад*** мясціўся на грудзе не адпускаў далёка вузкія пакручастыя вуліцы і вулкі, цесна грувасціў адна пры адной хаты, як бы зграбаў іх сабе пад пахі ашчаджаў кожным вольным лапікам зямлі, і толькі цэнтральная брукаваная плошча з двума касцёламі і шнурком крамаў ды парк пад (З, з)амкавай гарою яшчэ нагад(ыва, ва)лі пра колішнія абсягі. Мусіць некалі яны былі, гэтыя абсягі, аднак цяпер калі глядзець з замчышча бачыш адно чарапічныя дахі, дзе/нідзе з іх вытыркаюцца касцёльныя спічакі. Дзевяць стаго(ддз, дз)яў горад трымаўся груда  і раптам збег па адным з а…хонаў у поле. А ў полі ўжо ні/што не спыніць чалавека. Вуліцы пацягнуліся доўгія роўныя яны абрываліся пусткамі на якіх ледзь угадваліся сцежкі ў густых лопухах і чартапалоху, – пасля зноў вуліцы. Тут жа адгарадзіўся ад хат цаглянай сц…ною і завод газавай апаратуры, утыркнуўся ў неба доўгімі трубамі задыміў. Горад цяпер як  бы раздзяліўся. У адным верхнім былі крамы школы кіно руіны замка і базар у другім ніжнім – завод абсаджаны хатамі пусткі ***сажалкі*** закінуты сад пры бальніцы палявыя дарогі якія знікалі ў лагчынах між спадзістых узгоркаў. Палі тут ляжалі на ўзгорках, уся гэтая зямля была падвышаная а пасярэдзіне – груд з горадам.

Мацкевічы жылі ў ніжнім горадзе ў чатырохкватэрным драўляным доме для выкладчыкаў тэхнікума. На адной з пустак, насупраць гразкай сажалкі, якую што/год налівалі веснавыя і восен…скія дажджы паставілі адзін дом побач заклалі другі. Адразу за домам пачынаўся поплаў за якім разлягаўся бальнічны сад. Але сад ніхто не даглядаў ён быў прахадны таму і яблыкі ў ім (не, ня)смачныя, імі грэбавалі нават ***тутэйшыя*** хлопцы. Пад садам вялікая сажалка з дз…вюма крыніцамі. (271 слова)

Алесь Кажадуб. “Цюльпаны”.

3. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Зрабіце фанетычны аналіз выдзеленых слоў.

У немаведама які раз наш маленькі, заўжды дрымотны ў ціхіх шолахах аўтамабільных алей і трамвайных  хітраспляценняў гарадок перажывае пладаносны летні эпілог, што яшчэ іграе залатымі і барвовымі танамі. Уся прырода становіцца падобнай на вялікі мастацкі кацёл, у якім закіпаюць і змешваюцца самыя розныя колеравыя гармоніі. З яго праліваюцца кропля за кропляй халодны і трошкі фанабэрысты тон вераснёўскага неба, сінява сонных туманных пасмачак, што селяцца на гарадскіх ускраінах, і ядавіты медны адвар апалай лістоты. А цені!.. Гэта проста шэдэўры дэкадэнцкага мастацтва: завостраныя, выключна пазбаўленыя хоць якой сіметрыі, быццам мачты караблёў, што некалі затанулі, куртатыя і гатовыя напалохаць, быццам партрэты Мадзільяні, знерухомелыя і бязглуздыя, нагадваюць шпілі казачных палацаў. Сваім ціхім з’яўленнем на ***гарадскіх*** вулачках яны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паведамляюць пра завяршэнне кароткай летняй пары і пра тое, што паўсюль на зямлі настала супакойлівая вадзяністая цішыня.

У гэты прыгожы сезон змяняецца не толькі знешні выгляд гарадскога свету, але самое яго гучанне набывае выключна іншыя ***адценні***. Увесь гэты какафанічны express кактэйль з аднастайнага гулу аўтамабіляў, рытмічнага стуку трамвайных колаў, тысяч асколкаў чужой мовы, што летам здаваўся такім невыносна вязкім і ліпкім, у гэтыя вытанчаныя дні насычаецца абертонамі супакаення і стрыманасці. Акустыка плошчаў, праспектаў і спальных раёнаў робіцца больш тонкай і вострай. І заўважыць усё гэта, напэўна, толькі той, каму па-сапраўднаму дарагі дух горада, хто проста не можа ўявіць свайго жыцця без пастаянных зносін з гэтай шматаблічнай істотай, якая завецца мегаполісам. Кожная прыродная з’ява, будзь гэта навальніца, што раскідвае яркія маланкі і б’е ў грамавыя літаўры, альбо дробны восеньскі ***дождж***, што пакутуе на хранічны насмарк, накладваючыся на вялікаснае аблічча нашага горада, надае яму той унікальны каларыт, які змогуць ацаніць толькі сапраўдныя яго знаўцы. Гэта і ёсць гарадскі патрыятызм: ведаць, як горад, які ты вельмі любіш, адгукаецца на самыя нязначныя змены ў прыродзе, разумець яго, заўжды знаходзіць з ім агульную мову. (293 словы)

Святаслаў Віткоўскі. “Кроплі часу…”

4. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Зрабіце фанетычны аналіз выдзеленых слоў.

Сасоначка расла не ў гушчары як большасць а між стромкіх ладных ужо сясцёр. І сонца ёй было тут у/дosталь і дажджавой вадзіцы хапала ды ніхто знячэўку і стаптаць (не, ня)/мог. Расла сасоначка ў зацішку цягнулася да неба, туды дзе начамі плоймай высяваліся зоркі дзе месячык пастухом/бацькам праходзіў між імі. Часам здавалася ***сасона…цы*** што дагоніць яна старэйшыя дрэвы, перарасце і выпрастае вершаліну над усім лесам. Тады ўжо ніводная птушка не міне яе вершаліны каб на хвілінку (не, ні) прысесці склаўшы крылы, (не, ні) паглядзець у бясконцасць ды парадавацца жыццю. Якое ж яно жыццё, неахопнае, шырокае і бяскрайняе радаснае і шчаслівае. А магутныя вятры-бураломы ды злыя спякоты – часовае. Усё гэта мінае і зноў застаюцца шаравата/блакітныя ліпен…скія вечары майскія спевы птушак куванне самой зязюлі, вэлюм празрытага туману які прыходзіць з грыбнымі дажджамі з далёкіх і блізкіх лугавін з ручаёў крынічных рачулак аерных балацявін. Жыццё прыгожае і доўгае яго ніхто-ніхто не можа адняць. І дрэўца жыло кожным днём на/поўніцу узахлёб не ашчаджаючы сілаў і дабрыні радуючыся кожнай хвілінцы, кожнаму гуку ў наваколлі. Яна пакуль ***не ведала*** што побач жывуць нястомныя жукі-караеды што зусім недалёка селішчы людзей у якіх ёсць сякеры і пілы што ім трэба будаваць хаты, разводзіць агонь у печах. Але яна сасоначка нікога не чапае жыве тым што даецца кожнаму бясплатна, спакон веку. Дык навошта ж быць самотнай? Навошта па начах уздыхаць рыпець засохлымі галінамі пабітымі маланкай ***расшчэлінамі.*** Трэба ж кожную раніцу чакаць калі ўзыдзе сонца якім яно будзе – празрыста-яркім, сляпучым ці слюдзяніста-бляклым, заплаканым. Расла сасоначка заглыбляла карэнне ў зямлю

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зіхацела сярод бураватых ствалоў залацістасцю здаровай кары… Жыла расла сасоначка.

Частыя бураломы абміналі закутак гэтага лесу а калі і наляталі, на зямлю з надрыўным уздыхам лажыліся магутныя, выспелыя дрэвы. А сасоначка расла расла і радавалася. (280 слоў)

Анатоль Казлоў. “Незламаная свечка”.

5. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Зрабіце словаўтваральны аналіз выдзеленых слоў.

За нейкі тыдзень перад яблычным Спасам белыя буслы пачалі збірацца ў чароды, рыхтуючыся да адлёту. Ганарлівыя птахі, пакінуўшы свае разгатыя буслянкі на вільчаках сялянскіх хат, ці не з усіх навакольных вёсак сабраліся ў Імшэчку [імшарына], і адтуль, з бярэзнікавага ***россыпу*** і лазняковай кудры, цэлымі днямі чуўся іх журлівы, расстайна-самотны клёкат. Калі буслы, і старыя, і маладыя, гуртуюцца ў глухіх, малалюдных мясцінах, тут ужо пытаць не трэба: восень блізка. Барвамі змарнелай прыгажосці ахінулася прырода: сыпанулі жаўталістам бярозкі, першая прозалаць выступіла на клёнах, з узлеску на ўзбераг поля засмучана выткнуліся статныя рабінкі, абапнутыя, як цыганкі, густымі плахтамі ярка-чырвоных гронак.

Перад самым Спасам па начах вельмі ж часта і гулка шпокалі аб зямлю пераспелыя малінаўкі, і на свята старыя людзі ўпершыню ў гэтым годзе паспыталі водарных, як мёдам налітых, яблык і сакаўных груш-спасавак, папярэдне, яшчэ з раніцы, асвянціўшы садавіну ў царкве. Пасля такога боскага пачастунку ці, дакладней, боскага прычашчэння, багата каму з палешукоў, якія ***непахісна*** і ахвярна шануюць усе народныя павер’і і прымхі, напэўна, згадалася даўняя, дзедаўская прымаўка: “Стары Спас – сівенькі дзядок, на восець садзіў, жыта малаціў”. Бо і праўда: доўгая, на некалькі пралётаў калгасная адрына ў коптур, ледзь не да кроквaў, забіта пухнатымі жытнімі снапамі, ачмурэлы пах маладога жыта, намалочанага камбайнам, віецца з Гаўрылавага гумна, вольна і лёгка, збыўшы свой жнівеньскі клопат, дыхае стомленая палеская зямля. О гэты багаты і жаданы яблычны Спас!

Ворнай зямлі ў Малым Сяле ўвогуле скупавата, і тая ўроскід: невялікімі акраўкамі, шматкамі, абрэзкамі, яна шчэміцца між сухадолаў, гразкіх балацявін, ***пясчаных*** пагоркаў. Чарназёміцы кот наплакаў, усё супесі, мылец ды падзол, што ні палетак – камяніца, суцэльная крушня. Дзіўна нават: як такая знясіленая, змардаваная зямля яшчэ нешўта здатная радзіць? Да яе, сваёй карміцелькі і сваёй жа мучыцелькі, у розныя гады Малое Сяло адносіцца па-рознаму. (284 словы)

Віктар Гардзей. “Бедна басота”.

6. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Зрабіце марфемны (графічны і пісьмовы) аналіз выдзеленых слоў.

Стаяла ранняя зусім яшчэ (ня, не)/смелая восень. Было цёпла сонечна і парна. На сінім купале высокага неба толькі зрэдку з…яўляліся шызыя хмары. Спакваля і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

няспешна ўсталёўвалася пара тыповай для беларускіх абшараў і звыклай для нас стрыманай красы прыроды.

Славуты (Н, н)арачанскі край, радзіма аднаго з ***найярчэйшых*** талентаў беларускай літаратуры… Усё тут было тыповае для Беларусі, для яе клімату прыроды і ландшафту але нібыта вызначалася больш напоўненым зместам адмысловай эстэтычнай выпраўкай. Калі свяціла сонца то свяціла абавязкова шчодра, на фоне не інакш як чыстага бакітнага неба. У яго пяшчотным часам пякоткім промневым палоне здавалася цешылася ўсё жывое і нежывое. Калі ў…чынаўся вецер то быў ён напорлівы парыўчаты уздымаў такія хвалі якія на вачах ператваралі возера ў мора – наша беларускае мора. Яны настырна біліся ў борт ло…кі нахілялі яе то адным то другім бокам, пагрозна захліставаючы ўспен(ен, ян) ай вадою.

Сонечная шчодрасць і лагода, мяккая цеплыня і лёгкая хмарнасць час да часу змяняліся казытліва/волкай прахалодай дажджу ў вясёлых і спорных струменях якога на нейкі момант патанала ўсё наваколле. Яго буйныя кроплі падалі на ствалы і галіны дрэў рудую ігліцу і яшчэ зялёны мох. Здавалася што тут побач з возерам усё, у тым ліку і зямля, і паветра, і неба, пахне вадою.

Дождж ленавата аціхаў і адступаўся. ***Даўгавата*** яшчэ пасля яго ў пажоўклае лісце што ўкрывала л…сны дол шпокалі кроплі. У вільготным паветры стаяў водар ядлоўц… і мох… . Спакваля сонечныя скразнякі зноўку пачыналі працінаць шаты разгалістых дрэў нават калючыя лапы ельніку. Лашчылі вока і лагодзілі душу сіняя паднебная высь і празрыстая азёрная далеч. Усё навокал нібыта ажывала іскрылася ***ружавела*** маладзела. Свежасць і хараство здавалася былі разлітыя паўсюль.

Так, гэта была не/звычайная зямля, не/звычайныя ваколіцы. Усё было высокае крамянае яркае – сапраўднае, жыццядайнае. Адна і тая ж думка ніяк не адпускала мяне настойліва нагадвала пра сябе зноў і зноў толькі такая прыгожая зямля магла нарадзіць такога слыннага чалавека, як Максім Танк. (291 слова)

Мікола Мікуліч. “Шумяць нарачанскія сосны”.

7. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых назоўнікаў.

У школьных ***падручніках*** (дзесьці яшчэ на пачатку шасцідзясятых гадоў) пра Яна Чачота пісалася вельмі скупа, ды і тыя мізэрныя звесткі былі надрукаваны дробным шрыфтам. Але час усё ставіць на месцы, вяртае з забыцця імёны лепшых сыноў Беларусі, і сёння, бадай, не знойдзецца чалавека, які б не ведаў Яна Тадэвушавіча Чачота – яркую зорку нацыянальнага Адраджэння, аднаго з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры, сябра польскага паэта Адама Міцкевіча. Наш славуты зямляк, хоць нарадзіўся і жыў у часы ***прыгонніцтва***, пісаў на пагарджанай магнатамі сялянскай мове, збіраў і вывучаў фальклор, пакінуўшы нашчадкам багатую спадчыну. Вялікія людзі на тое і вялікія, каб іхняе жыццё і лёс пастаянна прываблівалі даследчыкаў неспадзяванымі загадкамі і тайнамі.

Вось і гэтая быль – з таго ж самага шэрагу.

Калі ехаць у Залужжа, што некалькімі дзясяткамі хат раскінулася наўсцяж ціхаплыннай ***Шчары***, то акурат на паўдарозе, між вёскамі Крывошын і Нетчын,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зялёным астраўком сярод маўклівых палёў і заліўных лугоў ушчамілася маляўнічае ўрочышча Рэпіхава. Расказваюць, дзесьці паблізу, ідучы на Маскву, Напалеон з высокага капца, насыпанага салдатамі, аглядаў сваё войска і тут жа, на Шчары, амаль бяззбройныя байцы Чырвонай Арміі, абараняючы мост, надоўга заступілі шлях фашысцкім калонам. Ад французскага нашэсця ў тутэйшых мясцінах застаўся знакаміты курган, ад першай імперыялістычнай вайны – даўно разбураныя акопы і безліч абеліскаў. Бурныя вятры двух стагоддзяў прашумелі над Рэпіхавым, і яшчэ стаяць у ім, чаруючы велічнай панурасцю, векавыя дрэвы, якія, акрамя крывапралітных бітваў, помняць багата іншых дат і падзей.

Да нядаўняга часу, ды і то сярод мясцовага насельніцтва, Рэпіхава было вядомае як родавае памесце графаў Патоцкіх, але ніхто з сучаснікаў нават і не падазраваў, што гэтае слыннае ўрочышча самым цесным чынам звязана з імем Яна Чачота. Сюды ўпершыню, здаецца, зусім выпадкова я трапіў роўна трыццаць гадоў таму назад, калі яшчэ бязвусым хлопцам працаваў у ляхавіцкай раённай газеце. (293 словы)

Віктар Гардзей. "Быль урочышча Рэпіхава".

8. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых назоўнікаў.

Быў асенні ***надвячорак***, адзін з тых (не, ня)частых якія здараюцца такой парою калі вялікае блякла/чырвонае сонца на шыза/зеленаватым небе нагадвае жывы шар. Гэты шар здавалася, вось/вось набрыняе цяжкай ***ружовістасцю*** і тады не ўтрымаецца на нябесным полазе сарвецца каля далягляду ўпадзе на вострыя вяршаліны цёмна/блакітнага лесу праколецца і залье ўсё навокал густой вязкай бронзай.

У такі надвячорак усё быццам падказвае – блізіцца пара па/сапраўднаму халодных начэй: і гэтае сонца што нязвыкла хутка коціцца да дал…гляду пакідаючы на крохкім небе бела-ружовыя драпіны і сшэрхлая жоўтая трава якую ўжо апоўдні акрапляе дробная халодная іскрыстая раса і пажухлыя, яшчэ не/агаленыя кроны дрэў і парывісты сіверны ***вецер*** што час ад часу ўзнімае на рачной плыні дрогкае рабаціннe.

Усё гэта бачыў і разумеў Чалавек які доўга і нерухома стаяў з вудай на беразе ракі. Часам ён рэзка вышморгваў з вады кручок і нават не/глянуўшы на яго ці засталося там што, кароткім спрактыкаваным узмахам ад сябе кідаў назад хоць ведаў, наўрад ці і зараз тузанецца паплавок, нырне пад ваду.

Часам ён нібы безуважна назіраў на крохкую ледзь прытуман(ен, ян)ую лугавую дал…чынь. Яна адкрывалася адразу за ракой і здавалася заціснутай з аднаго боку вострым кутам сасновага лес…, абгароджанага высокім шчыльным зялёным плотам, а з другога пагоркам парослым куртатымі жоўта/зялёнымі дрэвамі за якімі адзінока паблісквала бляшаная страха нейкага прыватнага дачнага домік….

Калі ***вочы*** стамляліся ад аднаго малюнка Чалавек пераводзіў позірк на раку якая ля пагорка крута паварочвае выгінаецца паўз яго бяжыць краем лугу. Тады яму здавалася што гэтая халодная па колеры звілістая шырокая стужка па якой вечаровае

сонца шчодра ра(сс, с)ыпала залацістыя бліскаўкі, рассоўвае сасновы лес і пагорак нібы вызначае кожнаму з іх сваё месца на зямлі.

І яшчэ думалася: напэўна, ***людзі*** не ведаюць, што ўсяму на свеце кожнаму дрэўцу і пагорку, кожнай лугавіне і кожнай жывой істоце, вядома ж, і чалавеку – яшчэ да нараджэння (У, у)сявышнім вызначана сваё месца. (298 слоў)

Уладзімір Саламаха. “Апазнаецца асоба мужчыны…”

9. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых прыметнікаў.

У Бярэзінскім запаведніку мне даводзілася бываць неаднойчы: і вясной, калі буйная квецень размалоджвае балоты і лугі, і ўлетку, калі ***сцішана-спакойны*** бор, увесь пранізаны сонцам, дрэмле на невысокіх грудках, і ў пару залатога ліставею, калі карціць пахадзіць гэтымі лесавымі сцежкамі, забрысці цераз высакатраўе і сыры нізкарослы алешнік на бераг балотнай рачулкі, здаля палюбавацца ***бабровымі*** заставамі, а калі пашанцуе, то і ўбачыць – хоць на імгненне – асцярожнага і прыгожага звярка, які ўвішна і клопатна рыхтуецца да зімы. А ўзімку запаведны лес маўклівы, задуменны, нейкі ўзнёсла-ўрачысты, прасторны і светлы. Толькі ўмей назіраць, слухаць цішыню, “чытаць” сляды шматлікіх лясных насельнікаў.

І хоць знаёмы гэты куток, але кожны раз едзеш сюды з хваляваннем, надзеяй яшчэ нешта ўбачыць. Душа адпачывае ад гарадскога тлуму, і думкі самі па сабе лагодзяцца, калі ступіш на бераг возера, пакрочыш лясной сцежкай, па якой рэдка ступае нага чалавека, толькі чуйны ***лясны*** звер працярэбіцца да вады ці ў пошуках здабычы. І адчуваеш удзячнасць да людзей, якія захавалі запаведны куток беларускай зямлі і цяпер берагуць і рэдкіх жывёл, і расліны, і шматлікія рэчкі і ручаі, балоты і азёры.

Тысячагоддзі затраціла прырода, каб стварыць гэты непаўторны зялёны храм, у якім адзіны культ – жыццё. Ледавікі, што калісь спаўзалі са Скандынаўскіх гор, быццам разец дойліда, змянілі рэльеф, пакінулі пасля сябе шматлікія сляды. Гэта і неглыбокія азёры, шырокія балоты, вялікія валуны. А назву запаведніку дала Бярэзіна, прыгажуня-рака, яшчэ тут вузкаватая, віецца між лясоў, балот і лугоў ажно на восемдесят кіламетраў. Ды яшчэ каля сямідзесяці рэчак і ручаёў аздабляюць гэты край.

Што і казаць, багаты гэты запаведны куток. Можна без перабольшання сцвярджаць: адзіны такі ў рэспубліцы. (257 слоў)

Алесь Дзятлаў. “Дзе струменіць Бяроза-рака”.

10. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых прыметнікаў.

Напэўна адна з самых балючых страт для чалавека страта малой (Р, р)адзімы, кроўнай сувязі з ёю страта сваіх каранёў той ***жывільнай*** эн…ргіі і чысціні якімі поўняць нас родная зямля і самыя блізкія людзі. Таму хочацца яшчэ і яшчэ раз азорыцца святлом маленства пакланіцца чароўнай вёска…цы мілым, дзівосным краявідам і наталіць душу іх хараством.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Залаты куток майго дз…цінства, блакітныя арэлі маіх мар, надзей і памкненняў – невялічкая вёска Заброддзе што на Быхаўшчыне. Тыя мясціны дзе ўсё напаўняла душу разнастайнымі фарбамі і а…ценнямі гукамі і павевамі, ахінала мудрасцю і красой трывогамі і перажываннямі. Тыя сц…жынкі і дарожкі якія тысячы разоў вымерваў басанож па якіх пайшоў затым у (не, ня)простае, але вельмі цікавае самастойнае жыццё. Тыя звычайныя, цягавітыя, цярплівыя і добрыя людзі/аднавяскоўцы, і найперш – мае бацькі ад якіх я ўзяў з сабой у дарогу шчырасць апантанасць сілу волі прагу ведаў трываласць духу веру ў дабро і справядлівасць настойлівасць у працы павагу да руплівых людзей любоў да (Б, б)ацькаўшчыны…

Маё дарагое Заброддзе налічвала тады 33 двары хаты і пабудовы патаналі ў густой зеляніне садоў і алей. Збоку ад бойкай дарогі на Быхаў вёска нагадвала дзівосны аазіс на ўзгорку заварожваючы кожнага хто трапляў у яе сапраўдным зялёным раем. В…сной у палісадах тут разлівалася чаромха струменіўся шматколернымі фантанамі бэз а сады здавалася аж да самага неба дыхалі густым духмяністым водарам здзіўлялі наваколле ўрачыстай б…лізной. Улетку пад вокнамі стракатліва і ўзнёсла палымнелі кветкі вяргіні півоні рамонкі наготкі… Звінела, нібы цурчэла саладжавае паветра гулі пчолы нацягваючы тысячы зумкіх струн ад вулляў да мядовых ліп і назад. А вакол вёскі каласілася жыта сінеў і гайдаўся нібы ***марскія*** хвалі, лён, лапушылася бульба цвіла грэчка… А далей – клікалі сваімі не/паўторнымі кілімамі шаўкавістыя лугі і вабіла гаючай вадой рэчка Грэза… І ў гэтым багатым разліве акварэляў і музыкі свет часта ўяўляўся мне бясконцай, дзівоснай ка…кай хваляваў радаваў абуджаў уражлівую ***дзіцячую*** душу на/заўсёды высяваючы ў ёй спагаду і замілаванасць.

Міхась Пазнякоў. "І роднай вёсцы пакланюся".

11. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых займеннікаў.

Стары дуб на завадскім двары, здавалася, зусім не чуў вясны: стаяў пануры, маўклівы, падняўшы ўгору закасцянелыя галінкі. Там-сям на дубе трымалася леташняе лісце.

Маленькая шустранькая сінічка порстка скакала з адной галінкі на другую, імклівая і насцярожана варочала галоўкай у чорнай шапачцы з аксамітных пёркаў, слухала. Чаму маўчыць стары дуб? На вуліцы вясна, а на галінках дуба няма ніводнай пупышкі. Сінічка звонка падавала голас.

Але стары волат не абзываўся.

Многа вёснаў бачыў ён на сваім вяку, і не адна сотня гадоў прашумела над ім. Ён жа ніколі не спяшаўся. Розная драбяза няхай сабе спяшаецца: жыццё ў яе кароткае. ***Яму*** ж пакуль што спяшацца няма патрэбы. Цяпло, што раптам нахлынула, зусім яшчэ не вясна. Колькі цёплых дзянькоў вясну не робяць.

Старыя казалі, ***што*** гэтае дрэва пасадзіў Францыск Скарына. Там-сям паміж людзьмі чуваць была яшчэ гаворка, што Янка Купала праславіў у сваёй паэме "Курган" менавіта гэты дуб.

Скарына і Купала – гэта людзі з "божай іскрай", пасланнікі вечнасці. Дуб таксама крупінка вечнага. Нашчадак тых вялікіх лясоў, што існавалі на зямлі, калі не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

было ні Купалы, ні Скарыны. Цяпер засталося ад іх усяго тры дрэвы: адно на ўзгоркавым беразе Дзясны, другое на востраве Хорціца, на Дняпры, а трэцяе тут, на беларускай зямлі.

Кургана пад гэтым дубам не было ніколі, ды і Скарына нарадзіўся пазней, як дуб вырас і набраў вялікую сілу. У дубе, не дабраўшыся да сярэдзіны, цвёрдай, як ***тая*** косць, заселі наканечнікі стрэлаў, што выпусцілі са сваіх лукаў татарскія коннікі, якія часам наведвалі сюды на сваіх цягавітых маларослых коніках, шукаючы сабе дарогі на захад і хапаючы ўсё, што трапіць пад рукі: розны хатні скарб, жывёлу, жанок. Ды хіба ў дубе заселі толькі адны наканечнікі стрэлаў? Кулі, асколкі, шрот – усяго не пералічыць. Здаецца, гісторыя беларускай зямлі запісана ў яго целе жалезам. (288 слоў)

Яўген Царанкоў. “Сведка вечнага”.

12. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых займеннікаў.

Вячэрні змрок хутка наступаў на Заблудную лукавіну. Некалькі хвілін таму на вершаліны векавых дубоў яшчэ іскрыліся жаўтаватым жнівен…скім лісцем у сонечных промнях і вось цені/шчупальцы ад галінак цягнуцца да зямлі. Кусты што запаланілі гэты ўскраек зямлі пачалі проста на вачах распаўзацца, расплывацца, ператвараючыся ў зменлівыя хісткія прывіды. З бакоў Заблудную лукавіну ўзяла ў клешчы рака Мнюта. Яе чыстая празрыстая вада адгарадзіла невялікі лапік зямлі як не ад усяго свету пакінуўшы толькі вузкі праход у адным месцы.

Пасярод векавых дубоў ураслі ў зямлю два вялікія камяні/валуны. Адзін, што крыху мен…шы, быў над ***самым*** берагам ракі і падточаны знізу паводкамі, кожную вясну мог зваліцца ў раку. Другі бол…шы, падобны на калматага агромністага мядз…ведзя які толькі ўзняў морду каб агледзець наваколле пасля зімовай спячкі ды, бы зачараваны, так і застыў на стаго(ддз, дз)і. Камень/мядз…ведзь зялёны, з нейкім бурштынавым адлівам. Праўда адзін бок чорны але не ад прыроды а ад дыму вогнішчаў што кожны вечар палілі тут сябры – Віцька Цімка і Пятрусь. Заблудная лукавіна, гэтыя валуны, векавыя дубы, рака усё было іх месцам іх маленькім патаемным куточкам дзе можна рабіць усё што хочацца… Сюды ніколі не хадзілі дарослыя лічылі Заблудную лукавіну месцам (ня, не)/добрым нават небяспечным.

З надыходам вечара як толькі знікала над Замкавай гарой сонца Заблудная лукавіна ажывала. З/боку невялікага балота куды сябры ніколі блізка не падыходзілі калі/нікалі даносіліся глухія гукі бы ***хтосьці*** цяжка ўздыхаў і клікаў на дапамогу. У гэтыя моманты сябры бліжэй падсоўваліся да цяпельца гаварылі толькі шэптам. Часам здавалася што разам са стогнам сіліўся ўзняцца на лапы і камень/мядз…ведзь, але нешта вельмі моцна трымала ***яго*** не адпускала. Сябры ведалі што гэта стогне багна. Раней сябры ніколі не заставаліся да ночы на лукавіне баяліся. Але ж паляцелі ў космас Гагарын Цітоў а яны баяцца ноччу быць у Заблудцы… Пад вялікім сакрэтам вырашылі рыхтавацца таксама да палётаў у космас і перш/наперш набрацца смеласці пазбавіцца ад розных страхаў. Вырашана зроблена. (304 словы)

Віктар Праўдзін. “Хто наступны?”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

13. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых дзеясловаў.

Хараша ***гучыць*** назва маёй вёскі – Чудзін. Гаваркое, змястоўнае слова, у глыбінях стагоддзяў корань яго. Дзіўнае, як і сама вёска. У маім дзяцінстве, тры-чатыры дзясяткі гадоў назад, гэта адно цэлае з векавечнаю прыродаю: вакол, не больш як за паўвярсты, – бары на высокіх узгорках, непралазныя беразнякі ды алешнікі ў лагчынах, яшчэ ніжэй – замшэлыя журавінныя балоты, бліжэй да ракі – лазнякі і ракітнікі, проста сярод поля – крынічныя балацявіны, дзе жанкі і дзяўчаты пралі (іменна пралі, білі пранікамі) і бялілі палотны. Паўз самую вёску – прыгажуня Лань, што з лесу з'яўлялася і ў лесе ***хавалася***, паплавы з морам вады і красак увесну, густымі травамі ўлетку, бухматымі стагамі ўвосень і ўзімку. Тады хвоі "забягалі" ў вулачкі, чараты часам прараcталі на стрэхах (імі зрэдку крылі хаты), вада ў паводку заходзіла ў жытло, сарваўшы падлогу… Зрэшты, ёсць паданне, што вёска пачыналася не тут, а ў Цэрквішчах, ва ўрочышчы, дзе нічога цяпер няма, апроч векавых дубоў. Нібыта некалі тамтэйшыя бунтары супраць паншчыны дымам пусцілі свае селішчы, перабраліся на вёрст дзесяць вышэй па Лані і заснавалі Чудзін, а рэшта падалася ажно на Украіну. Дзе тут праўда, дзе вымысел, цяжка ***сказаць***, адно пэўна: прыгожая вёска, дык прыгожыя і паданні. Дый суровых быляў, асабліва пра апошнюю вайну, тут колькі, але пра гэта трэба пісаць асобна.

Якія тады, у маім маленстве, былі вечары! Натомяцца людзі за дзень, пасля наўвіхаюцца ля печаў ды ў хлявах, а ўсё роўна не падаюць, бы снапы; за праснiцу ці за кісет з махоркаю – і на вячоркі, дзе гамана стому здымае, сілу на заўтра дае. Дзе ж і ты, малое-запечнае, заснеш – вызіраеш з-за коміна, слухаеш, не наслухаешся! Радуешся, што ў тваёй хаце збіраюцца, хоць і цесна. Шчымлівы халадок у грудзях ад жаночых песень, дрыжыкі па скуры ад мужчынскіх расповядаў пра неймаверныя страхоцці ды цуды. (288 слоў)

Алесь Каско. "Край казачнікаў".

14. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы (лічбы запішыце словамі). Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых дзеясловаў.

Паводле Георга Зімеля, нямецкага філосафа, у свеце зрокавых вобразаў не/існуе нічога, што падобна да твару чалавека. Вочы і пагляд маюць вялікае значэнне, асабліва ў жывапісе. Вочы перадаюць адухоўленасць асобы. Гэта сапраўды "вокны душы". Праз вочы ***перадаецца*** псіхалагічны стан чалавека, у іх адбіваецца кожная падзея перажыванні ўнутраны стан чалавека. Імпульс вачэй пагляду даносіць да нас магутную сілу духу.

Вочы бываюць розныя. Д…лікатная вытанчаная прыгажосць міндал…падобных вачэй патрабуе ў малюнку дакладнасці ліній плаўнасці і мяккасці формы. Інакш трэба маляваць выпуклыя вочы, зусім па/іншаму вочы якія глыбока пасаджаны ці "правалiліся", а яшчэ ж ёсць круглыя вочы… І нават квадратныя! Вядома апошнія ўмоўнасць ужытая мастаком каб у грубай форме перадаць пэўныя характ…рыстыкі асобы. Вочы ў прамен…чыках маршчынак або ў атачэнні глыбокіх маршчын/разорак, або з мяшкамі, прыпухлымі павекамі. Вочы з ву…кім разрэзам,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

як бы прыплюснутыя на твары і г.д. Кожны народ мае свае этнічныя адметнасці тыпу вачэй – разрэз форма колер прапарцыянальныя суадносіны з астатнімі часткамі твару.

Вочы мастаку ***пазнаваць*** усё сваё жыццё. Вочы чалавека, засяроджанага ў сабе, вочы пустыя напружаныя. Вочы шчаслівыя пахмурныя трагічныя насмешлівыя, жорсткія, какетлівыя. Вочы закаханыя гнеўныя, заклапочаныя хітрыя разумныя або бя…глуздыя лагодныя або калючыя спагадныя або асуджальныя. Вочы жывыя або мёртвыя… Пералік характарыстык вачэй пагляду – б…сконцы.

Асобнай увагі патрабуюць вочы дзіцяці у іх форме тым як пасаджаны на твары іншых адметнасцях закладзены ўжо ад прыроды важныя індывідуальныя характарыстыкі будучай асобы.

Вочы жанчын – асаблівыя непаўторна прыгожыя і какетлівыя. ***Зачароўваюць*** сілай імпульсу жаноцкас…ці самой сутнасці жанчыны. Ва ўсіх праявах раскрываюць глыбокі прыродны дар загадкавасць і невыказнасць пачу(цц,ц)яў. Унікальная па сваёй сіле жаноцкасці ідэалізацыі "Джаконда" (Л, л)еанарда (Д, д)а (В, в)інчы створаная прыкладна ў 1510-1515 гадах. Вочы "Джаконды" – насмешлівыя і высакамерныя у іх прыцягальная сіла і разбуральная недаступнасць. (298 слоў)

Віктар Альшэўскі. "Пачуццё раўнавагі, альбо час узыходзячага сонца".

15. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы (лічбы запішыце словамі). Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых службовых часцін мовы.

Спеўныя смалістыя бары з зязюльчыным кукаваннем і дзятлавай марзянкай; заваложаныя смугой ц…ністыя гаі з чырвоным ро(сс, с)ыпам суніц на пагорках і ружовымі лапікамі чабору ***ўздоўж*** дарог; невялічкая віхлястая рачулка Пціч што ціха струменіцца ў прыбярэжных (в/)ольхах і вербалозах. Прыгожыя і маляўнічыя мясціны дзе ў вёсцы Закружка паблізу ад Мінска нарадзіўся і выраз Уладзімір Карызна.

Там у дзяцінстве ён, вядома не мог угадаць свой жыццёвы лёс – проста блукаў у гаях і дубровах купаўся ў лугавых травах і красках пакуль уражлівая чулая душа не адгукнулася на гэты вечны покліч прыроды. Нарадзіліся вершы ўхвальна ацэненыя знаўцамі паэзіі яшчэ тады на/прыканцы пяцідз…сятых гадоў. У маладога паэта выразна акрэслілася свая, уласная тэма хараство роднай зямлі яе боль і пакуты жаданне дарыць радасць і дабрыню. Пра не/парыўную сувязь з (Б, б)ацькаўшчынай све…чаць нават самі назвы яго паэтычных кніг – "Край мой сінявокі", "Жураўліны досвітак", "Святло ліўня", "Цеплыня", "Цішыня баразны".

Былі ўжо надрукаваны першыя вершы і сябры віншавалі маладога аўтара з відавочным поспехам калі нечакана паэт заўважыў дзіўную рэч усё уладней яго існасць забіраюць у незваротны палон музыка беларускія народныя песні. Варта аднойчы было ўбачыць майскі надвячорак з квітнеючымі садамі і глыбокім чыстым небам над галавой як душа раптам набыўшы крылы перапоўнілася чароўнымі гукамі вясны. Ма…чыма прычынай таму сталі даўнія ма…чыны калыханкі напевы бацькавай балалайкі вясёлыя і журлівыя песні аднавяскоўцаў. Але вярнуўшыся ў

свой студэнцкі інтэрнат малады паэт сеў за стол і здарыўся цуд усе гэтыя таямнічыя "до-рэ-мі-фа-соліны" таленавіта рассыпаныя па нотным аркушы ўтварылі глыбока лірычную распеўную мелодыю. Вы напэўна здагадаліся што гаворка ідзе пра вядомую песню Уладзіміра Карызны "Беларусь мая сінявокая". Так, ***гэта*** яна – прыгожая дужа гарманічная любімая ў народзе, ды, апроч таго прыдатная і для хору, і для асобнага спевака – якасць увогуле характэрная для кожнай цудоўнай песні. "Беларусь мая сінявокая" надзвычай чароўна гучыць у выкананні жаночага хору – сапраўды заслухае…ся. (292 словы)

Віктар Гардзей. "Цёплая, нібы вясны світанне…"

16. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых службовых часцін мовы.

Дапякалі Мішку [медзведзяня] і пчолы. Хадзілі раз з маткай [мядзведзіцай] у глухі бор. Лазіла матка на хвою, залезла высока-высока, ледзь відно яе ад зямлі ***з-за*** папараці, за якой прылёг Мішка. І вось як зараве раптам маці, як затрашчыць нешта ўгары, сухія галінкі ляцяць, цярушацца, ды гуд пайшоў па ўсёй паляне. Не злезла, а саскочыла маці ды ходу, Мішка за ёй. Бяжыць, а пчолы за ім, і на галаву, і на хвост, і за пуза ўчапіліся. Лезуць сляпіцаю ў нос і ў вочы. Што ні рабіў Мішка – і аб кусты цёрся, і па зямлі качаўся – нічога не дапамагала. Пакуль з маткай ў ваду ні ўскочылі, у рэчку, тады толькі ачухаліся, ад пчол адмахнуліся. І дні тры хадзіў сам не свой. Хварэў нават трохі, у бярлозе адлежваўся. Вочы так паапухалі, ***што*** нічога не бачыў. Губы апухлі, нос, ні да чаго не дакрануцца. Але ж якім потым мёдам частавала маці, еў бы, здаецца, штодня ды смакаваў бы! ***Вось*** яны якія тыя пчолы былі!

І хоць баяўся Мішка і жабы, і чмяля, і пчол, і вожыка, але бачыў, што матка на іх і вокам не кідае, зусім не баіцца. А чалавечы голас калі пачуе – баіцца. Відаць, чалавек страшнейшы за чмяля, за жабу. Вось і цяпер матка асцярожна абнюхвае паветра і ідзе ў другі бок па глухіх балотных сцежках. "Відаць, у авёс" , – думае Мішка. І сапраўды, яны хутка выйшлі на вялікую паляну ў лесе. На ёй раскінуўся малады авёс. Ён яшчэ не паспеў, быў зеленаваты, і толькі дзе-нідзе трапляліся жоўтыя, залацістыя лапікі спелага. Ад лёгкага ветрыку хадзілі па аўсе дрыготкія хвалі, і яны поўнілі паляну ціхім, спакойным шолахам, нібы перашэптваліся калосікі. Любіў Мішка гэты шолах, гэтыя ціхія, ледзь чутныя галасы аўсяных каласоў. Ляжа ў баразёнку і прыслухоўваецца. Над ім глыбокае сіняе неба, высока-высока плывуць празрыстыя хмурынкі, пад імі плавае каршук, праляціць крумкач, пранясецца статак качак. А авёс шуміць. (303 словы)

Міхась Лынькоў. "Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў".

17. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Зрабіце аналіз выдзеленых словазлучэнняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мабыць, ёсць рацыя ў тым, каб крытэрыем творчай сталасці літаратуры лічыць не колькасць асвоеных ёю тэм, жанраў, стылявых напрамкаў, а маштабнасць ***мастацкага мыслення***. Тое, што беларуская літаратура, асабліва проза, дасюль распрацоўвала пераважна вясковую тэму, зусім не з'яўляецца яе недахопам. Яна праўдзіва адлюстроўвала асаблівасці гістарычнага лёсу, характар нацыянальнага быцця народа, пераважную большасць якога працяглы час складала сялянства. Немалазначны факт: амаль усе беларускія пісьменнікі, у тым ліку і маладыя, ***узгадаваліся ў вёсцы***, звязаны з ёю мноствам духоўных сувязей, належаць да яе ўсёй душой. Аднак куды важней той факт, што ўся наша літаратура фарміравалася ў сістэме духоўных і эстэтычных каштоўнасцей, створаных геніем народа-працаўніка, безыменнага творцы найбагацейшага ў свеце фальклору. Вядома, сучасны літаратурны герой не стане захапляцца, скажам, тым, што носіць мужыцкую сярмягу, як гэта рабіў у свой час герой-інтэлігент Максіма Гарэцкага. Куды важней знешніх праяў вернасці героя родным караням, сялянскім ідэалам само адчуванне і ўсведамленне гэтай вернасці і далучанасці. Чалавек без памяці пра мінулае, пазбаўлены гістарычнага вопыту свайго народа і іншых народаў, не мае будучыні. Бо ён жыве, па сутнасці, адным абмежаваным імгненнем і проста не здольны вызначыць сваё месца ў свеце.

Большасць герояў беларускай прозы – звычайныя людзі, простыя працаўнікі, якія ўвасабляюць спакой і мудрасць народнага погляду на жыццё, выклікаюць непаўторнае адчуванне трываласці нацыянальнага характару і нацыянальнага свету беларуса, унутранай сілы і здольнасці да супраціўлення, што ***выяўлялася***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***неаднаразова***. Глыбокія карані яго патрыятызму і глыбокай павагі да іншых народаў ідуць у далёкае гераічнае і драматычнае мінулае.

Беларуская проза як цэлае шчасліва пазбегла настальгіі па былому, аднабаковай ідэалізацыі ўласнай гісторыі: перад сучаснікам стаяць ва ўсёй складанасці праблемы, якія вымагаюць неадкладнага вырашэння. Зрэшты, яны стаяць сёння перад кожным з нас: хто мы і якая наша роля ў свеце, як жыць далей, на чый бок станавіцца ў вялікай спрэчцы дабра і зла? (284 словы)

Міхась Тычына. “Карані і крона”.

18. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Зрабіце аналіз выдзеленых словазлучэнняў.

Лямпачка ***ц…мяна гарэла*** недзе ўгары на чац…вёртым ці пятым паверсе і таму ***на лесвіцы стаяў*** прыцемак. Марына павольна пераступала з прыступкі на прыступку падымаючыся ўсё вышэй і вышэй і калі б хто паглядзеў на яе ў гэтую хвіліну напэўна сказаў бы што дзяўчына да нечага прыслухоўваецца. Але ў калідоры панавала ціша сюды ў поз…ні час не далятаў ніводзін гук ні з вуліцы ні з кватэр вялікага шмат/павярховага дома толькі высокія абцасы Марыніных чаравікоў ступалі па бетоне лесвіцы.

Дзяўчына ўз…шла на ***першую пляцоўку*** і глыбока ўздыхнуўшы прыпынілася высокая зграбная постаць яе нібы замерла. І зноў можна было падумаць што дзяўчына імкнецца штос…ці пачуць у гэтай густой цішы імкнецца – і не можа бо адзінае што чуваць зараз  гэта стук уласнага сэрца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вядома шмат па якіх прычынах можа стукаць дзявочае сэрца асабліва калі ёй толькі два…аць год. Хоць бы і па той што ўвесь вечар давялося танцаваць з маладым сімпатычным хлопцам у якога такое харошае гучнае імя Антон.

Хто ж ён такі гэты Антон? думала Марына узіраючыся ў акно якое цяпер было чорнае/чорнае. Там у акне нібы ў люстэрку відзён быў яе твар. Марына бачыла свой высокі адкрыты лоб крыху задзірысты нос дз…ве ямачкі на шчоках але ўяўленне малявала іншы твар – ягоны Антонаў. І ёй пачынала здавацца што з аконнай шыбы на яе пазіраюць і нават трошачкі ўсміхаюцца цёмныя Антонавы вочы тыя самыя што ўвесь вечар сачылі за ёю з/пад броваў якія амаль сышліся ля перано…я.

Малады чалавек вылучаўся сярод усіх хто быў у гэты вечар на танцах: на ім быў добра пашыты светла/карычневы гарнітур у той час як большас…ць з тых каго ведала яна насілі чорныя кіцелі або гімнасцёркі  звычайную форму чыгуначнікаў. Танцаваў малады чалавек вельмі хораша Марыне было прыемна з ім і таму калі ён запрасіў яе на новы танец яна без вагання дала згоду. (294 словы)

Яўген Васілёнак. “Гаспадыня”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

19. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Зрабіце сінтаксічны аналіз выдзеленых сказаў.

Дзявяты клас я скончыла не ў Лясной Гуце, дзе жылі бацькі. Здарылася так, што маю старэйшую сястру і яе мужа пасля заканчэння Смаленскага педагагічнага інстытута паслалі настаўнічаць у пасёлак Мокрае, які знаходзіўся недалёка ад Калугі. ***У сваіх пісьмах дадому сястра з захапленнем апісвала прыгажосць***

***былога павятовага гарадка, хваліла школу і дружны, згуртаваны калектыў настаўнікаў***.

У той вечар бацька адвёз мяне на чыгуначную станцыю, і я нават не заўважыла, як праехалі на падводзе дванаццаць кіламетраў па няроўнай лясной дарозе. Вядома, марыла то пра новую школу, то пра новых сяброў, то пра тое, што мяне чакае.

Новая школа мне ўяўлялася ў розных абрысах, але яе выгляд усё ж такі здзівіў мяне. Белая двухпавярховая, яна стаяла пасярод вялізнага густога саду, а старыя ліпы падступалі да самых акон, адлюстроўваючыся ў чыстым шкле. ***Прамая, засаджаная акацыямі алея вяла ад веснічак варот проста да парадннага ўвахода школы***. ***Пад вокнамі, на астраўках-клумбах, лапушыліся махровыя астры***. Воддаль, ззаду школы, раскінуўся двор з гаспадарчымі пабудовамі: тут знаходзіліся і хлеў для коней, і школьная лазня, і магазін, а непадалёку -- вялікі жыллёвы дом для настаўнікаў і тэхнічак. За школьным дваром, на роўным зялёным лужку, -- фізгарадок, далей, да самага яра, зарослага высокімі кустамі чаромхі і арэшніку, цягнуўся прышкольны багаты агарод.

Пасялілася ў невялікім дамку, што ціхенька прытуліўся ў куточку парку за кустамі язміну і бэзу. Ён быў двухкватэрны, адну кватэру з трох пакояў займалі мая сястра з мужам, у другой – таксама настаўніцкая сям'я. Пакой, што і казаць, утульны, з двума вокнамі ў сад, з круглым сталом пасярэдзіне, з карцінай "Гракі прыляцелі" на сцяне.

З вышыні другога паверха адкрываўся далягляд на гарадок і яго ваколіцы. Справа ад школы цягнулася вуліца з дамамі, то невялікімі, то доўгімі з некалькімі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ганкамі і комінамі, а паміж дамоў, як правіла, сады. Нават з вышыні было відаць, як згіналіся галіны дрэў пад цяжарам паспелых пладоў. (297 слоў)

Мікола Гамолка. "Дзяўчына ішла па вайне".

20. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Зрабіце сінтаксічны аналіз выдзеленых частак сказаў.

На календары яшчэ амаль тыдзень да восені але сонца заходзячы ў чырвані вяртаецца на зямлю белым, белымі іскрамі прыпадаюць ужо ў нізінах да траў прымаразкі. Падобна да таго што само сонца б…ецца спякотнымі промнямі аб скамянелую зямлю высякае гэтыя іскры, белы халодны жар. ***Па/іншаму ніяк і не растлумачыць таго*** што адбываецца: у/дзень паліць спасу няма а ў/начы выстудж(ва, ыва)е. І месяц над вёскай увесь час у вен…чыку у касына…цы – на добрае надвор…е на спёку і холад.

Раней за адведзены ім час ці то на б…схлебіцу ці то прадчуваючы халады збіраюцца ў цёплыя краіны буслы, як не сотні збілася іх на сенажаці каб пагаманіць апошні раз на роднай зямлі. Што ні кажы калгасны сход гэткае наўгаро…скае веча нібыта з вякоў векавечных паўсталі з зямлі дзяды і прадзеды сівыя босыя. ***(Ня, не)/спешна спаважна ўглядаюцца ў высокае чыстае неба*** махаючы яму крыламі: пачакай маўляў неба паспеецца пакуль што абмяркуем зямное.

Толькі на самоце калі на душы бусла спакойна і ціха калі распластаўшы ружовыя на сонцы крылы выбл…скваючы кожным пяром падрул…вае ён задубелымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

доўгімі нагамі да сваёй буслянкі вітальнай песняй адзначае сваё вяртанне з далёкіх краін. Калі на дасве…і выйдзе ён на родныя гоні палі дубровы сенажаці і кіне яго ў жар і холад ад няўпыннасці і бясконцасці жыцця і зямлі тады не памятаючы с…бе адкінуўшы сціпласць і сарам…жлівасць безгалосы зацягне ён сваю хоць і не зусім удалую але радасную шчырую песню нараджэння новага дня. ***А дзень бусла як і сялянскі спрэс у працы***. Нібыта каморнік мерае ён балота падоўгу ўглядаецца сумным вокам у н…куды ці то імкнецца зазірнуць што там за даляглядам ці то засяродзіць свой позірк у с…бе слухае шапаценне мяцёлчатых і в…стралістых траў як здатны слухаць гэтыя травы сівы дзед/паляшук. (277 слоў)

Віктар Казько. "Неруш".

21. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Зрабіце сінтаксічны аналіз выдзеленых сказаў.

***Лета развітвалася, пачыналася восень; у цудоўным парку вакол дамочка для гасцей, дзе пасяліўся Жукоўскі, і вакол палаца было больш летняй зеляніны, як восеньскага золата, дні стаялі пагодлівыя, і ад сонца праз высокія вокны ды адчыненыя ў парк дзверы пазалотай палалі шыкоўныя інтэр'еры пакояў.*** Светлы настрой напоўніў сэрца мастака, і ён адразу ўзяўся за работу, пісаў, перадаючы на палотнах непасрэднае ўражанне ад сустрэчы з цудоўнымі куточкамі шчаслівага людскога жыцця. Ён адчыняў усе вокны і дзверы, пускаў у пакоі, як хацела душа, жывую прыроду і смела, энергічна клаў на палатно, здавалася, не фарбу, а само расплаўленае сонца. Ім сaграваў і мэблю з чырвонага дрэва ды карэльскай бярозы, і партрэтныя вобразы баявых, у генеральскіх

эпалетах і ордэнскіх стужках, продкаў, акаймаваных багетным золатам, і серабрысты, у залатой аправе, крышталь люстраў ды вазаў з кветкамі таго самага парку, водар якога поўніў пакоі духмянасцю жывой прыроды.

Тут усё было музыкай, якую ён перадаваў рухам каляровых рэфлексаў, карункаў, валёраў, блікаў. Музыка жыла і ў самой графіні, жанчыне надзвычай прыгожай і далікатнай, і ў былым жыцці, якое ведалі людзі, што прысутнічалі ў палацы на партрэтах. Настроі палаца зрабіліся настроямі мастака, і ён адчуваў іх у кожнай рэчы, у кожнай дэталі. Як і ў квяцістым шалі, кінутым, быццам выпадкова, на белае крэсла, як і ў чырвоных кветках па чорным полі, так гарманіраваў са смуглявым, нібы ў цыганкі, аблiччам графіні. ***А за крэслам з шалем – дзверы, адчыненыя ў парк: толькі што графіня выйшла з пакоя, не зачыніўшы іх за сабою, і ў светлых мазочках пэндзля па зацененай падлозе яшчэ як быццам калыхалася паветра, узнятае доўгай і шырокай спадніцаю***. Тут ужо і назва карціны "Пакой у маёнтку Брасава" прасіла большага напаўнення -- "Пакой графіні Наталлі Сяргееўны". (273 словы)

Віктар Карамазаў. "Краса і воля".

22. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Зрабіце сінтаксічны аналіз выдзеленых сказаў.

***Па сабе ведаю што нейкія цэлыя падзеі карціны/вобразы выклікаюцца скажам павевам у паветры свежа/вымытай бялізны развешанай марозным сонечным днём на вяроўках сушыцца***. Якія асацы…цыі будзіць адзін гэты пах? У мяне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чамус…ці вострую свежасць агурочнага цвету і завязь першых агуркоў на градах паз…ней далучалася адчуванне свежасці толькі што разрэзанага свежага кавуна. А тонкі не/выказна ўражлівы цнатлівасцю сваёй расіста/жамчужнай чысціні пах ландыша! Цяпер на старасці год пачуць яго гэта падзея роўная для мяне далучэнню да вялікага душэўнага прасвятлення як пачуць скажам раптоўны сярэбраны ро…ып салаўінага рэха.

Пах і слых будзяць жывяць і замацоўваюць у памяці падзеі і вобразы якія па сваёй духоўнай сутнасці вельмі н…чым дарагія для кожнага з нас. ***Многія дз…сяткі год не магу забыць і ніколі не забудуся як пасля вайны прыехаўшы ў свае Еўлічы адвячоркам на захадзе сонца я ішоў наведаць магілу бацькі***. Свой настрой і думкі ў тую хвіліну я запомніў мабыць таму што ўрэзаўся мне ў памяць пах цёплай раллі. Цішыня і некалькі н…стройных жаночых галасоў якія н…ўпэўнена спрабавалі падняць над полем песню не столькі зрокавыя і сл…хавыя прыкметы роднага мне краявід… але відаць эмацы…нальныя асацы…цыі. Яны замацавалі ў памяці і мой настрой і развагі што былі асабліва дарагімі і важнымі для мяне ў тыя хвіліны. Пра што я думаў да якіх пачуццяў далучаўся душою – пра гэта паз…ней былі напісаны вершы “Край гасцінца” і “Ядлоўцавы куст”.

Першыя замаразкі мне заўсёды пахнуць чыстай свежа/вымытай палатн(ян, янн)ай тканінай настольнікамі ручнікамі прасцінамі.

***Памятаю як зласловілі каліс…ці крытыкі і парадысты над Кузьмой Чорным праз усю творчасць якога праходзіць вострае адчуванне пах… зямлі асабліва ў ранніх яго апавяданнях і раманах***. Колькі там пахаў – усюды і скрозь! Для

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

даследчыка, глыбокага псіхолага гэты наш пісьменнік у многіх сваіх гранях скарб у аспекце спазнання псіхалогіі творчасці і сігнальнай сістэмы мыслення і памяці. (286 слоў)

Васіль Вітка. “Вузельчык на памяць”.

23. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Зрабіце сінтаксічны аналіз выдзеленых сказаў.

Побач з нашым Загорам, уздоўж яго, з даліны на гару пяўся спрадвечны гасцінец. Цяпер ён ужо не пнецца, яго пакрылі асфальтам, і мноства машын снуе па ім значна цішэй і няпыльна. А ў дні майго маленства пяўся, глеіста-гразкі, і ніякія шараваркі не маглі яму памагчы стаць прыстойнай дарогай.

Пасля трох класаў Загорскай пачатковай школы я пайшоў у чацвёрты клас Турэцкай сямігодкі (заўсёды спаткнешся на гэтым “Турэцкая школа”, а яно ж – ад мястэчка Турэц). ***Нас, такіх “гімназістаў”, як падкусвалі ў вёсцы, было чацвёра, тры хлопчыкі і дзяўчынка, я наймалодшы***. ***Ніхто нас, вядома, спецыяльна не падвозіў, пра гэта і думкі не было ні ў нас, ні ў бацькоў, ні ў “панскай” дзяржавы***. Чатыры кіламетры туды і столькі ж назад для хуткіх пастушыных ног, хоць і абутых, у школу было няцяжка. Хоць часамі, узыходзячы на гару, калі мы вярталіся, мне зручней было апірацца далонямі на калені папераменна, так памагаючы нагам.

Заходні канец нашай вёскі ўздымаўся высока, а калі яшчэ выйсці з яе на гасцінец, дык і адчуеш, як ты падняўся над наваколлем. ***Ва ўсе бакі так далёка, так хораша ўсё відно: і палі, і вёскі, і мястэчка з шасцю светла-салатавымі***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***купаламі царквы, і лясы, меншы на поўдні, а на паўночным усходзе большы***. У меншы мы, школьнікі, мінулай восенню хадзілі па бярозкі, якія саджалі абапал гасцінца, а ў большы лес, які далей на поўнач, за Нёманам, і называецца Налібокамі, пушчай, дарослыя зімой ездзілі па дровы і дзеравякі.

Я і сёння яшчэ ўсё люблю сяды-тады, чым далей, то ўсё больш зрэдку, апынуцца на нашай гары. Калі адзін, дык моўчкі пастаю, паазіраюся, а калі з якім-небудзь госцем, бывае і з замежным, дык і спытаюся: “Што, прыгожа?”. А ў маленстве я ўмеў яшчэ радасць ад вышыні выказваць і крыкам, тонкім, пранізлівым, доўгім, лепш за ўсіх сябрукоў і сяброўак. (291 слова)

Янка Брыль. “Дзядок”.

24. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Зрабіце сінтаксічны аналіз выдзеленых сказаў.

Добрае пачуццё поўніла Аленку калі яна развітаўшыся з маці пайшла з цэха. І было шкада што трэба ісці і яна сказала сабе што пры…дзе сюды зноў што мажліва увогуле будзе калі/небудзь тут працаваць.

Аленка выйшла на ганак і з вышыні яго ўбачыла горад заліты вечаровымі агнямі чорна/бліскучыя шаты тапляў усцяж тратуараў і за імі незвычайна лёгкую бы не/важкую зусім ажурную арку моста. Над галавой белым глобусам вісеў плафон і ў святле яго Аленка нечакана заўважыла што рукавы кофтачкі зырка і пералівіста зіхацяць ад мноства танюткіх маленькіх зорачак падобных на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сняжынкі. ***Аленка паспрабавала ўзяць адну з іх дакранулася але пальцы нават не адчулі дотыку шкла.***

***Аленка ішла па вуліцы і на вуліцы таксама гарэлі электрычныя ліхтары і ад іх святла толькі цяпер больш ц…мяна зіхацелі шкл(ян, янн)ыя ніці/павуцінкі на рукавах кофтачкі***. І хоць ніхто не звяртаў на Аленку ўвагі ёй аднак здавалася быццам усе ведаюць што яна працавала сёння на заводзе бо бачаць зіхатлівае па…уцінне на яе адзенні.

На мосце Аленка прыпынілася зірнула на ваду у якой адбіваліся ярка асветл(ен, ян)ыя заводскія карпусы падобныя на дзівосны карабель і адчувала сябе часцінкаю таго вялікага і цікавага жыцця што ішло за асветл(ен, ян)ымі вокнамі завода.

Аленка раптам адчула яна пачынае разумець маці так як не разумела ніколі да/гэтуль. Быццам з вышыні але дужа ясна і выразна ўбачыла розныя дробязныя н…згоды што часам былі ў яе з маці адчула нікчэмнасць тых сваіх патрабаванняў адчула сваю вінаватасць. І тут жа ўявіла сабе школу будучы вечар на якім давядзецца выступаць і падумала пра тое што ёй цяпер ёсць пра што расказаць што яна будзе расказ(ва, ыва)ць доўга і гэтае яе апавяданне будзе самае цікавае бо наўрад ці ёсць дзе праца цікавейшая чым тая якую робіць яе маці. (278 слоў)

Алесь Савіцкі. “Шкляная нітка”.

25. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Зрабіце сінтаксічны аналіз выдзеленых сказаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Перад тым як ісці ў армію, я пасадзіў рабіну. Навучаны вопытам з маліннікам і дубкамі, гэтым разам быў больш разумным і хітрым: я выбраў месца ў самым глухім, зарослым крапівою кутку за дрывотняю. Тут няма высакавольтнай лініі, сюды не дабіраецца каса, грады далёка, і маё дрэўца не зможа дацягнуцца туды каранямі.

***У войску я калі-нікалі ўспамінаў той глухі куток двара, рабіну, і тады мне неяк цяплей рабілася на душы і пачынала здавацца, што гэта не дрэўца, а дзяўчына падрастае там і чакае мяне***.

Аднойчы ў пачатку лета, прыехаўшы чарговы раз у вёску і падыходзячы да сваёй хаты, я не ўбачыў над плотам знаёмых галін з рэдкімі лісцікамі. Дрэва сіратліва ляжала на зямлі, вывернутае з кавалкам дзёрну на каранях. Як расказала маці, нядаўна быў страшэнны вецер (цэлы буран!), паваліла плот, ён упаў на рабіну, вывернуў яе з зямлі.

У канцы лета я зноў наведаўся ў вёску, проста так, напярод сумуючы, падаўся ў свой куток двара і ахнуў. Рабіна мая ляжала, як і ляжала, на зямлі, але яна была ўся чырвоная, уся – на кожнай галінцы – абсыпаная гронкамі буйных, яркіх, сакавітых нават на выгляд ягад. ***На ёй не было ніводнага лісціка: усе сокі, што змагла выцягнуць з таго кавалка дзёрну каля каранёў і сама з сябе, ахвяруючы лісцем, рабіна пусціла на ягады.*** Яна ляжала – чырвоная на маладой атаве – і свяцілася затоеным гонарам, што выжыла, што змагла ўрэшце даць багаты плод, і глядзела на мяне з лёгкім дакорам: чаму не паверыў ёй?

Я падчысціў, паглыбіў рыдлёўкай старую яму, паклаў на дно гліны, падняў сваё дрэва, падвязаў яго да плота, прынёс два вядры вады і паліў. І цяпер я чамусьці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўпэўнены, што мая рабіна выжыве, прымецца зноў і будзе жыць да таго часу, пакуль будзе ведаць, што ў свеце ёсць хоць адзін чалавек, каму яна патрэбна, які хоць зрэдку ўспамінае і клапоціцца пра яе, для каго ёй варта жыць. (304 словы)

Андрэй Федарэнка. "Рабіна".

26. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Зрабіце сінтаксічны аналіз выдзеленых сказаў.

***Груша/дзічка мой пропуск у дзяцінства. Як забаронны знак як перасцярога як стоп/сігнал спачатку выплывае гэты малюнак і толькі потым расчыняецца брама ў далейшыя ўспаміны найперш усё/такі звязаныя з гэтым дрэвам пасярод поля.***

Як бы н… мільгацелі за акном краявіды перад маімі вачыма быў адзін той зялёная груша/дзічка пасярод жоўтага поля. Па некалькі метраў вакол дзічкі трактарысты не заворвалі пакідалі лапік зямлі які заўсёды ярка зелянеў густою упартаю травой. ***Колькі б мы н… таптаі яе як бы н… зміналі яна ўставала адыходзіла за ноч і да самай зімы заставалася нязменнаю.*** Здавалася нават што і пад снегам не адмірала яна зусім бо з ранняй вясны была тут высокаю і зялёнаю як н…дзе.

Дзічка была ў камлі тоўстаю – мы ледзь/ледзь абдымалі яе узяўшыся за рукі і ад самай зямлі пачыналася ў ёй і цягнулася метраў на два дупло. Некалі нехта расклаў пад ігрушаю вогнішча і пакінуў яго – мо хто з трактарыстаў якім абрыдла абворваць дрэва а мо хтос…ці проста забыўся патушыць агонь. Але

груша не здалася здужала і жыла з дуплом. Вось у гэтае дупло і любілі мы хавацца калі гулялі ў хованкі. Усе пра яго ведалі і (ня, не)/гледзячы на тое што шукаць ішлі найперш сюды кожны раз некалькі хлопцаў кідалася да дупла. Унутры дупло было чорным аднак сажа ўжо не бралася бо вышмальцавалася/выслізгалася да бляску. ***Дупло было скразное, навылёт, а значыць мела два ўваходы/выхады і ў таго хто хаваўся ў ім заўсёды быў шанц выскачыць непазнаным і перагнаць таго хто шукае.***

Праяз…жаючы паўз сваю вёску якая хавалася за лесапаласою я хацеў угледз…ць з акна вагона дзічку узіраўся пільна аднак не ўбачыў з/за дрэваў нават ніводнае хаты. Захваляваўся але адразу ж супакоіў с…бе сцяжына ў бок вёскі пратаптана. Значыць вёска жыве а раз жыве вёска то павінна жыць і дзічка. (287 слоў)

Барыс Пятровіч. “Успамін. Дзічка”.

27. Запішыце пад дыктоўку, зрабіце графічны аналіз выдзеленых слоў.

Цагляны, далікатэс, даўжыня, Наваполацк, ***повязь***, сальфеджыа, сінявокі, канферансье, трыдзявяты, нявыпечаны, чалавеказнаўства, паўночнаказахстанскі, прэс-цэнтр, светлалісты, Усць-Каменагорск, агонь усёпаглынальны, аўдытар, баул, маці-ўкраінка, песня-ўспамін, Штутгарт, штутгарцкі, Валдайскае ўзвышша, беларускія гарады, Беларускі вакзал (у Маскве), парцье, ***хадзьба***, аб’езд, вераб’і, Мальер, водна-меліярацыйны, кінафестываль, водаразмеркавальны, контрагент, мяса-малочны, бульбяны, карэнны, племянны, ястрабіны, ***узвышша***, адвеку, пад пахай, да смерці, па-дарожнаму, на жаль, аніколі, няважны, зусім не поўны, не цікавей чым цяпер, няўмека.

28. Спішыце словы (спалучэнні слоў), афармляючы згодна з правіламі беларускай арфаграфіі. Зрабіце арфаграфічны аналіз выдзеленых слоў.

Н…вадзвінск, узгор…е, л…тарэйны, ж…тон, ч…рапіца, с…мейны, ***трыдз…сяты***, б…ссэнсіца, яс…нёвы, малам…тражны, Паўднёва/Афрыканскі (рэгіён), свежа/вымыты, Ханты/Мансійск, прэс/рэклама, маральна/устойлівы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чалавек, ва (ў, у)ніверсітэце, а(ў, у)кцыяніст, князь (ў, у)семагутны, бацька-(ў, у)збек, рады(ў, у)с, Але(ў, у)цкія астравы, (М, м)ележаўскі стыль, (К, к)упалаўскія чытанні, 8 (С, с)акавіка, Сімяон (П, п)олацкі, Афанас…еў, ***Лавуаз…е***, ал…янс, п…еса, аген…чык, ваенна/марскі, ваенна/абарончы, астрашыцка/гарадоцкі, чалавека/год, обер/кандуктар, (У, у)шаччына, птушы(нн,н)ы, ***ві(нн, н)ы***, задуме(нн, н)ы, зубры(нн,н)ы, на/ўскід, у/вечары, як/след, дзе/нідзе, па/воўчы, н…праўда, ні/з/кім, нiколькі не/горшы, не/горшы за брата, ані/хто.

29. Запішыце пад дыктоўку, зрабіце графічны аналіз выдзеленых слоў.

Гепард, ***папялішча***, сяржант, леснікоўна, імпрэсарыа, паліграфія, шэрсцяткацкі, марозны, чырванашчокі, Салаўёў-Сядой, паўднёваасецінскі, свежазмалоты, Халхін-Гол, псіхаэмацыянальны, псіхолага-педагагічны, дзядзька-ўкраінец, на Умані, метэаўмовы, аульны, аўгіевы (канюшні), Паўночны Ледавіты акіян, караткевічаўскі герой, дапятроўская эпоха, коласаўскі радок, Літоўская метрыка, ***васьмю, здароўе***, усмешка, якісьці, Манпасье, горнатэхнічны, малааўтарытэтны, камер-юнкер, кілават-гадзіна, сацыяльна-бытавы, нізінны, аўсяны, Случчына, машынны, таматны, удвая, за мяжой, злева, па-першае, з разгону, ні з чым, няўрымслівы, зусім не варты, не лепшы за яе, нябачны.

30. Спішыце словы (спалучэнні слоў), афармляючы згодна з правіламі беларускай арфаграфіі. Зрабіце арфаграфічны аналіз выдзеленых слоў.

Гл…таць, усхода/знавец, Н…варасійск, м…розны, эд…львейс, ал…горыя, Складоўская/Кюры, ***н…ўцешна***, …гіпецкі, дз…сяцкі, фіта/біялогія, Цянь/Шань, паўночна/асецінскі, бела/польскі, бела/ружовы, раба/ўладальнік, дачка/ўцеха, на (Ў, У)шачы, 9 (М, м)ая, (К, к)упалаўскія радкі, (Б, б)аркалабаўскі летапіс, кал…е, піс…меннік, дз…ве, рэл…еф, ***камен…чык***, вэб/старонка, літаратура/знаўчы, ледзь/улоўны, глыбака/думны, глыбока/ўскапаны, ***(П, п)олаччына***, драўля(нн, н)ы, палымя(нн, н)ы, каме(нн, н)ы, цемя(нн, н)ы, без/разбору, на/двое, на/памяць, як/ніяк, у/пару, не/высокі, ні/ў/кога, не/прыяцель, далёка не/поўны, не/раней чым заўтра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Даведка**

2. Горад у гэтым месцы спускаўся з вялізнага груда, які вянчала гара Міндоўга, і ішоў у поле. Дзевяцьсот год горад мясціўся на грудзе, не адпускаў далёка вузкія пакручастыя вуліцы і вулкі, цесна грувасціў адна пры адной хаты, як бы зграбаў іх сабе пад пахі, ашчаджаў кожным вольным лапікам зямлі, і толькі цэнтральная брукаваная плошча з двума касцёламі і шнурком крамаў ды парк пад Замкавай гарою яшчэ нагадвалі пра колішнія абсягі. Мусіць, некалі яны былі, гэтыя абсягі, аднак цяпер, калі глядзець з замчышча, бачыш адно чарапічныя дахі, дзе-нідзе з іх вытыркаюцца касцёльныя спічакі. Дзевяць стагоддзяў горад трымаўся груда – і раптам збег па адным з адхонаў у поле. А ў полі ўжо нішто не спыніць чалавека. Вуліцы пацягнуліся доўгія, роўныя, яны абрываліся пусткамі, на якіх ледзь угадваліся сцежкі ў густых лопухах і чартапалоху, – пасля зноў вуліцы. Тут жа

адгарадзіўся ад хат цаглянай сцяною і завод газавай апаратуры, утыркнуўся ў неба доўгімі трубамі, задыміў. Горад цяпер як бы раздзяліўся. У адным, верхнім, былі крамы, школы, кіно, руіны замка і базар, у другім, ніжнім, – завод, абсаджаны хатамі, пусткі, сажалкі, закінуты сад пры бальніцы, палявыя дарогі, якія знікалі ў лагчынах між спадзістых узгоркаў. Палі тут ляжалі на ўзгорках, уся гэтая зямля была падвышаная, а пасярэдзіне – груд з горадам.

Мацкевічы жылі ў ніжнім горадзе, у чатырохкватэрным драўляным доме для выкладчыкаў тэхнікума. На адной з пустак, насупраць гразкай сажалкі, якую што год налівалі веснавыя і восеньскія дажджы, паставілі адзін дом, побач заклалі другі. Адразу за домам пачынаўся поплаў, за якім разлягаўся бальнічны сад. Але сад ніхто не даглядаў, ён быў прахадны, таму і яблыкі ў ім нясмачныя, імі грэбавалі нават тутэйшыя хлопцы. Пад садам вялікая сажалка з дзвюма крыніцамі.

Алесь Кажадуб. “Цюльпаны”.

4. Сасоначка расла не ў гушчары, як большасць, а між стромкіх, ладных ужо сясцёр. І сонца ёй было тут удосталь, і дажджавой вадзіцы хапала, ды ніхто знячэўку і стаптаць не мог. Расла сасоначку ў зацішку, цягнулася да неба, туды, дзе начамі плоймай высяваліся зоркі, дзе месячык пастухом-бацькам праходзіў між імі. Часам здавалася сасоначцы, што дагоніць яна старэйшыя дрэвы, перарасце і выпрастае вершаліну над усім лесам. Тады ўжо ніводная птушка не міне яе вершаліны, каб на хвілінку не прысесці, склаўшы крылы, не паглядзець у бясконцасць ды парадавацца жыццю. Якое ж яно, жыццё, неахопнае, шырокае і бяскрайняе, радаснае і шчаслівае. А магутныя вятры-бураломы ды злыя спякоты – часовае. Усё гэта мінае, і зноў застаюцца шаравата-блакітныя ліпеньскія вечары, майскія спевы птушак, куванне самой зязюлі, вэлюм празрытага туману, які прыходзіць з грыбнымі дажджамі з далёкіх і блізкіх лугавін, з ручаёў, крынічных рачулак, аерных балацявін. Жыццё прыгожае і доўгае, яго ніхто-ніхто не можа адняць. І дрэўца жыло кожным днём напоўніцу, узахлёб, не ашчаджаючы сілаў і дабрыні, радуючыся кожнай хвілінцы, кожнаму гуку ў наваколлі. Яна пакуль не ведала, што побач жывуць нястомныя жукі-караеды, што зусім недалёка селішчы людзей, у якіх ёсць сякеры і пілы, што ім трэба будаваць хаты, разводзіць агонь у печах. Але яна, сасоначка, нікога не чапае, жыве тым, што даецца кожнаму бясплатна, спакон веку. Дык навошта ж быць самотнай? Навошта па начах уздыхаць, рыпець засохлымі галінамі, пабітымі маланкай расшчэлінамі. Трэба ж кожную раніцу чакаць, калі ўзыдзе сонца, якім яно будзе – празрыста-яркім, сляпучым ці слюдзяніста-бляклым, заплаканым. Расла сасоначка, заглыбляла карэнне ў зямлю, зіхацела сярод буравbooatых ствалоў залацістасцю здаровай кары… Жыла, расла сасоначка.

Частыя буравломы абміналі закутак гэтага лесу, а калі і наляталі, на зямлю з надрыўным уздыхам лажыліся магутныя, выспелыя дрэвы. А сасоначка расла, расла і радавалася.

Анатоль Казлоў. “Незламаная свечка”.

6. Стаяла ранняя, зусім яшчэ нясмелая восень. Было цёпла, сонечна і парна. На сінім купале высокага неба толькі зрэдку з’яўляліся шызыя хмары. Спакваля і

няспешна ўсталёўвалася пара тыповай для беларускіх абшараў і звыклай для нас стрыманай красы прыроды.

Славуты нарачанскі край, радзіма аднаго з найярчэйшых талентаў беларускай літаратуры… Усё тут было тыповае для Беларусі, для яе клімату, прыроды і ландшафту, але нібыта вызначалася больш напоўненым зместам, адмысловай эстэтычнай выпраўкай. Калі свяціла сонца, то свяціла абавязкова шчодра, на фоне не інакш як чыстага бакітнага неба. У яго пяшчотным, часам пякоткім промневым палоне, здавалася, цешылася ўсё жывое і нежывое. Калі ўсчынаўся вецер, то быў ён напорлівы, парыўчаты, уздымаў такія хвалі, якія на вачахператваралі возера ў мора – наша беларускае мора. Яны настырна біліся ў борт лодкі, нахілялі яе то адным, то другім бокам, пагрозна захлістваючы ўспененай вадою.

Сонечная шчодрасць і лагода, мяккая цеплыня і лёгкая хмарнасць час да часу змяняліся казытліва-волкай прахалодай дажджу, у вясёлых і спорных струменях якога на нейкі момант патанала ўсё наваколле. Яго буйныя кроплі падалі на ствалы і галіны дрэў, рудую ігліцу і яшчэ зялёны мох. Здавалася, што тут, побач з возерам, усё, у тым ліку і зямля, і паветра, і неба, пахне вадою.

Дождж ленавата аціхаў і адступаўся. Даўгавата яшчэ пасля яго ў пажоўклае лісце, што ўкрывала лясны дол, шпокалі кроплі. У вільготным паветры стаяў водар ядлоўцу і моху. Спакваля сонечныя скразнякі зноўку пачыналі працінаць шаты разгалістых дрэў, нават калючыя лапы ельніку. Лашчылі вока і лагодзілі душу сіняя паднебная высь і празрыстая азёрная далеч. Усё навокал нібыта ажывала, іскрылася, ружавела, маладзела. Свежасць і хараство, здавалася, былі разлітыя паўсюль.

Так, гэта была незвычайная зямля, незвычайныя ваколіцы. Усё было высокае, крамянае, яркае – сапраўднае, жыццядайнае. Адна і тая ж думка ніяк не адпускала мяне, настойліва нагадвала пар сябе зноў і зноў: толькі такая прыгожая зямля магла нарадзіць такога слыннага чалавека, як Максім Танк. (291 слова)

Мікола Мікуліч. “Шумяць нарачанскія сосны”.

8. Быў асенні надвячорак, адзін з тых нячастых, якія здараюцца такой парою, калі вялікае бякла-чырвонае сонца на шыза-зеленаватым небе нагадвае жывы шар. Гэты шар, здавалася, вось-вось набрыняе цяжкай ружовістасцю і тады не ўтрымаецца на нябесным полазе, сарвецца каля далягляду, упадзе на вострыя вяршаліны цёмна-блакітнага лесу, праколецца і залье ўсё навокал густой вязкай бронзай.

У такі надвячорак усё быццам падказвае – блізіцца пара па-сапраўднаму халодных начэй: і гэтае сонца, што нязвыкла хутка коціцца да далягляду, пакідаючы на крохкім небе бела-ружовыя драпіны, і сшэрхлая жоўтая трава, якую ўжо апоўдні акрапляе дробная халодная іскрыстая раса, і пажухлыя, яшчэ не аголеныя кроны дрэў, і парывісты сіверны вецер, што час ад часу ўзнімае на рачной плыні дрогкае рабаціння.

Усё гэта бачыў і разумеў Чалавек, які доўга і нерухома стаяў з вудай на беразе ракі. Часам ён рэзка вышморгваў з вады кручок і, нават не глянуўшы на яго, ці засталося там што, кароткім спрактыкаваным узмахам ад сябе кідаў назад, хоць ведаў, наўрад ці і зараз тузанецца паплавок, нырне пад ваду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Часам ён нібы безуважна назіраў на крохкую, ледзь прытуманеную лугавую далячынь. Яна адкрывалася адразу за ракой і здавалася заціснутай з аднаго боку вострым кутам сасновага лесу, абгароджанага высокім шчыльным зялёным плотам, а з другога – пагоркам, парослым куртатымі жоўта-зялёнымі дрэвамі, за якімі адзінока паблісквала бляшаная страха нейкага прыватнага дачнага доміка.

Калі вочы стамляліся ад аднаго малюнка, Чалавек пераводзіў позірк на раку, якая ля пагорка крута паварочвае, выгінаецца паўз яго, бяжыць краем лугу. Тады яму здавалася, што гэтая халодная па колеры, звілістая шырокая стужка, па якой вечаровае сонца шчодра рассыпала залацістыя бліскаўкі, рассоўвае сасновы лес і пагорак, нібы вызначае кожнаму з іх сваё месца на зямлі.

І яшчэ думалася: напэўна, людзі не ведаюць, што ўсяму на свеце: кожнаму дрэўцу і пагорку, кожнай лугавіне і кожнай жывой істоце, вядома ж, і чалавеку – яшчэ да нараджэння Усявышнім вызначана сваё месца. (298 слоў)

Уладзімір Саламаха. “Апазнаецца асоба мужчыны…”

10. Напэўна, адна з самых балючых страт для чалавека – страта малой радзімы, кроўнай сувязі з ёю, страта сваіх каранёў, той жывільнай энергіі і чысціні, якімі поўняць нас родная зямля і самыя блізкія людзі. Таму хочацца яшчэ і яшчэ раз азорыцца святлом маленства, пакланіцца чароўнай вёсачцы, мілым, дзівосным краявідам і наталіць душу іх хараством.

Залаты куток майго дзяцінства, блакітныя арэлі маіх мар, надзей і памкненняў – невялічкая вёска Заброддзе, што на Быхаўшчыне. Тыя мясціны, дзе ўсё напаўняла душу разнастайнымі фарбамі і адценнямі, гукамі і пахевамі, ахінала мудрасцю і красой, трывогамі і перажываннямі. Тыя сцяжынкі і дарожкі, якія тысячы разоў вымерваў басанож, па якіх пайшоў затым у няпростае, але вельмі цікавае самастойнае жыццё. Тыя звычайныя, цягавітыя, цярплівыя і добрыя людзі-аднавяскоўцы, і найперш – мае бацькі, ад якіх я ўзяў з сабой у дарогу шчырасць, апантанасць, сілу волі, прагу ведаў, трываласць духу, веру ў дабро і справядлівасць, настойлівасць у працы, павагу да руплівых людзей, любоў да Бацькаўшчыны…

Маё дарагое Заброддзе налічвала тады 33 двары, хаты і пабудовы патаналі ў густой зеляніне садоў і алей. Збоку ад бойкай дарогі на Быхаў вёска нагадвала дзівосны аазіс на ўзгорку, заварожваючы кожнага, хто трапляў у яе, сапраўдным зялёным раем. Вясной у палісадах тут разлівалася чаромха, струменіўся шматколернымі фантанамі бэз, а сады, здавалася, аж да самага неба дыхалі густым духмяністым водарам, здзіўлялі наваколле ўрачыстай белізной. Улетку пад вокнамі стракатліва і ўзнёсла палымнелі кветкі: вяргіні, півоні, рамонкі, наготкі… Звінела, нібы цурчэла, саладжавае паветра, гулі пчолы, нацягваючы тысячы зумкіх струн ад вулляў да мядовых ліп і назад. А вакол вёскі каласілася жыта, сінеў і гайдаўся, нібы марскія хвалі, лён, лапушылася бульба, цвіла грэчка… А далей – клікалі сваімі непаўторнымі кілімамі шаўкавістыя лугі і вабіла гаючай вадой рэчка Грэза… І ў гэтым багатым разліве акварэляў і музыкі свет часта ўяўляўся мне бясконцай, дзівоснай казкай, хваляваў, радаваў, абуджаў уражлівую дзіцячую душу, назаўсёды высяваючы ў ёй спагаду і замілаванасць.

Міхась Пазнякоў. “І роднай вёсцы пакланюся”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

12. Вячэрні змрок хутка наступаў на Заблудную лукавіну. Некалькі хвілін таму на вершаліны векавых дубоў яшчэ іскрыліся жаўтаватым жнівеньскім лісцем у сонечных промнях, і вось цені-шчупальцы ад галінак цягнуцца да зямлі. Кусты, што запаланілі гэты ўскраек зямлі, пачалі проста на вачах распаўзацца, расплывацца, ператвараючыся ў зменлівыя хісткія прывіды. З бакоў Заблудную лукавіну ўзяла ў клешчы рака Мнюта. Яе чыстая празрыстая вада адгарадзіла невялікі лапік зямлі як не ад усяго свету, пакінуўшы толькі вузкі праход у адным месцы.

Пасярод векавых дубоў ураслі ў зямлю два вялікія камяні-валуны. Адзін, што крыху меншы, быў над самым берагам ракі і, падточаны знізу паводкамі, кожную вясну мог зваліцца ў раку. Другі, большы, падобны на калматага агромністага мядзведзя, які толькі ўзняў морду, каб агледзець наваколле пасля зімовай спячкі, ды, бы зачараваны, так і застыў на стагоддзі. Камень-мядзведзь зялёны, з нейкім бурштынавым адлівам. Праўда, адзін бок чорны, але не ад прыроды, а ад дыму вогнішчаў, што кожны вечар палілі тут сябры – Віцька, Цімка і Пятрусь. Заблудная лукавіна, гэтыя валуны, векавыя дубы, рака – усё было іх месцам, іх маленькім патаемным куточкам, дзе можна рабіць усё, што хочацца… Сюды ніколі не хадзілі дарослыя, лічылі Заблудную лукавіну месцам нядобрым, нават небяспечным.

З надыходам вечара, як толькі знікала над Замкавай гарой сонца, Заблудная лукавіна ажывала. З боку невялікага балота, куды сябры ніколі блізка не падыходзілі, калі-нікалі даносіліся глухія гукі, бы ***хтосьці*** цяжка ўздыхаў і клікаў на дапамогу. У гэтыя моманты сябры бліжэй падсоўваліся да цяпельца, гаварылі толькі шэптам. Часам здавалася, што разам са стогнам сіліўся ўзняцца на лапы і камень-мядзведзь, але нешта вельмі моцна трымала яго, не адпускала. Сябры ведалі, што гэта стогне багна. Раней сябры ніколі не заставаліся да ночы на лукавіне, баяліся. Але ж паляцелі ў космас Гагарын, Цітоў, а яны баяцца ноччу быць у Заблудцы… Пад вялікім сакрэтам вырашылі рыхтавацца таксама да палётаў у космас і перш-наперш набрацца смеласці, пазбавіцца ад розных страхаў. Вырашана – зроблена. (304 словы)

Віктар Праўдзін. “Хто наступны?”

14. Паводле Георга Зімеля, нямецкага філосафа, у свеце зрокавых вобразаў не існуе нічога, што падобна да твару чалавека. Вочы і пагляд маюць вялікае значэнне, асабліва ў жывапісе. Вочы перадаюць адухоўленасць асобы. Гэта сапраўды “вокны душы”. Праз вочы перадаецца псіхалагічны стан чалавека, у іх адбіваецца кожная падзея, перажыванні, унутраны стан чалавека. Імпульс вачэй, пагляду даносіць да нас магутную сілу духу.

Вочы бываюць розныя. Далікатная, вытанчаная прыгажосць міндалепадобных вачэй патрабуе ў малюнку дакладнасці ліній, плаўнасці і мяккасці формы. Інакш трэба маляваць выпуклыя вочы, зусім па-іншаму – вочы, якія глыбока пасаджаны ці “праваліліся”, а яшчэ ж ёсць круглыя вочы… І нават квадратныя! Вядома, апошнія – умоўнасць, ужытая мастаком, каб у грубай форме перадаць пэўныя характарыстыкі асобы. Вочы ў праменьчыках маршчынак або ў атачэнні глыбокіх маршчын-разорак, або з мяшкамі, прыпухлымі павекамі. Вочы з вузкім разрэзам, як бы прыплюснутыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на твары, і г.д. Кожны народ мае свае этнічныя адметнасці тыпу вачэй – разрэз, форма, колер, прапарцыянальныя суадносіны з астатнімі часткамі твару.

Вочы мастаку пазнаваць усё сваё жыццё. Вочы чалавека, засяроджанага ў сабе, вочы пустыя, напружаныя. Вочы шчаслівыя, пахмурныя, трагічныя, насмешлівыя, жорсткія, какетлівыя. Вочы закаханыя, гнеўныя, заклапочаныя, хітрыя, разумныя або бязглуздыя, лагодныя або калючыя, спагадныя або асуджальныя. Вочы жывыя або мёртвыя… Пералік характарыстык вачэй, пагляду – бясконцы.

Асобнай увагі патрабуюць вочы дзіцяці, у іх форме, тым, як пасаджаны на твары, іншых адметнасцях закладзены ўжо ад прыроды важныя індывідуальныя характарыстыкі будучай асобы.

Вочы жанчын – асаблівыя, непаўторна прыгожыя і какетлівыя. Зачароўваюць сілай імпульсу жаноцкасці, самой сутнасці жанчыны. Ва ўсіх праявах раскрываюць глыбокі прыродны дар, загадкавасць і невыказнасць пачуццяў. Унікальная па сваёй сіле жаноцкасці, ідэалізацыі “Джаконда” Леанарда да Вінчы, створаная прыкладна ў 1510-1515 гадах. Вочы “Джаконды” – насмешлівыя і высакамерныя, у іх прыцягальная сіла і разбуральная недаступнасць. (297 слоў)

Віктар Альшэўскі. “Пачуццё раўнавагі, альбо час узыходзячага сонца”.

16. Спеўныя смалістыя бары з зязюльчыным кукаваннем і дзятлавай марзянкай; заваложаныя смугой цяністыя гаі з чырвоным россыпам суніц на пагорках і ружовымі лапікамі чабору ўздоўж дарог; невялічкая віхлястая рачулка Пціч, што ціха струменіцца ў прыбярэжных вольхах і вербалозах. Прыгожыя і маляўнічыя мясціны, дзе ў вёсцы Закружка, паблізу ад Мінска, нарадзіўся і выраз Уладзімір Карызна.

Там, у дзяцінстве, ён, вядома, не мог угадаць свой жыццёвы лёс – проста блукаў у гаях і дубровах, купаўся ў лугавых травах і красках, пакуль уражлівая, чулая душа не адгукнулася на гэты вечны покліч прыроды. Нарадзіліся вершы, ухвальна ацэненыя знаўцамі паэзіі яшчэ тады, напрыканцы пяцідзясятых гадоў. У маладога паэта выразна акрэслілася свая, уласная тэма: хараство роднай зямлі, яе боль і пакуты, жаданне дарыць радасць і дабрыню. Пра непарыўную сувязь з Бацькаўшчынай сведчаць нават самі назвы яго паэтычных кніг – “Край мой сінявокі”, “Жураўліны досвітак”, “Святло ліўня”, “Цеплыня”, “Цішыня баразны”.

Былі ўжо надрукаваны першыя вершы, і сябры віншавалі маладога аўтара з відавочным поспехам, калі нечакана паэт заўважыў дзіўную рэч: усё уладней яго існасць забіраюць у незваротны палон музыка, беларускія народныя песні. Варта аднойчы было ўбачыць майскі надвячорак з квітнеючымі садамі і глыбокім чыстым небам над галавой, як душа, раптам набыўшы крылы, перапоўнілася чароўнымі гукамі вясны. Магчыма, прычынай таму сталі даўнія матчыны калыханкі, напевы бацькавай балалайкі, вясёлыя і журлівыя песні аднавяскоўцаў. Але, вярнуўшыся ў свой студэнцкі інтэрнат, малады паэт сеў за стол, і здарыўся цуд: усе гэтыя таямнічыя “до-рэ-мі-фа-соліны”, таленавіта рассыпаныя па нотным аркушы, утварылі глыбока лірычную, распеўную мелодыю. Вы, напэўна, здагадаліся, што гаворка ідзе пра вядомую песню Уладзіміра Карызны “Беларусь мая сінявокая”. Так, гэта яна – прыгожая, дужа гарманічная, любімая ў народзе, ды, апроч таго,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыдатная і  для хору, і для асобнага спевака – якасць увогуле характэрная для кожнай цудоўнай песні.  “Беларусь мая сінявокая” надзвычай чароўна гучыць у выкананні жаночага хору – сапраўды заслухаешся. (292 словы)

Віктар Гардзей. “Цёплая, нібы вясны світанне…”

18. Лямпачка цьмяна гарэла недзе ўгары, на чацвёртым ці пятым паверсе, і таму на лесвіцы стаяў прыцемак. Марына павольна пераступала з прыступкі на прыступку, падымаючыся ўсё вышэй і вышэй, і, калі б хто паглядзеў на яе ў гэтую хвіліну, напэўна сказаў бы, што дзяўчына да нечага прыслухоўваецца. Але ў калідоры панавала ціша, сюды ў позні час не далятаў ніводзін гук ні з вуліцы, ні з кватэр вялікага шматпавярховага дома, толькі высокія абцасы Марыніных чаравікоў ступалі па бетоне лесвіцы.

Дзяўчына ўзышла на першую пляцоўку і, глыбока ўздыхнуўшы, прыпынілася, высокая зграбная постаць яе нібы замерла. І зноў можна было падумаць, што дзяўчына імкнецца штосьці пачуць у гэтай густой цішы, імкнецца – і не можа, бо адзінае, што чуваць зараз, -- гэта стук уласнага сэрца.

Вядома, шмат па якіх прычынах можа стукаць дзявочае сэрца, асабліва калі ёй толькі дваццаць год. Хоць бы і па той, што ўвесь вечар давялося танцаваць з маладым сімпатычным хлопцам, у якога такое харошае, гучнае імя – Антон.

“Хто ж ён такі, гэты Антон?” – думала Марына, узіраючыся ў акно, якое цяпер было чорнае-чорнае. Там, у акне, нібы ў люстэрку, відзён быў яе твар. Марына бачыла свой высокі адкрыты лоб, крыху задзірысты нос, дзве ямачкі на шчоках, але ўяўленне малявала іншы твар – ягоны, Антонаў. І ёй пачынала здавацца, што з аконнай шыбы на яе пазіраюць і нават трошачкі ўсміхаюцца цёмныя Антонавы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вочы, тыя самыя, што ўвесь вечар сачылі за ёю з-пад броваў, якія амаль сышліся ля пераносся.

Малады чалавек вылучаўся сярод усіх, хто быў у гэты вечар на танцах: на ім быў добра пашыты светла-карычневы гарнітур, у той час як большасць з тых, каго ведала яна, насілі чорныя кіцелі або гімнасцёркі – звычайную форму чыгуначнікаў. Танцаваў малады чалавек вельмі хораша, Марыне было прыемна з ім, і таму, калі ён запрасіў яе на новы танец, яна без вагання дала згоду. (294 словы)

Яўген Васілёнак. "Гаспадыня".

20. На календары яшчэ амаль тыдзень да восені, але сонца, заходзячы ў чырвані, вяртаецца на зямлю белым, белымі іскрамі прыпадаюць ужо ў нізінах да траў прымаразкі. Падобна да таго, што само сонца б'ецца спякотнымі промнямі аб скамянелую зямлю, высякае гэтыя іскры, белы халодны жар. Па-іншаму ніяк і не растлумачыць таго, што адбываецца: удзень паліць – спасу няма, а ўначы выстуджвае. І месяц над вёскай увесь час у венчыку, у касыначцы – на добрае надвор'е, на спёку і холад.

Раней за адведзены ім час, ці то на бясхлебіцу, ці то прадчуваючы халады, збіраюцца ў цёплыя краіны буслы, як не сотні збілася іх на сенажаці, каб пагаманіць апошні раз на роднай зямлі. Што ні кажы, калгасны сход, гэткае наўгародскае веча, нібыта з вякоў векавечных паўсталі з зямлі дзяды і прадзеды – сівыя, босыя. Няспешна, спаважна ўглядаюцца ў высокае чыстае неба, махаючы яму крыламі: пачакай, маўляў, неба, паспеецца, пакуль што абмяркуем зямное.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Толькі на самоце, калі на душы бусла спакойна і ціха, калі, распластаўшы ружовыя на сонцы крылы, выбліскваючы кожным пяром, падрульвае ён задубелымі доўгімі нагамі да сваёй буслянкі, вітальнай песняй адзначае сваё вяртанне з далёкіх краін. Калі на дасвецці выйдзе ён на родныя гоні – палі, дубровы, сенажаці – і кіне яго ў жар і холад ад няўпыннасці і бясконцасці жыцця і зямлі, тады, не памятаючы сябе, адкінуўшы сціпласць і сарамяжлівасць, безгалосы, зацягне ён сваю, хоць і не зусім удалую, але радасную, шчырую песню нараджэння новага дня. А дзень бусла, як і сялянскі, спрэс у працы. Нібыта каморнік, мерае ён балота, падоўгу ўглядаецца сумным вокам у нікуды ці то імкнецца зазірнуць, што там, за даляглядам, ці то засяродзіць свой позірк у сабе, слухае шапаценне мяцёлчатых і вастралістых траў, як здатны слухаць гэтыя травы сівы дзед-паляшук. (277 слоў)

Віктар Казько. “Неруш”.

22. Па сабе ведаю, што нейкія цэлыя падзеі, карціны-вобразы выклікаюцца, скажам, павевам у паветры свежавымытай бялізны, развешанай марозным сонечным днём на вяроўках сушыцца. Якія асацыяцыі будзіць адзін гэты пах? У мяне чамусьці – вострую свежасць агурочнага цвету і завязь першых агуркоў на градах, пазней далучалася адчуванне свежасці толькі што разрэзанага свежага кавуна.

А тонкі, невыказна ўражлівы цнатлівасцю сваёй расіста-жамчужнай чысціні пах ландыша! Цяпер, на старасці год, пачуць яго – гэта падзея, роўная для мяне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

далучэнню да вялікага душэўнага прасвятлення, як пачуць, скажам, раптоўны сярэбраны россып салаўінага рэха.

Пах і слых будзяць, жывяць і замацоўваюць у памяці падзеі і вобразы, якія па сваёй духоўнай сутнасці вельмі нечым дарагія для кожнага з нас. Многія дзясяткі год не магу забыць і ніколі не забудуся, як пасля вайны, прыехаўшы ў свае Еўлічы, адвячоркам на захадзе сонца я ішоў наведаць магілу бацькі. Свой настрой і думкі ў тую хвіліну я запомніў, мабыць, таму, што ўрэзаўся мне ў памяць пах цёплай раллі. Цішыня і некалькі нястройных жаночых галасоў, якія няўпэўнена спрабавалі падняць над полем песню, не столькі зрокавыя і слыхавыя прыкметы роднага мне краявіду, але, відаць, эмацыянальныя асацыяцыі. Яны замацавалі ў памяці і мой настрой, і развагі, што былі асабліва дарагімі і важнымі для мяне ў тыя хвіліны. Пра што я думаў, да якіх пачуццяў далучаўся душою – пра гэта пазней былі напісаны вершы “Край гасцінца” і “Ядлоўцавы куст”.

Першыя замаразкі мне заўсёды пахнуць чыстай, свежавымытай палатнянай тканінай – настольнікамі, ручнікамі, прасцінамі.

Памятаю, як зласловілі калісьці крытыкі і парадысты над Кузьмой Чорным, праз усю творчасць якога праходзіць вострае адчуванне паху зямлі, асабліва ў ранніх яго апавяданнях і раманах. Колькі там пахаў – усюды і скрозь! Для даследчыка, глыбокага псіхолага гэты наш пісьменнік у многіх сваіх гранях – скарб у аспекце спазнання псіхалогіі творчасці і сігнальнай сістэмы мыслення і памяці. (286 слоў)

Васіль Вітка. “Вузельчык на памяць”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

24. Добрае пачуццё поўніла Аленку, калі яна, развітаўшыся з маці, пайшла з цэха. І было шкада, што трэба ісці, і яна сказала сабе, што прыйдзе сюды зноў, што, мажліва, увогуле будзе калі-небудзь тут працаваць.

Аленка выйшла на ганак і з вышыні яго ўбачыла горад, заліты вечаровымі агнямі, чорна-бліскучыя шаты таполяў усцяж тратуараў і за імі незвычайна лёгкую, бы не важкую зусім, ажурную арку моста. Над галавой белым глобусам вісеў плафон, і ў святле яго Аленка нечакана заўважыла, што рукавы кофтачкі зырка і пераліўіста зіхацяць ад мноства танюткіх маленькіх зорачак, падобных на сняжынкі. Аленка паспрабавала ўзяць адну з іх, дакранулася, але пальцы нават не адчулі дотыку шкла.

Аленка ішла па вуліцы, і на вуліцы таксама гарэлі электрычныя ліхтары, і ад іх святла, толькі цяпер больш цьмяна, зіхацелі шкляныя ніці-павуцінкі на рукавах кофтачкі. І хоць ніхто не звяртаў на Аленку ўвагі, ёй, аднак, здавалася, быццам усе ведаюць, што яна працавала сёння на заводзе, бо бачаць зіхатлівае павуцінне на яе адзенні.

На мосце Аленка прыпынілася, зірнула на ваду, у якой адбіваліся ярка асветленыя заводскія карпусы, падобныя на дзівосны карабель, і адчувала сябе часцінкаю таго вялікага і цікавага жыцця, што ішло за асветленымі вокнамі завода.

Аленка раптам адчула: яна пачынае разумець маці так, як не разумела ніколі дагэтуль. Быццам з вышыні, але дужа ясна і выразна ўбачыла розныя дробязныя нязгоды, што часам былі ў яе з маці, адчула нікчэмнасць тых сваіх патрабаванняў, адчула сваю вінаватасць. І тут жа ўявіла сабе школу, будучы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вечар, на якім давядзецца выступаць, і падумала пра тое, што ёй цяпер ёсць пра што расказаць, што яна будзе расказваць доўга і гэтае яе апавяданне будзе самае цікавае, бо наўрад ці ёсць дзе праца цікавейшая, чым тая, якую робіць яе маці. (278 слоў)

Алесь Савіцкі. “Шкляная нітка”.

26. Груша-дзічка – мой пропуск у дзяцінства. Як забаронны знак, як перасцярога, як стоп-сігнал спачатку выплывае гэты малюнак, і толькі потым расчыняецца брама ў далейшыя ўспаміны, найперш усё-такі звязаныя з гэтым дрэвам пасярод поля.

Як бы ні мільгацелі за акном краявіды, перад маімі вачыма быў адзін, той: зялёная груша-дзічка пасярод жоўтага поля. Па некалькі метраў вакол дзічкі трактарысты не заворвалі, пакідалі лапік зямлі, які заўсёды ярка зелянеў густою, упартаю травой. Колькі б мы ні тапталі яе, як бы ні зміналі, яна ўставала, адыходзіла за ноч і да самай зімы заставалася нязменнаю. Здавалася нават, што і пад снегам не адмірала яна зусім, бо з ранняй вясны была тут высокаю і зялёнаю, як нідзе.

Дзічка была ў камлі тоўстаю – мы ледзь-ледзь абдымалі яе, узяўшыся за рукі, і ад самай зямлі пачыналася ў ёй і цягнулася метраў на два дупло. Некалі нехта расклаў пад ігрушаю вогнішча і пакінуў яго – мо хто з трактарыстаў, якім абрыдла абворваць дрэва, а мо хтосьці проста забыўся патушыць агонь. Але груша не здалася, здужала і жыла з дуплом. Вось у гэтае дупло і любілі мы хавацца, калі гулялі ў хованкі. Усе пра яго ведалі і, нягледзячы на тое, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

шукаць ішлі  найперш сюды, кожны раз некалькі хлопцаў кідалася да дупла. Унутры дупло было чорным, аднак сажа ўжо не бралася, бо вышмальцавалася-выслізгалася да бляску. Дупло было скразное, навылёт, а значыць, мела два ўваходы-выхады, і ў таго, хто хаваўся ў ім, заўсёды быў шанц выскачыць непазнаным і перагнаць таго, хто шукае.

Праязджаючы паўз сваю вёску, якая хавалася за лесапаласою, я хацеў угледзець з акна вагона дзічку, узіраўся пільна, аднак не ўбачыў з-за дрэваў нават ніводнае хаты. Захваляваўся, але адразу ж супакоіў сябе: сцяжына ў бок вёскі пратаптана. Значыць, вёска жыве, а раз жыве вёска, то павінна жыць і дзічка. (287 слоў)

Барыс Пятровіч. “Успамін. Дзічка”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

28. Навадзвінск, узгор’е, латарэйны, жэтон, чарапіца, сямейны, трыдзясяты, бяссэнсіца, ясянёвы, маламетражны, Паўднёва-Афрыканскі рэгіён, маральна ўстойлівы чалавек, Ханты-Мансійск, прэс-рэклама, свежаскошаны, ва ўніверсітэце, аўкцыяніст, князь усемагутны, бацька-ўзбек, радыус, Алеуцкія астравы, мележаўскі стыль, Купалаўскія чытанні, 8 Сакавіка, Сімяон Полацкі, Афанасьеў, Лавуазье, альянс, п’еса, агеньчык, ваенна-марскі, ваеннаабаронча, астрашыцкагарадоцкі, чалавека-год, обер-кандуктар, Ушаччына, птушыны, вінны, задуменны, зубрыны, наўскід, увечары, як след, дзе-нідзе, па-воўчы, няпраўда, ні з кім, колькі не горшы, не горшы за брата, аніхто.

30. Глытаць, усходазнавец, Новарасійск, марозны, эдэльвейс, алегорыя, Складоўская-Кюры, няўцешна, егіпецкі, дзясяцкі, фітабіялогія, Цянь-Шань, паўночнаасецінскі, белапольскі, бела-ружовы, рабаўладальнік, дачка-ўцеха, на Ушачы, 9 Мая, купалаўскія радкі, Баркалабаўскі летапіс, кальe, пісьменнік, дзве, рэльеф, каменьчык, вэб-старонка, літаратуразнаўчы, ледзь улоўны, глыбакадумны, глыбока ўскапаны, Полаччына, драўляны, палымяны, каменны, цемянны, без разбору, надвое, на памяць, як-ніяк, у пару, невысокі, ні ў кога, непрыяцель, далёка не поўны, не раней чым заўтра.

**ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ**
**ВМК ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ**

## “АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”

### Тлумачальны каментарый

ВМК па дысцыпліне **“Актуальныя праблемы беларускай мовы”** прызначаны для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін.

Асноўная **мэта выкладання дысцыпліны** – развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне будучых спецыялістаў-філолагаў; выпрацаваць уменні і навыкі практычнай рэалізацыі атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці; садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў, здольных паспяхова вырашаць праблемы функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму; выхаваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

ВМК “Актуальныя праблемы беларускай мовы” займае важнае месца ў сістэме лінгвістычнай падрыхтоўкі студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, з’яўляецца дадатковай базай для грунтоўнага засваення беларускай мовы. Пры вывучэнні дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і цесная сувязь яго з ВМК іншых лінгвістычных прадметаў і, у першую чаргу, з ВМК па дысцыпліне “Сучасная беларуская літаратурная мова”.

Прапанаваны дапаможны раздзел уключае (згодна “Палажэння аб вучэбна-метадычным комплексе на ўзроўні вышэйшай адукацыі” пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь) элементы вучэбна-праграмнай дакументацыі па спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура, у прыватнасці, базавую вучэбную праграму, рабочыя вучэбныя праграмы, пералік вучэбных выданняў і інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_______________ У.У. Шлыкаў
“_____” ______________ 2013 г.
Рэгістрацыйны № УД _____ /баз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:**
1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура

2013 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
Нямковіч Н.М., дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Мароз С.С., дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Радзіваноўская Н.А., дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Ржавуцкая М.С., дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Урбан В.В., дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Кудраватых І.П., загадчык кафедры культуры маўлення і міжкультурных камунікацый установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, доктар філалагічных навук, прафесар;
Іватовіч-Бабіч В.Т., дацэнт кафедры славянскіх моў установы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № __ ад _____________ 2013 г.);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № __ ад _____________ 2013 г.);

Адказны за рэдакцыю: Д.В. Дзятко

Адказны за выпуск: Д.В. Дзятко

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па дысцыпліне **“Актуальныя праблемы беларускай мовы”** прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін. У вучэбнай праграме ўлічаны наступныя патрабаванні адукацыйнага стандарту. Характэрнымі рысамі праграмы з'яўляюцца: акцэнтаванне на кампетэнтнасным падыходзе да навучання, значнае ўзмацненне ролі і месца самастойнай працы студэнтаў, выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій. У межах супрацоўніцтва выкладчыка і студэнта праграма выступае своеасаблівым арыенцірам у працэсе набыцця ведаў, разнастайнай інфармацыі, атрымання практычных уменняў.

Асноўная **мэта выкладання дысцыпліны** – развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне будучых спецыялістаў-філолагаў; выпрацаваць уменні і навыкі практычнай рэалізацыі атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці; садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў, здольных паспяхова вырашаць праблемы функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму; выхаваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

**Задачы вывучэння дысцыпліны:**

– даць навукова абгрунтаваныя тэарэтычныя звесткі па дысцыпліне;

– азнаёміць студэнтаў з рознымі напрамкамі і канцэпцыямі ў беларускай лінгвістыцы, паказаць дыскусійнасць асобных меркаванняў і падыходаў у дачыненні да класіфікацыі моўных адзінак;

– раскрыць заканамернасці функцыянавання беларускай мовы як складанай шматузроўневай сістэмы;

– сфарміраваць устойлівыя навыкі аналізу моўных фактаў;

– спрыяць авалоданню літаратурнымі нормамі сучаснай беларускай мовы;

– развіць і ўмацаваць навыкі практычнага карыстання мовай;

– прывіць навыкі самастойнай работы;

– садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых спецыялістаў, здольных крытычна думаць і практычна выкарыстоўваць набытыя веды пры вывучэнні спецыяльных мовазнаўчых дысцыплін.

Курс “Актуальныя праблемы беларускай мовы” займае важнае месца ў сістэме лінгвістычнай падрыхтоўкі студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, з’яўляецца дадатковай базай для грунтоўнага засваення беларускай мовы. Пры вывучэнні дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і сувязь яго з іншымі лінгвістычнымі прадметамі, у першую чаргу з сучаснай беларускай літаратурнай мовай, а таксама з уводзінамі ў мовазнаўства і агульным мовазнаўствам.

**Патрабаванні да ведаў і ўменняў:** у выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць:**

– месца і ролю беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці моў;

– выдатных дзеячаў беларускага мовазнаўства і іх асноўныя навуковыя працы;

– галоўныя навуковыя праблемы сучаснай беларускай мовы і перспектыўныя шляхі іх вырашэння;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– навуковую і даведачную літаратуру па беларускай мове;

**умець:**

– адбіраць, аналізаваць і сістэматызаваць моўныя факты;

– праводзіць самастойныя лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады;

– весці пошук і аналіз неабходнай інфармацыі з розных крыніц, у тым ліку са слоўнікаў, з мэтай падрыхтоўкі вусных паведамленняў і рэфератаў;

– выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы;

**валодаць**: нормамі сучаснай беларускай мовы, асновамі культуры беларускага маўлення, якое ажыццяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах, навыкамі лінгвістычнага разбору моўных адзінак на ўсіх узроўнях моўнай сістэмы, навыкамі маўленча-камунікатыўнай дзейнасці.

На вывучэнне дысцыпліны “Актуальныя праблемы беларускай мовы” ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці адводзіцца ўсяго 494 гадзіны, з іх аўдыторных – 270 гадзін. На завочнай форме атрымання адукацыі ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці адводзіцца 72 аўдыторныя гадзіны. З мэтай павышэння якасці навучання ў педагагічны працэс неабходна ўключыць 2 пісьмовыя работы на семестр.

РЕПОЗИТОРИЙ

## Прыкладны тэматычны план

| № | Назва тэмы | Усяго аўдыторных гадзін | Лекцыйныя | Практычныя |
|---|---|---|---|---|
| **1.** | **Уводзіны** | **6** | **2** | **4** |
| 1.1. | Нацыянальная мова як гістарычная катэгорыя | 6 | 2 | 4 |
| **2.** | **Лексікалогія** | **50** | **10** | **40** |
| 2.1. | Слова як адзінка лексічнай сістэмы | 4 | 2 | 2 |
| 2.2. | Сістэмна-семасіялагічная ха-рактарыстыка лексікі | 4 | | 4 |
| 2.3. | Асобныя слоўныя апазіцыі ў межах ЛСК | 8 | 2 | 6 |
| 2.4. | Сінанімія як моўная з’ява | 6 | 2 | 4 |
| 2.5. | Семантычная класіфікацыя антонімаў | 6 | 2 | 4 |
| 2.6. | Класы слоў як з’ява лексічнай парадыгматыкі | 4 | | 4 |
| 2.7. | Гісторыка-этымалагічная ха-рактарыстыка беларускай лек-сікі | 6 | 2 | 4 |
| 2.8. | Лексіка беларускай мовы з пункту гледжання сфер яе вы-карыстання | 4 | | 4 |
| 2.9. | Сацыялінгвістычная сістэма-тызацыя беларускай лексікі | 6 | | 6 |
| 2.10 | Лексіка актыўнага і пасіўнага запасу | 2 | | 2 |
| **3.** | **Фразеалогія** | **6** | **2** | **4** |
| 3.1. | З гісторыі вывучэння | 6 | 2 | 4 |
| **4.** | **Лексікаграфія** | **4** | **2** | **2** |
| 4.1. | Стан, праблемы і кірункі су-часнай беларускай лексіка-графіі | 4 | 2 | 2 |
| **5.** | **Фанетыка. Фаналогія** | **6** | | **6** |
| 5.1. | З гісторыі вывучэння фанеты-кі і фаналогіі | 2 | | 2 |
| 5.2. | Фаналагічная характарыстыка гукаў у залежнасці ад пазіцый у слове | 4 | | 4 |
| **6.** | **Арфаграфія** | **4** | **4** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 6.1. | З гісторыі беларускай арфаграфіі | 2 | 2 | |
| 6.2. | Цяжкія выпадкі напісання | 2 | 2 | |
| **7.** | **Марфеміка** | **6** | **2** | **4** |
| 7.1. | Аспекты вывучэння марфемікі | 6 | 2 | 4 |
| **8.** | **Словаўтварэнне** | **14** | **4** | **10** |
| 8.1. | Адзінкі словаўтварэння | 14 | 4 | 10 |
| **9.** | **Граматыка. Марфалогія** | **74** | **30** | **44** |
| 9.1. | Асноўныя граматычныя паняцці і адзінкі | 6 | 2 | 4 |
| 9.2. | Слова як адзінка марфалогіі | 6 | 2 | 4 |
| 9.3. | Граматычны статус назоўніка | 6 | 2 | 4 |
| 9.4. | Асноўныя граматычныя катэ-горыі ўнутры катэгорыі на-зоўніка | 6 | 2 | 4 |
| 9.5. | Граматычны статус прыметніка | 8 | 4 | 4 |
| 9.6. | Граматычны статус лічэбніка | 4 | 2 | 2 |
| 9.7. | Граматычны статус займенніка | 6 | 2 | 4 |
| 9.8. | Граматычны статус дзеяслова | 8 | 4 | 4 |
| 9.9. | Граматычны статус прыслоўя | 10 | 4 | 6 |
| 9.10. | Лінгвістычны статус безасабова-прэдыкатыўных слоў | 4 | 2 | 2 |
| 9.11. | Граматычны статус службовых часцін мовы | 10 | 4 | 6 |
| **10.** | **Сінтаксіс** | **100** | **34** | **66** |
| 10.1. | Аспекты вывучэння сінтаксісу | 6 | 2 | 4 |
| 10.2. | Словазлучэнне | 6 | 2 | 4 |
| 10.3. | Просты сказ | 4 | | 4 |
| 10.4. | Прэдыкатыўная аснова двухсастаўнага сказа | 6 | 2 | 4 |
| 10.5. | Даданыя члены сказа | 8 | 2 | 6 |
| 10.6. | Аднасастаўныя сказы | 10 | 2 | 8 |
| 10.7. | Сінтаксічна непадзельныя ска-зы | 2 | 2 | 2 |
| 10.8. | Няпоўныя і эліптычныя сказы | 2 | 2 | |
| 10.9. | Ускладнены просты сказ | 8 | 2 | 6 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 10.9.1. | Класіфікацыя адасобленых членаў | 2 | 2 | |
| 10.9.2. | Пабочныя канструкцыі | 6 | 2 | 4 |
| 10.9.3. | Устаўныя канструкцыі | 6 | 2 | 4 |
| 10.9.4. | Далучальныя канструкцыі | 4 | 2 | 2 |
| 10.10. | Складаны сказ | 6 | 2 | 4 |
| 10.10.1. | Складаназлучаны сказ | 6 | 2 | 4 |
| 10.10.2. | Складаназалежны сказ | 6 | 2 | 4 |
| 10.10.3. | Складаныя злучнікавыя сказы прамежкавага, або пераход-нага, тыпу | 6 | 2 | 4 |
| 10.11. | Камунікацыйны аспект сказа | 4 | 2 | 2 |
| | **Усяго:** | **270** | **90** | **180** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

1. **Уводзіны**. Мэта і задачы курса. Сувязь з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі.

1.1. *Нацыянальная мова як гістарычная катэгорыя.* Нацыянальная мова як сістэма. Кампаненты сучаснай беларускай нацыянальнай мовы. Навуковыя дасягненні вядомых беларускіх лінгвістаў.

Беларуская літаратурная мова на сучасным этапе. Беларуская мова як першааснова нацыянальнай культуры.

2. **Лексікалогія.** Асобныя разнавіднасці лексікалогіі. Аспекты вывучэння лексікалогіі.

2.1. *Слова як адзінка лексічнай сістэмы.* Праблема азначэння слова. Праблема лексічнага значэння слова. Праблема мнагазначнасці слова. Пытанні аб упарадкаванні тыпаў лексічных значэнняў мнагазначнага слова.

2.2. *Сістэмна-семасіялагічная характарыстыка лексікі*. Праблема сістэмнай арганізацыі мовы ў сучаснай лінгвістыцы. Парадыгматычныя адносіны ў лексіцы. Фармальна-семантычная структура слова. Асноўныя тыпы слоўных апазіцый па семемах і лексемах.

2.3. *Асобныя слоўныя апазіцыі ў межах лексіка-семантычных катэгорый.* Амонімы, якія паявіліся ў выніку выпадковага супадзення спрадвечна розных слоў. Словаўтваральныя амонімы. Семантычныя (гамагенныя амонімы). Аманімія па дэнатату. Аманімія па сігніфікату.

2.4. *Сінанімія як універсальная моўная з’ява*. Праблема азначэння сінонімаў у лінгвістычнай літаратуры. Пытанне аб абсалютных сінонімах.

2.5. *Семантычная класіфікацыя антонімаў.* Антонімы, якія выражаюць якасную процілегласць. Камплементарныя антонімы. Антонімы, якія выражаюць супрацьлеглую накіраванасць дзеянняў, уласцівасцей, прымет. Антонімы-канверсівы. Энантасемія.

2.6. *Класы слоў як з’ява лексічнай парадыгматыкі*. Паняцце класа слоў. Тыпалогія класаў. Прадметна-тэматычныя групы слоў (ПТГ). Лексіка-семантычныя групы (ЛСГ). Семантычныя палі.

2.7. *Гісторыка-этымалагічная характарыстыка беларускай лексікі.* Спрадвечная лексіка. Лексіка перыяду беларускай народнасці. Лексіка перыяду беларускай нацыі. Роля народных гаворак ва ўзбагачэнні лексікі літаратурнай мовы.

Разнавіднасці іншамоўнай лексікі. Прычыны запазычвання іншамоўнай лексікі. Шляхі пранікнення і спосабы ўвядзення іншамоўных слоў у беларускую мову.

2.8. *Лексіка беларускай мовы з пункту гледжання сфер яе выкарыстання*. Дыялектная лексіка. Пытанне аб узаемадзеянні літаратурнай мовы і народных гаворак у беларускім мовазнаўстве. Узаемадзеянне тэрміналагічнай лексікі з агульнаўжывальнай лексікай беларускай мовы. Наменклатурныя назвы. Адрозненні паміж тэрмінамі і прафесіяналізмамі.

2.9. *Сацыялінгвістычная сістэматызацыя сучаснай беларускай лексікі*. Паняцце стылю і стылістычных сродкаў. Кароткая характарыстыка стыляў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Афіцыйна-дзелавы стыль. Навуковы стыль. Публіцыстычны стыль. Мастацкі стыль. Гутарковы стыль. Стылістычныя сродкі лексікі. Экспрэсіўная лексіка.

2.10. *Лексіка актыўнага і пасіўнага запасу.* Паняцце аб актыўным запасе лексікі. Паняцце аб пасіўным запасе лексікі.

3. **Фразеалогія**. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Змест фразеалогіі, прадмет вывучэння.

3.1. *З гісторыі вывучэння фразеалогіі.* Аспекты даследавання фразеалагічнага фонду беларускай мовы.

Аналіз фразеалагічных адзінак.

4. *Лексікаграфія.* Лексікаграфія як раздзел мовазнаўства. Змест лексікаграфіі, прадмет вывучэння.

4.1. *Стан, праблемы і кірункі сучаснай беларускай лексікаграфіі*. Даследаванні ў галіне гісторыі беларускай лексікаграфіі. Распрацоўка тыпалогіі слоўнікаў у сучаснай лнгвістыцы.

Аналіз слоўнікаў розных тыпаў (аднамоўных, двухмоўных, шматмоўных).

5. *Фанетыка. Фаналогія*. Прадмет і задачы фанетыкі, прадмет і задачы фаналогіі.

5.1. *З гісторыі вывучэння фанетыкі і фаналогіі*. Даследаванні фанетычнай сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Даследаванні фанетычнай сістэмы беларускай дыялектнай мовы.

5.2. *Фаналагічная характарыстыка гукаў у залежнасці ад пазіцый у слове*. Фаналагічная характарыстыка галосных гукаў у залежнасці ад пазіцый у слове. Фаналагічная характарыстыка зычных гукаў у залежнасці ад пазіцыі ў слове.

6. *Арфаграфія.* Прадмет і задачы арфаграфіі. Сувязь арфаграфіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства.

6.1. *З гісторыі беларускай арфаграфіі*. Станаўленне і развіццё сучаснай беларускай арфаграфічнай сістэмы.

6.2. *Цяжкія выпадкі напісання*. Перадача акання на пісьме. Правапіс **а, о, э** ў складаных словах. Перадача якання на пісьме. Правапіс **е**, **ё**, **я** ў складаных словах. Правапіс **у** і **ў** у словах іншамоўнага паходжання. Правапіс складаных слоў. Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў, блізкіх да прыслоўяў.

7. **Марфеміка**. Марфеміка як раздзел мовазнаўства. Прадмет і задачы марфемікі.

7.1. *Аспекты вывучэння марфемікі* .Паняцце марфемы, аламарфемы, морфа, аламорфа. Тыпалогія марфем.

8. **Словаўтварэнне.** Словаўтварэнне як раздзел мовазнаўства. Прадмет і задачы словаўтварэння. Кірункі даследавання.

8.1. *Адзінкі словаўтварэння*. Утваральная аснова, утваральная база, словаўтваральныя сродкі. Словаўтваральная пара, словаўтваральны ланцужок, словаўтваральная парадыгма, словаўтваральны рад, словаўтваральнае гняздо.

Паняцце словаўтваральнага тыпу і словаўтваральнай мадэлі.

9. **Граматыка. Марфалогія**. Падзел граматыкі на марфалогію і сінтаксіс. Змест і прадмет марфалогіі. Кірункі даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9.1. *Асноўныя граматычныя паняцці і адзінкі.* Граматычнае значэнне, граматычная катэгорыя, граматычная форма, словаформа. Паняцце парадыгмы. Спосабы і сродкі выражэння граматычных значэнняў.

9.2. *Слова як адзінка марфалогіі.* Словы і іх граматычныя групоўкі. Сістэма часцін мовы ў беларускай мове. Дыскусійныя пытанні класіфікацыі часцін мовы ў навуковай літаратуры. Безасабова-прэдыкатыўныя словы (прэдыкатывы). Няпэўна-колькасныя словы. Мадальныя словы. Выклічнік. Гукаперайманні. Звязка.

9.3. *Граматычны статус назоўніка.* З гісторыі вывучэння назоўніка. Прадметна-сэнсавая аснова катэгорыі назоўніка. Лексіка-семантычныя групы назоўнікаў. Узаемадзеянне паміж катэгорыяй назоўніка і катэгорыямі прыметніка, лічэбніка, займенніка, прыслоўя.

9.4. *Асноўныя граматычныя катэгорыі ўнутры катэгорыі назоўніка.* Асноўныя тыпы скланення назоўніка, сфарміраваныя на аснове родавай класіфікацыі. Скланенне асабовых імёнаў, прозвішчаў і геаграфічных назваў.

9.5. *Граматычны статус прыметніка.* Аспекты вывучэння прыметніка. Семантычныя асновы катэгорыі прыметніка. Разрады прыметніка. Узаемадзеянне розных разрадаў прыметніка, недакладнасць межаў паміж імі.

9.6. *Граматычны статус лічэбніка.* З гісторыі вывучэння лічэбніка. Граматычныя асаблівасці катэгорыі лічэбніка ў беларускай мове.

9.7. *Граматычны статус займенніка.* З гісторыі вывучэння займенніка. Займеннік як асаблівы лексіка-семантычны тып слоў. Граматычныя асаблівасці катэгорыі займенніка ў беларускай мове.

9.8. *Граматычны статус дзеяслова.* Шляхі вывучэння дзеяслова ў граматычнай традыцыі. Граматычныя асаблівасці дзеяслова. Пытанне пра стан у лінгвістычнай літаратуры. Узаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць граматычных катэгорый дзеяслова. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як гібрыдныя дзеяслоўныя формы.

9.9. *Граматычны статус прыслоўя.* Традыцыйныя пункты гледжання на прыслоўе. Вызначэнне катэгорыі прыслоўя. Граматычныя асаблівасці прыслоўя.

9.10. *Лінгвістычны статус безасабова-прэдыкатыўных слоў (слоў катэгорыі стану).* Граматычныя асаблівасці безасабова-прэдыкатыўных слоў.

9.11. *Граматычны статус службовых часцін мовы.* З гісторыі станаўлення службовых часцін мовы. Аспекты даследавання. Граматычныя асаблівасці службовых часцін мовы.

**10. Сінтаксіс**. Сінтаксіс як узровень мовы і раздзел граматыкі. Адгалінаванні сінтаксісу.

10.1. Аспекты вывучэння сінтаксісу. Сінтаксічныя адзінкі (сінтаксема, словазлучэнне, сказ, ЗФА і інш.).

10.2. *Словазлучэнне.* З гісторыі вывучэння. Лінгвістычны статус словазлучэння. Перабудова і парушэнне падпарадкавальных сувязей словазлучэння ў кантэксце.

10.3. *Просты сказ.* Аспекты вывучэння сказа. Мадэль сказа і сінтаксічныя пазіцыі. Паняцце прэдыкатыўнасці як асноўнай прыметы сказа. Вербацэнтрычная тэорыя сказа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10.4. *Прэдыкатыўная аснова двухсастаўнага сказа.* Праблема каардынацыі дзейніка і выказніка.

10.5. *Даданыя члены сказа.* Традыцыйнае вучэнне аб даданых членах сказа. Сінкрэтызм у сістэме даданых членаў сказа. Дэтэрмінаваныя і недэтэрмінаваныя члены сказа.

10.6. *Аднасастаўныя сказы*. Лінгвістычны статус аднасастаўных сказаў. Праблема класіфікацыі аднасастаўных сказаў. Сінтаксічная кваліфікацыя галоўнага члена аднасастаўнага сказа. Лінгвістычны статус вакатыўных сказаў. Месца генітыўных сказаў у сістэме простага сказа.

10.7. *Сінтаксічна непадзельныя сказы*. Тэрміналагічнае абазначэнне сінтаксічна непадзельных сказаў.

10.8. *Няпоўныя і эліптычныя сказы*. Лінгвістычная сутнасць няпоўных сказаў. Лінгвістычная сутнасць эліптычных сказаў.

10.9. *Ускладнены просты сказ*. Пытанне аб кампанентах ускладнення простага сказа.

10.9.1. Класіфікацыя адасобленых членаў. Сінтаксічная сувязь адасобленых членаў у сказе.

10.9.2. Пабочныя канструкцыі. Сувязь пабочных канструкцый з асноўнай часткай сказа. Класіфікацыя сказаў з пабочнымі канструкцыямі.

10.9.3. Устаўныя канструкцыі. Сувязь устаўных канструкцый з асноўнай часткай сказа.

10.9.4. Далучальныя канструкцыі. Лінгвістычны статус далучальных канструкцый.

10.10. *Складаны сказ.* З гісторыі вывучэння. Сінтаксічная сутнасць складанага сказа. Кампаненты складанага сказа. Класіфікацыя складаных сказаў. Канструкцыі з прыметамі простага і складанага сказа.

10.10.1. Складаназлучаны сказ. Праблема класіфікацыі.

10.10.2. Складаназалежны сказ. Праблема класіфікацыі. Кваліфікацыя асобных тыпаў даданых частак. Складаназалежныя сказы з сінкрэтызмам значэнняў.

10.10.3. Складаныя злучнікавыя сказы прамежкавага, або пераходнага, тыпу.

10.11. Камунікацыйны аспект сказа. Актуальнае чляненне выказвання. З гісторыі распрацоўкі пытання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
# СПІС ЛІТАРАТУРЫ

## *Асноўная*

Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.

Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 2. Сінтаксіс / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: навука і тэхніка, 1986. – 327 с.

Малажай Г.М., Кананенка Т.М. Лабараторныя працы па сучаснай беларускай мове. Мінск: Выш. шк., 1999.—300 с.

Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.

Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 2. Сінтаксіс / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 240 с.

Баханькоў, А.Я. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / А.Я. Баханькоў [ і інш.]; пад агул. рэд. А.Я. Баханькова / АН Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я.Коласа. – Мінск, 1994. – 463 с.

Лепешаў, І.Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы / І.Я. Лепешаў. – Мінск: Выш. шк., 1998. – 271 с.

Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.

Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.

Чалюк, Н.М. Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне. Просты сказ / Н.М.Чалюк. – Мінск: ТетраСистемс, 2004. -- 208 с.

Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

## *Дадатковая*

Антанюк, Л.А. Сінтаксіс беларускай мовы. Сказ. Функцыянальна-семантычны сінтаксіс: Вучэбны дапаможнік / Л.А. Антанюк. – Мінск: Акадэмія кіравання прф Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, 2004. – 110 с.

Бандарэнка, Т.П. Аднатыпныя словазлучэнні ў сучаснай беларускай літаратурнай мове / Т.П. Бандарэнка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 131 с.

Выгонная, Л.Ц. Інтанацыя. Націск. Арфаэпія / Л.Ц. Выгонная. – Мінск: навука і тэхніка, 1991. – 215 с.

Германовіч, І.К. Беларускія мовазнаўцы: у 2 т. / І.К. Германовіч; рэд. М.Р. Прыгодзіч, І.С. Роўда – Мінск: БДУ, 2006.

Карский, Е.Ф. Белорусы: в 3 т. / Е.Ф. Карский. – Мінск: БелЭн, 2006 - 2007.

Крывіцкі, А.А., Падлужны, А.І. Фанетыка беларускай мовы / А.А. Крывіцкі, А.І. Падлужны. – Мінск: Вышэйшая школа, 1984. – 269 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лукашанец, А.А. Праблемы сучаснага беларускага словаўтварэння / А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларуская навука, 2013.—315 с.

Лукашанец, А.А. Словаўтварэнне і граматыка / А.А. Лукашанец. – Мінск: Права і эканоміка, 2001. – 252 с.

Наркевіч, А.І. Назоўнік: Граматычныя катэгорыі і формы / А.І. Наркевіч. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1976. – 248 с.

Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003.— 672 с.

Прыгодзіч, М.Р. Беларуская мова ў працах замежных лінгвістаў / М.Р. Прыгодзіч. – Мінск: БДУ, 2010. – 184 с.

Прыгодзіч, М.Р. Словаскладанне ў беларускай мове / М.Р. Прыгодзіч. – Мінск: БДУ, 2000.—227 с.

Русак, В.П. Марфаналогія сучаснай беларускай мовы / В.П. Русак. – Мінск: Бел. навука, 2003. – 316 с.

Русак, В.П. Марфаналогія словазмянення і словаўтварэння сучаснай беларускай мовы / В.П. Русак. – Мінск: Беларуская навука, 2012. – 429 с.

Фанетыка беларускай літаратурнай мовы/ І.Р. Бурлыка, Л.Ц. Выгонная, Г.В. Носік, А.І. Падлужны; рэд. А.І. Падлужны. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 335 с.

Шуба, П.П. Дзеяслоў у беларускай мове / П.П. Шуба. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1968. – 82 с.

Шуба, П.П. Прыназоўнік у беларускай мове / П.П. Шуба. – Мінск: БДУ імя У.І. Леніна, 1971. – 224 с.

Шуба, П.П. Прыслоўе ў беларускай мове: Марфалагічны нарыс / П.П.Шуба. – Мінск: выд-ва АН БССР, 1962. – 194 с.

Яўневіч, М.С. Сінтаксічная сінаніміка ў сучаснай беларускай літаратурнай мове / М.С. Яўневіч. – Мінск: БДУ імя У.І. Леніна, 1977. – 280 с.

***Слоўнікі***

Арашонкава, Г.У., Лемцюгова, В.П. Кароткі слоўнік беларускай мовы: Правапіс. Вымаўленне. Націск. Словазмяненне. Словаўжыванне / Г.У. Арашонкава, В.П.Лемцюгова. – Мінск., 1994.

Арашонкава, Г.У., Лемцюгова, В.П. Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы / Г.У. Арашонкава, В.П. Лемцюгова. – Мінск, 2005.

Бардовіч, А.М., Шакун, Л.М. Марфемны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, Л.М. Шакун. – 2-е выд. – Мінск, 1989.

Бардовіч, А.М., Круталевіч, М.М., Лукашанец, А.А. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, М.М. Круталевіч, А.А. Лукашанец. – Мінск, 2000.

Беларуска-рускі слоўнік: больш за 110 000 сл.: у 3 т. Т. 1 – 3 / пад рэд. А.А. Лукашанца. – Выд. 4-е, перапрац. і дап. – Мінск: БелЭн, 2012.

Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск., 1994.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Мінск, 1996 – 2004.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Булыка, А.М. Слоўнік іншамоўных слоў. Актуальная лексіка / А.М. Булыка. – Мінск, 2005.

Гамеза, Л. Комплексны лексічны слоўнік беларускай мовы (сінонімы, антонімы, амонімы, паронімы) / Л. Гамеза. – Мінск: ТетраСистемс, 2008.

Грабчыкаў, С.М. Слоўнік паронімаў беларускай мовы / С.М. Грабчыкаў. – Мінск: Нар. асвета, 1994.

Граматычны слоўнік дзеяслова / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. В.П. Русак [і інш.]; навук. рэд. В.П. Русак. – 2-е выд., дапрац. – Мінск : Беларуская навука, 2013.

Граматычны слоўнік назоўніка / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 2008.

Граматычны слоўнік прыметніка, займенніка, лічэбніка, прыслоўя / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. Н.П. Еўсіевіч [і інш.]; навук. рэд. В.П. Русак. – Мінск: Бел. навука, 2009.

Клышка, М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М.К. Клышка. – Мінск: ПУП "Радыёла-плюс", 2005. – 672 с.

Лазоўскі, У.М. Слоўнік антонімаў беларускай мовы: Канкрэтныя выпадкі ўжывання / У.М. Лазоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1994. – 293 с.

Лепешаў, І.Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: У 2-х т. / І.Я. Лепешаў. – Мінск, 2008.

Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск, 2004.

Мажэйка, Н.С. Частотны слоўнік беларускай мовы / Н.С. Мажэйка. – Мінск, 2006.

Насовіч, І.І. Слоўнік беларускай мовы / І.І. Насовіч. – Мінск, 1983.

Слоўнік беларускай мовы / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы ; уклад. Н.П. Еўсіевіч [і інш.]; навук. рэд. А.А. Лукашанец, В.П. Русак. – Мінск: Беларуская навука, 2012.

Старычонак, В.Д. Слоўнік амонімаў беларускай мовы / В.Д. Старычонак. – Мінск, 1991. --

Струкава, С.М. Слоўнік архаізмаў і гістарызмаў (па творах беларускай мастацкай літаратуры і публіцыстыкі) / С.М. Струкава. – Мінск: Беларуская навука, 2007.

Шкраба, І.Р. Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі / І.Р. Шкраба. – Мінск: Беларус. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008.

Шуба, П.П. Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікаў / П.П. Шуба. – Мінск, 1993.—168 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ
## ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Для павышэння якасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў-філолагаў на працягу ўсяго тэрміну навучання ў ВНУ мэтазгодна прыцягваць кожнага студэнта самастойнай работы. Істотнай асаблівасцю самастойнай работы з'яўляецца актыўная мысліцельная дзейнасць студэнтаў, іх імкненне выявіць свой разумовы ўзровень і стан духоўных здабыткаў у выкананні пэўных заданняў. Студэнты становяцца суб'ектамі пазнавальнай дзейнасці, у іх развіваецца ініцыятыўнасць, самастойнасць у засваенні ведаў, уменняў і навыкаў, а таксама творчае ўяўленне. Змест і формы самастойнай работы студэнтаў распрацоўваюцца супрацоўнікамі кафедры ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі адукацыйнага стандарту.

Матэрыял, рэкамендаваны для самастойнага вывучэння, студэнты павінны атрымліваць ад выкладчыка з першых тыдняў семестра. Змест матэрыялу для самастойнай працы, распрацаваны выкладчыкамі кафедры, можа ўключаць тэарэтычныя ці практычныя заданні па пэўных тэмах, комплексы індывідуальных дамашніх кантрольных работ па тэмах і раздзелах дысцыпліны. Усе віды заданняў павінны быць размеркаваны па этапах: 1) напалову самастойная (калектыўная) работа; 2) самастойная работа рэпрадуктыўнага характару; 3) самастойная работа творчага характару.

На самастойнае вывучэнне варта прапаноўваць асобныя тэмы лекцый або іх часткі па раней складзеным плане з указаннем асноўнай і дадатковай літаратуры па праблеме. Адзначым, што для студэнтаў першага курса рэкамендуецца выносіць на самастойнае вывучэнне тэмы і падтэмы, асноўныя палажэнні якіх вядомыя са школьнага курса беларускай мовы, або тыя пытанні, вывучэнне якіх не патрабуе валодання спецыфічнымі лінгвістычнымі ўменнямі і навыкамі. На наступных курсах матэрыял, прапанаваны для самастойнага вывучэння, варта паступова ўскладняць, але ўсё роўна змест такога матэрыялу павінен змяшчаць тэарэтычныя пытанні, успрыманне, асэнсаванне і разуменне якіх не выклікае асаблівых цяжкасцей.

Эфектыўнасць самастойнай працы студэнтаў залежыць ад многіх фактараў. Тут і аптымальны выбраная форма працы, і дакладныя, канкрэтныя ўказанні і рэкамендацыі выкладчыка па выкананні з наступнай аб'ектыўнай ацэнкай яе вынікаў і, самае важнае, сістэматычнасць і паслядоўнасць у правядзенні такой працы.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для атрымання аб'ектыўнай інфармацыі аб ўзроўні паспяховасці студэнтаў мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: апераджальны, бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю ўжываецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

Дыягностыка кампетэнцый па дысцыпліне можа мець розныя формы.

Вусны кантроль: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках, калёквіумы, даклады на канферэнцыях, вусныя залікі і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пісьмовы кантроль: тэрміналагічныя дыктанты, дыктанты з дадатковымі заданнямі, кантрольныя апытанні, кантрольныя работы, пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях, рэфераты, пісьмовыя залікі і экзамены.

Графічны кантроль: моўны разбор з дапамогай графічных сродкаў, графічны дыктант (запаўненне табліцы па пэўнай тэме).

Тэставы кантроль: падбор каротках адказаў у адпаведнасці з заданнямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
______________ У.У. Шлыкаў
“_____” ________________ 2013 г.
Рэгістрацыйны № УД _______-/р.

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:**

1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускага мовазнаўства

Курс 1
Семестр 1 – 2
Лекцыі 20 гадзін

Залік 2 семестр

Аўдыторных гадзін
па вучэбнай дысцыпліне 70

Усяго гадзін
вучэбнай дысцыпліне 116

Форма атрымання
вышэйшай адукацыі дзённая, завочная

Склалі: С.С. Мароз, кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
Н.А. Радзіваноўская, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

2013 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вучэбная праграма складзена на аснове вучэбнай праграмы ўстановы адукацыі “Актуальныя праблемы беларускай мовы”, зацверджанай “__” ________ 2013г., рэгістрацыйны нумар______________.

Разгледжана і рэкамендавана да зацверджання кафедрай беларускага моваЗнаўства

“___” ___________2013 г., пратакол № __

Загадчык кафедры __________ Д.В. Дзятко

Адобрана і рэкамендавана да зацвярджэння Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

“_____” ______________2013 г., пратакол № __

Старшыня _____________ Д.В. Старычонак

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па дысцыпліне **“Актуальныя праблемы беларускай мовы”** прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін. У вучэбнай праграме ўлічаны наступныя патрабаванні адукацыйнага стандарту. Характэрнымі рысамі праграмы з'яўляюцца: акцэнтаванне на кампетэнтнасным падыходзе да навучання, значнае ўзмацненне ролі і месца самастойнай працы студэнтаў, выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій. У межах супрацоўніцтва выкладчыка і студэнта праграма выступае своеасаблівым арыенцірам у працэсе набыцця ведаў, разнастайнай інфармацыі, атрымання практычных уменняў.

Асноўная **мэта выкладання дысцыпліны** – развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне будучых спецыялістаў-філолагаў; выпрацаваць уменні і навыкі практычнай рэалізацыі атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці; садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў, здольных паспяхова вырашаць праблемы функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму; выхаваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

**Задачы вывучэння дысцыпліны:**

– даць навукова абгрунтаваныя тэарэтычныя звесткі па дысцыпліне;

– азнаёміць студэнтаў з рознымі напрамкамі і канцэпцыямі ў беларускай лінгвістыцы, паказаць дыскусійнасць асобных меркаванняў і падыходаў у дачыненні да класіфікацыі моўных адзінак;

– раскрыць заканамернасці функцыянавання беларускай мовы як складанай шматузроўневай сістэмы;

– сфарміраваць устойлівыя навыкі аналізу моўных фактаў;

– спрыяць авалоданню літаратурнымі нормамі сучаснай беларускай мовы;

– развіць і ўмацаваць навыкі практычнага карыстання мовай;

– прывіць навыкі самастойнай работы;

– садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых спецыялістаў, здольных крытычна думаць і практычна выкарыстоўваць набытыя веды пры вывучэнні спецыяльных моваznаўчых дысцыплін.

Курс “Актуальныя праблемы беларускай мовы” займае важнае месца ў сістэме лінгвістычнай падрыхтоўкі студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, з’яўляецца дадатковай базай для грунтоўнага засваення беларускай мовы. Пры вывучэнні дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і сувязь яго з іншымі лінгвістычнымі прадметамі, у першую чаргу з сучаснай беларускай літаратурнай мовай, а таксама з уводзінамі ў мовазнаўства і агульным мовазнаўствам.

**Патрабаванні да ведаў і ўменняў:** у выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць:**

– месца і ролю беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці моў;

– выдатных дзеячаў беларускага мовазнаўства і іх асноўныя навуковыя працы;

– галоўныя навуковыя праблемы сучаснай беларускай мовы і перспектыўныя шляхі іх вырашэння;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– навуковую і даведачную літаратуру па беларускай мове;

**умець:**

– адбіраць, аналізаваць і сістэматызаваць моўныя факты;

– праводзіць самастойныя лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады;

– весці пошук і аналіз неабходнай інфармацыі з розных крыніц, у тым ліку са слоўнікаў, з мэтай падрыхтоўкі вусных паведамленняў і рэфератаў;

– выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы;

**валодаць**: нормамі сучаснай беларускай мовы, асновамі культуры беларускага маўлення, якое ажыццяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах, навыкамі лінгвістычнага разбору моўных адзінак на ўсіх узроўнях моўнай сістэмы, навыкамі маўленча-камунікатыўнай дзейнасці.

На вывучэнне дысцыпліны “Актуальныя праблемы беларускай мовы” ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці на І курс адводзіцца 116 гадзін, з іх аўдыторных – 70 гадзін. На завочнай форме атрымання адукацыі ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці адводзіцца 24 аўдыторныя гадзіны (залік – 2 семестр). . З мэтай павышэння якасці навучання ў педагагічны працэс неабходна ўключыць 2 пісьмовыя работы на семестр.

РЕПОЗИТОРИЙ

**Змест вучэбнага матэрыялу**

| № | Тэма раздзела | Лекцыйныя | Практычныя | Лабараторныя | КСР |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Уводзіны | 2 | 2 | | 2 |
| 2. | Лексікалогія. Слова як адзінка лексічнай сістэмы | 2 | 2 | | |
| 3. | Сістэмна-семасіялагічная характарыстыка лексікі | 2 | 2 | | |
| 4. | Слоўныя апазіцыі ў межах ЛСК | | 6 | | |
| 5. | Сінанімія як моўная з'ява | | 2 | | 2 |
| 6. | Семантычная класіфікацыя антонімаў | 2 | 4 | | |
| 7. | Класы слоў як з'ява лексіч-най парадыгматыкі | | 2 | | 2 |
| 8. | Гісторыка-этымалагічная характарыстыка беларус-кай лексікі | 4 | 4 | | |
| 9. | Лексіка беларускай мовы з пункту гледжання сфер яе выкарыстання | | 4 | | |
| 10. | Сацыялінгвістычная сістэ-матызацыя беларускай лек-сікі | | 6 | | |
| 11. | Лексіка актыўнага і пасіўнага запасу | | 2 | | |
| 12 | Фразеалогія | | 4 | | |
| 13. | Лексікаграфія | 2 | 2 | | |
| 14. | Фанетыка. Фаналогія | | 4 | | |
| 15. | Арфаграфія | 2 | | | 2 |
| | **Усяго:** | **16** | **46** | | **8** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

1. **Уводзіны**. Мэта і задачы курса. Сувязь з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі.

1.1. *Нацыянальная мова як гістарычная катэгорыя.* Нацыянальная мова як сістэма. Кампаненты сучаснай беларускай нацыянальнай мовы. Навуковыя дасягненні вядомых беларускіх лінгвістаў.

Беларуская літаратурная мова на сучасным этапе. Беларуская мова як першаснова нацыянальнай культуры.

2. **Лексікалогія.** Асобныя разнавіднасці лексікалогіі. Аспекты вывучэння лексікалогіі.

2.1. *Слова як адзінка лексічнай сістэмы.* Праблема азначэння слова. Праблема лексічнага значэння слова. Праблема мнагазначнасці слова. Пытанні аб упарадкаванні тыпаў лексічных значэнняў мнагазначнага слова.

2.2. *Сістэмна-семасіялагічная характарыстыка лексікі*. Праблема сістэмнай арганізацыі мовы ў сучаснай лінгвістыцы. Парадыгматычныя адносіны ў лексіцы. Фармальна-семантычная структура слова. Асноўныя тыпы слоўных апазіцый па сememах і лексемах.

2.3. *Асобныя слоўныя апазіцыі ў межах лексіка-семантычных катэгорый.* Амонімы, якія паявіліся ў выніку выпадковага супадзення спрадвечна розных слоў. Словаўтваральныя амонімы. Семантычныя (гамагенныя амонімы). Аманімія па дэнатату. Аманімія па сігніфікату.

2.4. *Сінанімія як універсальная моўная з'ява*. Праблема азначэння сінонімаў у лінгвістычнай літаратуры. Пытанне аб абсалютных сінонімах.

2.5. *Семантычная класіфікацыя антонімаў*. Антонімы, якія выражаюць якасную процілегласць. Камплементарныя антонімы. Антонімы, якія выражаюць супрацьлеглую накіраванасць дзеянняў, уласцівасцей, прымет. Антонімы-канверсівы. Энантасемія.

2.6. *Класы слоў як з'ява лексічнай парадыгматыкі*. Паняцце класа слоў. Тыпалогія класаў. Прадметна-тэматычныя групы слоў (ПТГ). Лексіка-семантычныя групы (ЛСГ). Семантычныя палі.

2.7. *Гісторыка-этымалагічная характарыстыка беларускай лексікі.* Спрадвечная лексіка. Лексіка перыяду беларускай народнасці. Лексіка перыяду беларускай нацыі. Роля народных гаворак ва ўзбагачэнні лексікі літаратурнай мовы.

Разнавіднасці іншамоўнай лексікі. Прычыны запазычвання іншамоўнай лексікі. Шляхі пранікнення і спосабы ўвядзення іншамоўных слоў у беларускую мову.

2.8. *Лексіка беларускай мовы з пункту гледжання сфер яе выкарыстання*. Дыялектная лексіка. Пытанне аб узаемадзеянні літаратурнай мовы і народных гаворак у беларускім мовазнаўстве. Узаемадзеянне тэрміналагічнай лексікі з агульнаўжывальнай лексікай беларускай мовы. Наменклатурныя назвы. Адрозненні паміж тэрмінамі і прафесіяналізмамі.

2.9. *Сацыялінгвістычная сістэматызацыя сучаснай беларускай лексікі*. Паняцце стылю і стылістычных сродкаў. Кароткая характарыстыка стыляў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Афіцыйна-дзелавы стыль. Навуковы стыль. Публіцыстычны стыль. Мастацкі стыль. Гутарковы стыль. Стылістычныя сродкі лексікі. Экспрэсіўная лексіка.

2.10. *Лексіка актыўнага і пасіўнага запасу.* Паняцце аб актыўным запасе лексікі. Паняцце аб пасіўным запасе лексікі.

3. **Фразеалогія**. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Змест фразеалогіі, прадмет вывучэння.

3.1. *З гісторыі вывучэння фразеалогіі.* Аспекты даследавання фразеалагічнага фонду беларускай мовы.

Аналіз фразеалагічных адзінак.

4. *Лексікаграфія.* Лексікаграфія як раздзел мовазнаўства. Змест лексікаграфіі, прадмет вывучэння.

4.1. *Стан, праблемы і кірункі сучаснай беларускай лексікаграфіі*. Даследаванні ў галіне гісторыі беларускай лексікаграфіі. Распрацоўка тыпалогіі слоўнікаў у сучаснай лнгвістыцы.

Аналіз слоўнікаў розных тыпаў (аднамоўных, двухмоўных, шматмоўных).

5. *Фанетыка. Фаналогія*. Прадмет і задачы фанетыкі, прадмет і задачы фаналогіі.

5.1. *З гісторыі вывучэння фанетыкі і фаналогіі*. Даследаванні фанетычнай сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Даследаванні фанетычнай сістэмы беларускай дыялектнай мовы.

5.2. *Фаналагічная характарыстыка гукаў у залежнасці ад пазіцый у слове*. Фаналагічная характарыстыка галосных гукаў у залежнасці ад пазіцый у слове. Фаналагічная характарыстыка зычных гукаў у залежнасці ад пазіцыі ў слове.

6. *Арфаграфія.* Прадмет і задачы арфапграфіі. Сувязь арфаграфіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства.

6.1. *З гісторыі беларускай арфаграфіі*. Станаўленне і развіццё сучаснай беларускай арфаграфічнай сістэмы.

6.2. *Цяжкія выпадкі напісання*. Перадача акання на пісьме. Правапіс **а, о, э** ў складаных словах. Перадача якання на пісьме. Правапіс **е**, **ё**, **я** ў складаных словах. Правапіс **у** і **ў** у словах іншамоўнага паходжання. Правапіс складаных слоў. Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў, блізкіх да прыслоўяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны**
**(дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)**

| № п/п | Назва пытанняў, якія вывучаюцца | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя і мета-дычныя дапаможнікі) | Літаратура | Формы кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыйныя | практычныя | лабараторныя | КСР | | | |
| | **АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ (70 г.)** | **16** | **46** | | **8** | | | |
| ***1.*** | ***Уводзіны (6 г.)*** | ***2*** | ***2*** | | ***2*** | | | |
| 1.1 | Нацыянальная мова як гістарычная катэгорыя<br>1. Нацыянальная мова як сістэма.<br>2. Кампаненты сучаснай беларускай нацыянальнай мовы. | 2 | | | | | 16 | |
| | 1. Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры.<br>2. Беларуская літаратурная мова на сучасным этапе. | | 2 | | | | 11, 16 | Індывідуальнае апытванне |
| | 1. Навуковыя дасягненні вядомых беларускіх лінгвістаў. | | | | 2 | | 7, 8, 17, 25 | Праверка самастойна падрыхтаванай лекцыі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ***2.*** | ***Лексікалогія (48 г.)*** | ***10*** | ***34*** | | ***4*** | | | |
| 2.1 | Слова як адзінка лексічнай сістэмы<br>1. Праблема азначэння слова.<br>2. Праблема лексічнага значэння слова. | 2 | | | | | | |
| | 1. Праблема мнагазначнасці слова.<br>2. Пытанні аб упарадкаванні тыпаў лексічных значэнняў мнагазначнага слова. | | 2 | | | | 1, 3, 10, 16 | Франталь-нае апыт-ванне |
| 2.2. | Сістэмна-семасіялагічная характарыстыка лексікі<br>1. Праблема сістэмнай арганізацыі мовы ў сучаснай лінгвістыцы.<br>2. Парадыгматычныя адносіны ў лексіцы. | 2 | | | | | 1 | |
| | 1. Фармальна-семантычная структура слова.<br>2. Асноўныя тыпы слоўных апазіцый па семемах і лексемах. | | 2 | | | | 3, 16 | Ушчыльне-нае апыт-ванне |
| 2.3 | Асобныя слоўныя апазіцыі ў межах лексіка-семантычных катэгорый<br>1. Амонімы, якія паявіліся ў выніку выпадковага супадзення спрадвечна розных слоў.<br>2. Словаўтваральныя амонімы. | | 2 | | | | 3, 16, 17 | Тэрмінала-гічны дык-тант |
| | 1. Лексічны аналіз слова.<br>2. Тлумачэнне значэнняў амонімаў.<br>3. Вызначэнне тыпаў амонімаў. | | 2 | | | | 3, 16, 17, 19 | Праверка выкананых практыка-ванняў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Семантычныя (гамагенныя амонімы).<br>2. Аманімія па дэнатату. Аманімія па сігніфікату. | | 2 | | | | 3, 16, 19, 20 | Індывідуальнае апытванне |
| 2.4 | Сінанімія як універсальная моўная з’ява<br>1. Праблема азначэння сінонімаў у лінгвістычнай літаратуры.<br>2. Пытанне аб абсалютных сінонімах. | | 2 | | | | 3, 10, 16, 19, 21 | Ушчыльненае апытванне |
| | 1. Выбарка сказаў з рознымі тыпамі сінонімаў.<br>2. Падбор сінонімаў да слоў.<br>3. Канструяванне сказаў з рознымі тыпамі сінонімаў. | | | | 2 | | 3, 10, 16, 19, 21 | Праверка самастойна выкананых спецыяльных заданняў |
| 2.5. | Семантычная класіфікацыя антонімаў<br>1. Антонімы, якія выражаюць якасную процілегласць.<br>2. Камплементарныя антонімы. | 2 | | | | | 1, 10, 16, 19, 22 | |
| | 1. Антонімы, якія выражаюць супрацьлеглую накіраванасць дзеянняў, уласцівасцей, прымет.<br>2. Антонімы-канверсівы. Энантасемія. | | 2 | | | | 3, 18, 19, 22 | Тэрміналагічны дыктант |
| | 1. Выбарка сказаў з рознымі тыпамі антонімаў.<br>2. Падбор антонімаў да слоў.<br>3. Канструяванне сказаў з рознымі тыпамі антонімаў. | | 2 | | | | 3, 18, 19, 21 | Праверка выкананых практыкаванняў |
| 2.6 | Класы слоў як з’ява лексічнай парадыгматыкі<br>1. Паняцце класа слоў. | | 2 | | | | 1, 3 | Франтальнае апытванне |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2.Тыпалогія класаў. | | | | | | | |
| | 1. Прадметна-тэматычныя групы слоў (ПТГ).<br>2. Лексіка-семантычныя групы (ЛСГ). Семантычныя палі. | | | | 2 | | 1, 3 | Індывідуа-льнае апыт-ванне |
| 2.7 | Гісторыка-этымалагічная характарыстыка беларускай лексікі<br>1. Спрадвечная лексіка.<br>2. Лексіка перыяду беларускай народнасці. | 2 | | | | | 1 | |
| | 1. Лексіка перыяду беларускай нацыі.<br>2. Роля народных гаворак ва ўзбагачэнні лексікі літаратурнай мовы. | | 2 | | | | 3, 28, 29 | Індывідуа-льнае апыт-ванне |
| | 1. Разнавіднасці іншамоўнай лексікі.<br>2. Прычыны запазычвання іншамоўнай лексікі.<br>3. Шляхі пранікнення і спосабы ўвядзення іншамоўных слоў у беларускую мову. | 2 | | | | | 1 | |
| | 1. Вызначэнне запазычаных слоў па прыметах.<br>2. Тлумачэнне значэнняў запазычаных слоў.<br>3. Выбарка сказаў з запазычанымі словамі. | | 2 | | | | 3, 17, 18 | Праверка выкананых практыка-ванняў. |
| 2.8 | Лексіка беларускай мовы з пункту гледжання сфер яе выкарыстання<br>1. Дыялектная лексіка.<br>2. Пытанне аб узаемадзеянні літара- | | 2 | | | | 3, 10 | Ушчыльне-нае апыт-ванне |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | турнай мовы і народных гаворак у беларускім мовазнаўстве. | | | | | | | |
| | 1. Узаемадзеянне тэрміналагічнай лексікі з агульнаўжывальнай лексікай беларускай мовы.<br>2. Наменклатурныя назвы.<br>3. Адрозненні паміж тэрмінамі і прафесіяналізмамі. | | 2 | | | | 3, 10 | Індывідуа-льнае апыт-ванне |
| 2.9 | Сацыялінгвістычная сістэматызацыя сучаснай беларускай лексікі<br>1. Паняцце стылю і стылістычных сродкаў. Афіцыйна-дзелавы стыль.<br>2. Навуковы стыль. | | 2 | | | | 3, 10 | Франталь-нае апыт-ванне |
| | 1. Публіцыстычны стыль.<br>2. Мастацкі стыль. | | 2 | | | | 3, 10 | Ушчыльне-нае апыт-ванне |
| | 1. Гутарковы стыль.<br>2. Стылістычныя сродкі лексікі.<br>3. Экспрэсіўная лексіка. | | 2 | | | | 3 | Праверка практыка-ванняў |
| 2.10 | Лексіка актыўнага і пасіўнага запасу<br>1. Паняцце аб актыўным запасе лексікі.<br>2. Паняцце аб пасіўным запасе лексікі. | | 2 | | | | 3, 28 | Праверка практыка-ванняў |
| ***3.*** | ***Фразеалогія (4 г.)*** | | ***4*** | | | | | |
| 3.1. | *З гісторыі вывучэння фразеалогіі.*<br>1. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Змест фразеалогіі, прадмет вывучэння.<br>2. Аспекты даследавання фразеала-гічнага фонду беларускай мовы. | | 2 | | | | 5, 22, 23, 24 | Індывідуа-льнае апыт-ванне |
| | 1. Канструяванне і выбарка сказаў з | | 2 | | | | 5, 22, 23, 24 | Праверка |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | фраземамі.<br>2. Аналіз фразеалагічных адзінак. | | | | | | | практыка-ванняў |
| ***4.*** | ***Лексікаграфія (4 г.)*** | ***2*** | ***2*** | | | | | |
| 4.1. | *Стан, праблемы і кірункі сучаснай беларускай лексікаграфіі.*<br>1. Даследаванні ў галіне гісторыі беларускай лексікаграфіі.<br>2. Распрацоўка тыпалогіі слоўнікаў у сучаснай лнгвістыцы. | 2 | | | | | | |
| | 1. Аналіз аднамоўных слоўнікаў.<br>2. Аналіз двухмоўных і шматмоўных слоўнікаў. | | 2 | | | | 3 | Праверка практыка-ванняў |
| ***5.*** | ***Фанетыка. Фаналогія (4 г.)*** | | ***4*** | | | | | |
| 5.1. | *З гісторыі вывучэння фанетыкі і фаналогіі.*<br>1. Даследаванні фанетычнай сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.<br>2. Даследаванні фанетычнай сістэмы беларускай дыялектнай мовы. | | 2 | | | | 2, 4, 3, 9, 11, 12 | Індывідуа-льнае апыт-ванне |
| 5.2. | *Фаналагічная характарыстыка гукаў у залежнасці ад пазіцыі ў слове.*<br>1. Фаналагічная характарыстыка галос-ных гукаў у залежнасці ад пазіцыі ў слове.<br>2. Фаналагічная характарыстыка зычных гукаў у залежнасці ад пазіцыі ў слове. | | 2 | | | | 2, 3, 4, 8, 9, 11, 12, 13 | Праверка практыка-ванняў |
| ***6.*** | ***Арфаграфія (2 г.)*** | ***2*** | | | ***2*** | | | |
| 6.1. | *З гісторыі беларускай арфаграфіі.*<br>1. Прадмет і задачы арфаграфіі. Сувязь | 2 | | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | арфаграфіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства.<br>2. Станаўленне і развіццё сучаснай беларускай арфаграфічнай сістэмы. | | | | | | |
| 6.2. | *Цяжкія выпадкі напісання*<br>1. Перадача акання на пісьме. Правапіс а, о, э ў складаных словах.<br>2. Перадача якання на пісьме. Правапіс е, ё, я ў складаных словах.<br>3. Правапіс у і ў у ў словах іншамоўнага паходжання.<br>4. Правапіс складаных слоў.<br>5. Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў, блізкіх да прыслоўяў. | | | 2 | | 14, 25, 26 | Праверка самастойна выкананых спецыяльных заданняў. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Пратакол узгаднення вучэбнай праграмы**
**па "Актуальных праблемах беларускай мовы" з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці**

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы кафедры аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па "Актуальных праблемах беларускай мовы" | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Агульнае мовазнаўства<br><br>Сучасная беларуская літаратурная мова<br>Уводзіны ў мовазнаўства | Кафедра беларускага мовазнаўства<br>Кафедра беларускага мовазнаўства<br>Кафедра беларускага мовазнаўства | Прапаноў няма | Зацвердзіць вучэбную праграму па дысцыпліне "Актуальныя праблемы беларускай мовы" (пратакол № __ ад_____.2013 г.). |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
# СПІС ЛІТАРАТУРЫ


### *Асноўная*

1. Баханькоў, А.Я. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / А.Я. Баханькоў [ і інш.]; пад агул. рэд. А.Я. Баханькова / АН Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск, 1994. – 463 с.
2. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.
3. Малажай Г.М., Кананенка Т.М. Лабараторныя працы па сучаснай беларускай мове. Мінск: Выш. шк., 1999.—300 с.
4. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.
5. Лепешаў, І.Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы / І.Я. Лепешаў. – Мінск: Выш. шк., 1998. – 271 с.

### *Дадатковая*

6. Выгонная, Л.Ц. Інтанацыя. Націск. Арфаэпія / Л.Ц.Выгонная. – Мінск: навука і тэхніка, 1991. – 215 с.
7. Германовіч, І.К. Беларускія мовазнаўцы: у 2 т. / І.К. Германовіч; рэд. М.Р. Прыгодзіч, І.С. Роўда – Мінск: БДУ, 2006.
8. Карский, Е.Ф. Белорусы: в 3 т. / Е.Ф. Карский. – Мінск: БелЭн, 2006 - 2007.
9. Крывіцкі, А.А., Падлужны, А.І. Фанетыка беларускай мовы / А.А. Крывіцкі, А.І. Падлужны. – Мінск: Вышэйшая школа, 1984. – 269 с.
10. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003.
11. Прыгодзіч, М.Р. Беларуская мова ў працах замежных лінгвістаў / М.Р. Прыгодзіч. – Мінск: БДУ, 2010. – 184 с.
12. Фанетыка беларускай літаратурнай мовы/ І.Р. Бурлыка, Л.Ц. Выгонная, Г.В. Носік, А.І. Падлужны; Рэд. А.І. Падлужны. – Мінск: навука і тэхніка, 1989. – 335 с.

.

### *Слоўнікі*

13. Арашонкава, Г.У., Лемцюгова, В.П. Кароткі слоўнік беларускай мовы: Правапіс. Вымаўленне. Націск. Словазмяненне. Словаўжыванне / Г.У. Арашонкава, В.П. Лемцюгова. – Мінск., 1994.
14. Арашонкава, Г.У., Лемцюгова, В.П. Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы / Г.У. Арашонкава, В.П. Лемцюгова. – Мінск, 2005.
15. Беларуска-рускі слоўнік: больш за 110 000 сл.: у 3 т. Т. 1 – 3 / пад рэд. А.А. Лукашанца. – Выд. 4-е, перапрац. і дап. – Мінск: БелЭн, 2012.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

16. Беларуская мова: Энцыклапедыя – Мінск., 1994.
17. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Мінск, 1996 – 2004.
18. Булыка, А.М. Слоўнік іншамоўных слоў. Актуальная лексіка / А.М. Булыка. – Мінск, 2005.
19. Гамеза, Л. Комплексны лексічны слоўнік беларускай мовы (сінонімы, антонімы, амонімы, паронімы) / Л. Гамеза. – Мінск: ТетраСистемс, 2008.
20. Грабчыкаў, С.М. Слоўнік паронімаў беларускай мовы / С.М. Грабчыкаў. – Мінск: Нар. асвета, 1994.
21. Клышка, М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М.К. Клышка. – Мінск: ПУП "Радыёла-плюс", 2005. – 672 с.
22. Лазоўскі, У.М. Слоўнік антонімаў беларускай мовы: Канкрэтныя выпадкі ўжывання / У.М. Лазоўскі. – Мінск: Университэцкае, 1994. – 293 с.
23. Лепешаў, І.Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: У 2-х т. / І.Я. Лепешаў. – Мінск, 2008.
24. Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я.Лепешаў. – Мінск, 2004.
25. Насовіч, І.І. Слоўнік беларускай мовы / І.І. Насовіч. – Мінск, 1983.
26. Слоўнік беларускай мовы / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы ; уклад. Н.П. Еўсіевіч [і інш.]; навук. рэд. А.А. Лукашанец, В.П. Русак. – Мінск: Беларуская навука, 2012.
27. Старычонак, В.Д. Слоўнік амонімаў беларускай мовы / В.Д. Старычонак. – Мінск, 1991.
28. Струкава, С.М. Слоўнік архаізмаў і гістарызмаў (па творах беларускай мастацкай літаратуры і публіцыстыкі) / С.М. Струкава. – Мінск: Беларуская навука, 2007.
29. Шкраба, І.Р. Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі / І.Р. Шкраба. – Мінск: Беларус. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
______________ У.У. Шлыкаў
“_____” ________________ 20__ г.
Рэгістрацыйны № УД _______-/р.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:**

1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускага мовазнаўства

Курс 2
Семестр 3 – 4
Лекцыі 36 гадзін
ктычныя заняткі 74 гадзіны

Залік __ семестр

Аўдыторных гадзін
па вучэбнай дысцыпліне 110

Усяго гадзін
вучэбнай дысцыпліне 224

Форма атрымання
вышэйшай адукацыі дзённая, завочная

Склалі: С.С. Мароз, кандыдат філалагічных навук, дацэнт,

Н.А. Радзівеноўская, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

20___ г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вучэбная праграма складзена на аснове вучэбнай праграмы ўстановы адукацыі “Актуальныя праблемы беларускай мовы”, зацверджанай “__” ________ 20__ г., рэгістрацыйны нумар______________.

Разгледжана і рэкамендавана да зацверджання кафедрай беларускага мовазнаўства

“___” ___________20__г., пратакол № __

Загадчык кафедры __________ Д.В. Дзятко

Адобрана і рэкамендавана да зацвярджэння Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

“_____” ______________20__ г., пратакол № __

Старшыня _____________ Д.В. Старычонак

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па дысцыпліне **“Актуальныя праблемы беларускай мовы”** прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін. У вучэбнай праграме ўлічаны наступныя патрабаванні адукацыйнага стандарту. Характэрнымі рысамі праграмы з'яўляюцца: акцэнтаванне на кампетэнтнасным падыходзе да навучання, значнае ўзмацненне ролі і месца самастойнай працы студэнтаў, выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій. У межах супрацоўніцтва выкладчыка і студэнта праграма выступае своеасаблівым арыенцірам у працэсе набыцця ведаў, разнастайнай інфармацыі, атрымання практычных уменняў.

Асноўная **мэта выкладання дысцыпліны** – развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне будучых спецыялістаў-філолагаў; выпрацаваць уменні і навыкі практычнай рэалізацыі атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці; садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў, здольных паспяхова вырашаць праблемы функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму; выхаваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

**Задачы вывучэння дысцыпліны:**

– даць навукова абгрунтаваныя тэарэтычныя звесткі па дысцыпліне;

– азнаёміць студэнтаў з рознымі напрамкамі і канцэпцыямі ў беларускай лінгвістыцы, паказаць дыскусійнасць асобных меркаванняў і падыходаў у дачыненні да класіфікацыі моўных адзінак;

– раскрыць заканамернасці функцыянавання беларускай мовы як складанай шматузроўневай сістэмы;

– сфарміраваць устойлівыя навыкі аналізу моўных фактаў;

– спрыяць авалоданню літаратурнымі нормамі сучаснай беларускай мовы;

– развіць і ўмацаваць навыкі практычнага карыстання мовай;

– прывіць навыкі самастойнай работы;

– садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых спецыялістаў, здольных крытычна думаць і практычна выкарыстоўваць набытыя веды пры вывучэнні спецыяльных мовазнаўчых дысцыплін.

Курс “Актуальныя праблемы беларускай мовы” займае важнае месца ў сістэме лінгвістычнай падрыхтоўкі студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, з’яўляецца дадатковай базай для грунтоўнага засваення беларускай мовы. Пры вывучэнні дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і сувязь яго з іншымі лінгвістычнымі прадметамі, у першую чаргу з сучаснай беларускай літаратурнай мовай, а таксама з уводзінамі ў мовазнаўства і агульным мовазнаўствам.

**Патрабаванні да ведаў і ўменняў:** у выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць:**

– месца і ролю беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці моў;

– выдатных дзеячаў беларускага мовазнаўства і іх асноўныя навуковыя працы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– галоўныя навуковыя праблемы сучаснай беларускай мовы і перспектыўныя шляхі іх вырашэння;

– навуковую і даведачную літаратуру па беларускай мове;

**умець:**

– адбіраць, аналізаваць і сістэматызаваць моўныя факты;

– праводзіць самастойныя лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады;

– весці пошук і аналіз неабходнай інфармацыі з розных крыніц, у тым ліку са слоўнікаў, з мэтай падрыхтоўкі вусных паведамленняў і рэфератаў;

– выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы;

**валодаць**: нормамі сучаснай беларускай мовы, асновамі культуры беларускага маўлення, якое ажыццяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах, навыкамі лінгвістычнага разбору моўных адзінак на ўсіх узроўнях моўнай сістэмы, навыкамі маўленча-камунікатыўнай дзейнасці.

На вывучэнне дысцыпліны "Актуальныя праблемы беларускай мовы" ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці на І курс адводзіцца 116 гадзін, з іх аўдыторных – 70 гадзін. На завочнай форме атрымання адукацыі ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці адводзіцца 24 аўдыторныя гадзіны (залік – 2 семестр). . З мэтай павышэння якасці навучання ў педагагічны працэс неабходна ўключыць 2 пісьмовыя работы на семестр.
Завочнай формай атрымання адукацыі, у адпаведнасці з вучэбным планам, на 2 курсе прадугледжана 26 аўдыторных гадзін (12 лекцыйных і 14 практычных), залік і кантрольная работа праводзяцца ў 2 семестры.

РЕПОЗИТОРИЙ

**Змест вучэбнай дысцыпліны**

| № п/п | Тэма раздзела | Лекцыйныя | Практычныя | Лабараторныя | КСР |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Марфеміка | 2 | 4 | | |
| 2. | Словаўтварэнне | 2 | 6 | | |
| 3. | Граматыка. Марфалогія | 2 | 4 | | |
| 4. | Асноўныя граматычныя паняцці | 2 | 4 | | |
| 5. | Слова як адзінка марфалогіі | 2 | 4 | | |
| 6. | Граматычны статус назоўніка | 4 | 6 | | |
| 7. | Граматычны статус прыметніка | 4 | 6 | | |
| 8. | Граматычны статус лічэбніка | 2 | 4 | | |
| 9. | Граматычны статус займеннік | 2 | 4 | | |
| 10. | Граматычны статус дзеяслова | 4 | 8 | | |
| 11. | Граматычны статус прыслоўя. | 2 | 4 | | |
| 12. | Лінгвістычны статус безасабова-прэдыкатыўных слоў. | 2 | 4 | | |
| 13. | Граматычны статус службовых часцін мовы. | 6 | 16 | | |
| **Усяго:** | | **36** | **74** | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

7. **Марфеміка**. Марфеміка як раздзел мовазнаўства. Прадмет і задачы марфемікі.

7.1. *Аспекты вывучэння марфемікі* .Паняцце марфемы, аламарфемы, морфа, аламорфа. Тыпалогія марфем.

8. **Словаўтварэнне.** Словаўтварэнне як раздзел мовазнаўства. Прадмет і задачы словаўтварэння. Кірункі даследавання.

8.1. *Адзінкі словаўтварэння*. Утваральная аснова, утваральная база, словаўтваральныя сродкі. Словаўтваральная пара, словаўтваральны ланцужок, словаўтваральная парадыгма, словаўтваральны рад, словаўтваральнае гняздо.

Паняцце словаўтваральнага тыпу і словаўтваральнай мадэлі.

9. **Граматыка. Марфалогія**. Падзел граматыкі на марфалогію і сінтаксіс. Змест і прадмет марфалогіі. Кірункі даследавання.

9.1. *Асноўныя граматычныя паняцці і адзінкі*. Граматычнае значэнне, граматычная катэгорыя, граматычная форма, словаформа. Паняцце парадыгмы. Спосабы і сродкі выражэння граматычных значэнняў.

9.2. *Слова як адзінка марфалогіі*. Словы і іх граматычныя групоўкі. Сістэма часцін мовы ў беларускай мове. Дыскусійныя пытанні класіфікацыі часцін мовы ў навуковай літаратуры. Безасабова-прэдыкатыўныя словы (прэдыкатывы). Няпэўна-колькасныя словы. Мадальныя словы. Выклічнік. Гукаперайманні. Звязка.

9.3. *Граматычны статус назоўніка*. З гісторыі вывучэння назоўніка. Прадметна-сэнсавая аснова катэгорыі назоўніка. Лексіка-семантычныя групы назоўнікаў. Узаемадзеянне паміж катэгорыяй назоўніка і катэгорыямі прыметніка, лічэбніка, займенніка, прыслоўя.

9.4. *Асноўныя граматычныя катэгорыі ўнутры катэгорыі назоўніка*. Асноўныя тыпы скланення назоўніка, сфарміраваныя на аснове родавай класіфікацыі. Скланенне асабовых імёнаў, прозвішчаў і геаграфічных назваў.

9.5. *Граматычны статус прыметніка*. Аспекты вывучэння прыметніка. Семантычныя асновы катэгорыі прыметніка. Разрады прыметніка. Узаемадзеянне розных разрадаў прыметніка, недакладнасць межаў паміж імі.

9.6. *Граматычны статус лічэбніка*. З гісторыі вывучэння лічэбніка. Граматычныя асаблівасці катэгорыі лічэбніка ў беларускай мове.

9.7. *Граматычны статус займенніка*. З гісторыі вывучэння займенніка. Займеннік як асаблівы лексіка-семантычны тып слоў. Граматычныя асаблівасці катэгорыі займенніка ў беларускай мове.

9.8. *Граматычны статус дзеяслова*. Шляхі вывучэння дзеяслова ў граматычнай традыцыі. Граматычныя асаблівасці дзеяслова. Пытанне пра стан у лінгвістычнай літаратуры. Узаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць граматычных катэгорый дзеяслова. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як гібрыдныя дзеяслоўныя формы.

9.9. *Граматычны статус прыслоўя*. Традыцыйныя пункты гледжання на прыслоўе. Вызначэнне катэгорыі прыслоўя. Граматычныя асаблівасці прыслоўя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9.10. *Лінгвістычны статус безасабова-прэдыкатыўных слоў (слоў катэгорыі стану).* Граматычныя асаблівасці безасабова-прэдыкатыўных слоў.

9.11. *Граматычны статус службовых часцін мовы.* З гісторыі станаўлення службовых часцін мовы. Аспекты даследавання. Граматычныя асаблівасці службовых часцін мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны
## (дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)

| № п/п | Назва пытанняў, якія вывучаюцца | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя і метадычныя дапаможнікі) | Літаратура | Формы кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыйныя | практычныя | лабараторныя | КСР | | | |
| **1.** | **АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ (110 Г.).** | **36** | **74** | | | | | |
| **7.** | **Марфеміка (6 г.)** | **2** | **4** | | | | | |
| 7.1 | 1. Марфеміка як вучэнне аб марфемах. Прадмет і задачы марфемікі.<br>2. Паняцце марфемы, аламарфемы.<br>3. Панацце морфа, аламорфа. | 2 | | | | | 6, 7, 9, 10, 13, 19 | |
| 7.2 | Тыпалогія марфем<br>1. Рэляцыйныя і дэрывацыйныя марфемы.<br>2. Прадуктыўныя, непрадуктыўныя марфемы. | | 2 | | | | 2, 5, 17 | Ушчыльненае апытванне |
| | Марфемны аналіз слова<br>1. Аснова слова і яе тыпы.<br>2. Корань слова. Свабодныя і звязаныя карані.<br>3. Афіксы: тыпы, функцыя. | | 2 | | | | 2, 5, 17 | Праверка выканання практыкаванняў |
| **8.** | **Словаўтварэнне (8 г.)** | **2** | **6** | | | | | |
| 8.1. | 1. Кірункі даследавання. | 2 | | | | | 6, 7, 9, 10, 13, 19 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 8.2. | 1. Утваральная аснова, утваральная база.<br>2. Словаўтваральныя сродкі. | | 2 | | | | 2, 5, 18 | Франтальнае апытванне |
| | 1. Класіфікацыйныя адзінкі словаўтварэння.<br>2. Словаўтваральная пара, словаўтваральны ланцужок. | | 2 | | | | 2, 5, 18 | Праверка выкананя прыктыкаванняў |
| | 1. Словаўтваральныя парадыгма, рад, гняздо.<br>2. Словаўтваральны аналіз. | | 2 | | | | 2, 5, 18 | Індывідуальнае апытванне |
| **9.** | **Граматыка. Марфалогія** | **32** | **64** | | | | | |
| 9.1 | Кірункі даследавання<br>1. Апісальна-граматычныя даследаванні.<br>2. Функцыянальна-граматычныя даследаванні.<br>3. Супастаўляльна-граматычныя даследаванні інш. | 2 | | | | | 1, 3, 4 | |
| | 1. Навуковая апісальная граматыка.<br>2. Гістарычная граматыка. | | 2 | | | | 2, 5 | Франтальнае апытванне |
| | 1. Функцыянальная граматыка.<br>2. Тыпалагічная граматыка. | | 2 | | | | | Індывідуальнае апытванне |
| 9.2. | 1.Асноўныя граматычныя паняцці і адзінкі<br>2. Паняцце граматычнай катэгорыі<br>3. Паняцце граматычнай формы. | 2 | | | | | 1, 3, 4 | |
| | 1.Граматычнае значэнне<br>2. Паняцце парадыгмы. | | 2 | | | | 2, 5 | Праверка выканання практыкаванняў |
| | 1. Сродкі выражэння граматычных значэнняў.<br>2. Спосабы выражэння граматычных значэнняў. | | 2 | | | | 2, 5 | Праверка выканання практыкаванняў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 9.3. | Слова як адзінка марфалогіі<br>1. Словы і іх граматычныя групоўкі.<br>2. Сістэма часцін мовы. | 2 | | | | | 1, 3, 4 | |
| | 1. Безасабова-прэдыкатыўныя словы.<br>2. Няпэўна-колькасныя словы. | | 2 | | | | 2, 5 | Франтальнае апытванне |
| | 1. Мадальныя словы. Выклічнік.<br>2. Гукаперайманні. Звязка. | | 2 | | | | 2, 5 | Ушчыльненае апытванне |
| 9.4. | Граматычны статус назоўніка (10 г.) | 4 | 6 | | | | | |
| | 1. З гісторыі вывучэння назоўніка.<br>2. Прадметна-сэнсавая аснова катэгоры назоўніка. | 2 | | | | | 1, 3, 4, 8 | |
| | 1. Лексіка-семантычныя групы назоўніка.<br>2. Узаемадзеянне паміж катэгорыямі назоўніка, прыметніка, лічэбніка, займенніка, прыслоўя. | 2 | | | | | 1, 3, 4 | |
| | 1. Вызначэнне лексіка-семантычных груп назоўнікаў.<br>2. Складанне і выбарка сказаў з назоўнікамі розных лексіка-семантычных груп. | | 2 | | | | 2, 5, 21 | Ушчыльненае апытванне |
| | 1. Вызначэнне адрознага і агульнага паміж катэгорыямі назоўніка, прыметніка, лічэбніка.<br>2. Вызначэнне адрознага і агульнага паміж катэгорыямі назоўніка, займенніка, прыслоўя.<br>3. Марфалагічны аналіз назоўнікаў розных лексіка-семантычных груп. | | 2 | | | | 2, 5, 21 | Праверка тлумачальнага дыктанта з граматыч-ным заданнем |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 9.5 | Аб асноўных граматычных катэгорыях унутры катэгорыі назоўніка<br>1. Асноўныя тыпы скланення назоўніка<br>2. Скланенне асабовых імёнаў, прозвішчаў, геаграфічных назваў. | | 2 | | | | 2, 5, 21 | Праверка выканання практыкаванняў |
| 9.6. | Граматычны статус прыметніка (10 г.) | 4 | 6 | | | | | |
| | 1. Аспекты вывучэння прыметніка.<br>2. Семантычныя асновы катэгоры прыметніка | 2 | | | | | 1, 3, 4 | . |
| | 1. Разрады прыметніка.<br>2. Узаемадзеянне розных разрадаў прыметніка, недакладнасць межаў паміж імі. | 2 | | | | | 1, 3, 4 | |
| | 1. Класіфікацыйныя прыметы якасных прыметнікаў.<br>2. Марфалагічны аналіз якасных прыметнікаў. | | 2 | | | | 2, 5, 22 | Праверка выканання практыкаванняў |
| | 1. Класіфікацыйныя прыметы адносных прыметнікаў.<br>2. Марфалагічны аналіз адносных прыметнікаў | | 2 | | | | 2, 5, 22 | Індывідуальнае і фра-нтальнае апытванне |
| | 1. Класіфікацыйныя прыметы прыналежных прыметнікаў.<br>2. Марфалагічны аналіз прыналежных прыметнікаў. | | 2 | | | | | Праверка выканання практыкаванняў |
| 9.7. | Граматычны статус лічэбніка (6 г.) | 2 | 4 | | | | | |
| | 1. З гісторыі вывучэння лічэбніка. | 2 | | | | | 1, 3, 4 | |
| | Граматычныя асаблівасці лічэбніка<br>1. Скланенне колькасных лічэбнікаў. | | 2 | | | | 2, 5 | Праверка выканання |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Утварэнне колькасных лічэбнікаў<br>3. Асаблівасці ўжывання з назоўнікамі. | | | | | | | практыкаванняў |
| | Граматычныя асаблівасці лічэбніка<br>1. Скланенне парадкавых лічэбнікаў.<br>2. Утварэнне парадкавых лічэбнікаў.<br>3. Няпэўна-колькасныя словы. | | 2 | | | | 2, 5 | Праверка выканання практыкаванняў |
| 9.8. | Граматычны статус займенніка (6 г.) | 2 | 4 | | | | | |
| | 1. З гісторыі вывучэння займенніка.<br>2. Займеннік як асаблівы лексіка-семантычны тып слоў. | 2 | | | | | 1, 3, 4 | |
| | Граматычныя асаблівасці катэгорыі займенніка ў беларускай мове<br>1. Скланенне абагульнена-прадметных займен-нікаў.<br>2. Скланенне абагульнена-якасных займеннікаў. | | 2 | | | | 2, 5 | Граматычны калёквіум |
| | Граматычныя асаблівасці катэгорыі займенніка ў беларускай мове<br>1. Скланенне абагульнена-колькасных займен-нікаў.<br>2. Марфалагічны аналіз займенніка. | | 2 | | | | 2, 5 | Праверка выканання практыкаванняў |
| 9.9 | Граматычны статус дзеяслова (12г.) | 4 | 8 | | | | | |
| | 1. Шляхі вывучэння дзеяслова ў граматычнай традыцыі.<br>2. Пытанне пра стан у лінгвістычнай літаратуры. | 2 | | | | | 1, 3, 4, 11, 13 | |
| | 1. Граматычныя асаблівасці пераходных і непераходных дзеясловаў.<br>Граматычныя асаблівасці дзеясловаў незалежнага і залежнага стану. | 2 | | | | | 1, 3, 4, 11, 13 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Характарыстыка граматычных асаблівасцей пераходных і непераходных дзеясловаў.<br>2. Характарыстыка граматычных асаблівасцей дзеясловаў незалежнага і залежнага стану. | | 2 | | | | 2, 5, 20 | Індывідуальнае апытванне |
| | 1. Узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасць катэгорый дзеяслова<br>2. Сувязь катэгорыі ладу з катэгорыямі часу і трывання.<br>3. Сувязь паміж катэгорыяй трывання і катэгорыяй часу. | | 2 | | | | 2, 5, 20 | Праверка выканання практыкаванняў |
| | 1. Сувязь катэгорыі асобы з катэгорыямі ладу і часу.<br>2. Марфалагічны аналіз дзеяслова. | | 2 | | | | 2, 5, 20 | Ушчыльненае апытванне |
| | 1. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як гібрыдныя дзеяслоўныя формы<br>2. Асаблівасці ўтварэння і ўжывання дзеепрыметніка ў беларускай мове.<br>3. Асаблівасці ўтварэння і ўжывання дзеепрыслоўя ў беларускай мове. | | 2 | | | | 2, 5 | Праверка выканання практыкаванняў |
| 9.10. | Граматычны статус прыслоўя (6 г.) | 2 | 4 | | | | | |
| | 1. Традыцыйныя пункты гледжання на прыслоўе.<br>2. Вызначэнне катэгорыі прыслоўя. | 2 | | | | | 1, 3, 4, 15 | |
| | 1. Граматычныя асаблівасці прыслоўяў.<br>2. Граматычныя асаблівасці якасных прыслоўяў.<br>3. Утварэнне якасных прыслоўяў. | | 2 | | | | 2, 5 | Камбінаванае апытванне |
| | 1. Граматычныя асаблівасці акалічнасных | | 2 | | | | 2, 5 | Праверка |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | прыслоўяў.<br>2. Утварэнне акалічнасных прыслоўяў.<br>3. Марфалагічны аналіз прыслоўя. | | | | | | | выканання практыкаванняў |
| 9.11. | Лінгвістычны статус безасабова-прэдыкатыўных слоў (6 г.) | 2 | 4 | | | | | |
| | 1. Лінгвістычны статус безасабова-прэдыкатыўных слоў.<br>2. Катэгарыяльнае значэнне, марфалагічныя пры-меты, сінтаксічная роля. | 2 | | | | | 1, 3, 4 | |
| | 1. Вызначэнне граматычных асаблівасцей безасабова-прэдыкатыўных слоў.<br>2. Падбор і складанне сказаў з безасабова-прэдыкатыўнымі словамі розных лексіка-семантычных груп. | | 2 | | | | 2, 5 | Індывідуальнае апытванне |
| | Марфалагічны аналіз безасабова-прэдыкатыўных слоў<br>1. Лексіка-семантычная група..<br>2. Суадноснасць з іншымі часцінамі мовы.<br>3. Сінтаксічная функцыя. | | 2 | | | | 2. 5 | Праверка выканання практыкаванняў |
| 9.12. | Граматычны статус службовых часцін мовы (22 г.) | 6 | 16 | | | | | |
| | 1. Характарыстыка функцый прыназоўніка.<br>2. Характарыстыка разрадаў прыназоўнікаў. | 2 | | | | | 1, 3, 4, 14, 16 | |
| | 1. Вызначэнне і характарыстыка пpасторавых, часавых, прычынных і інш. прыназоўнікаў.<br>2. Вызначэнне сінанімічных | | 2 | | | | 2, 5 | Камбінаванае апытванне |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| прыназоўнікавых канструкцый. | | | | | | | |
| Характарыстыка разрадаў прыназоўнікаў<br>1. Вытворныя і невытворныя прыназоўнікі.<br>2. Простыя, складаныя і састаўныя прыназоўнікі. | | 2 | | | | 2, 5 | Праверка выканання практыкаванняў |
| 1. Разрады злучнікаў паводле паходжання.<br>2. Разрады злучнікаў паводле структуры.<br>3. Разрады злучнікаў паводле спосабу ўжывання. | 2 | | | | | 1, 3, 4 | |
| 1. Злучальныя злучнікі.<br>2. Падпарадкавальныя злучнікі. | | 2 | | | | 2, 5 | Індывідуальнае апытванне |
| 1. Характарыстыка разрадаў часціц паводле паходжання, структуры і функцыі.<br>2. Характарыстыка формаўтваральных і словаўтваральных часціц. | 2 | | | | | 1, 3, 4 | |
| 1. Вызначэнне граматычных асаблівасцей сэнсавых часціц.<br>2. Вызначэнне граматычных асаблівасцей мадальных часціц.<br>3. Вызначэнне граматычных асаблівасцей мадальна-валявых, эмацыйна-экспрэсіўных часціц. | | 2 | | | | 2, 5 | Франтальнае апытванне |
| 1. Марфалагічны аналіз прыназоўнікаў.<br>2. Марфалагічны аналіз злучнікаў.<br>3. Марфалагічны аналіз часціц. | | 2 | | | | 2, 5, 23 | Праверка выканання практыкаванняў |
| 1. Вызначэнне семантыкі і сінтаксічных асаблівасцеймадальных слоў.<br>2. Вызначэнне разрадаў мадальных слоў. | | 2 | | | | 2, 5 | Індывідуальнае апытванне |
| 1. Кваліфікацыя разрадаў выклічнікаў | | 2 | | | | 2, 5 | Праверка |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | выклічнікаў паводле значэння.<br>2. Кваліфікацыя разрадаў выклічнікаў паводле паходжання. | | | | | | | выканання практыкаванняў |
| | 1. Адрозненне выклічнікаў ад гукапераймальных слоў.<br>2. Сінтаксічная роля гукапераймальных слоў. | | 2 | | | | 2, 5 | Ушчыльненае апытванне |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

**АСНОЎНАЯ**


1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.
2. Малажай Г.М., Кананенка Т.М. Лабараторныя працы па сучаснай беларускай мове. Мінск: Выш. шк., 1999.—300 с.
3. Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.
4. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.
5. Сучасная беларуская літаратурная мова: Практычныя заняткі. 3-е выд. Мінск: , 1995. – 287 с.


**ДАДАТКОВАЯ**


6. Лукашанец, А.А. Праблемы сучаснага беларускага словаўтварэння / А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларуская навука, 2013.—315 с.
7. Лукашанец, А.А. Словаўтварэнне і граматыка / А.А. Лукашанец. – Мінск: Права і эканоміка, 2001. – 252 с.
8. Наркевіч, А.І. Назоўнік: Граматычныя катэгорыі і формы / А.І. Наркевіч. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1976. – 248 с.
9. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003.— 672 с.
10. Прыгодзіч, М.Р. Словаскладанне ў беларускай мове / М.Р. Прыгодзіч. – Мінск: БДУ, 2000.—227 с.
11. Русак, В.П. Марфаналогія сучаснай беларускай мовы / В.П. Русак. – Мінск: Бел. навука, 2003. – 316 с.
12. Русак, В.П. Марфаналогія словазмянення і словаўтварэння сучаснай беларускай мовы / В.П. Русак. – Мінск: Беларуская навука, 2012. – 429 с.
13. Шуба, П.П. Дзеяслоў у беларускай мове / П.П. Шуба. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1968. – 82 с.
14. Шуба, П.П. Прыназоўнік у беларускай мове / П.П. Шуба. – Мінск: БДУ імя У.І. Леніна, 1971. – 224 с.
15. Шуба, П.П. Прыслоўе ў беларускай мове: Марфалагічны нарыс / П.П.Шуба. – Мінск: выд-ва АН БССР, 1962. – 194 с.
16. Яўневіч, М.С. Сінтаксічная сінаніміка ў сучаснай беларускай літаратурнай мове / М.С. Яўневіч. – Мінск: БДУ імя У.І. Леніна, 1977. – 280 с.


***Слоўнікі***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

17. Бардовіч, А.М., Шакун, Л.М. Марфемны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, Л.М. Шакун. – 2-е выд. – Мінск, 1989.
18. Бардовіч, А.М., Круталевіч, М.М., Лукашанец, А.А. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, М.М. Круталевіч, А.А. Лукашанец. – Мінск, 2000.
19. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск., 1994.
20. Граматычны слоўнік дзеяслова / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. В.П. Русак [і інш.]; навук. рэд. В.П. Русак. – 2-е выд., дапрац. – Мінск : Беларуская навука, 2013.
21. Граматычны слоўнік назоўніка / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 2008.
22. Граматычны слоўнік прыметніка, займенніка, лічэбніка, прыслоўя / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. Н.П. Еўсіевіч [і інш.]; навук. рэд. В.П. Русак. – Мінск: Бел. навука, 2009.
23. Шуба, П.П. Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікаў / П.П. Шуба. – Мінск, 1993.—168 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

## ПЕРАЛІК ВУЧЭБНЫХ ВЫДАННЯЎ
## І ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

### *ДАПАМОЖНІКІ, НАВУКОВЫЯ ВЫДАННІ*


Антанюк, Л.А. Сінтаксіс беларускай мовы. Сказ. Функцыянальна-семантычны сінтаксіс: Вучэбны дапаможнік / Л.А. Антанюк. – Мінск: Акадэмія кіравання прф Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, 2004. – 110 с.

Бандарэнка, Т.П. Аднатыпныя словазлучэнні ў сучаснай беларускай літаратурнай мове / Т.П. Бандарэнка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 131 с.

Баханькоў, А.Я. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / А.Я. Баханькоў [ і інш.]; пад агул. рэд. А.Я. Баханькова / АН Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я.Коласа. – Мінск, 1994. – 463 с.

Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.

Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 2. Сінтаксіс / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: навука і тэхніка, 1986. – 327 с.

Выгонная, Л.Ц. Інтанацыя. Націск. Арфаэпія / Л.Ц. Выгонная. – Мінск: навука і тэхніка, 1991. – 215 с.

Германовіч, І.К. Беларускія мовазнаўцы: у 2 т. / І.К. Германовіч; рэд. М.Р. Прыгодзіч, І.С. Роўда – Мінск: БДУ, 2006.

Карский, Е.Ф. Белорусы: в 3 т. / Е.Ф. Карский. – Мінск: БелЭн, 2006 - 2007.

Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія, марфаналогія, марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.

Кароткая граматыка беларускай мовы: У 2-х ч. Ч. 2. Сінтаксіс / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 240 с.

Крывіцкі, А.А., Падлужны, А.І. Фанетыка беларускай мовы / А.А. Крывіцкі,
А.І. Падлужны. – Мінск: Вышэйшая школа, 1984. – 269 с.

Лукашанец, А.А. Праблемы сучаснага беларускага словаўтварэння / А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларуская навука, 2013.—315 с.

Лукашанец, А.А. Словаўтварэнне і граматыка / А.А. Лукашанец. – Мінск: Права і эканоміка, 2001. – 252 с.

Малажай Г.М., Кананенка Т.М. Лабараторныя працы па сучаснай беларускай мове. Мінск: Выш. шк., 1999.—300 с.

Наркевіч, А.І. Назоўнік: Граматычныя катэгорыі і формы / А.І. Наркевіч. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1976. – 248 с.

Лепешаў, І.Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы / І.Я. Лепешаў. – Мінск: Выш. шк., 1998. – 271 с.

Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум /


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003.— 672 с.

Прыгодзіч, М.Р. Беларуская мова ў працах замежных лінгвістаў / М.Р. Прыгодзіч. – Мінск: БДУ, 2010. – 184 с.

Прыгодзіч, М.Р. Словаскладанне ў беларускай мове / М.Р. Прыгодзіч. – Мінск: БДУ, 2000.—227 с.

Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні / В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. -- 199 с.

Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: вучэб. дапаможнік / Т.Р. Рамза; пад агул. рэд. А.Я .Міхневіча. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск: БДУ, 2006. – 214 с.

Русак, В.П. Марфаналогія сучаснай беларускай мовы / В.П. Русак. – Мінск: Бел. навука, 2003. – 316 с.

Русак, В.П. Марфаналогія словазмянення і словаўтварэння сучаснай беларускай мовы / В.П. Русак. – Мінск: Беларуская навука, 2012. – 429 с.

Фанетыка беларускай літаратурнай мовы/ І.Р. Бурлыка, Л.Ц. Выгонная, Г.В. Носік, А.І. Падлужны; рэд. А.І. Падлужны. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 335 с.

Чалюк, Н.М. Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне. Просты сказ / Н.М.Чалюк. – Мінск: ТетраСистемс, 2004. -- 208 с.

Шуба, П.П. Дзеяслоў у беларускай мове / П.П. Шуба. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1968. – 82 с.

Шуба, П.П. Прыназоўнік у беларускай мове / П.П. Шуба. – Мінск: БДУ імя У.І. Леніна, 1971. – 224 с.

Шуба, П.П. Прыслоўе ў беларускай мове: Марфалагічны нарыс / П.П.Шуба. – Мінск: выд-ва АН БССР, 1962. – 194 с.

Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. – Мінск: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

Яўневіч, М.С. Сінтаксічная сінаніміка ў сучаснай беларускай літаратурнай мове / М.С. Яўневіч. – Мінск: БДУ імя У.І. Леніна, 1977. – 280 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

## *СЛОЎНІКІ*

Арашонкава, Г.У., Лемцюгова, В.П. Кароткі слоўнік беларускай мовы: Правапіс. Вымаўленне. Націск. Словазмяненне. Словаўжыванне / Г.У. Арашонкава, В.П.Лемцюгова. – Мінск., 1994.

Арашонкава, Г.У., Лемцюгова, В.П. Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы / Г.У. Арашонкава, В.П. Лемцюгова. – Мінск, 2005.

Бардовіч, А.М., Шакун, Л.М. Марфемны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, Л.М. Шакун. – 2-е выд. – Мінск, 1989.

Бардовіч, А.М., Круталевіч, М.М., Лукашанец, А.А. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, М.М. Круталевіч, А.А. Лукашанец. – Мінск, 2000.

Беларуска-рускі слоўнік: больш за 110 000 сл.: у 3 т. Т. 1 – 3 / пад рэд. А.А. Лукашанца. – Выд. 4-е, перапрац. і дап. – Мінск: БелЭн, 2012.

Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; рэдкал.:
Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск., 1994.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Мінск, 1996 – 2004.

Булыка, А.М. Слоўнік іншамоўных слоў. Актуальная лексіка / А.М. Булыка. – Мінск, 2005.

Гамеза, Л. Комплексны лексічны слоўнік беларускай мовы (сінонімы, антонімы, амонімы, паронімы) / Л. Гамеза. – Мінск: ТетраСистемс, 2008.

Грабчыкаў, С.М. Слоўнік паронімаў беларускай мовы / С.М. Грабчыкаў. – Мінск: Нар. асвета, 1994.

Граматычны слоўнік дзеяслова / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. В.П. Русак [і інш.]; навук. рэд. В.П. Русак. – 2-е выд., дапрац. – Мінск : Беларуская навука, 2013.

Граматычны слоўнік назоўніка / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 2008.

Граматычны слоўнік прыметніка, займенніка, лічэбніка, прыслоўя / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. Н.П. Еўсіевіч [і інш.]; навук. рэд. В.П. Русак. – Мінск: Бел. навука, 2009.

Клышка, М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М.К. Клышка. – Мінск: ПУП “Радыёла-плюс”, 2005. – 672 с.

Лазоўскі, У.М. Слоўнік антонімаў беларускай мовы: Канкрэтныя выпадкі ўжывання / У.М. Лазоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1994. – 293 с.

Лепешаў, І.Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: У 2-х т. / І.Я. Лепешаў. – Мінск, 2008.

Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск, 2004.

Мажэйка, Н.С. Частотны слоўнік беларускай мовы / Н.С. Мажэйка. – Мінск, 2006.

Насовіч, І.І. Слоўнік беларускай мовы / І.І. Насовіч. – Мінск, 1983.

Слоўнік беларускай мовы / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы ; уклад. Н.П. Еўсіевіч [і інш.]; навук. рэд. А.А. Лукашанец, В.П. Русак. – Мінск: Беларуская навука, 2012.

Старычонак, В.Д. Слоўнік амонімаў беларускай мовы / В.Д. Старычонак. – Мінск, 1991. --

Струкава, С.М. Слоўнік архаізмаў і гістарызмаў (па творах беларускай мастацкай літаратуры і публіцыстыкі) / С.М. Струкава. – Мінск: Беларуская навука, 2007.

Шкраба, І.Р. Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі / І.Р. Шкраба. – Мінск: Беларус. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008.

Шуба, П.П. Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікаў / П.П. Шуба. – Мінск, 1993.—168 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ